Алесь Салавей


Галасы Айчыны





Галасы Айчыны


[illegible]



Алесь Салавей

ТВОРЫ

паэзія
проза
лісты



Мінск «Лімарыус» 2010

УДК 821.161.3
ББК 84(4Беи)
С 16

Серыя заснавана ў 2010 годзе

Укладанне, прадмова і каментар
Міхася Скоблы

Салавей, Алесь

С 16 Творы: Паэзія, проза, лісты / Алесь Салавей; уклад., прадм. і камент. М. Скоблы. — Мінск: Лімарыус, 2010. — 560 с.: іл.

ISBN 978-985-6740-03-0.

Гэта першая кніга выдатнага паэта Алеся Салаўя (1922–1978) на радзіме. Нараджэнец Койданаўшчыны, ён у 1944 г. пакінуў Беларусь, жыў у лагерах для бежанцаў у Аўстрыі, потым настала пасяліўся ў далёкай Аўстраліі. Аднак і на чужыне ён аджыўляў душу беларускім словам, ствараючы вершы ў класічных еўрапейскіх формах. «Творамі» А. Салаўя распачынаецца серыя «Галасы Айчыны», у якой мяркуецца выдаваць творы выбітных беларускіх пісьменнікаў.

УДК 821.161.3
ББК 84(4Беи)

ISBN 978-985-6740-03-0

© Салавей А., 2010
© Скобла М., укладанне,
прадмова і каментар, 2010
© ТАА «Лімарыус», 2010

Укладальнік і выдавецтва шчыра дзякуюць за спрыянне ў падрыхтоўцы да выдання твораў Алеся Салаўя сп. Надзі і Янку Запруднікам, сп. Лізе Літаровіч, сп. Вітаўту Кіпелю, сп. Лявону Юрэвічу, сп. Наталлі Гардзіенка, сп. Лідзіі Савік, сп. Сержу Трыгубовічу, сп. Веры Заморскай, сп. Ліне і Міколу Сагановічам, сп. Аляксандры Сямёнавай, сп. Антону Шукелойцю, сп. Веры Запруднік, сп. Юрку Кіпелю, сп. Вячку Станкевічу, сп. Аляксандру Міцкевічу, сп. Алесю Вінакураву, сп. Але Кузьміцкай, сп. Кастусю Вераб'ю, сп. Тані Красоўскай, а таксама сп. Валянціне Трыгубовіч і сп. Але Орса-Рамана і O.R. Cultural and Educational Foundation.

ПАЛАДЗІН РАДЗІМЫ

Паэт Алесь Салавей прыйшоў да мяне са старонак часопіса «Новы шлях». Часопіс гэты трапіўся мне на вочы ў 1989 годзе, на перадапошнім курсе філфака, у студэнцкім інтэрнаце. Аднакурснік вярнуўся з вакацыяў са сваёй Мядзельшчыны не толькі з ладным апольцам смакотлівай шынкі, але і з падшыўкай невядомага мне да той пары выдання. Даў на вечар пагартаць і, забіраючы, папрасіў лішне не распускаць язык.

Не скажу, каб мяне моцна ўразілі фотаздымкі нямецкай бранятэхнікі ці партрэты фюрэра на вокладцы. Уразіў змест часопіса. Прачытаўшы паэму Алеся Салаўя «На хуткіх крылах вольнага Пегаса», я зразумеў, якога паэта не хапае ў праграмным спісе класікаў, чые творы вывучаліся на філфаку.

Прайшоў год-другі, і літаратуру беларускай эміграцыі пачалі заўважаць у метраполіі. І не толькі заўважаць — усе менскія газеты і часопісы лічылі сваім абавязкам надрукаваць на сваіх старонках пісьменнікаў-эмігрантаў.

Памятаю, кампанія «БелАПан» (дай Божа здароўя яе заснавальніку — Алесю Ліпаю) даставіла ў Беларусь цэлы кантэйнер беларускіх кніг, выдадзеных у Мюнхене, Нью-Ёрку, Лондане, Таронта. Па іх запісваліся ў чаргу. Тады і трапілі ў мой кнігазбор «Спадчына» Янкі Купалы (з неразрэзанымі, нібы ў XIX стагоддзі, старонкамі), мюнхенскага крою «Вянок» Максіма Багдановіча і «Матчын дар» Алеся Гаруна, бінімаўскія тамы Наталлі Арсенневай і Алеся Салаўя. Арсенневай яшчэ пашанцавала патрымаць у руках кнігу сваёй выбранай паэзіі, якая паспела выйсці ў менскім выдавецтве «Мастацкая літаратура» ў 1996 годзе. Потым перад пісьменнікамі-эмігрантамі айчынныя дзяржвыдавецтвы ізноў, як за савецкім часам, звыкла апусцілі забаронны шлагбаўм.

«Каго вы лічыце найлепшым паэтам эміграцыі?» — аднойчы запытаўся ў Наталлі Арсенневай журналіст урадавай газеты з Менску. І пачуў у адказ імя Алеся Салаўя.

Няпоўных пяцьдзесят сем гадоў пражыў ён на гэтым свеце, з іх трыццаць чатыры — па-за межамі Беларусі, якую пакінуў дваццацітрохгадовым юнаком. Рэдка хто з беларускіх паэтаў тае пары мог пахваліцца ўладкаваным жыццём, шмат хто здзейсніў падканвойнае падарожжа ў Сібір, куды выязджалі эшалонамі, а вярталіся на радзіму (калі ўвогуле вярталіся) паасобку, кожны сваімі дарогамі. Але нават на фоне таго трагічнага перасялення народаў Алесь Салавей можа лічыцца самым беспрытульным беспрытульнікам. Крысава (вёска пад Койданавам, дзе будучы паэт нарадзіўся 1 траўня 1922 года) — Самахвалавічы — Наталеўск — Вялікія Навасёлкі — Менск — Лагойск — Ілля — Рыга — Вільня — Беласток — Пуйкуле — Руйене — Масяру — Гедэместэ — Лібава — Кёнігсберг — Талін — Берлін — Прага — Вена — Зальцбург — Кірхгайм — Кротын-

ген — Адэлаіда — Мельбурн (там паэт і памёр 22 студзеня 1978 года)… Вось тыя кропкі на геаграфічнай мапе, дзе знаходзіў свой часовы прытулак (кароткі ці больш працяглы) паэт Алесь Салавей. Хіба толькі ў Мельбурне займеў нарэшце ўласны дом, на падворку якога з сябрамі пёк бульбу ў прысаку. Бульба з прысаку, можа, і смакавала, але занадта непадобная на Беларусь тая Аўстралія, каб хоць часткова замяніць радзіму. Радзіму, да якой прырос усімі каранямі і галінамі, з якой спалучаны самым непарыўным злучвом — мовай. Паэт немагчымы без роднай мовы, яна — залаты запас паэта, які зберагаецца, як у банкаўскіх сейфах, у памяці і душы. Пакуль яна там, назапашаная, гучыць усімі дзівоснымі сугуччамі, — паэт здольны шаптацца з зорамі. А заціхае мова — замаўкае і паэт, і хвіліны ягонага жыцця на зямлі пачынаюць перасыпацца сухім пяском у пустэльні, бясплодным і нікому, нават яму самому, непатрэбным.

Можна дэкаратыўнае карлікавае дрэўца перасадзіць у гаршчок і перавезці на другі кантынент. Эўкаліпт не перасадзіш з Аўстраліі ў Беларусь — не прыжывецца. Так і паэт беларускі не прыжыўся ў Аўстраліі, хоць зямля і паветра паўсюль аднолькавыя. Не хапала чагосьці больш істотнага — апрача мовы, яе непаўторнай прасодыі і мілатонікі. Не хапала радзімы.

«А ты — зусім адзін. Куды ж цяпер ідзеш, нясхільны паладзін?» Алесь Салавей — верны паладзін радзімы. Ён прызнаваўся ёй у любові, як каханай дзяўчыне, ён трымаў яе, як намолены абраз, на покуці сваёй душы, ён звяртаўся да яе на «ты», але нават гэтае «Ты» пісаў заўсёды з вялікай літары. Усё гэта вельмі нагадвае сярэднявечную рыцарскую паэзію, з якой даму сэрца неяк незаўважна выцесніла Беларусь-Крывія.

Падарожнік, які едзе па Арарацкай даліне ў Арменіі, міжволі спыняецца каля незвычайнай аркі. Спыняецца і бачыць у ёй далёкі Арарат — святую для кожнага армяніна гару, якая апынулася на тэрыторыі Турцыі. Армяне змясцілі сваю недаступную святыню ў архітэктурную раму, як змяшчаюцца ў каштоўныя аклады старажытныя абразы. Так і на Беларусь мы часам глядзім праз трыумфальную арку нашай паэзіі.

Памятаеце Жылкава: «О як соладка сэрцу маліцца: «Беларусь, Беларусь, Беларусь»? Гэтак і Алесь Салавей багавейна ўсклікваў: «Скажу, укленчыўшы: Крывіччына святая! Хай Ты на смерць была распятай, а жывеш».

Я нездарма параўнаў Жылку з Салаўём, бо яны сапраўды блізкія — найперш сваімі паэтычнымі радаводамі ад Максіма Багдановіча. Што Алесь Салавей вучыўся ў Багдановіча — тое бясспрэчна. Алюзій на творчасць настаўніка, а часам і непрыхаваных цытатаў у вершах вучня — безліч. Не кажучы ўжо пра тое, што пераймаліся пэўныя эстэтычныя ўстаноўкі ды арыенціры накшталт гэтага: «Як месяц зіхаціць адбітым светам, такззяюць вершы даўніх форм красой». Вось адкуль яны, Салаўёвы санеты і трыялеты, актавы і рандо, гекзаметры і тэрцыны. Вось чаму адну са сваіх будучых кніг паэт хацеў назваць невыпад-

ковым словам — вянкі. Мне здаецца, што вершамі з таго — несмяротнага — «Вянка» Алесь Салавей не толькі захапляўся, ён жыў паводле іх. Памятаеце «Перапісчыка», створанага ўявай Багдановіча? Падобным перапісчыкам стаў і Алесь Салавей, калі некалькі разоў перапісаў ад рукі зборнік вершаў Вацлава Ластоўскага, намаляваўшы ўсе застаўкі і буквіцы, каб падараваць яго найбліжэйшым сябрам. Трапляліся мне і вершы Ларысы Геніюш, перапісаныя каліграфічным почыркам Салаўя і разасланыя ім суродзічам па ўсім свеце. А рукапісы ягоных кніг нагадваюць старасвецкія даскарынаўскія інкунабулы — здаецца, іх вынеслі на белы свет з якой-небудзь палаты кнігапіснай.

У савецкім літаратуразнаўстве існаваў гэткі тэрмін — паэт-самавук. Памятаю, так называлі Старога Уласа, які працаваў ляснічым у графа Тышкевіча. Але хто з беларускіх паэтаў першай паловы XX стагоддзя мог пахваліцца закончанай літаратурнай адукацыяй? Хіба адзін Уладзімір Дубоўка — выпускнік маскоўскага Брусаўскага літінстытута. Але дзе ён мог скарыстаць сваю сапраўды выдатную адукацыю? Не будзеш жа расказваць пра ямбы ды амфібрахіі мядзведзям у краснаярскай тайзе…

Беларускія паэты вучыліся свайму рамяству не ў акадэміях, не ў сівагаловых прафесараў ці надомных рэпетытараў. Навука паэзіі перадавалася паэтамі эстафетна — з рук у рукі, з радка ў радок. І шырокія, як марскія хвалі, памеры Гамера, і выказаная безапеляцыйна, як судовы вырак, рацыя Гарацыя — усё спасцігалася непасрэдна над старонкамі кніг.

Алеся Салаўя таксама можна залічыць у паэты-самавукі. Не выпадае ж месячныя літаратурныя курсы перад вайной назваць лесвіцай на Парнас. Ды і ці да навукі было шаснаццацігадоваму юнаку (тады яшчэ — Альфрэду Радзюку), на вачах якога нядаўна арыштавалі маці і бацьку і на плечы якога лёг нялёгкі клопат пра малодшую сястру і братоў?

На тых жа курсах навучаўся паэт Мікола Аўрамчык, які пазней успамінаў: «Альфрэд быў вельмі сціплы, крыху нясмелы, занадта сентыментальны. Затое, калі яго крыўдзілі, ён бываў ганарліва-яршысты. Скардзіўся на слабое сэрца, не мог хутка хадзіць, яму цяжка было падымацца на трэці паверх. На працягу месяца вучобы жыў на поўным утрыманні Літфонда. Аднойчы наш агульны сябра Аркадзь Марціновіч, які ўжо настаўнічаў і якраз атрымаў зарплату, запрасіў Альфрэда ў рэстаран. Дык той пасля прызнаўся, што ўпершыню за доўгі час папалуднаваў па-людску».

Паесці не было за што, а на кнігу (чытайце — самаадукацыю) грошы знаходзіліся. Што ж, многія пачаткоўцы аддавалі перавагу хлебу духоўнаму перад хлебам надзённым. Як тут не прыгадаць аднаго з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры Альгерда Абуховіча-Бандынэлі: «Хоць галодзен — я свабодзен, гдзе мне цягне — там бягу…»

Філосаф Эрых Фром пісаў пра ўласцівыя чалавеку ўцёкі ад свабоды. Наўрад ці зразумелі б ягоныя мудрагельствы грамадзяне дзяржавы, якая мільёны запіхнула за калючы лагерны дрот.

Што да рыфмы «галодзен — свабодзен», то яна мела поўнае права прапісацца ў паэтычным арсенале Алеся Салаўя. Зацягваць пояс яму ў жыцці даводзілася неаднойчы. І ў акупаваным немцамі Менску, дзе хлеб выдаваўся на карткі, і ў Рызе, дзе на беларусаў — супрацоўнікаў часопіса «Новы шлях» — латышы паглядалі падазрона, як на акупантаў. Блыталі з расейцамі. А савецка-расейскія акупанты прыйшлі ў Латвію першымі, апярэдзіўшы немцаў, акупацыя на акупацыю ўспрымаецца зусім на іншы лад… Зацягваўся пояс і ў Зальцбургу, у лагеры для безрадзімцаў і бесхацінцаў, якіх у паруйнаванай Еўропе налічваліся сотні тысячаў.

І тут я чую зларадны галасок, які абавязкова прагучыць, які ў сучаснай Беларусі не можа не прагучаць: «Так яму і трэба, калабаранту, нямецкаму паслугачу. Па ім Сібір плакала!» Так, падчас вайны Алесь Салавей працаваў у «Беларускай газеце», у цывільнай адміністрацыі мястэчка Ілля на Вілейшчыне, у рэдакцыі згаданага ўжо «Новага шляху». Друкаваў і ў газеце, і ў часопісе лірычныя і патрыятычныя вершы. Але ні разу, ні пад адным прапагандысцкім артыкулам я ні ягонага сапраўднага прозвішча, ні ягоных менш вядомых псеўдонімаў (Антон Дабрыдзень, Алесь Вясновы, Максім Блакітны, Банадысь Свой) не бачыў. «А чаму ён не стаў савецкім партызанам?» — чую я той жа галасок. А чаму ён, уласна кажучы, павінен быў са зброяй у руках бараніць той палітычны лад, які яго асіраціў? Гэтаксама не мела за што асабліва любіць савецкую ўладу супрацоўніца тае ж «Беларускай газеты» Наталля Арсеннева, якую таксама вінавацяць у калабаранцтве сучасныя чыстаплюі. За што любіць? За казахстанскую ссылку? За мужа на Лубянцы?

У самае недарэчнае становішча трапіў сябра Салаўя паэт Масей Сяднёў. Прыход немцаў літаральна вызваліў яго з савецкай турмы. Дык што, і ён мусіў ісці ў партызанскі лес, дзе яму, учарашняму «ворагу народа», які-небудзь засланы з усходу камісарык мог без лішніх роспытаў уляпіць кулю ў патыліцу?

Нам, беларусам, у ацэнцы гэткай складанай з'явы, як калабарацыя, трэба браць прыклад з еўрапейскіх краінаў. У выдаваных падчас нямецкай акупацыі газетах друкаваўся і чэшскі паэт Яраслаў Сайфэрт. Але яго за гэта ніхто не пазбаўляў волі на дваццаць пяць гадоў, як Ларысу Геніюш. Наадварот, прайшоў час, і ён быў уганараваны найвышэйшай у свеце Нобелеўскай прэміяй. На радасць усім чэхам. А прэзідэнт Францыі генерал Дэ Голь публічна, праз нацыянальнае радыё, неўзабаве пасля вайны выказваў падзяку тым настаўнікам, якія пры немцах вучылі дзяцей на французскай мове. Чаму ж вінаватымі аказаліся беларускія настаўнікі, якія на свой страх і рызыку адраджалі нацыянальнае школьніцтва ў акупаванай Беларусі? Паваенны савецкі рэжым пераследаваў іх не за тое, што вучылі пры немцах, а за тое, што вучылі па-беларуску. Трэба проста зірнуць на пэўныя падзеі з уласна беларускай званіцы, і мы перастанем бачыць ворагаў там, дзе іх ніколі не было.

Алесю Салаўю праца ў «Беларускай газеце» і «Новым шляху» давала магчымасць, па-першае, фізічна выжыць, па-другое — працягваць самаадукацыю. Што ён, нядаўні вучань савецкай школы, мог ведаць пра гісторыю сваёй радзімы? Пра каўтун на галаве дакастрычніцкага беларуса і пра небывалы росквіт Беларусі пасля вялікага Кастрычніка? А тут на старонках выдання, дзе ты працуеш, друкуецца з працягам «Беларусь учора і сяння» Язэпа Найдзюка, «Кароткая гісторыя Беларусі» Вацлава Ластоўскага, гістарычныя нарысы Усевалада Ігнатоўскага... Чытай — не хачу. Невыпадкова менавіта ў 40-я гады гістарычная тэма ў творчасці Салаўя выходзіць на першае месца. Ды і пазней, перабраўшыся з Аўстрыі ў Аўстралію, паэт яе абмінаць не будзе.

Гісторык Юры Туронак у сваім даследаванні «Беларуская кніга пад нямецкім кантролем» прыводзіць цікавую статыстыку. Аказваецца, і падчас акупацыі варштат Скарыны не прастойваў — за 1941–1944 гады ў свет выйшла 117 беларускіх кніг. Наклады некаторых з іх («Беларуская граматыка для школ» Браніслава Тарашкевіча», «Беларускі правапіс» Антона Лёсіка) дасягалі 100 000 (!) асобнікаў. У спісе выданняў знаходзім і паэтычны зборнік Алеся Салаўя «Мае песні», надрукаваны трохтысячным накладам у 1944 годзе ў Рызе. А перад гэтым паэт мусіў некалькі разоў прыязджаць у Менск, выбіваць на вайсковым складзе паперу, дамагацца дазволу на друк, палагоджваць справы з цэнзурай... Рарытэтны асобнік гэтай падобнай на школьны сшытак кніжкі мне давялося патрымаць у руках у Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва. На форзацы — аўтограф: «Уладзімеру Кушэлю — Алесь Салавей». Бэрлін, 22.IX.44 г.».

Пасля «Вянка» Максіма Багдановіча я не ведаю другой такой кнігі (таксама ж — першай), дзе была б гэтак наглядна прадэманстравана тэматычная, метрычная і поліфанічная разнастайнасць верша. Зборнік пачынаецца санетамі «Гайна» і «Лідскае замчышча», далей ідуць творы, напісаныя ў форме тэрцыны, рандо, белага верша. Паэт вольна абыходзіцца і з абрывістым брахікаланам, і з па-антычнаму непаспешлівым гекзаметрам. Яму падуладныя пярэваратні-трыялеты і вершаваныя цыклы, напісаныя ўрачыстым александрыйскім вершам. Ёсць у зборніку і рыфмаваныя афарызмы, і пераказаныя па-беларуску фрагменты з «Калевалы», і наследаванні Гамеру, і прыпавесць пра грэцкага мастака Апелеса і Аляксандра Македонскага...

Хто з беларускіх савецкіх паэтаў на той час мог сабе дазволіць такое? Ад іх патрабавалася адно — прыраўняным да штыка пяром весці вайну з фашызмам. Але вайна рэдка натхняе паэтаў на стварэнне шэдэўраў. Паэзія любіць жыццё і цураецца смерці.

У рэдакцыі «Новага шляху» Алесь Салавей працаваў разам з літаратуразнаўцам Уладзімірам Сядурам (ён значыўся галоўным рэдактарам) і паэтам Пятром Сакалом. Сваім чалавекам у часопісе быў і Кастусь Езавітаў — дзеяч яшчэ БНР-аўскай плеяды. А жыў паэт у Рызе хоць і на знямечанай

Бісмарк-штрасэ, але ў кватэры Міколы Дзямідава — беларускага вайскоўца таксама старой, яшчэ царскай, закваскі, які ласкава перадаў землякам ключы, а сам паехаў настаўнічаць у беларускія раёны Латгаліі.

У «мемуарна-каментатыўных нататках» Антона Адамовіча «Так пяяў Салавей» (фактычна — манаграфіі) рыжскі перыяд у жыцці паэта выглядае ці не празмерна гусарскім. Наведваў літаратурны салон, пазнаёміўся з мастачкай, якая зрабіла малюнкі да ягонай кнігі...

Магчыма, у тым латышска-расейскім салоне Алесь Салавей і знаходзіў часовую кампанію, дзе збіраліся неабыякавыя да паэзіі і мастацтва людзі. Але — якой блізкай да адчаю самотай вее з ягоных тагачасных лістоў да Масея Сяднёва! Нібы жыў паэт не ў еўрапейскай сталіцы, а на бязлюднай выспе. Лісты пісаў — па дваццаць і больш старонак. Ад празмернай адзіноты спрабаваў ратавацца алкаголем. Даходзіла да псіхічных зрываў. Па начах сам сабе чытаў уголас вершы, будзіў суседзяў. Вось урывак з ліста, напісанага 31 снежня 1943 года: «А я — адзін. На ўсю кватэру адзін. Вярнуўшыся з пошты, вазьмуся за Байрана. Разам з ім пакіну сваю кватэру, пакіну зямлю і палячу ў аблокі. Разам з Байранам там, у аблоках, я і спаткаю Новы год».

Новы год — з Байранам... Вось такі літаратурны салон — у рыжскім небе. І далей: «Запраўды, няма збавення. Хай яе пярун спаліць, гэтую Рыгу! Цяпер мне б — на Беларусь, у чыстае поле або ў асабнячок у Менску, каб не трывожыць суседзяў...»

Колькі беларускіх паэтаў жыццё дажывалі, марачы пра падобнае! На берагах Енісея і Гудзона, у казахскіх бяскрайніх стэпах і запалярнай тундры, на падканвойнай Калыме і ў «вольным краі тым, дзе ўдаль плыве Мурэй»...

Чым страшная адзінота? Чалавек застаецца сам-насам з няспынным бегам часу, які — няўлоўна ўцякае, які не стрымаць, не дагнаць. У аднаго мудрага чалавека спыталіся: «Які самы злавесны гук на свеце?» І той адказаў: «Гадзіннікавае цік-так». Думаецца, празмерная адзінота даймала і Алеся Салаўя.

З Рыгі паэт пакручастым шляхам — праз Эстонію, Кёнігсберг і Балтыйскае мора — трапляе ў Берлін, дзе кароткі час працуе бібліятэкарам пры Беларускай Цэнтральнай Радзе. Калі нехта (ізноў жа!) хоча папракнуць паэта за знаходжанне па сваёй волі ў логаве фашызму, хай прачытае хоць бы гэты верш, названы па нямецку «Fröhliche Weihnachten», што азначае звыклае і для нас пажаданне: «Вясёлых Калядаў»:

Так, Fröhliche Weihnachten! Так, паны,
з грубой душой пад знакам павучыны.
Што ж маеце, вандалавы сыны,
да той жанчыны?

Яна з малой дзяўчынкаю — дачкой,
асіліўшы пакуты і знямогу,

вязе ў касцёл праз ваш несупакой
малітвы Богу.

Дзяўчынка ўся ссінела, як той «Ost»
на світцы ў маці. Ost'аўка — не пані,
ёй месца і ні ў свята, і ні ў пост
няма ў S-Bahn'е.

Арыйскі дух з вагона гоніць прэч
жанчыну-маці і дачку жанчыны…
…Карае вас, карае Божы меч
ліхіх, бясчынных.

І знікне чорны прывід Сатаны,
і згіне зверства след на хіжым твары.
Так, Fröhliche Weihnachten! Так, паны,
людства пачвары!

Пад вершам дата — 24 снежня 1944 года. S-Bahn — гэта гарадская чыгунка. «Павучыны знак» — безумоўна, свастыка. А як называе Алесь Салавей фанабэрыстых прадстаўнікоў арыйскай звышрасы? Вандалавымі сынамі і пачварамі. Ці трэба казаць, куды мог трапіць паэт, калі б яго «вясёла-каляднае» пасланне трапіла ў рукі дасведчанага немца? У Бухенвальдзе і Дахау яшчэ дыміліся печы…

Увогуле, чаму ніхто з нашых літаратуразнаўцаў да гэтай пары не напісаў адмысловага даследавання на прыблізна такую тэму — «Антыфашысцкія настроі ў беларускай паэзіі пад нямецкай акупацыяй»? Дзе можна ўбачыць гэтыя настроі? Уважліва прачытайце верш «Годзе!» Наталлі Арсенневай (год напісання — 1942), верш «Маем сілы і край свой» Уладзіміра Дудзіцкага (датаваны 1943 годам) ці санет «Лідскае замчышча» таго ж Алеся Салаўя, напісаны ў 1942-м…

Новы 1944 год паэт сустракаў з Байранам у Рызе. А свой дваццаць трэці дзень народзінаў — проста на дарозе з Вены ў Зальцбург, з яшчэ адным выгнанцам, паэтам Алесем Змагаром. Упрогшыся ў брычку, пагрузіўшы на яе самы неабходны жыццёвы набытак, паэты пешкі ратаваліся ад савецкіх войскаў, якія ўжо занялі паў-Еўропы і занялі б яе ўсю, каб не гістарычная сустрэча з саюзнікамі на Эльбе.

У Зальцбургу Алесь Салавей трапляе ў адзін з лагераў для выгнанцаў, якія знаходзіліся на ўтрыманні міжнародных арганізацый. Хоць лагеры гэтыя размяшчаліся па-за савецкай акупацыйнай зонай, іх наведвалі савецкія рэпатрыяцыйныя місіі, агітавалі вяртацца ў Савецкі Саюз. Антон Адамовіч пазней успамінаў, як сярод місіянераў нечакана пазнаў свайго колішняга калегу па згуртаванні «Узвышша», ад якога пачуў сказанае з аглядкай, напаўголасу: «Не вяртайся». Не будзем варажыць-падлічваць, колькі чалавек былы ўзвышэнец выратаваў ад Сібіры. Думаецца, той учынак залічыўся яму на судзе высокім і справядлівым.

Паінфармаваныя пра небяспеку вяртання на радзіму, са згоды сваіх утрыманцаў насельнікі лагераў мянялі прозвішчы, рыхтаваліся да выезду з падзеленай на два антаганістычныя станы Еўропы. Алесь Салавей атрымаў часовы пашпарт на імя Альберта Кадняка, але салаўіныя песні працягвалі гучаць у ягонай змучанай настальгіяй і вайной душы. Чатыры гады, пражытыя ім у Зальцбургу, на паўгалодным лагерным пайку, як ні дзіўна, сталіся самым плённым перыядам у жыцці паэта. Разам з сябрамі Аляксеем Грыцуком і Уладзімірам Дудзіцкім Алесь Салавей выдае часопіс «Пагоня», друкуецца ў «Шыпшыне» Юркі Віцьбіча і «Сакавіку» Антона Адамовіча, знаёміцца з украінскімі паэтамі Ігарам Качуроўскім і Барысам Аляксандравым, перакладае творы пабрацімаў на беларускую мову.

Калі гэтая кніга ўжо рыхтавалася да друку, я даведаўся, што Ігар Качуроўскі жыве ў Мюнхене. Украінскія сябры падказалі адрас. Пісьмовы адказ ад шаноўнага прафесара, аўтара вядомай ва Украіне кнігі «Строфіка», прыйшоў вельмі хутка. Пан Качуроўскі жыва прыгадваў падзеі шасцідзесяцігадовай даўнасці, напомніў, што Алесь Салавей у Зальцбургу належаў да Саюза ўкраінскіх навукоўцаў, пісьменнікаў і мастакоў. І яшчэ паведамляў: «Некалькі разоў мы выступалі перад публікай супольна — Алесь, Барыс Аляксандраў і я. Найпрыгажэй дэкламаваў вершы Алесь». Я прасіў Ігара Качуроўскага пашукаць у сваім архіве прысвечаны яму ўкраінскамоўны верш Алеся Салаўя, ад якога засталося адно-адзінае чатырохрадкоўе:

Тільки очі лукаво примружить
І зі швабом тікае за ріг.
О мій Ігоре, любий мій друже,
Вже нікуди немае доріг.

Качуроўскі, які дваццаць пасляваенных гадоў пражыў у Аргенціне, са скрухай паведаміў мне пра сваю бяду: «Калі я ў 1996 годзе наведаўся на свой хутар паблізу Буэнас-Айрэса, мне расказалі, што мой прыяцель, які той хутар даглядаў, спіўся і памёр за пару тыдняў да майго прыезду, а ягоны малодшы брат спаліў мае архівы. Так што я застаў у садзе круглае выпаленае месца і яшчэ раз нядобрым словам згадаў Міхаіла Булгакава з ягоным хлуслівым выслоўем: «Рукапісы не гараць» (ліст ад 12 снежня 2008 года).

Недзе з тым спаленым архівам пайшоў дымам у аргенцінскае неба і працытаваны вышэй верш Алеся Салаўя, і фотаздымкі зальцбургскай пары, і іншыя сведчанні шчырай дружбы двух паэтаў — беларускага і ўкраінскага.

Зальцбургскія гады былі плённымі не толькі ў літаратурнай творчасці — у 1945 годзе Алесь Салавей ажаніўся, а праз два гады ўжо стаў бацькам дваіх дзяцей — сына Міхася і дачкі Ганны. А сем'і з малалетнімі дзецьмі краінамі вольнага свету (дзе патрабавалася найперш працоўная сіла) прымаліся менш ахвотна. Таму і напісалася ў прысвячэнні сябру адчай-

нае: «Вже нікуди немае доріг». Сябры выязджалі — хто ў Злучаныя Штаты Амерыкі, хто ў Канаду, хто ў Аргенціну... Вызвалены ад працы Алесь Салавей (пісьменнік у лагеры мог не працаваць) з акна свайго барака сузіраў суровыя Альпы і зноў адчуваў сваю непатрэбнасць у свеце.

У 1948 годзе выйшаў з друку яго зборнік «Сіла гневу», другі пасля «Маіх песняў». Гэтыя два зборнікі заўважна розняцца між сабою: калі ў першым паэт жыццялюбна славіў «чыстую красу», то ў другім, кажучы біблейскімі словамі, «упаў у адчай і беспрасветны смутак», усё часцей адчуваў сябе фаталістам, якому паўсюль мроіліся вобразы смерці (вершы «Зямля ў агні», «Плыве вадаплаў і плыве...»). «Мігдаловы горкі пах» наплываў не толькі з Багдановічавага «Вянка» — настольнай кнігі Алеся Салаўя. Спрабуючы растлумачыць схільнасць паэта да вобразаў смерці, як не ўспомніць прыгаданы Юркам Віцьбічам вусцішны факт: дзед будучага паэта пасля арышту сына Васіля ў 1937-м наклаў на сябе рукі, і падлетку Альфрэду давялося вымаць яго з пятлі... Ратаваўся Салавей творчасцю, літаратурай — як відно з лістоў сябрам, што пачыналі новае жыццё за акіянам. Апошні ў «Сіле гневу» верш невыпадкова мае дзеяслоўную назву «Жыць» і заканчваецца радком-заклёнам: «З цясніны я ірвуся, каб жыць, каб жыць, каб жыць!»

«У якім вершы Янкі Купалы згадваецца Пагоня?» — аднойчы запытаўся ў мяне гісторык літаратуры Анатоль Сідарэвіч, хітравата ўсміхаючыся, маўляў, усё роўна не адгадаеш. Але я адгадаў — з дапамогай Алеся Салаўя. Ёсць у яго верш «Конадзень» — пра хуткага конніка, на чыім «шчыце востракутым крыж Ярылаў мігае». А цяпер прыгадаем радок-рэфрэн аднаго з самых вядомых купалаўскіх вершаў: «Паўстань з народу нашага...» Заклікаюцца паўстаць і Прарок, і Пясняр, і Уладар. Даходзіць чарга і да Ваяра: «Паўстань з народу нашага, Ваяк, і волатам на вогненным кані...» І ў Купалы, і ў Салаўя ваяк-коннік не называецца, даецца праз апісанне.

Перагукваецца з Купалам Алесь Салавей і яшчэ ў адным выпадку. Памятаеце іранічнае купалаўскае: «Я не паэта, о крый мяне Божа!» А ў сваім «Лісце да крытыка» Салавей упэўнена і з выклікам заяўляе: «Я — паэта!»

І калі Янка Купала, прыбядняючыся, пісаў: «Я... пан касы», то Алесь Салавей мог бы з поўным правам прадэкляраваць: «Я — пан красы». Нездарма яго выніковая кніга, выдадзеная ў 1982 годзе Беларускім інстытутам навукі і мастацтва ў Нью-Ёрку, мае назву «Нятускная краса». Назва — аўтарская, хоць паэта на той час ужо не было сярод жывых.

Выказвалася, і неаднойчы, меркаванне, што выезд Алеся Салаўя ў 1949 годзе ў Аўстралію быў памылкай, якая ўрэшце і прыспешыла яго-ную смерць. На новым мацерыку, як пазней у прыватным лісце прыгадвала ўдава паэта Зінаіда Кадняк, абжыцца было сапраўды няпроста: «Галоўнай праблемай быў дах над галавой. Наняць кватэру ў тыя часы з дзецьмі было амаль немагчыма. У нас жа ў Аўстраліі ў 1950 годзе нарадзіўся другі сын — Юра. Трое дзяцей, адно з іх глуханямое... Па сканчэнні двухгадовага кантракту, які адбывалі ў Адэлаідзе, мы пераехалі ў Мельбурн. Сябры дапамаглі пабудаваць частку дома (два пакоі). Далей будаваліся па меры

магчымасці, ашчаджаючы кожны грош, куплялася толькі самае неабходнае. Дужа мала знаходзілася часу на пісанне вершаў, ды і муза вельмі рэдка наведвала Алеся».

Антон Адамовіч, каму і адрасаваўся працытаваны ліст, скрупулёзна падлічыў усе паэтавы спатканні з музай пасля выезду з Еўропы. І хоць алгебра ў спасціжэнні гармоніі — памочнік, як вядома, ненадзейны, прывядзём тут гэтыя сухія лічбы. Такім чынам, у 1949 годзе Алесь Салавей напісаў 17 вершаў (улічваючы створаныя па дарозе ў накрайсветную Аўстралію), у 1950-м — 6, у 1951-м — 8, у 1952-м — 28, у 1956-м, 1959-м, 1964-м, 1966-м, 1967-м, 1968-м, 1969-м, 1970-м, 1976-м — па адным вершы; неназваныя гады былі ўвогуле бясплённымі.

Чым жа займаўся паэт па першым часе ў той Аўстраліі? Дамо слова яму самому: «Насіць цэглу, капаць ямы, пілаваць дровы, вазіць вагонікі з пяском, забіваць кіркаю каменне пад шпалы, мясіць гліну, цягаць скрынкі і валізкі, мыць вокны і падлогі, бяліць сцены, раўняць рыдлёўкай дарожкі ў алеях, падмятаць, прыбіраць — гэта мае спецыяльнасці». Пералік «спецыяльнасцяў», вядома ж, уражвае. Што ж, Аўстралія — не Аўстрыя, дзе пісьменніку дазвалялася не працаваць.

А яшчэ Алеся Салаўя не пакідае спрадвечнае беларускае жаданне «купіць зямлю, прыдбаць свой кут». І ён ці не ў кожным лісце параскіданым па свеце сябрам піша і піша пра свой няўхільны клопат: «Учора і сёння шукаў зямлю ў Адэлаідзе», «добрая зямля каштуе нямала, затое — хоць адразу будуйся на ёй», «учора купіў зямлю і нарэшце стаўся собснікам (18 метраў ушыркі і каля 50 — удоўжкі)», «гэтая зямля — мая няўхільная патрэба»…

У іншым паўшар'і шукаў Алесь Салавей сваю «новую зямлю» — літаральна і метафарычна. І калі ў першым выпадку пашанцавала, то ў другім — шанцавала ўсё радзей і радзей. Маўчанне паэта — тэма далікатная, таму наўрад ці мэтазгодна дашуквацца прычынаў гэтага маўчання. Розныя паэты пазнаму пераадольвалі зону нема152: спрабавалі пісаць прозу, перакладалі. Алесь Салавей звяртаўся да жанру перакладу і раней, яшчэ ў Рызе і Зальцбургу, але рабіў гэта ад выпадку да выпадку. Часам — з ветлівасці. Сяброўскія беларуска-ўкраінскія дачыненні вымагалі і паэтычных перазоваў. І перазовы гэткія мелі месца: украінцы Барыс Аляксандраў і Анатоль Галан пераклалі з дзесятак твораў Алеся Салаўя — апошні дапамог абазваццa па-беларуску Тарасу Шаўчэнку і Леаніду Палтаве. Але толькі ў Аўстраліі Салавей вырашае заняцца перакладамі грунтоўна.

У 1951 годзе ён спрабуе перакладаць вершы Джона Кітса. Вынік перакладчыка не задавальняе, і гэта зразумела: перакладаць ангельскую класічную паэзію з павярхоўным веданнем мовы немагчыма. Паэт просіць сябра Янку Філістовіча, які застаўся ў Еўропе, прыслаць ангельскі слоўнік. І той прысылае — перад сваім геройскім дэсантаваннем у Беларусь, дзе будзе схоплены і расстраляны вясною 1953 года. Ці ведаў пра гэта Алесь Салавей?

А пакуль ён перакладае новых аўстралійскіх паэтаў, вяртаецца да сваіх ранейшых перакладаў з Рыльке, шліфуе іх і дасылае ў часопіс «Конадні». Пра намеры Салаўя-перакладчыка гаворыць адзін з ягоных лістоў у Беларускі інстытут навукі і мастацтва, адпраўлены з аўстралійскага Мельбурна акурат падчас чарговага перыяду маўчання: «Узяўся за пераклады з аўстралійскіх паэтаў у беларускую мову. Неўзабаве пашлю вам колькі вершаў-перакладаў. Абставіны жыцця і лёс мой склаліся гэтак, што мне праз гады — далей і далей ад пяра. Калі ж будзе выходзіць у мяне адзін верш-пераклад у месяц, дык пры жыцці і здароўі, калі дазволіць Бог, праз 10 гадоў збярэцца больш сотні вершаў. І гэта сталася б зборнікам. Назваў бы яго «Узлёты ў свет: аўстралійская паэзія па-беларуску».

На жаль, запланаваны на дзесяцігоддзе праект так і застаўся неажыццёўленым. І па сёння аўстралійская паэзія застаецца для беларускага чытача terra incognita. А таму падвойнае пачуццё жалю ахоплівае, калі думаеш пра тыя няспраўджаныя з невядомых прычынаў «узлёты ў свет».

І ўсё ж літаратура свету заўважна ўплывала на паэзію Алеся Салаўя і ўзбагачала яе. Астэроіды, пралятаючы міма вялікіх планетаў і трапляючы ў іх гравітацыйнае поле, змяняюць свае арбіты. Гэтак і паэзія Салаўя часам карэктавалася блізкай прысутнасцю Максіма Багдановіча і Янкі Купалы, Дантэ і Рыльке, Уладзіміра Жылкі і Мікалая Гумілёва. Салаўёва цікавасць да заходнееўрапейскіх формаў, ягоная пранесеная праз усё жыццё вернасць санету таксама сведчаць пра ўлучанасць паэта ў агульную энергасістэму сусветнай літаратуры. За сваё жыццё Алесь Салавей стварыў 94 санеты (калі ўлічваць і паэму «На хуткіх крылах вольнага Пегаса», напісаную санетнай страфой). Відавочна, што з усіх «старабудаў» архітэктонікі паэт аддаваў бясспрэчную перавагу гатычнаму замку санета. У 1958 годзе часопіс «Конадні» ў адным нумары сенсацыйна надрукаваў адразу два вянкі санетаў — Алеся Салаўя і Міхася Кавыля. Каму з іх належыць пальма першынства — без вывучэння архіваў абодвух сказаць цяжка. Па сведчаннях сучаснікаў, узбагаціў беларускі санетарый першым вянком усё ж Алесь Салавей. Проста затрымаўся з высылкай свайго вянка ў рэдакцыю, бясконца дасканаліў і шліфаваў яго. Што праўда, відаць, забыўся паставіць на рукапісе дакладную дату. А вось Міхась Кавыль не забыўся датаваць свой вянок — 22 студзеня 1956 года (а потым стварыў яшчэ адзін вянок санетаў). Паўтаруся, я не схільны прызнаваць чыёсьці першынство — не маю пад рукою неаспрэчных доказаў. Бясспрэчна адно — вянок санетаў сапраўды патрабуе віртуознага валодання і мовай, і формай, і дасканаліць ды папраўляць яго можна гадамі.

У старажытным Кітаі існавала адметнае мастацтва — лакавы жывапіс. Спачатку карціну шліфавалі дробназярністымі каменьчыкамі, потым — вугальным пылам, потым — вугальным попелам, і нарэшце — попелам саломы, самым пяшчотным матэрыялам. Санеты Алеся Салаўя робяць уражанне адшліфаваных «попелам саломы» — настолькі ў іх кожнае

слова на сваім месцы, а ўсе кананічныя правілы выкананыя без найменшых адхіленняў.

Думаецца, не толькі Наталля Арсеннева лічыла Салаўя найлепшым беларускім паэтам на эміграцыі. Ведалі яму цану і ў савецкай Беларусі. Прытым, не толькі ў літаратурным асяродку. У 1958 годзе ў Камітэце дзяржбяспекі нават распрацоўвалася спецаперацыя па ягоным вяртанні на радзіму. Не апошнюю ролю ў ёй, па задумцы распрацоўшчыкаў, павінен быў выканаць паэт Мікола Аўрамчык — даўні сябра Алеся Салаўя, а галоўнае — былы палонны, які не застаўся на Захадзе, а вярнуўся ў Беларусь. Да гонару Міколы Якаўлевіча, ён змог адмовіцца ад настойлівай прапановы. Што магло чакаць Алеся Салаўя на радзіме — тлумачыць наўрад ці трэба. За адзін «Новы шлях» чакалі яго доўгія шляхі ў адным кірунку — на ўсход, у спавіты калючым дротам Гулаг. Адкуль не вярнуліся паэты Уладзімір Жылка, Вацлаў Ластоўскі, Сяргей Астрэйка, Уладзімір Хадыка, Леапольд Родзевіч, Сяргей Дарожны…

Часопіс «Новы шлях», які калісьці хаваўся ў самых патаемных месцах студэнцкага інтэрната, сёння знаходзіцца ў адкрытых фондах Нацыянальнай і Акадэмічнай бібліятэк. Праўда, да яшчэ аднаго «фонду» мне так і не ўдалося атрымаць доступу. Аднойчы добрая знаёмая, ведаючы мае літаратурныя зацікаўленні, прызналася, што яе бацька ў гады Другой сусветнай вайны выпісваў «Новы шлях». А перад вяртаннем савецкай улады запакаваў часопісы ў вялікую снарадную гільзу, засмаліў і закапаў на падворку. Ці трэба казаць, што навіна мяне ўзрушыла, і я вырашыў арганізаваць пошукавую экспедыцыю.

Праз пэўны час мы з сябрамі, прыхапіўшы з сабой вайсковы металашукальнік, выехалі па ўказаным адрасе ў адну з вёсак Нясвіжскага раёна. Знайшлі патрэбную хату, паразумеліся з новымі гаспадарамі і — распачалі пошук. Праз кожныя паўметра металашукальнік папіскваў, і мы адкопвалі то вялікі ржавы цвік, то бляшанку з-пад кансерваў, то падкову. А тым часам на падворку збіраліся вяскоўцы, якія прачулі, што нейкія чужакі прыехалі ў іхнюю вёску і шукаюць… золата. Мы не паспелі апрацаваць і трацiны накрэсленай на плане дзялянкі, як да нас падышлі два парламенцёры з рашучым выглядам на тварах. «Мясцовае самакіраванне» вырашыла выправадзіць «золаташукальнікаў» за межы вёскі. Нашыя адчайныя тлумачэнні пад увагу не браліся, а яшчэ больш узʼюрвалі натоўп. Давялося падпарадкавацца.

Часопіс «Новы шлях» з творамі Алеся Салаўя застаўся ляжаць у надзейнай схованні да лепшых часоў. Я запомніў тую вёску, тую хату і той падворак. Прыхаванае — знойдзецца. Як знойдзецца калісьці і неапублікаваная паэма Алеся Салаўя пра Грунвальдскую бітву, і недапісаная аповесць «Пад нагамі гарыць зямля», раздзелы з якой аўтар чытаў сябрам.

Скарбы позна ці рана знаходзяцца.

Міхась Скобла

ВЕРШЫ

НА СЕНАЖАЦІ

Не ўставай так рана,
сонца залатое,
не сушы вадзіцу —
срэбную расу.
Бо касцы у поле
выйшлі грамадою,
навастрыў з іх кожны
звонкую касу.
Падаць сталі росы —
зазвінелі косы,
загучалі песні,
паляцелі ўдаль.
Роўнымі шнурамі
сцелюцца пракосы,
траву-руту косіць
дружна грамада.

1937

* * *

Ніхто ў цішы нямой
не скажа мне: — Паглянь:
на дне пары былой —
шчаслівая талань.

Я сам, я сам пайду
насустрач ёй з цішы.

Я ейны дар знайду
у глыбіні душы.

Краса пары былой
з цямна ў святло вядзе.
Не заблудзіць мне з ёй
нідзе, нідзе, нідзе.

1937

* * *

Мінулы дзень,
далёкі час!
Жыцця струмень
імкне да вас.

З глушы, дзе ймгла,
вы ведзяцё
у край святла,
той край — жыццё.

О ўскалыхне
яно свой звон!
Маёй вясне —
сугон-пагон

праз ноч, праз цень
да вас, да вас,
далёкі дзень,
мінулы час!

1937

ШЫЛАВА ГАРА

І сем гадоў таму назад
прыходзіў я сюды.
Паблізу быў маленькі сад.
Цяпер вакол — сады.

Тады мне восем год было,
цяпер — пятнаццаць мне.
Тады глядзеў з гары ў аблонь —
расінкай мо мільгне?

Аблонь, аблонь! Дзе ж ніва, дзе ж,
якую дзед араў?
Мо гэта ты, ды йнакш цвіцеш?
А Шылава Гара? —

Як і раней — прытулак хвой.
Гляджу з яе ў спазор
палёў. Мігцяць перада мной
яны мільёнам зор.

А зорка кожная — твой плод,
што нівы і сады
спляць. Міне яшчэ сем год —
ізноў прыйду сюды.

Усе агеньчыкі ўсіх зор
у верш, свой верш збяру.
Праз найчароўнейшы узор
услаўлю дзён зару.

1937

* * *

Малітвы небу на паперы
я запішу, аддам пяру
імкненняў пал, а ў неба дзверы
усё ж ніяк не адапру.

Шкада, — чуў я, — а там без меры
красы — дабра ўсяму дабру…
Найбольш за ўсё я ў тое веру,
чаго рукамі не бяру.

1937

* * *

— Дзяўчынка! Хіба я іначай
кахаю? Паслухай мяне:
пяшчота не дружыць з распачай… —
А ты у адказ:
— Ды не!
Не гэта цікава…
Такой нам
размовы не трэ… Таракан
ты йшчэ… А такі неспакойны
і волю даеш рукам.

— Дзяўчынка!
Парыў мой узнёслы!
Кахаю вось так!..
— Без прыгод! —
— Вось гэтак! Вось так!
Я дарослы,
мне сяння — пятнаццаць год!

01.05.1937, Койданава

* * *

Ці ж не новае шчасце мне знічыць?..
Ледзь здалёку махнеш мне рукой:
нешта, нешта у сэрцы крынічыць,
нешта ў грудзі ліецца ракой.

Усхвалёванасць рухаў і цела,
б'ецца ў жылах гарачы струмень…
Гэта толькі трава шапацела,
гэта толькі ўсміхаўся мне дзень.

1937

* * *

Пачакай, пабудзь са мной часінку.
Дома — добра нам. А на двары

цёмна ўжо. Настрашыць ноч дзяўчынку.
Аб адыйсці нат не гавары.

Выйдзеш ты на досвітку на ганак —
зацвіце зарою небакрай.
Сонца ўстане — усміхнецца ранак.
Пачакай, пабудзь, не пакідай.

1937

ТЫ

І лясы, і лугі, і блакітныя нівы,
неба — вечная сінь, дол — зяленіва шоўк.
Гэта — Ты. І чаму я з Табой нешчаслівы?
І чаму я жыцця без Цябе не знайшоў?

За любоў да Цябе я пакутаваць мушу,
а ў разлуцы з Табой — існаваць, а не жыць,
і за слова свае дзесь у негадзь, ці ў сушу,
як за слова Твае — галавой налажыць…

І ў глыбінях душы нараджаецца сіла,
гнеў — той сіле імя, і прарочыць яна:
за любоў да Цябе — непакорнаму — крылы,
за разлуку з Табой — вінавайцу — труна.

Непакорнаму — Ты і блакітныя гоні,
вінавайцу з труны — галавы не ўздымаць.
На шырокіх шляхох старадаўнай Пагоні
парыванняў Тваіх «не разбіць, не стрымаць!»

1937–1942

РАДЗІМА

Пакідаю я сталіцу,
горад хмуры пакідаю,
ад’язджаю у раздолле
хлебных ніваў і палёў.
Добрай раніцы, гушчары,
хмызнякі лясоў дрымотных,
луг і ты, Вуса-рака!

Добры дзень, палёў абшары,
добры дзень, браты і сёстры,
вёска Крысава мая!

Тут на белы свет з'явіўся,
тут я першы раз паветра
удыхнуў, і першых крокаў
моц я толькі тут адчуў.
І цяпер, цяпер заўсёды
я адвітваю увесну,
я адведваю улетку,
я аглядваю увосень,
я наведваю узімку
вёску Крысава сваю.

І увесну, і улетку
я найлепшы сябра сонцу,
я камрат звяром і птушкам,
брат бліжэйшы чалавеку
і прыроды верны сын.
І увосень, і узімку
я прыроды верны сын!
Я увесну бласлаўляю
маладыя збожжа ўсходы,
іх вітаю ўлетку я!
Я увосень бласлаўляю
плён багаты рупнай працы,
хлеб штодзённы і спажытак.
Іх вітаю ўзімку я!

Не хацеў бы жыць ніколі
у пясках сухіх пустыняў.
У марозных снежных стэпах,
зледзянелых і бязлюдных,
жыць ніколі не хачу.
У пясках сухіх пустыняў
я загіну ад спякоты,
у марозных снежных стэпах,
зледзянелых і бязлюдных,
я ад холаду памру.

Не было й няма нічога
шчаслівейшага радзімы,
раскашнейшага радзімы,
прыгажэйшага радзімы —
не было й няма нідзе.
Хай жыве мая радзіма!
Багацей, палі і нівы,
і паўней, засекі й свірны!
Шчаслівей, браты і сёстры,
вёска Крысава мая!

1938

ВУСА

Хотя я судьбой на заре моих дней...

М. Лермантаў

Вуса… Успамінаў здавольны усміх…
Далёка, далёка цяпер ад мяне
хаваеш спакой мой глыбока на дне.
Успомню, — заўсёды у думках маіх
твой вобраз мільгне.

Далёка, далёка… А ўся — прада мной:
між траваў зялёных ільсніцца раса,
між водаў блакітных зіяе краса.
Успомню — і сэрца гамоніць вясной
з табою, Вуса!

1938

* * *

Такі лагодны, як тая ласвіца,
твой поціск рук.
Душа галубкай з кунегай ласціцца
пад сэрца стук.

Салодыч думкаў так міла песціцца
з табой адной.
Уся пяшчотнасць у сэрцы змесціцца —
пабудзь са мной!

1938

* * *

Змоўклі вясёлыя песні застольныя,
сціхлі за імі звончыкі-бомы…
— Вам не пара яшчэ, дзеткі свавольныя,
вам шчэ далёка край невядомы!

Свет не зачынены любаму з любкаю,
любаму — хата, любцы — падушкі.
Разам у доміку — голуб з галубкаю…
Мы йшчэ далёка — нават не птушкі.

1938

* * *

Узыдзе ранак срэбны на лугі,
каберцы іхныя аздобіўшы ў мярэжы.
У росах заіскрацца мурагі,
на грудзі поўныя дыхне абшар бязмежны.

Пачую я: зязюля за ракой
куваць пачне ў бары. І дзяцел будзе стукаць.
Разбудзяць ціхі ранішні спакой
птушыных галасоў прыветлівыя гукі.

Ля нізкіх і зялёных берагоў
крыніца жвавая ключом жывым зазвоніць.
Грамаду хмар — пажоўклых мурагоў —
на небе буйныя узвей-вятры разгоняць.

І сонца яснае з высі тады
палье агністы сок цурком, нібы праз сіта;
нап'юцца соку гэтага сады,
памочыць вус у ім задумны колас жыта.

Туды, дзе поле шэпча збажыной,
дзе рэчкі хуткая вада цячэ, бруіцца,
іду, спатканы ранішняй красой,
халоднае вады з крыніцы каб напіцца.

То скарб я п'ю дабродзейкі-зямлі,
дзе нівы і сады, і рэкі — ўсё жывое…
Мае тут прадзеды й бацькі жылі,
мне ўсё тут блізкае, усё тут дарагое!

1938–1941

* * *

Я цябе палюбіў усім сэрцам адразу
за тваю прыгажосць і за ўсмешку вачэй…
Памятаеш, заўжды размаўлялі мы разам
пра ўсё тое, што сэрцу было даражэй.

Быў шчаслівы заўсёды тады я з табою,
чуў удары, здавалася, сэрца твайго.
Размаўлялі ўвесь час пра свой лёс мы абое —
палымнеў у грудзях нашых цёплы агонь.

Палымнеў… Не было на душы маёй суму…
Нашы словы тады не пайшлі ў небыццё.
Не прапалі нідзе тыя светлыя думы —
ў нашай хаце цяпер гаспадарыць жыццё.

Знаю я: прынясеш ты дзіцё хутка ў хату,
ці дзяўчынку, ці хлопчыка — мне ўсё адно,
бо упэўнены я, што жыцьць будзе багата
і заўжды ў нас дагледжаным будзе яно.

Буду рады бязмежна свайму я дзіцяці,
і не прыйдзецца мне так яго папракаць,
як калісьці мой дзед папракаў маю маці,
бо ён волі не меў, каб яе ўзгадаваць.

Увесь час яго мучыла гора ліхое,
ён не мог пракарміць ні сябе, ні дзяцей…
Мы інакш жывем… І шчаслівай парою
хай вялікім і дужым дзіцё ў нас расце!

1939

* * *

Сумнаю згадкаю
сталася ты.
Дзіўнай загадкаю
шэпчуць кусты.

Квола і нехаця
звоняць ліствой…
Не, у тым шэпаце
голас не твой.

Звяне, блукаючы,
восеньскі сум.
Жоўкне, сціхаючы,
змучаны шум.

1939

* * *

*…сцелюць галовы, як снапы, малоцяць цапамі сталёвымі,
на таку жыццё кладуць, веюць душу ад цела.*

«Слова аб палку Ігаравым»

Там, на пякельным таку, дзе цапамі малоцяць галовы,
веюць ад цела душу, поле ўсцілаюць касцьмі,
моцна трымаюць свой сцяг непакорныя ўнукі Ўсяслава,
падае збіты адзін — іншы змяняе яго.

Думаеш, воража, змыць непахісную славу крывёю?
Высям бязмежным раўню ейнай крывёй замуціць?
Колькі жыццё ні тапчы — не ўзнясешся да ясных сузор'яў,
колькі ўгару ні сягай — высяў табе не таптаць.

1939

* * *

Выйдзі, паслухай — гучаць галаслівыя медныя трубы:
з цемры былога выходзь наперад да яснага сонца!
Б'юць барабаны, грымяць цуды пад небам высокім:

радуйся, песні спявай — не ўваскроснуць былога аковы.
Прадзедам думна скажы — багаты і самы шчаслівы,
і весялейшы за ўсіх ты чалавек на ўсім свеце.

Я і не слухаю вас, галаслівыя медныя трубы!
Верны самому сабе, у думках раблюся паўдзікім,
зброю з камення чашу — крочу ў часы неаліту,
волі сапраўднае сын, я палюю на хіжага звера,
прышлым стагоддзям кажу: багаты і самы шчаслівы,
і весялейшы за ўсіх я чалавек на ўсім свеце.

1939

ГАЙНА

Ну вось — і нарадзінаў маіх дзень.
Мне дзевятнаццаць споўнілася сяння.
Адзін. Няма сяброў. Альховы сцень
цяпер са мной, і ты са мною, Гайна!

Тваё лугі і водырная тхнець
мурожных траў — вось слодыч частавання.
Успень пітво у берагох, успень,
двaццаты год мо пойдзе на спатканне!

Дзе ж келіхі? Сябры? Суровы лёс
мяне без іх у гэты кут занёс.
Як ён ні кпіцца нада мной нягожа, —

ды ўсё ж ад Гайны адарваць не можа!
І да чароўных ейных берагоў
дзень нарадзінаў я спаткаць прыйшоў.

01.05.1941, Лагойск

* * *

Не, не я тваю сціснуў руку,
і не я развітаўся з табою.
І не ты каля хаты ў садку
мой пагляд замуціла слязою.

Не, не я… Гэта ногі мае
адыходзяць, а сам я — на месцы.
Хай вайна мне дыхнуць не дае —
я пакінуў табе сваё сэрца.

Дык яшчэ раз руку сваю дай,
свой пагляд не журы больш слязою.
Ну, бывай, мая Ніна, бывай!..
Гэта ногі ідуць… сам — з табою…

19.09.1941, Лагойск

* * *

Бывай здароў, знаёмы кут!
Ты стаўся родны мне і блізкі,
хоць, праўда, жыў няшмат я тут,
хоць з нетутэйшае калыскі.

Пад гэткім небам і страхой
мяне матуля калыхала.
Ў краіне сонечнай маёй
такіх мясцінаў ёсць нямала.

Таму й шчыміць душа мая,
таму і цяжка развітацца…
У час, калі гарыць зямля,
надзеяў мала зноў спаткацца.

20.09.1941, Лагойск

БУКЕТ

У раскошы цвіцеў, а ў маркоце завяў,
пахаваўшы пагудку…
Пры ўспамінах вясны ля ўзварушлівых з'яў
мне балюча без смутку.

І пялёсткаў сухіх, нібы золата дрэў,
не ўтрымаў ён у жмутку.
А за ім на душы мой агонь дагарэў —
не пакіну я смутку!

1941

* * *

Чорны крук закракаў на ўсё горла,
звонкаспеўных птахаў пошчак змоўк.
Шэры конь з віхрастай цёмнай грывай
па дарозе з тупатам прабег.
Праграмеў падковамі, прагрукаў,
выкрасіў на бруку сноп агню.

Хмара змрочная ўспаўзла на неба,
захамарыўся блакітны дзень.
Пырснулі нажамі свігавіцаў,
неба перакроіўшы, агні.
Купы хмараў з грукатам грымотным
лынулі улеваю на дол.

Разліліся ўспененыя рэкі,
пазатоньвалі лугі, палі;
трэснула зямля, і на аскепкі
пашчапалася над ёю высь.
Ой, з благім насоўваюцца хмары,
не на добрае іх трушчыць гром!

1941

СПІ, МОЙ РОДНЫ

Заміж вянка на няведамую магілу майго бацькі,
які загінуў на далёкай Поўначы ў ссылцы.

Дрэвы лісце да сонейка туляць,
хмелем сцелецца подых вясны.
Як шкада, дарагі мой татуля,
што не бачыш ты гэтай вясны.

Паглядзець бы было так цікава
на палеткі, лясы, на лугі,
люба сэрцам адчуць было б славу,
што не згінуў наш край дарагі.

Што знайшоў ён сабе пуцявіну,
не заблытаўся ў цемры начы,

што цяпер ён імкліва, няспынна,
смела крочыць у шлях-далячынь.

Паглядзеў бы, як сонца праменіць,
як прывабна цяперака ў нас.
Гэта ж Краю прыйшло Прабуджэнне,
гэта ж першая наша вясна!

Ды ніколі не ўбачу цябе я…
О, няхай ім маё пракляццё —
Маскалі, чужнікі-ліхадзеі
загубілі тваё жыццё.

На чужынскіх прасторах ты мусіў
без пары даканаць… дагарэць…
Па старонцы сваёй Беларусі
неразвейную думаньку грэць…

Спі, мой родны, на дальнай чужыне,
пасля здзекаў і крыўдаў спачынь.
На тваёй занядбанай айчыне
не зазнае больш гора твой сын.

10.06.1942

МАЦІ СЫНА ЧАКАЕ З ВАЙНЫ

Маці сына чакае з вайны
у пакрыўленай хатцы-вязніцы.
Без сыночка ёй доўгія дні,
прыйдзе ночка — матулі не спіцца.

Ўецца думак дакучлівы рой,
без пары галава пасівела.
«Сынку родны, саколік ты мой,
што за доля цябе там сустрэла?

Быццам колас забыты, адна
век старэчы я ўжо дажываю.
Людзі сеюць (настала вясна).
Ну, а я — балазе, што жывая…

Хто мне вестку пра сына падасць?
Мо хіба толькі пушча ці зоры?
Я пыталася ў іх, ды ці раз,
толькі мне яны штось не гавораць…

Ты прыйдзі, дарагі мой сынок,
паглядзі, як мне цяжка жывецца.
Не надоўга — то хоць на дзянёк,
мо суцішыцца боль майго сэрца».

Безнадзейна, матуля, яго
клічаш ты на дзянёк хоць у госці:
ты не вернеш сыночка свайго,
як не вернеш свае маладосці.

На прасторах далёкіх, чужых,
пад зялёнай пахілай ракітай,
на траве нежывы ён ляжыць
там, палаткай паходнай накрыты.

А як смерці вянок над ім звіс,
і ў жыцці не было больш патрэбы —
раз астатні зірнуў ён увысь,
у бяздонне блакітнага неба.

Зіхацела чырвоным агнём
брыльянціста-ружовае сонца.
Гэтак некалі сонечным днём
зіхацела на роднай старонцы.

І прыпомніў, бядак, Беларусь,
дарагія палі, сенажаці,
травяністы луговы абрус…
І прыпомніў гаротную маці…

Дык не кліч жа, матуля, яго,
да цябе ён не прыйдзе у госці:
ты не вернеш сыночка свайго,
як не вернеш свае маладосці…

12.06.1942

У МРОЯХ

Іду сцяжынкаю, дрымотаю спавіты,
праз нівы хлебныя да коней на папар.
Навокал дрэмле ўсё. Ноч. Спеючае жыта
мне сытым коласам пяшчотна шчыпле твар

і ціха «шу-шу-шу» — калоссямі шапоча.
Палоніць шыр усю нясціхны шэлест-шум.
Хіба ільга ўлавіць шумценне летняй ночы?
Хіба мага не ўчуць узрушанасці дум?

А неба чырваняй, бы зарывам, жаўрыцца.
Што гэта? Ранняя зара?.. А мо пажар?
Суседніх ніваў сціш трывожыць навальніца?
…Вы, коні, блізка ўжо, і блізка ты, папар.

Свайго спабытніка прымай, начлег!.. Хрумстанне.
Агонь. Сябры мае. Звон путаў, ланцугоў.
Эх, ноч ліпнёвая і конскае іржанне,
эх, песні звонкія мае, маіх сяброў!

11.07.1942, Ілля

ЛІДСКАЕ ЗАМЧЫШЧА

З часоў славутых даўнае пары,
як успамін магуты Гедыміна,
як сведка гучных дзён мае краіны,
стаяць узнёсла замчышча муры.

Грудзьмі ў баёх адстойваючы чынна
зямлі свае і гонар і дары,
касцьмі не раз ляглі за лёс айчыны
тут продкі нашыя — асілкі-змагары.

Не змыла славы іхнай плынь гадоў!
Мы, праўнукі, — надзейная апора
нязгасных спраў вялікіх змагароў.

Нам іхны шлях навекі будзе дораг.
Хай памятае ўсякай масці вораг,
што ў нашых жылах — нашых продкаў кроў!

18.09.1942, Ліда

МАЛАДЗЕЧНА

Я заўсёды знаёмых сустрэчных
у дарозе ад сэрца вітаў.
А чаму так цябе, Маладзечна,
з колкім болем, з маркотай спаткаў?

Ты няветлае. Хмурае скрухі
чорны след на паглядзе тваім.
Як пацiснеш сустрэчнаму рукі,
калі ён іх не мае зусім?

Ад сустрэчы душа не сагрэта, —
чую болесць я ранаў тваіх.
І не грэе: «Мы знеслі не гэта,
прыйдзе час — дык загоім і іх».

01.09.1942, Маладзечна

ДЗЕЦІ

За тынам — сад.
Бліжэй — бярозкі, —
жывы ўспамін пра Беларусь.
Дзяўчынка й хлопчык каля хаты
на лаўцы вулкавай сядзяць.
— Чакай! —
чуваць дзяўчынкі голас
і голас хлопчыка:
— Не руш!
Спыніўся я…
Міэра ела, —
а мова родная чутна!
Усхваляваны, падыходжу:
— Здарова, дзеткі!
— Добры дзень! —
Бярозак жвавых шум над імі
нібы пацвердзіў праўду слоў. —
— А дзе татуня ваш і мама?

— Пайшлі на працу. Дома — мы.
— А што тут робіце?
— Нічога.
— Сказаў нам тата дома быць.
— Хто ж тата ваш? Латыш? Расеец?
— Не, наш татуня беларус!
...Ласкава зорыць сонца з неба,
галоўкі лашчачы дзяцей.
— А вы чые і хто такія?
— Я ні... ні... — мы — беларусы.

06.10.1942, Дзвінск

БЕЛАРУСІ

Тут нядаўна йшчэ гора шалела,
тут нядаўна йшчэ зналі прымус...
За цябе маё сэрца балела,
дарагая мая Беларусь.

Нам жыццё было цяжкім прыгонам,
і канца не было той бядзе.
Чуў Свяцейшы з высокага трону
горкі плач і літанні людзей.

Па шырокіх прасторах раздольных
беларускіх лугоў і палёў
гаравалі грамады бяздольных
паднявольных калгасных рабоў.

Час мінуў той. Цяпер будзе йначай.
Досыць крыўды нясці на гарбе!
Я цяпер не такую прадбачу,
дарагая Радзіма, Цябе.

Веру: нашы палеткі расквеціць
залаты ураджай каласся,
і пяшчотнае сонца засвеціць
на руінах старога жыцця.

1942

ПАД ШЭЛЕСТЫ ЛІСЦЯ

Пад шэлесты лісця, пад ліпавы шум
прылёг я спачынуць душою.
Віхрацца, нітуюцца прывіды дум,
і сэрца не знае спакою.

Лятуць мае думкі ў бязмежную даль,
бы хвалямі гнаныя чоўны.
То ў сэрца закрадзецца кволая жаль,
то крыўдаю злосць яго пройме.

Здаецца, ляцеў бы магутным арлом,
каб толькі арліныя крылы,
імкнуўся б, маячыў туды напралом,
дзе жыцці кладуцца ў магілы.

Я кінуў бы гнеўны праўдзівы свой кліч
пакрыўджаным злыднямі людзям:
«Даволі прад ворагам гнуцца нам ніц,
змагацца за іх больш не будзем!»

Ды сілаў няма, каб узняцца увысь,
і голас мой там не пачуюць…
Ліецца на долы крывавая слізь,
і вораны смерць там вяшчуюць.

У бой выступае нагальнікаў тлум,
адплату прыносіць крывёю.
Пад шэлесты лісця, пад ліпавы шум
не ведае сэрца спакою.

1942

ЗА СЛАВУ РАДЗІМЫ

Да арганізацыі Беларускага корпуса самаахoвы

Наш край рабавалі разбойнікі-каты,
душылі, таптали чужацкай пятой,
прабіла часіна рашучай расплаты, —
браты-крывічане, ўставайце на бой!

Даволі цярпелі бяду, ліхалецце,
даволі рабунку і крыўды зняслі.
Ніхто такой долі не зведаў у свеце,
як мы, беларусы, на собскай зямлі.
На бойні нас гналі, у турмы саджалі,
загоны скрозь нашай паліты крывёй.
За кроў мы адплацім вам смерцяй, шакалы!
Браты-крывічане, ўставайце на бой!
За светлае заўтра, за шчасце для дзетак,
ўставайце сцяною усе, як адзін,
ад водаў Дзвіны да ўкраінскіх палеткаў,
ад Віленскай брамы да Бранскіх мясцін.
Нас дваццаць мільёнаў! Сябе не дадзім мы
у крыўду навале бандыцкай ліхой.
За прадзедаў славу, за славу Радзімы,
браты-крывічане, ўставайце на бой!
Сягоння краіна нас кліча да зброі,
да новых нябачаных шчэ перамог,
каб права святога, здабытага боем,
ніхто адабраць нам ніколі не змог!
Вясенняе, яснае сонца сягоння
шугае-палае над нашай зямлёй.
Пад сцягам імклівай крывіцкай Пагоні,
браты-крывічане, уперад на бой!

1942

КІНЬ СВАВОЛІЦЬ ПАД ВОКНАМІ, ВЕЦЕР…

Прысвячаю роднаму брату

Ноч развесіла сінія шаты,
свежы водар прынесла ў пакой.
Ходзіць вецер на цыпках ля хаты,
зрэдку стукне у шыбы рукой.
Што сваволіш пад вокнамі, вецер?
Хіба вестку з сабою прынёс?

Можа, ты, як бывалы па свеце,
брата роднага ведаеш лёс?
Супыніся, крылаты, скажы мне,
я паслухаць цябе буду рад…
Доля брата палямі чужымі
недзе блудзіць пад стогны гармат.
Можа, блудзіць, а можа, навекі
у пасцелю злягла супачыць.
Можа, ён, зачыніўшы павекі,
пад сасонкай сны доўгія сніць.
Дык ляці ты тады на магілу,
смутак-жальбу маю перадай…
Каб зірнуў ты хоць раз, братка мілы,
хоць разок на адроджаны край!
На пажарах, руінах крывавых
кветку шчасця Радзіма знайшла.
За каго ты змагаўся — без славы
тых сырая зямля прыняла.
Да жыцця іх ніхто ўжо не верне,
ім — на карку людскім не сядзець…
Беларускае важкае зерне
каласіцца, аж люба глядзець!

1942

НЕ ПАКІНУ

Цяжка тут без цябе на чужыне,
о, Матуля, старонка мая!
Як дзіця, я цябе не пакіну,
на цябе не забудуся я.

Панясуся птушыным узлётам
на кілімы зямлі дарагой.
Не, нідзе няма лепшых пяшчотаў
за тваю пад радзімай страхой!

1942

* * *

Мяне не ўспамінаеш — сяння я далёкі.
У вас, у інстытутах, — шмат сяброў.
Але ці адчуваеш — не адны ж «урокі»! —
Няцечкі нашай смутак, жаль дуброў?

Ільды сплылі з Няцечкі. Шумныя дубровы —
пад новаю намёткай... Шлюць прывет...
Альтанка і парэчкі... Бэзу цвет ліловы.
Пад ім расце блакіткай твой жа след.

1942

* * *

У хату поўнач плыве ракой,
глядзіцца месяц у мой пакой.
Ля ганку ходзяць, паўзуць у сені,
нібыта здані, даўгія сцені.

Мая галубка, шчаслівы час!
Яны ні трошкі не страшаць нас.
З твае хусцінкі зрабіць фіранку —
і месяц пойдзе вітаць заранку.

1942

* * *

Шляхі маладосці! Без суму
пястуйце узлётную думу,
выходзьце з пяскоў Кара-Куму,
жыцця не прадаўшы мане.
Мае непаўторныя вёсны
і позірк да высяў зайздросны,
і ранак сярэбрана-росны,
нідзе не мінайце мяне!

А той пацалунак салодкі.
Час доўгай сустрэчы — кароткі,

мураваў той шолах дрыготкі —
на іх не забыцца ані.
Імкліва хадой неляною
ідзеце заўсёды са мною,
цвіцеце нязвяннай вясною,
мае непаўторныя дні!

1942

* * *

Мне і ў цемру не забыцца
светлых сноў.
Прада мною ты як быццам
зноў.

Гляну ўвысь, а ейны прозірк —
сінявой.
І здаецца зоркай позірк
твой.

Ў небе месяц, я на доле —
як браты.
Наша ўсё, усё раздолле —
ты.

1942

РАДАСЦЬ ЖЫЦЦЯ

Беларусь, дарагая краіна,
цябе сяння ніяк не пазнаць...
Навакола руіны, руіны, —
кроў і боль незагоеных ран.

Гэта сведкі навалы вялікай,
што табой валадарна прайшла,
што ўсе жахі мінуўшчыны дзікай
спапяліла дашчэнту, змяла.

Жахі тыя не прыйдуць ніколі!
Перажытаму — ганьба, праклён!

Беларус ад мінулай няволі
шлях прастуе да сонечных дзён.

Прыйдзе час — і загояцца раны,
зажыве, што балела не раз…
Я выходжу, днём новым спатканы,
прывітаць гэты радасны час.

Бачу — ў кожным знясіленым кроку
разняволеных нашых людзей,
у застыглым пакутаю зроку
абуджаецца сонечны дзень.

Знаю я: па лясох, па балотах
бой няўпынны праходзіць наўсцяж;
у агні, у крыві, у грымотах
нараджаецца радасць жыцця.

1942

ЛЁС ПАЭТА

Эх, ну й жыццё… Ну й мітусня…
А найгорш за ўсё — паэту.
Не будзе ж вершы ён мяняць
на хлеб, а рыфмы — на катлеты.

Той — на Суражскі прэ грыбы,
той — цягне порткі, той — камашы.
Глядзіш, цяляціны здабыў,
мукі… ну, вось табе і паша.

А як паэт не спекулянт
і на «сядзенні» мае латы, —
дык і сышоў зусім «на кант»,
куды ні пойдзе — страшаць матам.

У Самапомач прывяло
яго няшчасце — па абеды…
Ну, й не дастаў, бо як на злосць
расейскай мовы ён не ведаў.

Зайшоў у краму — не даюць,
каб ім паскручвала галовы,

сто грамаў хлеба ў дзень жуюць
адны работнікі ўстановы!

Ў тэатр панёс бяду сваю
паэт (вядома, без білета).
Ой, нешта ж тонка й там пяюць
ад бэнээсаўскіх паштэтаў.

Відаць, ад вельмі мяккіх страў
(накшталт штодзённае заціркі)
актор не вымаўляе «ра»,
а «ря» і «ре» упёрся тыркаць…

А мо… Ды што зашмат хацець
ад іх, актораў… Усюды гэтак…
Усюды, кажучы прасцей,
пах дзёгцю верне нос, не кветак.

Але да справы… так паэт
нічога з поўнага карыта
й не сербануў… такі ўжо свет,
дзе ў свеце ёсць паэта сыты?

За што ні ўлепіцца — «цюйга»,
«вон», «кыш»! Знаць, сыць не для паэтаў,
наперад можным забягаць
не палітычна, ведай гэта.

Што ж, вось і піша вершы ён —
жабрак-паэт аб сінім небе
і ноч, і дзень — ды марны плён,
ці ж гэткіх вершаў сяння трэба?

Калі ж газетка й прыме верш —
за ганарар паэт наш купіць
адну цыбулю, бульбы дзве
ці у сталоўцы лыжку супу.

Ўсяго на ўсё… і па бядзе!
А колькі крытыкі! Глядзеце!
Так, людскі суд — Энкавэдэ,
бадай, найгоршае на свеце.

— Мест працаваць, чаму ён шыр
нябёс вясёлкай апаясаў?
Навошта зораў накрышыў
мест крышаноў якога мяса?

Чаму ў яго сінее даль,
калі папраўдзе даль сівая?
Нашто ў верш пылу ён паддаў,
калі яго і ў месце маем?

Чаму «бляюць» яго званы?
А восень «грыпай захварэла»?
Ці ж ён здурнеў аб вёснах ныць,
калі на свеце гэткі рэйвах?!

Такі прысуд слана ці льва,
здаецца, збіў бы з панталыку,
а пра паэта — што й спяваць…
Шалей, крычы — ўсё робіш крыкам…

А колькі б сіні ні ляпіў
ты ў верш, і золата ні пэцкаў —
дарэмна, брат, не замуціш
жыцця ні ў Менску, ні у Клецку.

Не, трэ паэтам уцякаць
з зямлі няўдзячнай і крыклівай.
Паэтам — вольны Млечны Шлях…
Дык, гэй! гараць Космасу нівы!

Ляцець ці не? Шкада людзей
сваіх, хоць ты — чужы ім, ясна…
Эх, паляту, мо стрэну дзе
замест хлусні і сваркаў — шчасце?

Так, страсянуўшы пыл зямны
з гумовых стоптаных падмёткаў —
паэт ад крыўды і маны
ў эфір нырца дасць срэбнай плоткай.

Ніхто не будзе пераймаць…
На моцы сілы цэнтрабежнай
ён куляй трапіць нат не ў Марс,
а у Галактыкі бязмежжы.

Мо Вега ці Альдэбаран
прыгорнуць горкага паэту.
І ўвойдзе ён (даўно пара)
ў сістэму стройную сусветаў.

Там наш паэт забудзе, гад,
баі з-за месцаў і аб'едкаў…
І ўжо не вернецца назад,
нат не падсудным, толькі сведкам!

1942

ВОСЕНЬ

Каля хаты мае дрэвы летнія ўборы асыпалі
і заслалі аранжава-мосяжнай коўдраю двор.
За маўклівым сялом, за панурымі сёстрамі-ліпамі —
з поля звезена ўсё — у сарочцы калючай прастор.

Восень там гаспадарыць, ідзе па зямлі валадаркаю;
ёй належыць усё: поле, поплаў, рака, сенажаць;
ёй належыць нат сонца — зацьміць іншы раз яго хмаркаю
і заплача, пачне кроплі спорныя слёз асыпаць…

Я гляджу за акно: панадворкі там жоўта-барвовыя,
ходзіць вецер па іх; дрэвы хіляцца з боку на бок;
і заўважыў: шчэ дань засталася адна выпадковая, —
на галінцы кляновай дрыжыць сірацінка-лісток.

З хаты выйшаў на двор. Асцярожна рукою дрыжачаю
абрываю лісток, прыкладаю да твару яго:
ўсёй істотай адчуў адышоўшае лета гарачае,
бураў грукаты, трэск перуноў і спякотаў агонь.

Што ж, нічога! Міне й гэта восень і зімка з марозамі,
прыйдзе час — дрэвы хмурыя лісцем ізноў зашасцяць…
Перабудзем, знясём і нядобрае, й злое, і грознае,
прычакаем вясны, неўнікнёнай сяброўкі жыцця.

Верасень 1942, Ілля

НАШ ВУЧОНЫ

Ці зналі вы дзядзьку Івана,
Што ў мірны час крамку трымаў
І гандлем займаўся аддана?
А я дык даўно яго знаў.

Вайна яго надта змяніла,
Упрэгла ў аматарскі гуж.
На плечы пінжак узлажыла,
На голаў — рандэль-капялюш.

Ён з намі ў асобнай кватэры
У доме адным пражываў.
Спачатку ён быў інжынерам,
А потым і доктарам стаў.

На гэтым ён носа не звесіў,
Навукай захоплены быў.
Глядзім мы — ужо ён прафесар,
аж трэцяе званне здабыў.

І наш удалец адмысловы,
Каб часу не траціць дарма,
Выдумваць стаў новыя словы,
Якіх і ў гаворцы няма.

Замест галавы — дык «думніца»,
І «свінчык» — замест парася,
Заместа адозвы — «гукніца»,
«шыйдзюбы» — заместа гуся.

Не страўня — а «емельня», «ежня»…
Было шмат чаго і мудрэй.
Стаўклася з тых словаў яешня
На дзіва, на смех для людзей.

Віншуем з удачай! Мы можам
Параіць шчэ лепш паглядзець
«Вучонаму» ў месцах нягожых —
Там можна й мудрэйшае стрэць.

Мы выганім гэткіх «вучоных»,
Няхай нам не муцяць вады.
Так мову ўратуем законна,
Якой размаўлялі дзяды.

Верасень 1942

З ВАМІ

Кажуць, што можна жыццё перакроіць,
Мне ж не ўдаецца — жыву я ў чужых.
О, дарагая зямля! Хоць у мроях
вырвуся я да цябе, да сваіх.

Нат птушанятка малое начамі
мкнецца пад крылцы матулі свае…
Хай сабе мроі. Затое ў іх з вамі,
з вамі, сябры дарагія мае!

Снежань 1942, Рыга

ПАРОША

Насустрач прышласці сваёй
іду пад светлых мрояў ношай.
Шырока шлях разлёгся мой…
А сяння выпала пароша!

Пуховай пільсцяй мяккі снег
прысыпаў безліч ранаў шчымных.
На свет, пазбаўлены сунег,
зірну сапраўднымі вачыма.

10.12.1942

КАЛЯДЫ

Зіма. Мароз. Пагодны дзень.
А снег, як зорны шчыт, іскрыцца.
Прыгрэла сонца кагадзе, —
не хоча Дзед Мароз скарыцца.

А дзеці дружнаю гурбой
прастуюць з лесу цераз ляды
і елку цягнуць за сабой…
Успомніў я — ідуць Каляды!

11.12.1942

МНЕ ПОМНІЦЦА СТУДЗЕНЬСКІ ВЕЧАР

Мне помніцца студзеньскі вечар,
што ладзілі сябры мае,
і першая наша сустрэча,
і жвавыя вочы твае.

Я стрэў іхны позірк адразу,
як казку, як ваблівы сон;
хацелася з імі быць разам
шмат радасных ночаў і дзён.

Так блізка і гэтак далёка
Была ты.
Адвагі не меў,
а глянуць глыбока-глыбока
я ў самыя вочы хацеў.

Бы сон, адляцелі дні тыя,
а з імі — і радасць, і сум.
Былога ўспаміны жывыя
у сэрцы сваім я нясу.

Нясу… хоць за тысячы гоняў
ад бацькаўскіх гоняў цяпер.
Штадня — ў адзіноцтва палоне,
мне сумна тут, Ніна, павер.

А ты… там цяпер, дзе прыгожасць
прастораў ля Гайны-ракі;
згадаю — мне сэрца трывожыш,
віеш успамінаў вянкі…

І сяння спаткаў я дзяўчыну
у гэтай чужой старане,
хацелася крыкнуць ёй: Ніна!
Ды потым стрымаў сябе… — не!

А вельмі падобная… тая
хада, тыя рухі, той склад…
Стан стройны… усмешка такая,
і гэткі ж блакітны пагляд.

Адкуль яна? Можа, часамі
з мае незабытнай зямлі?
Кудой і якімі шляхамі
папала сюды і калі?

А я на дзяўчыну нясмела
зірнуў з неўтрыманай журбой…
І сэрца маё зашчымела
тугой па радзіме сваёй;

па нівах — прыгожых кілімах,
па ўзгорках, крыніцах, ляскох;
тугой па дзяўчыне любімай,
па ейных блакітных вачох.

Ах вочы, блакітныя вочы,
з якой вы такой стараны?
Чаму вы ў спакойныя ночы
мае непакоіце сны?

11.12.1942, Рыга

З НОВЫМ ГОДАМ!

З Новым годам, браты-крывічане!
З Новым годам, Радзіма мая!
На адвечных руінах паўстане
наша дружба і наша сям'я.

Новы год сустракае сягоння
селянін у хаціне сваёй,

што стагнаў на ўласным загоне
пад маскоўскай і панскай пятой.

Гляньце — ходзяць па свеце калекі,
і нямала няшчасных сірот…
Мы цярпелі і голад і здзекі —
усё вынес наш слаўны народ!

Брацця й сёстры! Часіна цяжкая,
але кіньма, даволі тужыць!
Смела ўперад — нас шчасце спаткае,
і мы будзем свабоднымі жыць.

Вецер зімні, парой навагоднай
ты над светам штандарам развей
песню волі і дружбы народнай
на улонні крывавых падзей.

1942

СНЯГІ

Не пухам лебедзяў абсыпаны лагчыны,
зямля схавалася пад белаю аўчынай,
мадзее воддаль гай адзін нагі…
Сувоі сыпкія, глыбокія снягі.
Няхай сабе… А я іх перакрочу
і з шляху праўднага нідзе, нідзе не збочу!

01.02.1943

ДАРОГАЙ ШЧАСЦЯ

Я растрасу ўсю кайстру горкіх дум,
ў слаце, у негадзі раскідаю, развею,
на шчупні вострыя натну прашэрхлы сум,
засыплю снежнай пільсцяю завеяў.

Расхрыстаю і сэрца, і душу —
зямлі бальзам праз грудзі хай бруіцца.
Пад зораў музыку, крыніцаў шум
у целе знікне хвор — красе-жыццю скарыцца.

З агнём у сэрцы, з сонцам у вачох
знайду свой тор, здалеўшы ўсе напасці.
Хоць шмат наперадзе заказаных дарог —
лепш рушу той, што выведзе да шчасця.

08.02.1943

* * *

Ноч топіцца ў снягох, і ветравей скуголіць,
карозіцца мароз дзябёлы пад акном;
зіме скарыліся палі — а дрэўных голляў
не ўдасца ёй заслаць аснежаным радном.
А нас, жывых — не адалець ніколі!
Стаю ля ганку я. Пад зорным шчытам — дом.
Я цемлюся ўгару, хоць вецер коле вочы,
шукаю зоркі той, што шчаснасць нам прарочыць.

12.02.1943

* * *

Што там, наперадзе, іскрыцца? Зыркі зніч?

Прастую да яго праз цемру зімняй ночы;
кастрыца снежная мяне засыпаць хоча, —
дарма! Я йду далей. Наперадзе — агні:
мо доля лепшая мая і сонца дні?

Люты 1943

ТРЫЯЛЕТ

Ты мне за ўсё найдаражэй,
о, край садоў, палотнаў белых!
Ты макаў цвет, клёк ніваў спелых,
ты мне за ўсё найдаражэй.
Нішто раслінам не бліжэй
вясны й пітва крыніц брынелых, —
ты мне за ўсё найдаражэй,
о, край садоў, палотнаў белых!

17.02.1943

ЛІСТ ДА КРЫТЫКА

Мой крытык каханы! Хацелася б мне
пагутарыць проста і шчыра,
хацелася б выказаць тое, што мкне
ад думак, сябруюць што з лірай.

Здзівіліся Вы, што бязвусы юнак
Пегаса пакрыўдзіў, палаяў,
ягоныя крыллі забраў… і — дзівак,
з ракой нежывой размаўляе!

Дзе ўгледзеў ён горы? І кручы стрэў дзе?
Тут роўнядзь, а ён — перашкоды…
Няўжо й сапраўды у юнацтве людзей
бывае шмат гэткіх заўсёды?

Няпраўда! Мне чэрствае сэрца — гара,
душа спарахнелая — круча,
я собскай асадкай, жыгалам пяра
ім боль учыняцьму пякучы.

Ці ведама Вам, што паэты рука
з радкоў вытыкае узоры?
Са мной размаўляе не толькі рака,
не толькі спяваюць мне зоры.

Мяне разумее нат камень сівы,
а я — ўсе ягоныя казкі;
лятаюць у госці ка мне журавы,
мне міла ўсміхаюцца краскі.

Багатае Крыўі матуля-зямля
мяне, чым змагла, надарыла:
дала мне і голас, і ўзлёт салаўя,
дала мне Пегасавы крылы.

Я з імі асілю завей снегавы
і буду днём веснім сустрэты,
бо я — гэта я, а не слуп верставы,
я вольны Пегас, я — паэта!

17.02.1943

* * *

Зірнула сонца ў маю хату,
як агняцвет, як дар вясны.
На стол заслаўшы з промняў мату,
зірнула сонца ў маю хату.
Хоць аб вясне ў палёх — шчэ сны,
і трызніць шыр пад белай шатай, —
зірнула сонца ў маю хату,
як агняцвет, як дар вясны.

25.02.1943

* * *

Хутка ў мяне ля вакон
ранні барвецьмуць, як ружы,
і пунсавецьме вясна
хутка ў мяне ля вакон.
З кветкамі сонечны кон
свет абагрэе ад сцюжаў…
Стрэне мо ўрэшце й мяне
з кветкамі сонечны кон?

26.02.1943

АФАРЫЗМЫ

Як не дастаць рукою сонца,
так не вярнуць пражыты дзень!

*

Пад цяжкай хмарай дыму й сажы
счарнее навет белы снег.

*

Жывым мы робім нежывое,
падпарадкоўваем сабе
і думку, й розум. А вядзе нас
і нежывы, й нябачны лёс.
Куды вядзе? Чаму? Навошта?
І дзе, і як свой спыніць шлях?

Люты–сакавік 1943

ХРЫСТОСАЎ ЛЁС

Няверцаў здрадай катаваны,
распяты быў Ісус Хрыстос.
Хоць меў няўгойныя Ён раны
і боль нясцерпны — а ўваскрос!
Знёс мукаў шмат мой край каханы, —
сцяў і яго Хрыстосаў лёс:
яму хоць цяжка, хоць балесне,
ён будзе жыць, ён уваскрэсне!

03.03.1943

ПЕРШЫ ГРОМ

Вясна! Вясна! У сінім небе
сівыя воблакі плывуць;
звісаюць пасмы з іх, бы зрэб'е, —
яны нам спорны дождж нясуць.

У лаву лучацца — як вокам
абняць. І вось — гаспадаром
прайшоўся ў хмарах цвёрдым крокам
і грукнуў грозна першы гром.

І лынуў дождж над садам, вёскай,
над лесам, полем, над ракой…
На нашы собскія палоскі
мы заўтра выйдзем талакой.

Зямля тугая задыміцца,
сяўня напоўніцца зярном…
Цябе вітаю, навальніца,
цябе вітаю, першы гром!

04.03.1943

* * *

Сустрэўся зноў з табою ў сне,
сяброўка першага кахання;

лёс разлучыў цябе й мяне, —
сустрэўся зноў з табою ў сне.
Сардэчны жар, агонь спатканняў
шчэ не астыг — праз грудзі мкне:
сустрэўся зноў з табою ў сне,
сяброўка першага кахання.

09.03.1943

ДРАБНІЦЫ

Сонца ўсходзіць пазней і заходзіць раней — ноч даўжэе,
блякне лісце на дрэвах, як воск. Стыне клёк пад карой.
Пройдзе ноч, прыйдзе дзень — і на содні жыццё карацее.
гасне юр, халаднейшаю ў жылах становіцца кроў.

*

Стыглі, як студзень, на кволых галінках халодныя росы;
сонца ўзышло — ажылі і заззялі, як перлы, яны.

*

Вісела, маўчала, забытая ўсімі, бязгучная скрыпка,
ды ўраз зажыла, запяяла, як струнаў крануўся музыка.

Сакавік 1943

* * *

Спяшайся жыць. Хай іншы раз і цяжка,
а радуйся таму, што й гэта ёсць;
на грудзі ўсе ўдыхай жыццёвы водар,
бо шчасце ў нас адно, жыццё адно.
І толькі раз яно ўсім нам даецца, —
і гэта самы найвялікшы скарб!
У содняў толькі дзень адзін бывае,
у год цвіце чаромха толькі раз.
Спяшайся жыць, бо тое, што мінула
ніколі больш не вернецца назад.

17.03.1943

* * *

Зацвіцела вясна навакола,
завіхрылася лісце прысад,
перапеніў чаромхавы солад,
замяцеліўся ў наквецях сад.
Хоць на сэрцы маім — стынь і холад,
стрэць вясну свайго краю я рад:
да сябе яна цягне і кліча,
гоіць болесць вадою крынічнай.

15.04.1943

ВІТАЙ

Вітай
прыход сяўбы чаканае,
з сяўнёю поўнай пераймай!

Зірні:
вясна, табой спатканая,
жаўроніць звонка ў вышыні.

Зямля,
напоўненая зернямі,
закаласіцца спакваля.

Узрэж
свой тор надзеяў цернямі;
пасееш, будзеш жыў — сажнеш.

28.04.1943

РАСЦІ, ЦВІЦІ

Расці,
расці,
жытнёвы дар багаты!
Цвіці,
цвіці,
мой бэз надзей крылатых!

Цвіці,
цвіці
на сэрцы, цвет жыццёвы!
Расці,
расці,
багаты дар жытнёвы!

02.05.1943

РАСА

Раса, раса,
лугоў краса
крыштальная, срабрыстая.
Чый гэта лёс —
каралі слёз,
што так зігцяць маністамі?

Зірні, пабач!
Чый гэта плач?
Мо траваў сокі йскрыстыя?
Не, гэта — боль,
і сум, і золь,
і кроў зямлі агністая.

04.05.1943

МОРА

Улетку хлапчуком бываў я часта ў полі…
У час жніва падыхаць хараством
азалачонае зямным жыццём прыроды, —
найлепшае, найшчаснае багацце.
І бачыў — хвалявалася пад ветрам
зямлі і неба дар — ржаное мора.
З канца ў канец раскочваліся хвалі,
а плыў па іх, як вадаплаў, камбайн,
і хвалі аб яго галовы разбівалі.
Не суджана было ім больш узняцца, —
камбайн глытаў іх… Поле сірацела…

О, мора, мора! Я пабачыў сяння
цябе йшчэ першы раз на ўсім жыцці.
Які узрушаны прастор бязмежны,
няма яму канца, няма і краю!
Бурлівыя, разгневаныя хвалі,
як дальны гром грымяць, равуць, грукочуць,
аблізваюць пясчаны бераг прагна.
Плыве, змагаючыся з імі, вадаплаў.
Ён разразае іх, карном прыціснуць хоча, —
яны ж з ягоных вырываюцца абдымкаў
і ззаду вадаплава не знікаюць…
Як знятай збажыне пад ветрам не гайдацца,
так не спыніць наплыву морскіх хваль!

19.05.1943, Дзынтары, Рыжская затока

НЯЙНАЧАЙ

Сок зямлі п’е трава,
ажываюць лугі,
а як раніца прыйдзе — дык плачуць…

Пазіраю на іх
без самоты й тугі.
Знаць, не ўчуў іхнай болі,
няйначай.

21.05.1943, Вільня

* * *

Усыпана крыжамі ўся аблога.
Тут не адзін, зямлёй прыціснуты, чало
сну вечнаму схіліў. Нямала палягло.
За што? За гэты груд пяску рудога?

02.06.1943, Койданава

МУРАШКІ

Знарок, ці не, але чыясь нага —
йшчэ след не знік — дом іхны разбурыла.
Цярэбіць неадступна троп жыццёвы
шматлічная і рупная сям'я:
будуе ўпарта новае жытло;
у муках працы, ў процьме перашкодаў
ідзе да мэты; дбае пра свой род,
ратуючы з няпомысу яечкі.
Драбнюткія, а ў іх — асілкаў згода!
Зямлі найменшае стварэнне хоча жыць!
Найразумнейшая істота — чалавек —
не можа гэткай згодзе не зайздросціць.

03.06.1943, Дзынтары, Рыжская затока

НА МАГІЛЕ

Памяці роднага брата Уладзіка.
Памёр 30.10.1941 г.

Ці у адной чужой бываў мясціне,
пярэчыў ці адной благой часіне,
заскорблых душ няпрыязнь абмінаў;
хаваў свае пачуцці на чужыне;
цябе, малодшага, заўсёды ўспамінаў;
наведаў родны дом — і не застаў
цябе жывым, няшчасны мой Уладзік.

Нямала час дзён шэрых прагартаў,
нягоды зносіў я, дагоды спатыкаў,
таго ж, што ўжо няма цябе — не знаў.
...Не бачыш ты мяне з зямлі сырой,
не чуеш, што я гутару з табой.
Твая магілка зарасла травой —
і я над ёй з пахілай галавой.

Сагнуўся я, бы ніцы вербалоз,
засеў у горле камень жорсткіх слёз.
Ніяк мне галавы ўгару не ўзняць,
не вырваць з горла каменя, сказаць:
— Калі ж нас доля кіне раскідаць
па свеце, і калі ж, калі прыжджом
часіны ўсім сабрацца ў войчы дом?

04.06.1943

КАБ СКАЗАЛІ…

Узышоў на прастор
шэры мораку сцень.
Дзень за згусткам ягоным
схаваўся.

Каб сказалі мне:
гэткі апошні ўжо дзень, —
я не плакаў бы,
толькі б
смяяўся.

10.06.1943, Менск

ПАЭТ

Хто церпіць больш за ўсіх? Хто зносіць шмат? Хіба, адзін паэт!
Не гэтак лёгка Музы найвялікшы дар яму даецца.
У слова кажнае, у кажны свой радок, што пойдзе ў свет,
ён укладае жар душы, ён укладае часткі сэрца.

І я — хай не паэт, хай толькі той, хто піша так, не ў толк,
Калі ж, ахоплены натхненнем, я бяру асадку ў рукі,
перш, чым пісаць, я адчуваю ўсё, што дзеецца вакол, —
і радасць чэрпаю заўжды да дна, а разам з ёю — мукі.

01.07.1943

ГЕКЗАМЕТРЫ

Цяжка ў хадзе дасягнуць вышнявіны сівога Парнасу:
сцежка — шыпшыннік густы, на сцяблінках — калючыя дзіды.
Лёгка не пішацца верш, калі хочаш, каб быў ён сапраўдны,
шмат ён каштуе ахвяраў — драбочкаў крыві майго сэрца.

*

Як ні сягай, а не ўдасца зацемрыць высокага сонца,
кожны прыступ да яго — наймагутная варта Дажбога.
Нельга стрымаць і зняволіць высокіх імкненняў паэта —
покуль пульсуе ў ім кроў і паветрам ахвоцяцца грудзі,
дзе б ён ні быў — на свабодзе, ў няволі — з ім слаўная Муза.

Ліпень 1943

* * *

Толькі выгляне сонца з-за хмараў, —
знікне зноў. Скуль бяруцца яны?
Можа, гэта жутлівасць пажараў?
Можа, гэта суцьмежа вайны?..

І марнее жытнёвы палетак,
і чакае касца сенажаць.
Кажуць людзі: настала ўжо лета,
ды чамусьці яго не відаць.

20.07.1943

САНЕТ

Здаецца, ўрэшце я знайшоў спакой,
хоць на кароткі час пакінуў горад.
Забраўся ў цішу. Неба нада мной —
прытулак сонцу ўдзень, а ўночы — зорам;

салоны вецер ветліцца з травой,
гамоніць воддаль водгульнае мора.
Скажы, хіба ў чароўнасці такой
хто-небудзь можа бачыць сум і гора?

А паспрабуй — і волю думкам дай:
міжволі ўспомніш звон бароў гуллівых,
найзалацейшы скарб на спелых нівах…

Гляджу задумліва на шызы небакрай, —
які б я быў удзячны і шчаслівы,
каб гэта быў мой сэрцу блізкі край!

25.07.1943, Дзынтары, Рыжская затока

* * *

Ці бачыш ты? —
Да долу гнецца важкі колас,
і хлебны пах стаіць наўкола
такі густы.

Твой хлеб узрос!..
Забраў ён шмат здароўя, сілаў, —
дажджлівым летам быў пахілы
ягоны лёс.

І толькі той
і боль, і радасць працы знае,
хто сеяў, хто цяпер зжынае
сваёй рукой.

28.07.1943

* * *

Не раз я чуў: «Зірні, якая прыгажосць,
якая велічнасць красы ўсяе прыроды —
і мора, і сады… і ўздым, і весялосць.
Пакінь тугу, жыві — будзь гаспадар — не госць.
Дзе бачыў ці страчаў ты лепшыя выгоды?
Раскошу й шыр такой вялікай асалоды?»
А мне — далёкае ў гэтых цудах штосць.

І хочацца сказаць: а я йшчэ багацей,
радзіму маю я, дзе неба йшчэ сіней,
а гладзь усіх вазёр і рэчак, і крыніцаў

за мора-акіян глыбей і прыгажэй,
гаі йшчэ зеляней, хмурынкі йшчэ бялей…
Ніяк мне і нідзе на гэта не забыцца!

31.07.1943, Дзынтары, Рыжская затока

ПТУШКІ

Шмат гнёздаў навілі сярод галля
крылатыя асельнікі паветра.
Гаспода ў іх — нябёсаў шырыня, —
тут кепска, дык ляці, куды захочаш.
А ім стае выгодаў, як відаць, —
лятаюць і бясклопатна шчабечуць.
Чаму ж, з адбіткам суму ў сэрцах, мы
глядзім на іх дзівоснымі вачыма?

15.08.1943, Рыга, Міежу Гай

МАСТАК

Прысвячаецца П. М.

За працай мастака я заспяю,
ён з пэндзлем у руцэ мяне страчае.
Вось і пейзаж, пачаты кагадзе, —
крыніца радасці, душы вымога.
Зноў пэндзаль дакрануўся да яго —
Тканіна ажывае на мальберце.
І, заварожваючы позірк, краявід
у поўнай веліччы красы ўзнікае.
Здаецца, ўсёй істотай чую я
прыемны водар дрэў і траў, і кветак,
кранае сэрца ён, хвалюе кроў
і кружыць галаву нябачным хмелем.
З пяшчотай зыркай сонца праз вакно
вянок свой промневы кладзе на фарбы.
Як самы багацейшы ў свеце чар,
пейзаж ірдзіцца светлымі агнямі.

20.08.1943

РАНДО

Агонь гарыць. І цемры лонь
яго ў абоймы ўзяць не ў стане.
Нат неба сіняга аблонь
пунсуе, бы ў зіхценні рання.
Падкіну дроў. Хай цьмы супонь
рве ноч. Хай блізіцца світанне,
збудзіўшы дрэмнай шыры сонь, —
не згасне ў парасьным саяне
агонь.

Калі жыцця дні да змяркання
ідуць і срэбрам беляць скронь —
ты йшчэ не згас. Пакуль дыханне
бадзёрыць кроў — рукі далонь
ў сардэчным чуе трапятанні
агонь.

27.08.1943

* * *

Глянь, дружа мой! — у вышыні
агні, бы ў дзіўнай казцы, йскрацца,
і ў люстра морскай глыбіні
праз беспрасвецце цямрыні,
зачараваныя, глядзяцца.

Так скарбы вечнае красы —
ці скарб зямлі, ці творчай працы —
нат у найзмрочныя часы,
нібы вясёлкі паясы,
нязгасна й велічна свіцяцца.

29.08.1943, Дзынтары, Рыжская затока

ПЕРАЧЫТВАЮЧЫ «КАЛЕВАЛУ»

Плакаў стары Вайнэмайнэн. Каціліся частыя слёзы
кроплямі ўзорыстых пацерак, золатам зерняў ячменных.

Падалі слёзы на бераг высокі шырокага мора,
з берагу — ў воды бліскучыя, з водаў — у немарач твані.
І не знайшлося нікога, хто змог бы дастаць тыя слёзы,
тыя агністыя зоры з прадонных і цёмных глыбіняў.
Толькі здалела дастаць іх адзіная сіняя качка, —
слёзы былі ўжо інакшыя — перламі дзіўнымі ззялі.

Колькі праліта слязінкаў маім шматгаротным народам!
Самы вялікшы мудрэц палічыць іх не змог бы ніколі.
Пэўна, няма той мясцінкі, якая б тых слёзаў не знала, —
рэчкі свае іх забралі, і моры чужыя схавалі.
Іх я на нітку радкоў наніжу, паўстаўляю у словы —
перламі будуць яны і паэзіі лепшым набыткам.
Кожны агеньчык іх ззяння і перлінкі кожнай багацце —
шчасце і гора маіх — і сясцёр, і братоў аднакроўных.

05.09.1943

МАКСІМУ БАГДАНОВІЧУ

Нечакана парвецца жыццё... Больш ніколі яно не ўваскрэсне.
Колькі думак нязбытых бярэ да сябе падысподная цьма!
Спатыкае іх вечны спакой. І ўсё роўна ім — вольна, ці цесна...
Толькі той будзе жыць, не памрэ — у нябыт каму шляху няма.

Не памрэ толькі той, хто аддаў усе сілы жыцця для народу,
хто мінулае ўславіў красой, зазірнуў хто і ў прышлыя дні.
Дар ягоны, убраны ў вянкі, шанавацьмуць нашчадкі заўсёды,
воды ўлеваў не змыюць яго, і не спаляць пякельняў агні.

07.09.1943, Рыга

РАМАНС

Зноў далёка я, зноў без цябе,
дні і ночы ў самоце й журбе.
Шчэ нядаўна быў разам з табой,
жыў і дыхаў тваёю красой.
Ды жаданых адведзінаў час
быў кароткім, як момант, для нас;
стрэча наша — за ўсё найбліжэй,
развітанне — за ўсё найцяжэй.

Зноўку, зноўку адзін. Неспакой
маіх думак заўсёды са мной.
Я скарбніцу ўспамінаў збярог, —
ты, жывая, як ёсць — у вачох:
погляд — неба; твае валасы —
залатыя палёў каласы;
твае рухі — мігценне зарніц;
голас — гоман срабрыстых крыніц.
Ты — уцеха у шчасці й бядзе.
Дзе знайсці мне найлепшую, дзе?
А таму я ў самоце й журбе:
зноў далёка я, зноў без цябе.

18.09.1943, Рыга

АПЭЛЕС І АЛЯКСАНДР МАКЕДОНСКІ

Вялікі мастак Апэлес —
высокая слава мінулых вякоў,
даўнейшае Грэцыі гонар —
аднойчы паднёс Аляксандру ён свой
малюнак. Там быў валадар на кані.
— Няважны малюнак, — сказаў валадар.
Такое «пахвалы» мастак не чакаў.
Да працы цудоўнай падведзены конь
зайржаў гэтак гучна і моцна,
што слаўны мастак не сцярпеў, адказаў:
— Твой конь разумее мастацтва ляпей,
як ты, валадар мой магутны!

19.09.1943

ПЕСНІ

Прысвячаецца М. Забэйду-Суміцкаму

Песні гэтыя чуў я ад маці,
калі быў дзіцянём шчэ малым,
а падрос — чуў і ў полі, і ў хаце,
чуў усюды, аддаўшыся ім.

Чуў у шолаху кожнай сцяблінкі,
чуў у шэпаце жытніх палёў,
у цвіліканні ўзнёслай птушынкі,
у сярэбраным звоне раўчкоў.

І цяпер мне ўспаміны усчуліў
спеў, сабраны із гукаў зямных,
і з нябёсаў, і з вуснаў матулі,
так далёкіх і так дарагіх.

Скарбы гукаў мастак у адзіных
шчырых песнях сардэчна прапеў
і ў маркоце халоднай чужыны
мне й сябрам маім сэрцы сагрэў.

28.09.1943, Рыга

ВОСЕНЬСКІЯ ТЭРЦЫНЫ

Прыпол свой ранне ў парась памачыла,
галоднае, на дрэвах рве лісты…
Яшчэ ў грудзёх нямала маеш сілаў,

яшчэ ж няшмат пражыў на свеце ты, —
па чым жа ныць? Шчэ будзе шмат патолі —
вясна разгорне зноў шацёр густы.

Ды мне не стрэць яе — ад шчымнай болі
жыццёвых мукаў я аслаб няўзнак.
Мая вясна не вернецца ніколі,
хоць у гадох маіх — яшчэ вясна.

26.10.1943

РАМАНС

Няма нідзе
блакітных васількоў —
такіх, што ў нас — няма нідзе.
І ўноч, і ўдзень
яны — трывога сноў:
я на чужыне не знайшоў
такіх нідзе.

Тваіх вачэй
блакіт, о квецік мой,
о любая, за ўсё сіней
блакіт вачэй…
Сябруе сум са мной,
бо не знайсці ў зямлі чужой
такіх вачэй.

22.10.1943, Рыга

РАМАНС

Толькі там,
дзе айчыны бальзам,
адзінота душы не кране
толькі там.
Аб сваёй старане,
я нікому ўспамінаў, о не, не аддам.

Толькі тут
непатолі прысуд
і маркота няволіць мяне,
толькі тут.
У чужой старане
не забуду цябе я, о не,
родны кут.

29.11.1943, Рыга

* * *

Павіслі вячорныя змрокі над вулкамі,
і месяц над местам — нібы аўрэол.
Засыпаў ён неба агністымі шпулькамі,
раскручвае променяў ніці на дол.

Мой дружа! Яны мне былое нагадваюць —
у вечар такі ж развітаўся з табой.
Ды ніці пачуццяў адзіных нас звязваюць,
як гэтыя промені — неба з зямлёй.

30.11.1943, Рыга

* * *

І заплакалі сумныя далі,
і маркотай дыхнулі палі.
Слёзы — зімных ільдзінак каралі,
а маркота — апёкі зямлі.

Плачце, плачце! Хай колкія стрэлы
суму жальнага грудзі пратнуць
тым, што вашай нявіннасці цела
паглумілі, не даўшы дыхнуць.

Тым, што скрухай тапталі да долу,
што кідалі узлёт пад адхін.
Скруцяць, скруцяць сабе яны голаў, —
дарма помсце прарочаць загін.

Ім не сцяць маіх думак і сэрца,
не згадаць іх жыццёвы сакрэт.
Застануся я тым аж да смерці,
кім жыццё мяне вывела ў свет!

15.12.1943

* * *

Нямала меў, нямала маю я сяброў.
Бадай усім на памяць добрую пакінуў
ці верш, ці фота, спадзяюся, успаміны
у кожнага паўстануць пра мяне ізноў,
калі пабачыць фота, верш мой прачытае…

Так не згасае ні сяброўства, ні любоў,
так блізкіх у жыцці і даль не разлучае!

30.12.1943

* * *

Зямля мая — абсяг вялікіх скарбаў,
Як золата ўначы, як срэбра ўдзень.
Сярод іх шмат такіх цудоўных фарбаў,
Што лепшых нельга больш знайсці нідзе.

Калі б сабраў іх дбайнаю рукою
І ўставіў у слухмяныя радкі, —
Заззяў бы верш вясёлкавай дугою,
Зазнічыў бы праз процьмы, праз вякі.

1943

ПЕСНЯ
(З «Калевалы»)

Мне адно прыйшло жаданне,
я адну задумаў думу:
каб барждзэй за спевы ўзяцца,
каб хутчэй прамовіць слова,
праспяваць каб песню продкаў,
роду нашага напевы.
Словы ўжо да вуснаў ліпнуць,
і струменяцца ўжо гукі,
на язык яны імкнуцца,
разбіваюцца аб зубы.

Залаты мой сябра й брат мой!
Дарагі камрат маленства!
Мы з табой спявацьмем разам,
мы з табой прамовім слова.
Мы убачыліся ўрэшце,
з двух бакоў цяпер сышліся;
рэдка мы бываем разам,
спатыкаемся нячаста.

Ну, дык дай свае мне рукі,
пальцы нашы разам злучым;
праспяваем песні гучна,
і пачнём ад лепшых песняў;
хай сябры пачуюць спевы,
хай іх слухаюць прыветна
між юнацтва маладога
шматпакутнага народу,
што нарэшце стаў на ногі.

Іх спяваў раней мой бацька,
цэп вырэзваючы з дрэва,
іх навучыла мяне маці,
прадучы сваю кудзелю.
Я тады дзіцём на доле
ля каленяў іхных поўзаў,
быў драбочкам, харчаваўся
малаком і сыраквашай…

Шмат яшчэ ёсць іншых словаў
і, мне ведамых, пазнанняў,
што нарваў я на сцяжынцы,
што на верасе зламаў я,
што набраў я на галінках,
што сабраў сабе я ў травах,
што падняў я на дарозе…

Мне мароз намовіў песняў,
нанасіў мне песняў дожджык,
мне навеяў песняў вецер,
хвалі водныя прынеслі,
словы мне складалі птушкі,
гукі мне стваралі дрэвы.

Я ў адзін клубок збіраў іх,
у адзін звязаў іх звязак,
і паклаў клубок на санкі,
і паклаў на сані звязак.
Іх дамоў прывёз на санях,
і на санках да асеці,
і пад кроквамі у клеці
іх замкнуў у медны кораб.

Доўга песні на марозе,
доўга ў схове тым ляжалі.
Мо, забраць мне іх з марозу?
Можа, з холаду узяць іх?
Мо прынесці ў хату кораб?
На тапчан паставіць куфар
Ці пад кроквамі пакінуць
пад чароўным гэтым дахам?

Адчыніць мо кораб песняў,
куфар, поўны словаў гучных?
За канец клубка мо ўзяцца?
Вузел звязку мо разблытаць?

Песняў слаўных ёсць нямала —
з іх адну я заспяваю;
загучыць яна прыемна,
калі квасу паднясуць мне
і дадуць ржанога хлеба.
Калі ж мне не будзе квасу,
не дадуць мне маладога —
заспяваю я нішчымна,
або з поснаю вадою,
каб і вецер быў вясёлым,
каб і дзень быў у аздобе
і каб ранішняй пацехай
заўтра дзень у нас пачаўся.

1943

У ВЫРАЙ

Лятуць, плывуць у вырай птахі лётам нестрыманым,
навіны смужныя ў далёкі край ад нас нясуць.
Вазьмеце, птахі, і мяне з сабой за акіяны,
каб трутнай горычы нідзе не бачыць і не чуць.

Хто знае, мо там лепш, мо там няма журбы сукротнай…
Нядрэнна птахам быць, а лепш — хмурынкай бестурботнай.

1943

БІТВА

(З Гамера)

Войскі, на месца адно імкнучыся, сышліся імгненна;
грозна схапіліся целы, схапіліся пікі і сілы
войнікаў, мосяжам скованых; з бляхі пукатае зразу

згрызліся яра шчыты, разгрымеўся прарэзлівы грукат,
разам зліліся змагарныя крыкі й смяротныя стогны
вояў, што нішчылі й гінулі; дол захлынуўся крывёю.

1943

ЭПІГРАМЫ

Сягаць не раю аж пад неба,
калі йшчэ трошкі не дарос —
не сунься з носам, дзе не трэба,
бо гэтак хутка страціш нос.

*

Быў гэткі ён: усіх дурнымі
лічыў, сябе ж за зуха меў,
хацеў быць мудрым над усімі,
і сам ад гэтага здурэў.

1943

* * *

«Сягаць не раю аж пад неба,
Калі шчэ трошкі не дарос.
Не сунься з носам, дзе не трэба,
Бо гэтак хутка страціш нос!» —
Пісаў так летась я. Пра іншых
Пісаў, але не пра сябе.
Калі ж і мне хто так напіша,
Не прападу! Няхай сабе!
Дармо, што я яшчэ бязвусы
І лысіны не маю я, —
Заўсёды ўсюды ганаруся
Імём Алеся Салаўя.
Я перарос усіх глыбінных
І павярхоўных перарос.
Смяюцца хай! Хай сыплюць кпіны, —
Не страчу ўзняты ўгору нос!
Я летась быў шчэ птушанёткам,
А сёлета — вялікі птах!

Учора поўзаў на падмостках,
А сяння стаў на торны шлях.
Паэты! Вам няма цярпення
Чытаць? За сэрца вам скрабе?
Я — Салавей Алесь, я — геній,
Калі не вам, дык — сам сабе!

03.05.1944, Рыга

ДОЖДЖ

І кроплі дробныя — спярша адна, другая —
сыпнулі мяккім волавам у твар.
Махнула грываю улева дажджавая
і падмяла ад пылу тратуар;
мяне абсыпала жарствой дажджу; ільдзінкі
сыпнула за каўнер. Перада мной,
узняўшы парасон, паспешна йдзе дзяўчынка,
яе здагнаў я, параўнаўся з ёй.
Без слоў, забыўшыся пра ўсё на цэлым свеце,
падходжу да яе; пад парасон
і я стараюся схавацца, і — закмеціў
пагляд вачэй. Які чароўны ён!
Пагляд вачэй… Пад'езд. Дзяўчынкі дом.
Яе няма больш. Зноў я пад дажджом.

Бывае шмат у нас сустрэчаў нечаканых,
Шкада, яны — мамэнт. І больш — для закаханых.

1943, Рыга

ГУМАНІЗМ

Прыемна нам сталеццяў пыл страхнуць…

М. Багдановіч

1. Францішак Скарына

У месце Вільні, у цішы ад бруку,
у шэрым замку, думна-самавітым,
ў пакоі сціплым, даўніной спавітым,
я з ім спаткаўся без размоў, без гуку.

Стагоддзі пылу я страсаю з друку,
між літар бачу зрокам прагавітым,
як людзям простым, людзям паспалітым
са словам нёс ён праўду і навуку.

З бязмежнай прорвы тхленнага змяркання
падняў радзіму дух яго глыбінны…
Гартай балонкі мудрага выдання:

радкоў чырвоных краскі і галіны,
паўмесяц, сонца — як вянок адзіны,
як непагаснасць вечнага світання!

2. Васіль Цяпінскі

Дзвіны шырокай бурныя глыбіны
плывуць імкліва, крышаць перашкоду
і праз парогі — цвёрдую пароду —
нясуць у далі свой наплыў няспынны…

Зямляк вялікі слаўнага Скарыны —
з зямель Наддзвіння, з полацкага роду —
душы парывы прысвячаў народу,
стаяў на службе праўды і айчыны.

«Шануй — вучыў ён — над сябе самога
свой родны звычай, не здраджай чужому,
вучы нашчадкаў, школа — іх дарога

да дому продкаў, праведнага дому…»
Дзвіна спявае вечны гімн быломуу —
стагоддзі пылу не змялі нічога.

3. Сымон Будны

Ад зыркіх промняў — першых іскраў рання
агні ўзняліся, і было іх многа.
А ён прыходзіў знішчыць духа злога
туды, дзе цемры йшчэ было ўладанне.

Ішоў са словам праўды і пазнання,
і з гэным словам, дадзеным ад Бога,
была для люду дзіўная спамога:
душы вялікай буйнае паланне!..

Я сяння бачу: зноў зладумаў змова
над славай краю спеліць план імглісты,
бразджыць над ёю катняя акова.

А ён не гасне — свеціць дух вячысты,
няхай пад пылам — ды заўсёды чысты,
і з ім не моўкне даўняй праўды слова!

1943

БЭЗ

Там, за сцяною, прывітаў заранку,
разам з дзянніцай зацвіцеў агніста...
Я летуцею: усміхнуўся ранку,
з росаў празрыстых нанізаў маніста.

Бэз адзінокі! Мы ў мурох — чужынцы,
ды па-над імі наш парыў узняўся.
Бачу праз шыбы: на адной галінцы,
зроку даступнай, — ажыла вясна ўся.

1943

ПАВОДЛЕ ДАНТЭ

О не, не цёмным воблакам шпакі
лятуць, калі зіма ў марозных путах
ідзе насустрач — а на ўсе бакі
нясуць вятры навалаў племя лютых;
надзеі лепшага ў нябыт пайшлі —
і не ўсміхаецца жыццё ў пакутах!

О не, не жальным крыкам жураўлі
трывожаць супакой высі празорай, —
а ўзнятыя вятрамі ад зямлі
натоўпы хмар. Штодня — ўсё горай, горай…

1943

* * *

Ён салодкі цяпер, але першы быў шмат саладзейшы.
А мой шлях да цябе, хоць і першы, ды быў карацейшы.
І нязмрочны мой шлях не абходжаны гэтак нікім.
Я ніколі яго не міну ў падарожжы цяжкім.

Ён узносіць, вядзе, уздымае ўгару — да світання.
Ён салодкі цяпер — пацалунак узлётаў кахання.
Але першы — няма параўнанняў і словаў яму:
ён зрывае ільды і зганяе з пацёмкаў зіму.

1943

* * *

Клён шапацеў на сцямнелым двары,
поўніўся радасцяй весняй.
Светла-пяшчотнаю казкай нябеснай
вабілі зоры з гары.

— З нашаю зоркай сустрэцца б… Няма… —
вусны твае мне шапталі. —
Разам сустрэцца б… — Ды ў зорныя далі
ты паляцела сама.

— Стрэнемся! Тут я не буду адзін! —
голас імкне за табою.
…Кожнае раніцы з клёна журбою
капаюць кроплі слязін.

1943

ТРЫЯЛЕТ

Мой бел-чырвона-белы сцяг —
зямлі мае краса і слава!
Імкненне ейнае і справа,
мой бел-чырвона-белы сцяг.
Барвовы шлях зары крывавай,
нябёсаў гладзь, палёў прасцяг —
мой бел-чырвона-белы сцяг,
зямлі мае краса і слава!

1943

ЁН ІДЗЕ

О, год стары! Ты ў вырай адлятаеш,
як журавель — ну што ж, прыйшла пара!
Нібы сняжынка лёгкая, спадае
апошні ліст з майго календара.

Насустрач новы йдзе. Вайны смугою
абвіўся ён — яму з ёй балазе.
Так, ён ідзе. Што ж добрае й благое
на гэты раз з сабою прынясе?

1943

* * *

Лёгкай рукою на шыбах узоры мароз вытыкае.
Помню маленства часы: цёплым дыханнем сваім
іх я кранаў, праграваў невялічкі кружочак-аконца, —
Дзеда Мароза й зіму ўбачыць хацеў праз яго.

Дзён незваротных узоры! Карункі маіх успамінаў!..
Іх не крану я цяпер, імі аздоблю свой верш.
Выткуцца ў вершы ўспаміны такім жа чароўным узорам,
тонкім, як стрункі чуццяў сэрцы маім маладым.

04.01.1944

* * *

Цэлымі днямі сядзеў і не спаў я цалюткія ночы,
лірныя струны настройваў, пра Музу пісаў свае вершы.
Іх ёй аддаць захацеў — і прыціхла нязмоўкная ліра,
вершаў паблеклі радкі, і замоўклі няўціхныя рытмы.

05.01.1944

ПАРАДА

Я вам не раю, сябры, заглядацца ў дзявоцкія вочы —
можна так страціць уласныя, тых не пабачыўшы больш.

06.01.1944

ЛІПАВЫ ЦВЕТ

Мяккі дзень студзеньскі сыпле і сыпле з нябёсаў сняжынкі —
і расцвітаюць, бы ўлетку, пялёсткамі белымі ліпы…
Ліпавы студзеньскі цвет! Ты наводзіш мяне на ўспаміны
дзён адышоўшых, калі я з каханай табой любаваўся.
Толькі шкада — аніяк не сарвеш цябе з кволых галінак,
і на ўспамін аб мінулым цябе аніяк не засушыш.

14.01.1944

* * *

Калі звычайную, хай просценькую рэч
свайму таварышу пакіну я на памяць,
я ведаю, хоць лёс — без частых жыць сустрэч
нас асудзіў, — яна прыязні не заплміць.

Яна — уцешлівы аб дружбе напамін
у час благіх і ў час памысных нам гадзін.

16.01.1944

САД

Да 25-годдзя Віленскай беларускай гімназіі

Раней за нашай вёскаю быў сад…
Ніколі так ягоных строяў шаты
не ўшчульвалі мяне і мой пагляд,
як у адну вясну, калі на святы

я ў вёску завітаў. І чуў — ад хат
плыў гоман; ён мае пачуцці кратаў:
«Сад гэты дваццаць пяты год падрад
вясной цвіце, і дасць ён плод багаты…»

Расцвіў і ты у дваццаць пяты год,
навукі сад, глыбокай веды цветам.
Багаты будзе дваццаць пяты плод

І верны ўзгадавальным запаветам.
Ён панясе для ўжытку і для ўцех
Святло навукі да крывіцкіх стрэх!

20.01.1944

МУЗА

Мораку шэрань разліў вечар ля хаты маёй
і праз фіранку акна цэдзіць яе у пакой.
Ходзік замоўк на сцяне. Ціша, і гукаў — ні-ні,
чыйсьці я голас пачуў: «Спі, салавейка, засні».

Кволіць дрымота мяне. Я на пасцелю прылёг.
Мрояў штодзённых і кроз ява ўсплывае ў вачох.
Мчуся, імкнуся увысь — лёгкасць узлёту адчуў,
кінуў пякельнасць зямлі — і да нябёсаў лячу…

Вечны блакіт. Дываны — воблакі. Я ў вышыні.
Голас пачуўся ізноў: «Спі, салавейка, засні.
Муза спявае табе. Я на спатканне прыйшла,
сон твой і твой супачын я пад апеку ўзяла.

Жахі — і цела й душу джгалі жаглом на зямлі.
Ну, а цяпер супачні — ў морак яны адплылі.
Ты — недасяжны цяпер, — чынаў не ўшчунуць тваіх.
Знікне, як засцлівы дым, шэрань часінаў благіх.

Спеў твой, як чар, загучыць, ён не замоўкне нідзе.
З'ішчанне зманлівых сноў блізіцца, велічна йдзе;
хорам красы паўстае; знічаў не тускнуць агні.
Іх не пагасіць ніхто… Спі, салавейка, засні…»

28.01.1944

* * *

Маці. З ёю — дзіця. Іх суцэльнасць — каляска…
Безуважныя постаці… Шыбы вітрын…
А калясачкі рух — і пяшчоты, і ласка,
мацярынскай любові і ўвагі зацін.
І яна, і дзіця — непарыўнасць адзінства,
неразлучнасці еднасць і мяккасць клапот.
Найцяплейшая лучнасць чуцця й мацярынства —
самай дробнай сняжынкі пяшчотны палёт.

30.01.1944

АКРАВЕРШЫ

Няхай чужыны хмурай ветры
І шэрань поўначы сырой
Няласкава і непрыветна
Ахутваюць дзень ясны мой,
Чакай: ад іх я непрыкметна
К табе ўцяку вясною светлай.
А мо й раней — перад вясной.

* *

Лісты пішу табе — след лучнасці не гіне.
Юнацтва цвет, о не — тугу сустрэла ты.
Свой нарадзінаў дзень спраўляеш на чужыне,
І я... з чужыны шлю вітальныя лісты.

Студзень 1944

* * *

Уладзіміру Глыбіннаму

Культура — азнака вышэй усяго,
мастацтва — красою яе надарыла;
ніколі не блякне тварэнне таго,
хто ім ахвяруе і веду, і сілы.

06.02.1944, Рыга

* * *

Цемра гусцее. Заплюшчыў дзень зморыны сінія вочы —
бачыць у снох чарадзейных ён месяца бляск залаты.
Толькі аддамся лятункам — і бачу я вобраз дзявочы,
рысы знаёмыя й блізкія — рысы жывой пекнаты.

21.02.1944

ЛЯ ВОСТРАЙ БРАМЫ

І прашчуры схілялі тут галовы…
Мінаю я праход Яе святы,
а вусны шэпчуць дабравесця словы:
— Святая Ты!

За Ёй — і старадаўняя сталіца
мае радзімы ў чарах пекнаты.
Ізноў Табе прыехаў пакланіцца —
— Святая Ты!

05.03.1944, Вільня

ЗМАГАР АЙЧЫНЫ

Мой дзед ваякам быў.
У царскім войску
на турка йшоў з адвагай змагара.
Змагаўся ж ён не за свае палоскі,
а за «айчыну» й «бацюшку-цара».

І бацька мой змагар быў з даўным гартам,
ішоў у бой з аддзеламі «Русі».
Што ж ён здабыў? Ад газаў на Карпатах
сваё здароўе й сілы падкасіў.

Цяпер змагар і я. Але змагар айчыны,
не царскай, а свае — Беларусі!
Змагар пары, што ў слаўныя бачыны
вялікай прышласці упіша нас усіх!

Шмат нас такіх!
Я веру:
мы здабудзем
Радзіме славу й волю на вякі.
Зірні, прыслухайся, крывіцкі людзе, —
ідуць у бой крывіцкія палкі!

10.03.1944, Менск

* * *

Добры дзень табе, сонечны Слуцак!
Стрэў з табою тваю я вясну…
З месцаў, холаду воды дзе льюцца,
я у госці к табе зазірнуў.

Я пад небам тваім, пад блакітам
апынуўся такім, як стаю…
Я прывёз табе вершы і рытмы,
я прывёз табе ліру сваю.

03.04.1944, Слуцак

ВІЛЬНЯ

Пазалаціў сутункі ззяннем з неба месяц — медны звон.
Прыціхла Вільня. Змоўклі, сцятыя струшлівым часам, вулкі.
У небе — іхны гаспадар. Здалося, скалыхнуўся ён,
наўколле зварухнуў ягоны гоман валадарны й гулкі.

Святыні Вільні ўзрушылі спакой. Загаманіла ціш.
У кожным хораме — мне чутна — водгук векапомны звоніць.
І тупат конскіх ног ад брукаў места думна ўзняўся ў выш,
гул неўгамонны ажывіў сляды сугоннае Пагоні.

Найдаўні след не сплыў з улеваю часоў і не сплыве,
і не зацьміць яго руіны дым — цяпершчыны аблічча.
Дзе ні ступі, куды ні глянь — яна, мінуўшчына, жыве,
сугоднай прозвесцяй званоў і вабіць да сябе, і кліча.

12.04.1944, Вільня

* * *

Яе чакаў і я. Прыйшла яна…
Нябёсаў царства першы гром адведаў…
Такіх ажыўчых вёснаў шмат я знаў,
Але такой маркотнай шчэ не ведаў.
Нядаўна я у Царскім садзе быў:
Чаромхаў тхнень і вохнае паветра;

Дзяўчатак смех — ні суму, ні журбы —
Вясну вітаў — яна іх стрэла ветла.
Дзяўчаткі… а не ўсчулілі нічым, —
Яны чужыя мне, я ім — таксама.
Душа мая сягала ў далячынь,
Дзе неба сінь сыходзіцца з лясамі.
А ў думках быў далёкі й блізкі Менск
І тая, чый пагляд мяне прывабіў.
Яна айчыну любіць і мяне,
І крывічу ў жыцці — найлепшы сябра.
А тут нідзе, нідзе такой няма,
Такой ніхто тут не страчаў, не ведаў…
Ну, што ж, няхай… Няхай сабе — вясна…
Яе з балючым сэрцам я адведаў.

20.04.1944, Рыга

* * *

У Койданаве жыў Радзюк Альфрэд
і не было там Салаўя Алеся,
цяпер ён ёсць і, кажуць, ён — паэт,
але… жыве далёка, ў Рызе дзесьці.
І кажуць, што забыўся ён пра ўсіх
сяброў, пра брата меншага й сястрыцу;
штось піша… а ў паэзіях сваіх
хоць раз не можа ім ён пакланіцца.
Відаць, не хоча прызнавацца ён,
што ён — Радзюк, для землякоў вядомы.
Паэтам стаў Алесем Салаўём —
дык і не хоча зазірнуць дадому…
Сястрыца родная! Мой родны брат!
Каб зналі вы, як мне без вас балюча!
Каб зналі вы, як быць я з вамі рад,
як дзень і ноч мяне разлука муча!
Я ў Менску быў, так блізка быў ад вас,
але ніяк не змог да вас прыехаць.
Усім, адданым краю, хмуры час

загарадзіў шляхі да блізкіх стрэхаў,
І я паехаў з болем у грудзёх
назад, у край чужы, чужую Рыгу,
дзе, будучы ў самоце, па начох
пісаў, і дзе цяпер друкую кнігу.
Друкую, так… І вершы зноў пішу,
і, родныя, пра вас я ўспамінаю,
сагрэць хачу ўспамінамі душу —
яна яшчэ жыве, йшчэ не канае.
Я рад зноў быць Альфрэдам Радзюком,
не знацца век з чужымі гарадамі,
каб быць у Койданаве, мець пакой,
і жыць, мае няшчасныя, там з вамі.
Тады мо й вершы б іншымі былі:
пра Радзюкоў, што шчасця век не мелі,
пра іх няшчасны лёс, пра стогн зямлі,
а не пра песняў салаўіных трэлі.

30.04.1944

* * *

Ізноў я нарадзінаў дзень спаткаў.
Мне сяння дваццаць два гады мінула.
Час не малы… Але ён не гушкаў
мяне ў сваёй калысцы з ласкай чулай.
Мяне ён выкінуў з яе. Аддаў
на здзек пары цяжкой і злому ветру;
хоць шмат куды нявetліва кідаў —
Радзіма мне заўжды была прыветлай.
Я ўспамінаю Койданаў сівы;
а потым — Менск, Лагойск з прыгожай Гайнай;
зноў Менск, пасля — Ілля і паплавы
паблізу ў прыгажосці незвычайнай.
А сяння Рыга — горад харства;
прыгледзішся — пануры і халодны:
з людзьмі сустрэнешся — няпрыязні жарства,
зірнеш на свет — сыры і непагодны.

Тут мякка сцелюць, але жорстка спаць,
а ў нас — хоць жорстка, але мякка целу.
Ну як радзіму мне не ўспамінаць,
калі душа спагады тут не стрэла?
Ну як, ну як, калі тут золь адна?
Калі мне вочы коле у адчаі…
Я келіх адзіноты п'ю да дна
і дваццаць трэці год жыцця страчаю.

01.05.1944, Рыга

* * *

Даволі спаць. Адчыніш вейкі —
вачэй не змочыць слёз раса.
Ці бачыш? — сяння салавейка
адведаў наш квяцісты сад.

Ці чуеш? — з цёмнага пругмення
туды, бы ў рай, абое йдзём.
А сонца сыпле шчодрай жменяй
пшаніцу промняў — скарбы дзён.

Зярняты сонца сеем. Глеба
усходы згодныя дае:
растуць яны, імкнуцца ў неба,
спяляць пад ім плады свае.

Прасвядным збуджаны ўраджаем,
я напаткаў няхісткі тор.
Прылівам сілаў адчуваю:
што я жывы, што не памёр!

15.05.1944

* * *

Ты плывеш, ты змагаешся з хваляй
колькі сілы стае.
Усё далей ад берагу, далей
рук узмахі твае.

Пеннай беллю ўзбярэжныя глыбы
серабрацца вакол.
Прыплываеш, крыштальная нібы,
і выходзіш на дол.

І не ступіш нагамі ў сандалі,
і не ўп'ешся цяплом —
неспакойная чайка у хвалі
зноў пакліча крылом.

27.05.1944, Маёры, Рыжская затока

ПАД П'ЯНУЮ РУКУ

Усе паэты — тут я не салгу —
Прапашчыя, прагорклыя прапіўцы.
Настане дзень — яны ў шынок бягуць,
Гатовыя ў гарэлцы утапіцца.
А з Камароўкі да шынка народ,
Як на пажар які, рашуча прэцца.
Ёсць ляпарнаскія пісцы, ёсць зброд,
Крычаць: — Гарэлкі нам не застанецца!
А што далей? Не варта і пісаць,
Хоць не паэта — след на рэбрах маю
Ад камароўшчыкаў. Таму, відаць,
Я гневу супраць іх не устрымаю.
Напомню зноў: я не паэта, не,
Не трэба мне ні выпіўкі, ні славы…
Прашу, прабачце за шматслоўе мне,
Цяпер пара узяцца і за справу.

Дык вось, на Камароўцы жыў адзін
Дзівак і капялюш меў — з гліны міску.
У содні ля шаснаццаці гадзін
Ён аддаваўся горкаму кілішку.
Яму й паэты не былі наўме,
Без іх і то было замала часу.
Ён паражніць кілішкі добра ўмеў,
Не ведаючы ліры і Парнасу.

Але ж, як кажуць, не заўсёды так
Вялося ўсё, як і заўжды вядзецца.
На ўсё свой час… Аднойчы наш дзівак
Пачуў: — Гарэлкі нам не застанецца!
Ён, як падсмалены, пабег на крык,
Ён не крычаў: — Карэту мне, карэту!
Адно гукаць ягоны мог язык:
— Разбой! Разбой! Далоў усіх паэтаў!
Ад іх учадзеў я. — З тае пары
Паэтам ён праклёны шле й злавесы.
Ды гэта шчэ не ўсё. Я чуў, сябры,
Што ён далез нядаўна і да прэсы.
Ён там з паўлітрам у руках знайшоў
Выгодны супакой, таксама й працу,
Зусім прапіты сэрцам і душой,
Статыстыкай паэтаў стаў займацца.
І у газеце танны свой тавар,
Што «Чужанінавым» завецца, цісnуў.
Мяшчанства дохлага прапіты твар
У творы тым гнілотаю раскіснуў.
Псеўдонімам ён хітра твар прыкрыў
І Крывічанінам пачаў ён звацца.
Ды дзе ж ты, чыжык, быў, дзе піва піў,
Мо б сербануў яшчэ? Ці рад старацца?
Хіба табе паэтаў зразумець?
Хіба табе, бяздарнаму, уцяміць,
Што ім, няшчасным, каб натхненне мець,
І за гарэлку ўзяцца трэ часамі…
Табе паэзія — афіша, ты — каза,
Моль камароўская душу якой абгрызла.
Адзінае магу табе сказаць:
Калі не поп, дык не ўбірайся ў рызы.

Ха-ха, ха-ха, ну вось і ўсё, сябры,
Цяпер пара й за чарку, каб ачнуцца,
Бо літары ўжо скачуць дагары
І рыфмы вельмі цяжка мне даюцца.

Травень 1944

ЗЯМЛЯ Ў АГНІ

Зямля ў агні. Гарачыня.
Сусвету — не дыхнуць.
Пякельнай лавы не суняць,
крыві струменіць муць.

Зямлі, зямлі гаспадары —
на дзвюх, на дзвюх нагах —
сусвету скарбы і дары
у пекла топчуць. Жах.

«Хадзі сюды, хадзі сюды! —
мне кажуць. — У паход
мы рушым. Вывядзем з бяды
радзіму і народ!»

Адзін: «Вазьмі, вазьмі — ці меў? —
вінтоўку — новы стыль...»
Я ўзяў. Я ўвесь акамянеў —
гнілы, крывы кастыль.

Другі: «Вось келіх у мяне —
пітво ў ім змагароў.
Вазьмі!» — Я ўзяў, зірнуў: на дне —
людскія слёзы, кроў.

А трэці: «Змогся? Супачынь!
Прыляж на ложак наш».
Я лёг. Прачнуўся уначы —
не ложак, а труна.

І ля мяне, і ля труны —
і века, і цвікі...
Ідуць яны, ідуць яны —
шкілеты... мерцвякі...

27.06.1944, Менск

* * *

Крыніцы звонкае струмень
замоўк — не піць вады з прыгорстаў...

Ізноў наперадзе сухмень
дарогаў нудных, прыкрых вёрстаў.

Як і раней, ізноў, ізноў
мяне чакае жах нязнаны.
Мо, гэта звада трызных сноў,
мо, імі я ў палон забраны?

Чаму так цяжка, цяжка мне?
Жывых не бачу і не чую.
На голых дошках у труне
жыву — і днюю, і начую.

«Цярпі!» — мне кажуць. Я цярплю.
«Накрыем — зноў мне кажуць — векам,
пасля... апусцім у зямлю,
і там ты станеш чалавекам...»

05.07.1944

* * *

У жылах счах крыві струмень,
і скута сэрца болем вострым.
Ізноў наперадзе сухмень
дарогаў нудных, прыкрых вёрстаў.

Як і раней, ізноў, ізноў
мяне чакае жах, нязнанасць.
Мо, гэта звада трызных сноў,
Мо, імі я ў палон забраны?

Чаму так цяжка, цяжка мне?
Жывых не бачу і не чую.
На голых дошках у труне
жыву — і днюю, і начую.

«Цярпі!» — Мне кажуць. Я цярплю.
«Накрыем, — зноў мне кажуць, — векам,
пасля... апусцім у зямлю,
і там ты станеш чалавекам.»

05.07.1944, Беласток

* * *

Масею Сяднёву

Сустрэча, першая сустрэча —
маё імкненне, думкаў рой;
я крочыў з імі, сябра мой,
праз дым цяпершчыны зларэчай.
І вось — чатыры дні падрад
з Табой жыву і размаўляю.
Мой дружа! Ты мой родны брат,
Цябе інакшым не ўяўляю.
Няма пачатку і канца
жаданням, звабленым размовай…
Вось да ідыліі вясковай
сягаем думкамі. Нырца
мы з галавой даём у мора
валвістых ніў — красы палёў.
Яно кунежыць нас, гавора
у мове блізкіх сэрцу слоў:
«Мае вы, я — сваё, сваё вам:
маім сынам не раздружыць!»
Чалом зямлі, дарам жытнёвым!
Жывём і хочам вамі жыць!
Душа, як птушка з клеткі, рвецца
на ваш прастор. І нам здаецца —
пад хараством палёў, лугоў,
пад неабсягам зор высокіх
плывём на хвалях дзён глыбокіх
да нашай явы берагоў.

07.07.1944, Беласток

* * *

Трамвай — даўжэзная, танклявая труна —
напханы трупамі людзей, бы селядцамі.
А з мяккай шэрані паднебнага руна
спадае долу дождж і ў шыбы б'е дубцамі.

Дол адчыняецца. Дарога ў цемру. Спрут
дратоў трамвайных, пэўна, шлях мой перапутаў.
Няўжо і я, як іншыя, — халодны труп?
Няўжо не вырвацца мне з тагасветных путаў?

09.07.1944, Кёнігсберг

* * *

Ахвяраў прагне смерць. Язык
ад прагі ёй апух — нямая.
У свет, дзе змоўк жывога зык,
крывёю сцёклых нат прымае.

Мяне цягнула — я уцёк
і да цябе прыйшоў, мой дружа.
Ты бачыш — я крывёй не сцёк,
на мне не раны — кветкі ружаў.

З табою колькі ўжо гадзін —
і асалоду п'ю жывую.
Са мною ты — я не адзін,
з табою я — жыву, жыву я!

Ты бачыш сам — шчаслівы той,
каму пацісне сябра рукі.
Навошта ж гнеўнаю пятой
нас хоча зноў таптаць разлука?

Навошта ж так, ты мне скажы,
мяне агортвае чужыннасць?
Быць аднаму — быць на мяжы
прадоння з брыжам на спружынах.

Тады і радасць не прыльне.
Сярод чужых быць — смерць нямая.
Я не жыву, няма мяне,
калі я блізкага не маю.

13.07.1944

* * *

Вароты ў няведамы свет. У дазоры
з касою стаіць чалавечы шкілет.
Зубамі ляскоча, як прагны пражора,
пытае: — Ты йдзеш у няведамы свет?

Ці маеш мандат на адведзіны свету?
Не маеш? Дык шляху у свет наш няма.
І я быў калісьці таксама паэтам,
ды знішчыла фах мой Кастуся сама.

Відаць, да Кастусі сабраўся ты ў госці?
Мо, ёй захапіўся, як некалі я?
Дарэмна! Шкілетам тут станеш, а косці
расцягне галодная зграя звяр'я.

Цяпер так, як я, ты не трапіш у ласку,
не станеш на змену Кастусі ў дазор.
Не прыйдзецца нават зубамі паляскаць,
не толькі сягаць у нябёсы да зор.

Вяртайся назад! Калі дома і згінеш,
дык там пахаваюць па-людску цябе;
там нават уславіць і Муза-багіня
таго, хто жыццё прысвяціў барацьбе.

Увесну цябе адвітаюць дзяўчаты,
вянкі ускладуць на магілу тваю…
А тут не сустрэць іх табе — азіяты
вакол і шкілеты вакол — не ўтаю.

Высмоктвалі кроў з нас, выцягвалі жылы,
і годнасць людскую таптталі, а мы,
як белыя негры, на белых служылі…
Не йдзі у свет гэты — ён горай турмы.

Мо, сплю я? Не, пэўна, не сплю. У дазоры
з касою стаіць чалавечы шкілет.
Як блізкаму сябру, ён шчыра гаворыць:
— Не йдзі лепш, не йдзі у няведамы свет!

23.07.1944, Кротынген

* * *

Пусціня… пусціня… пусціня…
і на сэрцы, і ў думках, і ў целе.
Струны ліры аб смерці звіняць.
Ці даўно аб жыцці мне звінелі?

Так нядаўна… Чаму ж, для чаго
самі людзі жыццё растапталі?
Згас жыццёвых імкненняў агонь,
ліра змоўкла у скогаце сталі.

06.08.1944, Рыга

КАЗКА Й СОН

Што Азія мне і Еўропа?
Не казка мая і не сон.
Я еду ў Еўропу на ж...
тры тыдні і гэтулькі ж дзён.

І як мне ад Азіі з’ехаць?
Хоць еду, а шляху няма.
Усіх — ці з грахом, ці без грэху —
мангольская косіць чума.

Капае суцьмежныя лёхі,
крывавіць знішчэння зару.
Ў канцлагеры ў Азіі здохну,
без хлеба ў Еўропе памру.

Таму й пасадзіў я на ж...
і лёс свой сабачы, і кон.
Вось Азія, вось і Еўропа —
і казка мая, і мой сон.

07.08.1944

* * *

Дваццаты век. А ён… Хіба маўчыць паэт?
Чаму не будзіць вершаў век дваццаты?..
Грымяць і абяскрыльваюць гарматы
жыцця імпэт.

Руйнуюць і нясуць раскошу ўцехі ім —
дзвюхногім падабенствам чалавеку.
Нялюдству ўсё, прыдбанае спрадвеку,
было чужым.

О не, сусвет! Не ты бурхлівы шквал, не ты.
А ў шквале сам гарыш, і я згараю.
Крывавы акіян. Агонь без краю.
І дым густы.

Не ты, — знішчэнняў жах, з мянушкаю — сусвет,
клыкоча, супакой з планеты сцершы:
— Калі я гавару — нямеюць вершы,
маўчыць паэт.

09.08.1944, Пуйкуле

* * *

Хацелася б мне вылаяцца ў вершы
на век дваццаты, на прадажны свет.
Салодкім словам сэрца не суцешыш,
аглухла Муза, а паэта сам — аслеп.
Гарыць зямля ў крыві — чын новы чалавека.
З агнём злілося сонца. Дым густы.
І курчыцца ў агні ўвесь свет з дваццатым векам,
нябачна больш прыстойнасці й красы.
Таму хацеў бы вылаяцца ў вершы
на век дваццаты, на прадажны свет.
А ён гарматаў мовай кажа: — Першым
я мушу гаварыць, маўчыць паэт.

09.08.1944, Пуйкуле

З ТАГО СВЕТУ

О, людзі! Паглядзеце на мяне,
хіба я назусім памёр, скажэце?
Правін ваш, як нябыт, не праміне,
чакае цемра й вас на вашым свеце.

Вы мне мячом адсеклі галаву
і вострым штыхам пракалолі грудзі,
зямлёй засыпалі. А я — жыву,
сцігуючы цяпер вас, людзі, людзі!

Ад вас, ад вас я свету смерці — дань.
Цяпер мой зірк — прадонне вашай згубы.
Я ўдзень — шкілет жывы, уночы — здань.
Скрыгічуць, просячы расплаты, зубы.

Гукаю ўдалеч: — Чэрці й ведзьмары,
даволі вам сядзець у нетрах крукам!
Прачнецеся, вы мне цяпер — сябры.
О, дайце, дайце мне касу у рукі!

Расплаты час прыйшоў. Шырэй пракос!
Скакаць на скошаных галовах будзем.
Пад ветру стогн, пад свіст і сковыт кос
нявінных мерцвякоў ад сну разбудзім!

Прыйшла, прыйшла чарга скакаць і мне
у княстве смерці, у пякельным свеце.
...Расплата вінавайцаў не міне,
смяротны танец у мяне наўвеце.

12.08.1944, Руйена

ПАКЛОН

Ізноў крануўся эшалон,
ізноў за поручні бяруся.
Паклон, Эстонія, паклон
табе ад сына Беларусі!

Густы імшарнік. Хмызнякі.
Ялінкі. Кволыя бярозкі.

Бягуць чыгункай цягнікі,
смуткуюць сцежкі і дарожкі.

Пакіну я цягнік. Да вас,
да вас пайду, зямлі сцяжынкі!
Скажэце, дзе хоць посны квас,
хоць хлеба чэрствага скарынка?

Скажэце, як мне абысці
напасце смерці ашалелай?
Скажэце, як і дзе знайсці
спачынак для душы збалелай?

Пакіну змрочны эшалон
і ад чыгункі адракуся.
Паклон, Эстонія, паклон
Табе ад сына Беларусі!

13.08.1944, Масяру

* * *

Ужо тры дні, ужо тры дні
не меў скарынкі хлеба ў роце.
Не кормяць вершы больш ані,
няма й граша ў папернай псоце.

Дзівак паэта, ну й дзівак,
хацеў насыціцца ён вершам!
Пісаў, пісаў, цяпер — жабрак,
сярод галодных — самы першы.

Чаму, навошта, для каго
глуміў паперу, чэрняй мазаў?
Сам ні ў ваду і ні ў агонь,
ні ў муляры, ні ў вадалазы.

Няўжо такі жыцця закон,
о Муза, строгая багіня? —
Спрытнейшы — хай бяздарны ён —
жыве, менш спрытны, здольны — гіне.

16.08.1944, Гедэместэ

* * *

Тры вадаплавы адплылі
у далеч, далеч морскай гладзі.
А я застаўся на зямлі.
Паплыць хто здолеў? Хто? Вы, б..!

І ўдзень, і ўноч — пры ўсім, пры ўсіх —
вы грэшным целам гандлявалі.
Народ, радзіму і сваіх
... прадавалі.

Цяпер жа вам — выгоды ўсе.
Цяпер — і гонар вам, і слава.
Вы ўсё займелі. Пакрысе
вы дапаўзлі й да параплава.

Куды ж, куды ўсе паплылі?
У цэнтр культуры, у Еўропу?
. . . .

Дзіўлюся — можна было б вам
застацца тут. Між ляжак голых
«хрысціць» умее вас іван,
не толькі немца, а й мангола.

Шкада — падонкаў не глыне
прадонне прагнай морскай сіні…
А ты, дзівак, плыві у сне,
чакай вяроўкі на асіне.

1944, Эстонія

* * *

Расцалаваў я алавік,
як той паэта — сакратаршу.
Хай я галодны — ён прывык
пісаць… А кішкі граюць марша.

Нясмела суну за парог,
а ў думках: — Мо, і не прагоняць?

— Как раз спекли мы вам пирог! —
ламана кажа мне эстонец.

— Идите прочь! Мои сыны
на фронте бьются, вы… вы что же?
…О, дзе ж вы, дзе вы, тыя дні,
калі я йшоў на стан варожы?

У летуценнях я ішоў
у бой за волю, за айчыну.
На яве йду… за латышоў?
Мо, за эстонцаў? Не! —
Лепш згіну

у чыстым полі пад кустом
без лусты хлеба, без табакі.
Абмые неба хай дажджом
і пахаваюць хай… сабакі.

18.8.1944, Гедэместэ

* * *

Бывай, Гедэместэ, бывай,
апошні суворы прытулак!
Паеду, памчуся ў свой край —
ніхто так, як ён, не прытуліць.
Скарыся, шляхоў далячынь!
— Нязваныя, — чую я — госці
у доме тваім. Супачын
рыхтуюць табе… на пагосце.
— Не едзь! — мне скуголяць вятры.
— Сабакам і сукіным сынам
назваў цябе дом твой. Утры
слязу, — па табе там асіны
льюць слёзы. —
Ізноў хтось: — Чакай!
У доме — злачынец і вораг…
Бывай, Гедэместэ, бывай,
апошні прытулак суворы!

Хай шлях невыразны — пара
ступіць на яго.
Падзямелле
грукоча: — Што ж, майстра пяра,
хістаешся, сеўшы на мелі?
Прабач! За табою — штыхі,
зірні — сцень пагібелі блеклы.
Забудзься на дом — і шляхі
пабачыш ты выйсцьныя з пекла.
А потым — і рай.
— Што мне рай?
Мне ўсё, што не дом, — не прытулак.
Сцякае крывёю мой край —
цяпер нат і ён не прытуліць…
Бывай, Гедэместэ, бывай!

1944, Гедэместэ

* * *

Лясы. Узгоркі. Паплавы.
Блакіт нябёсаў. Сінь азёраў…
Далёка вы, далёка вы,
радзімы блізкія прасторы!

А дні сярод палёў чужых
спяляць пасевы залатыя.
Пайдзі, прыслухайся да іх:
шумяць пасевы, ды не тыя.

Шумяць. У даль палёў зірні:
яшчэ далей — палі радзімы.
Плывуць крывёй над імі дні
і плыць сягаюць над чужымі.

Знішчэнне там, дзе іхны след.
Сваім, чужым — адно. Дзе ж дзецца?
Куды ні глянь — вялікі свет,
а чалавек не мае месца.

06.09.1944, Гедэместэ

* * *

Плыве вадаплаў і плыве
ад смерці да смерці у госці.
Пагібель маёй галаве
прарочыць бязлітасна хтосьці.

І кажа мне, кажа: «Глыне
цябе ненажэры прадонне.
А морскія камні на дне
спакой табе вечны адзвоняць».

«Пакіньце! — прарокаў прашу, —
нялёгка ад вашага мору
спакойна хаваць мне душу
на дне неспакойнага мора».

І цяжка маёй галаве.
Прароцтвы — калючыя восці.
Плыве вадаплаў і плыве
ад смерці да смерці у госці.

15.09.1944, Балтыйскае мора

У МОРЫ

І вецер скавыча, і б'ецца вада,
а з пострапу я не сыходжу.
Тры дні і тры ночы зямлі не відаць —
вачэй з небасхілу не зводжу.
Прыбой не змаўкае. І грукат, і гром
суздромны абшар спакарылі.
Крыклівыя чайкі нясуць над карном
маркоты счарнелыя крылы.
Тры дні і тры ночы плыве вадаплаў
праз бурнасць раз'юшаных водаў.
...Чырвонай зарою суклон запалаў.
Вачэй з небасхілу не зводжу.
Здаецца мне, бачу я бераг глухі,
над ім — і агонь, і пажары.

Крывёю набракнуў нябёсаў блакіт,
ахутаны цемрадзяй хмараў.
Не сполаху звіс над прасторамі сцень,
не вецер над пусткай гуляе, —
над горамі трупаў людскіх і касцей
гулянку Кастуся спраўляе...
Далей жа ад смерці, далей! Над карном
хай чайкі выпростваюць крылы!
Я сам капітан, я кірую стырном
вялікае моцы і сілы.
Мяне не спалохае буры простор,
не ўтопіць нязломную веру.
Падужаю ўспененасць водаў і шторм,
на сонечны выплыву бераг.
Не той, дзе крыві непатрэбны выліў,
не той меў я бераг наўвеце,
а бераг праўдзівай і мірнай зямлі —
ён Крывіяй вольнай завецца!
Далей жа ад грэшнай зямлі! За карном
хай пеняцца гнеўныя воды!
Я сам капітан, я кірую стырном.
Да праўды плыву і да згоды.

16.09.1944, Балтыйскае мора

* * *

Нідзе не адступае,
за мной — услед, услед.
Пакінь мяне, сухі шкілет —
твая каса даўно тупая!

На зруйнаваны готык
ідзі яе вастрыць!
Няхай агнём яна гарыць —
пякучым будзе ейны дотык!

І павядзе дарога
па звалавым гарбе —

да тых, што вывелі цябе
падкошваць плод жыцця зямнога.

Перадсмяротным духам
іх цешыць Сатана;
гарбаты троп да іх яна
даўно паслала мяккім пухам.

Ступай па ім — знямога
няласкай не кране.
Пакінь мяне, пакінь мяне —
чакаеш ты сябе самога!

07.11.1944, Берлін

* * *

Мой сціплы ложак! Прытульны спынак
інтымных думак! Жыцця спачын!
Як лягу спаць я — і пра дзяўчыну
успамінаю, калі — адзін.

Падушка й коўдра у кожнай нітцы
хаваюць думкі — аб ёй, аб ёй!
Заплюшчу вочы — яна мне сніцца,
як толькі ўстану — няма са мной.

Ізноў я лягу — ізноў я ў мроях,
віна ўсіх думак — з табой, з табой!
Няма спачыну, няма спакою…
О сціплы спынак! О ложак мой!

14.11.1944

ГЕРОЯМ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ

Прыйшоў у край чужы — і за гарою
дзень дагарэў. І ноч, і ноч усцяж.
Няўжо не змагаром і не героем
пакінуў Беларусь нашчадак ваш?

Няўжо мінуўшчыну, бацькоў магілы
таптаць чужому боту ён аддаў?
Хіба перад агнём варожай сілы
схіліўся, адступаючы ў аддаль?

Няўжо не споўніў запавету вояў —
не адступай нідзе, лепш паўшым ляж?!
Няўжо не змагаром і не героем
пакінуў Беларусь нашчадак ваш?

Няўжо? Мо ён яе і не пакінуў,
а выйшаў ейную знайсці світаль?..
Яго збівае з ног жарства чужыны,
а ён... ідзе і йдзе ад краю ўдаль.

І ўсё шукае сонца за гарою.
І не знаходзіць... Ноч і ноч усцяж...
Няўжо не змагаром і не героем
пакінуў Беларусь нашчадак ваш?

06.12.1944, Берлін

FRÖHLICHE WEIHNACHTEN

Так, Fröhliche Weihnachten! Так, паны,
з грубой душой пад знакам павучыны.
Што ж маеце, вандалавы сыны,
да той жанчыны?

Яна з малой дзяўчынкаю — дачкой,
асіліўшы пакуты і знямогу,
вязе ў касцёл праз ваш несупакой
малітвы Богу.

Дзяўчынка ўся ссінела, як той «Ost»
на світцы ў маці. Ost'аўка — не пані,
ёй месца і ні ў свята, і ні ў пост
няма ў S-Bahn'e.

Арыйскі дух з вагона гоніць прэч
жанчыну-маці і дачку жанчыны...

…Карае вас, карае Божы меч
ліхіх, бясчынных.

І знікне чорны прывід Сатаны,
і згіне зверства след на хіжым твары.
Так, Fröhliche Weihnachten! Так, паны,
людства пачвары!

24.12.1944, Берлін

МАЯ СТАЛІЦА

З халоднай поўначы прымі
свайго гасця, мая сталіца!
Я жыў імкненнямі тваймі,
цябе ніяк не мог забыцца.

Няхай ты страціла красу
і стан твой скрухаю ўзараны, —
табе прызнанасць я нясу,
бо ў маім сэрцы — тыя ж раны.

Таму і ты, і я — радня,
якой і боль не спакарае.
Зара ўзыходзячага дня
у думках нашых не згарае.

Няўжо ізноў павінен я
разлуцы змушанай скарыцца?
Сталіца любая мая,
цябе ніколі не забыцца!

1944, Менск

* * *

Я толькі з ёй пайшоў у свет,
апроч яе — усё забралі…
Дзяды вялікай сілай звалі
яе — аб сіле запавет:

«Яна, як гнеўны меч, — са сталі,
яна сатрэ сваволле бед,
што праўду Божую распялі…»
Я толькі з ёй пайшоў у свет.

Заву вялікай сілай гневу
вячыстасць колішніх слядоў —
нязломны дух маіх дзядоў,
спакой нябёс, дажджоў улеву,
красу і смутак ніў, садоў,
тугу прыдушанага спеву
у раннім росквіце гадоў
заву вялікай сілай гневу.

Яна вядзе мяне у свет —
туды, дзе йшчэ аб ёй не зналі.
«Яна, як воя меч, — са сталі,
яна сатрэ сваволле бед,
што Беларусь тваю распялі» —
гучыць за мною запавет.
Праз сон, дзе спяць, дзе доўга спалі,
яна вядзе мяне у свет.

1944

ВІТАННЕ СЛУЧЧЫНЕ

. . . .
. . . . — Слуцак блізка… —
Я прыўзняўся, шапку зняў,
паслаў паклон прасторам нізкі.

Цябе я, Случчына, як змог
сустрэў. Прабач, што лепш не здолеў.
Ты ажывіла ад знямог
мяне гасцінным хлебам-соляй.

Не утаю — мне келіх твой
паўным-паўнюткім быў — да краю.
Пад слуцкім небам-сінявой
я чуўся, бы ў палацах раю.

І час пабыту у гасцях
маленькай здаўся мне часінай.
А сяння — зноў далёкі шлях
у Менск, а потым — на чужыну.

Раскруціць шлях даўгі рулон
шашы. Пасля — чыгункі рэйкі…
Сваё вітанне і паклон
пакіну Случчыне навекі.

Цвіці вяргіннаю зарой,
буяй і жытам, і пшаніцай!
Калыбка спраў маіх сяброў,
натхнення іхнага крыніца!

1944, Слуцак

* * *

Мінаю заміны. Нічога,
што з цемрай не ладжу, йдучы, —
знаёмаю змалку дарогай
я выйду на золак з начы.

Пайду я да тых сенажацяў,
да гоняў скіруюся тых,
дзе сцені раздолля не засцяць,
дзе ў цвеце прасцяг залаты.

Дакучных замінаў парогі
пакіну у цемры густой.
Прысяду — спачынуць хай ногі —
і вочы абмыю расой.

Сусвет прада мною вялікі
паўстане ў шматфарбнай красе,
зямля мнагаспеўныя зыкі
да слыху майго данясе.

З паклонам жыццю прывітаю
раскошны сусвет хараства.

— Жыву я! — гукну, і заззяе
мой зірк, бы расою ліства.

І небу, і сонцу ўсміхнуся —
вялікшым у час наш і век.
Да скарбаў сусвету імкнуся,
я іхны, мне ймя — чалавек!

1944

* * *

Я прыйшоў ад зямлі, ад людзей
у сусвет — час плыў хваляю хуткай.
Ад жыцця не ўцякаў анідзе
у пагоню за таннай пагудкай.

О, зямля! Гэта ты, толькі ты
жыццядайнаю казкай шумела;
ты адна майго зла нераты
разрывала, кукобіла цела.

Людзі, людзі! Вы — сіла зямлі,
розум ейны і ўзлёту імкненне,
як жа так вы яе давялі
да руіны — слядоў спусташэння?

Як жа так?.. І калі мільгане
смерці меч — падарожны ёй посах, —
да жыцця ўся істота імкне,
а спакой для душы — у нябёсах.

Як вяртаецца з іх — і зямля
зноў кунежная; людзі з дагодай
засяваюць, надзеі спяляць,
дні ўсцяшаюць зямной насалодай.

Толькі, толькі тады і жыву,
і твару, і душой спачываю,
і у сне, і не ў сне — наяву —
пра зямлю і людзей я спяваю.

1944

* * *

Не сагрэе сонца майго твару,
не ўсміхнецца ў вочы мне блакіт,
калі неба засцяць змроку хмары
і жухнее долу малахіт.

Не, жыццё не ў тым, што чуеш, бачыш,
не ва ўсмешках сонца, не ў цяпле,
і жыццё не ў горы, і не ў плачы,
не ў гібенні блізкага у тле.

А не ведаць сну, не знаць спакою —
і не смерць, таксама й не жыццё.
Ліха жыць з напасцяю цяжкою,
блага йсці з напасці ў небыццё.

Дрэнна знаць раскошу і багацце —
гэта згіне, марна прабяжыць.
Жыць — быць роўным з роўным і змагацца
за сваё прызначанне, каб жыць.

1944

* * *

Аблокаў плач — мая туга,
мая няўцешная панурасць.
Вясёлкі радужнай дуга —
усміх, — пад сонцам слепне хмурасць.

Рассыплюць хмары слёзны сум,
зірне блакіт, луджоны сонцам, —
і я — ягоны аднадум —
такі ж ажыўлены, як ён сам.

Блакіт, вясёлкавай дугой
падпяражы маркоты хмары!
А плачу плач з нудой, з тугой
расплюхні ў сонечным пажары!

Спалі маланкавым агнём,
раструшчы горы гора громам!
Не цёмнай ночай будзь, а днём,
гасціннасць дай сваім харомам!

1944

* * *

І неба ранішнім абмылася дажджом,
зялёным хмелем набрынялі травы…
А я пакінуў Менск, а я — пакінуў дом
без павярхоўнай роскашы і славы.

Трывога дзён маіх, па добрай волі я
сюды, у край паўночны, не паехаў.
Відаць, такая доля ўжо мая —
маё няшчасце і мая уцеха.

Са мною толькі, толькі ты цяпер.
Я чуў ад хлопцаў — ты мне мала верыш.
А я нашу ў сабе самім цябе,
І йду з табой у дзён наступных дзверы.

А з намі крочыць і вясна. З дажджом
нябёсы дар жыцця на дол паслалі.
Вясна, вясна і там, дзе Менск, дзе дом
без павярхоўнай роскашы і славы.

Такі ён сціплы, просты ён такі,
ён даражэйшы мне за ўсе палацы.
Там людзі ў час бяздольны і цяжкі
умеюць жыць і з гневам дзён змагацца.

Ты там жывеш, міжвольная віна,
маіх бясконцых крозаў і ўспамінаў.
Куды ж, куды, скажы, пайшла вясна?
Чаму ж цябе у Менску я пакінуў?

Самотны зноў… Дзвіной сплылі з ільдом
адсветы ў водах — воблакаў купавы…
Вярнуся я, вярнуся ў Менск, у дом
без павярхоўнай роскашы і славы!

17.04.1944, Рыга

* * *

Снег ідзе… Вецер гуллівы да ліпаў — сясцёр сіратлівых —
лёгка пабег, прывітаўся, махнуў белабрысай чупрынай…
Гэткім бываю і я, калі стрэнуся з любай дзяўчынай.

1944

* * *

Дзе ж тая радасць — той дар адзіны
маіх узлётаў, той вечны рай?
З мясцінаў цёмных, з глухой краіны
яна прыводзіць у светлы край.

Вячорны захад тугой жаўрыцца,
усход заранны цвіце вясной.
Замкну павекі — яна мне сніцца,
адплюшчу вочы — яна са мной.

На лёгкіх крыллях імчыць да высяў,
за стромы гораў — туды, дзе ўзлёт.
Заўсёды бачся, штоночы сніся,
радзі аздобу, спялі ўмалот!

1944

РАДАСЛАВУ АСТРОЎСКАМУ

У час пахмурнай непагоды,
у шэры, немарачны час
на кліч крывіцкага народу
ішоў ты з намі, вёў ты нас.
Каб скінуць з плеч ярмо пакуты,
каб край не быў навалай скуты,
павёў нас, вояў, за сабой.
Праз перашкоды нэндзы й гора,
праз цемру змрочных касагораў
змагарна мы ішлі у бой.

Шлях слаўся нам балотам топкім,
быў лесам цёмным і густым.

Мы не сцішалі цвёрдых крокаў
ні праз агонь і ні праз дым.
А ўсход заліты быў чырвонай
крывёй зары — крывёй мільёнаў,
насіўся смерці здрадны цень.
Плылі густыя ўранні хмары,
шугалі вогненным пажарам,
агністы сыпалі струмень.

Мы не спынілі цвёрдых крокаў,
мы не схілілі галаў ніц.
Гаілі болесць ран глыбокіх
ажыўчай свежасцяй крыніц.
Хай перавага грэшных сілаў
атаку першую адбіла, —
нам знічыць слава новых дзён!
Каб скінуць з краю зло пакуты,
каб ён не быў навалай скуты,
у бой, у новы бой ідзём!

Мы не спыняем цвёрдых крокаў,
мы не схіляем галаў ніц.
Сабе цярэбім шлях шырокі
праз хмары дыму, праз агні.
Той перавагу й сілу мае,
хто веры ў прышласць не губляе —
яе народзіць новы бой!
Таму вянкі нязгаснай славы,
хто нас праз гром віхурнай лавы
вядзе змагарна за сабой.

1944

ЛІСТЫ НА ВЕТРЫ

Пустыя выгукі — лісты на ветры,
рыторыка — спажытак для нуды.
Мне без душы — што птушцы без паветра,
без сэрца мне — што рыбе без вады.

«Дазволь памерці за цябе, айчына!» —
«У бой! У бой!
Да заваёў!
Да чынаў!» —
не кратае ні зблізку, ні здалёк.

Яно не жывіць ні душы, ні сэрца,
яно — сухі пясок глухіх дарог —
ні да жыцця не кліча, ні да смерці —
ахвярнасці у славу перамог.

Бо і расціна на пяску завяне,
застыгне кроў яе — жывільны сок,
калі крыніцаў свежасць перастане
паіць ажыўчай волагай пясок.

1944

* * *

Смерць цэліла ў грудзі кап'ём,
і людзі ў магілу таптали...
Дабрыдзень, збавенне маё,
дабрыдзень, прыветлівы Талін!

Я йшоў у знямозе і бег
далей ад крыві, ад змагання.
— Ці варта табе ў барацьбе
імя чалавечае ганьбіць? —

пытаў я ў кагосьці. Нідзе
не чуў у адказ я нічога.
І як чалавек, да людзей
прыйшоў папрасіць дапамогі.

А сэрцы людзей, бы куп'ё,
мне мох на душы пластавалі...
Дабрыдзень, збавенне маё,
дабрыдзень, прыветлівы Талін!

Ад пекла хачу супачыць,
да раю — дарога цяжкая.

Дай, Божа, спакой! Уначы
хай белая здань не блукае!

Хай чорнаю хмараю ўдзень
пагібель мяне не трывожа.
Ратуй ад нядобрых людзей,
вялікі, магутны мой Божа!

Успомніў імя я Тваё —
і смерці пагрозаў не стала.
Дабрыдзень, збавенне маё,
дабрыдзень, прыветлівы Талін!

1944, Талін

СТАЎСЯ ЎСЮДЫ ГОСЦЕМ ВЫПАДКОВЫМ

Стаўся ўсюды госцем выпадковым.
Дзе ні ступіш — ля чужых варот.
На дарозе ўбачыў я падкову,
а ляжыць яна наадварот.

У Еўропу з Азіі сабраўся,
не даехаў — выгналі назад.
Пэўна, спераду яшчэ бяда ўся,
бо падкова — перадам назад.

Што мяне спаткае — невядома.
Непамысныя вакол сляды.
Ці назад, ці ўперад — ты не дома.
Словам — ні туды і ні сюды.

1944, Лібава

ДЗВЕ ЗІНЫ

На канцэрт прыйшоў з адной дзяўчынай,
Яе Зінай клічуць, як і вас.
Вас убачыў, Зіна, і на Зіну
Я забыўся ў перапынку час.

І ні Зіны той, ні Зіны гэтай
Не праводзіў я тады дамоў.
Сумавалі ўвечар два паэты —
Я і сябра мой, Масей Сяднёў.
Дні прайшлі... Цяпер я з вамі, Зіна,
А мо гэта толькі зманны сон?
Гэта вы — адзіная прычына,
З-за якой не бачу колькі дзён
Гэтай Зіны. Я кажу вам гэта
І напомню зноў, успомню зноў,
Што кахаюць вас аж два паэты —
Я і сябра мой Масей Сяднёў.
Без падману, хітрасці і змовы,
Хоць спаўю душу сваю тугой,
Вас усю аддам я М. Сяднёву,
Паміруся з Зінаю другой.
Хай забудуся на Зіну зноў я,
Не скажу, што Зіна нічыя, —
Неспакой і шчасце М. Сяднёва,
Неспакой Алеся Салаўя.

13.01.1945, Берлін

* * *

Мне твая спадабалася ўсмешка
І пагляд непадманны вачэй.
І, здаецца, — былі мы на ўзмежку
нашай дружбы. А жыць не лягчэй.

І не стала лягчэй на душы мне:
быў узмежак, мяжы — не было.
Па-ранейшаму я — на чужыне,
што было — дык і тое сплыло.

Мне здавалася — будзем сябрамі,
хоць у думках пабудзем парой
на радзіме з палямі, з барамі,
з небам сінім, з барвовай зарой.

Ну, а ты? Ты усім расказала,
расказала з таго ні з сяго:

— Гэткіх тыпаў заўсёды я знала,
горшых, пэўна, няма за яго.

Мне ж у вочы: — Дзіця — не мужчына.
Што й казаць — я дзяцей не люблю…
…Пасябрую з другою дзяўчынай,
на мяжу новай дружбы ступлю.

І без болю сыду я з узмежка
дружбы сянняшняй — будзе лягчэй.
Пасябрую з другою усмешкай,
з непадманным паглядам вачэй.

25.01.1945, Берлін

СЛУЧАНКА

Вочы твае — васількі. Я не бачу
радасці ў іх. Хто пакрыўдзіў случанку?
Многа няўцехі, балючага плачу
ля негасціннага ганку.

А за спіною — суровыя дзверы;
іх зачыніла твая валадарка,
носьбітка расы — чысцейшай без меры;
ты, беларуска, — татарка…

Зараз няшчасце вялікае ў пані
(з ім жа і гнеў — на цябе, небарака):
здох пры паданым табою сняданні
ейны ўлюбёны сабака.

Пані ў распачы ліхой, у трывозе
рэчы твае ў калідор паўкідала,
аж да цямна — ля дзвярэй на марозе —
кару адбыць загадала.

…Белую шаць асыпаюць таполі,
з імі прыгадвае дом свой случанка.
Плачуць мае васількі у няволі —
цяжка табе, паланянка.

16.02.1945, Вена

* * *

Так і сталася: тую, другую,
пра якую так марыў, знайшоў.
Сам за тое сабе не дарую,
што да той ад цябе я пайшоў.

І не ты, і не ты, а — другая,
з ёй інакшым зрабіўся, другім.
Быў табе дарагім, дарагая,
а ў другой… я не стаў дарагім.

Меў цябе і пагляд твой цікавы —
ён агенчыкам знічным гарэў,
і пры шклянцы халоднае кавы
ім я сэрца сцюдзёнае грэў.

А ў другой… непрывабная ўсмешка,
твар, бы месяц, маўклівы ў другой.
Ні мяжы новай дружбы, ні ўзмежка
не адчуў пад сваёю нагой.

Я не ведаў другой. І другая
не са мною была, а з другім.
Зноў прыйду да цябе, дарагая,
дай жа Божа зноў быць дарагім.

Люты 1945, Берлін

* * *

З агню вар'яцкага, з пякельнай цемрыні,
ад дзён, што ночамі зрабіў пажараў дым,
уцёк я да палёў. Зірні, зямля, зірні,
ці ж быў раней такім сухім я і блядым?

Як жыў табой, тады не ведаў цемры я.
І быў тады, як ты, прыбраная вясной.
Цяпер жа? Кажаш мне — цяпер я не твая.
А ты? Ты месяца жыхар, чужынец мой.

25.03.1945, Вена—Швадорф

* * *

...У дзявочыя вочы, як зоры,
мне цяпер, як глядзеў, не глядзець.

М. Сяднёў

Да жыцця ад пагібелі крочу,
а ратунку не бачу нідзе.
Мне на вас, непаўторныя вочы,
як глядзеў я раней, — не глядзець.

Давядзецца мне долу зваліцца,
патрабуе пагібелі лёс.
Будуць гэтыя вочы журыцца
і ніколі не выплачуць слёз.

Хай яны не гавораць аб гэтым, —
уяўляю такімі я іх.
Каб не быў я у сэрцы паэтам,
дык спяваў бы цяпер аб другіх.

Вочы шчырыя, вочы без жалю
я журботнымі змог уяўляць.
Мне яны ўсю душу ўсхвалявалі —
так ніхто йшчэ не ўмеў хваляваць.

І цяпер ім я смутак прарочу,
не даю ім на радасць надзей, —
мне на вас, непаўторныя вочы,
як глядзеў я раней, — не глядзець.

08.04.1945

ДВАЦЦАЦЬ ТРЫ

Мне сяння роўна, роўна дваццаць тры.
Жарства мне ногі рэжа, плечы — клунак.
Аснежных Альпаў гайсуны-вятры
мяне загналі на спачын у клуню.

Паблізу — цёплы дом... І я прылёг.
Ды сэрцы — лёд... Адчуў сябе, як дома.
Аб днёх спакою, вельмі рэдкіх днёх
мне прыгадала пахкая салома.

Такі, знаёмы змалку, тхненны пах.
Ідзе хтось… «Дзеду?..» «Блуд, унук, шмат блуду…»
Стаіць з даўжэзнай люлькаю ў зубах
двухногі вырадак, тупы адлюдак.

«Weg! — кажа ён. — Ты бачыш — keine Platz,
тут працаваць мне трэба, ты — заміна».
Як быццам я не ў клуню, а ў палац
зайшоў — ягоная так цвердзіць міна.

І я пайшоў. І ўпарта па шляхох
чужых, няласкавых, праношу ўпотай
усё, чым я жыву і што збярог
у сэрцы, не падужаным Гальготай.

Імкненне, след нялюдскасці сатры!
Няхай яна ў нябыце люльку слюніць…
Мне сяння роўна, роўна дваццаць тры.
Жарства мне ногі рэжа, плечы — клунак.

01.05.1945

МАЙМУ КАХАННЮ

Шкада, а вам не зразумець
мае, для Вас чужое, мовы…
Я ў Вашых буду летуцець
абдымках палкіх без размовы.

Засну, і ў першым сне да Вас
прыйду, і буду да світання.
Няхай шуміць ля вокнаў вяз
пра нас дваіх і… пра каханне.

Прыйду, прыйду… Хай усяго
сказаць у словах не сумею, —
маіх пачуццяў пал-агонь,
а пацалункі — джала змея!

Сказаць «ich liebe» ўмею я.
Люблю — маіх жаданняў словам.
Sie meine — Вы мая, мая.
Скажу астатняе без мовы.

Прыйду, прыйду. Сугрэю Вас,
Вас абдыму, Вас расцалую.
Кахаю я не першы раз.
Так моцна першы раз люблю я.

12.05.1945, Кірхгайм

КРЫЖОВЫ ШЛЯХ

Нарадзіўся Ты — з Табою
быў Ісус Хрыстос.
Змыць Цябе валвой прыбою
прагнуў бураў стос.

Дзень мінаў — разбою хвалі
большалі ўтрая.
У раз'юшанай навале
стаў на ногі я.

Неслі разам крыж пакуты —
Ты і я з Табой —
і цяглі няволю й путы
зморанай ступой.

Чорт вязаў нас ланцугамі,
нашы душы трос.
Мы цярпелі — разам з намі
быў Ісус Хрыстос.

А пасля… Твой твар пахмуры…
Ты ў агні гарыш…
Разлучылі нас віхуры —
стаў цяжэйшым крыж.

Не міну з тупой гурбою
ні адной вярсты.
Там, дзе Ты — і я з Табою,
а дзе я — там Ты.

Да ўваскросу ў свет нязнамы
дойдзе — хто ўсё знёс.
Мы ідзём, і разам з намі —
Сам Ісус Хрыстос.

1945, Кірхгайм

МАЛІТВА

Як боль свой выказаць хачу я —
Твой боль з грудзей маіх імкне.
Хто без Цябе мяне пачуе?
Цябе хто ўчуе без мяне?

З табой разлучаны, я страціў
сябе самога; ён адзін —
супольны смутак сына й Маці,
глыбокай болесці зацін.

Да надзямнога Валадара —
у зле разлукі — Ты ці я
маліцца будзем: гушчу хмараў
мальба не ўзбурыць нічыя.

Яна не зрушыць засць начную
і беспрасвецця не міне.
Ён без Цябе мяне не чуе,
Цябе не чуе без мяне.

Вялікі цуд жыцця, збавенне —
далёка ад Цябе ў глушы
адчуць Твайго багаславення
на сэрцы хрэст, цяпло ў душы;

пачаць малітвай — і не дарам,
няхай у думках, нам, дваім,
размову з вышнім Валадарам —
маім Вызбаўцам і Тваім.

Малітва зрушыць засць начную,
сустрэчы нашай днём блісне.
Са мною Ён Цябе пачуе,
з Табой пачуе Ён мяне.

1945

СМУТЛІВАЯ МАЦІ

Адарвалі, схапілі, сілком павялі.
Зледзянелыя хмары. І водгулле грому.

Ці жыве на далёкай зямлі?
І ці прыйдзе дадому?

І начамі, і днямі — з відна да цямна —
чорны жах у сваволлі нявінных лякае...
І смутлівая ходзіць Яна —
сына, сына шукае.

А па промені сонца — па нітцы даўгой —
аганькамі сцякае аблокаў ільдзіна.
— Як знайсці? Як пабачыць Яго?
Дзе зняволілі сына?

— Замолчать! —... І на твары маршчыны зляглі.
Горыч слёзаў... Пра болесць — нідзе і нікому?
Ці жыве на далёкай зямлі?
І ці прыйдзе дадому?

І здаецца стагоддзем часіна адна.
Без канца павучыну праносень сукае...
У сваволлі крывавым Яна
плача — сына шукае.

1945

СПОВЕДЗЬ

Ва ўпал, калі вецер ледзь дыша,
я ніву сваю араў.
Падвечар прылёг у зацішша
руцвяных траў.

І сонца — пабачыў санліва —
паволі ішло на схіл.
Марнела няўзоранай ніва —
не стала сіл.

Ці смеў я пакінуць работу —
няўтомнага дзеда ўнук?
Спалохаўся ўпалу і поту,
і болю рук?

Падбіта нязломных імклівасць.
Нямоцна ты плуг трымаў!
Бясслаўна прылёг у санлівасць
руцвяных траў.

Няўжо не здалееш, араты,
страхнуць свае зморы пыл?..
Няшмат — я ў адным вінаваты:
не стала сіл.

1945

GLORIA MUNDI

Вялікі ён, праўдзівы й непраўдзівы,
спагадлівы і хмуры — шырны свет.
Вядуць яго нябачаныя дзівы
і ў нурны змрок, і ў сонечны прасвет.

Ягоны я і валадар, і мучань,
адыстар ён — і сем'янін, і госць…
Як дойлід, стой над ім, пад ім — як вучань,
не пакідай яго такім, як ёсць!

І станецца: абыдзеш тлум знікомы,
дакорны зман з пагардай абмінеш —
паўстане ён, шматзорны, велікомы,
хвала яму не мецьме спыну й меж.

І чуцьмеш крык няверства: ці ж магчыма
пабачыць свет без цемры, без руін?
І ціснуцьме яно ў гурме плячыма,
асуджвацьме… Адчуеш: ты — адзін.

Адным і будзь! У мностве — глум бясчынны.
Свае душы зняменню не аддам!
Са мною ўсцяж і ўсюды — дар глыбінны:
«Той дужы, хто не ў гурце йдзе, а сам!»

1945

УЗНЯЎСЯ СОКАЛ У БЛАКІТ

Узняўся сокал у блакіт,
здалеўшы ўзлёту шлях цярністы.
А дзень шматфарбны, прамяністы
са скарбаў вышніх тчэ свой міт
і рассцілае аксаміт,
нікім не сплямлены і чысты…
Узняўся сокал у блакіт,
здалеўшы ўзлёту шлях цярністы.

Застою — цемень, хмуры дол,
імкненню — высь, харомы Феба.
Наймізарнейшая амеба —
і тая шле пратэст вакол:
хто птаху даў на ўзлёт дазвол?
Адказ грыміць з вышыняў неба:
бяскрылым — ніз, пахмуры дол,
крылатым — высь, харомы Феба.

Труслівым — гібель. Мужным — лёт,
перад нікчэмствам — непакора.
А зла і зайздрасці дакоры —
куслівай жоўці марны плод;
ніколі ім з гнілых балот
не ўзняцца ў свет нязгасных зораў,
у свет, дзе думкам праўдным — лёт,
дзе дух імкнення — непакора.

1945

* * *

У сузор'і заззяе Колас —
а трывогу хіба я ўтаю?
Чую сэрцам Цябе, Твой голас,
бачу ў думках красу Тваю.

І душою да светаў зорных
я імкнуся — не ўняць ляты,

а між імі — вянок спазорны;
мне здаецца, што гэта — Ты.

Прывітанне, мая Астрэя!
Над зямлёю свяці, свяці!
Заранiцай хай даль жаўрэе
у бяздзённі — маім жыцці;

хай у хмурай чужой краіне
не згасае яно ў журбе.
Ці Ты помніш аб верным сыне?
Не забудзе Твой сын Цябе.

Не тускней жа! Святло развее
цемру пусткі, пяскоў сувой.
Прывітанне, мая надзея, —
непагасны правобраз Твой!

1945

ЯЛІНКА

«Наш Божа, татку нам вярні,
нядобра нам адным...»
Ялінка. Дзеці. І агні,
і дым, сінявы дым.

А я, дарослы, поўны ўяў, —
бы прывід нябыцця.
Чаму не дым сінявы я?
Чаму я не дзіця?

Чаму? Ці здолеў бы дзіцём,
ці змог бы дымам быць?
Пакутным змучаны жыццём,
мой дух юнацкі спіць...

Як загудзе калядны звон, —
ад таткі мо прывет? —
прачнецца дух той, возьме ён
мяне ў прывабны свет,

у гэны дзіўны свет, куды
на крылах сны ляцяць,
дзе вёсны, вечныя сады,
дзе росы зіхацяць…

Ялінка. Дзеці. І агні,
і дым, сінявы дым.
«Наш Божа, татку нам вярні,
нядобра нам адным…»

1945

ЧАКАЙ

Чакай, чакай,
юнацкіх дзён парыў імклівы,
да новых вёснаў шчэ — зарана, не ўцякай!
Я не дасяг мяжы твайго прыліву,
чакай, чакай!

Калі, калі
ты змог мяне мінуць употай?
Мільгнуў здалёк і знік — і астры расцвілі…
Хто ж хутка так спахмурыў іх маркотай?
Калі, калі?

Няўжо, няўжо
я не вяшчун твайго прастору?
А без цябе ўваччу — імгла, журба крыжоў…
Няўжо твой крок — слухмянасць непаўтору,
няўжо, няўжо?

Чакай, чакай,
юнацкіх дзён парыў імклівы,
пакуль вясна цвіце — ёй змены не шукай,
не пакідай дацвітваць сіратліва,
чакай, чакай!

1945

СУСТРЭЧА

Не забыўся я насуплівай міліцыі —
пагражалі вы дручынаю гумовай:
— Выбью, выбью вам отсталые традиции! —
гаварылі мне абурліваю мовай.

А чаму ж цяпер з нясмелаю гаворкаю,
быццам вы мяне, забытага, пазналі,
падышлі бліжэй: — Богаты ль вы махоркою?
На один дымок рассчитывать нельзя ли?

Адышло ў нябыт уладнае калішняе.
Вы абдзёрты ўвесь — усцешанасць не ў жмені…
Пры маёй душы спустошанасць не лішняя,
мо яшчэ што ёсць — вытрушваю кішэні.

Што магу — даю. Мізэрнае здаволечы
«на дымок» стае — хай сэрца ў вас не ные:
мо патрапяць лепш аддзячыцца дзе-колечы
на шляхох крутых «традиции иные».

1945

* * *

Вянкі, табе вянкі,
аздобная краса!
Буйней, ідзі ў вякі,
з няволі ўваскрасай!

Табе нязгасна жыць
у сэрцах у людскіх.
З табой не засушыць
вянкоў, вянкоў маіх.

1945

* * *

Скажаш мне — і пайду
праз лясы, праз узгоркі.
Хай далёка знайду
хлеб няўцешны ды горкі.

Але будзе той хлеб
за цябе маёй мукай;
горны край, дальны стэп —
не даўгою разлукай.

І цярпенне маё,
і мой шлях у нязнанасць —
прабуджэнне тваё,
небыццю непадданасць.

1945

* * *

Хай не стукаецца ў дзверы
глухата часін засмучаных.
Не ідзі на скрып асвера
да крыніц, змяёй атручаных.

У абдымках іхных тоне
подлы зман і здрада чорная:
назаўсёды свае тоні
замуціла сінь вазёрная.

1945

* * *

Што ўчора мінула — ніколі
не пройдзе шляхамі наўколля.
А сяння — да крозаў поспех.
А заўтра — збытога посміх.

З'яўляйся ж і станься красою,
разліся блакітнай плюсою —
і яснай усмешкай рання
вянок твой мне ў вочы гляне.

1945

* * *

А прайшоў я ці мала дарог у свеце —
мне было не да стомы ног.
Дзе вы, золку агні? Па начох не спеце:
за спіной — велікомы лёх.

Асляпляйце яго — і, як сон, з далінаў
злыне чорная сажа дзён.
А блакіт?.. — Воч маіх ты ў палон не кінуў, —
пра цябе так хай кажа ён.

1945

* * *

Дабрыдзень, мая зарніца!
Даспела твая пшаніца.
Прынось жа свой серп хутчэй,
і ніве — цяжар з плячэй.

І сноп ты, зажаўшы, звяжаш,
пры працы мне шмат не скажаш.
А вечар дыхне з лагчын —
пачую: «Цяпер спачын».

1945

* * *

Найпершы парыў абяскрылены
штормам імгненным.
І досвітку ўсмешкі ахінены
дымам ваенным.

А даль, як і ўчора, туманіцца
тропам цярністым…

Ідзе не барвоваю раніцай —
змрокам імглістым.

Так рана ў дарослацсць канодныя
кінула косці.
Мінае княі непраходныя
без маладосці.

Ды як перад ёй ні туманіцца
шлях непаўторны —
вяшчуе наступную раніцу
промень вячорны.

1945

* * *

Далёка няўцеха развітання,
няблізка сустрэчы новай дзень.
Ды сілаў адной табе ці стане
падужаць суцьмежную глухмень?

Не думаць — не быць табой сугрэтым…
Хай неба — у засціле нямой, —
на волю імкнуцца перад летам
струмені, закутыя зімой.

Пшаніца расце аж пад аблокі,
і сонца святлее па сяўбе.
Даўжэйшы мой шлях у свет далёкі —
бліжэйшы зварот мой да цябе.

1945

* * *

З табою разам быў. Гайна… Крозы…
Ніколі забыццю не аддам.
А пацалунак твой… Дзве бярозы
і ўсхваляваны шум — зайздрасць нам.

Я многа бачыў іх. Свет бяскрайны
на ўзмежкі долаў-гор іх занёс.
Ды не забыцца мне водаў Гайны
і сведкаў цёплых стрэч — дзвюх бяроз.

І спатыкаю зноў. Быццам тыя.
Ці ж быў далёкім я і чужым?
Ды мне цяпер яны — як святыя,
і сумны мой пагляд — зайздрасць ім.

1945

* * *

Ой жа хітрунніца якая —
выгляд маленькае дзяўчынкі…
Ланяй нявіннай уцякае —
дзе ж там шчаслівыя абдымкі?!

Цяжка — не ўгонішся за ёю.
Як жа няўлоўную спаймаю?
Раптам павольнаю ступою
бег свой суцішвае ля гаю.

Блізка — далёкая так блізка.
Ой жа і хітрасць у дзяўчынкі!
Гасне сукленнае агніска.
Будуць шчаслівыя абдымкі.

1945

* * *

Мінаюць дні. Прайшла вясна. Адззяць і лету.
А з дня на дзень чакаеш ты — яго няма.
Загінуў мо далёка дзесь у злыднях свету?
Забыўся мо — і неспакой трымціць дарма?

А бэз адцвіў. І сенажаць зграбае травы.
Растуць жыты. Ім не мінуць сярпа й вязьма.
Хмурнее твой пагляд вачэй — такі яскравы.
Чакаеш ты і тужыш ты — яго няма.

1945

У ДЗЕНЬ НАРАДЗІНАЎ

Ідзе насустрач дваццаць пяты год,
а за спіною — дваццаць і чатыры.
Спявай, спявай пра край мой і народ,
яшчэ гучней спявай, надзеяў ліра!

Звіні зычней і неўгамонна грай.
Няхай жа з граннем збудуцца надзеі!
Грымі, што я вярнуся ў вольны край,
што не загіну, не памру нідзе я.

Міну тлумлівасць, «суету сует»
і абыду наўкол «тамленне духу»…
Мой край! Зірні праз мур няволі ў свет,
прыўстань і насцярожся, і паслухай.

Ці бачыш безліч войнікаў-сыноў?
Ці чуеш іхны гулкі, вольны гоман?
Жывеш адзіны Ты ў мільярдах слоў,
і даўніна, і славы дух не зломан.

Яны асілкі — войнікі-сыны.
Мінае ім дваццаты, дваццаць пяты,
і больш, і менш. Усе, усе яны —
Твае, Тваімі й вернуцца дахаты.

Зварот не будзе «суетой сует»,
не будзе ён цяжкім «тамленнем духу».
Пабачыць волі свет і праўды свет,
як пад зваротам тым свет цемры рухне.

І мне міне тады больш сталы год,
і я скажу ізноў, як сяння, шчыра:
— Пра неўміручы край мой і народ
яшчэ гучней грымі, збытога ліра!

01.05.1946

* * *

А ўсё ж мы вернемся дахаты, у Айчыну,
і не заблудзімся ў шляхох чужой зямлі.
А я вярнуся не адзін, а з сынам —
нашчадкам крывічоў і іх сям'і.

Скажу, укленчыўшы: — Крывіччына святая!
Хай Ты насмерць была распятай, а жывеш.
Тваіх дзяцей ні даль і ні імгла густая
не абясплодзілі ў чарсцве пустэльных меж.

Жывому — жыць. Знішчэнню — смерць. Жывое
кідае па сабе жыццё. Жывому — плод.
Ты не памрэш, Крывіччына! З Табою
ніколі не памрэ крывіцкі род.

12.05.1946

ПРОШЧА

1

Не ўзышла заранiца —
толькі морак імгліцца.
А душа не смяецца —
птушкай раненай б'ецца.
Богу я памалюся —
лёгкай мрояй зраблюся.
Паляціць мая мроя,
далячынь перакрое;
праз узгоркі, праз гаці
паляціць аж да Маці,
да бярозкі танклявай
з пахмурнелаю славай.
Пад бярозкай бруіцца,
прагне волі крыніца —
там, закуты заўчасне,
ейны водбліск не гасне.
У пакутах, у страце
там праходзіла Маці,

ля крыніцы стаяла,
свайго сына гукала.
А срабрыстыя воды
вобраз той назаўсёды,
як у люстры, адбілі,
следу мукаў не змылі…
А душа не смяецца —
птушкай раненай б’ецца.

2

Не спыняйся, пануры, —
не спакорышся буры,
з непаўстрымнасцю ў пары
выйдзеш, выйдзеш за хмары.
Станеш з думкаю яснай
пад вясёлкай нязгаснай.
За вясёлкавай брамай —
ты ля прошчы ля самай:
ля абвеянай славай,
ля бярозкі танклявай.
Пад бярозкай бруіцца,
звоніць срэбрам крыніца,
і — заўсёды жывая —
як вясёлка, зіяе.
Па дарозе цярпення —
той дарозе збавення —
там праходзіла ў шаце
Маці — Божая Маці,
ля крыніцы стаяла
і Ісуса шукала.
Дабрадайныя воды
вобраз той назаўсёды,
як у люстры, адбілі,
сілы духу не змылі.
Там ратунку амбона —
там твая абарона,
там пазбава ад буры,
не спыняйся ж, пануры!

1946

ГАМОНІЦЬ ДАЎНЯЙ ПРАЎДЫ ЗВОН

Гамоніць даўняй праўды звон,
гудзе — не мае зморы.
І моўкне ціхі, мірны сон
за горамі, за морам.

За морам, горамі — спакой
і людзі спяць спакойна…
А над калыбкай дум і мрой
узняты меч разбойны.

Няверцаў душы, як слата,
на люд, на край напалі.
І сына Божага — Хрыста,
зняславіўшы, распялі.

Хрыстовых праўднейшых сыноў
аддалі на згіноту.
А звон — той слаўны звон вякоў —
укінулі ў балота.

Спалілі хаты, а людзей
па свеце разагналі,
аддалі прышласць злыбядзе,
былое патапталі.

Здалося, знішчылі жыццё
нявернікі бясчэсне,
здалося, ўсё у небыццё
пайшло і не ўваскрэсне.

Здалося, змоўк навекі звон,
пайшоўшы на сканание.
Ніхто не чуў, як плакаў ён
у топкай вечнай твані.

Ніхто не знаў, як звону гнеў
збіраўся ў дружны гоман…
Звон страпянуўся, зазвінеў,
над светам грымнуў громам.

З сівых глыбіняў даўніны
і з ланцугоў палону
пачулі вольнасці сыны
кліч праўды і праклёну.

Праклён — няверцам смерць і страх,
а праўда — золак дзіўны.
Я на выгнанніцкіх шляхах
пачуў той кліч прызыўны:

«Выходзь, мой сыне! Уставай,
зірні — вакол прадвесне.
Ідзі за праўду ў бой! Твой край
без праўды не ўваскрэсне».

І з даляў свету усяго —
і ён, і я — мільёны —
ідзём — і ведаем чаго —
ідзём на покліч звону!

Хай з даляў блізкім будзе край,
хай зніч мільгне з-за долаў!
... Журба палёў, маркотны гай,
Айчыны сумны голас...

1946

ALEA ACTA EST!

Alea acta est! —
вырвецца зычна з грудзей.
Багаславення хрэст
дасць мне зычлівасць людзей.

Пераступлю Рубікон
спраглых чужынных шляхоў.
Як усміхнецца мне кон?
Дзе ад залогі дасць схоў?

Поўнач схавае мяне,
цемрадзі поцем густы;

досвітку промень мільгне —
ветла прытуляць кусты.

Рушу далей — і мурог
змые расою сляды.
Збочу з пагрозы дарог,
траплю ў хмызняк малады.

Стрэне з прыхільнасцяй лес,
будзе выспельваць мне план,
каб неўспадзеўкі пралез
я аж да ворага ў стан.

Станаў парадак і лад
шчэ не трапляў пад напасць.
Сыты нягоднік і кат —
злодыр той — будзе йшчэ спаць.

Будзе ён сон залаты
бачыць у царстве бярлог…
Перасягну праз драты
і праз апошні парог.

Ворагу крыкну ўсупор:
Alea acta est!
Гневу няўтрымны супор —
помсты апошні жэст.

Вобзем тырана шпурну —
зваліцца туша, як сноп;
скокну, як рысь, на спіну, —
каб у абоймы не згроб.

Кіпцямі горла здушу,
рэбры патрушчу, хрыбет
скомсаю, вырву душу —
гідкі антыхрыстаў след.

Неба маланкай мільгнець,
змые ўсю пораш дажджом.
З бліскаўкай — цемры канец! —
гулка пракоціцца гром.

Выйдуць і з местаў, і з сёл
тыя, каго не суняць,
славы сваёй аўрэол —
сцяг перамогі узняць.

Вольнасць і дух даўніны —
іхных імкненняў змест.
Чуеце? Крочаць Яны!
Alea acta est!

1946

ШВЕЙЦАРЫЯ

Думкі следам — як рой.
Выгінаецца троп, як змяя.
А за стромай гарой —
ты, Швейцарыя, казка мая!

Мне казала яна,
гэта казка: «Я — сонечны дол
залатога руна,
я — высокіх узвышшаў анёл.

Пад паглядам маім
думкі смелыя хлынуць ракой,
з імі — праўда, не дым,
з імі — воля, сугодны спакой».

...На яе паглядзець
я хачу хоць з высокай гары.
Пачынае хмурнець.
Палыскуе маланка ўгары.

Вецер скалы скрабе,
дождж бубніць, як удары кап'я...
Не пабачыў цябе
праз нахмуранасць, казка мая!

1946, Форальбэрг

СНЕЖАНЬ

Ты прыйшоў… Хто, няласкавы,
нестрыманасць звязаў?..
У прастор, у свет казкавы
ты свой шлях паказаў.

Зашумеў шугавеяю,
разаслаўся радном…
І няўжо не сумею я
быць са снежанскім днём?

Ці адчую, як шчыплецца
Дзед Мароз (колькі ўцех!)?..
І лятае, і сыплецца,
і мітусіцца снег;

шлях іскрысты ў свет казкавы
разаслаў, паказаў.
Хто, суровы, няласкавы,
нестрыманасць звязаў?

І хіба ў непасталасці
маладыя гады?
І няўжо я са сталасцяй
падружыў назаўжды?

Сталасць, сталасць хаморную
абыду, абміну,
і маленства задорнае
здаганю я, вярну.

Перарэжу сцяжынкамі
поле снежнае, гаць,
з пухавымі сняжынкамі
я пайду танцаваць.

Панясуся ў свет казкавы —
дзень там светлы заззяў…
Хто, суровы, няласкавы,
нестрыманасць звязаў?

1946

МАЛЕНСТВА

Пад беллю дрэвы маўчаць прарочa,
ля хаты ходзіць мароз дзябёлы…
А ён праз шыбы пабачыць хоча
снягоў сувоі — такі вясёлы.

На сцежцы ежу знайшла сініца,
працяглым ветрам зіма ўздыхае.
Глядзіць, глядзіць ён, не наглядзіцца,
смяецца, ручкай, як птах, махае.

Мой сынку, сынку! І я з табою
такім пацешным, як ты, раблюся;
ваюю смела са злой зімою,
імчуся ў звабнасць на снежным пусе.

І за сініцай, за госцяй з гаю —
хачу ўвагнацца — няўціхны, жвавы,
халодны вецер з двара ганяю,
у снах вітаю ўсясвет цікавы.

Адплюшчу вочы… О, дайце змогу
мінуць няспогадзь — пары шаленства! —
І я знаходжу сваю дарогу
у хорам светлы майго маленства.

1946

СПІ…

Ты адзін — усё-усенькае:
радасць, мукаў забыццё.
Немаўля маё маленькае,
найсвятлейшае жыццё.

Спі, мой сынку… Аргентынаю
не злякае сябра-сон,
нешчасліваю гадзінаю
над табой не дзынкне ён.

Гаварыць пачнеш — часінкай той
зможаш праўду сна ўяўляць.

Кажны рух твой новы, сынку мой,
будзе родным прамаўляць;

не ўсміхнецца ні Бразіліі,
ні Алясцы, ні Канго…
Станьце ж, станьце, сны, ідыліяй
непадкупнага, свайго.

Не крануць хай слыху ценькага
словы: Перу, Парагвай,
і няхай у снах маленькага
ажыве бацькоўскі край.

1946

* * *

Пачні з Гамера, ці пачні з Сакрата:
паэтаў — безліч, філасофаў — цьма.
А хто нячутых зыкаў струны кратаў?
Няўжо такіх шчэ не было й няма?

Былі — іх слова ў свеце не прапала
і не лягло ў згібенні на таку.
І несмяротны будучы Купала
Гамеру цісне — бачу я — руку.

Музыкі вечнага не змоўкне лера.
Хто йдзе ў вякі — той не памрэ зусім.
Вітае двух — Сакрата і Гамера —
разважны й спеўны будучы Максім.

А дзе ж нашчадкаў дружная кагорта,
і як «у перашкодах дух расце»?..
Пражытае даўно кійком падпёрта,
а новае пляцецца у хвасце.

Як мала толькі быць адным паэтам,
каб з мудрасцяй вялікшай падружыць.
Як цяжка, цяжка ў збітым, перапетым
пад атамнай насупленасцяй жыць!

Хто шлях з цяжкой стагнацыі пакажа?
Хто думку ўздыме вышай устакрат?
Калі ж яшчэ нясказанае скажа
цяпершчыны Гамер або Сакрат?

26.09.1946

* * *

З мройнай задумай моўкне бор.
Мату пад ногі сцеле сад.
З дрэваў скідае лістапад
найраскашнейшы іхны ўбор,
жорсткім іржышчам, як сілом,
ловіць ён лісце за сялом.

Смутак таполяў і бяроз,
змрочнасць каштанаў, хмурнасць ліп.
Зорыш наўкола… Жальны ўсхліп?
Слёзы, што вецер з лісцем строс?
Радасць і ўсмешкі, ці наслань?
Гмур і маркота, ці талань?..

Гэтак нядаўна высь вітаў,
сяння ў развазе долу рад;
заўтра шукацьме твой пагляд
сцішы, спакою, мяккіх траў.
Але ці ўздымеш ты з-пад ног
тое, што ўбачыць шчэ не змог?

Найраскашнейшы чар-убор
з дрэваў скідае лістапад…
Знаеш узлёты, іхны спад,
ломіш дуб-волат, мал-чабор,
папараць бачыш, а не цвет:
зрокам няўлоўны па-надсвет.

1946

* * *

«Будзе дачушка у нас», — ціха шаптала.
«Можа», — падумаў і я... Раптам замоўк.
Помню: акно адчыніў. Побач стаяла
Яблыня ў спелых пладах. Травы, як шоўк.

Мякка зваліўся на іх плод сакавіты.
Вецер балонку хіснуў — шыба ў ёй: «Дзын...»
Штосьці ў тым звоне пачуў, думай спавіты,
і нечакана сказаў: «Можа, і сын».

1946

* * *

Схіляешся над самаю калыскай —
не дрэмле позірк маці.
А сонейка ўжо нізка, нізка, нізка,
спакойны сон дзіцяці.

І птушкі замаўкаюць каля ганку —
не дрэмле позірк маці.
А ты яшчэ спяваеш калыханку —
спакойны сон дзіцяці.

1946

* * *

Клубочак-брацік бегае з лётачкай-сястрычкаю,
і ззяюць вочкі іхныя радаснаю знічкаю.
Ці раз, ці два аббеганы сцежкі і дарожкі,
а на спачын не просяцца кволенькія ножкі.

Высока звоняць жаўранкі — песні ў іх панадныя.
Не вабяць цацкі-звончыкі — вочкі больш прывабныя.
І ўявы ў неба ўзносяцца з клубікам на нітцы —
цікавы свет адчынены брацiку й сястрычцы.

1946

* * *

Да шчасця шлях не быў адчынены —
і рэдка твар зіяў усмешкаю.
А ты цвіцеш — твой стан не схілены,
а ты ідзеш нязманнай сцежкаю.

І нарадзіла ў дні гароцкія —
і боль, і мукі не прыгнобілі.
І рысы ўсе твае жаноцкія
красу дзявочую аздобілі.

Краса цвіце, і за дзянніцаю —
ёй сталым днём да яснай волі йсці.
Імкні, жыццё, жывой крыніцаю,
не спі, жыццё, у стомнай кволасці.

1946

EMPLOY

Не жыццё, а пекла. На кватэры
вось ідзе яно — святло й цяпло.
А ў маіх паспісаных паперах
піша й піша строгае: «Employ».
І цікавіцца: ці ёсць я ў хаце?
Што раблю? Нічога не раблю.
Буду рад калодкам і лапаце,
буду рад капейцы і рублю.
І старанна я на гідкіх малпаў
буду гнуцца ў холад і ў сухмень.
Пот пралью, ахвярай стаўшы гвалтаў.
З ног скалечаных — крыві струмень.
Напісаў бы сотню я паэмаў,
тысячу б я вершаў напісаў,
каб жыццёвых нудных тэарэмаў
цень-сцігун за мною не гайсаў.

Змог бы, збочыўшы хаос сусветны,
па няз'езджаных ісці шляхох.
Быў бы я вялікі і славетны,
несмяротным нават быць бы мог.
А цяпер — ніщто. Есць косці шашаль.
Рад жывой вадзе, бы малаку.
Грудзе рве сухі, калючы кашаль,
а іду — ледзь ногі валаку.
Добрая сучаснасць не ў кватэру
жыць мяне ўсадзіла, [redacted] ў дупло.
І ў маіх няспісаных паперах
запісала строгае: «Employ».

1946

МАЛІТВА

Божа вялікі, паслухай маленне,
вызвалі з цёмнай няволі наш край.
З рабскага здзеку, з цяжкога мучэння,
Божа, пазбавіцца змогу нам дай.

Глянь, Усявышні, як край зруйнаваны,
цэрквы, святыні паніпчаны ў ім.
Люд беларускі у морак загнаны,
веру зацемрыў няверніцкі дым.

Там, дзе былі дарагія святыні,
баль свой спраўляе няверства са злом.
Божа, Ты нам памажы — і з айчыны
морак няпраўды развеем святлом.

Божа вялікі, здымі з нас кайданы,
вызвалі з цёмнай няволі наш край,
сілу і долю шчаслівую дай нам,
нашай Крывіччыне волю падай!

1946

ТЫСЯЧА ДЗЕВЯЦЬСОТ...

Прысвячаецца Янку Юхнаўцу

Немінучасці — натхнёны
ход.
Крочыць Новы, неўнікнёны
год.

Час плыве, шле з дальных рэйдаў
блік,
піша ў небе белай крэйдай
лік.

Крэсліць: тысяча і дзевяць
сот...
З пражытога ймкне у неведзь
стод.

Рэшту лікаў затуляе
ён,
а на першых свой стаўляе
плён.

Гэта — дзён мінулых выхрыст
«V»,
а на доле злы антыхрыст —
«гаў!»

«V» паказвае атомам
шлях,
на антыхрыста стагромам —
бах!..

І зляцеў з маіх павекаў
сон.
Бачу: спомірснаму веку —
скон.

Велікома йдзе ўва ўсеведзь
год,
Новы — тысяча і дзевяць
сот...

1946

У ГЭТЫ ДЗЕНЬ

У гэты дзень, мой любы сын,
праз неўглядзь зла, несупакой,
праз хмур няўцешлівых часін
загляне воля ў наш пакой.

Заўжды чаканая, Яна
вялікай госцяй будзе ў нас.
Успомнім з Ёй… Была вясна.
Зырчэла сонца. Дзень не гас.

Ішла Яна. І сіла рэк
крышыла лёд, змывала бруд.
І сцяг, праслаўлены навек,
сцяг волі ўзняў над краем люд.

І клікаў вечнай славы звон:
«Паўстань з няволі, беларус!
Скідай з плячэй сваіх прыгон,
змятай навалу і прымус!»

Мой бацька тым зычлівым днём,
паўнюткім шчасця і сунег,
у хату дзедаву кулём
з няўтрымнай радасцяй прыбег.

«Татуля! З места пасланец
прынёс навіны у сяло.
На волі мы! Турме канец!
Над намі сонца узышло!

Ці чуеш, тата? Кліча звон:
— Выходзь жа з хаты, беларус!
Ты скінеш зругу і прыгон,
змяцеш навалу і прымус!»

І бацька — сына, бацьку — сын
абняў (а сонца — у акне!),
і кроплі радасных слязін
бліснулі ў промневым прадне…

Вятры — ліхія ўчынцы бед —
ірвалі светлых промняў ніць,

а хмары-злосніцы — услед
сягалі сонца засланіць.

Ніхто нячыстаму тады
душы свае не запрадаў…
Мой бацька ў струшні злыбяды
за волю злёг — жыццё адаў.

А я — нявольнік-сірата —
ішоў па бацькавых слядох.
Душылі немарач, слата,
склізота ўсцяж збівала з ног.

Адна-аднюткая — Яна
мяне адведвала у сне, —
сама жывая, як вясна,
напаміпала аб вясне.

І на няведамай зямлі
я над магілаю-капцом,
нібы пры дрэве — пры камлі —
казаў, аж лез у дол жыўцом:

«Устань, татуля! Кінь капец!
Ліхое з водамі сплыло!
На волі мы! Турме канец!
Над намі сонца узышло!

Ці чуеш, тата? Кліча звон:
— Зірні на край свой, беларус!
Ты скінуў зругу і прыгон,
ты змёў навалу і прымус!..»

І сны, і ява… Я цяпер —
сучаснасці жывы шкілет.
Руйнуе край драпежны звер,
стаўляе волю пад штылет.

Няхай! Крутых шляхоў адхін
Яе не здолее стрымаць.
Ты зможаш, веру, любы сын,
мяне на яве прывітаць.

«Татуля! — скажаш. — На шчырэц
паглянь — раллёй прыбіта зло.

На волі мы! Турме канец!
Над намі сонца узышло!

Ці чуеш, тата? Кліча звон:
— Скажы ўсясвету, беларус, —
навекі знішчаны прыгон!
Навекі змецены прымус!»

1947

КОНАДЗЕНЬ

In hoc signo vinces!

Над зямлёю збіраюцца хмары —
грымна ймкне навальніца.
Праз кілімы палёў, праз амшары
хуткі коннік імчыцца.

Высь раскоцістым громам гуркоча
над прасторам жытнёвым.
Паланеюць адвагаю вочы
пад шаломам сталёвым.

Разам з воем, у панцыр закутым, —
моц і сіла ліхая.
На ягоным шчыце вастракутым
крыж Ярылаў мігае.

Серабрыстая збруя, астрогі
свігавіцамі ззяюць.
Меч у воя — і вострьі, і строгі.
Хмары ўзад адпаўзаюць.

Рвіся, коннік, наперад ірвіся!
Над бацькоўскім парогам
твая слава ўздымаецца ў высі
з крыжам, дадзеным Богам.

І з абвіслым крылом пад знямогай
рыне ўніз навальніца.
Праз кілімы палёў з перамогай
хуткі коннік імчыцца.

1947

НА МАТЫЎ ГАЙНЭ

Пад змрокам жутлых перагас
твой дзень пагас.
Але не згінуць у глухмені
святла збуджальнага праменні.

Зладум, я ведаю, стакрат
пашкодзіць рад,
каб зачыніць навекі дзверы
з пустэльні цемры і зняверы.

О, не пушчай ягоных ног
на свой парог!
Тваё жыццё, тваё цярпенне —
да вёснаў сонечных імкненне.

1947

НАВЕКІ

Штандар цярпення ўзняў ты над жыццём —
і кане ў змрок нячыстага спакуса…
І ў сэрцы, і ў душы — з імём
Ісуса.

Здзяйсняецца і свеціць прыйсце кроз,
падбітым пошугам даруе лекі.
Ён уваскрос! Ён уваскрос
навекі!

Наругу зла ты знёс. Ці аднаго
яна гняла, падкошвала заўчасна…
І свеціць зніч імя Яго
нязгасна.

Няхай на тле знішчэнняў, на вуглях
ізноў цябе ў рабы цікуе змуса, —
ты не пакінеш зорны шлях
Ісуса.

І вер: ні змора і ні шал пагроз
жыцця не ўнімуць — лёд страсаюць рэкі.
Ён уваскрос! Ён уваскрос
навекі!

1947

ВАМ

Прастую праз жыццё,
і не хачу скарыцца трутню.
О не, вы не дасцё
спамогі мне асіліць скрутню.

Ваш гонар — над усё,
а слова — ледзь не голас Бога.
Як без касы — кассё,
ніхто без вас не варт нічога.

А я? Я толькі сам —
пакорны раб свайго натхнення.
Што значыць нейкі грам
святла і чыстага сумлення?

Што значыць? А без вас
іду, кідаю скрутню ззаду,
хоць вамі — і ці раз? —
даўно павешаны за здраду.

Сумленне чысты грам
вартнейшы тоны тла гнілога —
няхай я толькі сам
і за маёй спіной — нікога.

1947

ПАВОДЛЕ ГАЙНЭ

Заззяла неба, дол змаўкае ў сне.
Не гасне зорка, шчасце зычыць мне,
прарочыць новы дзень з высі —
о, не хлусі!

Як месяц — мору, так душы маёй
ты шэпчаш словы казкі залатой
і кажаш — лёт увысь дасі —
о, не хлусі!

1947

ЖЫЦЬ

На ейнае з'яўленне — яскравую зарніцу —
глядзеў, нібы на шчасце, і быў я не адзін:
з усклікам: «Ляля! ляля!» — спаткаў сваю сястрыцу
грыбок падгадаваны — усцешаны мой сын.

Смутлівы позірк маці… Распачнае будзённе…
Ці праўда — я шчаслівы? Ці шчасце — сны прыкрас?
Малыя пташаняты! Вы радыя сягоння.
А як жа, як жа заўтра? Ці радавацьме вас?

Цяпер вам у калыбцы — раздолле, шмат прастору,
а станеце на ногі — і цесным будзе свет:
прыгоды сноў развее, як дробную атору,
па вёснах не пакіне ні знаку, ні прыкмет.

Ці праўда — я шчаслівы?.. Дзіцячы сподум сына,
ягоных адчуванняў, здаволля разам з ім…
Чакае вас няўцеха, трывожная часіна.
Што скажаце на радасць тады бацьком сваім?

Ці скажаце?.. Хай віснуць няўмольныя пагрозы —
а несмяротнасць грымне: жыцця не заглушыць!
Махне крылом узлёт ваш праз мужнасць, не праз слёзы:
я з цесніны ірвуся, каб жыць, каб жыць, каб жыць!

1947

* * *

Аб табе успамін — найвышэйшая ўцеха,
неўтаймованы боль і надзеяў прачын.
І заўсёды ўва мне адгукнецца, як рэха,
аб табе успамін.

І не гасне са мной, і пад сонцам праводзіць
да наступнага дня — да прасвяды зямной,
а як ноч праміне — па заранні ўзыходзіць
і не гасне са мной.

1947

* * *

Хочацца плакаць — стрымваю слёзы,
болю не ўсцішаць яны.
Стромкія хвоі. Ніцыя лозы.
Грэчкі. Пшаніцы. Ільны.

З імі, над імі стройная постаць
вёснаў не йдзе спатыкаць:
цяжка ў няволі стан ёй выпростваць,
цяжка мяне прычакаць.

Толькі пабачыць — слёз не стрымаю
(хто іх тады не пральле?).
З імі на заўтра радасць хаваю —
я не праплакаў яе.

1947

* * *

Ці ж ты і не спаткаеш ніколі
тае, нідзе нязгаснай, зары?
Няўжо сляпні бязмоўнай не коле
з'яўленне ейнай знічнай іскры?

Яна зырчэе ў праўдных — у сэрцы,
яна пералятае скрозьдонь...
Ратунку не знаходзяць няверцы —
гарыць светлапрадвесны агонь.

1947

* * *

Нязмоўкная слава
імкненням і ўзлётам высокім!
Усходам, як спель, паўнасокім —
расіцца яскрава!

На мужным узлёце
пагляд свой пястуе дзянніца…
Не ўспыхнуць — навекі спыніцца
у марнай сукроце.

Там светласць не ясне,
дзе прысак тускнее ў нягодзе.
Хай знічыць, хай сонцам усходзе —
ніколі не згасне!

1947

ЯШЧЭ НЕ МОЎКНУЦЬ…

Яшчэ не моўкнуць стройныя санеты…
І супіць бровы хісткі век атому,
і ў нашы рукі хаасную ўтому
упарта сунуць модныя паэты.

Ды ў снох не звянуць збожжавыя леты,
куток праўдзівы продкавага дому,
паклон удзячны спогаду зямному,
малітвы шчырай пошуг у сусветы.

А вы жадалі б з векапомных стромаў,
культураў даўных змесьці веліч томаў?..
Пайду няўхільна сумны, адзінокі

(у суме — праўда, ў адзіноцтве — сіла)
туды, дзе думка клікала, будзіла,
дзе вам згібенне прараклі пракрокі.

1947

ЯК ВАС...

Як вас прысыпле глейкі груд магілы,
ці хто стрывае ў свеце завіруху?
Душа — не цела — абмінацьме скруху
аж там, дзе яснуць ззяйныя свяцілы.

Над пусткай долі йшчэ разгорне крылы,
як ён спачыне ад п'янога руху.
Абдорыць глебу чыстым зернем духу —
жывым насеннем несмяротнай сілы.

Яно ў тваім жа неспакойным сэрцы
расло, буйнела, каб не сцерлі гэрцы, —
ты сам кунежыў, не аддаўшы звадам.

На месцы прышлых папялоў планеты
з яго пад сонцам зноў узыдуць кветы —
пышнецьмуць буйна выпешчаным садам.

1947

ЦЕМРА

Святлу пагібель прагрыміць імгненна,
мана спапеліць вашыя аблоні.
А вас цікавяць рук маіх далоні?
Мазоль свой жорсткі я здабыў сумленна...

І мора дужым рада бурапенна,
імклівай хваляй у нязнанасць гоне.
І гінуць людзі — іх змяняюць коні.
І цёмнай сілай дыхае геена.

А недаспелым ападае колас,
а непачуты замаўкае голас.
Паўзе аблуда іхны след зацерці.

Ты іх мінаеш — не шукай збавення,
ты іх абходзіш — спатыкай згібенне,
мацуй на скон свой валадарства смерці.

1947

РАСТВО

На беспрасветным нашым бездарожжы
няўзнак абыдзем плач жабрачай леры,
сям'ёю дружнай пры Святой Вячэры
згадаем дом свой — сумны і прыгожы.

Палынуць думкі па Дзвіне, па Сожы,
па Нёмне, — ўсюды — праз пацёмак шэры:
— Настала радасць, — стукацьмуцца ў дзверы, —
Радзіўся, людзі, збаўца Вам — Сын Божы!

Спавіты змрокам летуценні нашы,
п'ём слёзы мукаў з недапітай чашы.
Святла шукаем — не знайшлі нічога.

О, дзе ж вы, дзе ж вы, што цяпер не з намі?
На кручах свету не спачынем снамі,
спаткаем разам прыйсце дня святога!

1947

НА ЧЫСТЫМ АРКУШЫ

Александрыйскі верш! Ты пад рукой Максіма
гучнеў і ажываў — з табой жыла радзіма:
і ейны колішні, і ейны прышлы дзень,
нятускная краса і сіл зямных струмень.
І з імі ты не змоўк. А думка рвецца птахам
сягаць, ісці з табой праведна-знічным шляхам —
туды, дзе йшлі бацькі, куды йшчэ не дайшлі.
Не збіся ж, верны сын, — шмат зблытаў на зямлі.
Дык будзь, мой чуйны верш, прасвядай і спамогай.
Дарэмна не скажы і пра мяне самога:
«На чыстым аркушы, прад вузенькім вакном
прыгожа літары выводзіць ён пяром...».

1947

АДЗІНОЦТВА

Пазбаўлены ўсяго, цярпеннем сум падпершы,
знаходжу супакой — яго прыносяць вершы.
Глядзіцца слепа ў ноч халодных шыбаў шкло.
Мітужны каганец — і ўцеха, і святло.
Ды цемры акіян не можа кроплю гэту
майго агню ўтапіць. Чужы і вам, і свету,
не гасну я ў нудзе, у сценях небыцця —
наслань знямеласці не стне майго чуцця!
Яно знайшло ў сабе і дол, і шлях уласны —
над імі зазіхцеў дзянніцы позірк ясны.
Развейваецца змрок. Займаецца зара.
Ідзі ж насустрач ёй — пара табе, пара!

1947

НОВЫ ГОД

Штогоду — Новы год. Надзей вякі наўкола.
Між іх твайго жыцця ўсё звужваецца кола.
Збыццё надзей за ім? О не — сляды няўдач!
А ў ім, як у вузле, — і боль, і сум, і плач;
і сыплюць шаць злыбед яны табе на скроні,
а ты — усёй душой — на водгульныя гоні,
дзе быў на золку дзён свет вечнасці, як дом,
і ў ім, нібы сам Бог, ты быў гаспадаром.
Цяпер ён — зроку даль. А для душы — бліжэйшы
парыў назад у свет — праўдзівы, найвышэйшы.
Яшчэ адзін парог — сузорны Новы год, —
Яшчэ адзін твой крок — да вечнасці зварот.

1947

ЧАЛОМ, ЧАЛОМ...

Чалом, чалом, слухмяныя актавы,
і рыфмаў звон, і спеў радкоў, чалом.
Скасіў мадэрн ажыўчых сокаў травы,
а кветкі іх назваў вялікшым злом.
Я з вамі йду пад полагам няславы,
дваццаты век вас выціснуў на злом
і на жанчын мужчынскія ўсклаў споднi,
і пасадзіў саву на храм Гасподні.

1947

НУ, ШТО ЯШЧЭ...

Ну, што яшчэ? Зноў ліра заспявала?
Цяпер не спеў, а гром — суддзя й рашай!
Ты мёртвых строф — іх слова заняпала —
з імглы вякоў на смех не ўваскрашай.
І я маўчу. Спрачацца толку мала.
На ўсім жывым ліпіць сухі лішай:
людская порсць нікчэмства і звыроддзя —
апошні крык бязбожнага стагоддзя.

1947

ПАКІНУЎ Я...

Пакінуў я шаблонны свет уплываў,
здалося мне — абшар цвіцеў зарой.
Да заваёў свайго героя вывеў —
змагаўся ён, стаяў за чын гарой.
Але пад глум прыліваў і адліваў
ён спарахнеў, аброс імхом, карой,
паставіў дом не з цэглы, а з картуны,
падзьмуў віхор — і ўвесь канец фартуны.

1947

НЕ ЎСПАМІНАЙ

Маўчы, мой верш! Не ўспамінай эпохі.
Яна — патоп, і над табою — глум.
Ды як мінуць вось тыя ахі й охі,
той самы чын і той жа шум-бурум?
І як знайсці на ток зямлі хоць трохі
жывых слядоў, цвярозых вечна дум?
Няўжо чало пад той жалезнай каскай
больш не жыве ні яваю, ні казкай?

1947

СЛУПЫ

Дарэмна вы на глыбах крыгалому
сваіх ідэй паставілі слупы.
Наплыў ільдоў саб'е іх, як салому
б'юць на таку зухвалыя цапы.
Хай з вас ніхто не рад учынку злому,
ваш грымны чын — бяздарны і тупы.
Самым сабе не знойдзеце вы броду.
Ну, чым яшчэ паслужыце народу?

1947

НІШЧЫМ

Зусім нішчым. Сухі пясок пустыні —
ваш ідэал. Мякіна — мозаг, кроў.
Пабачыў вас — на коўзкай лёднай стыні
бязродны гурт скапычаных кароў.
Апошні раз у высь нябёснай сіні
ваш правадыр — ваш бык на скон зароў.
На баўтунох вы селі за квактуху,
курчат няма — вось ваша сіла духу.

1947

АЛЬПЫ

З усіх бакоў пасталі вы, як сцены.
Не долу гладзь — граніт з усіх бакоў.
Гурмой гарбоў пад беллю снежнай пены
застылі вы, бы ў сівізне вякоў.
І не стрымаць — мой пошуг летуценны,
нібы арол — крылаты птах, з акоў
на волю ймкне, — устрыбны ўздым пракуды! —
а вам стаяць, не рушыцца нікуды.

1947

СПАКОЙ

Хачу цяпер ад глуму й куламесы
спакой знайсці для сэрца і душы.
А мой спакой — бы ветразь той бялесы:
ірвіся ў свет, не знай сляпой цішы;
пакінь зямлю — рубеж глухі, кумесы,
фальшывы цвет на здраду не сушы,
і не гнібей на зваленай калодзе,
а гімн спявай жыццёвай насалодзе!

1947

НЕСМЯРОТНАСЦЬ

Не я — вы самі здраднікі народу:
прадалі д'яблу і душу, і цела.
Ці ж вам, аслеплым, сонца зіхацела?
Нібыта яснасць спавіне нягоду.

На кліч аблудны — незычлівы зроду —
атарай клумнай паўзяце здзічэла,
каб сцяг бясплямны, што трымаю смела,
падбіць, збясчэсціць, як маю свабоду.

Сё вам — зняслава. Мне ж няўспомірс мукі:
уздымуць волю іншых вояў рукі,
натхнёных раннем, непадданых змусе…

Таўпе прадсконнай я жывым не дамся,
і пад нязломнасць — голас небу: — Станься! —
Сваёю смерцяй згіну, не скаруся.

1948

АРДЭНАНОСЦАМ

Вам прышпілілі ордэн той жа самы:
пышлівы гонар адмысловым катам.
Нясе нядрэмнасць варту вашым хатам,
для смерцяў новых выкапаўшы ямы.

На ўяўнай цноце нат не змыты плямы
крыві, пралітай закаваным братам.
Ну што ж, тварэце неўгамонным святам
і т а т у — бацьку гучныя рэкламы!

Рука у путах: «Слава!» — піша — «Слава!»
А розум цвердзіць: «Згінь, прысуд крывавы!»
Не, гэна бляшка таннае медалі

душы не смеціць, з думкай не начуе,
і вусны шэпчуць — толькі Бог вас чуе —
збавення словы — іх вы не прадалі.

1948

КРЫВІЧЫ

Старэтных вечаў водгалас пасцежны,
твая йшчэ слава штормамі не сцята.
Гудзе званамі вольная Палата,
Дзвіною рушыць на прастор бязмежны.

Прабудны пакліч — гоман прыбярэжны —
далёка чутны — наваколле ўзнята:
— Хай згіне цемра! Час табе, адплата! —
— Хай сонца ўзыдзе! Прэч, набег драпежны! —

А чольны шэраг вой вядзе адважны,
мячом падступным грозна-недасяжны.
З гадоў паходных і з вякоў суровых

не сцемяць змрокі раніцы краменнай.
Над ёй лунаюць светласцяй праменнай
нашчадкаў сцягі ў далях пурпуровых.

1948

НЯХАЙ

Няхай да скону будзеш ты бяздомны
без хатняй ласкі, радасці айчыстай —
акроплюй потам на зямлі агністай
нямыя шахты і глухія домны;

куй на кавадле водгук даўгапомны
сталёвай сілы, моцнасці вячыстай —
застанься з верай і душою чыстай
заўсёды дужы і нідзе нязломны.

Ды помні: прышласць свеціцца ў зары ўся,
і ты аблуднай цемры не скарыўся.
Цяжар чужыны з віхрам волі дружны.

А пошуг мрояў — са збыццём суладны.
У край жаданы, праўдзе падуладны,
ідзе нясхільна толькі той, хто мужны.

1948

МАКСІМ БАГДАНОВІЧ

Далёка ад зямлі прадзедавых загонаў
ён песціў у душы гармонію паўтонаў.
Ды сэрца рвалася на волю, на прастор —
туды, дзе гуў лясун, шумеў спрадвечны бор,
і сон вадзяніка, і зорных ночаў лоні,
мінуўшчыны сляды, і коннікі Пагоні,
мадоннаў вобразы, случанкаў паясы.
О, васільковы край бязмежнае красы!
Адведаў шыр тваю — ды ёю дыхаў мала…
А вечнасць разам з ім цябе не пакідала,
і памятаць заўжды — апошні быў зарок,
а з ім — нязвялы дар — ацвецены в я н о к.

1948

І СОНЦУ, І ВЯСНЕ

Не здрада гэта, не, і гэта — не каханне.
Чаму ж чакаем так натхнёнага спаткання
з табой, адданаю не мне, мной — не табе?
Калі ж той радасны, жаданы час праб'е,
мы, падуладныя вышэйшым чулым тэмам,
спяшаемся хутчэй у спеўны Mozarteum.
Там гімны скрыпка шле і сонцу, і вясне.
Нялюдскі скача смык па ўзбуджанай струне.
Так Паганіні йграў. З Фларэнцыі азванай
плыве ягоны спеў валвою ўсхваляванай.
Ён не мінае нас і знойдзенай зямлі
з-пад Сожа і Дняпра, з-пад Нёмана й Вяллі.

1948

І ХМУРНЫ ПАС РАДЗЕЕ

На Schafberg узыдзі. Зубчастаю калеяй
маленькі паравік паўзе ўгару далей — і
ужо ў вышынях ты. Пад шэрай ватай хмур
суседніх гор сцяна — нібы халодны мур.
Пад схіламі — вясна, і хмурны пас радзее, —
ты бачыш дол, прастор, блакітнае Mondsee
іскрыцца і блішчыць. А хвалі... Ці ж яны
не тыя блізкія журботныя ільны?
І вось, каб толькі знаў, і вось, каб толькі ведаў
каротшы лёту шлях — адразу б іх адведаў.
Цяпер жа зноў — уніз. Зубчасты тор ізноў.
Маленькі паравік разбудзіць з мройных сноў.

1948

АД ШУМНЫХ РЭК

Denn was der Mensch in seinen Erdeschranken
Von hohem Gluck mit Götternamen nennt...

Goethe

Ад шумных рэк і ад вазёраў поўных,
нязнаная з магільна-зімным сном,
яна — узлёт у вобразах чароўных,

узнёсласць дум, акрыленых чуццём.
Без вас, без вас, астыглых і бяскроўных,
займаецца абуджаным агнём.
Я толькі з ёй. І ейнымі шляхамі
іду, яны — прызначаны не вамі.

1948

СЦЮЖА

Збівае з ног раз'юшаная сцюжа.
У чоўне сноў і сонца не ўсплыло.
Цяпер не спіш, усё імкнешся дужа
ступіць на дол, ухутаны ў цяпло.
Навошта ж ты пра заўтра дбаеш, дружа,
калі ў цябе і сяння не было?
Надыдзе змрок — якраз, калі світае, —
і дагарыць надзея залатая.

1948

SILENTIUM!

Молчи, скрывайся и таи
И чувства, и мечты свои.
Ф. Тютчев

Каму сказаць пра ўцеху ці пра мукі,
праз неўгамон, праз тупат ідучы?
Не западуць тваіх пачуццяў гукі
у немы гул прадоннае начы.
Не знай яго — не зведаеш прынукі,
не з ім ідзі на зніч свой — і маўчы.
Гаворыць той, хто моўчкі ў свет прастуе,
хто не маўчыць, адстаўшы, той — статуя.

1948

ІДЗЕШ, ПЛЫВЕШ

Са свету ў свет ідзеш, плывеш і едзеш,
ступаючы ці ў першы новы свет.
А па-за ім у горы стогне недзе ж
той кут, дзе быў гаспадаром твой дзед.
Над шэраняй шляхоў бясконцых згледзіш
гаморны змрок і сонца ўсплеск — прасвет —
ты думаеш: вакно — ці, можа, яшчэ не? —
у дзедаў свет — канец твайго мучэння.

1948

ЗАРАНКА ЎСХОДУ

Ці адчуваеш? Вёсны адшумелі
з пары, калі мы вольнымі арламі
шугалі ў высі… З хвалямі-кругамі
пакінуў човен долы, травы, мелі.

Да іх з праводзін чайкі адляцелі.
Ці новых стрэнеш перад берагамі
нязнаных светаў? Дзесьці за марамі
ці ты спачынеш? На якой пасцелі?

Тускнее захад. І заранка ўсходу
на ўзлётных крылах будзіць насалоду —
у ёй світальна-велічнае штосьці:

жыццё няўхільна хіліцца да схілу,
але не зляжа ў цёмную магілу
жывы адвеку подых маладосці.

1949

ЗА

За цёмна-сінім, за Чырвоным морам
спатканы будзеш акіянам хмурым.
Ды ты не з долаў, схіленых віхурам,
не з узбярэжжаў, падуладных зморам.

Хай загамоняць з'юшаваным хорам
ліхія хвалі, хай з глыбіняў мурам
твой шлях загацяць, — не, не быў панурым —
не паддасіся здрадлівым спакорам.

Што паўстрымае з волі і навагі
імклівасць дужых? Глянь на шчоглаў сцягі:
яны палошчуць пад вятрамі, бурай

у шызым змроку свой узвіў світальны —
праз шэрань хмараў у блакіт крыштальны
узносяць пошуг над вадою бурай.

1949

ПРАЗ НЕСПАГАДУ

Да сонцаў ясных, як сваім вяслом бы
ні гнаў ты човен — летуценне-мару, —
не завітаеш да Мадагаскару
і не закінуць хвалі да Каломбы.

Ці ж то адзіны у шляхох залом быў?
Праз неспагаду ты пайшоў на кару,
не прамяняўшы дубу, ясакару
на чырвань вежаў, на шаблоны-пломбы.

Няхай Гвінея, ці няхай Гаваі —
і найдалейшы кут не пахавае
дум неразменных і аб ліпе гойнай,

і аб бярозе, і аб думным клёне —
аб той прывабнай пекнаце-аблоні —
без іх не злечыш болі невыгойнай.

1949

УЗВІЎ

Бунтуе воды акіян грымотны —
прадонна-жадны і дабру, і ліху.
Гамоняць хвалі — ім няма суціху.
Чаму ж ты, дружа, хмуры і журботны?

У стомным шэпце ветразяў узлётных
узвіў слабее, просіцца аддыху.
На блізкі ўзбераж дзень прыляжа крыху,
пасцеле з пены белыя палотны.

Над сном спачыну ўзыдзе месяц нізкі,
сыпнуўшы ў завадзь агнявыя бліскі.
Як дол пясчаны ўтульнага кунежжа,

ён агартае залатым спакоем…
Ледзь золак, — зноўку збуджаны прыбоем,
вітацьмеш далеч бурнага бязмежжа.

1949

НАДОЙСЦЕ

Старчма прыўстане вадаплаў на грудзе
шалёнай хвалі акіяну-гневу.
І зноў удалеч праз вятры і ўлеву
шляхі скіруе — непакорны зблудзе.

Далёкі бераг-Конадзень. Ён будзе
прадвесцем зыркім збытага спадзеву.
Раджайнай глебе-пешчы — дар засеву,
пустэльнай злечы — згібель у агудзе.

О, не скарайся навальніцам грымным,
плыві да спыну смелым, непаўстрымным!
У віхрах пенных не паддайся звадзе.

О, не наўвеце золата якойсьці
нязнанай выспы, а тваё Надойсце
шуканай волі ў славе і прасвядзе.

1949

НА ЦІХІ БЕРАГ

На ціхі бераг ступіш асцярожна,
каб не парушыць даўнага спакою.
Чароды ж думаў хлынуць талакою —
за далягляды палятуць трывожна.

То ж бо ў аддалях жыць ім толькі можна,
дзе круг жыццёвы вірыцца ракою,
дзе над палянай, сонечнай лукою
нябёсаў веліч зіхаціць пабожна.

Дзень учарашні кануў за марамі.
Яго хацеў бы ацвяціць дарамі —
пярлістым скарбам знойдзенае волі.

Калі ж сустрэне заўтрашняе з сяння,
збудзіўшы ў росах ранняе світанне —
ён не адыдзе ў незварот ніколі.

1949

СЯРОД ЧАРОЎНЫХ НІЎ

Спаткаўся я з табой, вясёлай і ўрачыстай,
сярод чароўных ніў Ламбардыі цвяцістай.
— Твая адзіная, — ты цешыла, — са мной:
пад вышняй светласцяй, над пышнасцяй зямной.
Я з ёй, як ты, прыйшла з-пад неба — яснай сіні,
табой аспеванай, да скрыпак Паганіні.
З валошкавых шнуроў, з пралескавых палян
прынеслі мы свой дар і ў песенны Мілан.
Лунаў там наш — твой спеў — нязмоўкны голас краю.
З ім слаўныя шляхі да знічнага бяскраю:
да водаў буйных тых, якімі ўсе плыты
вядуць да берагоў, адкуль і мы, і ты.

1949

ЗІРНІ

Я не хачу сустрэць за цёмным акіянам
вачэй заморскіх юр ды іхным быць каханым.
Зірні, як пеніцца абшараў водных шквал,
слупамі ўзносячы пад неба грозны шал.
Нягода праміне — і студзенем падлёдным
утаймаваны гнеў замрэ у сне халодным.
І не ўзбудзіць яму прытоеных віроў
без буры лютае — хаўрусніцы вятроў.

А смутак вечны твой — той ціхі позірк зорны,
далёка ад цябе, згасанню непакорны,
у звабным харастве ўзыходзіць над парой,
лагодзіць пешчамі і свеціцца зарой.

1949

СВЯТАЯ

(На матыў Р. М. Рыльке)

У полымі вайны народ марнеў ад спрагі,
сцюдзёнае вады нат з падарожнай плягі
ён і глытка не меў. Дзяўчына — стройны стан —
пайшла шукаць ваду, лячыць народ ад ран.
Празь спёку, едкі дым малітвы несла Богу,
і, стому зносячы, прасіла ўсім спамогу.
Ды вось пагляд застыг на юнаку адным —
ён быў паранены. На твары маладым —
васкова-жоўты сцень, бяссілля выраз цьмяны.
Схілілася яна, перавязала раны,
прынесла ў прыгаршчах крынічнае вады.
Яшчэ вам доўга жыць, юнацкія гады.

1949

ЗВОН

Пад спёкай сонца дзень пры вечары растаяў.
А ты йшчэ не даплыў да ўцехі — да Гаваяў.
Ці ўгледзіш песняў дол, ці ўчуеш небны звон
зямное цішыні? Прываблены здавён
гамонкамі палёў і казкамі ляснымі,
твой позірк зіхаціць абтокамі аднымі:
там травы — зык зямлі, ды рэкі — вадаграй,
там дрэвы — струнаў звон, ды краскі — спеўны рай.
Там родзіцца, расце і там цвіцее тое,
што блізкае табе і песні маладое,
так знанае, як даў уцяміць Сам Спадар, —
нідзе няўтратнага жыцця твайго алтар.

1949

ЗА ПОРТ САІД

За Порт Саід ты вырушыў мяльчастай
істужкай вод у далягляд руды.
На пострапе сцягой, даўно пачатай,
бітмо людзей вязе пакут сляды.
«Цветов и льда» няма. А «арапчата»?
«Не кинул им ты на ходу плоды?»
О не, о не! З ласункамі не борздкі,
бяздомны шлях бязлітасны і жорсткі.

1949

ПЕРАД ВЯСНОЙ

О, Афрыка! Крывіччынай была б ты,
каб Нёмнам быў твой паўнаводны Ніл,
я над табой спыніў бы лёт крылаты,
далей у свет сягаць не меў бы сіл.
Прабач за сум з мае далёкай хаты —
счарнелы жаль бусліных пругкіх крыл.
Перад вясной узнёслага адлёту
дай лёгкасць ім прасвяднага звароту.

1949

НАДОЙСЦЕ ДНЯ

Калі мінеш сцямнелы ў спёцы Адэн,
надойсце дня спрадвесціць далячынь.
Бяскраю шыр задыміцца, як ладан,
і з водамі сальецца небасінь.
А там і свет, ніколі не разгадан, —
ружовы ўсход — пачатку сонца плынь.
І як не край зямлі за акіянам,
так не канец нязнанаму ў пазнаным.

1949

УЗБУДАМ ХВАЛЬ

Узбудам хваль вірацца гнеўна воды
і пеняцца з распачай пад карном.
Куды плывеш? На час ці назаўсёды?
Каму, скажы, пакінуў сумны дом?
Нязнаных зор ты бачыш карагоды,
знаёмыя — пад акіянскім дном.
За Афрыкай з пяскамі залатымі
яны ў душы зіхцяць тваймі святымі.

1949

АКІЯН

Шуми, шуми, послушное ветрило...
А. Пушкин

Roll on, thou deep and
Dark blue Okean — roll...
Byron

Шумі, шумі, мой ветразь паслухмяны,
хвалюйся ўсцяж, пануры акіян.
Залечыш мо на сэрцы болесць — раны —
па той зямлі, што завалок туман?
Я ёю быў, як ты, ускалыханы
і ўспоены. Навекі ёю п'ян.
Маўляў ты сам, неўсціхамір заўсёдны,
я з ёй цяпер і дружны, і нязгодны.

1949

ЗА ГОДАМ ГОД

Адыдзе ноч. І акіяну хвалі
расступяцца — пабачыш сонца ўсход.
Пад ім гады, на дне што векавалі,
гады надзей плывуць — за годам год.
Перад табой — няведамыя далі,
нязнёслыя дакучлівых нягод.
Яны ў чуцці акордаў воляграйных,
спатканых тут — на хвалях вод бяскрайных.

1949

ПАЎДЗЁННЫ КРЫЖ

Цябе ніяк не надзіць сон суседаў.
Выходзіш зноў на пострап. Зноў глядзіш:
адылі там — цікавасць Бог табе даў —
над позіркам гарыць, не гасне ўзвыш.
Сярод агнёў, якіх яшчэ не ведаў,
прамяніцца і сам Паўдзённы Крыж.
Пад роўнікам шукай тае планеты,
дзе зноў над ім апынешся ўва сне ты.

1949

ПАЛАДЗІН

З дзядоў і прадзедаў — гады ў вякі наніжам —
спыніліся шляхі аж пад Паўдзённым Крыжам.
З ім верных пяць сяброў. А ты — зусім адзін.
Куды ж цяпер ідзеш, нясхільны паладзін?
Спакой вакол цябе. Не хочаш ты спакою.
Хто вольны — дужы той. Сцяжынаю цяжкою
ты прагнеш праставаць імкненню наўздагон —
туды, дзе йшчэ жыве драпежны мастадонт.
Пад стомаю ў руках не схіліш алебарду.
Ты з ёй нясеш любоў, нянавісць і пагарду.
Нянавісць — жорсткі скон ап'яненым крывёй,
любоў — для спрагненых бальзам вады жывой.

1950

ЧАЎНЫ

М. С. і А. К.

Пры берагох Вяллі блакітнаводнай
спыніліся самотныя чаўны.
Мае сябры, за ўцехаю прыгоднай
без нас цяпер не паплывуць яны.

Калышуць іх пад зоркаю праводнай
усплескі хваль. А нашы мроі-сны —
ледзь толькі мы павекі прызачынім —
усё лятуць да іх прасторам сінім.

1950

БЕЛЫ СНЕГ

Пётру Мікулічу

Ты знёс вайну — суровую сяброўку
твае вясны, нязналай шмат уцех.
Гнаў ворага. Ды ён вярнуўся зноўку
бурыць спакой братоў і мірных стрэх…
Ідуць шляхі на Вязынь і Раёўку.
Прысыпаў іх пухнаты белы снег.
Калі ж вясна разгорне снегу шаты —
твае сляды паклічуць да адплаты.

1950

НАДЗЕЯ

На выспе пустэльнай згарае шчасце
табе адданых — помніш іх ты.
Б'ецца аб камень жорсткае засці
сокалам падбітым агонь святы.

Сохне, збягае спацехі крупінка
між скалаў горных, траваў рудых.
Зрэдку праб'ецца жывая расцінка —
сардэчных пачуццяў гарачы ўздых.

Ў імкненні да сонца жыццё не мадзее.
Узышлай расціне набрацца сіл.
Разгортвае крылы ўзлётаў надзея,
рвецца надзея за небасхіл.

Ёй шлях нялёгкі — з хмараў сцякае
улеваю чорнаю ночаў цяжар.

Пекла знішчэння высь рассякае —
сыплецца з неба зораў жар.

Ды над тваімі палямі, барамі
не гасне полыск сілы жывой.
Надзею вітае пры ўвойсцьнай браме
дух неўміручы — ён вобраз твой.

Дужэе сэрца, воля цвярдзее —
хілых не знае крылляў размах…
Не гасне вера, жыве надзея
рвецца надзея на ўзлётны шлях.

1950

НАДЗЯМНЫМ

Ніяк не ўсцешаны нязвыклым новым светам,
яшчэ ты не чаўрэў у сутарэнні гэтым,
дзе за халоднаю цаглянаю сцяной
папугу і кату, чымся табе са мной,
больш выгады й цяпла. Нямудрыя стварэнні
крычаць, пішчаць, няма спакою ў сутарэнні.
Газеты і лісты адхінены. Ты спіш.
І гасне каганец. Міргкі Паўдзённы Крыж
праз цёмнае вакно, закутае у краты,
твой запалоніць сон. Не зведаеш ты страты:
тугі адхлыне боль у забыцці адным —
яе Паўдзённы Крыж атуліць надзямным.

1951

У АКІЯН

Ступіўшы на зямлю, імкнешся да ўзбярэжжа.
Ізноў у акіян твой плаў дарогу рэжа,
нібы спакон вякоў прапрадзедаў нарог
імкнецца супачыць у пушчах, у барох.
Ва ўзбуджаным бары, ля шматгаліннай гушчы,

пад гоманам вятроў ва ўсхваляванай пушчы
табе сам Архітэкт там дом пабудаваў —
цудоўны дом з імхоў, з кашлатых дрэў і траў.
Пад домам тым бруяць крыніцы надзямныя,
з зямлёй злучыўшы высь і сокі наліўныя.
Пры гэтым доме — дуб, таполя, важны клён —
старая Грэцыя, найдаўны Вавілон.

1951

СУМ

Агні ўзбярэжныя пагаслі за вадою.
На моры вусцішна. З маркотай і бядою
ты лепш мяне, зямля, навекі пахавай.
Маё апошняе, распачнае: бывай,
бывай, нязжатае буйное ўцехі ніва!
І ў струнах горычы збуджаецца шчасліва
яшчэ нястрачаны дзівосных зыкаў час.
Ты бачыш: твой маяк у цемры не пагас.
Як соладка ва ўсім, чаго няма, знаходзіць
здаволле, хоць яно ўсуполь з нудой не ходзіць.
На моры — хваль віры. Між іх знайшоў спакой
нязнаны спыну сум — адзіны сябра мой.

1951

У НОВЫ СВЕТ

У новы свет пад зорным небам новым
на хвалях дзён гады жыцця плылі.
І ветразі пад подыхам вясновым
спыніліся надвечар ля зямлі.
Пабачыў ты: над захадам барвовым
жаданыя свяцілы не ўзышлі…
Запальвай іх хоць у душы прачулай,
каб цемра-ноч навек не агарнула.

1951

ЯК АКІЯН

Няўхільнага ты просішся згібення,
о свет, сабе не можаш рады даць.
Як акіян ва ўсхваляванай пене,
не бачыш дня яскравую пастаць.
А па-за днём на сон у мяккім сене
ты прамяняў саломы жорсць, каб спаць.
А людзі? Ці ж на брыж прадоння людзі
збавення мур паставяць у заблудзе?

1951

ЗОРЫ

Прыслухайся: да высяў клічуць зоры,
між іх і ў іх — і новы свет, і ты.
Пад імі — дол няўцешны і суворы,
над імі — край святлярна-залаты.
І паўтары — не быў душою хворы
той пілігрым, што не спыніў ляты
да воддаляў, яшчэ нікім нязнаных,
да здзейсненняў, бяздушшам не таптаных.

1951

У ЦІШЫНІ

У цішыні, на ўскраі ночы цёмнай
ты думаў шмат аб сянняшнім сваім.
Твая вясна пад жальбаю бяздомнай
і адцвіла, і знікла, быццам дым.
А ты з душой юнацкай і нястомнай
ідзеш у дні заўсёды маладым.
І ажыве — хай толькі сілаў стане —
вячорны змрок у заўтрашнім світанні.

1951

ДОМ

Прысвячаецца М. С.

Мой сябра, час настаў нам дом пабудаваць.
Так цяжка без яго тужыць і бедаваць.
Хацелася б, каб ён перасягнуў харомы
і роднай хаты стыль сусвету стаў вядомы.
Руплівай працы плён — наш будаваны дом —
вось гэты сціплы верш, што рады жыць з відном.
Пад уравень пастаў страфу-александрыну
і нацягні пад шнур радкоў усю тузіну.
Паставіць кропку — цвік забіць — не варта ўмець,
павінен талент быць, натхненне трэба мець.
І ззяцьме ў доме ўсцяж прыйсцьдзённе дня — світанак,
ягоны дах — назоў, твой стройны подпіс — ганак.

1951

* * *

Дабрыдзень беларускай хаце!
Чалом нашчадкам крывічоў!
Дай Бог Табе, мой родны браце,
шчасліва йсці плячо ў плячо

з высокасцяй тваіх ідэяў,
з адлукай ад клапот былых,
са здзейсненнем усіх надзеяў,
з хутчэйшай блізкасцяй да іх.

23.02.1952

ВОДДАЛЬ

Прачнешся воддаль з першым «ку-ка-рэ-ку»,
яшчэ сампоўнач. Досвітак няблізка.
Спакой сялібы. Ранняя адбліска
зары далёкай не замжыць павеку.

І адчуваеш вейную бяспеку:
высока ззяе празаранкі рыска,
і песціць долу зыбкая калыска
шляхі ў нябёсы птаху-чалавеку.

Ляце празорнай за гарой крутою
купацца ў сонцы, сябраваць з хадою —
абы да траваў дакрануцца босым,

па дабравесці — громе перуновым,
як і ў маленстве, усміхацца новым
ліпнёвым краскам і купальскім росам.

1952

СЛОВА

Яно паўстала на тваім пачатку,
было цяплейшым, найласкавым — «ма-ма»…
Сціскала сэрца ўтратных зыкаў гама,
калі забралі і яго, і татку.

Зрывала восень з дрэў, з палёў апратку.
Ступаў у безведзь — стрэла школы брама,
за ёй пабачыў: слова — цемры яма.
Святло блізкога ззяла толькі ўкрадку.

Пад перагасай штормаў, бураў, ветраў
расхрыстаў грудзі найглыбейшых нетраў —
жыццё пульсуе рытмам незмаўканым:

ад нівы хілай, стромага узвышша
шырэй гамоніць, больш узнёсла піша,
папеліць жахі вольных дум вулканам.

1952

НЕ З ВАМІ

З трыбунных высяў прамаўлялі ўчора:
— Калі не з намі, першы ўчынак — здрада!
А сяння ў засці заўтрашняя ўлада,
і невыразна весцяць гойнасць зоры.

Вы гэтак хутка падаліся ў норы —
і млоснай сыці думка ваша рада.
Разменных пешчаў танная прынада
душу прапасціць у прадажнай зморы.

Часы мінаюць. Тыя, што не з вамі,
крыштальнасць духу ўзносяць над вякамі,
яны — надойсця чолы-авангарды.

Але ў прадонне заламаным крокам,
найсвятшых скарбаў зманлівым вырокам,
цяжкія цэглы ганьбы і пагарды.

1952

ЗМАГАРОМ НАРОДУ

Хай ваша слова вечна расцвітае
і будзе клічам да жыцця народу.
Яго гнялі ўсе — з захаду і ўсходу —
знішчалі поступ рупнага ратая.

Як поўнач зыйдзе — новы дзень світае,
узыйсцем сонца весцячы пагоду.
Знаходзіць шчасце, дзіўную прыгоду
уцехаў зыркіх раніца святая.

Ваяўнікі вы лепшай, шчаснай долі!
Ваш дух крылаты негадзі адолеў,
аздобіў праўду пышнымі вянкамі.

Бязмежна ўзнёслых, вольных лётаў птахі
высока ўзнеслі духу краю гмахі —
пазамінулых і перад вякамі.

1952

НАД СЛУЦКАМ ДНЕЕ

Над Слуцкам днее. Гасне ноч на зорах.
І з першым снегам вецер дзьме калючы.
Прастуе ўперад рыцар неўміручы,
за ім — нядрэмнасць вояў у дазорах.

Ён бачыць золак, чуе кожны шорах,
вітае ў думках сон прабудны Случы...
Абшар бязмежны і прастор нясплючы,
у вас не мае месца хіжы вораг.

Агні жывыя, іскры лістападу,
узлётнасць ваша не зазнала спаду.
За вас у муках рыцарскай дарогай

крывёй сцякалі, гінулі і мерлі,
каб вас навекі злыбеды не сцерлі,
каб вы свяцілі прыйшлай перамогай.

1952

НЕ СПІШ СПАКОЙНА

Не спіш спакойна, мой далёкі браце,
як сполах ночаў, дні твае насталі.
Пад звон жалеза і пад скрыгат сталі
імкненняў пошуг прападае ў страце.

Без спыну ў доме, без начлегу ў хаце
капаеш долы, засяваеш далі.
Пад імі злыдні праўду пахавалі —
куеш навекі ім сваё пракляцце.

Непакананы жорсткаю пакутай,
перамагаеш змея мукі лютай.
І шлях паўторны да жыцця з цярпення

няволі злуду паліць перунамі.
З табой, са мною — крочыць поплеч з намі
паўтору-кругу змена-пакаленне.

1952

ЛІСТ

На снежных землях поўначы халоднай,
сярод абтокаў, званых Салаўкамі,
дзе дні здаюцца доўгімі вякамі,
пад сэрцам носіш ліст ад маці роднай.

— Ратуй нас, Божа… У бядзе заўсёднай
не дай нядолю зносіць жабракамі…
Вярні мне сына… — Злоснымі ваўкамі
жахаюць вочы варты падкалоднай.

Пайшоў на мукі, цемраю караны,
за словы праўды — покліч неўстрыманы,
за водгук славы, сцертай ланцугамі.

Драбок найменшы ад крыві ахвярнай
не гіне кропляй, згубленай і марнай —
плыве раскутай волі берагамі.

1952

ЛЁС

Ні над вазёрнай гладзяй ціхай, пласкай,
ні над марскою ўстрыбнай хваляй-лавай
ты не ўсплываеш з бліскавічнай славай,
не поўніш сэрца радасцяй і ласкай.

Твой лёс няўмольны: у далоні пляскай,
з бядоты цешся над прысуднай лавай…
І ўзлётай мрояй і жывою явай,
і дзіўнай песняй, і чароўнай казкай.

Узносіш крылле, а шугаць не можаш,
будуеш месты — ды бяздомных множыш,
кіруеш аўты ў водбліск магістраляў…

Прыблуда едзе, селіцца, лятае,
і там, дзе слова і краса святая —
балюе, топча крыўду слёз-караляў.

1952

ЗГОДА

Салодкіх песняў аб свабодзе, міры
ты чуў ці мала — іхнаму паўтору
няма і краю. Глянь з-пад гаю-бору —
на нівы лезуць жудасныя ўпыры.

Нібы ягняты, у жыццёвым віры
лісліва ўтораць шуму жыта-хору:
— Жыве між намі згода без дакору,
як вы, наш голас непадкупны, шчыры.

Сваймі вачыма з думкаю прадбачнай
не зычыш полю долі небарачнай.
Але расціна падпадае, звяне —

цішком спакуснік смокча з яе сокі.
А на трыбуне радыя пракокі
ёй весцяць шчасце, радасць, красаванне.

1952

МАЛА

Спытаюцца ў цябе трыбуны масаў:
чаму маўчыш так шмат і творыш мала?..
У свеце фарбаў радасных і красаў

кальчэе з холаду зямная гала.
Ствары мелодыю вясны, музыка,
яшчэ й зайграй, каб маса не праспала

світання прыйсцьнага. Ды пальцы — смыка
і струн іскрыпкі не кранала здаўна.
Не вобразы ў суладнасці вялікай,

а злітыя ў адно — і флора, й фаўна
твой зрок заслоньвалі. Цягнуў ты лямку
кавалка хлеба дзённага бясслаўна

і біўся ў пазачыненую клямку
кавадла й молата, рыдлёўкі й кіркі.
Ты меў адну прызначаную рамку —

ублізь і ўдалеч, удаўжкі і ўшыркі —
мятлу, мяшкі з пшаніцаю ці соляй.
Згінаўся горб — і неба водбліск зыркі

не мог, пануры, ты разгледзець болей.
...Прыгноблены і стомай, і змярканнем,
не цешаны дабром, хвалёнай воляй,

сядаў тварыць, іграць. Ды парываннем
цябе натхняла Муза неахвотна.
О, лепш было маўчаць з убогім граннем,

без сябра доўга плачучы маркотна,
без Бацькаўшчыны плачучы заўсёды...
Душа няўстрым пакутвала гаротна,

сузорны шлях да вышняй насалоды
шукаючы ў празмерлівым гарэнні.
Натуга сіл падужвала нягоды —

і захлыналася чуццё ў натхненні.
Ты йзноў сядаў. Сугучны хор бязлікі
гучаў у дыяментавым тварэнні.

Тады ў акрыленых руках музыкі
іскрыпка валадарна, думна грала.
Луналі з крышталёвых тонаў зыкі —
скупыя зыкі — іх было так мала.

1952

РАЗВІТАННЕ

Паставіла на стол букет вясновых кветак
і адышла. А я — твайго адойсця сведак —
застаўся з горкаю, журботнаю думой;
ты без мяне, яна ж — дума — усцяж са мной:
навошта ты прыйшла у мой гасцінны хорам
не ўцехаю спавіць, а сціснуць грудзі горам?
Без сэрца і душы агнём сваіх вачэй
запаланіць змагла. Куды было б лягчэй

не ведаць цеплыні, што застаецца лёдам,
не песціць пустыша, што вырасце бясплодам;
не быць прывабленым, адойшлым ад вясны,
не бачыць той букет — не польны, не лясны.

1952

ПРЫПЫНАК

Сардэчная хвала гасціннаму прыпынку!
Пабуду тут яшчэ прыемную часінку…
Прабачыш, ведаю, за мой даўгі пабыт.
Усцяж мне мроіцца: ты ўцехаю спавіт.
У хораме тваім, у сонечнай святліцы
я ў рукі браў тамы з утульнае паліцы.
Чытаў, забыўшыся аб поўных зморы днёх
і аб усім благім, аб чым забыцца мог.
З зяленіваў зямных, з вышынных сіняў, беляў
тут гутарыў са мной разважлівы Longfellow.
Я з ім шчаслівы быў. І ў дзіўным свеце ўяў
пад сонцам Індыі душой супачываў.

1952

У СВЕТЛЫ ДЗЕНЬ

У светлы дзень Пятра — у дзень твайго анёла
цвілі — прыгадваеш? — лугоў шнуры вясёла.
І песцілі палі спацехі мройнай сны,
намірг забыўшыся пра сполахі вайны.
Яна ж, няўмольная, падкошвала, таптала
вясёласць пешчаў-мрой. Цябе ў нязнанасць гнала.
Блакітныя ільны, мядзяныя жыты
усцяж пыталіся: — Нас не пакінеш ты?
Ізноў той час. Туды, дзе дні спацеху снілі,
імчаць, нясуць душу твайго святога крыллі.
А з імі ўзносішся на ўзлёце лёгкім сам.
Ці адчуваеш ты? — ты там, ты толькі там.

1952

СВЯТЛЯРНЫЯ АГНІ

Той вечар памятны — і ці ж ільга забыцца? —
у сэрцы і душы, святлеючы, агніцца.
Па бліскных клавішах узмахі рук стрункіх —
празвесцівы акорд пачуццяў парыўкіх.
Праменнай высі рой — сузор'яў пераліўы.
Удумлівы Шапэн, Рахманінаў чуллівы,
Бетховен, Вагнер, Бах, Чайкоўскі, Барадзін —
сягаў шматструнны зык да сонечных гадзін.
Гучацьме вечна ён над лёдам анямелым,
будзіцьме дрэму сну праменнем дзённа-смелым.
Ільды цямнярныя, святлярныя агні.
Руку сваю святлу, ажыўчасць, прасцягні.

1952

У ІМ І ПА-НАД ІМ

Як люстра — магістраль. І аўты, і палацы.
Наўзбоч праходзіш ты без хаты і без працы.
І не спыняешся ля полыскных вітрын,
мінаеш засень дрэў, жывы зялёны тын.
Аркестра. Музыка. Трамбоны, трубы, флейты
З кішэннай пусцінёй ад іх імкнеш далей ты —
у мройлівы прасцяг прывабных змалку зор,
ільсністы ад расы, блакітны ад вазёр.
У ім і па-над ім — свой Моцарт і Сальеры,
свой Дантэ, свой Шэкспір. Да іх табе ўсе дзверы
у ім адчынены... Далёкі бераг, порт
і блізкі сэрцу зык — найчулых струн акорд.

1952

ЗАРА

Nature gives to every Time and Season
Some beauties of its own.

Dickens

Дабрывечар, Зара! З каляднае ялінкі
цярушацца на дол пухнатыя сняжынкі.

Успыхваюць агні праменнем свечак-зор —
і гіне з цемраю нязгода і дакор.
З агнямі цёплымі Зары Святой Вячэры
узносімся і мы да той надземнай веры,
дзе неба, і зямля, і ён, і ты, і я —
пад Вышнім Спозіркам сугодная сям'я.
Душы злагодненай усцешанняў глыбокіх
стаюцца блізкімі пачуцці ўсіх далёкіх.
Апошняя свяча гарыць, як Прыйсце Дня, —
нявіннасць светлая, любоў і цеплыня.

1952

ВАМ ХОЧАЦЦА

Вам хочацца раскошаў, выгад свежых
і цёплых вод, і зыркага святла.
Маўляў, няма няслаўнае суцьмежы,
пара бядот у небыт адплыла.
Але ці з вас перасягнуў хто межы
узлётам дум — ад пня і да стала?
Імкнёны свет? Ці да яго ўзняліся?
Ці дараслі да ясназорнай высі?

1952

У ДОБРЫ ЧАС

У добры час — сустрэчаў свет цікавы —
адведаў я няскончаны ваш дом.
Няхай у ім былі ўсяго дзве лавы,
і лава ў ім няхай была сталом, —
я ад душы вам зычыў шчасця, славы
і келіх піў за вас, сябры, нагбом:
за ваш узлёт, уцехаю спавіты,
за кут бацькоў, у свеце незабыты.

1952

ЗНІЧЫ

Малым дзічком ты быў у маладосці
і жыў між дрэў, між траў. Плыла рака.
Зіхцела высь. Бязмежжа весялосці
гушкала свет на крылах ветрака.
Ці б не хацеў паўтору той любосці?..
Стырчма тырчыць шчацінне ў вепрука.
Ні сонца йшчэ, ні зоры йзноў, ні знічы
не вернуць больш нявіннай ранняй дзічы.

1952

ШЛЯХ

...Green in Summer, white in Winter,
Ever singing, ever singing.

H. W. Longfellow

Усё ўздыхай і мучыся, і енч аж —
адчуеш там садоў і ніваў спель.
Красой вясны зяленівасць увенчыш,
сагрэеш ёй зімы сцюдзёнай бель.
Адзіны спеў — пабожна нізка ўкленчыш
жыццю свайму, усім — нязгіну хмель:
у гушчарох — у лесе і за лесам —
нязблудны шлях нясхільным Геркулесам.

1952

КІТАЙ

Далёка жаль і «плач твой аб старонцы»...
Падзеяў том у неабмін лістай —
спыні пагляд на заўтрашняй балонцы:
стаіць, як мур, абуджаны Кітай.
Зноў свежы ліст — цяжэе том бясконцы.
І бачыш ты, спадар зямлі — ратай,
як паўстае з глыбіняў вірных мелеч,
а з сэрц малых, няскорных духам, — веліч.

1952

НАЯВЕ

Я толькі йзноў цябе наяве ўбачу,
калі ўзляціш у высненую ўзвыш,
дзе больш няма ні жалю, і ні плачу,
іскрыстым дзе агнём навек гарыш.
Перад святлом цямнейшую няўдачу
не ўваж канцом, хай з ёй — прадоння брыж:
твой нават шлях у Калыму й Камчатку
займанай быў зарой твайго пачатку.

1952

НАЎВЕЦЕ

Найноўшае напамяці, наўвеце:
і цішыня, і валадарны гром.
І балазе яно ў адойшлым леце
свяжыла дол не спрышам, а вядром.
А ты? Няўжо пазнаў усё на свеце?
Ягоным ты ці быў гаспадаром?
У ім, старым, пры новым не рабі ты
замкнёны круг з ягонае арбіты.

1952

КОЛА

І круціцца гісторыі ўсё кола,
у ім — адзін і той жа самы дзень:
узмах крыла вышыннага сакола,
за небасхіл прадонная карцень.
Высокі ўстрыб і нізкі звал. Наўкола
пазнай жыцця няўрымслівы струмень:
адведаць высь, вярнуцца ў дол — не спасці,
крылатым зноў радзіцца, не прапасці.

1952

ІМКНІСЯ ЎСЦЯЖ

Імкніся ўсцяж на зніч нязгаснай веры
у ясны дзень, у твой світальны край.
Учора хай былі эпохі, эры,
ды сяння ім без заўтра быць не дай.
У век шляхоў за межы стратасферы
твая душа узносіцца няхай
далей і прэч ад стоптаных надзеяў
да надзямных, нязгіну годных дзеяў.

1952

УСПАМІН

Зайсці і не застаць ані-нікога дома,
вярнуцца ані з чым — ці ж гэта не знікома?
Хоць побач дні-сябры — гадоў-вазёр кругі,
а ўсё-ткі па адным імкнуцца ў берагі.
Што сталася з табой, мой дружа адзінокі?
Мо, гэтак, як і я, маркоты лічыш крокі?
Мо, пад трамвайны звон у шуме гарадскім
успомніў раптам ты аб самым дарагім?
Вось вечарэе ўжо. І месяц невясёлы
прыйшоў сюды адтуль, дзе слёзна плачуць долы.
Ён быў там сяння ўдзень. Як зноў пачне світаць,
о, хоць бы з ім адным твой успамін застаць.

1952

КАМЭНЕ

Як згасне дзень, не адыду навекі,
не абміну надойсцевай пары.
Прыйду назад, дзе ўсцяж гамоняць рэкі,
дзе ўтораць ім і нівы, і бары.

Наўскрай зямлі — я жыў і дыхаў імі,
чуў іхны грай над хваляй морскіх вод.
Сваймі былі яны паміж чужымі,
як для вясны — праменны сонца ўсход.

Над імі ў зле, няволі віслі хмары —
я прадчуваў надойсця вольны рэй.
Аб іх спяваў ля спадаў Ніягары
і ў той зямлі, якой плыве Мурэй.

Знаёміў іх з пахмурным Альбіёнам,
ад іх вітаў цвяцістую Шампань.
І дыхаў дол глыбінным гучным звонам,
з вячорных сноў абуджваючы рань.

У гушчарох зняверлівае стомы
імкнуўся я парывы духу даць,
каб ён шугаў да зораў па-над стромы
і не схіляў у злыбедах пастаць.

О ты, мая адзіная Камэна,
на ўсіх шляхах нязгінам дзён свяці!
Не адыду… Наперайм крочыць змена:
я з ёй і ў ёй — і ў песнях, і ў жыцці.

1959

УСЦЯЖ

Памяці Уладзіміра Аксючыца

Віхура зла за хмуры акіян
шпурнула нас, нібы ў прадонне згіну.
Ды ты мінаў няўцехі і абман,
і палка так любіў сваю краіну.
Зямля вясны і сонца неба ўсцяж
былі з табой, як бы сябры, у згодзе.
Калега мой, найлепшы дружа наш,
ты зваў сябе, як найпрасцей, Валодзя.
Спачыў навек ты на зямлі чужой…
Хай сніцца ўсцяж табе край родны твой.

1966

* * *

У гэты час, калі ўсясвету зоры
мігаюць нам — у дол, у цішыню,
наш розум ёсць уздымны і празорны,
узносіць нас далёка ў вышыню.

Надыдзе ноч — прастораў там вазёры;
і скажам так наступнаму мы дню:
вяртаемся да тых зямных крыніцаў —
там — толькі ж там жыцця усім напіцца.

УДЗЯЧНЫ ЎСІМ

Пясняр, змагар, бядняк праз век,
Быў перш за ўсё я чалавек!

Уладзімір Жылка

Удзячны ўсім за шчырасць цёплых словаў,
за ваш узлёт, так добра бачны мне.
Ад гарадоў узрушных, новых сёлаў
ракетай ён высока ў неба мкне.

Высока там — і здзейсненні, і мэты,
а нізка тут — тым здзейсненням пачын,
і над святлом сучаснае планеты
раджаецца планетаў прыйшлых чын.

Я з вамі быў, і з вамі ўсцяж я крочу,
жадаю ўзняць вышэйшы лёту ўзмах.
Так нечут вам шчаслівасці прарочу,
хоць можа сам не ўзнёс вышэйшы гмах.

І можа, сам, як чалавек, схіліўся,
ды ў вершах быў я шчырым ад душы.
Усцяж быцця шляхі перасякліся,
гамонкі шлях і шлях глухой цішы.

Не абміну і сяння светлай веры
у тое, што заўсёды будзе жыць.
Прыхіліцца спачын, навекі шэры,
а ваш узлёт жыцця не пераспіць.

Я ЖЫЦЬ ХАЧУ

Я жыць хачу, хоць морак цёмных сіл
нясе загін зняможанаму свету…
Ад сэрца і крыві, ад пульсу жыл
адна мальба да рады ці савету:
дай волю нам, жаданую здавён, —
і мы мінём нячыстых д'яблаў сілы.
Трагедыя, калі мільён… мільён —
жыццё складуць заўчасна ў змрок магілы,
крыжовы шлях, цярніста-згінны шлях —
і валіцца на дол цярпення сцяг.

ЁН І ЯНА

Яна: — Ты ёсць найлепшы сябра мой
да самага жыцця майго скanання…
Адцвітваў бэз у роспачы нямой,
не ведаючы заўтрашняга рання.
А ён: — З табой, няхай канец вясне,
пайду на згін сусвету, каб не згінуў…
І як было, і як было ў вакне, скажы —
жыццё цвіце на самым рубяжы…

БЫВАЙЦЕ

Бывайце, радасць і цяпло сустрэчы,
сябры і сёстры родныя, браты!
Уздымны пошуг зорнае ляты
нас не разлучыць з думкамі ўдалечы.

Разважны розум — не цяжар на плечы,
у ім нязгасна зззяе Дзень Святы —
ён абмінае шлях паўзбоч круты
да волі светлай з цемры і галечы.

І мы сустрэнем зноўку, у мамэнт,
той час, што знішчыць непагадзь ушчэнт.
О, як прыемна па гадох даўжэзных

пабачыць чулых, дружных землякоў,
вярнуцца ў ранне досвіткаў сунежных —
няма там путаў, здзеку і акоў.

МАМЕ

Заміж вянка на магілу

Мама, мама, мая дарагая,
ты глыбока ў магіле спіш.
Над зямлёю высока мігае
зырказзяйны Паўдзённы Крыж.

Ува ўявах пад ім, як чад бы,
Беларусь — летуценне і сон.
Ейных ткальняў дабротных скарбы
свет вітаюць з цудоўных красён.

Ты радзіла мяне ў Беларусі,
напаіла, карміла, дала
пры глухой ледзяной завірусе
незлічоныя пешчы цяпла.

Беларусь, Беларусь, снегавеі
прамінаюць, іскрыцца вясна.
У цвяцістай пялёсткаў завеі
расцвітанняў — ты з імі красна!

Застаешся нястрачанай мамай,
акрыліўшы лятою мяне…
Не згаджуся з глыбокаю ямай
і не буду ёй сябрам я, не!

Не зміруся прыхільна у згодзе
з чужаземнаю доляй цяжкой,
прападае спацешша майго дзе
і згасае святлярны спакой.

Але ўсё ж, як зямля прытуле,
мы пад ёю — адна сям'я.

Дарагая мая матуля,
залатая айчына мая!

Хай зырчэюць пад сонцам світанні —
імі кожны ў глыбінях сугрэт.
Прывітанні табе, прывітанні,
мама, мама, твой сын
Альфрэд.

1967

* * *

Ізноў я завітаў да Вашай хаты,
а ў ёй — анікагусенькі няма...
Адведзін келіх, сяння непачаты,
наступны раз зазвоніць нездарма,
бо мы не ведаем прыязні страты —
не абмінаем блізкіх сціхама.
Сустрэнемся, спаткаемся, пабачым
узлёты думаў у агні юначым.

27.10.1968

ЖАДАЮ ВАМ

Дарагому дзядзьку Антону
ў шасцідзесяцігоддзе жыцця

Жадаю Вам здзяйснення яснай мэты,
нязгіну ўсіх высоказзяйных дум.
Мы дажылі да ўзлётаў на планеты —
святла жыцця не сцемрыць горкі сум.
Дасяглага спрадвечныя прыкметы
не здолее зняволіць здзек і глум.
Хай свецяцца ў зары нязмрочнай веры
святой красы адчыненыя дзверы.

13.06.1969

* * *

Паважанай Ларысе Геніюш,
у шасцідзесяцігоддзе жыцця

Вялікія тамы з няславай і шматслоўем
не могуць замяніць нязмрочнае красы,
з якой штодчас, штодзень, заўсёды ў сэрцах ловім —
няхай найсціплых два — айчыны галасы.

І з «Невадам...» плывём у глыбы таямніцаў:
прадонны свету скарб і полымя зары.
Там неўстрыманы ўзлёт да зораў — да крыніцаў —
святла струмень, браты і сёстры, і сябры.

1970

* * *

Жадаю Вам
У гэты час світання —
Радзінаў дзень —
Узлёту ясных яў;
Ад сэрца шлю
Найшчырае вітанне,
Зычэнне ўцех
У свеце розных з'яў.

* * *

Памяці Ліды Н.

Любіла красы паўніню,
ішла напярэймы дню.
Хто дыхаў нязгаснай красой,
той вечна жыць будзе, бо з ёй.

23.10.1973

* * *

Жадаю Вам найсветлых дзён
З Днём нарадзінаў, што відзён
Праз кожны год наступных крас —
Прыгожых, шчасных з'яў для Вас!

27.07.1975

* * *

Дарагому сябру Міколу — у 65 гадоў жыцця

Яно прыйшло адтуль, дзе ўцеха ходзіць з горам, —
жыццё цярністае. Там шчырыя сябры —
шлюць гімны хараству неўтаймаваным хорам —
прасторы хлебныя, гуллівыя бары.

Яшчэ адзін парог. І зноўку сонца ўзыдзе.
Адплыне ў нябыццё цяжар і крыўд, і мук.
Пачаты ўчора шлях у морак не адыдзе,
бо поруч на яго ступае сяння ўнук.

Ды будуць зноў цвіцець сады і пахнуць хвоі,
пшаніцы і жыты да неба ўздымуць зрок.
Ні сыпкія пяскі, ні снежныя сувоі
назаўтра не змятуць унука мужны крок.

23.10.1976

ПАЭМЫ

НА ХУТКІХ КРЫЛАХ ВОЛЬНАГА ПЕГАСА

Прысвячэнне

Мінаюць дваццаць першыя угодкі
майго жыцця. Пакуль яшчэ не стар —
усё, што я набыў за час кароткі,
што маю — пакладу на свой алтар.
Для вас, сябры мае і аднагодкі,
народзе мой, крывіцкі мой абшар,
нашчадкі прышлага, былога продкі,
я прысвячаю слоў сардэчных дар.
Дармо, што вас не бачу гэтым часам,
дармо, што есць мяне чужыны золь,
грызе душу цяжкой разлукі моль, —
знясу усё — і зло, і перагасы,
да вас прымчу слоў гэтых хлеб і соль
на хуткіх крылах вольнага Пегаса.

1

Калі ўзварушаць росных траваў бліскі
вятры паўдня — там край, мая зямля, —
здаецца мне, што чую голас блізкі,
дармо, што ён даносіцца здаля.
Яго страчаю я з паклонам нізкім,
яму шляхі далей шчэ значу я, —
гайдае ён майго чуцця калыскі
і неспакой сцішае спакваля.

Калі ж дыхне наўсуперак калючы
паўночны вецер — клёк з радзімы ён
гняце назад; шлю покліч наўздагон —
а голас разбіваецца аб кручы.
На грудзі камень-жоран ціснe, млён
свідруе сэрца жорстка і балюча.

2

Не мае боль граніц і берагоў.
Я клічу ўсемагутнага Зевеса:
о, мой Зевес, о слаўны бог багоў,
змяці, скрышы нягодныя злавесы;
не дай паўночным скогатам шляхоў,
захутай іх суцьмежнаю завесай;
вярні назад паўдзённы ўздых вятроў
і прагані навалу хмараў звесых.
Так просіць помачы найвышшай той,
хто стрэнецца з няўхільнаю бядою,
калі яна і цягне за сабою,
і вязніць у жахлівы горан свой —
з апошніх сіл ён дужаецца з ёю,
нібы плывак, што топіцца, — з вадой.

3

О, мой Зевес!.. Здаецца, у эфіры
мяне пачуў ён — шле сваіх бажкоў:
ляцяць яны, імклівыя Зефіры,
з усходу й захаду — з усіх бакоў.
Лагодны подых шлюць на ўлонне шыры,
даюць жыццю, што мерзне, цёплы схоў.
І гэткі ласкавы, і гэткі шчыры
павеў паўдня вяртаецца ізноў.
Хоць я на яве гэтага не бачу,
затое ў мроях пешчу і нашу,
бо толькі можа ў іх уняць душу
адзін паэта — больш ніхто, няйначай.
Тады нястрымнасць болесцяў глушу
наплывам новых хваль крыві гарачай.

4

Тады прыходзіць Муза. Мне яна —
сяброўка дум узнёслых і натхнення.
Ніхто апроч яе — яна адна
вядзе мяне да спраў і летуценняў.
Туды вядзе, дзе творчасці вясна,
становіцца на шлях маіх імкненняў,
гатовая ў няпомыс адагнаць
натоўпы чорныя свавольных сценяў.
Я з ёй заўжды. І нас не разлучыць.
Так над калыскай хворага дзіцяці
схінаецца і ўдзень, і ўночы маці,
яна глядзіць яго, яна не спіць,
гатова нат жыццё сваё аддаці,
каб ейнае магло дзіцятка жыць.

5

У звоне рыфмаў і у іхным рэі
спявае Муза мне ўвесь час, заўжды,
і кожны раз прытуліць і сагрэе —
крылатай думка робіцца тады:
нясе мяне і ў край, што ў ранах млее,
нясе мяне і ў прышласць праз гады,
дзе новы ўсход пурпураю зарэе,
дзе вольнага жыцця цвітуць сады.
Даруй, чытач мой, мне за гэткі ранні
і без пары, без часу смелы лёт.
Але ж, казаў той, думкі ломяць лёд
замінаў. І у творчым парыванні
чаму ж парой не ўзняцца да высот?..

6

Нікому дум маіх не ўзяць на засаў,
пакуль жывуць — усякі змогуць час.
Пакуль жыццё у сэрцы не пагасла,
хачу радзіму ўбачыць шчэ хоць раз.
Маё жыццё і я — нястрымна, засаб
ірвёмся ўвысь, на родных ніў Парнас…

На хуткіх крылах вольнага Пегаса
ляту, мой Край, сябры мае, да вас.
. . . .
. . . .
. . . .

7

Ляту, ляту з далёкае чужыны —
ля зораў неба торнага мой шлях.
Вітанне вам, знаёмыя мясціны,
табе, зямлі сялянскае прасцяг!
Я быў і ёсць, і буду вашым сынам,
бацькамі — вы. Не спаў я па начох —
жылі ў маіх вы думках неадхлынна,
а засынаў — былі ў маіх вы снох.
Даўно не бачыў вас. У дальнай зморы
мне кожны месяц быў даўгім, як год.
Праз сотні вёрстаў, сотні перашкод,
праз немарач лясоў, праз стромы гораў
сягаў да вас, радзіма і народ,
сягаў да вас, крывіцкія прасторы.

8

Вось і яны, мурожныя лугі,
што хараством нязгасным вабяць вока.
Ля іх, у сценях лозаў, — берагі
ракі Вусы — дзе плыткай, дзе глыбокай.
Бягуць да берагоў тых праз лагі
крыніцы, поўныя зямнога клёку.
А з неба ў люстры водаў, як багі,
адсвечваюцца белыя аблокі.
Вуса, Вуса! Ці помніш, як вясной
тваім я захапляўся ледаходам?
А ўлетку у абдымкі плынных водаў
нырaў і дна кранаўся галавой?
Ці помніш, як па коўзкай гладзі лёду
на спрытных коўзнях бегаў я зімой?

9

Ці помніш?.. Ад ракі ідуць прысады
на ўсход. Там бачна Шылава Гара.
Туды калісь я бегаў на агляды
высокіх хвояў, што пасталі ў рад.
Чуў іхны звон і быў бясконца рады,
калі, ўзабраўшыся на хвою, пазіраў
на шыр палёў, на пышнасць даляглядаў,
дзе перад гэтым краскі я збіраў.
Тут восеняй, вясной, зімою, летам
па два-тры тыдні я бываў штогод.
Да дзеда ў госці прыязджаў. Турбот
улетку больш за ўсё было — палетак
карцела кожны абысці; і от —
мне сталася найлюбым месца гэта.

10

Тут, трэ сказаць, я гадаваўся, рос,
дармо, што змалку строга і няміла
мяне кідаў па іншых месцах лёс.
Бо толькі тут мяне зямля ўпаіла
жывой вадой; багаццяў ейных плёс
уліў у грудзі моцы плынь і сілы,
маю душу да самых зор узнёс,
ёй даў узлёт і даў Пегаса крылы.
З маленства сэрца толькі тут маё
любоў да краю роднага адчула.
За вёскай з дзедам быў парой; кранула
мяне — ён вёдаў — ніваў тхнень, гаёў.
«Унучку, глянь, — казаў дзядунька чула, —
усё, што бачыш, — наша, ўсё сваё».

11

І я праходзіў праз палі, праз нівы —
сем год было мне. (Хутка дні ішлі!)
Купаўся ў моры збажыны шумлівай
і прыпадаў грудзямі да зямлі.

Прыкладваў вуха да яе — чулліва
я адчуваў, як сокі там цяклі,
як выплывалі напаверх імкліва,
як травы ў гуках, чутных мне, раслі.
І думаў я аб тым, каб тыя гукі
сабраць і у адзін звязаць клубок,
напоўніць імі любы мой куток —
тады не бачыў бы ні зла, ні мукі.
(Такі з мяне маленькі быў прарок,
які не знаў ніякай шчэ навукі.)

12

Суладнасць свету — бы увесну сад
была ў маіх вачох у тыя годы.
І ейная прывабная краса
мяне запаланіла назаўсёды.
І я — драбочак свету — скмеціў сам,
што кожны ейны перл — то дар прыроды,
што кожны ейны чар — жыццю пасаг
і лек духовы ў жоўцьныя нягоды.
Мне люба ўсё было: і лес, і луг,
і шапаценне тхненнае расцінкі,
і мігаценне срэбнае расінкі.
Быў велічным сусвету кожны рух —
і згодныя жывой істоты ўчынкі,
і сонца ўсходзячага зыркі круг.

13

Любіў вясной глядзець у сінь нябёсаў,
раскошай дыхаць іхнаю, калі
па ціхім моры вышыні дзівоснай
хмурынкі лёгкія, як пух, плылі;
калі ў мой край на крылах веснаносных
ляцелі стройным клінам жураўлі…
. . . .
. . . .
Вясна прайшла. А восень стрэла сумна.

Урэзаліся ў памяць тыя дні:
з тужлівым крыкам птушкі ў вышыні
ляцелі ў вырай над пустэчай гумнаў.
«Нядобрае прарочаць штось яны», —
казалі людзі, глядзя ўвысь задумна.

14

А потым?.. Пачалося і пайшло…
Зямлю ўсчала разбойніцкая зруха.
Бы град, людскія головы далоў
крывавая сыпнула завіруха.
Нямала ейны меч зложыў галоў,
і чалавек ёй кожны быў — што муха.
Муку жуды смяротны млын малоў,
драпежная крышыла косці скруха.
Нясцерпным пеклам стаўся белы свет,
яго зямля — суцэльнай дамавінай.
На кожным кроку — гнеў, разбой злачынны,
за імі — поцемкі, крывавы след;
куды ні ступіш — слёзы, кроў бязвінных
і сыты чорным груганом абед.

15

Тады я страціў бацьку, страціў маці.
Я быў з дзяцей старэйшым — меў тады
пятнаццаць год. Са мной — шчэ трое ў хаце,
сястра, браты… Ні хлеба, ні вады…
Ну, вось і ўсё… Да гэтага няшчасце,
і холад грызкі — дзень не без бяды,
і недавер вакольны, і праклясце
без дай прычыны — на усе лады.
Мо гэта шмат каму недаспадобы,
але з маленства лгаць я не прывык —
абману скрух мой голаў не панік.
Хто стрэў мой кон, той знае — дні жалобы
меў гэным часам селянін-мужык
і ўнук дасконны дзеда-земляроба.

16

На собскім целе ранаў знёс нямала.
Штодня дурманіў розум дымны чад
і злыбяда ў слату, у гразь таптала;
сягаў не раз і мне крывавы кат
адсекчы голаў. Мой узрост нясталы
расправу адхіляў — дык быў нагляд.
Так сілаў шмат згубіў. Наканавала
мне доля жыць, як бачна ўжо, няшмат.
Пяклі агнём мяне пакутаў шчымы,
з грудзей юнацкую смакталі кроў,
забралі моц, што я ў жыцці знайшоў,
але ж ні ў летні вар, ні ў холад зімаў
ім не аддаў нязрадную любоў
да роднага людства і да радзімы.

17

Цяпер ні далеч, ні сыры туман
ні шэрых вечароў, ні мутных ранняў,
ні хараства чужога хітры зман
любові той не ўзяў і ўзяць не ў стане.
Крывіч — радзімаю назоў мне дан!
Я рад, я ганаруся гэтым званнем,
усім сабой людству свайму аддан,
такім я быў і буду да скanання.
Заўжды — ці я за працаю цяжкой,
ці між сяброў, пры радасці удзеле,
або хваробай кінуты ў пасцелю —
успамінаю кут каханы свой.
Заўжды — пакуль пачуцці не знямелі —
жыву і дыхаю, мой Край, табой.

18

Мой дарагі! Тваіх глыбінь крыніцы
гаілі раны ў сэрцы мне не раз.
Каб не было цябе, даўно я ніцма
зваліўся б долу ў завірушны час.

Калі б не ты — калючая кастрыца
нягодаў выела б мне вочы ўраз.
І там, дзе ты, я лекаў змог напіцца
і моцы іхнае агонь не згас.
Цяпер ці мала болесцяў сцішае
мне аб табе нат добры успамін.
Заўсёды ты са мной — я не адзін.
Які шчаслівы той, хто адчувае,
што ён адданы Краю свайго сын —
яму жыццё і сілы прысвячае!

19

Якой жа бачу я зямлю тваю
цяпер, мой Край? Яна — уся на ранах.
Паблякла, веліч страціўшы сваю,
і хараство, што так было каханым.
Манголец, акрывавіўшы зямлю,
нікім, нікім не прошаны, не званы,
Айчыну найдарожшую маю
злачынна нішчыць гвалтам нестрыманым.
Жадае ён крыві, вязніцаў, крат,
не можа жыць ён без агню, без войнаў,
стварыў закон нялюдскасці разбойны.
Чаму ж, чаму маўчыш, мой родны брат?
Хіба хапае сіл глядзець спакойна,
як рэжа цела Краю твайго кат?

20

Рухомы моцных прадзедаў крывёю,
не йдзі з нядужасцяй ляной ступой.
Ты ж у руках трымаеш моцна зброю,
бо ты жывеш, валодаеш сабой.
Хай дні твае не хмурацца тугою,
а з высака узнятай галавой —
з нястрымнаю крывіцкаю сям'ёю
адважным будзь — ідзі ў апошні бой.
Сама сабой да нас не прыйдзе воля,

сама сабою з неба не зляціць.
Калі зняволеным не хочаш быць,
а хочаш жыць — выходзь на бітвы поле!
І волю толькі зможам мы здабыць
змаганнем збройным, моцным, як ніколі.

21

Нялёгкім будзе бой. З крыві, з агня
не кожны выйдзе цэл. Шмат з нас паляжа.
Магчыма, там складу і галаў я,
але не трусам — войнікам адважным.
Мы зброяй — родам даўнага кап'я —
перад сусветам сцвердзім і дакажам,
што слаўная крывіцкая сям'я
сіл досыць мае на загубу ўражжу.
І не дарма сваю мы кроў пральём,
і не дарма складзём свае ахвяры.
Усё, аб чым з нас кожны сніў і марыў,
калі не нам — нашчадкам прынясём!
І неба Крыўі не зацемраць хмары,
і тор жыцця не зарасце быллём.

22

Заціхне бой. За намі — перамога!
І новы дзень усходняя зара
народзіць. Дзень той абяцае многа…
Цяпер і ў прышласць зазірнуць пара.
Для крывіча, а не для трутня злога
нясе яна і моц, і плён дабра,
к сабе і кліча, й вабіць маладога
прарока і паэту-змагара.
Як сымбаль вечнага жыцця, заззяе
над Крыўяй вольнай светланосны зніч.
Зямля на Перуна ўладарны кліч
адкажа спорнай працай і ўраджаем.
І без чужое ласкі — сам крывіч
гаспадаром здалее быць над Краем.

23

Каб чэрпаць веду і навукі дар,
сваіх дзяцей пашле ў свае ён школы,
а кожны вучань — будучы змагар,
што не аддасць мангольскім ордам волі.
Не зломіць больш яго варожы ўдар.
Абыдзе ён лясы, абыдзе долы,
усё — нат дзіўных таямніцаў чар —
ён падпарадкуе сабе наўкола.
Узняўшы бел-чырвона-белы сцяг,
ён з войскам собскім, дружным і адзіным,
на варту стане любае Айчыны.
І сціхаміраццa маскаль і лях,
і не кране нас ліхадзей злачынны.
. . . .

24

І ён, той светлай прышласці усход,
перад вачмі маймі гарыць нязгасна.
Магуты, славы, вольнасці прыход
нязломнай Крыўі — сонечны і ясны.
Яго ў баях здабудзе мой народ.
Шлях будзе вольны — і на ўзлёце часу
прымчыцца ён у Край без перашкод
на хуткіх крылах вольнага Пегаса.
Заўсёды бачыць прышлы дзень найперш
натхнёны Музаю юнак-паэта.
Хоць ён юнак, а ў Край, вясной сагрэты,
праносіць веру над усім наўзверш.
І толькі з думкаю і з верай гэтай
я сведама пушчаю ў свет свой верш.

02.05–29.10.1943, Рыга

ЗВІНЯЦЬ ЗВАНЫ СВЯТОЙ САФІІ

Юрку Віцьбічу

1

Вітанне, космасу прастор!
Нішто мне нейкі перавал там!
Ad astra слынных лётаў створ
узнёс мяне на зайздрасць Альпам;
шугнуў удаль, як метэор,
з найноўшай зброі пальнуў залпам…
Ты не мінеш смяротных ран,
пантэра хіжая, тыран!

2

І папярхнуўся спеў застольны,
і чорнай сцёк упыр крывёй;
змярцвеў гармідар беспатольны,
прад сконам гаркнуўшы савой.
А над Дзвіною горад стольны
схіліўся думнай галавой,
і, ўскалыхнуўшыся ў стыхіі,
загуў змагарны звон Сафіі.

3

З канцоў паўстала даўніна,
з аддаляў выйшаў год за годам;
і адпаўзла ў нябыт мана,
і вечны скон прыйшоў нягодам.
А непакорная Дзвіна
плыве з былым і з новым згодам,
і новым днём гудзе здавён
Святой Сафіі грымны звон.

4

Святляр жыцця, цямняр агоній
і неўміручасці сімптом —
няўціхны звон. Гудзьбе ягонай
званы астатнія гуртом

уторацъ згодай неўгамоннай:
Дзын-дум! Бам-бом! Дзын-дум! Бам-бом!
Сваё паўторнае світанне
спаткаць выходзьце, крывічане!

5

Звініць Святой Сафіі дар,
не моўкне збытая надзея.
Займай пасад свой, валадар,
нашчадак слаўны Чарадзея!
Паслухай: звону кажны ўдар —
жыцця вялікшая падзея.
Хай здрада б'ецца ў цвердзь ілбом…
Дзын-дум! Бам-бом! Дзын-дум! Бам-бом!

6

Звіняць званы Святой Сафіі —
гамоніць збуджаная даль,
ірвуцца путы векавыя,
і ломіцца кайданаў сталь.
Нясуць законы вечавыя
сумлення чыстага крышталь
людству, зямлі, святлом спавітай,
крывёю праўднаю здабытай.

7

Званы звіняць. Шумяць на ўтор
лясы Крывіччыны блакітнай;
вітае іх Птушыны Тор
сузор'ем, поле — песняй жытняй,
валвой — азёраў буд-гутор,
узбераж — казкаю ракітнай…
Вялікі край, шматспеўны край,
легендаў вечных мудры бай!

8

Звіняць званы. А па далёкай
зямлі (там — ноч, святла — нідзе)

яшчэ ўсё мучыць катаў лёкай
выгнанца ў зморы і нудзе.
Ды краты нішчацца. Шырокай
далінай шлях-зварот вядзе
у сёлы ўсіх дароў на нівах,
у месты ўсіх званоў гуллівых.

9

Званы звіняць. І гэн — з нямой
чужыны, горнай і бяздомнай,
ідзе мой брат і сябра мой —
змагар краіны зычназвоннай.
Заміны — бачыць ён — гурмой
над прорвай рухнулі прадоннай;
ён чуе — кліча вольны дом:
«Да-дому! Бом! Дзын-дум! Бам-бом!»

10

Звіняць званы Святой Сафіі,
Дзвіной імчыцца бурны сром.
Грымяць паходы баявыя,
сусвет узрушыўшы суздром.
Зямля пяскі змяла сухія,
азёры стрэслі лёд-паздром.
. . . .
. . . .

11

Няма табе канца і краю,
абшар, прамудрасці сабор!
Я выйду з кола небакраю —
я неўтрыманасці сябёр!
Мяне да дум маіх — да краю
прымчыць найноўшых лётаў створ
туды, дзе ў велічнай стыхіі
звіняць званы Святой Сафіі.

1946

ДОМІК У МЕНСКУ

I

Цвіці, вясна мая, цвіці!
З табой парываў пошуг поруч.
Няхай знікае ў небыцці
глухіх часін туга і горыч.

Бязмежжа ніваў калыхай,
пашлі ім веслівыя сокі —
зямлі і неба дар — няхай
узносіць іх узрост высокі.

З тваёй ацвеценай красой
насіцьму ўсцешаную мрою:
на луг, аздоблены расой,
ступлю з праддзённаю зарою.

Прайду па ім гаспадаром,
паклон пашлю багаццю ніваў,
сустрэну песняю свой дом —
вяшчунняй спору й плённых жніваў.

Цяпер жа — немань, ноч над ім,
тугой засмучаным харомам,
ахутаў далі зманны дым,
спакой трывожаць высі громам.

Жуда над вокнамі брыдзе,
круччо сядзіць на шэрых стрэхах…
Ты засталася у бядзе,
мая пакіненая ўцеха!

II

А з тым харомам-домам я
маленькі дом успамінаю:
над самай Свіслачай стаяў,
ці сяння ён стаіць — не знаю.

Я ў ім пражыў аднюткі дзень,
у ім я ёй глядзеў у вочы.
З вакна зайздросціў нам прамень,
як мы, на розвіт неахвочы.

Я голас ейны ў доме чуў —
той звон крыніц, нібы срабрысты.
Я з насалодаю адчуў
ягоны спеў крышталльна-чысты.

Пабачыў працу ейных рук
на ўзорах, ёю вышываных.
Я чуў — на вулцы голскі брук
змаўкаў, нібы зачараваны.

Мне помніць доўга дзень у тым
у доме простым а раскошным.
Я мілым быў і дарагім
ягоным госцем — мо й апошнім.

Бязмежна ўдзячны дому й дню —
няўтоме рук і сціплай працы:
пазнаў я з імі прасціню
пышнейшай над усе палацы.

III

Мы нарадзіліся наўзбоч
здаволлем выпешчаных сцежак.
Сляпіла вочы цемра-ноч,
святлом нам быў маленькі ўзмежак.

Мы працярэбвалі шляхі
да межаў дзён, заўсёды ясных, —
ды адшпурляў віхор ліхі
да ночаў вечных і заўчасных.

Не песціў зваблены пагляд
зарніцаў ранніх і вячорных —
хмурнеў суровы гул гармат
сцяной дымоў — густых і чорных.

Нязгаснасць радасці здалёк,
як зніца, клікала, будзіла —
ды прыбліжальны мужны крок
гняла антыхрыстава сіла.

Мы не спыняліся, яе
вось-вось імклівa дасягалі…

Нястомна зло ланцуг куе
і не сціхаюць штормаў хвалі.

Куды ні глянь — на растанёх
прапекла крыж пакут прыгнула.
І тое, чым бы жыць я мог, —
адным-аднюткім днём мільгнула.

IV

Пакінуў з болесцяй яго —
ізноў паклікалі дарогі.
А дому йшчэ ні аднаго
я не знайшоў — так свет убогі.

Як шоўк — ля дома на двары
краса мураваў аксамітных.
Як жвір — заморскія каўры
маіх прытулкаў невыбітных.

Ля дома ў пуні моцны сон,
як пух — і сена, і салома.
Як грант — чужы начлег-прыгон,
не адпачынак — толькі ўтома.

Ці ж у маёй бядзе цяжкой
магільны холад камяніцы
замяніць сціплы мой пакой
у вокнах з позіркам дзянніцы?

Ці ж у мужчынскіх сподніх твар
пад голс эпохі маляваны,
заменіць мне яе — той чар,
ні з кім у свеце незраўнаны?

І той, хто страціў дом-харом,
пазнаў ля сцен чужых і ўпартых
палац з раскошай і дабром
яго, найбеднага, не варты.

V

І з росным ранкам, з ясным днём,
і на зары, і на паўдзённі,
«адзіны дом, каханы дом» —
няўціхна сэрца б’ецца-звоне.

Граніц мінаючы драты,
брыдзе мой лёс гарбатым дзедам.
«Каханы ты, адзіны ты», —
уторань сэрцу думкі следам.

Званочкі-краскі, васількі.
Ці ж то яны? Яны ж — далёчы.
Між іх мільгаюць матылькі.
А ў думках — толькі дом і вочы.

Рамонкі — безліч, безліч іх!
Адна краса — палі і ўзмежкі.
А мне здаецца — вочаў тых
глыбокі смутак і... усмешкі.

Маркотны шлях. І пад ступой
скрыпяць пяскі, бы снег аб полаз.
Я не спаткаюся з табой
і больш не чуцьму ейны голас.

Ізноў палі. І белізна
садоў-гаёў; на сэрцы — склока:
вакол вясна, цвіце вясна,
а вы... не блізка — так далёка...

VI

«Драўляны дом, блакітны дом!
Маіх найлепшых мар прытулак.
Ці так жа ўсё сваім вакном
глядзіш на вузенькі завулак?

Ці шчасцем ты сваім багат,
ці шашаль сцены твае губіць?
Ці так жа ўсё зялёны сад
тваю ідылію галубіць?

Скажы ты мне, скажы ты мне,
дзе зараз тая, што начамі
малілася сваёй вясне —
такая... з сінімі вачамі?

Ці ёй цяпер, як і тады,
ад нечага ўсё сумна, цяжка?

Як пражывае малады
свой век прыгожая манашка?

Што з ёй цяпер? Свой ціхі сум
яна ў вачох па мне ці носіць?
Гаротнасць цяжкіх яе дум
каго развеяць яна просіць?

Драўляны дом, пястуй свой сон,
гадуй у садзе свой спачынак.
Ты мар найлепшых пантэон,
адзіны дум маіх прыпынак.»

VII

О, незабыўныя радкі
майго калегі М. Сяднёва!
Вы дум цвяцістыя вянкі,
цытую вас я слова ў слова.

Я з вашым аўтарам пра вас
успамінаў у Беластоку,
і з вамі я тужыў ці раз
ля водаў Рыжскае затокі;

і праз далейшыя шляхі
былі вы песняю адзінай;
ступаў я з вамі праз імхі
лясоў Эстоніі гасціннай;

і пры насланні — дымных днёх —
былі вы знічкай успаміну,
жылі ўва мне ў трывожных снох
і ў бамбасховішчах Берліну.

Ды Reich у згін не пахіснуў
і не паставіў на калены;
мяне ад вас не адхіснуў
і стогн руін агністай Вены.

Як з вамі я, вы ідзяцё
за мной па скалах Альпаў хмурых.
І вы, як дом, — маё жыццё,
мая нясхільнасць у віхурах.

VIII

Як дом над Свіслачай-ракой —
найсціплы скарб мае сталіцы,
так згадка — плач тугі, якой
цяпер трымцяць і вёснаў гліцы.

Адпорны сіберным вятром —
ён частка цэлага харому,
ды мне цяпер — бы сам харом,
нібы мой дом самога дому.

Яна ж у ім — яна жыла,
мо й сяння зносе ў ім няўцеху,
і пад крывавым пеклам зла
не знае радасці і смеху.

Мо ў тундрах, мо сярод пяскоў
нясе пакрыўдны здзек сваволі —
і па слядох яе бацькоў
далей грыміць ланцуг няволі…

Туга салодкая мая
даўно са мною не сябруе,
а ў сэрца джаліць, як змяя,
і ў ёй, нібы ў агні, гару я.

І дакарае мне: — Чаму ж
і дом, і ў ім яе пакінуў?
Няхай бы ты — і смел, і дуж —
харобрым рыцарам загінуў.

IX

Ты дакарай мне, дакарай,
мая туга — неўтаймаванасць!
Бясслаўна я пакінуў край.
А дзе ж ахвярная адданасць?..

На дол, сцякаючы крывёй,
спадала чэрапная каска.
Ішла-паўзла на змену ёй
чырвонасплюшчаная маска.

Адна прад сконам: — O, mein Gott! —
і смерць на месцы спатыкала.
— Даешь! Дави его, вперед! —
другая побач не змаўкала.

А дом… Яна — ці ж гэта сон? —
сказала ветліва і цвёрда:
— Ідзі! — бы грайкіх струнаў звон
прагуў распачлівым акордам.

— На край і неба, і зямлі
ідзі, а злыбедам не дайся.
Адтуль, дзе толькі ў снох былі,
неперáможаным вяртайся. —

Яна сказала ў доме мне —
і я паслухаўся наказу.
…Была вясна. Маёй вясне —
заўсёды жыць, бы казцы-сказу.

X

А беларуская вясна —
я не знайшоў нідзе ёй роўных.
Краса на ўсёй зямлі — адна,
ды шмат у ёй аздоб чароўных.

І рознасць іхная ў вясне —
і ў той вясне харому-дому…
Як першы цёплы дзень блісне,
марозу весцячы утому, —

гарыць крыштальны, чысты снег,
і дзень, як сонца, — прамяністы.
Ледзь кропля звонкая са стрэх
спадзе, маўляў смарагд агністы, —

і ажывае свет красы:
і дол, і неба — зоры й зоры;
і прачынаюцца лясы,
гамоняць рэкі і вазёры;

снягі струменямі вады
да іх імкнуцца нестрымліва,
плывуць і крышацца ільды,
пад сонцам таюць зігатліва.

Яшчэ руцвянаю травой
не ўскрыты ўзрэччы і пралескі,
а пад нябёснай сінявой
цвітуць блакітныя пралескі.

XI

Пяшчоту весніх абыймоў
зямля ўдыхае шырай-шырай.
Шпакі вяртаюцца дамоў —
не вабіць іх далёкі вырай;

лятуць у свой харом — у ім
найбольш, як дзе, цяпла й раздолля...
І з днём праменна-залатым
п'юць дрэвы сок святла й здаволля.

Цвіце, адцвітвае гарэх.
Снягі зыйшлі. А дол — пад беляй,
і пух асінавы, бы снег,
кладзецца лёгкаю пасцеляй.

Дымнее пахкая ралля —
ёй сейбіт зерне дорыць-сее.
Пчала спяшае да вулля.
Блакіт насупліва хмурнее.

Разважна крочыць першы гром
за хмарна-змрочнымі дзвярыма.
Зямля, абмытая дажджом,
буяе пышнасцяй кілімаў.

Зноў адчыняе дзверы выш,
рвучы суцэлле хмар на болкі, —
зіяе з іх праменны спіж
дугой шматколернай вясёлкі...

XII

Вясна праводзіла ў шляхі,
дзяліла смутак развітання.
Над ёй глуміліся штыхі —
зняслаўцы ейнага світання.

І прэч, губляючы сяброў,
спяшалі захаду вандалы.
І зноўку неслі здзек і кроў
сыны усходняе навалы.

Агнём пяклі адны адных
і агрызаліся агнямі.
Распачы крык, апошні ўздых —
нат ночы зблыталіся з днямі.

Як лістапад, спадала з дрэў
вясна, адцвілая заўчасна;
і сам харом шугаў гарэў,
гарэў, здавалася, нязгасна;

схаваўся ў дыме і агні
і дом зруйнованай сталіцы...
І доўга йшчэ ў далечыні
займаўся полыск палавіцы.

Жаўрэў крывёю небакрай —
куды ні йшоў я і ні ехаў...
Вялік шырокі свет-бяскрай —
бясконцы шлях пакут-няўцехаў.

XIII

За дом, за пышную вясну
ішоў і йду, і не спынюся.
Павекаў стомных не самкну
у несціханай завірусе.

Мае цярністыя шляхі
вядуць да дзён, заўсёды ясных,
не адшпурне віхор ліхі
да ночаў цёмных і заўчасных.

Шукае спрагнены пагляд
зарніцаў ранніх і вячорных.
Сціхае строгі гул гармат
і кане дым — густы і чорны.

О, нездарма зара здалёк
мяне і клікала, й будзіла:
пад прыбліжальны мужны крок
трасецца зльдніцкая сіла.

Само сабе ланцуг куе
прапекла й зло пад штормаў хвалі.
Я не згубіў зары — з яе
вачэй не зводзіў у навале.

І на апошніх растанёх
хай не змыкаюцца павекі,
каб тое, чым я жыць не змог,
было маім — было навекі.

XIV

І з росным ранкам, з ясным днём —
і на зары, і на паўдзённі —
цябе я помніў, дом-харом,
цябе я помню і сягоння.

Твая аздоба пекнаты —
і па-над полем, і на полі.
Каханы ты, адзіны ты,
ты мне не быў чужым ніколі!

Ішоў праз далеч нацянькі,
ступаў апоўдні, апаўночы,
у жыце бачыў васількі,
мне ў іх яе зіялі вочы.

Стаптаў ці мала мурагоў,
пераступаў, мінаў узмежкі —
да незабыўных берагоў
мяне вялі яе усмешкі.

І верыў: ёй не быць рабой!
І прыйсце блізкае вяшчую:
няўхільна ўбачуся з табой
і голас ейны зноў пачую.

Сустрэне цвецень-белізна
усіх садоў, адыдзе склока.
Вакол вясна, цвіце вясна —
і вы так блізка, недалёка.

XV

Цвіці, вясна мая, цвіці!
З табой парываў пошуг поруч.
Няхай знікае ў небыцці
глухіх часін туга і горыч.

Бязмежжа ніваў калыхай,
пашлі ім веслівыя сокі —
зямлі і неба дар — няхай
узносіць іх узрост высокі.

З тваёй ацвеценай красой
здзяйсняю ўсцешаную мрою:
на луг, аздоблены расой,
іду з праддзённаю зарою.

Прастую ў даль гаспадаром,
паклон нясу багаццю ніваў.
Цябе вітаю песняй, дом —
вяшчунняй спору й плённых жніваў.

Пад сонцам светла-маладым
і нада мной, табой — харомам —
не засціць неба трутны дым,
блакіт развеяў хмары громам.

А поруч нас яна ідзе,
аб ёй і водгалас — як рэха…
Цябе не кінуў у бядзе,
мая нястрачаная ўцеха!

1944–1945

СЫН

I

Бядой прыгноблены твой стан,
мая пакутная айчына.
Красу растурзвае злачынна
працемрай счорнены гаман.
Здабыць святло, развеяць зман
ты з дому выправіла сына…
Нясцерпны боль, пахілы стан
і слёзы, мора слёз, айчына!

II

Яны, закулі што цябе,
шукаюць троп твайго дзіцяці.
Нясплямнасць ганьбяць у пракляцці
у зацямрушанай кляцьбе.
Ці ж у няроўнай барацьбе
устоіць сын — спадзея маці?
Ці смерць асочвае цябе
заўчаснай смерцяю дзіцяці?

III

А ў сэрцы голас: — Хай няма
людзей з табой, а толькі горы,
няхай прытулак твой — у горы
без варты змрочная турма, —
цябе не згнібе ціхама
няўхільнасці memento mori.
Мужней, будзь гартным, хай няма
цяпла, а толькі лёд і горы.

IV

І нестрыманы кліч: — Дармо
імгла ўсясвет варушыць зманам,
не замаўчаць балючым ранам —
не зняміць іх акоў ярмо!

А гарт —
е дом красы забраным!
Нарузе — небыт, і дармо
прытулак твой хмурнее зманам.

V

І словы ласкі: — Чую, сын,
на свет ідзе-імкне нашчадак.
Няхай не мірсціцца на спадак
счарсцвелы грунт чужых краін;
нясі ж, каб род не йшоў на згін,
у дом, свой дом святло й парадак;
мой сын-дзіцё і бацька-сын,
на свет ідзе-імкне нашчадак!

VI

На свет насуплівы імкне,
як я, выношваны ў трывозе.
Ды на бязвыйсцевай дарозе
у неспагаднай старане
у вокны радасць не зірне —
нядоля стогне на парозе…
А нестрыманае імкне —
і не закуць яго ў трывозе!

VII

Ці над зямлёю дождж, ці град,
ці не сціхае навальніца,
ці сонца ўсцешана іскрыцца,
ці тужыць месяц-светласпрат —
на шыр жыцця з нявольных крат
нястомна шлях куе крыніца,
і не саб'е з яго ні град,
ні зімаў лёд, ні навальніца…

VIII

Душы трывожнай неспакой —
уся і ўцеха, і багацце…

Я горка плакаў, як пры ўтраце,
за наш, айчына, хлеб з вадой,
за болесці дачкі тваёй
і за твае — за мукі маці.
Няўжо трывожны неспакой —
адзіны скарб наш і багацце?

IX

...Ледзь толькі дрэвы за вакном
у маладой лісцве-убранні
спаткалі дзень, а промень ранні
праз шыбы кпіў над вашым сном,
здалося мне, збудзіўся дом:
— Радзіўся сын! — і прывітанні...
— Радзіўся сын! — і за вакном
цвілі сады ў красе-убранні.

X

І я адчуў: шляхі мае
мінулі засцьлівую хмару.
А сын пад мужным лётам чару
вырослым поруч паўстае,
рукам спачыну не дае,
перамагаючы прымару,
шляхі ягоныя й мае
выводзяць нас на шыр, за хмару.

XI

А там, дзе быў утульны дом,
і там, дзе скарб спяліла жыта, —
руінаў шчэрбы, і прыбіта
зямля ўраджайная дажджом.
Мой сын нязгасным светлым днём
кладзе цагліны працавіта —
і вырастае новы дом,
і ў полі скарбы спеліць жыта.

XII

Знікае мор ярэмных мук,
жыццё плыве на хвалях славы.
Будуюць моцны мур дзяржавы
цвярозы розум, сіла рук.
А следам змена — дужы ўнук
прастуе ў свет шляхамі явы…
Каб ты не знаў ярэмных мук,
мой род, мацуй здабыткі славы!..

XIII

Прарочу: выпрастаеш стан,
мая цярплівая айчына.
З плячэй тваіх спадзе руіна —
нямы цяжар балючых ран.
Не зломіць бураў акіян
будаўнікоў — і бацьку, й сына.
Для іх не сплямлены твой стан
і ты — жыццё для іх, айчына.

XIV

Табе ж адданага жыцця
не знае хай memento mori.
Ягоны крок — не шуст у зморы,
не траваў шэпт, не шам трысця:
а бацька-сын і сын-дзіця
ідуць здалець злыбед гаморы!
І пад нясхільнясцяй жыцця
схіляецца memento mori.

1947

ВЯНОК САНЕТАЎ

1

Мае найлепшыя дары — вянкі
цвітуць і свецяцца Табой, далёкай.
Звініш Ты ў думках песняй сінявокай,
палонячы нясціхныя радкі.

Ад водгуку шматцечнае ракі,
ад возера маўклівасці глыбокай
Ты выплываеш над бясхатняй склокай,
у косах — сымбаль дому — васількі.

О, Беатрычэ Ты, о Ты, Прадзева!
Дажджамі знічак — зорных слоў улева
хвалу красе з вышыняў шле на дол.

Гамоняць ёю горы і нізіны.
Чалом ад неба і зямлі вакол —
Табе, правобраз хараства адзіны.

2

Табе, правобраз хараства адзіны,
з малітвамі схіляю галаву.
Праз дзень і ноч адно Табой жыву…
Запальваецца ў небе Шлях Птушыны.

З яго, як дар, цурыцца неадхлынны
струмень святла. Пад ім я наяву:
бывай, нязваблівы прыпын, — плыву
да берагоў каханае Айчыны.

Ва ўскалыханым ветрам акіяне
ці раз у вочы прывід смерці гляне,
спаткае час няўцешны і благі.

Усё адужае мой плаў няспынны,
бо Ты са мною — радасці й тугі
хвалюеш Ты таёмныя глыбіны.

3

Хвалюеш Ты таёмныя глыбіны.
Маіх надзеяў, веры і быцця,
вітай, прымай асельца — не гасця,
шляхі не вернуць да нямой чужыны.

О, выслухай: няма нідзе краіны,
цябе аддалай крыўдзе забыцця,
і толькі ён адзін — тыран жыцця
нявольнікам сваім згінае спіны.

З табою поплеч я — змагчы цяжар,
раздзьмухаць да агню прыгаслы жар.
Ідзе вясна. І на зямлі адталай

пускаюць дрэвы свежыя лісткі.
Не абяскрыліць катаргаў навала
душы людства, узнёслай у вякі.

4

Душы людства, узнёслай у вякі,
не закуе атрутная Гальгота.
Растопяцца ільды, замрэ спякота,
святла не сцемраць горныя крукі.

Манахі духу, волі ваякі,
вам несмяротнай вышыні яснота!
На нівах спее сонца пазалота,
крышталем неба звоняць жаўрукі.

Твой голас чутны. Ім спявае свет —
і колераў, і гукаў агняцвет.
Лунае ён — вяшчун высокалётны.

Ваколля скарбы — знічы-маякі:
там ткуцца чарадзейныя палотны
ад лёгкасці натхнёнае рукі.

5

Ад лёгкасці натхнёнае рукі —
крыла недасягальнага анёла —
цвяцістасці букет зіхціць вясёла
з узлесся шумнага, з ціхой лукі.

Збірала краскі ты ў жмуты, пукі —
прывабу гарадоў, уборы сёлаў,
каб імі цешыць, радаваць наўкола,
атульваць яснасцяй твой шлях цяжкі.

Красуе на абрусах беласнежных,
на ручніках і покрыўках сунежных
старанна вышыты расцвіт вясны.

У ім і велічнасць — спазор вышынны:
як здзейсны сон, як чары даўніны,
узорнай казкай сцелюцца тканіны.

6

Узорнай казкай сцелюцца тканіны —
зямлі, вышыняў пышны далягляд
з тваіх красён... Ізноў цвіцее сад.
Пялёсткаў бель. Акацыі, язміны

так міла пахнуць. Рой гудзе пчаліны.
Як паланее ў звабе твой пагляд!
Вялікі Дом Красы — жывы прыклад,
ва ўлевах навальнічных незагінны.

І будзе вечным працы плён трывалы —
над ім Сам Дойлід, з веку ў векі дбалы.
Пачуцці поўняцца агнём святым.

З дарог знікаюць змрочныя заміны.
Нязгіну парыванне, духу ўздым
да светаў лёт збуджаюць сакаліны.

7

Да светаў лёт збуджаюць сакаліны
імкненні думак светлых і надзей.
Юнацкі ўздых на паўніню грудзей —
не кволасці звядальныя адхіны.

І пад устрыбам чэзне сык змяіны,
бо сіла ў пошугу, а ў поўзі — змей.
Хто ўзнёсся над будзённем найвышэй,
багаславёныя той мае чыны.

Чар прыгаства — не толькі красаў дань,
але і мужнасць — рыцарства талань.
Яму шукаюць шчасця і спакою

і напярэймы крочаць нацянькі —
на тых, сатканых вольнаю рукою,
на залатых палотнах мастакі.

8

На залатых палотнах мастакі —
майстры малярства, музыкі і слова
Твой славяць вобраз велічна і нова.
Увысь, удалеч неба летакі —

імчаць у свет, як бы чараўнікі,
яго з-пад Вільні, Менску, Магілёва…
Ты чутна ўсцяж — найспеўных скарбаў мова,
і бачна Ты — стан гнуткі і стрункі.

І дні, маўляў узмахі белых крылаў,
стаюцца лёгкімі ў бязмежжы сілаў.
Перада мной — краіна дабраты.

Усходзіць сонца ранняй насалоды.
Плывуць у прыстань ціхую плыты
пад зорамі прарочымі заўсёды.

9

Пад зорамі прарочымі заўсёды
адпачывае задуменны ніз.
А месяц у адбліску хмарных рыз
на заванi сутрыму лудзіць воды.

Ён добра ведае прыплываў ходы,
да блізкіх земляў. Глянь: зары карніз
на бор зубчасты палыменна звіс,
на вольхі за ракой, на азяроды.

Хай палыскуюць з даляў свігавіцы
адойшлай і зваротнай навальніцы —
адхіліць іх світанняў глыбіня,

яе заслепяць сонечныя ўсходы.
У нараджэнні радаснага дня
змаўкаюць завірушныя нягоды.

10

Змаўкаюць завірушныя нягоды,
падужаныя гартам і святлом.
Засвечвае сусвету мудры дом
мільённых зыркіх вокнаў карагоды,

глядзіцца незмігутна ў падысподы,
махаючы праменневым вяслом.
Наўкола зорыць ласкай і цяплом
Спадар Найвышні са Свае Гасподы.

Маўляў, пасля прыпару ў перасуш,
зямля празору высі піцьме ўсю ж.
Заб'юцца найсвяжэйшыя крыніцы

у ейных нетрах токам бруявым.
Адно з не-сну глыбіннае дзянніцы
спявае дол у хмелі веснавым.

11

Спявае дол у хмелі веснавым,
і мы ідзём, як і раней, нясхільна,
заўжды трымаючыся ўпоруч шчыльна,
як войнікі ў зароку баявым.

Нязломны дуб здаецца векавым,
вакол сябе ўзіраючыся пільна,
з магутных рук рассейваючы ўмільна
брыльянты жалудоў дажджом густым.

Карэнне новае свідруе глебу,
галінкі жвавыя смяюцца небу,
расце асёлкаў незлічоны ём,

іх пояць сокаў моцныя струмені —
прыроды светлазорлівы харом
не памірае ў велічным тварэнні.

12

Не памірае ў велічным тварэнні
Твае чароўнасці святы абраз.
...Да Вінчы, Рафаэль праз даль і час —
цяпершчыны з адвечнай славай геній

стае перад Табою на калені.
Ад згіну свету да ўваскросу — праз
аднетласць і збавенне — пераказ;
у неўміручасці — Твае цярпенні.

З Табой слабы — нязможны паладын,
асілак без Цябе — бястроп'е ў звін.
Грукоча шквал сукрухаў і бядоты,

нявечыць, топча да жыцця нястрым,
не траціць, не заломлівае ўзлёты
крылаты дух пры бліску надзямным.

13

Крылаты дух пры бліску надзямным
з узбуду ўзносіць да нязнаных светаў.
Там больш няма таёмнасці сакрэтаў,
неразгаданасці знікае дым.

Рассейваецца ў пыле агнявым
шалёны гнеў распаленых каметаў.
Не ные сэрца — звонкі спеў планетаў
шугае ўсцяж у віхры маладым.

Недасягальнае, будзь сябрам шчырым!
У жылах б'ецца кроў салодкім вірам,
плады ўпіваюцца тваім вінам,

бальзамам глыбаў — дужыя карэнні.
Пад сінявою вышняй не заснём —
як сонца йдзе ў прыцін — знікаюць цені.

14

Як сонца йдзе ў прыцін — знікаюць цені,
ніштo не засціць велічы зачын.
Няхай гарчэе злыбедаў палын
ды йзноў шалеюць лютыя нішчэнні —

не разбурыць магутныя скляпенні
нязломных сіл, не пакарыць нязвін
неперможнасці ў вуглёх руін!
З нясхільнасці яго твае багаславенні.

Гарыць, не гаснучы, агонь праз дні,
праз ночы, свеціць з даляў, з блізіні,
з учора ў сяння й заўтрае. У згодзе

яго пяроймуць прыйсця юнакі.
Ім на ўспамін у шчасці і прыгодзе —
мае найлепшыя дары — вянкі.

МАГІСТРАЛ

Мае найлепшыя дары — вянкі
Табе, правобраз хараства адзіны,
хвалюеш Ты таёмныя глыбіны
душы людства, узнёслай у вякі.

Ад лёгкасці натхнёнае рукі
узорнай казкай сцелюцца тканіны.
Да светаў лёт збуджаюць сакаліны
на залатых палотнах мастакі.

Пад зорамі прарочымі заўсёды
змаўкаюць завірушныя нягоды,
спявае дол у хмелі веснавым.

Не паміраае ў велічным тварэнні
крылаты дух пры бліску надзямным.
Як сонца йдзе ў прыцін — знікаюць сцені.

[1958?]

ДРАМАТУРГІЧНЫЯ ТВОРЫ

ДУХ ПРАЎДНЫ, ДУХУ ЗЛА НЕПАДУЛАДНЫ

Сцэнічны абраз у адной дзеі

Удзельнікі: *Уступнае слова*
Алесь
Мікола
Рыгор
Анатоль

Перад зачыненаю заслонаю з'яўляецца

УСТУПНАЕ СЛОВА:

Дабрыдзень вам, суродзічы на залі!
Дабрыдзень, госці! Шанаванне ўсім!
Гады плывуць, як бурных водаў хвалі,
адны — на спад, а іншыя — на ўздым.
У буйным росцвіце красы вясновай,
у пошугу крылатае ляты
зямля атульвае жыццё абновай,
а неба дорыць позірк залаты.
Збалелы ж смутак для душы чуллівай
нясе пары узлётнай нізкі спад.
Пад горкім плачам восені тужлівай
хаваецца ў туманах далягляд.
Хай не агортвае нас морак шэры!
Журбу адкінуўшы, у лепшы час,
у шчаслівейшы дзень — нязгаснасць веры
вось тут мы хочам паказаць для вас.
Хай над зямлёй лунае спеў суладны,
хай б'ецца ў ёй крыніц ажыўчы сок!..
«Дух праўдны, духу зла непадуладны» —
завецца так наш сціплы абразок.

(Знікае, у гэты момант адчыняецца заслона.)

Пакой, падобны да кабінета. Пісьмовы стол з грудамі кніжак. Наўкола колькі крэслаў. Пры стале сядзіць Алесь, нешта чытае.

А Л Е С Ь *(устаючы, ходзячы)*:

Кхэ-кхэ *(кашляе)*.
А неба
на долківае пальцам, як сто год
таму назад. І сотні год усцяж
зямлю ажыўчай сілай неба поіць
і сварыцца за грэшныя праступкі —
яна ж не хоча слухацца, не хоча…
А я сябе пацешу звабнай казкай:
каўром зялёным слалася пад небам
зямля, і гэткаю была заўсёды,
як сёлета, вясна; у тых жа фарбах
шырокім шляхам лета праставала
на светлы і здавольны супачынак;
і восень ува ўсіх сваіх калёрах
схілялася з паклонам над зямлёю;
зіма на шугавейных белых крылах
шумела ўзмахамі, на дол сядала,
адпачывала з важнаю задумай,
ці раз ізноў узняцца спрабавала,
махала крыламі — ізноў на дол
у стоме падала, а раптам сонца
яе тапіла ў рэках нестрыманых
і параю ўздымала да нябёсаў;
ізноў ішла раскутая вясна…
Калыша казка, спаць мяне ўкладае,
спяшаецца сказаць, пакуль не позна:
яшчэ ніхто, ніхто, яшчэ ніколі
не змог пад сонцам і пад небам бачыць
красы тае ў вясновых зыркіх фарбах,
у тых усмешках летніх — у раскошы,
у тых васенніх смутках маляўнічых,
у той зімовай белай сумятні —
тае красы, што ёсць і што існуе —

няўлоўленай паглядам чалавека,
не дадзенай яму яе ўлавіць.
І не пабачанай яна загіне,
і не пабачанай ідзе на згін.
Ідзе на згін. Заўжды ажыўчай сілай
паіла неба дол, але цяпер —
на дол сыходзіць з неба д'ябал смерці,
народжаны зямным непаслухмянствам…

(Чуваць стук у дзверы.)

Там стукаецца нехта…

(Стук паўтараецца.)

Калі ласка.

(Уваходзіць Мікола.)

МІКОЛА:

Дабрыдзень, сябра мой Алесь!

АЛЕСЬ:

Дабрыдзень!

(Цісучць адзін аднаму рукі.)

МІКОЛА:

Як маешся?

АЛЕСЬ:

Лепш не пытай… Як ты?

МІКОЛА:

Я чуюся заўсёды вельмі добра,
бадзёры праз усё маё жыццё —
і радасць агартае мае думы…
Я светлых дум прыяцелям жадаю
і нават ворагам… Бо вораг… Ён… ну што?..
Ён сам зусім не ведае, што робіць…
Ягоныя і сэрца, і пачуцці
аблытаныя чорным павучыннем
шайтана-д'яблавай нячыстай сілы.
Калі ж іскра святла ў яго істоту,

іскра святла ўпадзе — тады і ён
пачне шукаць збавення ад зняверы.
Як знойдзе — ён пабачыць прабуджэнне
ад чаду, што сляпіў, сушыў яго.
А як не знойдзе, дык туды й дарога
яму адна — у цёмнае прадонне.
Дух праўдны духу зла непадуладны,
не ўкленчыць у пакоры перад ім…
Але вось ты… Чаму такі ты сумны?
Што сталася з табой?

АЛЕСЬ:

Сядай, Мікола.

(Сядаюць.)

МІКОЛА:

Мне думалася — ты…

АЛЕСЬ:

О не, о не!
Лаўлю тваю я думку на паўслове —
не ёсць я рыцарам, не ёсць манахам,
не ёсць апосталам святла, як ты…
Як лягу спаць — а мне зусім не спіцца,
як толькі ўстану — месца не магу
знайсці сабе, на сэрцы гэтак цяжка
і гэтак сумна на зямлі чужой,
што толькі бачу ўсё перад сабою —
пагібель свету бачу, больш нічога.

МІКОЛА *(устае)*:

Ну, ты ўжо тут загнуў… І як так можна
сябе ў распачы мучыць і губіць?
Як можна працаваць і захапляцца
дарамі, данымі зямлёй і небам?
Як можна будаваць жыццё ў палоне
шчымлівай больсці сэрца і душы?
О, гэта вельмі з'ядлая хвароба!

А для яе так шмат агойных лекаў:
яны ў самой прываблівай прыродзе.
Вось ранне зыркае і сонца ўсход
цябе абуджвае, вядзе, натхняе.
Люстраным водбліскам мігаюць росы,
рознагалосы спеў на ўсе лады —
птушыны спеў палоніць наваколле.
О, як прыемна жыць на гэтым свеце!

АЛЕСЬ:

Прырода, птушкі, росы, ну яшчэ што?..

МІКОЛА:

А ці ж бо не? І гэта там, дзе маеш,
скажу тут проста, хлеб штодзённы свой
і ўсякага дастатку, што да хлеба.
Сам ведаеш — на свеце шмат людзей,
няволяй мучаных. Яны не сум,
але і сіверны мароз і голад,
і здзек, і злыбяду перамагаюць —
і не скараюцца. Трымае іх
нязломнасць духу, мужнасць і адвага.
А тут? Што тут… Вось толькі трэба ўмець,
вось трэба ўмець ва ўсім вакольным бачыць
не тое, што і мучае, й гняце,
а тое, што ўзварушвае і ўзносіць.

(Стук у дзверы.)

Бач, нехта завітаў да нас…

АЛЕСЬ:

Заходзьце!

(Уваходзяць Рыгор і Анатоль.)

РЫГОР *(да Алеся)*:

Дабрыдзень, дзядзька!

АЛЕСЬ:

Добры дзень!

АНАТОЛЬ:

Дабрыдзень!

МІКОЛА:

Дабрыдзень!

(Мікола і Алесь устаюць, вітаюцца.)

Рады мы, што вы прыйшлі.

РЫГОР:

Прыйшлі адведаць дзядзьку мы — Алеся.
Як ён жыве, як маецца? Ён нам
знаёмы добра.

МІКОЛА:

Гэта проста скарб —
на свеце мець сяброў такіх, якія
яшчэ не адракліся ад цябе.

АЛЕСЬ:

Я вельмі ўдзячны вам за вашу ўвагу,
што да мяне. Якія весці ў вас?

РЫГОР:

Я песню вывучыў, яе жадаю,
калі мы ўсе збяромся, праспяваць,
калі мы ўсе, суродзічы, сям'ёю
збяромся дружнай — праспяваць для ўсіх,
я так зачараваны гэтай песняй
на словы Багдановіча…

МІКОЛА *(да публікі)*:

Увага!

(Мікола, Алесь і Анатоль сядаюць.)

РЫГОР
*(спявае ведамы раманс на словы Максіма Багдановіча
«Зорка Венера ўзышла над зямлёю…»)*

МІКОЛА *(як толькі Рыгор скончыў спяваць)*:

Цудоўна!

АЛЕСЬ:

Надзвычайна!

АНАТОЛЬ *(устае)*:

А вось я
хацеў бы з вершам выступіць, як мы
збяромся разам дружнаю сям'ёю.

МІКОЛА:

Не толькі песню, а і верш мы любім.
Ты дэкламуй — мы слухаем уважна.

АНАТОЛЬ *(дэкламуе)*:

Над зямлёю збіраюцца хмары,
грымна ймкне навальніца...

АЛЕСЬ:

Цудоўна!

МІКОЛА *(устаючы, да публікі)*:

Надзвычайна!

(да Анатоля):

Дык сядай,
будзь ласкаў, я ж яшчэ сказаць тут нешта
наўвеце маю.

(Да Алеся):

Бачыш сам — няма
няўцехі сумаваць, або праймацца.
Цябе сябры твае не пакідаюць —
прыемна гэта ведаць, адчуваць.
Бадзёрасцяй і ўпэўненасцяй вее
ад іх — прыхільных маладых людзей.

АЛЕСЬ:

Праняты гэтым я. Бязмежна ўдзячны!
Перад сабою бачу родны свет
у фарбах вечных — сонечны і зорны.

МІКОЛА:

У свеце зорным і ў нязгаснай веры,
у сонечных іскрыстых парываннях
варожасць не жыве паміж людзей.
Яны знаходзяць прыязнь, зразуменне.
Тады і свет, сам свет не йдзе да згіну,
бо згода выратоўвае яго…
Лунае па-над намі дух свяцісты,
імкне да ўчынкаў велічных, высокіх…

РЫГОР:

І гаспадар зямлі — сам чалавек —
так прагне па-надземных далячыняў.

АНАТОЛЬ:

Яго вітаюць космасу прасторы.
І там, куды яшчэ ніхто ніколі
не мог сягнуць — будуе ён масты
дарогаў ад зямлі, што лучаць з небам…
Упоруч з ім шугае маладосць
крылатая, узлётная высока.

АЛЕСЬ:

Я веру вам і вамі так натхнёны…

МІКОЛА:

Прыемна бачыць твой узрух, запал…

АЛЕСЬ:

Няма ў наўколлі сілы паўстрымаць
неўтаймаваных парыванняў духу…
Дух праўдны, духу зла непадуладны,
вядзе да новых светаў, новых зор!

1946–1964

ЗАЗЗЯЛА ПРАБУДЖАЛЬНАЯ ДЗЯННІЦА

Сцэнка з трыма галасамі

ПЕРШЫ ГОЛАС:

Заззяла прабуджальная дзянніца —
прачнёмся мы, нябыт агорне сны.
І будзем так няўстрашліва дзівіцца
у прыйсце — дзень, што выплыў з даўніны.
Усплыў іскрыцца, блішча, не згасае.
Далёка з хмарамі заходні змрок.
Маланка свігавіцамі красае
сціхоту, ёй асвечваючы зрок.
Без харасства няма жыцця на свеце.
Усюды там, дзе толькі харасство,
крышталем зор высока неба свеце
у сяння — у прадвечнасці раство.

ДРУГІ ГОЛАС:

Пад незгасальнасцяй — узвіў багаты
з імкненнямі быць вольным на зямлі,
каб у спакой найвыпешчанай хаты
дары цяпла няўсцішліва плылі.

ТРЭЦІ ГОЛАС:

А вольным быць — не быць рабом ніколі:
ні ў спёку, ні ў засцюжаны мароз.
Змаганне ўсцяж ідзе на збройным полі
за волю — чар і скарб адвечных кроз.

ПЕРШЫ ГОЛАС:

Салодкая ў абдымках наша ўява…
Няхай з адыйсцем горкай злыбяды
яна красуецца, жыве, як ява
на долах, дзе расцвітаюць сады.

ДРУГІ ГОЛАС:

Узнёслы свет бярозаў і таполяў,
каштанаў, хвояў і цвяцістых ліп.

Нідзе не знойдзеш найяснейшых воляў,
якімі цешыцца сардэчны ўсхліп.

ТРЭЦІ ГОЛАС:

Айчынаю прачуласць называем,
абтокам на зямлі ўсяпрыгаства.
Выснёны рай заўсёды будзе раем,
цяплом пяшчотным для ўсяго людства.

ПЕРШЫ ГОЛАС:

Няхай жыве наўколле маладосці,
прывабнасць неўміручае красы!
Ці чуеце? З усіх краінаў госці
ёй дораць прывітанняў галасы.

ДРУГІ ГОЛАС:

Яна прыгожая, яна — святая,
крыніцаў звон, спакой суцішных стрэх.
Не дрэмле морак, раніца світае,
люструючы ў вазёрах звабны ўсмех.

ТРЭЦІ ГОЛАС:

Бязмежжа славы, слова і багацця,
мільярдная ашчаднасць скарбаў — дар.
Калі над ёй гаморыцца няшчасце,
яна — згібенню смерць, жыцця ўладар.

ПЕРШЫ ГОЛАС:

Брыльянтная сястра па-над высокай
ляты да неба — аж да самых зор.
Не мірыцца з маўклівасцяй бяссокай
шматмоўны, сонцавобразны спазор.
З узвышша знічыць зорка залатая,
нязгасная прывабнасцяй усёй…
Яна прыгожая, яна — святая
на ўлонні з жыццядайнаю красой.

ВЕРШЫ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

У ЛЕСЕ

Бы пярыначка, лятае
над арэшнікам матыль,
кулічок дзесь напявае:
— Тылі-тылі!
— Тылі-тыль!
На паляначцы у скоках
спрытна кружыць цецярук,
узлятае невысока,
апускаецца на сук.
А на дрэве дзесь далёка
дзяцел стукае:
— Тук-тук…
Сцеле пах густы маліна,
з ёю — верас, мох, чабрэц…
Важна сеўшы на галінах
б'е ў глухі званок глушэц.
А зязюля недзе ў лесе
выгаворвае:
— Ку-ку!..
Гукі мчацца ў паднябессе,
ўдаль за поле, за раку.

1939

УЛЕТКУ

Ласкава зірнула
зранку ў хату сонца

і заззяла ясным
бляскам на ваконцы.

У зялёны гай мы
пойдзем сёння, дзеткі;
ягады ўжо ёсць там,
і красуюць кветкі.

Там, паміж кустамі,
знойдзем мы суніцы;
ў лесе нас чакаюць
спелыя чарніцы.

Там іскрыцца срэбрам
рэчка на прасторы.
Запяём мы ў гаі
песню дружным хорам.

Запяюць вясёла
разам з намі птушкі;
з намі загамоняць
і жучкі, і мушкі.

1944

СНЯЖЫНКІ

Пухнатыя сняжынкі
лятаюць над зямлёй.
Зялёныя ялінкі
пасталі грамадой.

Там беллю ўсё паслана,
дзе мох кудлаты рос.
Сягоння вельмі рана
прачнуўся Дзед Мароз.

Пухнатыя сняжынкі
лятаюць над зямлёй.
Пратопчам мы сцяжынкі
вясёлай грамадой.

ДЗЕД МАРОЗ

З дарагімі пакункамі
завітаў Дзед Мароз.
Шмат уцех з падарункамі
ён усім нам прынёс.

Над снягамі сыпучымі
дзеду стомы няма.
Маразамі траскучымі
не спыняе зіма.

Дзед шляхоў многа ведае
і прыходзіць штогод,
ён сягоння адведае
наш жывы карагод.

ЯЛІНКА

Сягоння ялінка наша
цуднейшая, чымся калі.
І Сцёпка, і Юрка, і Саша —
мы ўсе да яе прыйшлі.

Яе нам прыгожа прыбралі
у чырвань, у белы снег.
І чуецца радасць на залі —
і песні, і звонкі смех.

Вітаем мы Дзеда Мароза
з каханай айчыннай зямлі.
Нам сумныя дні — не пагроза,
у небыт яны адплылі.

ЗАЙЧЫК

Зайчык мілы, зайчык шэры
будзе доўга, доўга жыць.
Дабразычлівы без меры
Дзед Мароз пры ім сядзіць.

Мае дзед частункаў скрынкі —
чакаляды, ліманад.
Частаваць каля ялінкі
ён і нас, і зайку рад.

Па-за вокны, па-за дзверы —
навакол наш спеў чуваць.
Зайчык мілы, зайчык шэры
хоча з намі танцаваць.

1959

ІНШАМОЎНЫЯ І НЕЗАКОНЧАНЫЯ ВЕРШЫ

* * *

Куда плывём? Скажи, мой друг, куда?
Ты слышишь? — Оглушён машинным стоном
Трюм корабля. Зачем плывём, когда
Судьба нас ждёт во мраке вод бездонном?

Бежать? Куда бежать? Вокруг — вода.
Судьбе сказать: — Напрасно, пусть утонем,
Ты не страшна! Смертям двум не бывать,
Одна — пустяк, её — не миновать.

28.07.1944, Митава — Шлок

* * *

Шумит, шумит угрюмая тоска
Моей души — взволнованное море.
Как пена волн, седые облака
Навстречу мне стремятся, с ветром споря.
Они спокойны и легки пока,
Но быть грозе большой — земля в укоре.
Гроза, гроза — сильна и велика —
Уж близится, с пути сметая горы.

Мой милый друг! Ну где же, где же нам
Перенести грозу? В степях далёких?
В спокойной синеве небес высоких?

Нет крыльев и пути нет к небесам.
Там облака. А мы? Мы одиноки.
Нам места нет нигде — ни здесь, ни там.

29.08.1944

* * *

Тільки очі лукаво примружить
І зі швабом тікае за ріг.
О мій Ігоре, любий мій друже,
Вже нікуди немае доріг.

1948

* * *

…Ды можа сам, як чалавек, схіліўся,
А ў вершах быў я шчырым ад душы.
Усцяж быцця шляхі перасякліся —
Гамонкі шлях і шлях глухой цішы.

ПЕРАКЛАДЫ

З Райнэра Марыя Рыльке

ПЕСНЯ СТАТУІ

Хто так моцна, бязмежна кахае мяне,
што гатовы на шлях небыцця?..
Той, хто дзеля мяне знойдзе смерць ў глыбіне,
той каменнае сэрца зварушыць ўва мне,
той абудзіць мяне да жыцця.

Я сумую, бо кроў ува мне не вірліць:
маё цела — маўклівы камень.
Я чакаю жыцця: бо так хораша жыць…
Ці адважных няма, каб мяне аджывіць,
каб падаць абуджэння прамень?

І калі прыйдзе час, што змагу я прыняць
ўсе найлепшыя скарбы быцця, —
зноў пачну сумаваць,
пра камень шкадаваць,
бо крывёю сваёй, што вiном будзе граць,
не змагу я таго з нетраў морскіх узняць,
хто кахаў мяне больш ад жыцця.

ХЛОПЧЫК
(Маленькі ваяўнік)

Я так хачу падобным быць да тых,
што ў ночны час на хуткіх конях мкнуцца,
і на бягу агні паходняў ўюцца,
як плоймы валасоў яскрава-залатых.
Наперадзе усіх хачу я быць,
як сцяг разгорнуты, што ў выш лунае, —
мой шолам залаты ў агнёх паходняй ззяе.

І рад ваяўнікоў імчыць за мной,
іх шоламы, таксама як і мой,
тут прызрастыя, тут ізноў заззяюць,
тут шклом бліснуць, а тут ізноў знікаюць.
Каля мяне — трубач. І кліча ён
нямую даль, труба яго зіхціць,
змагарны гук над цемраю мігціць,
цераз якую мкнёмся мы, як сон:
дамы за намі валяцца на брук,
хіляцца вуліцы пад сілай небывалай,
пляцы здаюцца ў міласць нашых рук…
А коней нашых бег гудзіць навалай.

СУСЕД

Нябачная скрыпка, што ўслед мне ідзеш?
І чый гэта сум неадступна нясеш
да суму маіх адзінотных гадзін?

Ці шмат іх сумуюць? Ці толькі адзін?
Ці мала у свеце ёсць гэткіх людзей,
што ў хвалях шукалі здзяйснення надзей,
бо гук твой не ўчулі ў віхуры зямной?
Чаму ж ты ідзеш неадступна за мной?
Чаму я бываю сусед толькі тых,
што жаль узбуджаюць у струнах тваіх,
што выказаць хочуць у ночнай цішы
нястрымныя жальбы самотнай душы?

1942

ВОСЕНЬ

Спадару Божа, час настаў: пара
сукрыцца ў сценях сонечным гадзінам,
пусціць вятры ў палі красы й дабра.
Дазволь жа йшчэ ў садох даспець пладом,
двума цяплейшымі даруй іх днямі:
няхай нап'юцца вышнімі дарамі —

салодка-цьмяным і густым вінам.
Хто страціў дом — таму яго не мець.
Хто сам — самому й знаць тугі абладу:
пісаць лісты, не зводзіць з кніг пагляду,
не спаць, блукаць праз гай, адзеты ў медзь,
пад неспакойным віхрам лістападу.

1948–1952

З Тараса Шаўчэнкі

* * *

Садок вішнёвы каля хаты,
хрушчы над вішнямі гудуць,
аратыя з плугамі йдуць,
спяваюць ідучы дзяўчаты,
а маткі на вячэру ждуць.

Сям'я вячэрае ля хаты;
звязда вячорная ўстае;
дачка вячэраць падае,
а маці вучыць — часу страта,
бо салавейка не дае.

Паклала маці каля хаты
маленькіх дзетачак сваіх,
сама заснула каля іх.
Заціхла ўсё… Не спяць дзяўчаты,
ды салавейка не заціх.

1947

З Леаніда Палтавы

ХТО МЫ?

Апавітыя горам і славаю,
у ночы прадоннай чашы
залатымі рыбамі плаваюць,
не гаснучы, вокны нашы.

Мы сонца праводзім працаю
і працаю сустракаем.
І ўсё-такі наша нацыя
завецца йшчэ «Южным краем».

Хто ж мы? Ахвяры паховінаў?
Узнятыя ў неба рукі?
Ці новых часоў Бетховены,
што пішуць, не чуючы гукаў?

Ці можа аж з гор Патагоніі
шматколернаю ценню
нязмоўкныя нашы сімфоніі
далей павядуць пакаленні?

1947

У БАЛЬНІЦЫ

Бязмежны свет разгадвалі з запалам,
і веліч гораў трушчылі у пыл.
Патройвалі патугу аманалам,
калі сваіх не выстачала сіл.
А чалавек у сонечнай бальніцы
ляжыць на ложку ў болю, у журбе,
ляжыць адна з найбольшых таямніцаў,
што мы па-рабску носім у сабе.
Ляжыць не промень, не руда, не камень,
а свету і зямлі ўладар спакон.
Ды ваш, о, добрая сястра, ваш «аман»
не ведаю, ці ўхіліць вечны сон.
Здабыта ўсё. І ёсць усё ў бальніцы:
і шкло, і ціс, фіранкі, і святло.
Прабач, нябожа, —
нашу таямніцу
пазнаць нам часу нават не было.

1955

З Адама Міцкевіча

ДА НЁМНА

Нёмне, рака айчыны! Дзе ёсць тыя воды,
што іх яшчэ ў маленстве чэрпаў у далоні?
Што імі потым плаваў у дзікія тоні
неспакойнаму сэрцу шукаць прахалоды?

Тут Лаўра ў захапленні з уласнае уроды
любіла збіраць краскі і аквечваць скроні;
той вобраз, люстраваны ў срэбнахвальнай лоні,
слязьмі ці раз муціў я — натхнёны заўсёды.

Нёмне, мой родны краю! Дзе ж бедаў пагрозы,
а з імі поўна шчасця, нядолі так многа?
Дзе ўсмешкі ўяў дзіцячых — ранку залатога?

Бурлівы ўзлёт юнацкі і мройныя крозы?
Лаўра — уцеха й радасць? Сябры дзе? Нікога…
Мінула ўсё… Чаму йшчэ са мной мае слёзы?

1955

З Макса Дуна

* * *

Скакаў я, пакуль дзвюх ступнёў не меў,
спяваў я — не меў языка перад тым,
смяяўся, не маючы двух вачэй,
кахаў, пакуль сэрцам не быў маладым.

Я плаваў, пакуль не меў дзвюх рук,
трымаў адлегласць у пальцах ног
яшчэ перад тым, як сусвет пазнаў
і зведаў дзікі прабуд у снох.

Шматлічных жыццяў сабраў я плод,
пакуль не ўступіў у гэты час.
Я знаў — без магілы, не ўскопанай мне —
з'ядае чарвяк толькі смерць якраз.

1973, Морэланд

ПРОЗА

КАРОТКІ ЖЫЦЦЯПІС

Мой дзед Раман — былы парабак графа Чапскага; бацька Васіль — спачатку земляроб, потым — інтэлігент.

Дзед меў чацвёра дзяцей — тры дочкі і аднаго сына. На сына Васіля — майго бацьку — пакладалася шмат спадзяванняў, думалася — вырасце ён, выйдзе ў людзі. Але не паспеў ён пражыць на свеце і восем гадоў, як пачало адчувацца, што ён — лішні рот у хаце. Правільней за ўсё не ў хаце, бо яе не было ў дзеда, а ў графскім двары, які меў назоў Крысава. Давялося Раману аддаць Васіля ў парабкі. Той і служыў у багатых гаспадароў: карміў свіней, ганяў улетку ў поле жывёлу, узімку выконваў іншыя гаспадарскія працы. Гаспадарку бацька з дзедам займелі толькі ў 1920 годзе. Пабудавалі дом на пасёлку, які паступова ўзнікаў недалёка ад былога графскага двара і атрымаў той жа назоў — пасёлак Крысава. Цяпер там ужо не пасёлак, а вялікая вёска. Месціцца яна ля рэчкі Вусы, прытоку Нёмана, недалёка ад м. Койданава.

Ажаніўся бацька мой у 1921 годзе. А 1 траўня 1922 года ў той жа вёсцы Крысава з'явіўся на свет і я. Маці мая была інтэлігентная, пісьменная жанчына, шмат увагі аддавала на выхаванне. У 1923 годзе бацька пераязджае на працу ў Койданава, дзе нейкі час працуе ў лясніцтве. Потым перамяшчаецца на гэткую ж самую працу ў м. Самахвалавічы.

У пачатку 1928 года ён камандыруецца на працу ў Чэрвенскі (былы Ігуменскі) павет. Працуе там да студзеня 1933 года ў былой савецкай гаспадарцы Наталеўск на становішчы дырэктара гаспадаркі і вучыцца завочна, атрымлівае вышэйшую сельскагаспадарскую асвету. Там жа, у Наталеўску, у 1929 годзе, калі мне было сем гадоў, я і пачаў вучобу ў пачатковай школе.

У студзені 1933 года мы выехалі зноў у Койданаўскі павет і атайбаваліся ў былым саўгасе Вялікія Навасёлкі. Бацька, як і раней, займае

становішча дырэктара гаспадаркі. У Навасёлках я скончыў у траўні таго ж года пачатковую школу, а ўвосень паступіў на вучобу ў пяты клас Койданаўскай сярэдняй школы. Улетку 1934 года пераехала на сталае жыхарства ў м. Койданава і ўся наша сям'я. Бацька нейкі час быў за загадчыка прыгараднай гаспадаркі Койданаўскага райспажыўсаюза, а потым — за загадчыка гандлёвага аддзелу. Я прадаўжаў вучобу. У шостым класе праседзеў два гады — не паддавалася матэматыка. Сёмы клас скончыў у 1937 годзе. У жніўні ж гэтага года тагачаснымі ўладамі былі арыштаваныя бацькі. За што — я і да сянняшняга дня не ведаю. Паводле чутак, бацька памёр у 1938 годзе ў Менскай турме. Маці была высланая на 10 гадоў у Сібір. Што з ёй цяпер — не ведаю.

У восьмым класе Койданаўскай школы я вучыўся, не маючы бацькоў. Жыў у найгоршых варунках. На маім утрыманні было яшчэ трое дзяцей: малодшыя два браты і сястра. Даводзілася дбаць аб хлебе не толькі для сябе, але і для братоў, і для сястры. А таму я вельмі мала наведваў школу, бо трэба было зарабляць хлеб, працуючы на розных выпадковых працах. У школе быў за рэдкага госця. Апроч моваў, літаратуры і гісторыі, амаль нічога з астатніх дысцыплінаў не ведаў. Перад экзаменамі, увесну 1938 года, педагагічная рада Койданаўскай школы прызнала мяне за няздольнага вучня і не дапусціла да экзаменаў, палічыўшы, што я ўсё адно не вытрымаю іх. Гэтак я быў пакінуты ў восьмым класе на другі год.

Гэтым часам, пачынаючы з 1937 года, на балонках розных беларускіх выданняў пачалі часта з'яўляцца мае вершы. Улетку 1938 года я быў выкліканы ў Менск на месячную канферэнцыю маладых пісьменнікаў, якая склікалася былым праўленнем Саюза савецкіх пісьменнікаў Беларусі. Дарэчы, на канферэнцыі я быў не ў асаблівай пашане сярод сваіх сяброў-курсантаў — маладых пісьменнікаў і паэтаў. Меў я тады ўсяго 16 год, быў, можна сказаць, падросткам, а амаль усе астатнія курсанты — дарослыя дзядзькі. Яны не хацелі мець са мной ніякіх справаў, а некаторыя з іх уважалі за сорам кудынебудзь ісці разам са мной. Праўда, мае вершы былі не горшыя іхніх, але іх гэта не цікавіла, іх цікавіў, відаць, знадворны выгляд чалавека, паводле якога яны давалі ацэну і вершам. Курсанты, калі дзе-небудзь збіраліся разам у вольныя часіны, дык заўсёды гутарылі аб дзяўчынах і іншых падобных справах... Я ж тады яшчэ мала гэтым цікавіўся, не

далучаўся да падобных гутарак, а больш чытаў і працаваў над новымі вершамі. З мяне смяяліся, зазначалі, што я, напэўна, вар'ят або тупіца, калі над кожным вершам сяджу падоўгу; апавядалі, што, маўляў, Пушкін адным махам пісаў свае творы, а таму трэба з яго браць прыклад. Адзін курсант нават напісаў на мяне наступную эпіграму:

Такое тупіцы,
Такое дурніцы
Не бачыла нават і вока…
О, да паэта яму далёка!

Пасля канферэнцыі я не вярнуўся ў Койданава. У верасні паступіў на вучобу ў Менскае педагагічнае вучылішча (былы Педагагічны тэхнікум імя Усевалада Ігнатоўскага). Вучачыся там, я часта наведваў менскі Дом пісьменніка. Свае вершы паказваў старэйшым паэтам, уважліва выслухоўваў іхнія заўвагі. Калі ладзіліся літаратурныя вечары, спрабаваў і сам выступаць, выказваць свае думкі.

У педагагічным вучылішчы я вучыўся да 5 лютага 1940 года і, не скончыўшы яго з прычыны дрэнных жыццёвых абставінаў, выехаў у м. Лагойск на працу ў рэдакцыю раённай газеты, дзе і прабыў да 22 чэрвеня 1941 года, да пачатку вайны. Працаваў на становішчы заступніка адказнага рэдактара. З 19 кастрычніка 1941 года да 10 лютага 1942 года быў у Менску на журналісцкай працы ў рэдакцыі «Беларускай газеты». Потым жыў у м. Ілля Вялейскай акругі. Працаваў там у адміністрацыі. З 9 кастрычніка 1942 года жыву ў горадзе Рыга. Працую на становішчы заступніка рэдактара часапісу «Новы шлях».

Вершы я пачаў пісаць яшчэ змалку, з васьмігадовага ўзросту. Калі яшчэ не хадзіў у школу і меў каля шасці гадоў, маці мне часта чытала дзіцячыя кнігі, растлумачвала сэнс прачытанага. І, памятаю, у мяне, маленькага, часам з'яўляліся думкі, што калі вырасту, дык абавязкова буду такім, як і той, хто піша гэткія цікавыя кнігі. Больш за ўсё цікавілі мяне дзіцячыя вершы. Будучы ў дашкольным веку, я шмат іх ведаў на памяць і часта прасіў матулю, каб яна перачытвала мне да таго часу, пакуль не запамінаў. Калі ж пайшоў у школу і навучыўся чытаць і пісаць, тады паспрабаваў сам скласці вершык. Свае спробы я паказваў бацькам, але яны спачатку на гэта мала бралі ўвагі. Толькі, памятаю, увесну 1933 года бацькі зацікавіліся маімі вершамі, а за адзін нават пахвалілі. Выглядаў той верш гэтак:

Наш Альфрэд будзе паэтам,
Будзе вершы ён пісаць,
Будзе знацца з усім светам,
Свет яго ўвесь будзе знаць!

Далей ішлі радкі пра тое, кім будзе мая сястрыца Ала (нарадзілася ў 1923 годзе). Далей — радкі пра маіх братоў Лявонку (нарадзіўся ў 1929 годзе) і Уладзіка (нарадзіўся 18 сакавіка 1933 года, памёр 30 кастрычніка 1941 года ад няшчаснага выпадку). І канчаўся верш наступнымі радкамі:

Ну, а мама й тата дома
Будуць жыць, адпачываць.
Мы, вядома, мы, вядома,
Будзем ім дапамагаць.

Пачуццё вершаванага памеру ў мяне выпрацавалася даволі рана. Ужо ў дзесяцігадовым узросце я пісаў рытмічна вытрыманыя вершы.

Калі вучыўся ў 6 класе, асмеліўся паказаць адзін з вершаў выкладчыцы літаратуры. Ён ёй спадабаўся. Мяне запісалі ў літаратурны гурток, пачалі змяшчаць вершы ў школьным рукапісным літаратурным часапісе. А ўжо ў 1937 годзе адзін з вершаў я паслаў у друк.

Першы надрукаваны мой верш называўся «На сенажаці» і выглядаў гэтак:

Не ўставай так рана,
Сонца залатое,
Не сушы вадзіцу —
Срэбную расу.
Бо касцы у поле
Выйшлі грамадою,
Навастрыў з іх кожны
Звонкую касу.
Падаць сталі росы —
Зазвінелі косы,
Загучалі песні,
Паляцелі ўдаль.
Роўнымі шнурамі
Сцелюцца пракосы.

Траву-руту косіць
Дружна грамада.

Гэты верш быў надрукаваны ў койданаўскай раённай газеце «Ударнік Дзяржыншчыны» ў чэрвені 1937 года.

Я вельмі шмат вымагаў ад сябе, стараўся стварыць нешта выдатнае і незвычайнае. А гэта не ўдавалася, не хапала сілаў. І ў выніку ўсяго гэтага ў канцы 1939 года кінуў пісаць зусім; накінуўся на кніжкі, вывучаў і чытаў класікаў расейскіх і еўрапейскіх. І неўзабаве з'іначыўся мой пагляд на літаратуру, перад маімі вачыма адчыніўся інакшы свет… Усё напісанае і надрукаванае да канца 1939 года я не ўважаю за паэзію. Гэта былі зусім слабыя і наіўныя літаратурныя спробы. Рукапісы тых спробаў я страціў у час ваенных падзеяў 1941 года.

У 1941 годзе я ізноў узяўся за пяро. Гэты час я ўважаю за пачатак свае паважнае працы. Памятаю, была вясна 1941 года. Зазелянелі дрэвы і лугі ля рэчкі Гайны на Лагойшчыне. Гэта натхніла мяне напісаць верш. І я напісаў санет «Гайна». Паслаў яго ў рэдакцыю аднаго часапісу. І неўзабаве атрымаў адказ, што, маўляў, санетаў цяпер ніхто не піша. Даўнія формы даўно ўжо выкінуты на сметнік, і іх ніхто не ўжывае. Я спачатку хацеў узяцца за іншы жанр, але прыгожасць класічных формаў, якія прадаўжаў спатыкаць у літаратуры, зачаравала і захапіла мяне. Парашыў — калі гэтак, дык тады я буду пісаць толькі сам для сябе і нікому напісанага не паказваць і нідзе не друкаваць. Толькі ў канцы 1942 года, знаходзячыся ў Рызе, я паказаў колькі сваіх ранейшых і новых лірычных вершаў аднаму ведамаму беларускаму крытыку і літаратурнаму працаўніку. Вершы ён пахваліў, а дзе трэба было — і зганіў. Ён заахвоціў мяне і параіў працаваць у гэтым кірунку далей. І праца мая пайшла больш пэўнымі крокамі.

Мой самы галоўны прынцып — менш слоў, а больш думак. Я паважаю новае, імкнуся да яго, але не збіраюся адкідаць ад сябе старога, калі яно добрае і прыгожае. Правільна сказаў калісьці наш паэт Максім Багдановіч: «Як месяц зіхаціць адбітым светам, так ззяюць вершы даўніх форм красой!» Класічныя формы — трыялет, санет, актава ды інш. — патрабуюць глыбокае думкі, дысцыпліны слова, вялікае культуры. Вось у гэтым іхняя вечная вартасць.

У 1942 годзе я спрабаваў пісаць гумарыстычныя вершы і апавяданні на тэму дня. У гэных вершах і апавяданнях я не дабіўся памысных вынікаў. Калі перачытваў іх нядаўна — мне стала сорамна

за самога сябе. Усе рукапісы я знішчыў. Не хачу больш тых вершаў і апавяданняў бачыць і аб іх успамінаць. Тым, хто ведае аб маім аўтарстве гэных вершаў і апавяданняў, буду заўсёды вельмі ўдзячны, калі яны гэтае веданне пакінуць у таямніцы.

1944

БЕЛЫ СНЕГ

І сыплецца, сыплецца мяккая пацяруха з неба… І, здаецца — не неба над галавою, а — неабсяжны ток. Ходзіць па ім гаспадар руплівы — вецер, варушыць нязграбныя копы — хмары, глытае трушанку іхную ў жоран свой, круціць, варушыць у жорне й меле, і, папярхнуўшыся, сыпле — не зерне — муку далоў…

Мука — буйная й незвычайная. Кожны маленькі драбочак ейны — крышталь; пакуль даляціць да долу — мароз-валадар у шаць, у пушок прыбярэ яго. А колькі такіх драбочкаў? — пэўна, кропляў у моры вады не менш і не больш…

Сыплецца… сыплецца… сыплецца…

Белы снег.

Падае, падае… Мкнецца долу; на хаты, на дрэвы падае, на снежную бель. Бель — на бель…

Хаты — апошні прыпынак і месца, дзе быў спачын, засталіся ззаду. Наперадзе — вялікі гасцінец, — шырокі шлях — стогадовыя бярозы па бакох. Дарогі — ні следу, ні знаку няма. Як бачна — колькі дзён не праязджаў тут чалавек і не ступала ягоная нага. Толькі бярозы — задумныя мроі — значаць шлях.

Цяжка рухацца гэтым шляхам, ісці наперад. Цвярды тор засыпаны глыбокім снегам. Ногі западаюць у глыб, топнуць у ёй. Нельга ступаць. Здаецца, не наперад рухаешся, а назад.

Цяжка, але трэба йсці.

Ужо чацвёрты дзень знаходзіцца ў цяжкой дарозе Алесь. Чацвёрты дзень — дарога, чацвёрты дзень — пехатой.

Толькі ўначы — адпачынак у жытле такім-сякім, што пры дарозе…

Алесю пашчасціла вырвацца з чужацкіх мясцінаў. Цяпер — шлях да радзімы.

І цяжкі, нялёгкі шлях. Чацвёрты дзень усцяж — снег і снег. Здаецца, неба сыпле яго з усіх засекаў, а мае іх гэтулькі, што і не злічыш, і кожная жменя з кожнага засеку — кропля ў моры…

Замоўкне, адчуўшы стому, вецер — і кружацца ў лёгкай суладнасці сняжынкі, павольна й мякка кранаюцца да зямнога саяну. Вылецiць, адпачыўшы, з недалёкае лагчыны вецер iзноў — замітусяцца, заскачуць сняжынкі, як і раней, заказычуць твар падарожніка, закруцяцца ў паземцы над долам. Замахаюць галінкамі бярозы, страсуць цяжар, а снег засыпае іх ізноў.

І ўсё сыплецца й сыплецца...

А йсці нялёгка. Хацелася б легчы ў пуховую пасцелю, адпачыць. Няшмат — адну толькі часінку. Хай спявае тады свае дыфірамбы вецер. Калі супачыне трохі сэрца, вальней удыхнуць грудзі паветра, можна будзе прыслухацца да іх... Хай тады кружацца ў танцы пад іхныя гукі сняжынкі, хай кружацца колькі хочуць; тады й можна будзе адчуць хараство іхнага лёту ў прасторы, іхнага быцця сярод жывых і нежывых...

Аднак, не... Ні на адну часінку не трэба спыняцца. Трэба йсці.

Да любых мясцінаў, да блізкай з маленства хаты няшмат засталося ўжо. Яшчэ колькі кіламетраў — і ўсё. Пакуль вечар — і дома. Таму — ісці й не спыняцца. Ісці, ісці...

Там, напэўна, і не чакаюць. Там уважаюць, напэўна, што ўжо даўно загінуў... Усё ж ён не загінуў, ён жыве. Ён ніколі не забываўся на блізкую сэрцу зямлю, на родных сваіх і дарагіх. Ён разам з імі жыў у мроях і ў мроях імкнуўся да іх...

І ад самага сэрца выліваюцца словы... Не, гэта не словы; гэта — кроплі гарачай крыві, кроплі палымністага сэрца. Гэта — верш, складзены, напэўна, яшчэ раней. Вусны шэпчуць словы верша:

Думы! Думы! І ўдзень, і ўначы
не давалі вы мне супакою,
там блукаючы, там жывучы,
дзе пакінуў я дом над ракою.
Нестрымана сягалі туды,
завірухі і холад міналі.
Праз парогаў чужых невады
вы крыніцай жывой працякалі...

А снег не перастае і не перастае йсці...

Ужо пачынае сутунець. Няўжо й сапраўды сутункі? Да хаты ж было недалёка. Да сутункаў трэ было быць там. А тут яшчэ — чужая зямля... Можа, гэта здаецца...

Але штораз — цямней і цямней. Сапраўды сутунее. Нешта й ногі адмаўляюцца далей ісці. А паблізу — ніводнае хаты, ніводнага жытла.

Зусім нечакана душыць кашаль. Балюча вырываецца з грудзей…

А дарога, нібы наўсуперак, яшчэ больш цяжкая. Снег — вышэй калена. Ніяк немагчыма йсці.

Ужо амаль цёмна. Мацней дыхнуў вецер. Праясняецца неба. Выглядвае зрэдку месяц — мосяжны чарапок.

І гэтак хочацца піць! Здаецца, каб хоць адзін глыток вады было ў гэтым чарапку…

Ды не дастаць яго рукой, не зачэрпнуць ім вады — каб і было адкуль, — не зачэрпнуць…

Напэўна, сумысля вецер не адстае цяпер, прычапіўся, прыліп. Не адстае й не адстае:

— Алесь… Алесь… Супачні, супачні… На пасце… пасцелі…

А ён яшчэ спрабуе йсці. Ступіць два крокі — кашаль зноў спыняе яго, кружыцца галава. Ён хапаецца рукамі за паветра — не адчувае ў ім апоры і — падае… Напружваючы сілы, устае, спрабуе йсці далей. Два крокі — і йзноў кашаль валіць з ног. Хапаючы надарванымі грудзямі паветра, падае…

А паблізу — ніводнае хаты, ніводнага жытла…

Закіданая снегам дарога. Наперадзе — ніводнага следу. Колькі дзён не праязджаў чалавек, не ступала ягоная нага…

Зноў зваліўся долу. Памкнуўся ўстаць — не змог. Не ўстаў…

Цяпер зусім добра. Цёпла, як у хаце. Нястрашна, што мароз. Няхай сабе… Затое цёпла й добра. Толькі кашаль… Кашаль. Не могуць грудзі ўдыхнуць паветра.

І раптам… Месяц адплыў недзе далёка, далёка; знік з вачэй, потым зноў наблізіўся.

«Няўжо, няўжо… гэта мой канец?» — мільгнула думка. І зноў кашаль.

Цёплы струменьчык крыві лынуў з горла. А вусны, здаецца, нешта шэпчуць… Гэта не вусны, гэта самі словы йдуць ад думак:

О, каханы, о любы мой краю!
Дай мне сілаў, жыццё мне вярні!
Я паблізу цябе паміраю
на парозе твае вясны…

…Неўзабаве пачалося світанне. На аснежаным гасцінцы, раскінуўшы рукі, ляжаў на спіне чалавек. Струменьчыкі чырвонай крыві замерзлі на шчацэ, на каўняры, на белым снезе…

Замоўкла сэрца. Заціхла дыханне. Спыніліся думкі. Анямелі пачуцці.

Памёр чалавек.

Белы снег… Чырвоная кроў…

10.02.1944

ЧУЖЫ

Сцяпан Кажура быў нядрэнны мастак. У 193… годзе ў горадзе К. ён скончыў мастацкую акадэмію. І сярод скончыўшых ішоў, бадай што, у першых шэрагах. Ягоная дыпломная праца заняла адно з першых месцаў і на акадэмічнай выстаўцы ўзяла на сябе агульную ўвагу.

Ад малых гадоў Сцяпан трымаўся цікавай прывычкі: ён заўсёды жыў планамі на будучае і ад гэтых планаў стараўся не адступацца. Не жыў, як іншыя, тым, што дзень прынясе, што само прыплыве ў рукі, а стараўся пераймаць жыццё, чэрпаць з яго самае найлепшае і карыснае. Яшчэ калі вучыўся ў гімназіі, упарта працаваў над сабою, удасканальваў свае мастацкія здольнасці і няўхільна летуцеў аб мастацкай акадэміі. Ягоныя планы і летуценні здзейсніліся.

Чалавекам Сцяпан Кажура быў простым і інтэлігентным. Ён любіў прастату, захапляўся ўсім нармальным і натуральным. Яго можна было бачыць сярод людзей вясёлым і жыццярадасным, тактоўным і ветлівым. Гэткім ён быў і ў асабістым жыцці. Сцяпан адкідаў ад сябе лішняе і занадта вычурнае. Ніколі пры сустрэчах з паважанымі людзьмі не рабіў кіслай і фальшывай усмешкі, а шчыра глядзеў у вочы, ад сэрца ўсміхаючыся і горача паціскаючы руку. Гэтым ён шмат каму падабаўся. А ў вачах шмат каго быў, ведама, і нявыхаваным. Але Сцяпан не праймаўся. Прастату ён ставіў вышэй за ўсё пустое, напышлівае, нікчэмнае і настырлівае. Не любіў падлізлівых паклонаў мала не да самай зямлі, дарэмнага выдыгання нагамі, лішняга шматслоўя і непатрэбнай слюнявасці.

Сцяпан заўсёды быў поўны энергіі і запалу. Ён жыў, тварыў, захапляўся, усім цікавіўся, стараўся авалодаць яшчэ недасягнутым,

атрымаць яшчэ ненабытае, даваў усяму адпаведную ацэну. Гэта заўважна вылучала яго з натоўпу звычайных, шэрых людзей, замкнутых у цесныя, пагніўшыя ад даўнасці, рамкі, не маючых ініцыятывы і ўласнае думкі. Гэта рабіла яго чалавекам з пэўным палётам, ставіла вышэй абыякавай будзённасці. Сцяпану думалася: калі б ён знаходзіўся ў тым натоўпе, якога заўсёды цураўся, тады ён стаўся б ягонай ахвяраю, задыхнуўся б у ягонай цяжкой атмасферы і загінуў бы як мастак…

Не, Сцяпан не быў абыякавым і шэрым чалавекам. Тое, што яго прыцягвала і захапляла, — паспяхова прайшоў. Наперадзе — праца і праца, вялікая ўвага, аж пакуль ён, Сцяпан Кажура, не стане зусім дасканалым мастаком, будзе ведамым і для ўсіх даступным.

Тым часам Сцяпан цвёрда намерыўся пакінуць самотнае жыццё. Хацелася мець сямейны прытулак і, будучы атуленым ягоным цяплом, працаваць не толькі на карысць сваёй сям'і, але і на карысць…

І тут Сцяпан не ведаў, каму яшчэ сваёй працай можа прынесці карысць. Усё ж было ведама, што ён — нядрэнны мастак.

Але жыццё не склалася так, як Сцяпан планаваў. Праз два гады пасля пабрання памерла ад родаў жонка. Ейная смерць сталася для мастака вялікім няшчасцем. Ён страціў, здавалася, непаўторнага чалавека і сябра ў сваім жыцці. Бадай цэлы год нічога не маляваў. Пазней пабраўся другі раз.

Калі Сцяпан Кажура меў двое дзяцей — хлопчыка і дзяўчынку, — пачалася вайна. Няшчасце ішло за няшчасцем, не абмінала яно і чалавека, які без творства не мог жыць. Сцяпан разам з сям'ёй апынуўся ў чужой краіне, далёка ад свайго любімага горада. Давялося цяжка працаваць у нямецкім горадзе Г. Пра мастацтва не было калі думаць. Бесчалавечнае барбарства зрабіла мастака рабом, паставіла яго ва ўмовы, у якіх можна было толькі цягнуць нікчэмнае існаванне.

Сталася новае няшчасце. Яно падкасіла чалавека зусім. У часе бамбардыроўкі горада, калі Сцяпан быў на заводзе, загінулі ў лагерным бункеры жонка і дзеці…

Вясёлая кампанія мужчынаў сядзела пры стале. А трохі воддаль, у другім кутку пакоя, седзячы на канапцы, жвава гутарылі праміж сабою Вольга Ладуцька — гаспадыня кватэры, элегантная жанчына, і Марыя Чупрык — маладая, прыгожая ейная суседка. Мужы — Тодар Ладуцька і Рыгор Чупрык — былі ў мужчынскай кампаніі.

— Так не люблю я гэтых мужчынаў, — гаварыла Ладуцька, — што прост не магу вам, Марыя, расказаць. Вы падумайце толькі, — яна кіўнула галавой у бок стала, — прост цэлымі вечарамі сядзяць над картамі. І мой Тодзік такі дурны, як і ўсе мужчыны, гуляе і гуляе ў карты.

Марыя Чупрык, усміхаючыся, адказала:

— Што вы, што вы, Вольга. Вы няпраўду, па-мойму, кажаце. — Марыя прымружыла вочы (падбрытыя чорныя бровы выраўняліся ў струнку) і мяккім, грудным голасам прадаўжала:

— Ёсць даволі мілыя і сімпатычныя мужчыны. Учора я пазнаёмілася з сынам мамінай сяброўкі — малады, прыгожы, скромны, наіўны. — Марыя адкінула галаву на спінку канапкі. — Люблю наіўных і скромных мужчынаў. Грыша раней быў такім, але сапсаваўся. Грыша! — зрабіўшы выгляд маленькай дзяўчынкі, Марыя крыкнула да мужа: — Ты сапсаваўся, Грыша, праўда?

Але ні Рыгор Чупрык, ні Тодар Ладуцька, ні іншыя мужчыны нічога не чулі. Гульня была ў разгары. Раптам Тодар Ладуцька ўскочыў з месца і, узняўшы руку з картаю ўгору, закрычаў на ўвесь голас:

— О-о-о! Чырва! Трапіў мне ўрэшце шанец у рукі!

Вольга, ягоная жонка, пакінула канапку і хутка падбегла да стала.

— Тодзік! — закрычала яна, — што ты сабе думаеш?! Ты не можаш гаварыць трошкі цішэй? Я прост больш не магу! — І вярнулася, усхваляваная, на канапку.

— Супакойцеся, Вольга, — суцішыла яе Марыя. — Вы не звяртайце на іх увагі. Яны — дурныя, смешныя дзеці.

— Праўду вы кажаце, — ужо амаль спакойна падхапіла Вольга. — Прост дурныя, смешныя дзеці. Я даўно павыганяла б іх з хаты, каб не адзін чалавек. Толькі праз таго чалавека я яшчэ стрымліваю сваю нянавісць да мужчынаў. Вы ведаеце, пра каго я гавару?

— Не, не ведаю. А пра каго, цікава?

— Угадайце.

— Мо, часам, пра Сцяпана Кажуру?

— Так, угадалі, пра яго. Каб мой Тодзік быў такі, як Сцяпан Кажура, я на яго ніколі не крычала б. Сцяпан і ў карты гуляе, але меру ведае. Шкада, што сяння чамусьці не зайшоўся. Калі ён гуляе ў карты, тады і таўкачы нашы так не гарлапаняць. Пан Кажура, гуляючы, гаворыць такім далікатным галаском — прост здаецца, што сама карта прыемна выгаворвае словы. Прост люба тады гля-

дзець на такую гульню. Вы заўважылі гэта? — Вольга павярнулася да суседкі.

— А мне чамусьці Кажура не падабаецца. Па-мойму, ён такі паважны, пахмурны.

— Не кажэце, не кажэце! — перабіла Вольга. — Гэта няпраўда. Вы прост не разумееце яго. Ці памятаеце вы, як ён вітаецца? Ён так нізка і прыгожа кланяецца, так пяшчотна цалуе руку, што прост сэрца маё трапечацца.

У дзверы нехта пастукаў.

— Калі ласка! — хтосьці крыкнуў з-за стала.

Увайшоў Сцяпан Кажура. Адразу ж, пераступіўшы парог, ён сказаў:

— Нізка кланяюся ўсім!

Амаль на пальчыках ён хутка і нячутна падышоў да канапкі, ледзь не ў пояс схіліўся перад жанчынамі, прывітаўся, цалуючы рукі. Паздароваўся і з мужчынамі.

— Я не… — нешта хацеў сказаць Сцяпан, але яго перабіла Вольга:

— Вельмі прыемна вас бачыць, пане Кажура. Сядайце, калі ласка, шаноўны пане. Сваім прыходам вы прост прыносіце радасць у нашу хату.

— Дзякую, шчыра дзякую за камплімент, — ізноў нізка кланяючыся, адказаў Сцяпан.

Пасля апошняга няшчасця — трагічнай смерці жонкі і дзяцей — Сцяпан Кажура зусім з'іначыўся. Сам ён добра заўважаў, што зрабіўся падобным на шэрых, нізкавокіх і абыякавых людзей.

У парку цвіла ліпа. Прыемны пах дрэваў і кветак поўніў паветра. Гуляючы ў прысадах парка, Сцяпан думаў аб тым, што вось скончылася вайна, а ён змушаны туляцца па чужыне. Нічога не малюе і не мае ахвоты маляваць. Успомніў сваю трагедыю…

Раптаў ён заўважыў жанчыну, якая, прысеўшы ля дзіцячай каляскі, штосьці майстравала. Падышоўшы бліжэй, убачыў, што з каляскі саскочыла кола, і жанчына ніяк не магла яго прыладзіць.

— Дазвольце вам дапамагчы, — сказаў Сцяпан.

— Калі ласка, — прыўзняўшыся і нібы засаромлена зірнуўшы на Сцяпана, адказала жанчына.

Сцяпан хутка прыладзіў кола. Жанчына падзякавала і павезла каляску з дзіцем углыб парка. Сцяпан доўга глядзеў ёй услед. Ён падумаў, што нават не бачыў, дзяўчынка ці хлопчык былі ў калясцы.

Наступнага разу, гуляючы ў парку, Сцяпан ізноў сустрэўся з жанчынай. Прывітаўся і доўга глядзеў ёй услед, пакуль яна разам з каляскай не схавалася за гушчай дрэваў. Пазней, стоячы воддаль, бачыў, як жанчына, схіліўшыся над каляскай, спавівала дзіця. На ейным твары прачытаў і бязмежную ўвагу, і клопат, і цеплыню — усё, што ўдзялялася дзіцяці. Сцяпан раптам адчуў, як узбуджана забілася сэрца. На душы палягчэла і пасвятлела.

У надышоўшую ноч Сцяпан не спаў. Нацягнуў на раму палатно, падрыхтаваў фарбы…

Папалудні наступнага дня быў гатовы малюнак схіленай над дзіцячай калыскай маткі.

Мастак любаваўся сваім малюнкам. У ім пачынаў абуджацца той самы Сцяпан, які жыў у ім яшчэ на радзіме перад вайной. На месцы не сядзелася. Хацелася пайсці да Ладуцькі ці…

Заўвага рэдакцыі. На гэтым перарываецца прысланае ў рэдакцыю апавяданне «Чужы». Відаць, паважаная аўтарка не ўклала праз памылку ў куперт апошніх балонак твора. Навязаць лучнасць з аўтаркай нам не ўдалося. Канец, напэўна, такі: сужэнствам Ладуцькаў і Чупрыкаў не спадабалася далейшае трыманне Сцяпана. Мастак выходзіць на вуліцу. Ён для ўсіх чужы і адзінокі сярод людскога натоўпу.

1946

МАНАЛОГ САБАКІ

Сяння мне вельмі несамавіта. Нават месяцу не магу паскардзіцца; змрочныя хмары завалаклі неба, і ніяк не бачу мілага нязменнага сябра майго адзіноцтва. А хутка поўнач. Служанка гаспадароў — ці чуеце — храпе ў самым дальнім пакоі дому. Яна ненасытная ненажэра, непрабудная спюка, надвечар нават не накарміла мяне. Я адчуваю пустэчу ў жываце. Мне падцягнула духі. З гэтага перадпакою цяжка адчыніць дзверы ў кухню, але не пад сілу мне ўлезці ў шчыльна зачыненую электрычную лядоўку. А там ляжаць салодкія кавалкі цяляціны, якія служанка сяння прынесла ад мясніка. Заўтра яна, шэльма, зжарэ палавіну гэнага мяса і скажа гаспадыні (а яна і гаспадыня так падобныя адна да аднае, як дзве сястры), што карміла ім мяне і выводзіла мяне на шпацыр. У сапраўднасці яна фліртавала з мясніком, шмат яму

абяцаючы. Тое ж самае, адышоўшы колькі крокаў ад мясное крамы, яна абяцала і пажылому дворніку аднаго дому. Мінуўшы рог суседняе вуліцы, яна з тымі ж словамі сустрэла і правяла апраненага ў форму юнака ў высокіх ботах. А ён ёй прыгадаў, каб яна не падыходзіла больш да яго са мною без медаля на маёй шыі. Авохці мне! Я сам — важнейшы за медаль. Некалі я ўкушу яго за гэткае зневажанне майго гонару.

Як бачыце, доля мая незайздросная і нешчаслівая. З'явіўся я на свет, відаць, пад незычліваю зоркаю, хоць і прыналежу да арыстакратычнага роду расістых сабакаў. А ўсё праз майго гаспадара — доктара, прафесара, інжынера Сцяпана Заблуду. Чалавек ён нетутэйшы, а прышлы сюды з далёкага свету эмігрант. Ён купіў мяне на рынку, калі я быў яшчэ малы, але прыналежанне да роду моцна захавалася ў маёй памяці. Ведама, гаспадар Заблуда не ёсць расістым арыстакратам. Хоць ён і разбагацеў хутка на новым месцы, заняўшыся перапродажам дамоў ад аднае фірмы, але ён толькі ўпісаны ў тэлефонны каталог, ніколі гэтым не займеўшы гэткае радаслоўнае, як мая. Заблуда — страшэнна скупы жмінда. Ён выгандляваў сабе гэты прыгожы дом, купіў, апрача мяне, аўта, лядоўку й мяккія крэслы, толькі тут, у перадпакоі, пакінуўшы знішчаны кілім, але старэнькай беднай жанчыне з далёкага свету, адкуль сам прыехаў, не паслаў анічагусенькі, хоць яна і прасіла дапамогі. Калі б я меў такую ўладу, як гаспадарова служанка, я сам не даеў бы і ад служанкі палавіну забраў бы (ёй стае), каб дапамагчы. А скупярэка Заблуда нават не плаціць за мяне падатку, і я нясмела бегаю на вуліцу. Адна сытая самазадаволеная баба заўчора сказала: «Цьфу! Які брыдкі сабака!» А я падумаў: «Зірні ў люстэрка на сябе, праезджаная кансерва». Я толькі падумаў, але не сказаў, бо прыналежанне да майго роду не дазваляе гэтага.

Вось ужо і поўнач, а месяц не выгляне з-за хмараў, колькі ні ўзіраюся ў сцюдзёнае акно. Гаспадары яшчэ не вярнуліся з кіно. На якія фільмы ходзяць яны? Мабыць, яны пайшлі на прэм'еру «Wild West». Праз тыдзень, прачытаўшы ў заўтрашняй газеце рэцэнзію на гэты фільм, яны даведаюцца, ці было ім там весела. Потым пойдуць да суседзяў і будуць дыскутаваць аб фільме. Вельмі хутка фільм забудзецца і пачнецца дыскусія аб куплі і продажы дамоў: як хто выгодна купіў або прадаў, як вокны або дзверы, як аўта або патэфон, як сабака (успомняць і мяне) або кот. Пасля мой гаспадар Заблуда пачне га-

варыць аб палітыцы, а гаспадыня Заблудзіха пасняшаецца сунімаць яго: «Сцёпа, ты не спяшайся, Сцёпа, ты голасна не гавары». Але Заблуда ўсё адно будзе прамаўляць з запалам аб адной вялікай дзяржаве і аб тым, што ён зрабіў бы, калі б кіраваў ёю... Ён вызваліў бы ад голаду галодных — ці лягчэй ад гэтага майму сянняшняму галоднаму жавату?

Часта бывае дыскусія і ў нашым доме. Калі ў суседзяў палітыкай канчаецца, дык у нас — наадварот. У суседзяў бываюць і звычайныя людзі, а ў нас — адны палітыкі, і ўсе — людзі з тытуламі. Апрача гаспадара — прафесара, доктара, інжынера Сцяпана Заблуды, бываюць у нас і доктар Халімон Моркаўка, і інжынер Сілівон Сініца, і прафесар Харытон Яблыня, і магістр Спірыдон Пень. Яны дыскутуюць, і кожны горад, успамінаны імі, называецца універсітэтам. Раней мне думалася, што яны прыехалі з дзяржавы, імя якой — універсітэт.

А колькі дзён таму былі ў нас дзве асобы без тытулаў, але вельмі паважаныя. Гэта — прэзідэнт Аб'яднання Незалежных і Непадлеглых Ксавэры Скубач і паэт Анатоль Птах. Скубач собскаручна напаўняў вiном паэтаву чарку, прасіў выпіць і ўсё казаў і казаў яму на вуха, час ад часу падтрымліваны самім гаспадаром Заблудам: «Нам патрэбна аб'яднаць масы, нам трэба агра-ні-заваць і задзіночыць. Найлепшая апора ў гэтым — вы. Пэўна ж, вы паэт, вы маеце дар, вы нам што-небудзь пра-ляк-дэмуеце і гэтым узварушыце-ускалыхнеце масы. Вы мусіце мець чароўны голас. Вы нам праспяваеце і гэтым спрычыніцеся, прыкладам, да па-рыля-пузацыі незаконна забытага гімну «Ад веку мы спалі». Вы можаце быць добрым танцорам. Вы нам пратанцуеце і сваім аў-ры-та-тэтам вернеце да ўжытку забываную «Лявоніху». Вы стрункі станам, і, апрануўшы вышываную сарочку, зможаце бліскуча дэраст-маваць хараство нацыянальнае вопраткі. Масы будуць з вас браць прыклад...» Яшчэ штосьці гаварыў прэзідэнт Ксавэры Скубач, але хутка ап'янелы паэт зваліўся пад стол і там шаптаў ужо мне на вуха:

Уздымем штандары змагання,
Абудзім заспаны народ.
Праз кроў да жыцця і кахання
Скіруем свой смелы паход.

Я заснуў ад паэтавых вершаў і нічога далейшага не прыгадваю.

Вось ужо — ці чуеце? — вяртаюцца мае гаспадары. Яны — ці чуеце? — дзесьці выпілі, мабыць, заязджалі пасля кіно ў начны клуб. Гаспадыня — ці чуеце? — сварыцца на мяне: «Як ты, сабачая морда, мог намачыць наш праўдзівы персідскі кілім?!» А я сабе думаю: «Ён, гэны кілім, гэткі праўдзівы, як ты сама».

Заўтра яна пойдзе з гаспадаром у царкву. І пойдзе таму, што купіла новае футра. Яна спыніцца перад царквою, яе абступяць. Яна будзе хваліцца, што ейнае футра — найвялікшая каштоўнасць. Але я сваім нюхам адчуваю, што гэта самы звычайны пафарбаваны вясковы заяц — трус. Я думаю і адчуваю, але ні гаспадарам, ні іхнім знаёмым нічога не скажу. Скажэце ім вы — яны мо лепш зразумеюць вашу мову.

1954

СОРАК ДЗЁН

Успамін над свежай магілай

Сорак дзён таму заўчасна перастала біцца сэрца Ліды Нікан — чулае, шчырае сэрца жонкі Мікалая Нікана, ведамага беларускага патрыёта і грамадскага дзеяча ў Аўстраліі. Сяння, 2 снежня 1973 года, у праваслаўнай царкве на Эльм Стрыт у Мельбурне, паводле старой хрысціянскай традыцыі, у саракавы дзень пасля смерці адбылася паніхіда за супакой душы нябожчыцы. На паніхідзе было шмат людзей — беларусаў і іншых нацыянальнасцяў. Усе ведалі Ліду Нікан, гутарылі з ёй, шанавалі і паважалі яе, а яна іх таксама.

«Спадарыня Ліда» — так пераважна называлі яе проста, але шчыра, ейныя блізкія й знаёмыя. Бацька нябожчыцы быў ведамым украінскім тэатральным дзеячом, акторам, носьбітам тэатральнага мастацтва. Маці — з эстонскага роду. Бацька прывіў дачцэ змалку любасць да мастацтва й красы. Яна добра ведала беларускую мову і, як родную, шанавала яе. Апрача славянскіх, валодала эстонскай, шведскай, ангельскай, нямецкай мовамі. Спадарыня Ліда не толькі натхняла мужа да працы, да ўзгадавання і выхавання ўзятых сіротаўдзяцей, не толькі шыла беларускія нацыянальныя сцягі і вышывала сарочкі. Яна ўсім сэрцам і душою жыла ў свеце красы — чароўнай і вечна жывой. Мела прыгожы голас і натхнёна спявала. Захапляла-

ся музыкай і цаніла яе. Ведала Чайкоўскага, Бетховена, Моцарта, Вагнера, Шапэна — усе іхнія музычныя творы не толькі вычувала, але і глыбока разумела. Чытала, успрымаючы і разумеючы, не толькі Шаўчэнку й Купалу, але і Шэкспіра й Гётэ, Байрана й Гайнэ. Цікавілася мастацкімі палотнамі Рэпіна й Рэмбранта. Прыгадвала заўсёды пра творы эстонскага й шведскага народных эпасаў, шмат урыўкаў з іх дэкламавала ў арыгінале пры сустрэчах з сябрамі. Мы чулі словы незразумелых нам моваў, але, паводле пачуццяў і гукаў, пераймалі іхні сэнс:

Мне адно прыйшло жаданне, я адну задумаў думу…

Або:

Плакаў стары Вайнэмайнэн, каціліся чыстыя слёзы
З берага ў воды бліскучыя, з водаў — у немарач твані…

Шчасце і гора маіх і братоў, і сясцёр аднакроўных.

Нябожчыца любіла вясну й кветкі. І ўсе, што праводзілі яе на вечны супачын, абдарылі ейную магілу вянкамі кветак, проста ўваскроснай крыніцай вянкоў. Кветкі звялі, але ніколі не звяне ў душы пачуццё іхняга неўміручага расцвітання.

У доме, у якім жыла вечнай памяці Ліда Нікан і які гаспадар называе «Прыпынкам», у пакоі сярод кніжак (а ў гэтым пакоі заўсёды была яна), сярод плітак з запісамі музыкі і г. д. стаіць узнёслы столік для кветак. На століку — фатаграфія нябожчыцы. З двух бакоў фатаграфіі гараць ціхапалымяныя свечкі. Між свечак — скрыначка з музыкай. Накручваецца пружына — і вы чуеце цудоўную мелодыю Бетховена, якую нябожчыца бязмерна любіла. У мелодыі — горыч і плач душы пры няшчасці, а пры радасці — уцеха і захапленне. І яна жыве, не моўкне гэтая мелодыя ва ўзлёце ў высокі свет душы адойшлай ад нас на няўхільнай дарозе ў тое ж адойсце.

1973

ПАД НЕБАМ ПАЎДЗЁННАГА КРЫЖА

Сяброўскія сустрэчы беларусаў

Над новым светам, у новым небе між новых зораў зырка ззяе шасцізорны Паўдзённы Крыж. Мільёны зораў наўкола яго выдаюцца лагоднапалымянымі свечкамі сіняй прадоннай прасторы. Там — усё далёкае ад нас і такое вялікае, бязмежнае, неабдымнае! І разам з гэтым у думках — блізкае! Мы так блізка ў імкненнях парываемся да яго. І колькі прыгаства крыецца, апрача Зямлі, у гэтым высокім, яшчэ не ў поўнай меры дасягнутым чалавекам свеце! Найвышэйшая гармонія кіруе ўсімі сіламі — і тымі, што высока ад нас, і тымі, што поруч з намі.

Гаснуць зоры. Неба палымнее чырвонаружовай зарой. Узыходзіць сонца. Раніца. Зямля новага свету па-свойму ажывае разам з усім — і флорай, і фаўнай. Прабуджаецца квінслендская сонечная і заўсёднарлетняя Паверхня Раю (Surface Paradise). З буйнейшымі раннімі сіламі імкнецца ў бясконцасць прастораў нястрымнаводны Мурэй. Таропка скача па родных прасторах думны кенгуру. Увішна лазіць па дрэвах жвавы аўстралійскі мядзведзік.

Пры нараджэнні дня грамада беларусаў — каля 20-ці аўтаў і каля 100 чалавек — рушыла ў дарогу. Мэта падарожжа — маёўка ў Народным парку Каралеўскага возера. Парк заняў сабе пачэснае месца ў 40 мілях ад Мельбурна на 14 тысячах акраў зямлі. Мае каля 100 пародаў і дрэваў, і птушак.

Была сярэдзіна сакавіка. Пачатак аўстралійскай восені. Прыгожы сонечны дзень нагадваў беларускую вясну — канцакрасавіковую і пачаткатравеньскую.

Размясціліся на лаўках пры шырокіх сталах — усё адмыслова зробленае для маёўкаў. Побач — печы для вогнішчаў. Падсілкаваліся й вырушылі на прагулку. Вясёлыя й жыццярадасныя дзеці наладзілі свае гульні — пускалі высока ў неба летакі й ракеты. Усё хутка, прывязанае да ніткі, вярталася назад і зноў паўторна шугала высока.

Прагулка звілістаю сцежкаю вяла ўздоўж нястрымных спадаў вады. Серабрыстыя струмені лагодна цурчэлі з гораў, разбіваючыся аб чыста вымытыя, нібы адшліфаваныя, камені й скалы. Высокія, магутныя эўкаліпты ўпіраліся густымі чубамі ў вышыню. Ва ўглыбленнях, дзе вада спынялася, часова стаяла, адсвечваліся рэдкія бялёсыя хмурынкі з неба. І ўсіхныя пачуцці надоле былі спалучаныя разам з чароўным

нізам і празорнай вышынёй. Высока цвіцелі беллю густыя хмызнякі. Выдавалася, белыя клубочкі снегу ападаюць з хмызнякоў, ператвараючыся ў пену струменяў. І хоць на свеце краса — адна з мноствам розных аздобаў, думкі парываліся далёка-далёка да роднай беларускай красы, «да шумных рэк і да вазёраў поўных», да ўсяго, чым дыхалася і сярод чаго раслося змалку.

Вярталіся на месца стаяння зачараваныя прыгожасцю наваколля. Распальвалі вогнішчы, смажылі свініну й бараніну, пяклі цыбулю й бульбу. А колькі было сапраўдных пекуноў бульбы ў гарачым прысаку й попеле! — яшчэ ад таго часу, калі «пастушком ганяў у бор». Усё смакавала на свежым паветры, як ніколі. Ізноў падсілкаваліся. Птушкі парка вітаюць наведвальнікаў радасным спевам, потым часова замаўкаюць, каб даць голас людзям. Загучэлі, паліліся з грудзей песні, родныя песні. Сярод грамады — і спевакі беларускага мяшанага хору ў Мельбурне. Яны надавалі тон усім песням. «Люблю наш край, старонку гэту…» і «Зорка Венера ўзышла над зямлёю…» гучна разам з іншымі песнямі паланілі лес. У іх жыла частачка спеўнай Беларусі.

Ехалі дадому поўныя радасці й натхнення, а таксама і з сумам, што не ўсе суродзічы ў свеце праводзяць час так уцешна й здавольна.

Праз тыдняў пяць адбылася новая маёўка. Паехалі ўсе ў сасновы й яловы лес паміж Баларатам і Далесфордам. Еўрапейскі лес пасаджаны ў пачатку гэтага стагоддзя. Пасярод яго — ціхае возера. Буйна й густа расце паміж дрэваў папараць. І грыбы — знаёмыя нам яшчэ ў маленстве грыбы — хаваюцца пад іголкамі яловых і сасновых галінаў, часам выглядаюць з-пад іх. Безліч шышак сябруе з грыбамі. Рыжыкі і маслякі, прыгожыя, паважныя мухаморы. Рыжыкі й маслякі збіраюцца ў кошыкі, а мухаморы не кранаюцца, не збіраюцца. Няхай растуць сабе, як той у жыце васілёк, які прыносіць шкоду. Але не знішчаецца, бо ягоная краса прыйшлася даспадобы беларускаму селяніну. Баравікоў і іншых грыбоў няма. Яны не зжыліся з глебай і кліматам.

Адведзіны лесу былі не толькі мэтай маёўкі, але й збіраннем грыбоў і лоўляй рыбы на возеры. Адны ахвотнікі пайшлі з кошыкамі ў грыбы, іншыя — з вудамі на возера, у рыбу. Вярнуліся з поўнымі кошыкамі грыбоў, з цяжкаватымі торбамі рыбы. Як і на ранейшых маёўках, расклалі вогнішчы, смажылі падсілкаванне. Ізноў беларускія

песні, дружны хор, сяброўская грамада. Перад вачыма — прыгожы лес, беларускі бор у далёкім свеце!

У дзень сьвяткавання Кангрэса й Абароны ў Беларускім Доме ў Мельбурне — пасля дакладаў і мастацкай часткі — адбыўся сяброўскі вечар. Размовы, успаміны з маленства, з дому лучылі ўсіх у адну сям'ю. Шклянка гарбаты або чарка іншага пітва падбадзёрвалі і падтрымлівалі настрой. І цяпер не абышлося без песняў. Спявалі і тыя ж харыстыя, што раней былі на сцэне. Але спеў на залі, пры стале выдаваўся больш гучнейшым і сардэчным — яшчэ ад большага сэрца, як на сцэне! Да слёзаў закрануў выступ спадарыні Надзі Грушы з песняй «Беднае сэрца мамы». Узварушыла ўсіх і дэкламацыя верша «Гамоніць даўнай праўды звон».

Дарагая Бацькаўшчына жыве ў нашых сэрцах, пяшчотна цепліцца ў пачуццях, яснее, не гасне ў думках ззяйным хараством.

1974

ЛІСТЫ

1. МАСЕЮ СЯДНЁВУ

15 снежня 1943 г., Рыга

Вельміпаважаны спадар Сяднёў!

Мабыць, нечаканым будзе для Вас гэты ліст — ліст ад незнаёмага чалавека, але я ніяк не змог стрымацца, каб не напісаць хоць колькі словаў. Паверце, нястрыманае жаданне напісаць Вам выклікалі ў мяне Вашыя вершы, якія я прачытаў нядаўна ў «Новай дарозе». Я працую ў рэдакцыі часапісу «Новы шлях» на становішчы стылістага, сам крыху спрабую пісаць вершы, а таму цікаўлюся паэзіяй. І за апошнія два гады, чытаючы і перачытваючы вершы ў беларускай прэсе, я ніколі не быў гэтак узрушаны і не адчуваў гэткага задавальнення, як тады, калі чытаў «Новую дарогу», што выпадкова да мяне трапіла, дзе быў надрукаваны верш «Мара». Колькі лірычнай цеплыні і шчырасці, колькі пачуццяў і перажыванняў у гэтым вершы! Верш не ад думак і не ад розуму, і, казаў той, не ад галавы, а ад чыстага сэрца… Радасная ўсмешка з'яўляецца на твары, адчуваеш нейкае невыказнае задавальненне і ўзняты настрой і, адначасна, неспакой за лёс нечага дарагога і сэрцу блізкага, калі чытаеш радкі з верша «Домік у Менску»:

Драўляны дом! Блакітны дом!
Маіх найлепшых мар прытулак!
Ці так жа ўсё сваім акном
Глядзіш на вузенькі завулак?
Ці шчасцем ты сваім багат?
Ці шашаль сцены твае губіць?
Ці так жа ўсё зялёны сад
Тваю ідылію галубіць?
Скажы ты мне, скажы ты мне,
Дзе зараз тая, што начамі
Малілася сваёй вясне, —
Такая… з сінімі вачамі?

Усім сэрцам адчуваеш боль і плач душы чалавека, які з далёкага выгнання ў мроях рвецца да сваіх бацькоў (верш «Маім бацькам»). І надзвычайна моцна перададзеная летуценная сустрэча з бацькамі. Выгнанец, «долі падуладны жабрачай», перад гэтаю сустрэчаю абтрасае пыл з адзення, прыкрывае раны, бо ведае, калі ўбачаць іх бацькі, ім будзе вельмі цяжка і балюча… І гэта ўсё не надуманыя, не штучныя, а запраўдныя перажыванні, гэтак умела перададзеныя ў вершы! Усімі часткамі сваёй душы адчуваю запраўдную паэзію і высокую мастацкасць у Вашых вершах, але, як у звычайнага чалавека, не літаратурнага крытыка, у мяне не хапае словаў усё гэта правільна і добра перадаць на пісьме. Скажу толькі тое, што кожная новая газета і кожны новы верш — усё большае і большае ўражанне і задавальненне. І адно, толькі адно — чаму дзе-нідзе сустракаюцца перабоі ў рытмах? Каб не было іх, было б яшчэ лепш…

Калі чытаў Вашыя вершы, мне ўспомнілася вясна 1939 году. Я вучыўся тады на першым курсе Менскага педагагічнага вучылішча (былога Белпедтэхнікума). У нашым інтэрнаце, у суседстве з тым пакоем, дзе мешкаваў я, жыў малады хлапец невысокага росту, кучаравы, з блакітнымі вачыма, таксама студэнт вучылішча. Ён не быў маім блізкім сябрам, а толькі суседам, жыхаром аднаго інтэрнату. Таму я не памятаю ягонага прозвішча. Памятаю толькі, што ён зваўся Сяргеем. Аднойчы Сяргей прачытаў у насценнай газеце вучылішча мой верш. Пасля гэтага ў яго з'явілася жаданне пабачыцца са мной і пагутарыць. Неяк вечарам ён зайшоўся ў той пакой, дзе знаходзіўся я. Пачалі гутарку. Гаварылі пра літаратуру, пра паэтаў, пра вершы. Я тады часта наведваў літаратурныя сходы ў менскім Доме пісьменнікаў. Сяргей гэта ведаў і пытаўся ў мяне аб тым, што я там чуў, каго з пісьменнікаў бачыў, ці гутарыў з кім-небудзь з іх.

— А ці чытаў ты дзе-небудзь гэты верш? — спытаўся Сяргей, дастаючы з кішэні пільчака паперку, спісаную вершамі, і паказваючы мне.

— Пакажы, пакажы, — зацікавіўся я і памкнуўся ўзяць тую паперку ў свае рукі.

— Не-не, гэтага верша ў твае рукі не аддам, — запярэчыў Сяргей, — а калі жадаеш пачуць, слухай.

І ён пачаў чытаць. Я настарожыўся, стараўся запомніць кожнае слова. Верш быў вялікаваты, і я запомніў толькі адну страфу. Цяпер,

пад уплывам часу, я забыўся яе і ніяк не магу прыпомніць. Памятаю, што верш быў пра дзве дарогі. У пэўным месцы яны разыходзіліся: адна ішла ў адзін бок, другая — у іншы. І памятаю, што той верш надзвычайна спадабаўся мне.

— Сяргей, дай гэты верш у мае рукі, — прасіў я, — я пачытаю яго сам і вярну табе назад.

— Не дам, — быў адказ.

— Чаму?

— Так... Вось не дам і ўсё... І не прасі.

Мы змоўклі. Першым парушыў цішыню Сяргей.

— Калі хочаш, прачытаю табе яшчэ адзін верш? Гэта — акрастых, прысвечаны мне.

— Добра, чытай, — і я зноў настарожыў свой слых.

Сяргей пачаў чытаць, а я прагна лавіў кожнае слова. Гэты акрастых быў невялічкі, і я яго запомніў. Калі не памыляюся, вось ён:

Слухай, слухай мяне, мой харошы,
Я хачу табе расказаць,
Рана думак тваіх пароша
Галаву тваю стала займаць.
Ехаць, лётаць табе у даль,
Юны будзеш ты шчасця ўладар.

Сяргей змоўкнуў. Крыху памаўчаўшы, сказаў:

— Я шмат меў вершаў гэтага чалавека пры сабе, але яны засталіся дома.

— А чые гэта вершы? Хто ж гэты чалавек? — насядаў я на Сяргея.

— Гэты чалавек — Масей Сяднёў, мой стрыечны брат.

...Я тады быў яшчэ зусім маладым, можна сказаць, падросткам. Гэткага прозвішча не ведаў і ў 1938–1939 гадах у часапісах не сустракаў. А калі яно з'яўлялася ў друку раней, дык тады я пяшком хадзіў пад стол.

У мяне былі добрыя старэйшыя сябры — маладыя паэты, студэнты Менскага педагагічнага інстытута. Я часта з імі спатыкаўся, гутарыў. Аднойчы я спытаўся ў аднаго з іх, ці ведае ён такога паэта Масея Сяднёва. Ён адказаў, што чуў гэткае прозвішча, і што Сяднёў — здольны паэт, але ён, напэўна, цяпер арыштаваны органамі НКВД... Я тады

зразумеў, чаму Сяргей не хацеў мне паказаць вершы таго аўтара. І парашыў больш Сяргея не турбаваць.

Не ведаю, ці ёсць у Вас стрыечны брат Сяргей, ці не, не ведаю, ці запраўды Вашы вершы ён чытаў, але гэты выпадак у маім жыцці быў і я яго запомніў.

З таго часу прайшло ўжо шмат дзён. Я з'іначыўся, падрос, мабыць, з'іначыўся і Сяргей, і цяпер, каб спаткаліся, дык і не пазналі б адзін аднаго. Мне даводзілася часта ўспамінаць тыя, першы раз чутыя мною вершы і іхняга, няведамага мне, аўтара…

І цяпер я разгарнуў газету, убачыў верш, прачытаў «Масей Сяднёў», «Мара», і ўспомнілася ўсё, усхвалявана пачаў чытаць і атрымаў яшчэ большае, як некалі, задавальненне. А таму ніяк не мог стрымацца, каб не напісаць.

Ласкава прашу прабачыць мне за тое, што турбую Вас гэткім даўгім лістом. Калі не маеце нічога супроць і маеце час — напішыце мне.

Гэта будзе для мяне вялікая радасць, асабліва тут, на чужыне.

Можна мне пісаць на адрас рэдакцыі або на прыватны адрас: Alfred Radzjuk, Riga, Bismark-Strasse, 5–10, Ostland.

Жадаю ўсяго найлепшага і поспехаў у працы.

Моцна цісну руку. З прывітаннем — *Альфрэд Радзюк.*

2. МАСЕЮ СЯДНЁВУ

31 снежня 1943 г., Рыга

Дарагі Масей!

Ад самай першай літары гэтага ліста прашу выбачыць мне за тое, што я, на твой прыклад, пачаў ад гэткае формы звароту. Я ўжо напісаў «дарагі Масей», а рука чамусьці дрыжыць і неяк няўпэўнена выводзіць літары. Як ні кажы, ты старэйшы за мяне, больш за мяне перажыў, з большай ведаю і дазнаннем. А таму неяк няёмка звяртацца да старэйшага чалавека так, як да роўнага. Але ж нічога не зробіш — такая твая прапанова. Думаю, што ў далейшым асмелюся…

Шчыра дзякую за твой ліст і за тое, што ў ім напісана. Мне неяк не верыцца, што ўсё гэта, адносна майго творства, праўда. Але, з іншага боку, можа яно і мае якую-колечы вартасць. І гэта добра.

Прабач, дарагі сябра, за такі спозьнены адказ. Апошнімі днямі мне давялося пралежаць у пасцелі… Дзякаваць Богу, сяння падняўся на

ногі. Збіраюся цяпер надоўга развітацца з пасцеляй. Ужо ж зіма. Можа, дасць Бог, хутка пачнуцца маразы. Тады і паветра пачысцее і павальнее.

Наша рэдакцыя гэтымі днямі, можна сказаць, пуставала. Спадар Сядура яшчэ не прыехаў з Менску. Тэхнічны рэдактар выехаў на свята. Сяння я наведаў рэдакцыю. Твой ліст, што да спадара Шырокава, як я даведаўся, наша машынерка своечасова скіравала на Дзвінск. Наагул, падрабязных вестак пра Тодара мы не маем. Ведама толькі, што ён у Дзвінску — і ўсё. Сам ён не напісаў ніводнага слова. Толькі інспектар беларускіх школаў Дзвіншчыны паведамляў, што Тодар — у Дзвінску, што просіць ён матэрыялаў для газеты. Твой ліст пасланы на імя інспектара з просьбай перадаць яго Тодару.

Ужо дзве гадзіны дня. Мінула большая палова апошніх содняў 1943 года. Неўзабаве і вечар. Адылі 12 гадзінаў ночы, за імі — Новы год. Ты, напэўна, у коле сваіх бліжэйшых сяброў рыхтуешся цяпер да спаткання Новага года. А я — адзін. На ўсю кватэру адзін. Гаспадары, з якімі можна згаварыцца па-расейску, і тыя выехалі кудысьці…

Я асабіста ўважаю Новы год за найлепшае свята. На яго пакладаю спадзяванні, што ён запраўды прынясе нешта новае. І мне б хацелася б спаткаць яго як найлепей. Але з чым жа спаткаць? Ні з чым…

А можа, пагутарыць з сябрамі, пажартаваць, пасмяяцца, заспяваць песню на сканчэнне апошняй часіны гэтага года і спаткаць з ёю новы? Але ж дзе сябры? Няма. Добрыя хлопцы выехалі. Засталіся, бадай, толькі тыя, што пачуваюць сябе беларусамі толькі на працы. Канчаецца працоўны дзень — канчаецца для іх і Беларусь. Тады іх цікавяць толькі жонкі і дзеці або палюбоўніцы. Тады яны забываюцца на аднакроўных братоў, забываюцца на радзіму. Няхай сабе… Хай іхныя жываты будуць спакойнымі. Не шкада іх, калі яны жывуць толькі для жывата.

Можа, я залішне распісаўся? Можа, шматслоўнічаю? Але я веру — ты мне гэта прабачыш. Веру — ты зразумееш, што ў гэты мамэнт, аддаўшыся свайму лісту, я забываюся на адзіноту; мне здаецца, што ты побач са мной і што я з табой шчыра гутару і гутару на яве, а не ў пісьмовай форме. А можа, гэтак пісаць і пісаць аж да таго часу, пакуль не прыйдзе Новы год? Хто яго ведае, неяк не асмельваюся… Тады табе давядзецца затраціць шмат часу на чытанне ліста. Гэта з аднаго боку. А з іншага — хочацца сяння ж і адаслаць гэты ліст, бо заўтра пошта не працуе.

Вярнуўшыся з пошты, я вазьмуся за Байрана. Разам з ім пакіну сваю кватэру, пакіну зямлю і палячу ў аблокі. Разам з Байранам там, у аблоках, [redacted] і спаткаю Новы год. Ты ўсміхаешся, ты здзіўляешся — што са мной здарылася? Ці не звар'яцеў я? Не, нічога са мной не здарылася. Гэта — праўда.

Адзін тутэйшы «вялікі чалавек», «паважаны грамадзянін» аднойчы сказаў мне, што мая паэма — безгрунтоўнае лётанне ў аблоках, адарванае ад зямлі, і лётанне — нікому непатрэбнае. Можа, ён і мае рацыю. Можа, нікому і не патрэбнае... Але, напэўна, ён не ведае, што, знаходзячыся на зямлі, асабліва ў цяперашні час, далей собскага жывата не сягнеш. І толькі той, хто здольны цяпер дабрацца да аблокаў, можа чаго-колечы дасягнуць. Толькі ўсё пабачыўшы, перажыўшы і перацярпеўшы на зямлі, можна што-небудзь стварыць у аблоках. Асабліва цяпер. На зямлі нічога не створыш, а ўсё тое, што бачыш, перажываеш і трываеш на ёй, заглушыць усякае імкненне да гэтага. У «сіняй вышы» адпачываеш душой, «там няма ні нуды, ні клапоў», і толькі там можна сабрацца з думкамі, накіраваць іх на адпаведны шлях, і толькі там можна знайсці запраўдныя ўмовы для таго, каб сёетое стварыць. Творачы ў аблоках і адчуваючы пад сабой зямлю, адчуваеш усё на ёй перажытае, ніколі не адарвешся ад яе, а, наадварот, яшчэ бліжэй будзеш звязаны з ёю. Адгэтуль лепш відаць, што дзеецца ўнізе, і лепш там ведаеш, як дапасоўваць тварэнне да зямнога жыцця. І гэта толькі тады, калі, падкрэсліваю, адчуваеш пад сабой зямлю. Але гора таму, хто ў аблоках лятае, а зямлі пад сабой не адчувае.

Правільна кажуць: «Калі грымяць гарматы, дык музы маўчаць». Я цалкам, ад пачатку да канца, згодзен з гэтым сцверджаннем. Голас нашае музы заглушаецца гулам гарматаў. Яны не ў стане іх перакрычаць. У сіняй жа вышыні ёсць такія мясціны, да якіх гарматны выбух не дасягае... Гэткая ўжо наша доля — даводзіцца пераадольваць абставіны...

Я не ўважаю сябе за дасягнуўшага тае вышыні, і, як мне здаецца, ніколі і ніяк мне не давядзецца яе дасягнуць. Не з маім розумам і не з маім здароўем. Але ж сваю думку, хай яна няправільная і негрунтоўная, я маю права выказаць...

З Байранам, толькі з Байранам спаткаю Новы год! Я шмат чытаў Байрана яшчэ ў маленстве. Заўсёды быў задаволены ягонымі творамі. Але тады слаба разбіраўся, слаба разумеў. Цяпер з вялікай цікавасцяй

перачытваю. І сяння, асабліва сяння, калі не хочацца быць на адзіноце, калі няма жадання звыкнуцца з гэткім палажэннем, незвычайна прыемна развітацца з сянняшнім днём, надзвычайна прыемна «сталеццяў пыл страхнуць», падыхаць «мінулым, гэткім мудрым, слаўным». І заўсёды, пры накшталтным палажэнні і адчуванні міжволі бярэшся за класічныя формы, цалкам аддаешся ім. Яны мяне цягнуць да сябе сваёй важкасцяй, сваёй разважнасцяй. Яны патрабуюць дысцыпліны слова, глыбокае думкі, вялікае культуры. А таму яны не выміраюць, а, наадварот, у адпаведныя часы па-новаму ажываюць.

Я люблю і класічныя формы, паважаю і новыя. Люблю і старое, калі яно добрае, не супярэчу і новаму, таксама неблагому. Я не вораг розных кірункаў у літаратуры. Кожны з іх хавае ў сабе нешта своеасаблівае і добрае. А добрае заўсёды застаецца добрым. Гэта не кажа аб тое, што я павінен пераймаць усе кірункі. Не. Я стараюся прытрымлівацца аднаго кірунку — ці ў формах старэйшых, ці ў формах больш новых. Не спадабаецца гэта адным, дык спадабаецца іншым, бо няма тае рэчы на зямлі, якая б усім аднолькава падабалася. Не дай Бог нацягваць усё на адзін капыл. Хай у нашай літаратуры будзе воля для ўсіх кірункаў. Тады і чалавеку будзе воля ў выбары таго, што яму падабаецца.

А на рамансы я гляджу інакш… Нашым жа кампазітарам патрэбен матэрыял і патрыятычны, і любоўнага характару, і матэрыял чыстае красы, красы ў поўным сэнсе гэтага слова. І толькі раманс здольны хаваць у сабе гэткую красу, якую можна аздобіць музыкай… Краса — найлепшы спажытак для духовага адпачынку чалавека. Правільна сказаў Максім Багдановіч: «Няма красы без спажытку, бо сама краса і ёсць той спажытак дзеля душы».

Дарагі Масей! Яшчэ раз прашу выбачыць за маю шматслоўнасць. Мабыць, шмат чаго сказаў я непатрэбнага, мабыць, шмат у чым і памыліўся. Але людзей, якія ніколі ні ў чым не памыляліся б, напэўна, няма. Гэта — мая шчырая гутарка з табой.

У гэтым лісце я пасылаю табе на добрую памяць сваю фотакартку з вершаваным надпісам на ёй. І, адначасова, пасылаю для «Новай дарогі» два вершы. Я збіраўся друкаваць іх у «Новым шляху», але і так там маіх вершаў хапае. Калі будзеш уважаць за патрэбнае іх надрукаваць, дык ласкава прашу друкаваць іх без зыначанняў, так, як у мяне. Прабач, што надакучаю, але ж — сам ведаеш — усе аўтары гэткія.

Віншую цябе, дарагі сябра, з Новым годам, жадаю шчасця, здароўя і новых удачаў!

Твой ліст прынёс мне шмат радасці. Ён з'явіўся новым сцверджаннем таго, што я ўсё ж не адзін, што я звязаны са сваімі аднакроўнымі братамі. Ён шмат мне дапамог у тым, каб хутчэй падняцца з пасцелі пасля апошняга занядужання.

Маё гарачае прывітанне Янку Богдану. Хай ён прабачыць мне за тое, што гэтак доўга не адказваю на яго вершы. Дрэннае адчуванне не давала мне даўгі час узяцца за працу. Думаю, што пасля Новага года адчую новы прыліў сілаў, тады і напішу адказ.

Твой ліст з фатаграфіяй і з вершамі атрымалі. Шчыры дзякуй. Верш «Сталін на трыбуне» будзе надрукаваны ў другім нумары часапісу. У першы нумар ён спазніўся.

Можа, у цябе ёсць крыху лепшая, больш выразная фатаграфія? Дасланую табой з тэхнічнага боку не ўдасца ў нашым часапісе выкарыстаць.

Вось, здаецца, і ўсё. Чакаю адказу і новых вершаў для нашага часапісу.

Моцна цісну тваю руку і жадаю табе ўсяго найлепшага.

Жыве Беларусь!

Твой *Алесь.*

3. МАСЕЮ СЯДНЁВУ

14 траўня 1944 г., Рыга

Мой дарагі Масей!

Нарэшце, здаецца, я агоўтаўся, дайшоў да цвярозага розуму. І адразу ж узяўся пісаць табе ліст. Колькі часінаў таму я выпадкова нашчупаў у сваёй кішэні дзве паштовыя квітанцыі. «Massiej Siadniow, Bialystok» — напісана на іх. На адной штамп — Riga 3. 5.1944, на другой — 5.5.1944. Значыцца, я нядаўна паслаў табе два заказныя лісты. Але ж гэта відавочна нейкае недаразуменне... Здаецца, апошнімі днямі я табе нічога не пісаў. Можа, машыністка наша пасылала табе часапіс, і ад яе выпадкова трапілі квітанцыі да мяне? Сяння нядзеля, яе няма, а заўтра абавязкова спытаюся.

Прашу, ласкава прашу цябе, мой дарагі Масей, прабач, калі ласка, мне за такое даўгое маўчанне. Месяц часу прайшло з таго дня, калі

я вярнуўся з Менску, а не напісаў табе ніводнага слова. За гэта цяпер лаю самога сябе, ніяк не магу даравань. А можа, і дарэмна гэта раблю? Калі падумаць, дык я й не вінаваты. Больш за ўсё вінаватыя ў маім даўгім маўчанні розныя прычыны, што апошнім часам так непамысна склаліся. Аб самых галоўных прычынах я не буду нічога пісаць, бо калі ўспамінаю пра іх, дык балюча робіцца на сэрцы. Лепш перайду да іншае тэмы.

Уладзімір Глыбінны напісаў пра тваю творчасць вялікі артыкул. Я чытаў яго. Ён, напэўна, бліжэйшымі днямі будзе пасланы табе і аддадзены ў друк або для нашага часапісу, або для часапісу «Узвышша». Дакладна не ведаю.

Мне казалі ў рэдакцыі, што ты ў маю адсутнасць прыслаў для нашага часапісу два вершы. Адзін з іх не прапусціла цэнзура (цэнзар выдумаў нейкую двухсэнсавасць, а пераканаць яго, што ён памыляецца, не было каму), а другі верш карэктар недзе згубіў; я ператрос усе паперы і не знайшоў. Замест згубленага верша я даў у 8-ы нумар часапісу верш «Адзінства хараства». Прабач, калі ласка, за тое, што так здарылася.

Толькі ўчора я змог здаць у друкарню свой зборнік лірыкі. Цэлы месяц я адседзеў у Менску, пакуль атрымаў цэнзурны дазвол, заказ у друкарню і заказ на паперу. Заказ на паперу ў Райхскамісарыят атрымаў у Менску ў дваццатых чыслах сакавіка, а дазвол на паперу ад Райхскамісарыяту змог атрымаць толькі 11 траўня. А рыжскія друкарні не бяруць заказаў на друкі да таго часу, пакуль няма дазволу на паперу. Ужо, здаецца, усе цяжкасці пераможаныя, а ўсё ж не ведаю, калі друкарня аддасць мой зборнік у набор.

Цяпер — яшчэ адна бяда. Дзеля эканоміі паперы тут не згаджаюцца друкаваць кожны верш на асобнай балонцы. Кажуць, што будуць вярстаць усе вершы падрад. Выходзіць, што я дарэмна скарачаў у Менску свой зборнік на 29 вершаў для таго, каб ён меў, паводле патрабавання Сівіцы, не больш 96-ці балонак. Дык жа пры гэткіх умовах вёрсткі і без скарочання зборнік будзе мець нават менш 96-ці балонак!.. На аднаўленне скарочаных вершаў тут не згаджаюцца, кажуць, што зборнік мусіць быць такім, якім ён прыняты ў Менску... Усё ж я буду яшчэ хадацца, каб кожны верш друкаваўся на асобнай балонцы. Можа, што-небудзь і ўдасца. Бяда — кішэні мае апусцелі. А без падмазкі, казаў той, далёка не паедзеш. Цяпер жа — вайна...

А іншыя справы — таксама няважныя. Яшчэ летась я пачаў пісаць невялічкую паэму «Айчына». Не скончыўшы яе, узяўся за новую

паэму «Дзвіна» — і гэтай не скончыў. Перад Новым годам пачаў пісаць белым вершам у пяць стопаў ямбу драму з жыцця беларускай інтэлігенцыі пад назовам «Я хачу жыць». Пачатак пайшоў, здаецца, нядрэнна, але калі я знаходзіўся ў Менску, новая паэма не давала спакою, прасілася на паперу. Давялося пачаць і яе. І сталася так, што мною пачатыя чатыры рэчы, але калі я іх скончу — няведама. Бываюць часіны — прыходзіць настрой пісаць, я бяруся за які-небудзь з пачатых твораў, пішу далей; хочацца выказаць нешта важкае і вялікае. Я адчуваю, што ў мяне не стае сілаў, каб гэтае самае важкае і вялікае перадаць на паперы. Тады я пачынаю крычаць немым голасам на ўвесь свой пакой, і мне здаецца, што ў гэтым крыку я чую тое, што хачу сказаць; на сэрцы робіцца лягчэй. Я хапаюся за пяро і пачынаю пісаць. А праз некаторы час ізноў адбываецца тое самае. Аднойчы ўварваўся ў маю кватэру дворнік, пачаў на мяне лаяцца за тое, што не даю жыхарам усяго дому супакою…

Запраўды, няма збавення. Хай яе пярун спаліць, гэтую Рыгу! Палажэнне такое, як у таго мужыка, які ніяк не мог знайсці сабе месца, каб выстагнацца… Цяпер мне б — на Беларусь, у чыстае поле, або ў асабнячок у Менску, каб не трывожыць суседзяў. А тут дык і вершаў няма мажлівасці позна ўвечары дэклямаваць — суседзям спаць трэба. Бяда — часта я забываюся на гэта…

А з іншага боку — навошта ўсё гэта? Навошта з-за нейкай дурносці мець непрыемнасці? Суседзі пачалі ўважаць мяне за вар'ята. Прыязджала нядаўна гаспадыня і казала: «Я вам советую, Альфред Васильевич, бросить эти глупости — писать стихи, ибо вы скоро сойдёте от них с ума». Хто яго ведае, можа й праўда? Можа, і мае рацыю адзін разумнейшы за мяне чалавек, які неяк сказаў: «Дарэмна, браце, псуеш ты паперу. Пішаш, пішаш, а толку мала. Топчашся і топчашся на адным месцы: асабістыя матывы, мала патрыятызму, мала вобразнасці, мала разнастайнасці тэмаў, вялікі ўплыў Максіма Багдановіча і Масея Сяднёва. Нічога, браце, з цябе не будзе…» А я чалавек нервовы, спачатку агрызнуўся, а цяпер, супакоіўшыся, пачаў раздумваць: можа й праўда?

Вось і адхіліўся я ад сур'ёзных развагаў. Ці не глупства пішу?

Увогуле, жыву я цяпер няважна. Такія-сякія нелады з некаторымі асобамі і шмат, шмат што іншае. Сур'ёзна парашыў кінуць-рынуць усё тут і выехаць неўзабаве ў Менск. Здаецца, згадзіўся б і зборнік свой на волю лёсу пакінуць. Цяпер адна толькі перада мной перашкода — няведама, ці пусцяць адгэтуль.

Дарагі Масей! Я пасылаю табе на добры ўспамін два вершы (з новых). Праўда, у іх мала чаго новага — ранейшыя думкі, але інакш быць не магло: я не здольны станавіцца наўсуперак сваім пачуццям. Магчыма, я знаходжуся ў гэтых вершах пад моцным тваім уплывам, дык ты мне даруй гэта. Іх не варта нідзе друкаваць, хай яны будуць табе на памяць.

Бывай здаровы!

Моцна цісну тваю руку.

З сяброўскім прывітаннем — А. Радзюк.

P. S. Раней быў такі Алесь Салавей. Ён «пописывал стишки, которые можно встретить у каждого гимназиста средних классов. Но он всё-таки отличался от тех гимназистов; гимназисты обычно записывали стишки в тетрадь, а Соловушка их кукарекает, как сова. Говорят, теперь он потерял голос и перестал пугать мир своим неистовым мычанием. Но если это неправда, так советую ему замолчать. Незнакомый и К.».

(Гэта з ліста, дасланага мне нядаўна няведамай асобай.)

Я згаджаюся з думкай няведамага чалавека. Цяпер Алеся Салаўя няма. Ёсць проста Альфрэд Радзюк. А калі ён і піша што-небудзь, дык гэта па старой прывычцы. Запраўды, мне вельмі цяжка забыцца на тое, да чаго я прывыкаю. Раней наша рэдакцыя была ў адным будынку, пасля пераехала ў іншы. Дык я мала не два месяцы, ідучы на працу, падыходзіў, забыўшыся, да ранейшага будынку і толькі там апамятваўся і скіроўваў туды, куды трэба. Пасля ўжо адвык. Гэтак і з вершамі.

Я ўважаю, што ты не забудзешся і на Альфрэда Радзюка. Ён жадае па-ранейшаму падтрымліваць з табою лучнасць.

Чакаю хутчэйшага адказу — *А. Радзюк.*

4. МАСЕЮ СЯДНЁВУ

15 траўня 1944 г., Рыга

Дружа мой!

Сяння ў мяне было вельмі прыемнае спатканне з надзвычайна інтэлігентнай і сімпатычнай асобай. Гэта асоба — старэйшы латышскі літаратар і паэта, чалавек вялікай культуры. Знаходзячыся пад абладаю гэтага спаткання й гутаркі, я цяпер думаю: чаму

ў шмат якіх нашых літаратараў, сяброў пяра, не стае тых якасцяў, якія можна заўважыць у літаратараў іншых краінаў? Чаму ў нас яшчэ да гэтага часу існуе бескультурная, нявартая ніякай пахвалы прывычка адзін аднаго падкусіць, пакпіць нават са свайго найлепшага сябра? Чаму, калі чалавек патрабуе сур'ёзнай дапамогі або парады, робіцца гэта часамі ў вельмі вострай настырлівасці, у абразлівым тоне, у павярхоўнай, не грунтоўнай, у некультурнай і не свомай інтэлігентнаму чалавеку форме? Чаму той-сёй не хоча зразумець, што доказамі, якія, можа, і маюць рацыю, але адначасна і маюць абразлівы тон, нічым не дапаможаш чалавеку, а толькі панурыш яго ў горшае палажэнне?..

20 траўня 1944 г.

Сталася так, што таго дня, калі я пачаў пісаць гэты ліст, закончыць яго не давялося. Цяпер прадаўжаю далей.

22 траўня 1944 г.

Дык вось — далей. Пры спатканні спачатку я адчуваў сябе неяк несамавіта. Сядзеў, апусціўшы галаву ўніз, пазіраў на падлогу. Я нагадваў сабою дзікуна, які ніколі не бачыў людзей. Літаратар пытаўся ў мяне: што здарылася? Я не ў лад адказваў на пытанні, калі-нікалі падымаў свой пагляд на літаратара. Здавалася, ён пранізваў мяне наскрозь, чытаў мяне. Я ізноў апускаў пагляд долу. І літаратар пачаў здагадвацца. І ён, можна сказаць, угадаў усё, што было ў мяне на сэрцы. Мне давялося згадзіцца, што гэта — праўда. Літаратар падняўся з крэсла, пачаў хадзіць па пакоі. Ён сваімі доказамі і прыкладамі, успамінамі са свайго жыцця разагнаў мае нярадасныя думкі, якія сцігавалі мяне на працягу апошніх дзён.

Я вярнуўся дахаты зусім інакшым чалавекам. Узяўся пісаць табе ліст. У той вечар у мяне было шмат думак, якія я хацеў пераказаць у лісце. Але верш, які пачаў наспяваць у маім сэрцы і які я цяпер табе дасылаю, перабіў мае думкі, і я змушаны быў адкласці ліст на другі дзень. Толькі сяння я змог закончыць яго. Але ранейшых думак, якія наспявалі ў пачатку, сяння ніяк не здолеў сабраць.

Ласкава прашу прабачыць мне за мой мінулы ліст. Я цяпер шкадую, што яго пасылаў. Гэта праявы зялёных гадоў, маладосці.

Нядаўна чытаў твой верш «Сябрам». Я ўзрадаваўся гэтаму вершу. Цалкам супадае з маімі думкамі й настроем. І я гэткімі ж словамі

гаварыў сам з сабой. Цяпер ёсць верш, і буду яго дэкламаваць. Моцна цісну тваю руку. Чакаю адказу.

Жыве Беларусь!

Алесь Салавей.

P. S. Нядаўна атрымаў ліст з Менску. У ім — верш нейкага Міколы Валнавога. Гэты верш — эпіграма-пародыя на цябе. Напісаны вельмі гладка. Мы пасмяяліся з гэтага верша, і я яго выкінуў у кошык. Перадрук на ўсякі выпадак захаваў. Калі цікавішся — прышлю ў наступным лісце.

5. МАСЕЮ СЯДНЁВУ

9 чэрвеня 1944 г., Рыга

Дружа мой!

Калі я часам, знаходзячыся ў стане нецвярозага розуму, і паслаў табе вершы «Мой сябра мне сказаў», «Сягаць не раю аж пад неба», «Жыў-быў», «Ізноў я нарадзінаў дзень спаткаў», дык ласкава прашу цябе: дзеля Бога, нідзе іх не друкуй і нікому не паказвай, спалі іх, каб не засталося і следу. Буду табе за гэта вельмі і вельмі ўдзячны. Праўда, вершы «Жыў-быў» ды «Ізноў я нарадзінаў дзень спаткаў» не гэткія ўжо і страшныя, але я ад іх цяпер адмаўляюся. Бяда — я аддаў іх друкаваць у наш часапіс. Цяпер агледзеўся — і схапіўся за галаву. Выкінуць немагчыма — позна, зроблены ўжо цэлафан. Калі ж усіх пералічаных вышэй вершаў я не паслаў табе, дык яшчэ і лепш. Убачыўшы два апошнія ў нашым часапісе, — не чытай.

Адно вельмі добра памятаю: я паслаў табе «І неба ранішнім абмылася дажджом», «Яе чакаў і я» і «Даволі спаць». Ад іх я не адмаўляюся. Але я не меў намеру друкаваць гэтыя вершы ў «Новай дарозе», я проста так сабе іх паслаў табе на памяць. Калі яны не падабаюцца вашаму рэдактару — хай не падабаюцца на здароўе. Я ўжо табе, здаецца, пісаў, што няма тае рэчы на зямлі, якая б усім аднолькава падабалася (вычытаная мною з кніжак «ісціна», з якою ў такіх выпадках даводзіцца згаджацца).

Дзіўная рэч — прачытае што-колечы сп. Езавітаў і кажа, што дрэнна; прачытае спадар Глыбінны і кажа, што добра; прачытае крытык Дуброва з Менску (брат Язэпа Пушчы) і кажа, што так сабе; прачытае Лявон Крывічанін і крычыць: «Лабуда! Далоў!» Каму верыць?

Гэтак і з Масеем Сяднёвым. Крытык Дуброва кажа: «Шкада, што я не атрымліваю «Новай дарогі». А ў рэдакцыі «Беларускай газеты» рэдка калі яе знойдзеш. Давялося мне нядаўна прачытаць тры вершы Масея Сяднёва. Цудоўныя вершы! Калі б я змог яшчэ дзе-колечы прачытаць колькі ягоных вершаў, дык напісаў бы артыкул на цэлых дзевяць падвалаў». Гэтыя словы, мне здаецца, перададзеныя проста з вуснаў Дубровы, бяз зменаў (у мяне часамі вельмі добра працуе памяць і рэдка калі падводзіць). Яны былі сказаныя ў сакавіку 1944 года ў Менску.

Уладзімір Глыбінны кажа: «Калі чытаю вершы Сяднёва, дык запраўды адпачываю. Яны задавальняюць самыя тонкія струны пачуццяў».

Лявон Крывічанін, зрабіўшы паважны выгляд, кажа: «Я ўсё ж такі не памыляюся — у Беларусі на трох чалавек прыпадаюць два паэты. Ха-ха! Ха-ха!» Нездарма нехта Апалінар Чоп напісаў:

Яму паэзія — афіша, ён — каза,
Моль камароўская душу якой абгрызла.
Адзінае магу яму сказаць:
— Калі не поп, дык не ўбірайся ў рызу.

А паэта Уладзімір Дудзіцкі, прачытаўшы што-колечы Масея Сяднёва, круціць носам і нічога не кажа. «Ну як?» — пытаюся ў яго. «Гм… гм…» — і больш ні слова. «Як вершы, чуеш, ці не?» — пытаюся зноў. «Га?.. Ну, вершы — як вершы, але… але…» І больш у яго нічога не выпытаеш. Колькі б ні намагаўся.

Юрка Віцьбіч — не крытык і не паэта — бегае па Культурным згуртаванні і, захлынаючыся ад прыліваў радасці, крычыць: «Идеальные стихи! Замечательные стихи! Моисей Седнёв имеет свой собственный голос. Ни на кого не похож. О нет, он не эпигон!» (Табе, напэўна, ведама — Юрка Віцьбіч гутарыць толькі па-расейску, а піша, безумоўна, па-беларуску.)

А нейкі Алесь Салавей, чытаючы вершы М. Сяднёва, заўсёды падобны на маладога псіха (бо псіхі пераважна, як кажуць, бываюць старымі). Чытае ён кожны верш толькі адзін раз, і то не па-людску, і толькі ад аднаразовага чытання завучвае ўвесь верш на памяць. І гэтак усе вершы носіць у сваёй галаве. Іншым разам уначы дэкламуе ўперамешку з вершамі Цютчава. Ягоны сябра-карэктар, які нядаўна пасяліўся з жонкай у суседні ад яго пакой, стукае ў сцяну і крычыць: «Не перашкаджайце спаць!» Шчасце —

гаспадар прыязджае дахаты раз у паўгода, гаспадыня — раз на тры месяцы.

Нешта я збіўся з толку і пачаў адхіляцца ад тэмы. Ага — далей. А Наталля Арсеннева кажа: «Русіцызмы! Няўважлівыя адносіны да мовы! Мала вобразнасці! Звычайныя словы!»

Ізноў — каму ж верыць? Хіба толькі Ф. Цютчаву:

Молчи, скрывайся и таи
И чувства, и мечты свои —
Пускай в душевной глубине
Встают и заходят оне
Безмолвно, как звезды в ночи —
Любуйся ими и молчи.

Как сердцу высказать себя?
Другому как понять тебя?
Поймёт ли он, чем ты живёшь?
Мысль изреченная есть ложь.
Взрывая, возмутишь ключи, —
Питайся ими и молчи.

Лишь жить в себе самом умей —
Есть целый мир в душе твоей
Таинственно-волшебных дум;
Их оглушит наружный шум,
Дневные разгонят лучи, —
Внимай их пенью — и молчи!..

Калі я быў у Вільні, дык дэкламаваў гэты верш аднаму ведамаму, здаецца, беларусу. Я кончыў чытаць, а мой слухач усхапіўся з месца, пачаў бегаць каля стала, замахаў рукамі, ад узнерванасці не мог вымавіць спачатку ніводнага слова. Толькі нейкія невыразныя гукі зрываліся з ягоных вуснаў. «Што здарылася?» — думаў я. Да мамэнту майго дэкламавання мы былі найпрыязнымі людзьмі. Нават колькі кілішкаў выпілі разам. «Але ж мы не ўпіліся, — падумаў я, — і не відаць, каб гэты чалавек быў п'яным». Нарэшце я пачуў: «Ты цяпер чалавек не мой! Ведаць цябе не хачу больш! Толькі гэтыя Пушкіны, Лермантавы й Цютчавы забралі з нашых шэрагаў шмат інтэлігенцыі беларускай. Толькі з-за гэтых Пушкіных і Цютчавых мы ніяк не можам Беларусі пабудаваць! Я здзіўляюся, як можа беларускі інтэлігент,

які нават вершы піша, захапляцца ворагамі нашага сялянскага народа!» (Слова «сялянскага» вымаўлялася з націскам.)

«Прабачце, — запярэчыў я, — я захапляюся не расейскімі ідэямі, а высокай мастацкасцяй у паэзіі расейскіх класікаў, іхнай вялікай культурай. Я з іх бяру прыклад, вучуся ў іх!»

«Няпраўда! У расейскага «Ванькі» ніколі не было ніякай культуры й не будзе! Народ, лепшыя сыны якога кажуць: «Славянские ручьи сольются в русском море», ніколі не можа быць культурным! Трэба захапляцца не «не лукоморьями у дубов зелёных», «не славянскими ручьями», не азіятамі, а еўрапейскай літаратурай!»

«Прабачце, еўрапейскіх класікаў, як Шылера, Гётэ, Байрана, Мальера й іншых, я таксама не цураюся, як і Пушкіна, Лермантава, Фета й Маякоўскага...»

«Маякоўскага?!» — і на твары чалавека з'явіўся жах. Ён зноў не мог вымаўляць словаў. Праз колькі хвілінаў забарабаніў зноў, і я, напружваючы слых, ледзь разбіраў пазбаўленыя выразнасці словы: «Не, цяпер ты зусім не мой! Не мой чалавек! Гэта жах, жах, жах! Ідзі, ідзі да тых, каго Пушкін змусіў адрачыся ад беларускага сялянскага народу, каго змусіў захапляцца «русским дворянством». Ідзі да тых, хто чытае й дэкламуе:

В последнем вкусе туалетом
Заняв ваш любопытный взгляд,
Я мог бы пред учёным светом
Здесь описать его наряд;
Конечно б это было смело,
Описывать моё же дело.
Но панталоны, фрак, жилет,
Всех этих слов на русском нет.

Ха-ха! А дачка кампазітара Галкоўскага нічога не ведае, апрача:

Когда б вы знали, как ужасно
Томиться жаждою любви,
Пылать — и разумом всечасно
Смирять волнение в крови;
Желать обнять у вас колени
И, зарыдав, у ваших ног
Излить мольбы, признаньня, пенье,
Всё, всё, что выразить бы мог.

Хіба яе змогуць крануць такія высокапаэтычныя сялянскія вершы:

Край наш бедны, край наш родны,
Лес, балота ды пясок…
Чуць дзе крыху луг прыгодны,
Хвойнік, мох ды верасок.
А туманы, як пялёнка,
Засцілаюць лес і гай…

Не, гэтыя радкі не крануць яе ніколі, бо яе сапсавалі розныя там Пушкіны! Адзін мой знаёмы звар'яцеў ад гэтых самых Пушкіных. Ягоны бацька — беларус, маці — беларуска, а сам сябе ён уважае за расейца. Хто вінаваты? Пушкіны! Калі кладзецца спаць, ён дэкламуе:

Ах, ножки, ножки! Где вы ныне?
Где мнёте нежные цветы?

А калі прачынаецца ўранні, дык ад яго нічога іншага не пачуеш, апрача:

На берегу пустынных волн
Стоял он, дум великих полн,
И вдаль глядел… И думал он:
Отсель грозить мы будем шведу.
Здесь будет город заложён
Назло надменному соседу.
Природой здесь нам суждено
В Европу прорубить окно.

«Прабачце, — перабіў я, — вы адмаўляеце Пушкіна. Адкуль жа вы ведаеце ягоныя вершы на памяць?»

«Я іх вывучыў не дзеля таго, што імі захапляюся, а дзеля таго, каб імі даваць супраціў русацяпам!»

Я больш не вытрымаў… А што далей было — змоўчу. Гэта нецікава.

Ваш рэдактар ведае гэтага чалавека. Можа, калі-небудзь убачуся з табой і назаву ягонае прозвішча.

Шмат спісаў я паперы і шмат выліў чарніла, а за твой апошні ліст не падзякаваў. Сяння яго прывёз мой гаспадар — спадар Дзямідаў. Шчыры дзякуй табе за ліст. Я заўсёды бываю вельмі задаволеным, калі атрымліваю ад цябе лісты. У тваёй асобе я маю адзінага чалавека, ад якога даводзіцца пачуць ласкавае слова.

Я не ведаю, чаму я такім нарадзіўся на белы свет: словы ласкі — бальзам для маёй душы, яны мяне ажыўляюць і натхняюць. Можа, гэта таму, што…

10 чэрвеня 1944 г.

…я вельмі кволы чалавек. Я не мужны, як іншыя, не станоўкі й не вытрывалы. Я, напэўна, ніколі не змог бы прайсці тых этапаў, якія прайшоў, скажам, ты. Я ведаю: трэба выхоўваць у сабе сілу волі. Але як яе выхаваеш, калі ўся мая істота няздатная да гэтага? А спрабаваў. Я кідаў курыць. Куру з 15-гадовага ўзросту, з тае пары, калі страціў бацькоў. У 1941 годзе, на трэцім месяцы вайны, я колькі часу знаходзіўся ў свайго далёкага сваяка на Койданаўшчыне. «Не патрэбная цяпер мне твая самасейка, — сказаў я сваяку, — буду кідаць курыць». «Пабачым», — пачуў у адказ.

У першы дзень, здаецца, ніякіх праяваў не было. На другі дзень я хадзіў, як мыла з'еўшы. Сваяк ад'язджаў у млын, папрасіў мяне запрэгчы каня. А я ніколі не запрагаў, нават не ведаў, як ускладаць на каня хамут. Сказаць сваяку, што не ўмею, не выпадала — ён бы смяяўся з мяне. І я пайшоў запрагаць. Усклаў хамут, здаецца, правільна. Але вось гэтая дуга, каб на яе немач! Толькі вазьмуся за супоню, крыху пацягну — і дуга перакульваецца праз галаву каня. Ізноў прымацую гужамі дугу да аглобляў, спрабую засупоніць хамут — і зноў адбываецца тое самае. «Ты яшчэ не запрог?» — пачуў раптам голас. «Не», — адказаў я. «Ха-ха-ха! З якога ж боку ты запрагаеш? Як жа ты ўкладаеш дугу ў гужы? Ты мо п'яны?» — «Не п'яны, а дурны! Разумееш? Дурны! Паспрабуй сам два дні не пакурыць, дык і ты каня не запражэш! І ў цябе ўсё наадварот будзе выходзіць!» — «Ха-ха-ха! Я ж казаў, што не жартачкі — кінуць курыць».

А ў другую ноч я не змог заснуць ні на часіну. На трэцюю ноч, змучаны бяссонніцаю, здаецца, крыху задрамаў. Пасля ўсхапіўся з ложка, пабег на кухню, запаліў газніцу, сеў на лаву й пачаў абіраць бульбу. «Што ты робіш?» — пачуў спалоханы голас гаспадыні…

«Можа, я лунацік?» — падумалася мне. Але ж месяца ў гэтыя ночы не было. Мае думкі развеяў сваяк. Падышоў і падаў капшук з табакаю: «На, закуры…» І я закурыў. Адразу пасвятлела ў вачах, і іншы свет паўстаў перада мною. Палягчэла на сэрцы.

Другі раз я кідаў курыць у канцы 1942 года, будучы ўжо ў Рызе. Дактары катэгарычна забаранілі мне курыць і піць гарэлку. Я цвёрда пастанавіў: ні адной папяросы ў зубы, ніводнага глытка гарэлкі ў рот!

А тым часам, калі я знаходзіўся паблізу людзей, якія курылі, дык прагавіта ўдыхаў водар табачнага дыму, мае рукі трэсліся, як у старца, на вачах выступалі слёзы. Калі знаходзіўся ў рэстаране, а паблізу хто-небудзь выпіваў, нос мой ужо так свярбеў, ажно слюнкі цяклі.

Я не мог працаваць — галава адмаўлялася думаць, літары скакалі перад маімі вачамі, стук пісальнай машынкі змушаў мяне скрыгатаць зубамі, найменшы пабочны гук даводзіў мяне да шаленства. Я не размаўляў з людзьмі, а агрызаўся, як паранены звер.

А ў адну ноч (ведама ж, бяссонную) пад маім ложкам пачалі пішчаць пацукі. Я ўсхапіўся, запаліў святло, схапіў чаравік, перакуліў ложак — і велізарны пацук прабег каля маіх ног. Я шпурнуў чаравікам, не патрапіў, а пацук знік у шчыліне паміж сцяной і печчу. Да болю я дзёр кіпцюрамі печ, рад быў бы яе ў гэты мамэнт разбурыць, але — не ставала сілаў…

Я не жыў, а мучыўся. Давялося адрачыся ад сваіх пастановаў. Курыць я не кінуў, а гарэлку мой арганізм з радасцяй прымае і да сянняшняга дня.

Вось каб пажыў з год у тым месцы, дзе не п'юць і не кураць, скажам, у турме, дык там змог бы адвыкнуць, і нічога са мной не сталася б.

Прабач мне, дарагі Масей! Ізноў я распісаўся. Залез у нейкую дурніну. Дзякаваў табе за ліст, а цяпер вунь куды залез.

Я падобны на трохгадовае дзіця. Калі хто-небудзь выпадкова загаворыць да мяне павышаным тонам, адразу нейкі цяжар сціскае мае грудзі, камяк — у горле, я адчуваю ў сабе пусціню. Тады я раблюся маўклівым, незгаворным, галаву апускаю долу. Часта пры сустрэчах з сябрамі я не паказваю выгляду, што хто-небудзь мяне пакрыўдзіў, бо крыўдзіцца, фактычна, няма на што, але сяджу, як вады ў рот набраўшы. Мяне не разумеюць: «Чаго нос павесіў? Трэба быць вясёлым, жыццярадасным! А ты?»

А я яшчэ ніжэй апускаю голаў. Уладзімір Дудзіцкі, калі я быў у Менску, сказаў і такое: «Я турмы прайшоў, этапы прайшоў, а носа не вешаў і не павешу. Ты нічога не бачыў, нічога не перанёс, а ўдаешся ў роспач! Арыгінальнічаеш! Глядзеце на мяне — я паэта, а таму не такі, як усе іншыя! Дык ты арыгінальнічай перад тымі, хто цябе не ведае, я цябе даўно разгадаў!»

І запраўды, ад усіх заўсёды я чую амаль тое самае: «Арыгінальнічаеш!»

А мне ніколі гэта не прыходзіла і не прыходзіць у галаву. Ні аб якіх арыгінальствах я ніколі не думаў і не думаю. І два гады таму я быў гэткім самым чалавекам. І нікому тады сваіх вершаў не паказваў і ні ад кога не чуў: «Арыгінальнічаеш!» Выходзіць, ва ўсім вінаватыя вершы.

Адзін Лявон Случанін даў мне беспамылковую ацэну: «Барышня! Цямця-лямця! Меланхолік!»

Я не пакрыўдзіўся. Хоць адзін чалавек сказаў больш-менш правільна.

Хіба не барышня? Вось у тваім лісце прачытаю ласкавае слова — і ўсмешка з'явіцца на маім твары, і тады я гаваркі, вясёлы, нават без гарэлкі. Магу гаварыць і жартаваць да таго часу, пакуль мне не скажуць: «Досыць! Абрыдзела!» І ад гэтых словаў прападае мая вясёласць, і я набываю выгляд, апісаны вышэй. Толькі гарэлка робіць мяне інакшым. Тады я хоць і мала гавару, але вясёлы, тады калі і пакрыўдзіць мяне хто, дык не змаўчу. А пасля, калі працверажуся, бяру назад свае словы. Адзінае ў мяне нязменнае — гэта ўпартасць. Часамі стрэліць у галаву думка: не гаварыць нічога пра тое і тое. Тады хай мяне рэжуць, хай б'юць — не скажу ні слова.

Вось толькі цяпер, пішучы ліст, я ўспамінаю, якім я часта бываю. Я добра ведаю, што вельмі дрэнна быць такім чалавекам. Але накшталтныя думкі ў маю галаву не прыходзяць тады, калі я бываю такім.

Я ніколі нікому не апавядаў так шмат аб сваіх недахопах. Нават найбліжэйшы мне чалавек Уладзімір Глыбінны добра мяне не ведае. Ты — першы чалавек, перад якім я так адкрыты. Запраўды, форма звароту на «ты», твая прастата і прыхільнасць развязалі мой язык. Пішучы лісты ў афіцыйным тоне, я ніколі не змог бы быць такім шчырым. Я тады пісаў бы пра грамадскія справы, не панураўся б у сваё асабістае. Быў бы не «раднёй», аб якой ты пісаў, а чэрствай і халоднай істотай. А часам хочацца забыцца на штодзённае і цалкам аддацца самому сабе. Нічога, крыху падрасту, падвучуся і пасля напішу аповесць, высмеяўшы гэткага тыпа, як я, які і граша не варты.

Ты нікому нічога пра мяне не кажы. Пакуль што я веру толькі табе аднаму. Не варта чытаць маіх лістоў іншым — тады на свеце будзе менш людзей, якія з мяне смяюцца.

Я здзіўляюся, чаму вашаму рэдактару не падабаюцца мае вершы «І неба ранішнім абмылася дажджом», «Яе чакаў і я», «Даволі

спаць»? Я ўважаў, што гэта — найлепшыя мае вершы. Мне здавалася, што ў іх упершыню бліснула мікраскапічная іскарка майго ўласнага «я», пазбаўленага эпігонства. Цяпер мае думкі развейваюцца.

Наагул, мне здаецца, што калі б я паслаў у «Новую дарогу» свае пазалеташнія, спаленыя ў печы, вершы «Над калыскай», «То не сокал раным-рана», дык яны спадабаліся б вашаму рэдактару.

Між іншым — я вялікі прыхільнік ягоных вершаў. Яшчэ ў 1942 годзе, едучы праз Вільню ў Рыгу, я заўважыў два зборнікі Хведара Ільяшэвіча. Тады ў Вільні я прачытаў колькі ягоных вершаў, але набыць зборнікаў не давялося. Яшчэ тады я зацікавіўся арыгінальнымі, своеасаблівымі вершамі Ільяшэвіча, не падобнымі на творы другіх паэтаў. У іх былі трапная вобразнасць, мастацкасць і культура.

11 чэрвеня 1944 г.

А ад брашуры «Друкарня Мамонічаў» я быў у захапленні. Надзвычайна сур'ёзны і разумны твор!

Нядаўна адзін рыжскі беларус дыў мне пачытаць зборнічкі Хведара Ільяшэвіча і часапіс «Калоссе». Вершы я не толькі чытаў, але і перачытваў. Глыбака запалі ў памяць радкі:

Паплыву ў хвалях шуму з-пад палёў беластоцкіх
Да дняпроўскіх лугоў і да слуцкіх пшаніц.
Мо мне вецер раскажа, як у гэтых зарэччах
Рассыпаў нехта слёзы і ў змрок галасіў.
Мне так часта здаецца ў жаўцеючы вечар,
Што каменні на полі — гэта жнеі без сіл.
Расплялiся іх косы і апалі прыгожа,
Вецер з рук абамлелых не развеяў ім сны.
І яшчэ заміраe спеў працяжны на пожні
З тых гадоў, калі ў жыце упалі яны.

Цудоўна! Тут няма зрыфмаванага набору словаў, затуманеных штучна створанымі вобразамі. Тут — глыбака пачуццёвыя думкі, трывога за лёс народу, вялікая пашана нашчадкаў да прадзедаў. Гэта — жыццё, якое кранае сэрца жывога чалавека, якое змушае яго не быць бясклапотным і падумаць, дзе і для чаго ён жыве. І мне здаецца, што Хведар Ільяшэвіч пасля Танка — другая паводле сілы велічыня сярод паэтаў Заходняй Беларусі. Па-мойму, Ільяшэвіч перарос і Арсенневу, і Машару, а пра Іверса, Васілька і Хмару не варта і ўспамінаць.

Параўноўваючы моўныя асаблівасці вершаў Ільяшэвіча з асаблівасцямі празаічных твораў у «Калоссі» і артыкулаў у «Новай дарозе» М. Дальнага, я пераканаўся, што Дальны — гэта Ільяшэвіч. Калісьці я чытаў артыкул у абарону маладых паэтаў, і мне ніяк не верылася, што яго напісаў Ільяшэвіч. А прачытаўшы артыкул «На новай хвалі» пра паэзію Арсенневай, я зусім расчараваўся ў М. Дальным. Чытаў я гэты артыкул, як і ўсе, зверху ўніз, але да толку дайсці не змог. У пачатку гаворыцца пра адно, у сярэдзіне — пра супрацьлеглае, а ў канцы — супрацьлеглае і сярэдзіне, і пачатку. «Перад ёй адчыняецца новая багатая крыніца творчасці — сацыяльнасць.» Што гэта? Не разумею. У адным месцы Арсеннева плыве на новай хвалі, а ў другім — спрабуе плысці. І меркаванні аб колішняй пяснярцы чыстае красы нешта не вяжуцца.

Але навошта я пачаў выказваць свае беспадстаўныя погляды аб крытыцы? Ды яшчэ ў лісце! Прабач, дарагі Масей!

12 чэрвеня 1944 г.

Я маю вялікае жаданне набыць зборнікі вершаў Хведара Ільяшэвіча. У Вільні не мог трапіць у кнігарню Станкевіча: то яна была зачыненая, то ў мяне не было часу, то іншыя прычыны перашкодзілі. А даводзілася чуць, што ў кнігарні Станкевіча гэтыя зборнікі ёсць. Не ведаю, калі мне зноў давядзецца быць у Вільні. А тым часам, можа, з Беластока можна было б выпісаць гэтыя зборнікі?

Я ўжо паміраўся з усімі і зноў вяду нармальны кшталт жыцця.

Учора прагульваўся ў горадзе. Было не асабліва горача, але ад сонца ў мяне пачала кружыцца галава, зрабілася нядобра. Ледзь жывы дабраўся дахаты. Прагавіта ўдыхаў паветра, але чамусьці мне яго не ставала; я адчыніў вакно, высунуў галаву на двор — усё адно не ставала. Гаспадыня дала панюхаць нейкіх кропель — тады палепшала. І што такое — сам не ведаю. Такіх выпадкаў ужо больш за год у мяне не было.

Пад вечар узяўся за рукапісы сваіх пачатых вялікіх рэчаў. Узлаваўся на іх — кінуў у печ і спаліў. Толькі пачатак паэмы «Айчына» пакінуў. А пасля зрабілася шкада спаленага. Цэлую ноч праз гэта мучыўся — не мог заснуць і на часіну.

Ці закончу калі-небудзь паэму «Айчына» — не ведаю. Цяпер лета — спецыяльна пісаць не прыходзіць натхненне. Калі іду на працу ці знаходжуся ў страўні, часам з'явіцца ў галаве колькі новых

радкоў — запішу. Чытаю назаўтра — не падабаецца, знішчаю, і гэтак справа наперад не пасоўваецца. А тады нешта новае, не вершы, а штосьці невыразнае, несфармаванае, лезе ў галаву, не дае супакою. Хацеў на два тыдні забыцца на ўсё, адпачыць — няма рады. Калі да мяне звяртаюцца, мала назваць маё імя ці прозвішча два ці чатыры разы — трэба падысці і крануць мяне, тады толькі я пачую.

Ты толькі не падумай, дарагі Масей, што ўважаю сябе за генія, за паэту. Часта ад узнерваванасці я бываю горшым за п'янага, а выпіўшы колькі кілішкаў гарэлкі, магу за тры гадзіны нага́сіць цэлую паэму. Каб мяне так натхняла жыццё сваёй цвярозасцяй, як гарэлка нецвярозасцяй, дык праз дзесяць гадоў, магчыма, і быў бы з мяне такі-сякі паэта.

Сяння аднаўляў у памяці спалены рукапіс пачатай драмы. Нічога не атрымалася — свае рэчы я так не запамінаю, як чужыя. Зборнік мой ужо набраны, звярстаны і пракарэктаваны. У канцы гэтага тыдня будзе друкавацца, у пачатку наступнага — трапіць у пераплётную. Можа, паспее выйсці ў свет.

Калі рабіў карэктуру, дык расчароўваўся ў сваім зборніку. Нішто мне не падабаецца, усё здаецца бязвартасным, мізэрным і нікчэмным. А раней так хваляваўся за лёс кніжкі, перажываў. Для чаго ўсё гэта было?

А як з тваімі зборнікамі? У 9-ы нумар часапісу я даў інфармацыю, што хутка выйдуць. Справа з выхадам нашага часапісу — няважная. Яшчэ 8-ы, красавіцкі, нумар ляжыць у друкарні. Віна не наша. Друкарні занятыя для вайсковых мэтаў. Ужо шмат нумароў падрыхтавана да друку, і яны чакаюць у друкарні.

Я аддаў у набор для чарговых нумароў твае вершы «На хутары» і «Жыццё». У 15-м нумары «Новага шляху» пачнём друкаваць артыкул Ул. Глыбіннага «Лірычнае адтварэнне перажытага». Калі маеш вялікую і выразную фатаграфію, прышлі, дамо цябе ў гэты нумар на вокладку. Я не жартую. Калі які-небудзь актор мае права трапіць да нас на вокладку, дык паэта мае на гэта яшчэ больш правоў.

Прабач мне, што адрываю цябе гэтым лістом ад працы. У мяне з'явілася ахвота пагутарыць. Бо з людзьмі сустракаюся рэдка, заўсёды — адзін, як Лявон Бушмар. Той, праўда, быў ваўком, а я — ваўчаня.

Моцна цісну тваю руку! Бывай!

З паважаннем — твой *Алесь*.

6. МАСЕЮ СЯДНЁВУ

[1944], Слуцак

Дарагі Масейка!

Ты бачыш, што ў гэтым лісце літары, напісаныя маёй рукой, падобныя на нешта незвычайнае і непрадбачанае. Але ты — свой хлопец і прабачыш мне гэта.

«Родныя, не плачце пры ўспаміне...» На гэтыя радкі я не забудуся ніколі. Тут няма выкрунтасаў накшталт: «Я махнуся чупрынай ў блакіты, адкруціўшыся куляй зямной...» Гэта — модная жаночая шляпка, якая плыве па свеце пэўны перыяд.

Твой *Алесь Салавей.*

7. МАСЕЮ СЯДНЁВУ

14 лістапада 1944 г., Рыга

Дружа мой!

Сяння мы атрымалі 5 экзэмпляраў 6-га нумару «Новае дарогі». Урэшце, я змог прачытаць газету на месцы, не хадзіць да «вялікіх чалавекаў» з паклонамі, не выпрашваць ад «оного высочества» ласкі даць мне пачытаць «Новую дарогу». І гэта, напэўна, дзякуючы табе. Шчыра дзякую і прашу прабачэння за ўчыненыя мною клопаты...

Шчыра дзякую табе за ліст, за фатаграфію. Пры надрукаванні ў «Новым шляху» артыкула пра цябе выкарыстаем і фатаграфію.

А ў сваіх вершах ты ўздымаешся вышэй і вышэй... Чытаючы верш «Зманлівасць», я страціў раўнавагу, ускочыў на стол, голасна зачытаў на ўвесь рэдакцыйны пакой. Шкада, што каля мяне не было каралеўны, а толькі... калега-карэктар. І, дзівак, падумаў, што я звар'яцеў. (Ён у нас працуе не так даўно, добра мяне яшчэ не ведае.) А можа, ён і не памыліўся... Часамі мне здаецца, што я запраўды чалавек ненармальны. Нармальныя людзі заўсёды застаюцца нармальнымі...

І, ведаеш, неяк не хочацца верыць, што гэтыя вершы пісаліся колькі год таму. Каб яны былі напісаныя на катарзе або ў турме мікалаеўскіх часоў (хоць і не жыў тады, але мне апавядалі), дык я тады б даў веры. А вось як можна напісаць такія вершы на савецкай катарзе — я ніяк не магу ўявіць. Мне здаецца, што яны пісаліся цяпер. І кожны новы верш — усё новыя й новыя поступы наперад, незалежна ад таго, якая

стаіць пад вершам дата. Гэта сведчыць аб велізарным творчым росце — не па днях, а па гадзінах.

Я вельмі рад падтрымліваць лучнасць з чалавекам, які піша гэткія цудоўныя вершы. Гэта кажу я шчыра, ад чыстага сэрца, без ніякіх намераў трапіць у ласку. Я ніколі не крывіў душой і не збіраюся крывіць. Пасля тваіх вершаў я адчуваю сябе мізэрненькім вершаплёцікам, і ў мяне пачынаюць з'яўляцца думкі, ці не надакучаю я табе і ці добра, што я звяртаюся такім тонам, хоць ты нічога супроць не маеш у апошнім лісце.

Ты пытаешся — адкуль я паходжу? Што ж — будзем заводзіць больш шчыльнейшае знаёмства.

Я з'явіўся на свет 1-га траўня 1922 года ў вёсцы Крысава, у 7-мі кіламетрах ад Койданава, у 33-х кіламетрах ад Менску. На вёсцы давялося жыць толькі да аднагадовага ўзросту. Потым лёс кідаў мяне, спачатку з бацькамі, а пазней і аднаго, па розных мястэчках і гарадох Беларусі. Бацька мой — спачатку земляроб, потым — інтэлігент. У 1929 годзе атрымаў вышэйшую сельскагаспадарскую асвету. У 1938 годзе памёр у менскай турме. Маці ў гэтым жа годзе была асуджаная і высланая на 10 гадоў у Нова-Сібірскую акругу. Не ведаю, што з ёй цяпер, але, напэўна, не жыве, бо мела вельмі дрэннае здароўе.

А я — іхны старэйшы сын. Сын «ворагаў народу»... Маю незакончаную сярэднюю асвету.

Ты памыляешся — я не моцна складзены. Рост мой — ніжэйшы сярэдняга. Сам я — тонкі, як цвік, крыху гарбаваты. Можна лёгка ўзяць мяне аднэй рукой, як матыля, і не толькі мой верш, але і мяне самога бяз цяжкасцяў выкінуць у кошык.

Здароўе... Здаецца, увогуле нядрэннае. Толькі вельмі слабое сэрца. Не магу нармальна ўзняцца на трэці паверх. Не магу мыцца ў лазні, не магу хутка хадзіць. Ледзь не так дыхне на мяне вецер — і даводзіцца пасля адлежвацца ў пасцелі. Але я на гэта мала бяру ўвагі. Нядаўна мне давялося чуць, што людзі з хворым сэрцам вельмі жывучыя. Як каты...

Гэта табе, відавочна, нецікава... Дык ласкава прашу прабачыць.

Колькі дзён таму вярнуўся з Менску наш галоўны рэдактар. Блізу два месяцы быў ён там. Мне аднаму тут было цяжкавата. Дзеля гэтага другі і трэці нумар выходзяць са спазненнем. Са спазненнем быў выпушчаны і першы нумар. Другі нумар сяння друкуецца. Заўтра вышлю. Там зьмешчаны твой верш «Дзяцінства». (Дарэчы, па-мойму, лепш было б «Мален-

ства»; дзяцінства бывае ў старасці, калі чалавек дзяціняе. І чаму «ўзнаў», а не «пазнаў»? Прашу прабачыць за гэту заўвагу.) У трэцім нумары будзе надрукаваны «Домік у Менску». У чацвёрты нумар пастараюся даць верш «Маім бацькам», у пяты — «Зманлівасць».

Я прашу прабачыць мне за гэткую хаатычнасць майго ліста, за ягоную несур'ёзнасць. Нешта не клеюцца думкі. Дрэнны настрой. Віна ўсяму гэтаму — «Уражанні», «Дарога на Парнас», якія кагадзе давялося прачытаць у «Новай дарозе». Здзіўляюся, як жа ў газеце, якую выпускаюць літаратары, і нядрэнныя літаратары, магла з'явіцца такая бесталковая, неразумная рэч. Горшай дурніны (прабач, калі ласка), мабыць, нідзе нельга знайсці. З такой некультурнасцяй (апрача дурніны) варта было б Чаславу Будзьку не вылазіць з «зажабленага балота» на пасмешышча людское. Запраўды, ніяк, ну ніяк не магу ўявіць, як да старонак газеты магло быць дапушчанае жабінае кваканне... Жаба горш усякай скаціны. (Сам ён бесталковая скаціна!)...Прашу дараваць за лаянку. Але, мне здаецца, ты разумееш, што мне ад гэтага лягчэй...

Артыкул М. Дальнага ў абарону маладых паэтаў — кашаль для хворага чалавека. «Раніца» вельмі добра зрабіла і вельмі правільна.

Ад чалавека, які мае дараванне, толькі і трэба вымагаць і вымагаць. Ніякія «аглоблі» і ніякія каменні не заглушаць такога чалавека, а яшчэ больш загартуюць яго, гэтым самым дапамогуць яму праз усе цяжкасці выбіцца, казаў той, у людзі. Калі ж той, хто не мае даравання, і спалохаецца «аглоблі», дык не шкода. Усё адно з яго нічога не выйдзе. А розныя «абароны» на ягоны адрас даюць яму падставы думаць, што ён усё ж, казаў той, не лыкам шыты. І што горш усяго, такія абароны робяць маладога паэту вечным калекам. Толькі суровае вымаганне і бязлітасная крытыка могуць дапамагчы паэту, які не мае апоры пад нагамі, знайсці яе.

Не дай Божа стаць за лекара чалавеку, які знойдзе на дарозе паўвоза лекаў. «Такія дактары вымуць душу без пары», — справядліва кажа народ. За апошнія словы я цалкам адказваю.

У першых чыслах сакавіка паеду ў Менск. Буду там мала не месяц. Пасля, вяртаючыся назад, затрымаюся крыху ў Вільні.

На гэтым я і кончу. Няма часу больш пісаць.

Рэдакцыя чакае ад цябе новых вершаў.

Жадаю ўсяго найлепшага!

З прывітаннем — *Алесь Салавей.*

8. УЛАДЗІМІРУ СЯДУРУ і МАСЕЮ СЯДНЁВУ

28 траўня 1946 г., Зальцбург

Дарагі Уладзімір Сядура!

Дарагі Масей Сяднёў!

Атрымаў ад Уладзіміра Сядуры ліст. Шчыра дзякую. Радуюся, што ён жыў і здароў. Як маецца ягоная маці? Уладзік! Апошнім часам я шукаў цябе праз сваіх знаёмых у Брэгенце. Адтуль атрымаў весткі, што ты выехаў у амерыканскую зону Нямеччыны.

Яшчэ з восені мінулага года я таксама думаю пра тое, каб выехаць туды, дзе ёсць больш нашых людзей, скажам, у Рэгенсбург. Але да сянняшняга дня не выехаў толькі таму, што ніяк не выпадае пакідаць без духовай апекі нашых людзей, якія тут ёсць.

Нас разлучае аўстрыйска-нямецкая мяжа. Уяві, што нават нельга прыехаць да вас на колькі дзён. Пропуск у Нямеччыну тут дастаць можна. Але як жа вярнуцца назад? Пра зваротны пропуск няма й гутаркі. Пайсці на іншы шлях, як гэта шмат хто робіць, я не адважваюся.

Усё ж на пераезд я не пакідаю надзеяў. Думаю, што неўзабаве гэта зраблю, калі можна будзе там у вас прапісацца.

Усе вашы новыя выданні я чытаў. Не бачыў толькі часапісу «Шыпшына». Траплялі тыя выданні рознымі шляхамі ад вашых украінцаў да нашых, а з рук апошніх яны выпадкова траплялі і да мяне.

Добрая рэч — тыя часапісы, калі няма нічога лепшага. А няўжо нельга было б выдаваць там у вас тое-сёе ў друкарні? Чаму гэта ўкраінцам удаецца? Яны выдаюць не толькі газеты і часапісы, але і зборнікі вершаў і прозы. Маюць нават свае ўласныя друкарні. Каб было тут гэтулькі людзей, колькі ў вас, каб былі сродкі і агульная дапамога, можна было б тут сёе-тое выдаваць і ў друкарні.

Мы ўжо выдалі два нумары часапісу «Пагоня». Выдаецца цяпер трэці нумар. Выдаем газету «З беларускага жыцця» (на рататары). Першы нумар часапісу атрымаўся смешным. Гімназістыя даўней, напэўна, лепш выдавалі. Надрукаваў я гэты нумар у 25-ці экземплярах на звычайнай пісальнай машынцы. Другі нумар памерам на 32 балонкі быў надрукаваны ўжо так, як і Юркаў часапіс. Але і ён не атрымаўся гэткім, як хацелася. Літары там-сям выйшлі невыразна. Спачатку, добра не валодаючы гэтай справай, я дастаў зусім дрэнныя

матрыцы. Чорт іх ведаў, што яны дрэнныя! Самому ж даводзілася ўсё рабіць, і матрыцы набіваць спачатку я добра не ўмеў. Цяпер ужо навучыўся. Трэці нумар выйдзе з выразнымі літарамі. Газета «З беларускага жыцця» выходзіць з тэхнічнага боку беззаганна.

Цяжка ўсё гэта даецца, але нічога не зробіш. Машынкі няма. Выпрасіш — літараў нашых не хапае. Даводзіцца тыя літары, якіх няма, падстаўляць ад рукі. Ды і пісаць няма каму. Іншая справа — у вас. У вас — цэлая армія пісьменнікаў. З увагі на тое, што часапіс выдаецца адмыслова для таго, каб было што чытаць звычайным простым людзям, мне шмат «дапамагаюць» паважаныя класікі.

Часапіс «Новы шлях» у мяне ёсць. Цяпер я яго ні за якія грошы нікому не дам нават на колькі гадзінаў. Уладзімір Дудзіцкі таксама пакінуў недзе свой камплект, як і ты. А я пранёс яго праз такія перашкоды, якіх, напэўна, ніхто не перажываў. З Вены далей на захад я рухаўся пяшком. Ішоў селавымі дарогамі, бо на галоўных шляхах ужо былі тыя, ад каго я ўцякаў. Але і па селавых дарогах не было ходу. «Тыя» наступалі на пяты — я бег без духоў і памяці.

А заседзеўся я ў Вене, дарэчы сказаць, да самага апошняга толькі праз даверлівасць да латышоў (рыжскіх знаёмых). Яны рознымі спосабамі пераканалі мяне ў тым, што ў Вену прыйдуць амерыканцы. Некалі ў Рызе, седзячы спакойна ля небяспекі пад бокам, яны верылі ў прыход ангельцаў.

У найцяжэйшы мамэнт я нідзе не кінуў часапіса. Як жа ты мог яго пакінуць яшчэ ў Празе? А цяпер ты перасылаеш просьбу: «Перапішы і прышлі». Табе, напэўна, ведама, што паштовыя перасылкі з Аўстрыі ў Нямеччыну цяпер абмежаваныя. Як жа я перашлю твае артыкулы? Як жа я зраблю гэта самае «перапішы»? Хто ж перадрукуе, апрача мяне самога? А дзе ўзяць машынку, калі мне газету выдаць цяжка. Я пішу ў палове ліста, а за спіною стаіць чалавек, хочучы забраць машынку. А каб і была машынка, дык я не ручаюся, што можна было б перапісаць усе 23 артыкулы раней, як за тры месяцы, друкуючы такім тэмпам, як я.

Цяпер я збіраю грошы на куплю машынкі. Калі ўдасца гэта зрабіць, дык я тады тое-сёе перапішу і перашлю праз каго-небудзь. А ўсё астатняе перапішам тады, калі спаткаемся.

Артыкулы «Залаты век», «Беларуская мова ў гісторыі Беларусі» і «Жыве Беларусь» надрукую ў сваім часапісе «Пагоня».

Усякія меркаваныя намі выезды ад нас не залежаць. А як кранемся з месца — я заўсёды буду імкнуцца туды, дзе больш нашых людзей.

Цалкам падрыхтаваныя да друку мае зборнікі лірыкі «Сіла гневу» і «Вянкі». Першы — на 8 друкаваных аркушаў, другі — на 6 (такі ж памер, як і ў «Маіх песнях»). Галоўныя матывы зборніка «Сіла гневу» — Бацькаўшчына і народ, мінулае, сучаснае і будучае, знішчальная сіла вайны, неўміручасць чалавека — гаспадара зямлі, неўміручасць крывіцкага роду і Крыўі-Беларусі. У зборніку «Вянкі» — 38 вершаў пра каханне і маладосць, пра жанчыну-маці, ейную глыбокую любоў да дзіцяці і ейнае вялікае сэрца, тры вянкі санетаў пра неўміручасць красы і хараства, спаленая ў Рызе і адноўленая тут паэма «Домік у Менску», паэма «Сын». У абодва зборнікі ўвайшлі паводле тэматыкі і тыя раннія вершы, якія я ўлучаў у зборнік «Мае песні», але зняў пазней з прычыны недахопу месца (самі ведаеце — памер «Маіх песняў» быў абмежаваны). Пазней, калі буду жывы і ўдасца выдаць усе зборнікі, я аб'ядНаю іх у адну вялікую кнігу пад назовам «Мае песні» з трыма часткамі: «Мае песні», «Сіла гневу» і «Вянкі». Можа, цяпер трохі смешна гаварыць пра будучыя планы, але калі жывеш якімі-небудзь меркаваннямі — тады лягчэй на сэрцы.

Трэба шчыра прызнацца, што пасля заканчэння вайны я ўвесь час працую, як чорны вол. Цяпер пішу празаічную аповесць «Пад нагамі гарыць зямля». Каб не жыў далёка ад сваіх, не напісаў бы таго, што напісаў. Я не маю ахвоты выдаваць зборнікі на рататары. Рататарнае выданне зніжае вартасць кніжкі. Не губляю надзеі на тое, што пашчасціць выдаць мае зборнікі і ў друкарні.

У мяне ўжо ёсць сын. Ягонае імя — Міхась. Хутка споўніцца два месяцы. Вядомая рэч, за здароўе новага чалавека ў беларускай сям'і выпілі нядрэнна. Справілі такія хрэсьбіны, што палова гасцей засталася там, дзе і піла, а другая палова папаўзла ракам дахаты. Потым цэлы тыдзень пахмяляліся…

У нашай гаспадарцы ёсць і кот. Называем яго Моська.

Уладзімір Дудзіцкі адрокся ад сваіх ранейшых перакананняў яшчэ пры капітуляцыі. Знайшоў цікавую «мадмуазель» і цяпер зрабіўся такім, што і не пазнаць. Дарэчы, ён узначальвае тут усіх нас.

З вядомых беларусаў ёсць тут і Аляксей Грыцук. Ён шмат дапамагае ў выдавецкай справе.

Днямі паедуць ад нас хлопцы ў Нямеччыну. Тое-сёе з навінаў яны вам прывязуць.

Праз Мюнхенскі універсітэт УНРРА можна дастаць пропуск у Аўстрыю. Хай хто-небудзь прыедзе сюды да нас на пару дзён.

29 траўня 1946 г.

Масей! Чытай гэты ліст. Ён напісаны і да цябе.

Уладзік! Нядаўна я гутарыў з адным хлопцам — братам М. Ганько. Ён згадзіўся перапісаць твае артыкулы ад рукі. Калі яго наша табарнае начальства вызваліць ад чорнай працы, праз два месяцы ён перапіша 23 артыкулы, і я пастараюся іх табе пераслаць.

Моцна цісну вашыя рукі. Прывітанні ўсім сябрам і знаёмым.

Гарачае прывітанне Юрку Віцьбічу.

З паважаннем — *Алесь Салавей.*

9. ЮРКУ ВІЦЬБІЧУ

21 верасня 1946 г.

Вельміпаважаны Юры Аляксандравіч!

Не вытрываў я, каб не напісаць Вам колькі словаў. Яшчэ летась, увосень я пісаў да Вас ліст. Паслаў яго, але адказу не атрымаў. Пэўна, той ліст не трапіў у Вашыя рукі (*частку ліста прачытаць немагчыма. — М. С.*). Пасля капітуляцыі я, як і многія, узяўся за працу. Шмат чаго напісаў у апошні час. Пры наступнай нагодзе ўсё новае перашлю, бо ў папярэдні раз не змог шмат перапісаць. Калі пасылаць, дык пасылаць у акуратным выглядзе, а не абы-як. А шмат што даводзіцца перарабляць, папраўляць, знішчаць і пісаць нанова, бо шмат чым я зусім не задаволены. Учора падабалася, а сяння — не. Хіба ўсё напісанае ў найгоршых, безнадзейных абставінах можа быць такім, якім яго можна было б напісаць на радзіме, у сваёй дзяржаве? Дзе цяпер гэта надрукуеш? Чым падтрымаеш сваё існаванне, не ствараючы новых рэчаў?

А ў думках паўстае шмат новых тэмаў. І прыходзіш адначасна да пераканання, што так, як трэба, не напішаш, бо даводзіцца шмат сілаў затраціць на змаганне за штодзённы кавалак хлеба, на розныя, хай сабе і патрэбныя, драбніцы, што абмяжоўваюць і адбіраюць зашмат каштоўнага часу. Адчуваеш нікчэмнасць творства нашага народа, які не можа цяпер даць таго, што змог бы даць ён у сваёй дзяржа-

ве. Пераконваешся, што за межамі сваёй Бацькаўшчыны і дзяржавы ты сяння — нуль.

А што чакае наперадзе? Хіба пражывеш на чужыне, працуючы на літаратурнай ніве? Здабываючы (*неразборл. — М. С.*), выглядаючы ў вачах гэтага чалавека нікчэмнай істотай (*неразборл. — М. С.*). І яму не абыходзіць тое, што ты нешта творыш. Не, ён не дапаможа табе! Кідай, брат, пяро і паперу ды бярыся за лапату!.. Добра, можна і ўзяцца. Гэта нястрашна. Але гэтай лапатай ты працуеш толькі на свой жывот і гнеш спіну на якога-небудзь аўстрыяка. А дзе ж тая ахвярнасць для народу і радзімы, пра якую ты так марыў?

Гэта, дарэчы, старая песня. Прабачце, дарагі дзядзька Юры, за тое, што надакучаю Вам такою няноваю слязлівасцяй. Але я не прывык крывіць душой. Можа, заўтра ў мяне быў бы іншы настрой, можа, іншае было б у мяне на сэрцы, — іншым быў бы і ліст. Пра што я сяння якраз думаў, пра тое і напісаў. А можа ўсё гэта — не слязлівасць, а шчырыя словы чалавека, які хоча гаварыць? І не абы-як, а пасапраўднаму, які хоча паставіць творства вышэй усякіх драбніцаў, а яму сяняшнія праклятыя абставіны звязваюць рукі і не даюць належна здзейсніць ягоных планаў…

Не заўсёды так бывае, дзядзька Юры. Часам блісне іскра надзеі, і тады — дай Божа лёгкасці пяру і сілу духу! Але ўсё адно не выходзіць так, як хочаш. Ужо два месяцы праўлю і перарабляю напісаны яшчэ ўвесну верш «Звіняць званы Святой Сафіі» (тэму навеяў мне Ваш часапіс). Хочацца, каб верш сапраўды звінеў, як тыя званы. Зрабіў колькі рэдакцыяў гэтага верша, і ніводная не падабаецца. Сяння рашыў на апошняй рэдакцыі паставіць кропку. Хай будзе так, як выйшла.

Паважна думаю выдаць усё ж такі на ратататары свой зборнік «Сіла гневу». Гэта выданне, ведамая рэч, не перашкодзіць пры першай жа магчымасці выдаць зборнік і ў друкарні. А тым часам хай вершы не марнуюцца, хоць 200 экз. хай пабачаць свет. Другая падрыхтаваная да друку кніга — «Вянкі» — можа і пачакаць, бо большая палавіна яе мне ўжо не падабаецца — ёсць мясціны, якія трэба папраўляць.

Ласкава прашу нічога не перадрукоўваць са зборніка «Мае песні» без майго ведама. Такія-сякія радкі ў гэтым зборніку я ўжо паправіў. Можа, дасць Бог выдаць калі-небудзь другое выданне з папраўкамі.

Ужо колькі месяцаў я паважна думаю над тэмай бітвы пад Грунвальдам у 1410 годзе. Буду пісаць вялікую паэму. Вядомая рэч, не Польшча ў хаўрусе з Літвой разбіла крыжакоў, а Літва ў хаўрусе з Поль-

шчай. І не Ягайла меў вырашальнае становішча, а адну з галоўных роляў у перамозе ўзялі смаленскія палкі. Дзякуючы ім, я так уважаю, была наканаваная перамога над крыжакамі ў самы цяжкі мамэнт змагання. Я нідзе не магу патрапіць на сляды фактаў пра смаленскія палкі. Гэтага няма ні ў нашай, ні ў польскай, ні ў украінскай, ні ў нямецкай гісторыях. Нічога вычарпальнага я не знайшоў і ў энцыклапедыях. Паспрабую цяпер шукаць людзей, якія павінны ведаць пра гэта. Можа, дзядзька Антон або «скаўты» ведаюць што-небудзь?

Не дае мне супакою задуманая яшчэ ў Рызе ў 1944 годзе драма на тэму жыцця беларускага інтэлігента, які перамагае ўсе перашкоды на сваім шляху і застаецца моцным і не сапсаваным. Абставіны, праклятыя абставіны звязваюць рукі! Яны не даюць мне пісаць і аповесць у прозе, два раздзелы якой я ўжо напісаў. Тэма — мінулая вайна, знішчэнне людства, імкненне вялікіх народаў падпарадкаваць сабе меншыя народы (*далей нечытэльна. — М. С.*).

10. ВІТАЎТУ ТУМАШУ

4 лістапада 1946 г., Зальцбург

Вельміпаважаны спадару доктару!

Яшчэ адну радасную вестку атрымалі мы ад нашых людзей з Нямеччыны. Гэтай весткай з'явіўся Ваш ліст.

Цешыць нас, што сціплыя вынікі нашае працы трапілі і да Вас. Дзякуем вельмі за добрыя заўвагі й пажаданні.

Нічым іншым, апрача таго, што трапіла да Вас і што Вы бачылі, пахваліцца не можам. Нашых людзей тут вельмі мала, і зрабіць штонебудзь няма ніякае магчымасці. Нават тое, што робім, прыйдзецца неўзабаве спыніць.

Увесь цяжар рэдагавання часапісу «Пагоня», тыднёвіка «З беларускага жыцця» ляжыць на маіх плячах. Выдавецкія справы (машына, пакой для працы, папера, фінансы і пісанне некаторых матэрыялаў) — на плячах А. Грыцука. Прыкладае сваю руку да гэтага і Уладзімер Дудзіцкі. Скажам, адзін з нумароў «З беларускага жыцця», прысвечаны моладзі, выйшаў з ягонае ініцыятывы.

Размяшчэнне матэрыялаў і мастацкае афармленне — мая справа. Што да мастацкага афармлення — тое-сёе ў гэтай справе раблю сам,

а тое-сёе — арганізоўваю. Дапамагае ў гэтым адзін наш чалавек — юрысты Г. Ляўчук, што жыве ў французскай зоне Аўстрыі.

Пра Пятра Мірановіча не маем вестак. Я яго спатыкаў у Вене ў канцы лютага і ў сакавіку 1945 г. Выехаў я з Вены (правільна — выйшаў пешкі) у самы апошні мамэнт. Мірановіч яшчэ заставаўся там. Што з ім цяпер і дзе ён — я нічога не ведаю.

Маё асабістае пажаданне — выбрацца любой цаной з Аўстрыі ў Нямеччыну. Хоць і ў Нямеччыне спаткаюся з перашкодамі на сваім жыццёвым шляху, але разам са сваімі людзьмі, мабыць, лягчэй будзе перамагаць гэтыя перашкоды.

Аб нашым жыцці ў Аўстрыі Вы, напэўна, ведаеце.

Уявіце сабе чалавека, які раней стаяў над людскімі спінамі і падганяў да працы людзей бізуном. І цяпер гэтага чалавека ўважаюць за хаўрусніка, ледзь не за пераможцу і даюць яму поўныя правы, нават апеку над былымі ягонымі рабамі. Бясспрэчна, пасля ўсяго гэтага такі чалавек яшчэ вышэй уздыме бізун над спіною чужаземнага раба. Калі гэта ўявіце — не трэба будзе апісваць аб нашым жыцці.

Вашы часапісы «Шляхам жыцця» і «Скаўт» давялося мне бачыць. «Скаўт» вельмі нестаранна адносіцца да перадруку твораў класікаў і сучасных пісьменнікаў. Скажам, у вершы «Пагоня» М. Багдановіча надрукавана: «Успомню Вострую Браму святую» заміж «Ўспомню Вострую Браму святую»; «у белай пене…» заміж «ў белай пене…»; «рвуцца, імкнуцца…» заміж «рвуцца, мкнуцца…»; «прадалі, аддалі ў палон» заміж «прадалі і аддалі ў палон (і пасля слова «палон» мусіць быць пытальны знак); «не ўсцішыцца гэтакі боль» заміж «не усцішыцца гэтакі боль»; «усё лятуць і лятуць тыя коні» заміж «ўсё лятуць і лятуць тыя коні». Няправільна пастаўленыя і знакі прыпынку…

Моладзь мусіць прывыкаць да акуратнасці. І творы класікаў трэба ёй перадрукоўваць акуратна. Ад такога перадруку верш робіцца рытмічна нявытрыманым, і паэт, каб жыў, за гэта ніколі б не дараваў.

Што да пасылання Вам нашых часапісаў — складаная справа. Ніякія друкі ў Нямеччыну праз пошту не ідуць. Але будзем спадзявацца, што тое-сёе як-небудзь трапіць да Вас.

Прывітанне Хведару Ільяшэвічу. Пішэце, калі ласка. Вашыя лісты будуць радасцю для ўсіх.

З павжаннем — *Алесь Салавей.*

11. МАСЕЮ СЯДНЁВУ

27 лістапада 1946 г.

Дружа мой!

Шчыра дзякую за ўпартае маўчанне.

Можа, слова «крывіч», якое я ўжываў, ужываю і буду ўжываць у сваіх творах, зрабіла цябе маім ворагам? Я не хачу ў гэта верыць, але калі так, дык дзейнічай, браце…

Хутчэй за ўсё, не ты паставіш помнік некаму, а табе паставяць яго...

А я ўсё адно не ведаю і не хачу ведаць пра вашу бязглуздую ўнутраную грызню і не магу адмовіцца ад таго, што я — беларус, нашчадак слаўных крывічоў.

Ты, значыцца, такі сябра: калі табе залежыць, то ты пішаш, а калі не — маўчыш? Балюча пра гэта здагадвацца.

Уяўляю, колькі атрымаў бы я лістоў, каб напісаў нешта падобнае да верша «Дазвольце вам паставіць помнік». Панкоў і я не зношу, але, на жаль, у Аўстрыі іх няма — не было на каго мне абурацца. Наадварот, цяпер мае калегі павар'яцелі і выклікаюць абурэнне горш за тых панкоў.

Усё ж захочаш мне напісаць, але будзе позна…

Чуў я адным вухам, што ты — у актыўных шэрагах адмоўшчыкаў маіх вершаў. Вельмі прыемная вестка… Калі паэцік, які, шчыра кажучы, толькі засмечвае і «Шыпшыну», і «Званы», заяўляе, што мае вершы дрэнныя — гэта адно. А калі такі запраўдны паэта, як Масей Сяднёў — гэта другое.

А рэдактар (гэта да Юркі Віцьбіча) мае, бясспрэчна, права на свой густ, але гэта не павінна перашкаджаць друкаванню вершаў, якія падабаюцца людзям з другімі, можа быць, больш правільнымі густамі. Рэдактарскі густ не павінен абражаць чалавека, які мае права друкавацца з такім жа поспехам, як, скажам, Масей Сяднёў.

Я ведаю, для вас, затуманеных глупствам, прычынай чаго, хутчэй, з'яўляецца дармовы хлеб, на якім вы седзіцё, нічога не значыць, калі адзін літаратар выйдзе з вашых шэрагаў. Вы геніяльныя, вы зможаце абысціся і без яго. І я, калі будзеце так адносіцца да маіх твораў, змагу абысціся без вас.

Днямі, калі цябе цікавіць, выходзіць 4-ы нумар «Пагоні». Змешчаны ў ім і твае творы: «Цень Янкі Купалы» і «Разбітае лётнішча».

Я друкую ўсё добрае, не зважаючы на свой густ.

Цісну руку — *Алесь Салавей.*

12. МАСЕЮ СЯДНЁВУ

29 лістапада 1946 г.

Моська!

Сяння ўначы бачыў я ў сне, што ты здзекваешся з маіх вершаў... Калі гэта праўда, шчыра кажу табе, пакінь здзекі над часткаю маёй крыві. Ты ж запраўдны паэт, мне думаецца, а не палітычная, ё... ў с... курва, або прастафіля.

Заміж нападаў на частку самога сябе вазьміся за вывучэнне тэорыі паэтыкі, якую ты не асабліва добра ведаеш. Добраму паэту не абавязкова ведаць тэорыю паэтыкі, але пры веданні яе добры паэта адрозніць, ці актавай, якой ён зносіць не можа, напісаны верш «Звіняць званы Святой Сафіі», ці звычайным чатырохстопным ямбам, няхай сабе на ўзор актавы, тым ямбам, якім напісаны верш «Домік у Менску», або, скажам, верш «Хусцінкі». А нумарацыя строфаў — прыватная справа аўтара. Ад гэтага верш не траціць сваёй вартасці.

Твае напады на мяне, дружа мой, г... пахнуць. Лепш учытайся і ўдумайся ў тое, на што нападаеш. Так і раней было — спачатку ганіў тое-сёе з маіх твораў, а пазней адстойваў. Зразумела, табе лепш за ўсё спадабаўся б верш пра спадніцу вясковай дзяўчыны. Але мне крыўдна, чаму запраўдны мастак бачыць мастацтва толькі ў спадніцы, а ў фантастычным узлёце да нябёсаў яго не бачыць. Адмова ўзлёту ў неба — гэта толькі тэорыя, а мастацтва ўсё адно застаецца мастацтвам.

Дрэнны мастак Маякоўскі, але добры трыбун, правільна сказаў, што паэтаў шмат патрэбна, але добрых і розных. Меў рацыю хлопец, ё... яго маць!

А ты чаго хочаш ад мяне? Ды каб я пачаў пісаць у тым стылі, у якім пішаш ты, у мяне атрымалася б пародыя. І ў цябе тое самае выйшла б, каб ты пісаў у маім стылі. Дык пішы сабе тое, што хочаш; добра напішаш — ні слова табе не скажу. І я буду пісаць тое, што захачу; дрэнна напішу — лай, але на добрыя рэчы не вылівай гнілой палітычнай малафейкі.

Дай «выцень у мазгаўніцу, каб думніца дайшла да цяму», і зразумей, што я маю такое ж права называць сябе беларусам, нашчадкам крывічоў, як і ты — нашчадкам радзімічаў. Няўжо вы ўсе з глуздоў там з'ехалі з гэтымі самымі крывічамі?

Мне нічога не абходзіць, ці нападае на мяне хто-небудзь, ці не, але калі нападае на мяне частка самога мяне, тады я здымаю штаны і с... на ўсе ейныя творы.

Калі тое, што бачыў я сяння ў сне, — няпраўда, тады я прашу прабачэння за ўсё вышэйсказанае і на гэтым канчаю палеміку.

Застаюся — зацяты беларус, нашчадак слаўных крывічоў, што паходзілі з Полацка, — *Алесь Салавей.*

13. ВІТАЎТУ ТУМАШУ

14 снежня 1946 г., Зальцбург

Вельміпаважаны спадару доктару!

Дзякую шчыра за Ваш ліст. Радуецца сэрца, што наша беларуская справа не замірае, што паводле магчымасцяў робіцца ўсё добрае і карыснае. А што да друкаванага слова, якое штодня ў Вас усё больш гучнее, — гэта вельмі пахвальная з'ява і вялікае дасягненне нашае эміграцыі, хоць, шчыра кажучы, у Баварыі можна было зрабіць больш, як зроблена.

Мне пашчасціла выдаць асобным выданнем у адной друкарні ў Зальцбургу сваю невялічкую паэмку «Звіняць званы Святой Сафіі». Загаловак запазычаны ў Юркі Віцьбіча, таму і паэмка прысвячаецца яму. Каб тут было гэтулькі нашых людзей, колькі ў вас, каб я меў грошы, а гэта магчыма пры агульнай дапамозе і падтрыманні, я, або, інакш кажучы, мы, змаглі б выдаць друкарскім чынам усё, што толькі нам захацелася б, можна было б выдаваць кніжкі, газеты і часапісы, і гэта дорага не каштавала б.

Не раз даводзіцца здзіўляцца, як такая паважная наша эміграцыя ў Баварыі да гэтага часу так і не змагла выдаць нічога саліднага? Няўжо эміграцыйная хвароба, г. зн. сваркі, нашым майстрам пяра даражэй за беларускую справу? Чаму нашым блізкім суседзям розныя сваркі не перашкаджаюць выдаваць у Баварыі дзесяткі часапісаў і кнігаў, і трынаццаць, як мне ведама, вялікіх друкаваных газетаў? Дык хіба нам нельга было выдаць адну, няхай сабе адну, невялічкую друкаваную газету? Пры такім палажэнні нават у бліжэйшыя гады добрая палова нашай эміграцыі страціць сваё нацыянальнае імя, бо нам без добрага друкаванага слова на чужыне — якраз як пчолам без добрай маткі. Можа, я пад уплывам сваіх паэтычных уяваў трошкі і прыўвялічваю. Дык прабачце мне, калі ласка, за гэта.

Я, мабыць, буду мець магчымасць перасляць мала не паўтысячы экземпляраў свайго невялічкага выдання ў Мюнхен. Адтуль яно павінна трапіць і да вас.

Верш Хведара Ільяшэвіча якраз паспеў трапіць у 4-ты нумар нашай «Пагоні». Ён пайшоў на адно з паважных месцаў у часапісе. Мне думаецца, што 4-ты нумар «Пагоні» ў шмат разоў лепшы за папярэдні, 3-ці нумар.

Між іншага, выданне «Скаўцкая інфармацыйная служба», высланае праз пошту, намі атрымана. Дзякуем. Усё тое, што я спрабаваў пасляць вам праз пошту, чамусьці вяртаецца назад. Усё ж яшчэ раз зраблю спробу пераслаць што-небудзь.

Шчыра прызнаюся, мне вельмі цяжка напісаць Вам аб беларускім жыцці ў Аўстрыі, бо, праўдзіва кажучы, няма аб чым пісаць. Адзінае, чым можна пахваліцца, — гэта нашы такія-сякія выданні. У Аўстрыі знаходзіцца тэарэтычна 5000 беларусаў, а практычна — чалавек 300. Што да тэарэтычнай і практычнай колькасці — частка з былое Польшчы, а частка — пераважна з Віцебшчыны ды Смаленшчыны. Праз рэгістрацыю, праведзеную летась Беларускім таварыствам у Зальцбургу, прайшло 315 чалавек. У самім Зальцбургу пашчасціла нам згуртаваць мала не 200 чалавек. З такой колькасцю асобнага беларускага лагера стварыць не ўдалося. Цяпер большыня гэтых людзей раз'ехалася, і засталося трошкі больш за паўсотню. Чалавек пятнаццаць умее гаварыць па-нашаму, астатнія шчыра прызнаюцца, што яны беларусы, але па-беларуску гаварыць не ўмеюць.

З нашай інтэлігенцыі ва ўсёй Аўстрыі — чалавек 6–7. З добрай інтэлігенцыі — чалавекі чатыры. Астатняя колькасць — работнікі і сяляне. Каб было тут больш нашай інтэлігенцыі, і каб было каму арганізаваць нашых людзей, тады былі б і нашы лагеры, а каб былі лагеры — інакш выглядала б і ўся справа. Мы яшчэ летась у сотнях лістоў білі трывогу і ў Мюнхен, і ў Рэгенсбург. Нічога не дапамагло. Нас, трох чалавек, сумела навязаць з імі лучнасць, а яны, сотні, яшчэ да гэтага часу не сумелі зрабіць гэтага. Усё, што тут зроблена, для нас траіх — вялікае дасягненне. Але большага зрабіць тром чалавекам нельга. Я адкідаю з гэтай колькасці самога сябе, бо я — не грамадскі дзеяч, і тады застаецца, можна сказаць, толькі адзін чалавек — А. Грыцук.

Мне пашчасціла адведаць ангельскую і французскую зоны Аўстрыі. У Вілляху (ангельская зона) у польскім лагеры жыве дзвесце беларусаў. Я затраціў мала не тры дні, каб знайсці там хоць аднаго (запраўднага) беларуса. Урэшце, я выпадкова спаткаўся з мянчанінам, пабраным з беластачанкай. Жонка мянчаніна ўзняла крык, чаму ейны муж гаворыць

з незнаёмым чалавекам у «кітайскай» мове. Муж не паслухаў сваёй жонкі. Ён паказаў мне кватэры, у якіх жылі людзі з Баранавіччыны, са Слонімшчыны, з Белавежы… Ніхто не прызнаўся, што ён беларус, і ніхто не прызнаўся, што ён умее гаварыць па-беларуску. Нягледзячы на гэта, я пакінуў людзям адрас нашай рэдакцыі. Ніхто нічога не напісаў, ніхто не падпісаўся на газету…

Вось да чаго давялі людзей страх перад рэпатрыяцыяй і наагул палажэнне ў Аўстрыі. Калі ўспомню аб гэтым — не магу стрымаць сваёй болесці. Людзі на вачах адракаюцца ад свайго запраўднага нацыянальнага імя. А ў французскай зоне спаткаў беларусаў, якія ўважаюць сябе за расейцаў, якія страцілі ўсякую людскасць, бо за кожную спробу пераконваць іх можна атрымаць, прабачце, па мордзе.

У нас праводзіцца запіс на выезд у Аргентыну. Першы транспарт мае адысці праз паўтара месяца. Я не запісваюся. Вы самі добра ведаеце, як цяжка выязджаць за край свету з чужымі людзьмі. А можа, нашы людзі з Баварыі выедуць да Аўстраліі? Дык тады мне паміраць у Аргентыне сярод чужых людзей?

Вельміпаважаны спадару доктару! Маю да Вас просьбу. Ці не маглі б Вы дапамагчы мне пераехаць да нашых людзей у Баварыю? Я магу выехаць і ў ваш лагер, у ангельскую зону. Мяне не цікавяць лепшыя жыццёвыя ўмовы і я на іх не спадзяюся. Я падрыхтаваны да найгоршых цяжкасцяў і ўмоваў. Я хачу толькі аднаго — трапіць да сваіх людзей. А разам са сваімі людзьмі я пайду куды хочаце, хоць у пекла. А з чужымі і ў рай не хачу ехаць.

Ці няможна было б выпісаць мяне праз УНРРА? Ці няможна было б прыслаць мне праўку ад УНРРА, што яно згоднае мяне прыняць? Гэта дапамагло б атрымаць пропуск у Баварыю. Аргумент — я хворы, не ў стане пратрымаць сваю сям'ю, а ў Ватэнштаце жывуць мае сваякі, якія здолеюць узяць мяне на сваё ўтрыманне. Маё прозвішча — Альберт Кадняк, 1922 г. нар. Члены сям'і: жонка — Кадняк Зінаіда, 1922 г. нар., і сын Міхал — 9 мес. Спадар Грыцук таксама хоча пераехаць да вас.

Два месяцы таму я выслаў такую просьбу і ў Мюнхен, і ў Рэгенсбург. Не маю ніякага адказу.

Будзьце ласкавыя, станаўлюся на калені і прашу Вас, не адмоўце ў маёй просьбе. Няхай не дасць Бог спаткацца Вам з немагчымым. Дапаможаце мне — гэтым самым выратуеце маё жыццё. Я спадзяюся яшчэ пажыць трошкі, і колькі буду жыць, столькі буду ўдзячны Вам і буду маліцца за Вас перад Богам.

Яшчэ хачу паведаміць Вас, што ў Зальцбургу ёсць беларуская праваслаўная парафія. Беларусы маюць сваю царкву, для іх два разы на тыдзень адпраўляюцца багаслужэнні. За настаяцеля — святар В. Нікіфараў. Хоць моліцца пяць чалавек, але — у сваёй царкве.

Чацвёрты нумар «Пагоні» — апошні. Тыднёвік «З Беларускага жыцця» свой выхад спыніць пасля Калядаў. Што маглі зрабіць, тое зрабілі, і зрабілі старанна.

Прывітанне Хведару Ільяшэвічу.

З Новым годам! З Раством Хрыстовым!

Алесь Салавей.

P.S. А можа, і ад вас ужо выязджаюць у Аргентыну? Будзьце ласкавыя, напішэце як мага хутчэй.

14. МАСЕЮ СЯДНЁВУ

27 снежня 1946 г.

Дарагі дружа Масей!

Твой ліст прынёс мне вялікую радасць. Ён пераканаў мяне, што я запраўды не адзін, што я не спаткаўся з найвялікшай трагедыяй у сваім жыцці — стратай цябе як сябра.

Абвяшчаю мір і згоду і бяру раней сказаныя словы назад.

Абвяшчаю мір і згоду Юрку Віцьбічу і застаюся перакананым, што і ён, як і ты, — не мой вораг.

Ад радасці я падскочыў у сваім дупле пад самую столь.

Праз пару дзён — Новы год. Спатыкаю яго ў думках разам з табой. Выпіваю ў думках на радзіме разам з Юркам Віцьбічам добры «сосуд» да дна.

Рука дрыжыць ад хвалявання і ніяк не можа вывесці роўныя радкі.

Думкі выскачылі з галавы, і не магу нічога талковага напісаць.

Дружа Масей! Дзядзька Юры! Вітаю вас з Новым годам, з Раством Хрыстовым! Жадаю вам радасці, шчасця, сілаў, натхнення і новых поспехаў у літаратурнай дзейнасці. Разам з вамі ў думках падымаю высока келіх і выпіваю за наша агульнае здароўе.

Хай благаслаўляе вас Бог!

Цісну рукі — *Алесь Салавей.*

P. S. Прывітанне сп. Манькову. Пішы на канвертах не Whiteruthenion, а Byelorussian — з такім надпісам лісты ўсіх, хто мне піша, даходзяць.

15. МАСЕЮ СЯДНЁВУ

28 снежня 1946 г., Зальцбург

Дарагі дружа Масей!

Дзякую за ліст, паштоўку і зычлівыя пажаданні. Ужо другі дзень я не магу супакоіцца ад радасці. Шчаслівы на свеце той чалавек, які мае добрых сяброў.

З майго боку — узаемныя святочныя пажаданні. З Раством Хрыстовым! Гарачае прывітанне Ю. Віцьбічу. Кланяецца табе Аляксей. Уладзіка я яшчэ не бачыў, але завочна шлю ад яго прывітанне.

Алесь Салавей.

16. МАСЕЮ СЯДНЁВУ

Ноч з 31 снежня 1946 г. на 1 студзеня 1947 г.

Дружа мой!

Апошнія чатыры дні я нічога не рабіў. Толькі дэкламаваў твае вершы. Так з тваімі вершамі і спаткаў Новы год.

Нібы прадчуваючы прыход нечага новага, да самай поўначы не клаўся спаць сын Міхась. Ён ужо гаворыць каля дзесятка словаў. Безумоўна, ён чуў размову сваіх бацькоў у хаце («Новы год, Новы год…» — часта траляліся словы). І перад самай дванаццатай гадзінай сын замахаў ручкамі, задрыгаў ножкамі ў сваім ложачку і голасна выгукнуў разы са тры: «Новы! Новы! Новы!» Гэта вельмі здзівіла мяне. Сын упершыню вымавіў такое слова, і вымавіў якраз перад Новым годам.

А ў той мамэнт, як стукнула дванаццатая гадзіна, як на дзіва, замяўкаў пад дзвярыма кот. Адчынілі дзверы — і ў хату важна ўвайшоў Моська. Гэты быў найвялікшы цуд: Моська ў часе нашых пярэбараў у цяперашняе дупло адбіўся ад нас, і мы не бачылі яго мала не тры месяцы. А на парозе 1947 года прыйшоў-такі…

Цяпер сын і Зіна спяць, а я пішу табе ліст. Успамінаю надыход 1944 года, калі я жыў у Рызе. Я тады спатыкаў Новы год у думках разам з табою. Так і цяпер, на парозе 1947-га…

Я пішу, а Моська мурлыкае перада мной на стале, прыжмуранымі вачыма паглядае на ліст, дзе я выводжу літары. Я хачу…

Прабач, дружа, пасля слова «хачу» я паставіў шматкроп'е праз хвілінаў дзесяць па ягоным напісанні. Выпадкова перарвалася дум-

ка, і я ніяк не магу яе ўспомніць. Наагул, страціў усе думкі, якія круціліся ў галаве. Нейкі туман засланіў паперу, замільгала ўваччу, я ўзняў галаву, і мне здалося, што перада мной сядзіць не кот Моська, а ты. Я прыўзняўся з крэсла, гляджу — кот. Сеў — ізноў затуманілася ўваччу, зірнуў — перада мною сядзіш ты. Мне зрабілася вусцішна. Я прагнаў са стала ката, патупаў трохі па дупле. Цяпер прадаўжаю пісаць. Нічога ўжо не палохаюся, але ўсё адно нейкі туман стаіць перад вачыма, і літары скачуць, як п'яныя.

Піць — нічога не піў. Нават хлеба няма перад Новым годам у хаце, а пра гарэлку і думаць не даводзіцца. Гэта па-першае. А па-другое — я цяпер не магу піць. У думках, бясспрэчна, я выпіваю разам з табой добрую пляшку за наша здароўе, але наяве — нядобра было б мне, каб выпіў…

Відаць, ад думак крыху ап'янеў. А часам мне здаецца, што я зрабіўся не зусім нармальным. Гэта хутчэй за ўсё…

Дружа мой! Я ніяк не магу дараваць сабе, што яшчэ летась не выехаў у Баварыю. А была магчымасць. Людзі нашы амаль усе раз'ехаліся. Для каго і для чаго я застаўся ў Зальцбургу — сам не ведаю. Цяпер калі кратацца куды, дык толькі з чужымі людзьмі. Заставацца на месцы — таксама з чужымі. Са сваімі лепш жыць у прыцемку на ўзгорачку, чымся з чужымі пад сонцам на высокай гары… Са сваімі заўсёды лягчэй перамагаць цяжкасці на жыццёвым шляху. І як мне трапіць да вас, да сваіх людзей, я не ведаю… Цяжкасцяў я не палохаюся, але духовага заламання вельмі і вельмі баюся. Сярод чужых я не зусім станоўкі ў змаганні з духовым заламаннем… Колькі ні думаю, ніяк не магу прыдумаць, як мне трапіць да вас.

Нада мною былі навіслі хмары страшнай хваробы. Штурхнуў мяне Бог упару з'явіцца да лекара. Пайшоў выпісваць новыя акуляры, а трапіў на рэнтген. Каб месяцы два пачакаў, было б вельмі дрэнна. Цяпер мне штодня шпіляюць па чатыры ўколы, і лекары кажуць, што ўсё будзе добра. А яшчэ раяць нічога дрэннага пра хваробу не думаць і добра харчавацца. Я выконваю іхную параду сумленна: думаць — нічога не думаю, а харчуюся добра толькі ў думках, так, як і выпіваю сяння з табой пляшку гарэлкі…

Прывітанне ўсім. Цісну руку — *Алесь Салавей.*

17. ВІТАЎТУ ТУМАШУ

[1947]

Вельміпаважаны спадару!

Для того чтобы моё письмо долго не задерживалось в пути из американской в английскую зону, пишу по-русски.

Несколько недель тому назад я обращался к Вам с просьбой относительно бумаг, при помощи которых я смог бы получить разрешение на переезд к Вам. Кроме того, о чём я писал, нужно иметь бумажку от военных властей о разрешении на выезд ■ их зону.

Калі Вы толькі можаце зрабіць тое, што я ў Вас прасіў, будзьце ласкавыя, не адмоўце ў гэтым. Я нікому не прынясу лішніх клопатаў і ні для кога не стануся абцяжаннем. Будзеце мець добрую сілу ў выдавецкай справе. Дапамажы мне, Божа, пераехаць да сваіх людзей.

Спадар Грыцук таксама хоча пераехаць да вашых мясцінаў.

Хведар! Дружа! І ты дапамажы чым толькі можаш у гэтай справе.

Алесь Салавей.

Прыпіска Аляксея Грыцука: Дарагія! Калі толькі можаце, памажэце нам у нашай просьбе. Мы Вам будзем за гэта ўдзячныя. Я наагул жыву нядрэнна. Цяпер спаткала мяне няшчасце: на лыжах пакруціў нагу і ўжо 10 дзён ляжу ў ложку. Бывайце — *Аляксей.*

18. У РЭДАКЦЫЮ ГАЗЕТЫ «БЕЛАРУСКІЯ НАВІНЫ»

25 студзеня 1947 г.

Да рэдакцыі газеты «Беларускія навіны» ад пэўных людзей з Нямеччыны можа надысці прапанова зняць з продажу маю паэму «Звіняць званы Святой Сафіі». Застаючыся перакананым, што беларусы ў Парыжы жывуць сваім розумам, я, аднак, для лепшага разумення гэтай справы, пасылаю ў рэдакцыю копію свайго ліста да нашых людзей у Нямеччыне.

Я даведаўся аб забароне распаўсюджваць маю невялічкую паэмку «Звіняць званы Святой Сафіі», прычынай чаго з'яўляецца прысвята паэмкі Юрку Віцьбічу. З увагі на гэта даю наступнае вытлумачэнне.

Аўтарам назову «Звіняць званы Святой Сафіі» з'яўляецца Юрка Віцьбіч, што ведама кожнаму, хто цікавіцца беларускай прэсай. Гэты

назоў запазычаны мною ў Юркі Віцьбіча. Прысвята з'яўляецца фактычна зазначаннем таго, у каго запазычаны назоў, і дадзена на падставе пэўных правілаў у літаратуры. Каб я гэтага не зрабіў, гэта ўважалася б за кражу арыгінальнага назову, і Юрка Віцьбіч меў бы поўнае права ў пэўных абставінах абвінавачваць мяне праз суд за літаратурную кражу. Як літаратар, адпаведных законаў у літаратуры я абысці не мог.

Юрка Віцьбіч з'яўляецца чалавекам, які больш, чымся хто іншы, аддаў сілаў душы і крыві за беларускую справу. Юрка Віцьбіч належыць да тых, каму цудам пашчасціла застацца жывым, не апынуўшыся там, дзе апынуліся нашы найлепшыя пісьменнікі — носьбіты й краса беларускага мастацтва. Вельмі і вельмі памыляецца той, хто гэтым лацьвавper. Палітыка мяне не абыходзіць (хоць Віцьбіч, думаецца мне, не горшы палітык за тых, хто прэтэндуе на палітыка), але ў мастацкай літаратуры, як мне ведама з апошняй прэсы, Юрка Віцьбіч да сянняшняга дня застаўся пры сваіх ранейшых пазіцыях. Адмаўляць сяння Юрку Віцьбіча як пісьменніка — гэта значыць, рабіць пагром беларускай літаратуры на эміграцыі. Прысвяціць паэмку Юрку Віцьбічу як пісьменніку я меў поўнае права.

На творах Юркі Віцьбіча я выхоўваўся змалку. Яшчэ тады, калі я, казаў той, хадзіў пяшком пад стол, у нашай літаратуры было знішчана ўсё беларускае. Янка Купала і Якуб Колас, а з празаікаў Юрка Віцьбіч — вось у каго засталося мне спатыкаць хоць кроплю беларускасці ў той час, калі я стаў на ногі. За гэта я Юрку Віцьбічу шмат абавязаны. Мая рука ніколі не падымецца скрэсліць прозвішча таго, хто так шмат спрычыніўся да майго беларускага выхавання.

Уважаю, што адны, да якіх належыць, прыкладам X, і другія, да якіх належыць, скажам, Y, у зацятасці свайго непатрэбнага «змагання» — гульні ў салдацікі — вельмі шмат памыліліся. Гэтае смешнае «змаганне» і ўзяло на сябе ўвагу пэўных інстытуцыяў. А цяпер адны могуць назваць другіх здраднікамі й прадстаўнікамі розных агентураў, а другія могуць тое самае сказаць у адказ. Вынікі такіх «змаганняў» мне добра вядомыя. Тады невыпадковым з'яўляецца й паўстанне чуткаў аб розных даносах і г. д. Мяне цяпер зусім не здзівіць, калі Y паведаміць, што X дайшоў да даносаў ды іншых брудных справаў, і адначасна не здзівіць тое, калі X зазначыць, што Y займаўся тым жа. Я ніколі не паверу ў тое, што падобнымі справамі займаліся адны й другія.

Даўно трэба разумным людзям пасадзіць Юрку Віцьбіча на ягонае літаратурнае месца і перасцерагчы яго ад умяшання ў «палітыку правадырства». Разам з гэтым трэба пасадзіць на свае месцы і іншых «салдацікаў» і «генералаў».

Са свайго боку раджу ўсім сведамым і разумным беларусам апамятацца і не раздзьмухваць з невялікага агню вялікага полымя. Цвёрда веру ў тое, што ўвесь вэрхал, узняты нашымі людзьмі ў Нямеччыне, лопне, як мыльная бурбалка, адразу ж па сканчэнні дармовага хлеба. Да ўсялякіх непаразуменняў давялі, бясспрэчна, толькі дармовы хлеб і бяздзейнасць. Мінецца гэта — настане тады згода і супакой.

Ніякай цаной не пагаджаюся на тое, каб замазаць у паэмцы прысвяту Юрку Віцьбічу. Я не пайду насустрач метадам, ад якіх я ўцякаў і пры ўспаміне пра якія валасы становяцца дыбам і спакойна не спіцца. Як беларус, нашчадак слаўных крывічоў, і як беларускі пісьменнік, застаюся цвёрда ўпэўненым, што ні паэмкай «Звіняць званы Сятой Сафіі», ні прысвятай яе Юрку Віцьбічу я ні трошкі не пашкодзіў нашай агульнай справе. Калі хто думае пра гэта інакш — хай тады паэмка застаецца забароненай да распаўсюджання.

P. S. Калі і вынікне што-небудзь дрэннае з прычыны «змаганняў», дык вінаватымі будуць і X, і Y, а не адзін толькі які-небудзь X.

За зневажанне Юркі Віцьбіча як пісьменніка я нікому ніколі не дарую. Такія людзі з неба не падаюць — раю мець на ўвазе. Апамятайцеся, дапамажэце Юрку Віцьбічу сесці на ягонае запраўднае месца. Вялікія пісьменнікі — вялікія дзеці паводле свайго характару. Да такіх людзей павінен быць пэўны педагагічны й дыпламатычны падыход, а не «бах-тарабах», узняты падлітай у агонь смалой.

Яшчэ раз раджу пакінуць займацца дурніцамі. Што ж станецца, калі брат на брата будзе вастрыць нож? Можа, зараз і творы Ю. Віцьбіча трэба забараніць? Як там, адкуль я якраз ўцякаў? Што гэта? На беларускай эміграцыі яшчэ раз эміграваць ад сваіх?

Не хочацца верыць у раздваенне беларусаў на эміграцыі, але міжвольна пераконваюся, што пэўныя людзі прадаўжаюць палітыку разгону ўсходніх беларусаў.

Адсутнасць пэўнае павагі да нашых пісьменнікаў гаворыць аб адсутнасці адпаведнае культуры.

Зусім не здзіўлюся, калі за гэты ліст і на мяне хто-небудзь пачне вешаць сабакаў. Стаяў, стаю і буду стаяць на ідэйным беларускім шляху, а не на шляху прыватных амбіцыяў і інтарэсаў.

Алесь Салавей.

19. ВІТАЎТУ ТУМАШУ

12 лютага 1947 г., Зальцбург

Вельміпаважаны спадару доктару!

Не знаходжу найцяплейшых словаў, каб выказаць Вам сваю глыбокую ўдзячнасць за Вашыя клопаты й старанні, што да майго пераезду ў Нямеччыну. Вельмі й вельмі шчыра дзякую Вам, спадару доктару. Урэшце, я маю такія-сякія падставы… Цяпер буду звяртацца да адпаведных уладаў, буду клапаціцца, дамагацца, і, можа, штонебудзь выстараюся. Шмат каму з маіх суседзяў падобнае да таго, што я цяпер маю, дапамагло… Зразумела, была б больш пэўная магчымасць атрымаць пропуск, каб я меў паперы з амерыканскае зоны. Але ўсе мае лісты, якія я пісаў туды мала не год, не здолелі крануць узрушаных небывалым «змаганнем» сэрцаў. Гэта — між іншага, бо наракаць — барані Божа, я ні на кога не наракаю; ніхто ж не абавязаны, зразумела, мне дапамагаць, а калі дапаможа хто, дык гэта ягоная асабістая добрая воля…

Мой папярэдні ліст пісаўся да Вас у мамэнт, калі я быў у вельмі цяжкім духовым стане. Мне думаецца, што гэты ліст — не толькі песімістычны, але і заняпадніцкі і, можа, нават крыху нетактоўны. Ласкава прашу дараваць, калі я што-колечы не так, як належыць, напісаў.

Добрыя Вашыя заўвагі, што да нашых невялічкіх выданняў, узрадавалі і ўзбадзёрылі. Усё ж гэта не тое, спадару доктару, што можна было б выдаць, шчыра прызнацца. Вы гэта і самі ведаеце. Гэта ўсё слёзы, па-мойму. І калі задумаешся над імі — цяжка на сэрцы… Шмат чаго лепшага можна было б і напісаць. Мяне асабіста ўжо доўгі час цікавіць тэма бітвы пад Грунвальдам. Задумаў я пісаць вялікі паэтычны твор на гэту тэму. Але нічога не выходзіць, калі бяруся пісаць. Для мастака, зразумела, не існуе ўмоваў. А вось крыніца натхнення павінна быць, мне думаецца. Аднак тое, што перад вачыма, — дакучлівае, невыразнае й нецікавае. Глядзіш на малюнак на блізкай

адлегласці — нічога не бачыш; адыдзешся — туман перашкодаў заціямняе яго, таксама нічога не бачыш. Словам, і ні ўмоваў, і ні крыніцы натхнення — нічога няма. Гэтак яшчэ ўвесну мінулага года я напісаў два раздзелы аповесці ў прозе «Пад нагамі гарыць зямля». Усё засталося недапісаным і, мабыць, застанецца назаўсёды... Адсутнасць магчымасці працаваць на карысць таго, чым жывеш, — трагедыя, ведама, не толькі адзінкаў, але дзесяткаў і сотняў, а разам — і ўсяго народу.

Я гавару пра ўсё, што думаю, шчыра й адчынена, не затушоўваючы нічога штучнай напышлівасцю і туманам фальшывай бадзёрасці. Гэта, зразумела, не павінна быць падставай для таго, каб думаць, што я — бедны й нешчаслівы, не здольны да жыцця. Наадварот, я шчаслівы, бо я жыву, змагаюся за жыццё, перамагаючы перашкоды, не замоўчваю іх, і гэта дае мне больш сілаў для змагання з імі. І тады адчуваеш, як спадае са спіны цяжар, як з'яўляецца натхненне да працы, да творства. І хоць цяпер у нас яшчэ больш пагоршала, хоць на душы пацяжэла, а ў жываце (ён, зразумела, на заднім плане) папусцела, я паўтараю ўслед за Вамі Вашыя словы: «Раней-пазней спаткаемся ізноў усе разам на сцежках-дарожках вялікага свету!»

Моцна цісну Вашу руку — *Алесь Салавей.*

20. АЛЯКСАНДРУ МІЦКЕВІЧУ

19 лютага 1947 г.

Вельміпаважаны спадару!

Прыемна было атрымаць Ваш ліст і радасна было даведацца, што Вы знайшлі свайго дзядзьку.

Паслаў я Вам нядаўна 4-ты нумар часапісу «Пагоня». Мабыць, Вы ўжо яго атрымалі.

Далей часапіс «Пагоня» не будзе выдавацца. Тыднёвік «З беларускага жыцця» таксама спыніў свой выхад.

Пасланыя Вамі грошы, якія я спадзяюся яшчэ атрымаць (як бачна, Ваш ліст прыйшоў хутчэй за грошы), будуць захаваныя на часапіс (8 шыл.), а астатнія 7 шыл. хай лічацца за Вамі. Калі яшчэ штонебудзь выдадзім, на што не губляем надзеі, — прышлём Вам.

З паважаннем — *Алесь Салавей.*

21. ВІТАЎТУ ТУМАШУ

23 лютага 1947 г.

Вельміпаважаны спадару доктару!

Мак ці не мак — ласкава прашу прабачыць. Перапісваючы свае творы, я папсаваў характар пісьма. Інакш пісаць тым часам не ўмею. На Вашую заўвагу хацеў узлавацца, ды не змог (даруйце за шчырасць).

За ліст Ваш вельмі дзякую. Лучнасць з суродзічамі падтрымлівае на духу.

Гэта праўда, што розныя абставіны, у якіх мы жылі, зрабілі свой уплыў на нашую мову. Але я, мне думаецца, прытрымліваюся беларускай літаратурнай мовы. Яна ёсць, яна існуе, і дыялекты, менавіта дыялекты, я, па-мойму, абмінаю. А яны мне ўсе вядомыя: і менскія, і віцебскія, і палескія, і віленскія, і падляшскія. За ўзор найлепш браць мову, інакш кажучы, лексікон, зацверджаны і ўсталены Інстытутам беларускае культуры (Акадэміяй навук) — афіцыйнай установай, яшчэ перад разгромам г. зв. «нацдэмаў». У беларускасці таго часу няма сумніву; правапіс і лексікон былі прынятыя, калі не памыляюся, навуковай канферэнцыяй, у якой бралі ўдзел не толькі беларускія вучоныя і наагул моваведы з Савецкай Беларусі, але і з-за межаў. За тыя каштоўныя ўклады ў скарбніцу беларускае літаратурнае мовы людзі заплацілі жыццём, і найлепш было б да часу стварэння новае, запраўды беларускае, Акадэміі навук браць за ўзор ужо дасягнутае. Тады не было б хаосу ў нашай мове і тады, зразумела, не пісаў бы кожны так, як яму хочацца. Даруйце мне за гэтыя дылетанцкія словы — я не мовавед, беларускую мову ў беларускай школе вывучаў усяго 8 гадоў — вельмі мала. Але на свайго вучыцеля, колішняга аднаго з аўтараў беларускае граматыкі за часоў «нацдэмаўшчыны», паскардзіцца не магу…

І яшчэ хацелася б сказаць: тое, што нашы людзі амерыканскімі тэмпамі забываюцца на мову сваіх бацькоў і дзядоў, не павінна, памойму, выклікаць варожасці да запраўднага ўзору беларускае мовы (у асноўным) у газеце «Бацькаўшчына» (праўда, у ёй тым часам карэкта слабая). Перадусім мы мусім браць увагу на культуру мовы. Калі пачнём шукаць паланізмы й русіцызмы там, дзе не трэба, дык тады зусім на нашай мове трэба будзе паставіць крыж («перадусім», скажуць, — паланізм; напішэце інакш — будзе «русіцызм»).

…Калі чатырохстопныя й пяцістопныя ямбы й харэі могуць быць без цэзуры, дык шасцістопныя ямбы й харэі без цэзуры на трэцяй стапе, а сямістопныя — на чацвёртай называюцца бясконцастопнымі ямбамі й харэямі (тое самае, што музыка без тактаў). Такія ямбы й харэі рэжуць вуха, што вычувае рытм. Ніводзін паэта, які мае няйдрэннае пачуццё рытму, нават нічога не ведаючы пра цэзуру, не можа дапусціць такое паэтычнае непісьменнасці (чым я асабіста не магу пахваліцца). Сучасныя паэты (не ўсе, зразумела) праз сваё няведлайства ўважаюць цэзуру як глупства, як нешта лішняе і непатрэбнае, так, як сучасныя жанчыны (таксама не ўсе) уважаюць за лішняе сваю спадніцу (прабачце)…

Праўда, добрыя паэты-мастакі часам умеюць зацяніць гэты недахоп высокай мастацкасцю або імпрэсійнасцю сваіх твораў (Сяднёў, скажам), і ім ён там-сям даруецца, застаючыся незаўважаным. Гэтага, аднак, не знойдзеце ў Багдановіча, у Жылкі і нават у Коласа, калі не памыляюся, але знойдзеце ў Дубоўкі, у Пушчы, у Купалы. Купала нават санеты пісаў шасцістопным ямбам без цэзуры — скандал! І ў маіх ранніх вершатворах поўна такіх «скандалаў». А вершатвор «Вільня», напісаны ў 1944 годзе (васьмістопны ямб), зусім непісьменны з гледзішча паэтыкі (якія вучыцелі — такі тым часам і вучань).

Вось гэтая самая цэзура і мела ў мяне зачэпку да вершатвору Н. Арсенневай, надрукаванага ў часапісе «Медычная думка». Вершатвор, праўда, напісаны вольным ямбам (вольны верш, не вершатвор, і свабодны верш — розныя паняцці). Ёсць у гэтым вершатворы, напісаным вольным вершам (ямбам), пяцістопныя, шасцістопныя й сямістопныя вершарадкі.

Вось паэтычна пісьменныя вершы: «Італьскае віно // рубінамі пальецца…» — шасцістопны ямб, цэзура на трэцяй стапе. Або: «Адно не да віна // Францішку Скарыне…» Далей: «Задорна друкаваць сляды // на чыстых, на харошых…» — сямістопны ямб, цэзура на чацвёртай стапе і г. д.

А вось блага: «Таптаў гадамі не // дарма далёкі свет…» — рытм у радку кульгае; ён патрабуе паўзы на «не», а гэтае самае «не» павісае ў паветры, адлучыўшыся ад слова «дарма». «…Балонках першае // парошы, піць густы…» — і гэты верш няўдалы, цэзура ёсць, але яна аддзяляе эпітэт «першае» ад слова «парошы». «У рэках рыбы чуюць першыя віры…» — цэзуры няма, а зрабеце яе — атрымаецца вось

што: «У рэках рыбы чу // юць першыя віры...» І далей: «Маўчыць даўно гаспо // да ў Падуі старой... Вось кніжыцу ён ра // згарнуў сваю ў рудой...»

Яшчэ я маю строгія заўвагі з гледзішча эўфанічнасці, на падставе якіх сказаў, што верш напісаны нестаранна. Але на іх не спыняюся, бо зойме шмат месца, хай гэтым займаюцца аўтары падручнікаў з паэтыкі, якіх у нас няма. Нават Валеры Брусаў — бацька расейскага вершазнаўства — зрабіў шмат памылак у сваіх працах з паэтыкі. І, слепа пераймаючы гэтыя памылкі, а таксама памылкі М. Горкага з тэорыі літаратуры, савецкія падручнікі пазаводзілі людзей у блуд. Тым больш і я не асмельваюся выказваць далей сваіх заўвагаў, бо ведаю вельмі мала — больш адчуваю сваім нутром. А па-за ўсім гэтым — вершатвор, можа, нават і геніяльны.

«Апокрыф» М. Багдановіча ў Вашым выданні я не бачыў. А хацелася б пабачыць.

Сам я цікавых навінаў не маю. Думкі аб самагубстве робяцца ўсё больш і больш актуальнымі.

Яшчэ раз раблю спробы выехаць неўзабаве ў Нямеччыну. Хоць у іншы барак перасяліцца — і то будзе лягчэй. Як выеду — напішу Вам.

Што да майго сцэнічнага абразка — я передумаў. Тым часам друкаваць не буду — хачу перарабіць.

Жадаю добрых удачаў і памыснасці ў Вашым жыцці й працы.

З глыбокім паважаннем да Вас — *Алесь Салавей.*

22. ЮРКУ ВІЦЬБІЧУ

Зальцбург, 26 лютага 1947 г.

Вельміпаважаны дзядзька Юры!

Шчыра прызнацца, я не чакаў ад Вас ліста. Яшчэ месяцы тры таму пэўныя людзі (толькі не Уладзімір Глыбінны, зразумела) паінфармавалі мяне, што два словы «крывічы», ужытыя ў паэме «Звіняць званы Святой Сафіі», зрабілі мяне Вашым дасконным ворагам. Пасля давялося мне атрымаць шмат іншых інфармацыяў. Цяпер Ваш ліст інакш паставіў мяне да ўсяго гэтага. Дзякаваць Богу, што тыя інфармацыі былі часткова хлуслівымі, і дзякаваць Богу, што справа не стаіць так, як я яе раней уяўляў.

З прычыны ўсяго ўспомненага ў пэўных лістах да пэўных асобаў я не зусім тактоўна й слушна выказваўся аб Вас. Вельмі рады буду, калі Вы згодзіцеся не адкапваць «смярдзючага нябожчыка» — гэнае мае пісаніны, як сказаў Масей Сяднёў.

Прыемна было даведацца, што часапісы «Шыпшына» і «Звіняць званы Святой Сафіі» не заламаліся на шляху перашкодаў. Гэтыя часапісы выклікаюць нядрэннае ўражанне паводле свайго духу й зместу. Мне не спадабалася толькі размяшчэнне матэрыялаў. Гэта моцна адбілася на саліднасці часапісаў. Але саліднасць, зразумела, — другарадная справа. Змест — вось што самае галоўнае. І мне думаецца, што мае заўвагі аб знадворным выглядзе часапісаў не павінны ўзбурыць Вас. А што да размяшчэння матэрыялаў, то я магу памыляцца — не ва ўсіх аднолькавыя й правільныя густы… І калі я шчыра скажу, што і наша «Пагоня», і Вашы «Шыпшына» й «Званы» — слёзы, дробныя слёзы ў параўнанні з тым, што можна было б выдаць, — гэта, па-мойму, зусім не адмовіць вартасці й значання часапісаў, вартасці таго, што ёсць.

Усё ж бязмежна захоплены я Вашай вялікай працавітасцяй, што да выдання аж двух часапісаў. Як ні кажэце, выдаваць аднаму чалавеку два часапісы — вялікая справа. І ў Вас, мне думаецца, людзі, якія тое-сёе друкуюць у часапісе, а ва ўсім працэсе выдання стаяць убаку, не асмельваюцца сказаць, што ўсё робяць яны, а не Вы… У нас гэта трошкі інакш. Дзіўна было б, каб я, надрукаваўшы ў «Шыпшыне» пару сваіх рэчаў, пачаў хваліцца перад усімі, што «Шыпшына» — мая заслуга, а не заслуга Юркі Віцьбіча…

Забарона распаўсюджваць маю паэмку «Звіняць званы Святой Сафіі» — факт, бессупярэчны факт. Я нават атрымаў прапанову даць згоду на скрэсленне ў кніжачцы Вашага прозвішча. І тое, што паэмка не з'явілася ў Вашым табары, якраз і сведчыць аб забароне. Паэму затрымалі, відаць, у пэўным месцы, і можа, ужо нават знішчылі. Уладзіміру Глыбіннаму я паслаў адбітак свайго пратэсту. Зможаце прачытаць. У гэтым пратэсце заўважыце такія-сякія сляды ранейшага няправільнага паінфармавання мяне, адначасна заўважыце тое, што я зрабіў так, як трэба было зрабіць пісьменніку (можа, на самой справе, я і не пісьменнік, але, не ўважаючы сябе за яго, ніколі нічога не здолеў бы напісаць).

Аб маім намеры пераехаць у Баварыю. Не атрымаўшы станоўчага адказу з Рэгенсбургу, куды я звяртаўся, я напісаў быў ліст да д-ра

Тумаша. Доктар вельмі чула паставіўся да маёй просьбы і прыслаў мне адпаведныя паперы. Але тут — амерыканская зона, і я не змог атрымаць дазволу на пераезд паводле папераў з ангельскае зоны. Тады я звярнуўся з просьбай да Міколы Вярбы. Ён паведаміў мяне аб пэўных захадах з ягонага боку, што да майго пераезду. На гэта патрэбна паперка ад табарных уладаў, што ў табары жывуць мае крэўныя, што табар згаджаецца мяне прыняць, і паперка павінна быць пацверджана амерыканскімі вайсковымі ўладамі. Цяпер я чакаю яе ад Вярбы, і яму, я ўважаю, лягчэй, як каму іншаму, выстарацца яе. Калі ж яму не давядзецца выканаць маёй просьбы, тады буду звяртацца да Вас. А цяпер — ці не маглі б Вы напісаць ліст да Вярбы, каб ён не паклаў гэтай справы пад сукно? Ваш ліст падштурхне яго, зразумела, і ён хутчэй што-небудзь зробіць.

Мне, шчыра прызнацца, абрыдзела жыць так, як жыву цяпер. Згодзен узяцца за найцяжэйшую працу, толькі каб мець супакой і не галадаваць. І зусім сур'ёзна быў наважыўся выехаць на працу ў прамысловасць Францыі. З Парыжа атрымаў вельмі добрыя паперы. Але амерыканцы нікога не пускаюць да сваёй зоны, а каб і пускалі — не здолеў бы паехаць, бо не маю грошай. Круці не круці, а адзінае выйсце — выязджаць да Вас.

А цягне мяне імкненне далучыцца да сваіх, хоць я, хутчэй за ўсё, мала выгадаю на гэтым. Людзі, сярод якіх я жыву, умеюць паважаць не толькі сваіх літаратараў, але і чужых. Такое ўвагі й пашаны, якую я маю, мне не давядзецца спаткаць сярод сваіх людзей.

Я паслаў Вам праз Уладзіміра Дудз цкага 4-ты нумар часапіса «Пагоня», бо тыя, праз каго я сам магу паслаць, не перададуць яго Вам. Дарэчы, не друкуйце зместу 4-га нумару да таго часу, пакуль не атрымаеце яго. У працэсе выдання змест быў крыху з'іначаны. Я выкінуў сваё апавяданне «Дзе ж ты, дзіця маё?», бо яно мне не падабаецца. Сцэнічны абраз «Дух праўдны, духу зла непадуладны» я парашыў трошкі «падсушыць».

Дзякую, вельмі дзякую за Вашы лісты. Мне яны прынеслі вялікую радасць. Чакаю часіны, калі давядзецца пабачыцца.

Адначасна пасылаю два вершы: «Дваццаць тры» і «Fröhliche Weihnachten». Яны належаць да кнігі «Сіла гневу» (раздзел «Жывому — жыць, знішчэнню — смерць»).

Я і ўся мая сям'я шчыра вітаем Вас і ўсю Вашу сям'ю.

З глыбокім паважаннем — *Алесь Салавей.*

23. МАСЕЮ СЯДНЁВУ

26 лютага 1947 г., Зальцбург

Дружа Масей!

Аж цэлых два лісты атрымаў я сяння: адзін ад цябе, а другі — ад Юркі Віцьбіча. Апынуўся ў гэткім самым стане, у якім быў у часе атрымання першага твайго ліста... Дзякуй, дружа, што не забываешся на мяне.

У мяне, дапраўды, апошнім часам усё перакруцілася ў галаве, не ведаю — ці на зямлі жыву, ці на небе. Адзін піша адно, другі — іншае, а трэці — адрознае ад першага і другога. І пачаў я рабіцца падобным на тую дуду: як надзьмеш яе — так яна і грае. Хто праўду піша, а хто хлусіць? І прыказка ў лісце Юркі Віцьбіча: «Трымай злодзея!» гукнула мне на саме вуха: «Злодзей хлусіць! Ён, «караед»!

Веру вашым лістам. Не магу не верыць. А той, у каго «галава вылезла, ды вума не вынесла», няхай чакае, пакуль я паверу. Не дачакаецца...

Дружа! Саступаю табе і абыходжу маўчаннем тваю натацыю. Мог бы і цяпер агрызнуцца, але не хачу быць у тваёй уяве прыдзірлівым. Змоўчваю. Агрызанне да дабра не давядзе. Няхай яму будзе канец. Згода?

Паслаў табе 4-ты нумар «Пагоні». Я ўважаю, што яго табе павінны перадаць. На цябе ж, мабыць, зуба не маюць?

Праўда, праўда, — забаранілі распаўсюджваць мае «Званы». Аб падрабязнасцях даведайся з ліста, які я паслаў Віцьбічу.

А зіма, браце, выела ўсе мае косці — і нічога ад мяне не засталося, бо адны косці і былі. Ужо дзесяць гадоў усцяж (і ўсе мы гэтак) — часам з квасам, а парою з вадою. Лезь, струпехлая здань Алеся Салаўя, на зледзянелую печ, а сыну — дарогу ў жыццё! Ці не бачыш, як ён, ссінелы і счарнелы ад холаду, крычыць на ўсё салаўінае дупло і лезе да вакенца, каб кранууцца рукой намаразі? Балазе, ён малы і нічога не разумее... Радуйся, што здань твая ператвараецца ў постаць Альберта Кадняка, у істоту, якая дбае пра крупы і хлеб, пра свой жывот. Не будзе дбаць — здохне й сына асіроціць...

Спалучыць Алеся і Альберта ў адной асобе не давялося.

Цісну руку. Пакуль што адчуваю, што я яшчэ — *Алесь Салавей.*

24. МАСЕЮ СЯДНЁВУ

29 сакавіка 1947 г., Зальцбург

Дружа Масей!

Зычу табе шчаслівых і радасных Велікодных святаў. Дай Божа наступны Вялікдзень святкаваць разам ва ўмовах, намі пажаданых.

Алесь Салавей.

25. ВІТАЎТУ ТУМАШУ

3 красавіка 1947 г.

Вельміпаважаны спадару доктару!

Лісты ад Вас ідуць доўга, мала не месяц, а часам больш месяца. Вашу паштоўку ад 16.02.47 я атрымаў сяння разам з лістом ад 03.03.47. Колькі дзён таму атрымаў купэрт ад Янкі Сурвілы з каляндарыкам на 1947 год. Больш двух месяцаў блукаў каляндарык у дарозе. Дзіўна, а з амерыканскай зоны Нямеччыны лісты ідуць 4–5 дзён.

Гэта між іншага, бо колькі б ні ішлі лісты і калі б яны ні былі напісаныя, — заўсёды я ім вельмі й вельмі рады. Гэта адзінае, што так моцна і так станоўка духова падтрымлівае. Каб я быў пазбаўлены і гэтай магчымасці, дык жыццё тады было б зусім невыносным… Вельмі дзякую Вам за Вашы лісты і за Вашы захады й стараннi, што да мяне.

Шмат чаго з'іначылася ў нас ад таго часу, калі я атрымаў пасведчанні аб тым, што ў Вашым табары жывуць бацькі маёй жонкі. Калі ў той час такія паперкі з амерыканскай зоны вельмі добра маглі дапамагчы ў выездзе адгэтуль, дык цяпер нішто не можа дапамагчы. Цяпер справа ўсіх нас даволі беспаспяхова вырашаецца ў Маскве. Ува ўсякім разе тут нас не пакінуць. Нас куды-небудзь вывезуць або выганяць. У адваротным выпадку, самі людзі рынуцца на злом галавы. Мне засталося пакінуць ранейшыя думкі, што да выезду, і падрыхтаваць сябе да ўсяго, што чакае наперадзе. Цяжка будзе, калі не давядзецца далучыцца да сваіх людзей. Гэта будзе трагедыяй для мяне.

З іншага боку, так ці інакш, Нямеччына — адзіная краіна, на пасяленне ў якой я магу разлічваць, каб прадаўжаць сваё існаванне. Трошкі надзеяў маю і на Францыю. Ні ў якую іншую краіну я не

змагу выехаць, бо ніякая іншая мяне не возьме з прычыны майго здароўя. А таму заставацца ў Аўстрыі ў баку ад свайго гурта я не магу і не павінен заставацца. Чакаю і буду чакаць таго, што прынясе мне мой лёс…

Узамен за прысланы каляндарык я паслаў на імя Янкі Сурвілы 25 экземпляраў сваёй кніжачкі «Звіняць званы Святой Сафіі». Каляндарык пакінуў вельмі прыемнае ўражанне. Сціплы, але з густам, невялічкі, нічога лішняга ў ім няма. Усё на сваім месцы. Проста радасна было пераканацца на гэтым невялічкім каляндарыку, што нашы людзі ўсё-ткі здатныя да добрых рэчаў.

Тыднёвік «З беларускага жыцця» і часапіс «Пагоня» спынілі свой выхад. Можа, неўзабаве будзе выдавацца іншы тыднёвік, або двухтыднёвы рэлігійна-грамадскі часапіс. Гэта — ініцыятыва Ул. Дудзіцкага… 4-ты нумар «Пагоні» пасланы Вам месяц таму. Спадзяюся, што Вы атрымалі ўжо яго.

Пішу і ўспамінаю, што праз два дні — Вялікдзень. Давядзецца святкаваць яго толькі ў думках. А на яве ён будзе зусім звычайным і шэрым сучасным днём. Але якім бы цёмным ні быў дзень няўцешнай сучаснасці — усё роўна на змену цемры прыйдзе святло. Усё роўна напоўніць святло нашы душы ўпэўненасцю ў светлае заўтра. А ўпэўненасць — здзейсненне!

Дазвольце прывітаць Вас з Вялікаднем. Хрыстос уваскрос!

Найлепшыя прывітанні Вам і Хведару Ільяшэвічу ад мяне і ад А. Грыцука.

З павbooжаннем — *Алесь Салавей.*

26. МАСЕЮ СЯДНЁВУ

14 красавіка 1947 г.

Дружа мой!

Гнявацца — не гневаюся. Але лістоў ад блізкіх людзей чакаю з нецярплівасцяй. Яны — адзінае, чым я цяпер жыву. Шкада, дружа, што ты вельмі скупы на словы. Раней ты, здаецца, не быў такім.

Даведаўся я, што дэлегацыя беларускіх пісьменнікаў на чале з М. Сядднёвым вітала з'езд МУР'у; М. Сяднёў выдаў сваю новую паэму «На край святла». Я да глыбіні душы ўзрадаваўся, даведаўшыся аб гэтым. Ату мне, дружа, — ні слова пра свае навіны.

Бачыў і чытаў рэцэнзіі на выдадзены нашымі суседзямі «Лексіс» Л. Зізанія; рэцэнзенты ўважаюць беларускія словы за ўплыў галіцкага дыялекту на ўкраінскую мову ранейшых часоў... Чытаў у «Часе» і «Пагоню» М. Багдановіча ў перакладзе Яра Славуціча, і «Сівою вярбою» Н. Арсенневай, і пераклад М. Танка, і «Царыцу» «маладога паэты» М. Кавыля. Чытаў таксама артыкул пра мабілізаванне дапамогі нашым «няшчасным», якія няздатныя самастойна арганізаваць сваё жыццё. Бачыў у змесце аднаго з новых украінскіх выданняў і назоў «Цень Янкі Купалы». Цешуся, дружа, тваімі поспехамі і тым, што ўсё ж нядрэнна рэпрэзентуешся перад суседзямі.

У тутэйшым часапісе «Літаўры» (выдаецца ў друкарні) ёсць у перакладзе мае «Званы». У іншых драбнейшых выданнях надрукавана шмат іншых рэчаў. Мяне асабіста гэта не вельмі цешыць. Балюча, што няма магчымасці друкавацца ў сваёй прэсе, ды яе, уласна кажучы, і няма. Частку з напісанага ў апошнія два гады я паслаў у вашы мясціны, але аб лёсе пасланага нічога не ведаю.

Збіраешся выдаць свае вершы ў друкарні? Вельмі добра было б, каб удалося. Я не маю жадання выдаваць на ратататары свае зборнікі. Уважаю за лепшае перапісваць іх ад рукі.

Каб я знаходзіўся ў іншых абставінах, — мог бы набыць невялічкую друкарню ў сваю ўласнасць. На друкаваннне кнігаў невялікага фармату выстарчае маленькага «барабанчыка» — ручной друкарскай машынкі велічынёй з ратататар. Такія «барабанчыкі» валяюцца ў кожнай нямецкай друкарні на сметніку. Ёсць фірмы, якія могуць (зразумела, за грошы) і шрыфтоў нарабіць. Ад «барабанчыка» і ад пары кілаграмаў шрыфтоў пачынала сваю дзейнасць і ўкраінская друкарня ў Зальцбургу.

Дружа, пасылаю табе на добрую памяць верш, прысвечаны М. Сяднёву. Таксама пасылаю і вершы «Майму каханню» і «Так і сталася».

Пераклады з Т. Шаўчэнкі і з Л. Палтавы — для друку. Май на ўвазе, што ў перакладзе з Палтавы захаваныя ўсе рытмічныя асаблівасці першатвора, чаго, мне думаецца, мусіць прытрымлівацца кожны перакладчык.

Што з «Шыпшынай»? Ці выдаецца? Калі яна спыніла свой выхад, дык перашлі пераклады А. Адамовічу. Адначасна перашлі (хоць раз выканай маю просьбу) і верш «Пачні з Гамера, ці пачні з Саграта», каб ён не марнаваўся ў рукапісе, і, калі можна, вершы «Дваццаць тры» і «Fröhliche Weihnachten», якія я паслаў раней Ю. Віцьбічу.

Не забудзься адначасна перасцерагчы А. Адамовіча: няхай друкуе паводле арыгінала і ні да чаго не прыкладае свае рукі. У іншым выпадку няхай не друкуе зусім.

Нашы выданні, дарэчы, спынілі свой выхад.

Што да асабістага жыцця — не варта і пісаць.

Альберт Кадняк, як выявілася, не здолеў страціць чалавечай годнасці і памёр, бедны, ад паху сала з суседніх пакояў. На змену яму зноў прыйшла здань Алеся Салаўя.

Паэму «Дваццаць пяць», якую ўжо канчаў, кінуў у печ. Збіраюся пісаць нанова. Цяпер, мабыць, будзе не паэма, а вялікі верш.

Выехаць нікуды не давядзецца, бо ніхто мяне не возьме. А ў Аўстрыі застацца — аддаць сябе на заўчасную пагібель. Буду чакаць таго, што прынясе лёс.

Паслаў тры вершы Яру Славуцічу.

Так і прайшлі ў мінулым годзе дзесятыя ўгодкі тваёй літаратурнай дзейнасці — незаўважна і ў супакоі. Шкада. Я нават не прывітаў цябе, бо не меў летась з табой лучнасці.

Пішы даты ў лістах, не забывайся. Яшчэ адна навіна — лысею. Галю цяпер галаву — рыхтык Махатма Гандзі або Хірогіто... Прабіваецца першы зуб мудрасці.

Перашлі да друку А. Адамовічу яшчэ верш «Снежань». «Спі» не пасылай. Гэты верш можа быць у зборніку, але асобна друкаваць яго не варта. А я тым часам падрыхтую і пашлю А. Адамовічу іншыя вершы, калі атрымаю ад яго адказ. Дарэчы, перашлі мне ягоны адрас. Бачыў велікодную газету «Час» на 24 балонках. Бязмежна захоплены поспехамі нашых суседзяў! І беларусы маглі б выдаць такую газету, каб мелі больш розуму.

Тым часам бывай здароў.

Цісну руку — *Алесь Салавей.*

27. МАСЕЮ СЯДНЁВУ

27 красавіка 1947 г.

Дружа Масей!

Пасылаю табе два паасобнікі папраўкаў да зборніка «Мае песні». Адзін паасобнік няхай застаецца ў цябе, а другі ласкава прашу перадаць А. Адамовічу.

Атрымаў 1-ы нумар часапісу «Сакавік». Чытаў рэцэнзію на свае «Званы».

Цверджанне пра дэманстрацыю супроць Ю. Віцьбіча й часапісу «Звіняць званы Святой Сафіі» з'яўляецца беспадстаўным і несур'ёзным, а таму было б лішнім адпаведна рэагаваць на яго. Рэцэнзент (ім, думаецца мне, ёсць А. Адамовіч) памыляецца, заяўляючы, што паэмка мае 11 актаваў. У ёй 11 строфаў на ўзор актавы (чатырохстопны ямб). Класічная актава ў нашай, як ва ўкраінскай і расейскай мовах, найлепш перадаецца пяцістопным ямбам з цэзурай на другой стапе. Нават Багдановічаву актаву «Як моцны рэактыў» трэба ўважаць за верш на ўзор актавы, напісаны шасцістопным ямбам.

Бай — не толькі міфічная істота, ужываная ў дзіцячым фальклоры. Баем называюць і апавядальніка казкаў, і музыку. Даць падрабязнае вытлумачэнне ў слоўніку я не меў змогі, бо не было месца.

Чаму ў часапісе друкуюць вершы строфамі ўмітушкі? Гэта выглядае па-дзіцячы, і калі хто-небудзь робіць так, дык не варта браць прыкладу.

Заўвага пра «несавецкасць» твораў А. Бялевіча будзе падставай для ліквідацыі паэты. Пэўна ж, часапіс трапіць у рукі Бялевічавых «апекуноў». Гэта вялікая і непапраўная памылка, зробленая часапісам.

Не забудзься аддаць А. Адамовічу папраўкі. Неўзабаве перашлю пару дзесяткаў вершаў.

Цісну руку — *Алесь Салавей.*

28. ВІТАЎТУ ТУМАШУ

8 траўня 1947 г.

Вельміпаважаны спадару доктару!

І апошні Ваш ліст, як і ўсе ранейшыя лісты, прынёс мне вялікую радасць. Дзякаваць Богу, што Вы атрымалі ўрэшце 4-ты нумар часапісу «Пагоня». Гэты нумар стаўся, напэўна, апошнім... Як я ўжо пісаў Вам, часапісы нашы больш не выдаюцца. Штуршком на часовае спыненне выдавецкай працы сталася распараджэнне ўладаў аб забароне распаўсюджваць часапісы па-за межамі таго месца, дзе яны выдаваліся. Але гэта фактычна не звязвала рук пасылаць іх ва ўсе куткі Аўстрыі, і само распараджэнне ў выніку працы рэпатрыяцыйнай камісіі было часовым. Галоўнай прычынай была нястача сродкаў,

выкліканая невялікай колькасцяй чытачоў і нябытнасцяй згоды, якая трывае далей.

А цяпер адна асоба пачала біць трывогу ў сваіх лістах у розныя мясціны, што вінавайцамі спынення выдавецкай працы з'яўляемся я і А. Грыцук, што мы, не парадзіўшыся з той асобай, а паводле ейных уяваў — з камітэтам, зрабілі ўсё сваім адумам. І апрача ўсяго гэтага, тая асоба звальвае ўсю віну заняпаду беларускага жыцця ў Аўстрыі на мяне і А. Грыцука і падкрэслівае, што каб не было нас на перашкодзе, дык было б усё — і выданні, і праца і г. д.

Я спатыкаў усякіх людзей на свеце. Але такое нахабства сярод сваіх людзей у такі цяжкі час ніяк не змяшчаецца ў маёй галаве.

І гэта тады, калі і я, пазбаўляючы сябе і сям'ю куска хлеба, і А. Грыцук, вытрачалі да апошняй магчымасці свае сродкі на тое, каб даць хоць пару друкаваных, хай на ратататары, словаў сваім людзям.

І гэта тады, калі тая асоба на наша зацікаўленне грамадскімі сродкамі, якія знаходзяцца пад ейнай апекай, паказала нам, прабачце, кукіш.

Я, як агню, баяўся і баюся нябытнасці еднасці і ўзаемаразумення, гэтага нашага няшчасця. Але што рабіць, калі той-сёй збіраецца на гэтым будаваць сваю папяровую дзейнасць і славу?

Непрыемна, што пэўныя нецікавыя драбніцы з нашага жыцця выходзяць за межы Аўстрыі. Але мне няма з кім падзяліцца, дык я дзялюся з Вамі і прашу прабачэння за такую маю шчырасць.

Што да Вашых заўвагаў на мой ліст да Беларускага дапамогавага камітэта ў Нямеччыне (у «Беларускія навіны» пасылаўся адбітак таго ліста), то хачу сказаць, што я якраз словамі «разам з гэтым трэба было пасадзіць на свае месца і іншых «салдацікаў» і «генералаў» і падаў думку, каб пасадзіць на свае месца і Віцьбічавых супрацоўнікаў.

Пішучы паэмку, я якраз і хацеў успомніць перажыванні палоннага Чарадзея, пададзеныя ў «Слове», але мне гэта не ўдалося... Аўтарам жа назову «Звіняць званы...», такога назову, якім ён ёсць, факт фактам, з'яўляецца Юрка Віцьбіч, і гэтага нельга адмовіць.

Успамінаючы засцярогі не да паэтаў-«усходнікаў», а наагул да «ўсходнікаў», я меў на ўвазе толькі пэўных людзей, якія, на жаль, яшчэ ёсць, а не беларускага грамадзянства. А дзялення на «ўсходнікаў» і «заходнікаў» сярод пісьменнікаў не толькі няма, але яго не існавала зусім.

Давялося бачыць мне 1-шы нумар часапісу «Сакавік». Шкада, што і гэты часапіс прадаўжае таўчы, казаў той, ваду ў ступе. Чытаў не зусім талковую рэцэнзію на мае «Званы...».

У 4-м нумары «Пагоні» бальшыня ілюстрацыяў выканана не мною, а адным беларусам-адвакатам.

Ласкава прашу перадаць маю картку Я. Сурвілу, што адначасна пасылаю.

Ладная колькасць DP з Аўстрыі выехала і выязджае цяпер у іншыя краіны. Я нікуды не еду.

Прывітанні Вам і Хв. Ільяшэвічу ад мяне і А. Грыцука.

З глыбокім паважаннем да Вас — *Алесь Салавей*.

29. ВІТАЎТУ ТУМАШУ

21 траўня 1947 г., Зальцбург

Вельміпаважаны спадару доктару!

Калісьці ў маленстве, вывучаючы геаграфію, я летуцеў аб замежных і заморскіх краінах, што паўставалі ў маіх уявах у поўнай велічы сваёй і красе, думаў пра стромыя Альпы, і найлепшым маім жаданнем было — пабачыць зманлівыя тады далёкія краіны, прыгажосць іхняе прыроды і авеяныя славаю помнікі іхняе мінуўшчыны…

Сяння я жыву каля тых самых, выпешчаных раней у думках, Альпаў. Але яны цяпер не прывабліваюць маёй увагі, не цікавіць мяне і краіна, у якой я жыву. Усё пахмурае, нуднае й халоднае, і да ўсяго я абыякавы… А сэрцу сняцца аксамітныя раўніны роднае й каханае Койданаўшчыны, блакітная Вуса, каля якое працякалі найшчаслівейшыя, хоць вельмі рэдкія й кароткія, дні маленства. Сніцца задумліва-ўважлівы і прыхільна-прываблівы любы Менск, «беларускі Каўказ» — Лагойшчына з сінявокаю Гайнаю, дзе адшумелі, хоць вельмі балюча й сурова, дні юнацтва.

Яна, адна-адзіная Яна, радзіма, стаіць у маіх вачах і ўдзень, і ўначы; я ўкленчваю штодня перад Ёю і малюся Ёй так, як умею. І не бачу я ні аснежаных Альпаў, і не быў нават у тых ведамых свету мясцінах, куды за вялікія грошы прыязджалі людзі з розных канцоў зямное кулі, каб пабачыць тое, што іх цікавіла, можа, больш, як некалі цікавіла мяне…

Я не магу, паверце мне, не магу пабываць там, дзе трэба было б пабываць. Кожныя адведзіны якой-небудзь мясціны яшчэ больш будуць распальваць мае ўспаміны…

Можна закінуць мне празмерную прывязанасць да свайго грунту, якая вывела мяне з раўнавагі, пазбавіўшы і пачуцця, і розуму. Але такое цверджанне было б няправільным… Нялюдскае існаванне забрала ў мяне ўсё. Не змагло забраць толькі таго, на што нельга забыцца, чаго нельга забраць.

Імкненне знайсці кавалак хлеба на пражыццё змусіла мяне шукаць такое працы, дзе можна зарабіць капейку грошай. Мне прапанавалі становішча зборцы грошай за пражыццё ў табары. Я адмовіўся ад такое працы. Лепш, сцякаючы потам і выбіваючыся з сілаў, варочаць каменні, чымся быць канцылярыстам або бюракратам. Люблю творчую працу, а не збор грошай ці падшыванне папераў. У цяперашніх умовах, праўда, не выпадае выбіраць. Я і не выбіраю, а толькі адмаўляюся быць рабом парожніх і бяздушных целаў.

Застаўся быў працаваць на фірму, што да збору лекарскіх раслінаў. Заробак там нядрэнны, што, зразумела, менш за ўсё цікавіла б мяне, каб не мучыў голад, і праца там на свежым паветры. Але не давялося там працаваць: апошнім часам яшчэ больш я страціў свой зрок, і цяпер нічога не бачу, што робіцца пад нагамі.

Працую цяпер у майстроўні па вырабу мэблі. Выконваю ўсякую дапаможную работу. Зарабляю 20 шылінгаў на тыдзень. А тыднёвае напаўгалоднае існаванне ўсёй сям'і каштуе 23 шылінгі.

Вось бачыце, вораг капіталу пачаў пісаць пра свой заробак. Нястача таго, чаго патрабуе жывот, змушае думаць жыватом, і думаць пра тое, да чаго павінен быў бы існаваць доступ за цвярозыя думкі галавы.

У грамадскім жыцці не бяру цяпер ніякага ўдзелу. Праектаваны рэлігійна-грамадскі часапіс не выйшаў і, мабыць, не выйдзе. На ўсё патрэбна праца, без яе нішто не даецца. Выдаваць часапіс — не пасквілі пісаць у розныя мясціны.

Шчыра дзякую Вам за апошні ліст. І ад нас неўзабаве пачнуць выязджаць да Ангельшчыны.

Мне трэба перабрацца ў Нямеччыну і заставацца там, не зважаючы на ўмовы й абставіны.

Найстрашнейшае — «друзья-товарищи». За імі — голад, галодная смерць. Але і гэта ўжо не палохае мяне. Усё роўна адзін раз паміраць.

Прывітанне Хведару Ільяшэвічу.

Бывайце здаровы!

З павакжаннем — *Алесь Салавей*.

30. ЮРКУ ВІЦЬБІЧУ

9 чэрвеня 1947 г.

Дарагі дзядзька Юры!

Мой ліст у Парыж да рэдакцыі «Беларускіх навінаў» быў адбіткам ліста да Беларускага дапамогавага камітэта ў Нямеччыне. Друкаваць яго ў прэсе я не меў намеру.

У лісце я хацеў абараніць сваё палажэнне, што да прысвяты паэмкі «Звіняць званы Святой Сафіі», і выступіць супраць зневажання Вас як пісьменніка. Вы надрукавалі ліст у часапісе «Шыпшына» без маёй згоды і самавольна выкінулі тыя мясціны, у якіх я радзіў знайсці найпамыснейшыя для Вас і агульнага дабра шляхі, каб дапамагчы Вам, ведамаму нашаму пісьменніку, пазбавіцца пэўных хібных, на маю думку, крокаў, зробленых Вамі.

Самавольна надрукаваны й скарочаны Вамі тэкст не становіць сабою тае цэласці маіх думак аб Вас, якую я хацеў выказаць.

Уважаю, што гэтым самым Вы парушылі маё права на аўтарства ліста і надрукавалі яго ў імя сваіх асабістых інтарэсаў, уводзячы ў блуд наша грамадзянства і ягоную думку аб лісце.

З паважаннем — *Алесь Салавей.*

31. АЛЯКСАНДРУ ЛАШУКУ

23 чэрвеня 1947 г.

Дарагі сябра Аляксандр!

У «Беларускіх навінах» давялося мне ўбачыць Вашы росшукі, і я ўжо збіраўся пісаць у Парыж, каб даведацца пра Ваш ад'езд. Сяння атрымаў ад Вас ліст, вельмі рады яму і вельмі дзякую за добрую памяць.

Шмат прайшло часу з тых дзён, калі мы былі разам, шмат чаго з'іначылася ў нашым жыцці, і сяння нават даводзіцца напружыць памяць, каб прыгадаць аб цікавых і нецікавых часінах з пражытага. Вельмі цьмяна мігціць у памяці наша сустрэча ў Менску. Тады я, здаецца, хваліўся Вам пад чаркай гарэлкі, што маю жонку й дзіця... Нічога гэтага тады ў мяне не было, і пабрацца мне давялося толькі ў Нямеччыне.

А наагул я не зусім той, якім Вы мяне ведаеце. Маё пражыванне ў Іллі было часовым змаганнем за выжыванне — на працы, што мне не падабалася й не вабіла мяне. Тады я спрабаваў зрабіцца на 10 гадоў старэйшым, каб мець большую павагу да сябе, ды гэта не ўдавалася: юнак, якім я тады быў, заставаўся юнаком. Мяне цікавіў зусім іншы свет, а не тое жыццё, у якім я перабываў. Невыносныя абставіны звязвалі мае імкненні — і з мяне атрымлівалася карыкатура: ні тое, ні сёе… Я сам саромеюся цяпер колішняга сябе.

Жыву цяпер у табары ДП. Нядаўна застаўся на вучобу ў майстроўню па вырабу мэблі — вучуся на валізках… Пісаць вершы, выдаваць часапіс, газету, ■ калі няма на гэта магчымасці — рабіць валізкі, будаваць дамы, дарогі, капаць каналы — творчая праца, і яна мне лепш падабаецца за працу бюракрата ў канцылярыі.

Апошнімі днямі павялічылася мая сям'я. Але абставіны жыцця палягчаюцца — з вучня пачынаю пераходзіць на самастойную працу і зарабляю ўжо невялікія грошы. Галоўнае, што зарабляю, бо гандлем не займаўся й не займаюся — не дазволю аддаць сваю душу на ўніжэнне годнасці дзеля капейкі ў імя жывата.

У Нямеччыну шляхі зачыненыя. Раней можна было перабрацца, але на гэта патрэбна была паперка, што ў Нямеччыне жывуць мае сваякі. Такой паперкі я не здолеў атрымаць ад сваіх сяброў.

Не варта злаваць на К. Ваўка за тое, што адышло. У святых я не веру, і кожны калі-небудзь каму-небудзь насаліў, як кажуць. У Нямеччыне жыве адзін чалавек, які не толькі насаліў мне некалі, але ледзь і на той свет не адправіў. Ды я не гневаюся цяпер на яго. Няхай жыве спакойна. Ён задурны, каб яму «дзякаваць». І К. Воўк — гэткі ж самы.

З грамадскага жыцця ў Аўстрыі няма чым пахваліцца. Нашых людзей тут вельмі мала.

Пішэце мне, калі ласка. Буду вельмі рады Вашым лістам. Моцна цісну Вашу руку.

З павяжаннем — *Алесь Салавей.*



Алесь Салавей.



Мікола Аўрамчык — сябра юнацкіх гадоў. 1938 г.



Масей Сяднёў. 1943 г.



Апошнія дні на радзіме... Валянцін Таўлай, Сяргей Хмара, Тодар Лебяда, Масей Сяднёў, Алесь Салавей, Уладзімір Сядура, Хведар Ільяшэвіч, Аляксей Анішчык. Менск, 1944 г.



Гэты здымак Алесь Салавей
падараваў Беларускаму музею
ў Вільні. 1943 г.



Алесь Салавей
з сынам Міхасём.
Зальцбург, 1947 г.



З украінскімі сябрамі
Ігарам Качуроўскім
і Барысам Аляксандравым.
Зальцбург, 1946 г.



Першая кніга «Мае песні». Рыга, 1944 г.



Гучыць слова паэта.



Алесь Салавей выступае
на ўгодках Слуцкага паўстання.
Мельбурн, 1969 г.



У Адэлаідзе, 1950-я гг.



Жонка паэта Зінаіда Кадняк.



Алесь Салавей з жонкай Зінаідай і дзецьмі: Ганнай, Міхасём і Юркам. 1950-я гг.



Паэт на пабудове ўласнага дома. 1951 г.



З жонкай на адпачынку. 1960-я гг.



На шпацыры. Мельбурн, 1951 г.



Алесь Салавей з суайчыннікамі. 1950-я гг.



Калядная паштоўка
з вершам Алеся Салаўя
(выдавецтва «Бацькаўшчына»).



З Міколам Ніканам
і Антонам Адамовічам.
Мельбурн, 1977 г.



«Вазьмеце, птахі, і мяне
з сабой за акіяны...»




Сустрэча з сябрамі.



З жонкай і ўнукамі на акіянскім узбярэжжы. 1970-я гг.



Рэчка Вуса ў ваколіцах Крысава – на радзіме паэта.



Бывайце

Бывайце, радасьць і цёплы сустрэчы,
Сябры і сёстры родныя, браты!
[illegible] [illegible] зорнае [illegible]
нас не разлучыць з думкамі ўдалечы.

Радзімы розум — не цяжар на плечы,
У ім [illegible] зямлі [illegible]
Ён абмінае шлях [illegible], [illegible]
Да тое светлае ад цемры і галечы.

Аўтограф верша
А. Салаўя «Бывайце».



Магіла паэта ў Мельбурне.

32. МАСЕЮ СЯДНЁВУ

4 жніўня 1947 г.

Дружа мой!

Хто там у вас распаўсюджвае сатырычныя вершы пра вучоных і пісьменнікаў, падпісаныя маім імем? Што за рудыменты некультурных звычак? Гэта не толькі некультурныя звычкі, гэта літаратурнае хуліганства, якое трэба прыраўняць да крыміналу. Я не ведаю, якія там вершы. Калі нават хто-небудзь прыхаваў колішнія мае жартоўныя вершы і цяпер выкарыстоўвае іх у сваіх брудных справах, дык гэта таксама злачынства, якое мяжуе з басяцтвам.

Я далёка ад усяго гэтага. Звяртаюся да цябе, як да сябра, ласкава прашу цябе — набі морду ганебным злачынцам ад майго імя.

Гэтым разам я парашыў даць табе магчымасць адпачыць ад маіх лістоў, і адпісваю са спазненнем. Шчыра прызнацца, мне і не было аб чым пісаць. Зменаў у маім жыцці амаль не адбылося, калі не браць на ўвагу таго, што паменшаў ростам і больш прыгнуўся да зямлі.

Суседзі мне радзяць выязджаць у Венесуэлу або ў Чылі (толькі ў гэтыя краіны ды яшчэ ў Бразілію ёсць магчымасць ад нас выехаць). Мне кажуць, што ў тых краінах я выратую ад пагібелі і сябе, і сваю сям'ю. Мяне запэўняюць, што там я зараблю шмат грошай, неўзабаве змагу стаць собснікам, а гэта — добрае будучае для маіх дзяцей. Мяне пераконваюць, што, прыкладам, Чылі — краіна цёплых водаў, і я нідзе лепшага месца не знайду. І Алёшка зусім паважна радзіць мне выязджаць у Чылі. Ад усіх гэтых парадаў мяне пачынае браць ліха. Стварыўся такі цяжкі духовы стан, што я пачынаю сумнявацца — ці не стаў я вар'ятам? І малаток на працы ў майстроўні, і гул самахода на вуліцы, і кожны пабочны гук — усё крычыць мне ў вушы: «Не едзь! Нікога не слухай!» «Не едзь! Не едзь!» — штосьці гукае і ў глыбіні душы. Спатыкаешся з кім-небудзь: «Дабрыдзень! — Дай Божа здароўя!» «Ну як, запісаліся да Венесуэлы? Не? Дрэнна робіце, хутчэй выязджайце адгэтуль...» Людзі маюць рацыю — у Аўстрыі жыць нельга. Але ж ці можна выязджаць з агню ды ў полымя з сям'ёю, з маімі поглядамі на жыццё, ад якіх нізавошта не адракуся?..

Апошняга тыдня штоночы паўзлі на мяне ў сне агністыя хіжыя змеі, з'яўляўся Алёшка ў даўгой белай сарочцы з касою ў руках. Я ўсхопваўся без памяці з ложка, хацеў уцякаць з пакоя, стукаўся га-

лавой аб дзверы і прачынаўся. Калі спатыкаўся з Алёшкам удзень, мне думалася, што ў ім сядзіць нешта нячыстае.

Я пішу табе аб усім гэтым, добра ведаючы, што такую шчырасць заўсёды абгаварваюць і заўсёды з яе смяюцца. Цяпер у модзе іншая «шчырасць» — тая, што ўважае сябе за найшчаслівейшую, хоць грызуць яе вошы і гняце гора. І заўсёды ў модзе маска сляпога з дурной усмешкай (нядрэнная характарыстыка аптымізму). Гэта — аксіёма, гэта — праўда.

Вось такія ў мяне навіны... Усё ж тры тыдні таму, у нядзелю, я выбіраўся на агледзіны лёдавых пячораў — красы Аўстрыі, найпрыгажэйшых пячораў у свеце. Каб пабачыць іх, трэба было ўзбірацца на вышыню 1650 метраў. Я ўзабраўся, хоць цяжка пасля адхвараэў. Захапленню майму не было канца... Летась бачыў колькі іншых прыгожых мясцінаў.

Пішы, дружа. Калі табе будзе вельмі цяжка адпісваць мне — не бойся спазніцца з адказам. Я не буду гневацца. Цвёрда пераканаўся, што я ў свеце — зусім адзін, і ўжо зміры ўся з гэтым.

Бывай здароў. Моцна цісну тваю руку.

Заўсёды твой — *Алесь Салавей.*

33. ВІТАЎТУ ТУМАШУ

10 жніўня 1947 г.

Вельміпаважаны спадару доктару!

Я не хацеў так спазніцца з адказам на Ваш ліст. Мала не два месяцы адпісваю Вам і ўвесь час нішчу бадай закончаныя лісты — у кожным радку бачу: такое мізэрнае й нікчэмнае маё жыццё, што цяжка аб ім пісаць і прызнавацца.

Сяння ізноў пішу. Бо яшчэ цяжэй жыць без лучнасці. А навіны ўсё роўна нецікавыя.

У майстроўні, дзе я застаўся на працу, набыў фах валізкара і працую цяпер самастойна. Зрок мой, зразумела, не перашкодзіў гэтаму, бо бачу праз акуляры вельмі добра. У мінулым лісце я ўспомніў пра зрок між іншага — якраз тады не бачыў таго, што мяне не цікавіць...

Толькі я не пачуваю сябе шчаслівым на валізках; мая душа не выйшла з «часовага тупіка», а трапіла ў яшчэ «горшы тупік». Матэрыяльнае жыццё таксама не палепшылася, а сям'я з волі Божае ізноў

павялічылася пад скептычныя ўсмешкі найразумнешых. Супроць волі Божае цяжка стаць — няхай сабе дурні плодзяцца, а разумным Бог і гэтага не дае.

Людзі ад'язджаюць і збіраюцца да ад'езду. Разам з гэтым прыпамінаецца рынак, на якім нашы дзядзькі прадавалі коней. Купец аглядаў каня з ног да галавы, шчупаў яго, глядзеў у зубы, ляскаў далоняй па спіне і выгукваў: «Годзен! Купляю!» І купляў. Куплялі і з адным вокам, як Вы пішаце, інакш кажучы, аднавокіх ці зусім сляпых — абы толькі былі дужыя, абы маглі цягнуць лямку.

Я належу не да «кавалёў-вернідубаў» і, застаючыся тым, кім ёсць, прадаўжаю шанаваць чалавечую годнасць. Таму мне не так лёгка думаць аб тым, што мяне чакае наперадзе, або аб тым, што рабіць, каб куды-небудзь выехаць. Гэта па-першае. Па-другое, я маю зацікаўленне, якім жыву, якога не магу сам, добраахвотна, пакінуць, або аддаць яго на пагібель. Ператварыцца ў парожняе цела без душы ў імя мізэрнага жывата можна, але гэта — не мой ідэал. А з думкамі, што ўздымаюцца вышэй жывата, цяжка сяння куды-небудзь крануцца. Па-трэцяе, сям'я мая — не для пярэбараў у экзатычныя краіны. А па-чацвёртае, нельга больш заставацца на месцы.

Вось што мяне мучае, вось што не дае мне супакою. Больш я не магу пісаць — чаго добрага, плакаць пачну.

Навіны з грамадскага жыцця: пры Беларускай праваслаўнай парафіі ў Зальцбургу закладзена Брацтва Святой Афрасінні Полацкай. Гэта — адзіная на сяння рэлігійна-грамадская арганізацыя беларусаў у Аўстрыі.

Уладзімір Дудзіцкі выехаў у Венесуэлу. «Апазіцыі» цяпер няма.

На гэтым канчаю. Найшчырыя прывітанні.

З павжаннем — *Алесь Салавей.*

34. ЯНУ ПЯТРОЎСКАМУ

26 жніўня 1947 г.

Вельмішаважаны спадару!

Хочацца выказаць найшчырэйшую ўдзячнасць за Вашую ўвагу да мяне, але не хапае словаў; абмяжуюся тым, чым магу: вялікае Вам дзякуй!

Вы пішаце: «Як жа Вы дапусцілі аж да гэткага?» Няўмольнага лёсу абысці я не змог, і тое, што цяпер перажываю, пачалося ўжо год таму.

Можна цярпець і год, і два — гледзячы як. Бывае гэтак, што і году не выцерпіш. І маё цярпенне дайшло да сваіх межаў, мяне ўжо ўзяло ліха. А з волі Божае павялічылася яшчэ мая сям'я. Майму другому дзіцяці, дачцэ, спаўняецца тры месяцы.

Ні аб чым не магу сур'ёзна думаць. Галоднага, мабыць, нішто не цікавіць, апрача ежы — патрабаванні жывата становяць сабой найвышэйшы ідэал. Зарабляю толькі 150 шыл. на месяц і пайшоў на працу толькі таму, каб хоць гэта зарабіць. Жыву на тым, што атрымоўваю ў лагеры. Майго заробку ледзь выстарчае на выкуп прызначанага. Не на паступовае паміранне, а хоць на такое-сякое існаванне ўсяе сям'і патрэбна блізу 1000 шыл. на месяц (дарэчы, у агульным катле — заўсёды палова таго, што можна мець на картку індывідуальна).

Вам ведамы прыдзел на дзяцей да 3 гадоў; майму сыну нават не стае таго, што належыць дваім — яму і ягонай сястры. Даводзіцца дадаваць ад сябе, і сын пачуваецца, дзякаваць Богу, добра. Дачцэ не зусім добра — мала малака, маці выбіваецца з сілаў. Я яшчэ цягаю ногі так-сяк, але настрой канчальна дабівае.

Усё гэта, аб чым пішу, — мабыць, у аднаго мяне ва ўсім Зальцбургу, бо толькі адзін я не маю тых крыніцаў, што маюць гэткія, як я, сярод арганізаваных эмігрантаў, і адзін я не ўмею займацца гандлем — адзінай падтрымкаю нашага брата. Гандаль, здабыццё хлеба па-за прадугледжанымі законамі — не мая стыхія. У першы ж дзень я абанкроціўся б, і тыя, каму быў бы вінаваты, распаролі б мне жывот. Адзіны мой крок па-за прадугледжанымі межамі расхістаў бы мае нервы, і першае начы я лопнуў бы ў ложку ад нервовае ўзбуджанасці. Усякія адваротныя пераконанні мяне ў гэтым не маюць і не могуць мець поспеху.

Выехаў бы ў Ангельшчыну або ў Францыю — з сем'ямі туды не бяруць. Падаўся б да Нямеччыны, ля сваіх мо было б крыху лягчэй, — не пускаюць. А ў Паўдзённай Амерыцы я і 150 шыл. не зараблю. Не з маімі сіламі змагацца з тамтэйшай экзотыкай… Зразумела, маючы ў галаве трошкі розуму, не варта брацца за гуж, якога не пацягнеш. Лепш загінуць там, дзе трэск пад сілу, чымся там, дзе пшык не па сілу.

Было б вялікім шчасцем для мяне атрымаць дапамогу, аб якой Вы пішаце. Кажуць, што лепш гінуць, не патрабуючы дапамогі, адмаўляючыся ад яе. Мо гэта і праўда, але мне больш падабаецца іншае: даюць — бяры, б'юць — уцякай. Гэта — шчырыя мае словы. І лепш быць шчырым, хоць можа крыху шурпаватым, чымся салодзенькім, але няшчырым.

Апрача харчоў, нічога іншага не патрабую.

Частка нашых людзей ужо раз'ехалася. Але бальшыня — яшчэ ў Зальцбургу.

Учора хлопцы паслалі Вам Вашыя кніжкі.

Найшчырэйшыя прывітанні Вам і Вашай сям'і.

З паважаннем — *Алесь Салавей.*

35. ЯНУ ПЯТРОЎСКАМУ

30 жніўня 1947 г.

Вельміпаважаны спадару!

Прабачце мне, калі ласка, я мушу шчыра прызнацца: з пэўных меркаванняў і прычынаў я не змагу запоўніць прысланай мне анкеты. У дадатак да майго мінулага ліста магу дадаць яшчэ наступнае: прозвішча маё — Кадняк, імя — Альберт, нар. 29.4. 1922 г., беларус з Польшчы, нерэлігійны, літаратар і некваліфікаваны работнік. На ўтрыманні жонка (нар. 1922 г.) і двое дзяцей: аднаму год і чатыры месяцы, другому — тры месяцы. Дзеці і жонка — праваслаўныя.

Яшчэ раз прашу прабачэння. Калі незапоўненая анкета перашкодзіць мне атрымаць дапамогу ад Вашай арганізацыі (хоць я, зразумела, не маю на дапамогу права і не заслугоўваю на яе), — нічога не зробіш. Хай гэтыя словы не выклічуць у Вас благой думкі пра мяне, я не збіраюся Вас пакрыўдзіць гэтым або абразіць. Застаюся вельмі ўдзячным Вам за Вашую ўвагу да мяне і буду памятаць пра гэта заўсёды. Вашая ўвага падтрымала мяне і абнадзеіла, я выйшаў на мамэнт з цёмнага лёху адзіноцтва на святло, адчуў каля сябе сваіх блізкіх, пераканаўся, што сярод іх не прападу. Адзін за ўсіх — усе за аднаго, і адчуваеш у сабе моц і сілу, думаючы пра гэта. І пры ўсім гэтым анкета — бязвартасная паперка, яна — толькі фармальнасць. Я разумею, без яе цяжка абысціся, але анкеты прыносяць мне страх, напамінаюць аб жахлівым мінулым, ад першага іхняга пытання цямнее ўваччу, і рука адмаўляецца пісаць. Ні голад, ні пагроза смерці, а толькі страх перад карай за непаслухмянства (а ў такіх, як я, гэтая кара — страшней смерці) змушаў і змушае іншым разам нават цяпер запоўніць анкету. Гэта — прычыны; пра перакананні змоўчу, бо яны — або мая абмежаванасць, або рацыя; няма пэўнасці — варта маўчаць.

Успомненае маё прозвішча не павінна з'іначыць майго адрасу — пісаць мне трэба, як і раней, на псеўданім, бо ніхто тут майго прозвішча не ведае.

На гэтым [redacted] канчаю.

З павbooжаннем — *Алесь Салавей.*

36. АЛЯКСАНДРУ ЛАШУКУ

10 верасня 1947 г.

Вельміпаважаны сябра!

Зайздрошчу Вам, што маеце магчымасць выехаць у Ангельшчыну. Хай і не зусім добра будзе Вам там з матэрыяльнага гледзішча, хай будзе цяжкая праца з малой надзеяй стаць на ногі і разгарнуцца, але духовае Ваша жыццё будзе больш-менш забяспечана. Там, у Ангельшчыне, шмат нашых людзей. Нашаму палітычнаму эмігранту-інтэлігенту, мне думаецца, спажытак для душы мае большае значанне, чымся сала й крупы, будучыя грошы ці багацце. І не толькі спажытак наагул, а супольнае імкненне да сваіх найдаражэйшых ідэалаў, у імя якіх спаткаліся з лёсам бяздомнага бадзяння ў свеце.

А для мяне Францыя або Ангельшчына застаюцца толькі летуценнем. З малымі дзецьмі туды не пускаюць. І давядзецца, мабыць, выязджаць у Бразілію або ў Аўстралію — туды, дзе нашых людзей будзе вельмі мала. Хутчэй за ўсё так і станецца; толькі туды і можна цяпер ад нас выехаць, а заставацца чакаць іншых магчымасцяў нельга, зусім нельга. У Аўстрыі няма як больш жыць, хоць і выезд не прынясе нічога добрага. Усё гэта — мая няўцеха, на ўнікненне якой не стае ўмельства.

Вось якія ў мяне апошнія клопаты і навіны. Навінамі з грамадскага жыцця таксама цяжка пахваліцца. Беларусаў у Аўстрыі вельмі мала. Што было — і тое распалася, а што ёсць — не асмельваюся, каб гаварыць аб ім сур'ёзна.

Дзякую за Ваш ліст і жадаю памыснасці ў Вашым жыцці і поспехаў у здзяйсненні Вашых планаў і намераў. Усяго найлепшага.

З паважаннем — *Алесь Салавей.*

37. ЯНУ ПЯТРОЎСКАМУ

11 верасня 1947 .

Вельміпаважаны спадару!

Так, я песімісты. І цешуся, што не страціў здольнасці глядзець на свет запраўднымі вачыма, успрымаць жыццё такім, якім яно ёсць у запраўднасці. Не можа, паважаны спадару, быць непесімістам чалавек, здольны цвяроза думаць. Трэба было б ператварыцца ў абмежаваную й тупую істоту, каб быць аптымістам — маскай сляпога з дурною ўсмешкаю — і цешыць сябе самога тым, чаго няма або не можа быць.

Паходжу я з рыма-каталіцкага роду. Хрысцілі мяне ў касцёле. Я не напісаў у сваім лісце, што я бязбожнік або няівернік, а напісаў, што нерэлігійны (не ў сэнсе няверы ў Бога, а ў сэнсе непрыналежнасці да пэўнага веравызнання). У Бога веру, і веру, мабыць, мацней за таго, хто пра Бога шмат гаворыць, але не залічаю сябе да якой-небудзь рэлігіі (веравызнання), бо тыя, якія існуюць і якімі я цікавіўся, не дазваляюць мне гаварыць з Богам так, як падказвае маё перакананне й светаадчуванне.

Што да сваіх дзяцей, запэўняю — калі буду жывы, яны не трапяць па-за межы нашага будучага адраджэння. Як іх выхоўваць — ведаю, калі не вельмі добра, дык больш-менш, але ўсё ж не горш за тых, хто мяне вучыў дагэтуль.

У дадатак — я індывідуалісты. Хачу быць такім, якім з'явіўся з волі Божае на белы свет, а не такім, якім жадаў бы бачыць мяне, вымуштраванага, тлумлівы натоўп — і палітычны, і непалітычны. Мая асабістая, індывідуальная вера ў Бога мацнейшая за сплямленую натоўпам веру, і я перакананы, што гэтая мая вера ні трошкі не адхіліць мяне ад нацыянальнае прыналежнасці — справы крыві.

Не прымеце, барані Божа, маіх думак на свой кошт, імі я дзялюся толькі з Вамі.

Застаюся з глыбокай удзячнасцяй за Вашую ўвагу да мяне, як да чалавека. З паважаннем да Вас і да Вашае сям'і, з найшчырэйшымі прывітаннямі —

Алесь Салавей.

38. МАСЕЮ СЯДНЁВУ

21 верасня 1947 г.

Дружа мой!

Не губляючы веры ў тое, што ты — добры хлопец і мой найлепшы сябра, ласкава прашу цябе: прышлі мне свой зборнік «У акіяне ночы», 3-ці і 4-ты нумары «Шыпшыны» і, калі выйшаў, 5-ты. Добра было б, каб прыслаў яшчэ і нумары часапісу «Звіняць званы Святой Сафіі» (я маю толькі 2-гі й 4-ты нумары). Цяпер пошта прымае пакункі да паўкілаграма, значыцца, можна прыслаць. Не кладзі гэтай справы пад сукно, выканай маю просьбу. Даруй мне за гэткі тон, ты ж сам добра ведаеш: калі не папросіш цябе — нічога не будзе.

Дзякуй за твой ліст. Адклад не ідзе на лад, таму адразу адпісваю. Адкладзеш на дзень — атрымаецца на месяц, а то й больш. Гэта — абыякавасць, а не гультайства, бо гультайства — дабраякасная асаблівасць дасканалага чалавека, а працавітасць уласцівая толькі абмежаваным людзям. Ты, зразумела, не абмежаваны.

Навіны і ў мяне нецікавыя. Ужо не працую там, дзе раней працаваў — няма збыту. Цяпер збіраюся ўладзіцца на працу ў фірме, што да пракладання каналізацыі. Умовы працы цяжкія, але гэтая фірма выдае штомесяц чатыры дадатковыя харчовыя карткі. А голад штурхае чалавека куды хоцькі.

Толькі Венесуэла і ўсміхаецца мне. На выезд пачынаюць націскаць, а туды, дзе сваіх больш будзе, як ты пішаш, цяжка трапіць з малымі дзецьмі.

З Дудзіцкім ні я, ні Аляксей (Грыцук) не развіталіся. Ён сам вінаваты, і разлучыліся мы ворагамі. Гэта нецікавая навіна, але я нічога не мог зрабіць.

Я не заграз тут і з дапамогай суседзяў змог бы пераехаць у вашы мясціны. Але ж нашы мудрагелы не маюць ні спрыту, ні здольнасці, каб прыпісць каго-небудзь у цяперашніх абставінах. А пасяліцца ў суседзяў, ізноў дакучаючы ім, не выпадае. Гэта змусіла мяне махнуць на Баварыю рукой. Пры першай нагодзе падамся, мабыць, да Аўстраліі. Ці загіну там, ці застануся навекі ў адзіноцтве — гэта мяне цяпер не цікавіць.

Зразумела, пры ўсім гэтым не можа быць і размовы аб працы над новымі рэчамі, хоць ніколі яшчэ не меў такога натхнення й ахвоты да працы, як цяпер. Ахвота ёсць, але патрабаванні жывата адсоўваюць

яе на задні план. Дык я седнем сяджу начамі, мучаючы сябе, над французскай мовай (узяўся таму, што ў 1945 годзе ўжо браўся за яе трохі). Нямецкую мову вывучыў збольшага (найлепш — тэарэтычна), з лацінскай пазнаёміўся, вывучу і французскую!

Застаецца толькі радавацца і цешыцца весткамі, што Юрка Віцьбіч вяртаецца ў асяроддзе нармальных людзей. Я яшчэ не пакінуў гневацца на яго за выкарыстанне майго ліста, за бруднае друкаванне і распаўсюджванне ў ягоных асабістых інтарэсах маіх колішніх жартоўных вершаў. Па завуголлі змагацца я не збіраюся, а калі трэба будзе, дык патраплю змагацца з Леонасамі Кравіс-Чаніўсамі і сам, і буду змагацца адчынена і больш сур'ёзна. Ласкава прашу перадаць гэтыя словы Юрку Віцьбічу.

А Цэлеш няхай лепш працуе над падвышэннем сваёй веды і вывучае беларускую мову, а не закладае «хаўрус». Мне думаецца, што «хаўрус» гэны — нядрэнная справа, толькі за ягоныя закладзіны павінны ўзяцца сур'ёзныя людзі. І закласці трэба так, як закладаюць свае хаўрусы нашы суседзі.

Ці будзе надалей выдавацца «Шыпшына»? Напішы мне, тады я вышлю яшчэ што-небудзь.

Хіба ты не ведаў, што матэрыялісты й шкурнікі аж сцаць, прабач, каб хутчэй трапіць у які-небудзь Парагвай або Уругвай? Апошнім часам я зміры́ўся з усім, крыху атупеў і нервы мае супакоіліся. Сплю цяпер спакойна.

Не хочацца, вельмі не хочацца выбірацца ў акіян ночы, беспрасветнае цемры й адзіноцтва. Але што зробіш? Выбару я не маю.

Хто гэты М. Гук?

Моцна цісну тваю руку — *Алесь Салавей.*

39. МАСЕЮ СЯДНЁВУ

24 верасня 1947 г.

Дарагі дружа Масей!

Мой падрыхтаваны да друку зборнік вершаў «Сіла гневу» якраз і становіць 96 балонак тэксту (усё горшае і непажаданае я адсеяў). Але, на жаль, я маю толькі адзін перапісаны ад рукі паасобнік зборніка (чарнавікі я спаліў)… Ты, зразумела, паінфармаваны аб цяперашнім маім палажэнні; дастаць пісальнае мышынкі напракат

не магу, а таму ад сяння пачынаю старанна перапісваць рукою ўвесь тэкст, каб паслаць табе для друку. Буду перапісваць так, каб рукапіс станавіў сабою люстэрка будучай кнігі. Яшчэ раз скарачацца вельмі не хочацца, а таму зборнік мае выглядаць так: калі набіраць тэкст корпусам, кніга будзе мець фармат «Маіх песняў» (прыблізна 15 на 21 см). Але з гэтага палажэння ёсць выхад: калі набіраць тэкст петытам, памер будзе станавіць кнігу малога фармату (прыблізна 12 на 16,5 см). Калі ж яшчэ зменшыць фармат, тады кніжка павінна дайсці да аб'ёму ў 112 балонак. І я буду вельмі ўдзячны, калі гэтыя мае планы будуць падтрыманыя. Умовы мае будуць зусім магчымыя: ад 1000 паасобнікаў я запатрабую толькі 100 — у лік ганарару.

Усё гэта пачынае мяне кідаць ва ўстрывожаную выдавецкую «трасавіцу» (ліхарадку): ці знойдзецца добры карэктар? ці будзе каму дагледзець? Я вялікі вораг усялякае абыякавасці ў выданні кніжак.

Малюнак вокладкі я прышлю сам. Малюнкаў да трох раздзелаў рабіць не буду — можна будзе абмежавацца і звычайнымі друкарскімі літарамі. Нават калі вокладка запатрабуе шмат клопату, можна не рабіць і клішэ, а проста друкарскім шрыфтам паслугавацца.

Значыцца, знаходзячыся ў цяперашнім сваім пекле, я буду старацца, каб да канца кастрычніка ўсё перапісаць. Зраблю ўсё магчымае, каб у першых чыслах лістапада ты атрымаў рукапіс зборніка.

А можа і сам, пры своечасовым інфармаванні змагу прыйсці, каб зрабіць карэктуру. Чакаю падрабязнага адказу. Усё гэта — пэўная справа ці не?

А цяпер дзякуй і яшчэ раз дзякуй за ўвагу. Жадаю ўсім «усечасным» (мабыць, ты іх разумееш пад словам «зарубежнікі») многіх летаў за намер дапамагчы ў выданні кніжкі. Робяць добрую справу — вялікая падзяка ім за гэта, шкодзяць — палітыка, а яна мне ні ў галаве, ні ў іншым месцы.

У зборніку ў адным вершы будуць «крывічы» і «Крывіччына», дык ты дурням скажаш: для Салаўя гэта тое самае, што для грэкаў, напрыклад, — Элада.

А так хацелася б выдаць зборнік да ад'езду ў няведамы свет!

Пасылаю адначасна фатаграфію на добрую памяць. Напішы — ці атрымаў.

Можа, давядзецца перадрукаваць там, у вас, зборнік на машынцы? Тады, можа, лепш пасылаць часткамі? Дык першую (1/4) частку я змог бы паслаць праз тыдзень. А яшчэ праз тыдзень — другую і г. д.

Напішы. Калі перадрукоўвацца будзе ў вас, пажадана захаваць пры перадруку «люстэрка», перагледзець старанна тэкст перад друкарняй, захаваць націскі, што будуць азначаны ў рукапісе. Ці будзе каму зрабіць усё гэта? Ці згодзішся, скажам, ты?

Я буду ставіць вымогу: без папраўкаў і з'іначанняў. Ці згодзяцца на гэта выдаўцы?

Пад чыім кіраўніцтвам і наглядам будзе выдавацца кніжка? Калі пад тваім — мне вельмі прыемна.

Бывай!

Алесь Салавей.

40. АЛЯКСАНДРУ ЛАШУКУ

3 кастрычніка 1947 г.

Вельміпаважаны сябра!

Нядрэнную фатакартку пашчасціла Вам зрабіць у Італіі. Выглядаеце вельмі добра — таксама, як і раней, ні трошкі не з'іначыліся. Дзякуй Вам. Адплаціць узаемнасцяй, на жаль, не магу, бо сфатаграфавацца ў нас — цэлая праблема, грошай можна не мець, а вось амерыканскія цыгаркі — абавязкова. Усё гэта так ужо мне надакучыла, што я нікуды не хаджу і нічога не патрабую.

Шылінг, пасланы Вамі ў купэрце, я атрымаў. З такіх грошай ходзяць цяпер толькі аднашылінгавыя, двухшылінгавыя і пяцішылінгавыя банкноты. А наагул у грашовых справах я мала паінфармаваны, бо яны для мяне — чужы і далёкі свет. З Нямеччыны ні грошай, ні пакункаў пасылаць сюды нельга. З Ангельшчыны пакункі ў Аўстрыю прымаюць.

Пасылаю на Вашу просьбу грашовы перавод з паштовымі маркамі на 1 шыл. Паводле такой аплаты можна пасылаць да 50 шыл.

Навіны ў мяне па-ранейшаму нецікавыя. Цешыў сябе выездам з Аўстрыі, а выехаць цяжка. Трэба мець добрыя мазалі на руках, каб спадабацца камісіі. Застаецца мне ранейшая ўцеха — далейшае існаванне на святым духу.

З 1-га і 2-га нумароў «Пагоні» нічога не засталося — усё разаслалі. Далей часапіс не выдаецца.

Глыбока ўдзячны Вам за Вашы старанні мне дапамагчы. А наагул: не клапацецеся, калі ласка, аб дапамозе для мяне — я на яе не заслугоўваю. Дапамагаць такой мізэрнай істоце, як я, — вялікі

грэх. Той, хто пазбаўлены магчымасці працаваць на карысць Бацькаўшчыны, — даўно памёр, і яго трэба скрэсліць з памяці.

Я не жыву тады, калі [illegible] працую толькі для свайго жывата і для таго, хто выплачвае мне грошы. А таму мне не ўсміхаюцца замор-скія «магчымасці». Можа, мне асабіста і лепш было б ад гэтых «магчымасцяў», але для радзімы й народу лягчэй ад іх не будзе. Цяпер я імкнуся насустрач ім не як чалавек, а як прадажная істота, што баіцца смерці, голаду й цвёрдай пасцелі пад бокам.

Не грашыце Богу й Бацькаўшчыне, дапамагаючы мне!

З павmembranaжаннем — *Алесь Салавей.*

41. МАСЕЮ СЯДНЁВУ

16 кастрычніка 1947 г., Зальцбург

Дарагі дружа!

Кніжку «У акіяне ночы», часапісы «Звіняць званы Святой Сафіі» і «Шыпшыну» атрымаў. Дзякую. Шкада, што не прыслаў ты ўсіх часапісаў, якія я прасіў. А цікава было б пабачыць у 4-м нумары «Шыпшыны» мой славуты ліст.

Чаму перакруцілі апошні радок у «Тэрцынах» М. Багдановіча? І трэба было вам аж другі раз надрукаваць мой вершатвор «У дзень нарадзінаў» — гэты непараўнальны ўзор бяздарнасці і графаманства!

Са зборнікам ідзе туга. Ім я моцна расчараваны. Пастараюся хутчэй пасланць, бо калі застанецца ў мяне — спалю, неадкладна спалю.

Сяння пасылаю частку тэксту. Неўзабаве будзе выслана і рэшта (пачатак і канец). Калі фармат кнігі будзе гэткі, як і «У акіяне ночы», дык няхай набіраюць такім жа шрыфтам — усё змесціцца. У маім рукапісе толькі адна васьмістрофная балонка і дзве — сямістрофныя. Калі канец верша «У гэты дзень» (35 бал.) пасунуць на адну страфу ніжэй, дык тады ва ўсім зборніку будзе ўсяго тры сямістрофныя балонкі. Змест зойме 2 бал. (95-ю і 96-ю). У змесце не трэба рабіць разбіўкаў паміж радкамі.

У тых трох вершах, якія займуць тры балонкі па 7 строфаў, няхай друкары зробяць на адзін пункт меншыя разбіўкі паміж радкамі і на два пункты — паміж строфамі, — тады напэўна ўсё змесціцца. Меншыя на пункт-два разбіўкі не будуць кідацца ў вочы. Ёсць два шасцістрофныя вершы з motto — хай і іх набіраюць з меншымі разбіўкамі.

У выпадку, калі ўвесь тэкст не ўвойдзе ў 96 балонак, можна зняць вершы «Вільня» (18 бал.), «Мая сталіца» (19 бал.), гэта дасць дзве балонкі. І яшчэ на ўсякі выпадак зазначу: пры кончай патрэбе можна зняць і вершы «Нябёсы ранкавым абмыліся дажджом» (62 бал.), «Каб сказалі» (75 бал.), «Толькі выгляне» (76 бал.), што дасць яшчэ чатыры балонкі.

У дадатак да мінулага ліста паведамляю аб яшчэ адной вымозе: без маёй згоды друкаваць у перыядычных выданнях вершы з пасланага рукапісу нельга.

Да зборніка ўвайшлі і тыя раннія вершы (бальшыня іх, зразумела, падгладжаная пры апошняй рэдакцыі), якія свайго часу ўваходзілі ў рукапіс «Маіх песняў», але пазней былі знятыя з прычыны абмежаванага аб'ёму зборніка. Частка ранніх вершаў, што таксама мела ўваходзіць у «Мае песні», залічана да майго трэцяга зборніка «Вянкі». У яго ўвойдуць і тры вянкі санетаў (1945 г.), і паэмы «Домік у Менску» і «Сын» (1946 г.). Усе гэтыя рэчы павінны яшчэ адлежацца трохі.

У асобным канверце пасылаю вокладку. На адным лісце (з аднаго й другога боку) — два малюнкі. Мне думаецца, малюнак з пажарам даваць не трэба — не падыходзіць па змесце; лепш, мабыць, надаецца малюнак з маланкай над зямной куляй. Калі вокладка пойдзе — на другой балонцы кнігі (пад тэкстам «Правы засцярожаныя») павінна быць: «Вокладка Г. Л.». Малюнак пасля выкарыстання пажадана вярнуць мне. Што да зацемкі «Правы засцярожаныя», то зрабі так, як сам уважаеш: можна даваць, а можна і не даваць. Што да зазначэння на першай балонцы: «1937–1947» — таксама. Даты пад вершамі мусяць быць захаваныя. І пажадана, каб яны ставіліся злева, а не справа, як у тваім зборніку.

У табары ў Каме — мая хворая маці. Прышлі спраўку аб гэтым ад табаровага лекара, пацверджаную дырэктарам табару (адміністратарам I. R.O.). Змагу атрымаць пропуск на 48 гадзінаў у вашы мясціны. Іншым шляхам трапіць да вас цяпер вельмі небяспечна, асабліва сляпому, як я. Мая персаналія — у Юркі Віцьбіча.

З выездам у Аўстралію нічога, мабыць, не выйдзе. Магчыма, пашчасціць выехаць у ЗША. Не ведаю, дзе будзе лепш.

Пару часінаў таму атрымаў твой ліст. Шкада, сяння ўранні скіраваў хлопцаў на пошту з вокладкай. Мабыць, ужо паслалі… Атрымаў і другі паасобнік «У акіяне ночы» — дзякую і за яго.

Пачатку рукапісу (ад 1-й да 33-й бал.) тым часам не пасылаю, бо, як на ліха, пацякла столь, і заліло мне тэкст.

Мне гонар: адзін мой сябра ніяк не можа забыцца маёй жонкі. Шкада, што цяпер яны адзін аднаму непатрэбныя... Ды гэта, зрэшты, — глупства.

Што чуваць пра «Сакавік»?

Моцна цісну тваю руку — *Алесь Салавей.*

42. ЮРКУ ВІЦЬБІЧУ

20 кастрычніка 1947 г.

Дарагі дзядзька Юры!

Я не маю яшчэ 4-га нумару «Шыпшыны» і таго нумару «Званоў», у якім надрукаваны мой верш «Гамоніць даўняй праўды звон». Іншыя часапісы атрымаў. Шчыра дзякую. Таксама дзякую за ліст і за ўвагу да мяне.

Цяпер пасылаю для «Шыпшыны» два вершатворы. У Вас яшчэ ёсць «Fröhliche Weihnachten». «Дваццаць тры» друкуйце ў пазнейшым нумары, каб не паўтараліся «нарадзіны» за «нарадзінамі». З прозы маю два апавяданні і адзін сцэнічны абраз, напісаны белым вершам, але ўсё гэта — у чарнавіку і не вельмі мне падабаецца. Пазней пабачу — можа і выведу тыя творы ў людзі.

Прозы ў прысланых часапісах яшчэ не чытаў, але ўся паэзія за выняткам аднаго-адзінага вершатвора М. Сяднёва «Жаданне», — жах, неапісальны жах. А мае рэчы — горш усякага жаху. Вершы Янкі Юхнаўца (хто б ён ні быў) і пераклад з І. Кастэцкага заслугоўваюць асобнае ўвагі як найноўшая адзнака бяздарнасці і вар'яцтва. Праўда, яна, гэтая адзнака, не новая, бо яшчэ ад старадаўна-грэцкіх часоў літаратура перажывала пасля кожнай велічыні падобнае вар'яцтва, ад якога і следу «нашчадкам на ўспамін» не засталося. А ў нас велічыні яшчэ не было, а ўжо скачам з адхіну, далей людскога г..., прабачце, не бачачы нічога. І, дзіўная рэч, людзі ўважаюць, што яны імкнуцца да новага, калі яно, гэтае новае, у трыццаць разоў старэйшае за ўсё ўдасканаленае, што прыйшло яму на змену.

Для мяне не мае ніякай вартасці і паэзія пра атам, і паэзія пра вераб'я, калі яна не мастацкая. Мастацкая ж паэзія пра вераб'я, які жыў і сотні тысячаў год таму, — паэзія, вар'яцтва пра атам — вар'яцтва і больш нічога. Ад празмернага святла можна аслепнуць, ад празмернага гуку — аглухнуць, а таму чалавек ніколі не асягне

таго, што яму не дадзена; разам з узлётам угору яму толькі ўласцівы і гэткі ж самы спад уніз. А таму — яшчэ больш дасканаліць тое, што нам дадзена (у нас яно не было яшчэ ўдасканаленым ніколі), а не зніжацца да нявеглайства, замаскаванага «пошукамі новага».

У вершатворы «Тысяча дзевяцьсот...», пасланым Вам летась, я памылкова прапусціў адзін радок. Пад загалоўкам у дужках мусіць быць: «Паводле найноўшай моды». І яшчэ дапішэце, калі ласка: «Прысвячаецца Янку Юхнаўцу». Гэны вершатвор — пародыя на мадэрністых, і яго інакш нельга ўспрымаць.

Прысвячэнне ў паэме М. Сяднёва «На край святла» — цудоўная, класічная, нават геніяльная рэч, запраўды новая. І форма арыгінальная: спалучэнне метрычнай сістэмы з танічнай, калі не памыляюся. Вельмі шкадую, што сама паэма мне не падабаецца.

Буду Вам вельмі ўдзячны, калі зробіце ўсё магчымае ў справе выдання майго зборніка лірыкі. Частку тэксту я ўжо паслаў на адрас М. Сяднёва.

І я, і ўся мая сям'я перасылаем найшчырэйшыя прывітанні Вам і Вашай сям'і.

З глыбокім паважаннем — *Алесь Салавей.*

P.S. А Вы ўсё ж нядобра зрабілі, што скарацілі й надрукавалі мой ліст. Не згаджаюся я і з распаўсюджваннем маіх сатырычных вершаў. Цяпер я змог бы напісаць лепш.

43. МАСЕЮ СЯДНЁВУ

26 кастрычніка 1947 г., Зальцбург

Дружа!

Тыдзень таму я паслаў табе першую порцыю свайго зборніка (33–68 бал.). Сяння пасылаю другую порцыю — канец (69–96 бал.). Праз дні тры-чатыры вышлю рэшту (1–32 бал. — пачатак).

Можа, я не дагледзеў дзе-небудзь якой літары, дык папраў. «Зь» перад мяккімі «с, з, ц, к, х, п» ставіць не трэба, а перад іншымі мяккімі — трэба.

Здзіўляюся, як я змог адолець усё ў доме вар'ятаў і жаху?.. А незадаволенасць кнігай — найвялікшая. Калі пісаў, думалася — добра, цяпер — дрэнь.

Змест можна падаваць так, як і ў мяне (так падаюць і некаторыя венскія выданні), бо інакш не змесціцца на дзвюх балонках.

Твой зборнік «У акіяне ночы» дагледжаны больш-менш добра (праўда, часта спатыкаюцца памылкі з віны карэктара, і шмат якія балонкі крыва надрукаваны, а гэта — гультайства друкара-машыністага).

Думаю, што зборнік не ўзварушыць увагі нашых крытыкаў (дарэчы, іх і няма), але суседзі ўсыпалі б мне ў косці. Бальшыня з іх стаіць на няправільных, антымастацкіх пазіцыях. Бяруць прыклад з тых, што ўжо гніюць, з таго, што становіць сабою рудымент дэгенерацыі. І ў нас заўважаецца нахіл да гэных пазіцыяў. Шкада. Нам жа — яшчэ квітнець, як квітнелі некалі тыя, што цяпер дэгенеруюць. Гэта не спознены працэс развіцця, а ўхіленне ад заўчаснай пагібелі, праставанне па запраўднай мастацкай дарозе, якая заўсёды і ва ўсе эпохі была адзінай.

Наватарства ж — нядрэнная справа, але яна не павінна пераходзіць у гратэск.

А наагул я не жыву ўжо. Я паступова паміраю. Ізноў з суровых Альпаў насоўваецца холад, на апал няма надзеяў, святло бывае зрэдку, з харчамі яшчэ больш пагоршала. Часовае маё духовае заспакаенне трывала нядоўга; нервовае ўзбуджанне ізноў дайшло да такога стану, што аднаго дня адняло мне ногі, і я не змог хадзіць. Пра Венесуэлу думаю цяпер, як пра збаўленне, і не магу дараваць сабе тое, што ўлетку да яе не паехаў. Тое, што маеце вы, у параўнанні з нашымі ўмовамі — рай. Няхай людзі не наракаюць.

На працу нікуды не пайшоў, бо ўжо так выбіўся з сілаў, што не магу, абсалютна не магу нічога рабіць. За гэта пагражае выключэнне з табару, а па-за табарам — сімулянтам шляхі зачыненыя. Дарэчы, наш табар развязваецца, і неўзабаве павандруюць мае косці дзесьці на ўскраіну места.

А ў Венесуэлу больш не бяруць, намеры выехаць у іншыя мясціны рассыпаюцца, як пацукі па маёй кватэры. Іх — мільёны, нічым іх са стайні не выведзеш. Нікога з сям'і яны не чапаюць, толькі да аднаго мяне ўнадзіліся і сотнямі гайсаюць па мне ўначы. Відаць, мае косці салодкія. Няхай грызуць, праклятыя! Няхай насмерць загрызаюць! Улетку я ваяваў з імі. А цяпер застаўся пераможаным.

Каб жа адны пацукі, а то і іншай заразы — мільярды, і ў нэндзе яна бярэ верх над чалавекам.

І ўсё ж я шкадую гэтай стайні, бо мы тут — у асобным катуху. А цяпер не абмінуць пакою на 18 дарослых і 20,5 дзяцей (можа, трошкі я і перабольшваю, але няшмат). Нават Алёшку (я ж не раўня яму) пачынае браць ліха. Ён, мабыць, паедзе ў Канаду — самотных бяруць куды хоцькі.

Як з перадрукам майго рукапісу?

Не лянуйся інфармаваць мяне пра зборнік.

Моцна цісну руку — *Алесь Салавей.*

44. МАСЕЮ СЯДНЁВУ

7 лістапада 1947 г., Зальцбург

Дарагі дружа!

Учора я паслаў табе апошнюю порцыю рукапісу зборніка лірыкі «Сіла гневу». Дай Божа, каб зайшло ўсё і не загінула ў дарозе. Пішы, дружа. Яшчэ я не пераехаў у іншае месца. Цісну руку.

Алесь Салавей.

45. ВІТАЎТУ ТУМАШУ

16 лістапада 1947 г., Зальцбург

Вельміпаважаны спадару доктару!

Жыву цяпер у лесе, пры схілах гораў. Адзіная выгада — дровы пад бокам. Вятры тут вялікія й частыя. Наломяць галля — і ўзімку не будзе холадна. Табар вялікі. Жывуць у ім пераважна латышы й літоўцы. З беларусаў ва ўсім табары — толькі мая сям'я.

Не хацелася мне кратацца з наседжанага месца. Але — нічога не зробіш.

Наагул жа — навіны ранейшыя. Усё залежыць ад таго, што прынясе жыццё. Сам чалавек бязрадны; нічым не дапаможа — ні ўпартаю працаю, ні заробленымі грашыма.

Дзякую Вам за цёплыя словы, яны падтрымалі мяне і абнадзеілі.

Яшчэ раней, выязджаючы ў няведамы свет, я добра ведаў аб тым, што мяне чакае наперадзе. Я быў падрыхтаваны да немінучае і хуткае пагібелі без катняе рукі над галавою, і гэты шлях для мяне быў выгаднейшы, чымся іншы шлях. З волі Божае жыццё маё склалася

зусім інакш. Шлях да пагібелі не кароткі, а даўгі й вельмі складаны. Пры такім існаванні ён разлічаны на пэўны час. У іншым месцы, калі давядзецца выехаць, ён будзе яшчэ даўжэйшым. І я часта думаю — ці не лепш заставацца на месцы, спадзеючыся на пагібель хутчэйшую? На пагібель мізэрных астанкаў колішняга жыцця, бо сам я, уласна кажучы, ужо загінуў, пазбаўлены магчымасці працаваць на карысць таго, з чым сэрца й розум.

Думкі — думкамі. Але гэтыя мізэрныя астанкі — усё роўна нявольнікі свайго марнага існавання. І хацелася б ім хутчэй кудынебудзь паехаць, ды з малымі дзецьмі нікуды не бяруць. Нават у Чылі і Аўстралію.

Вельмі сімпатычна выглядае кніжыца «Цень Янкі Купалы». Ёсць адна загана: той, хто выдаваў кніжыцу, строга прытрымліваючыся граматычных правілаў, не ўзяў пад увагу правоў аўтара на «паэтычную вольнасць» і не паставіў «у» кароткага пасля зычных там, дзе яно мусіць быць дзеля захавання рытму. Напрыклад, надрукавана: «не ў маленькую вуліцу — у вечнасць», а трэба: «не ў маленькую вуліцу — ў вечнасць»; надрукавана: «ушануем, брацця, у нашым стылі», а трэба: «ушануем, брацця, ў нашым стылі» і г. д. Гэтая ж рэч друкавалася не з памяці, як «Пагоня» М. Багдановіча... Такія памылкі вельмі непрыемныя і для аўтара, і для чытача, які вычувае рытм. Рытмічная памылка з віны выдавецтва больш балючая для аўтара, чымся граматычная памылка.

Чуў я, што ў вас выйшла з друку шмат іншых выданняў. Ці нельга было б як-небудзь мне параслаць? Быў бы вельмі ўдзячны й абавязаны.

Месяцаў шэсць таму Янка Сурвіла прасіў мяне прыслаць камплекты «Пагоні» і «З беларускага жыцця». Тады нельга было паслаць, а цяпер пошта прымае пакункі да паўкілаграма, але я ніяк не магу сабраць грошай на паштовыя выдаткі. Каб паслаць у Нямеччыну паўкілаграмовы пакунак, трэба купіць паштовых марак на 25 шыл. Хай гэта не будзе перашкодай прасіць мне ў вашым выдавецтве новых кніжак. Што да камплектаў, на Ватэнштат пры першай магчымасці я не забудуся.

Найшчырэйшыя прывітанні, з павažаннем — *Алесь Салавей.*

46. МАСЕЮ СЯДНЁВУ

17 лістапада 1947 г.

Дружа Масей!

Нарэшце я вызваліўся з пярэбарнае трасавіцы і больш-менш уладзіўся на новым месцы. Наўкола табару — лес, сцены гораў. Тут буду шукаць «заспакаення ад хаосу зямнога», калі не пазбавіць Бог гэтае магчымасці.

Атрымаў з ангельскае зоны Тваю кніжыцу «Цень Янкі Купалы». Прыемна ўзяць у рукі акуратна выдадзеную рэч. Толькі «ў» кароткага не ўсюды дагледзелі — абібокі!

Мая кватэра — малюсенечкі катушок, у якім і сесці няма дзе. Але я задаволены: усё ж я адзін і не ў кагале. Жыхары табару — прыбалтыйцы.

Наагул жа, пра жыццё пісаць не варта, бо давядзецца паўтарацца.

Апошнюю порцыю свайго рукапісу я паслаў Табе 10 дзён таму. Яшчэ не маю ад Цябе ніякіх вестак. Чакаю іх. Чакаю нецярпліва і «Спадзяванні».

Перадай маю просьбу А. Адамовічу, каб прысылаў на мой адрас газету, што пачала выдавацца.

Моцна цісну Тваю руку — *Алесь Салавей.*

47. МАСЕЮ СЯДНЁВУ

18 лістапада 1947 г., Глязэнбах

Дружа мой!

Сяння атрымаў твае «Спадзяванні». З тэхнічнага боку кніжка лепш выглядае, чымся «У акіяне ночы». Адзінае, што коле вока: прозвішча аўтара на вокладцы трэба было даць крыху большымі літарамі, а падзагаловак «вершы» на вокладку не варта было выносіць, месца яму — на першай балонцы.

Паводле зборніка «Спадзяванні» можна з пэўнасцяй меркаваць, што мой тэкст, пасланы табе, цалкам змесціцца на 96-ці балонках.

Дружа! Можа, цана выдання трошкі ўздымецца — зрабі ўсё магчымае, каб «зарубежнікі» не пашкадавалі дакласці грошай. Калі не будуць мець — збярыце як-небудзь. Наагул, пастарайся прыспешыць выданне, каб не залягло ў доўгую скрынку.

Дзіўна: некаторыя твае і мае апошнія вершы маюць у пэўных мясцінах аднолькавы дух і настрой. Ні ты мяне апошняга, ні я цябе — не чыталі. Каб хто-небудзь з нас быў Дубоўкам, творы якога мне не падабаліся і не падабаюцца, дык нехта меў бы гонар трапіць на пяро нашай гора-крытыкі ў ролі плагіятара.

Убачыш У. Глыбіннага — перадай мой новы адрас: A. Kadniak-Salavej, DP Camp Glasenbach, Salzburg, 21 Bar., zimm 5, Osterraich. Я ўжо даўно не маю ад яго лістоў.

Ёсць чатыры добрыя беларусы, што жывуць па-за Зальцбургам, — прыхільнікі тваіх вершаў. Яны вельмі хочуць набыць твае зборнікі. Як гэта зрабіць?

Цісну руку — *Алесь Салавей.*

48. МАСЕЮ СЯДНЁВУ

27 снежня 1947 г.

Масей!

З Калядамі і Навагоднімі святамі!
Што з маім зборнікам?

Алесь Салавей.

49. ВІТАЎТУ ТУМАШУ

10 студзеня 1948 г.

Вельмі паважаны спадару доктару!

Застаецца быць толькі шчырым, гледзячы на прысланыя Вамі выданні — усе яны выдадзены вельмі добра, і нічога ім нельга закінуць. Найпрыгажэй і найакуратней выдадзена кніжыца «Музыка й чэрці». Дзве-тры граматычныя памылкі — увесь ейны недахоп. Я асабіста не здолеў бы так акуратна выдаць такую кніжыцу, як «Чортава бутэлька». Пераклад стaранны, на бяскніжжы — зусім магчымы, але ўсё ж стылісту там-сям трэба было б прыкласці руку. Не падабаецца мне ўлюбёнае віляначанамі (я разумею — на падставе мнагагалосся): «раздумываючы», «асвечывалі» і г. д. Яно, праўда, спрэчнае, але ніводнай нашай граматыкай не замацаванае. Я пісаў бы толькі

«абток», «востраў» не ўжываў бы; пісаў бы «аповесць» заміж «повесць»; не пісаў бы «лічыў за адзін», а — «уважаў за адзін»; ужываў бы «які» заміж «каторы». Лепш, мабыць, пісаць «вакно», а не «акно». Мне больш падабаецца: «ладную частку свайго параўнальна кароткага жыцця»; «меншы, чымся іншыя» або «меншы іншых»; «дасканалы паводле свайго выгляду» ці «дасканалы з выгляду»... На назе ў дарослага — ступня, у малога — ступенька, у ганку — прыступкі; усходы жыта, пшаніцы, але прыступкі сходняў і г. д.

Можа, я памыляюся — ласкава прашу не гневацца на мяне. Часапіс «Медычная думка» — вельмі салідны і змястоўны. З таго, што я разумею, не падабаецца мне верш Н. Арсенневай пра Ф. Скарыну. Задуманы верш надта цікава, але напісаны нестаранна, за што маладому паэту крытыка ніколі б не даравала. Скандал — у пэўных мясцінах верш непісьменны з гледзішча паэтыкі! Ды ўсё гэта праходзіла й праходзіць незаўважна, паэтычную непісьменнасць у старэйшых паэтаў крытыка называе «законамі», прабачце, «прынцыпамі ўнутранага руху».

Я маю сцэнічны абразок у адной дзеі «Дух праўдны, духу зла непадуладны», напісаны белым вершам, нідзе яшчэ не друкаваны. Яго можна было б выдаць такой самай кніжыцай, як «Музыка й чэрці». Ці ёсць цяпер у Вас на гэта магчымасць? Напішэце, калі ласка, тады я змагу Вам пераслаць гэты абразок. За выдаўца можа быць той, хто выдасць.

Прыемнае ўражанне пакідаюць прысланыя паштоўкі. Але, памойму, няможна так выдаваць, не падаючы, што гэта — пераздымкі з працаў мастака. Калі нельга было зазначыць прозвішча мастака, дык трэба было паставіць ініцыялы.

Мне вельмі непрыемна — нічога з камплектаў нашых выданняў ужо не засталося. Тое, што пакідалася для Я. Сурвілы, я пасылаю спадару М. Панькову.

Дзе цяпер жыве Хв. Ільяшэвіч? І як жыве? А ўсё ж не можа адвыкнуць ад свайго «прыгатавання» заміж «падрыхтавання», калі не маецца наўвеце страва... Мае найшчырэйшыя яму прывітанні!

Вашы святочныя зычэнні прынеслі нам шмат радасці на галодныя Каляды й Новы год. Дзякую Вам, а таксама дзякую за ўсё прысланае.

Ветліва прашу перадаць найшчырэйшыя пажаданні Вашай сям`і.

Да пабачэння, з павbooжаннем — *Алесь Салавей.*

50. МАСЕЮ СЯДНЁВУ

14 студзеня 1948 г.

Дружа!

Калі ўважаеш, што прыкладзеныя да гэтай пісулькі вершы маюць якую-колечы вартасць, дык надрукуй іх дзе-небудзь (пры ўмове — усе разам, пад агульным назовам «Актавы»). Загадзя папераджаю: актавы «Нішто» й «Слупы» былі напісаныя яшчэ тады, калі я твайго зборніка «Спадзяванні» не меў і не чытаў. Словы, падкрэсленыя пакручастай рыскай, трэба друкаваць курсівам або ўразбіўку.

Аўтар перакладаў супрацьпастаўляе цябе ўкраінскай прафесарскай і мадэрнай паэзіі і параўноўвае з Ясеніным, як з нечым пазітыўным, высокім, недасяжным, што належна яшчэ не прадумана і не ацэнена.

Адрас паэта, што пераклаў вершы: Ігар Качуроўскі, St. Martin Villach, DP Camp, B. 4, Osterraich.

51. ЮРКУ ВІЦЬБІЧУ

15 студзеня 1948 г.

Дарагі дзядзька Юры!

У Нямеччыне прыбліжваецца страта вартасці старых грошай — вымена не за гарою. Калі хто-небудзь мае іх — хай не пашкадуе на мой зборнік, бо ўсё роўна яны загінуць, як гэта было ў нас, у Аўстрыі. Калі зборнік пойдзе ў друк неўзабаве — ён пабачыць свет, калі не — нічога не будзе (на радасць зладумам).

Але чаму Масей маўчыць? Што з ім сталася? Ці не навялі на яго мае лісты нехаць пісаць мне?

Дазваляю М. Сяднёву выбраць для анталогіі з «Сілы гневу», што яму асабіста падабаецца. Я не ў стане цяпер цвяроза думаць. Назоў анталогіі надаецца да здымкаў з канцэнтрацыйнага табару, а не да збору вершаў; калі не позна — варта абавязкова з'іначыць. Са старых вершаў можна надрукаваць толькі «Перачытваючы «Калевалу». Калі б «Сіла гневу» ўжо друкавалася, — можна было б паслаць, зразумела, што-небудзь зусім новае (пры няпэўнасці не хачу ператвараць Ваша выдавецтва ў гербары сваіх рукапісаў)... У анталогію я згадзіўся ўвайсці толькі ў тым выпадку, калі туды будзе ўваходзіць і М. Сяднёў.

Што з маімі вершамі, пасланымі на Ваш адрас у канцы кастрычніка і ў пачатку лістапада? Як толькі ўсе яны пайшлі ў 6-ты нумар «Шыпшыны» і як толькі М. Сяднёў збракаваў актавы, пасланыя яму ўчора, — я пашлю для 7-га нумару «Шыпшыны» іншае — напішэце. Пажадана было б у гэтым нумары менш палітыкі і менш графаманскіх вершаў (такіх, як мой «У гэты дзень»), прысвечаных 25-аму Сакавіку.

Храните гордое терпенье
И дум высокое стремленье.

Пэўна ж, аўтар успомненых радкоў лепш за Ю. Шэраха (Гр. Шаўчука) ведаў — ці рыфмы такога тыпу добрыя ці благія. Збаўленне — не збавлення, спусташэнне — не спустошення і, зразумела, у нас гэта, як і ў расейцаў, — добрыя рыфмы. Нават матэматык у паэзіі Валеры Брусаў ужываў рыфмы такога тыпу… У асуджэнні М. Кавыля голас Ю. Шэраха не становіць сабой голасу крытыка-мастака, хоць можа, М. Кавыль і не заслугоўвае на ўзняцце пад нябёсы… Хай Ю. Шэрах — прафесар, хай дацэнт, хай найлепшы наш сябра, але з ягоным крытычным графаманствам нельга згадзіцца. У мастацтве няма ні «прынцыпаў унутранага руху», ні «прынцыпаў нанізвання». Можна і нанізваючы, і не нанізваючы ствараць сапраўдныя мастацкія рэчы, калі на гэта ёсць талент…

Сумна, што адзін з найлепшых вершаў М. Сяднёва «Абнаўленне» — «зрыў у наіўнасць». Рукой вялікага паэта напісаны верш «Маладым». Не ўступае ягонай сіле і верш «Хвала маладосці».

Дарагі дзядзька Юры! Ласкава прашу зрабіць усё, што ў Вашай сіле, і дапамагчы М. Сяднёву ў хутчэйшым выданні майго зборніка (як толькі М. Сяднёў прытрымліваецца ранейшых сваіх словаў і як толькі мая просьба — не пустыя гукі для Вас). Калі нічога не будзе, ласкава прашу напісаць мне аб гэтым, каб я дарэмна не спадзяваўся.

Прышлеце 4-ты нумар «Шыпшыны». У ім — працяг «Крывічоў» М. Зарэцкага, а гэта мяне вельмі цікавіць. Я ж не атрымаў яшчэ 4-га нумару.

Ці піша да Вас Уладзімір Дудзіцкі?

Жадаю поспехаў!

Хай дапамагае Вам Бог!

З глыбокім паважаннем да Вас, адданы Вам — *Алесь Салавей.*

P. S. Можа, М. Сяднёву ў «Сіле гневу» нешта не падабаецца — друкуйце тады ў анталогіі адзін верш — «Перачытваючы «Калевалу».

52. АЛЯКСАНДРУ ЛАШУКУ

5 лютага 1948 г.

Дарагі сябра Аляксандр!

Я ўсё яшчэ нікуды не выехаў і не маю надзеяў выехаць, і Ваш ліст, зразумела, застаў мяне ў Аўстрыі. Па-ранейшаму жыву на новым для мяне ў межах Зальцбургшчыны месцы — у прыбалтыцкім табары. Можна з пэўнасцяй сказаць, што ў бліжэйшы месяц-два я нікуды адгэтуль не выеду.

У Францыю выехаць — трошкі пабойваюся. У Ангельшчыну выехаў бы і сёння, каб пусцілі мяне разам з сям'ёй (на ўмову: спачатку — самому, а сям'я потым — я не згаджаюся). А сям'я мая не маленькая: жонка і двое дзяцей; сыну — 2 гады, дачцы — 8 месяцаў. Бо і ў Аўстрыі без працы пражыць нельга, ніхто дармова, як у Нямеччыне, нашага брата не корміць. Але працу тут знайсці вельмі цяжка, нават апошнім часам немагчыма. Напішэце, як выглядае той выезд паводле кантракту, я Вам тады дам пэўны адказ. Управы тутэйшых табараў толькі рады выезду кожнага чалавека, абы яго хто-небудзь забраў.

Мне апошнім часам трошкі ўсміхаецца выезд у Нямеччыну. Але я ў гэта не веру.

Не турбуйцеся, калі ласка, аб гэных самых 50 шылінгах. Іх, дарэчы, можна было паслаць у звычайным лісце, бо ў самой Аўстрыі лісты не цэнзуруюцца. Нават няма цяпер цэнзуры і на лісты з іншых краінаў, апрача Нямеччыны й Японіі. Але тыя шылінгі ўжо не ідуць у нас — у канцы снежня адбылася другая вымена грошай... З 1 студзеня прымаюцца ў Аўстрыю і пакункі з усіх краінаў, апрача гэных самых Японіі і Нямеччыны.

Вайсковыя коўдры (коцы) і прасцірадлы старыя й новыя — у нас у вялікім ходзе. Толькі за іх ды яшчэ за што-небудзь з вопраткі можна выменяць на сяле тое-сёе з харчоў. Але я не раджу Вам вытрачацца — Вы і самі патрабуеце грошы на падтрыманне здароўя. Ад цыгаркаў не адмаўляюся. Закон курцоў — не адмаўляцца, калі частуюць.

У Ангельшчыне мне не было б горш, як у Аўстрыі. Неяк перабіваўся б. А пазней і жонка магла б працаваць. Хацелася б толькі

трапіць на працу паводле маіх сілаў, лепш у прамысловасці, з земляробствам я амаль не знаёмы. Адмысловага фаху я не маю, лепш за ўсё надаюся вазіць вагонікі й насіць цэглу дзе-небудзь пры пабудове. Такія ж людзі таксама патрэбныя.

Ці выдаецца далей «Беларус на чужыне»? Быў бы вельмі ўдзячны, каб вельміпаважаныя суродзічы выслалі на мой адрас па аднаму паасобніку.

Моцна цісну Вашу руку.

З паважаннем — *Алесь Салавей.*

Мой адрас: Albert Kadniak, Glasenbach, Salcburg, DP Camp, Baracke 21, zimm.5, Austria.

53. МАСЕЮ СЯДНЁВУ

22 лютага 1948 г.

Дружа мой!

Каб не забыцца, перш за ўсё ласкава прашу ўнесці наступныя папраўкі ў зборнік «Сіла гневу»: на 24-ай балонцы ў першай страфе знізу трэба напісаць «збавенне» заміж «з'яўленне» і «багаславенне» заміж «благаслаўленне»; на 28-ай балонцы ў 16-м радку зверху — таксама «збавення».

Калі яшчэ не позна, хацелася б мне надрукаваць у «анталогіі» вершатвор «Прошча»; яго скалечылі ў часапісе «Божым шляхам», а таму добра было б пусціць яго ў свет у людскім выглядзе.

З пропускам у вашы мясціны ў мяне нічога не выйшла. Калі яшчэ ў першай палове студзеня яго можна было атрымаць зусім лёгка, нават за адзін дзень, дык цяпер на перашкодзе — розныя драбніцы й фармальнасці; вельмі шмат людзей пачало прасіць пропускі. Нястача аднаго-адзінага дакумента аб тым, дзе я быў у 1938 годзе, разбіла ўсе мае планы. Але і гэту перашкоду можна было б абмінуць, каб было чым падмазаць. А «падмазку» знайсці мне так цяжка, як і пісталет, каб скончыць жыццё самагубствам. Вешацца ж не зусім добра. Але яшчэ пабачым...

Калі воля Божая злітуецца нада мною, у канцы красавіка або ў траўні ўсё ж убачымся. Спадзяюся, што ты не палянуешся тады прыехаць да мяне ў Мюнхен. А можа, яшчэ ў Францыю або ў Англельшчыну выеду, калі возьмуць адразу з сям'ёй.

Шмат хто ў лістах з Нямеччыны зайздросціць нам: нібыта з Аўстрыі ёсць лепшая магчымасць куды-небудзь выехаць. Хай выкінуць гэтыя думкі з галавы. Хто мае добры мазоль на руках і хто не мае дармаедаў на сваёй спіне, той і з Нямеччыны з поспехам выедзе.

А з іншага боку — куды ехаць, чаго?

Ці выйшаў 6-ты нумар «Шыпшыны»?

Моцна цісну тваю руку — *Алесь Салавей.*

54. МАСЕЮ СЯДНЁВУ

28 лютага 1948 г.

Дарагі мой дружа!

Ласкава звяртаюся да цябе з просьбай. Не адкладваючы ні на адну часінку, як мага найбарджэй перашлі рукапіс майго зборніка «Сіла гневу» і малюнкі вокладкі на адрас А. Адамовіча. Яшчэ раз ласкава прашу — зрабі гэта як найспяшней.

А. Адамовіч напісаў мне, што мае магчымасць выдаць у вельмі хуткім часе мой зборнік. А ты паведамляў, што ў цябе гэтая справа стаіць. Дык паспрабуем — можа, праз Адамовіча што-небудзь атрымаецца. Пашлі яму рукапіс, і з мамэнту адаслання выданне цябе больш не будзе абавязваць. Ты толькі пасылаеш рукапіс, а рэшту справаў, як уласнік рукапісу, з Адамовічам палагоджваю я сам.

Усё гэта абавязвае цябе толькі ў тым выпадку, калі ты не дастаў яшчэ грошай на выданне і не здаў зборніка ў друкарню.

Неяк я напісаў Віцьбічу, што зборнік хутчэй пабачыць свет, калі ён будзе далей ад «Бацькаўшчыны». Тым часам даводзіцца ўзяць гэтыя словы назад. Дый пісаліся яны тады, калі «Бацькаўшчына» вельмі ўжо «кусалася».

Неяк трэба было б нам пamірыць Віцьбіча з Адамовічам. Каму патрэбная гэта варажнеча? Была б толькі карысць, каб яны памірыліся. Адамовіч, даведаўшыся, што Віцьбіч адышоў ад палітыкі, пайшоў бы яму насустрач. Маю падставы на гэтыя словы. І я радзіў бы Ю. Віцьбічу не ліць больш памыяў на галаву А. Адамовіча. Забудземся на адышоўшае!

Напішаш мне. Добра?

А тым часам бывай, дружа.

Моцна цісну тваю руку — *Алесь Салавей.*

55. МАСЕЮ СЯДНЁВУ

17 сакавіка 1948 г.

Дружа мой!

Сардэчна дзякую табе за ліст, за перасланне маіх рэчаў на адрас А. Адамовіча. Апошнім часам падзеі ў свеце ідуць не днямі, а цэлымі дзесяцігоддзямі. Цяжка цяпер гаварыць аб нашым спатканні. Прадчуваю сваю пагібель, калі толькі пачуццё не падводзіць. Ва ўсякім выпадку, так ці інакш, блізка нейкі канец — ці то добры, ці то благі.

А на тым свеце, пэўна ж, усе спаткаемся. Развязка на носе, яна мусіць быць, бо без яе ўсё роўна няма жыцця.

Аляксей Грыцук сяння едзе ў Канаду. Адзін хлопец сказаў: «Калі бацян уцякае з сяла, значыцца, будзе пажар…»

Пра вашы мясціны думаць не пакідаю — разам было б весялей спатыкаць або збавенне, або пагібель.

Па-за ўсім гэтым ўсё-усякае праходзіць паўз маю ўвагу.

Бывай! Не трачу надзеяў пабачыцца яшчэ — твой *Алесь Салавей.*

56. АЛЯКСЕЮ ГРЫЦУКУ

[Сакавік 1948 г.]

Дарагі Аляксей!

У нас ужо трэці тыдзень усцяж лье дождж, неспадзявана пахаладала, у горах выпаў снег. Жыта палягло, нішто не расце, застойваюцца й сенакосы. І сум агартае душу, такая маркота й бяспрасвецце ў ёй, як і надвор'е. І безнадзейнасць, і бесперспектыўнасць… Не хачу наводзіць на цябе нуду й жуду, але хачу сказаць, што й тут надыходзіць дзікое атупенне, далёкае ад ямбаў і харэяў. Гэта — набліжэнне да нашага Рубікону. Яно не магло абмінуць нас «в чужедальних странах». Зразумела, цяжка яго перажыць, і цяжкім будзе само пяройсце, а пяройдзем — адразу адляжа; будзем бездакорнымі каўбоямі, далёкімі ад таго, чым жылі год таму. Я думаў-уважаў раней, што ўсё гэта можа надысці за акіянам, ды цяпер пераконваюся, што ўсюды на чужыне — ці то ў Амерыцы, ці то ў Еўропе.

Думкі мае цяперака зусім інакшыя ад ранейшых — змушаны пакінуць сваё вершаплёцтва.

І ліст, і два даляры атрымаў — вельмі й вельмі дзякую. Не забывайся, Алёша, і аб сабе думаць. Грошы табе спатрэбяцца на новым месцы. Нічога лішняга не пасылай, бо аж два даляры — гэта шмат, па-мойму… Бываюць выпадкі, калі даляры нехта вымае. Цэнзуры ж цяпер няма, і вымаюць, зразумела, тутэйшыя аўстрыйцы яшчэ на пошце. У такім выпадку найсціплейшаму і наймізэрнейшаму на выгляд лісту шанцуе больш — ніхто не падазрае, што ў ім што-небудзь мае быць.

Даляры прадаў мне Мікола. Цана канадыйскага даляра апошнім часам становіць 28 шыл. Але ж і хлеб на чорным рынку каштуе 1 шыл. 50 гр. Тут цяперака наагул усё з'іначылася: магазіны паўнеюць штодня, навет цукру без картак па 14 шыл. кілаграм — колькі хоцькі. Працавітыя застаюцца без працы, былыя гультаі знаходзяць яе. І я рукамі й нагамі пачаў шукаць працу. Але мая асоба, мабыць, не належыць да гультаёў, бо нічога яшчэ не знайшла. Не толькі я, але й Мікола нічога не выхадзіў — яго ж звольніла ранейшая фірма яшчэ пры табе, здаецца. Беспрацоўе дабіла яго да ручкі.

Мне давялося-такі паехаць у Галяйн. Ды там усе месцы занятыя — нашыя «беспрацоўнікі» пазаймалі. У дзесяцёх кіламетрах за Галяйнам праца ёсць, ды там — каменяломня. Нідзе я не змог бы ў поце чала свайго здабываць капейку ў такой каменяломні. Працуюць там баволы («буйвалы»), і мне з імі не зраўняцца. Мікола там быў, радзіў мне не старацца, бо й сам не асмеліўся ўзяцца, сказаў, што не пад сілу. Я не паслухаўся, бо ўважыў, што мая асоба нінавошта не здатная, пакуль яе хто-небудзь «не возьме за морду». Але ў першы ж дзень, нават у першай палове дня, я застаўся пераможаным — прагналі мяне са свістам. Словам, выйшла такое, аб чым аднаму толькі табе прызнаюся.

Мо ў Канадзе будуць мацней «трымаць за морду», каб без апаразкі здолеў трапіць у лік непераможных? У такім разе толькі на Канаду павінен ісці мой шлях. Лес жа ў 1941 годзе пілаваў. У першыя два-тры тыдні скура злазіла з далоняў, а пазней так уцягнуўся, што зрабіўся моцным, як дуб, праўда, еў мо не горш, чымся цяперака ты. У гэтай справе крыху надаюся для Канады. Але тым часам бяруць толькі тыя сем'і, якія маюць па тры рабочыя душы (а дзяцей пры гэтых «душах» можа быць хоць 20).

З Легену шмат выязджае ў Канаду. Цяперашні тамтэйшы галоўны камендант і начальнік Фядзюшка абяцаў увапхнуць мяне ў адміністрацыю, навет запэўніў, што стрымае сваё слова. Што да мовы

тутэйшай гасціннай краіны — ведаю яе не горш за Казлоўскага і ў сто разоў лепш за цяперашняга кватэрмайстра — былога артыстага (Кліменка ўжо выехаў). Наагул, цяперака ў Легене абавязковая мова — (*неразборл. — М. С.*).

Дарэчы, і Мікола ўжо прыняты да выезду. Транспарт надыходзіць бліжэйшымі днямі. Едзе ён на сельскую гаспадарку, разам з ім і В. Кінаў.

Цётка атрымала твой ліст з далярам. Вельмі радая.

Памерла М. Дуброўская. Вольга сумуе і з нецярплівасцяй чакае ад цябе ліста.

«Сіла гневу» бліжэйшымі днямі павінна пабачыць свет. Як атрымаю — адразу ж пашлю табе. Што да «Вянкоў», ня ведаю — ці друкаваць іх, ці не? У гэтым зборніку тапчуся на месцы і перапяваю ранейшыя матывы — без універсітэта большага не змог дасягнуць. Мабыць, пакіну гэты зборнік у забыцці. Я яшчэ не даваў згоды на ягонае друкаванне. Раджуся на гэту тэму з Адамовічам.

Адрас Акулы згубіўся. Але ведаю адрас кальпартэра беларускіх выданняў у Баварыі на Канаду. Вось ён: Jozeph Pitushka, General Deleveri, Ottawa, Ont.

Прывітанне Курыловічу й Матвеенку.

Прывітанне ад усіх! Моцна цісну тваю руку.

З паважаннем — *Алесь Салавей.*

57. ВІТАЎТУ ТУМАШУ

7 красавіка 1948 г.

Вельміпаважаны спадару доктару!

З вялікай радасцяй прачытаў Ваш ліст. Вельмі дзякую.

З заўвагамі, што да мовы, не згаджаюся. Далей спрачацца на гэту тэму не буду, бо замала маю веды з гэтае галіны, каб давесці навукова. Скажу толькі між іншага: усё нармальна змяшчаецца ў маёй галаве, калі памятаю каго-небудзь, думаю аб кім-небудзь, забываюся на каго-небудзь, гавару пра каго-небудзь; забываюся шапку ў хаце, увайшоўшы ў тэатр, забываюся на шапку і не здымаю яе з галавы, памятаю пра шапку, думаю аб шапцы; забываюся грошы дома, каб купіць жонцы падарунак, а каб падала з неба каша — забыўся б і на грошы; не тыкаю пальцам у вока, не чапаю чужых кніжак, не кранаю салодкімі словамі дзявоцкіх сэрцаў, а пішу пра недатыкальнасць асобы, незачэпнасць

собскасці, недакранальнасць душы; не забывацца на мову — не думаць аб ёй, лацьвапажыць, забывацца мову — развучвацца гаварыць і г. д.; затыкаць дзірку, крытыкацца, датыкацца і інш., — чаму ж не можа быць недатыкальнасці, хоць і ў польскай мове ўжываецца?

Згаджаюся з адным знаёмым, што «лёт» — так, а «лята» — не, бо і хады без ходу не было б, і, пэўна ж, правапіс усталяецца (у сэнсе канчальнага ягонага апрацавання для сталага ўжытку), а прыналежнасць да чаго-небудзь ці каго-небудзь устанаўляецца, сцвярджаецца і г. д. Зрэшты, спрачацца нам не варта на гэтую тэму, бо спрэчкам не будзе канца. Калі мы літаратары, дык мы маем права на сваю мову, г. зн. на індывідуальныя асаблівасці і адценні свайго лексікону. Толькі такім шляхам (праз мастацкае слова) і выпрацоўвалася ўсцяж стагоддзяў літаратурная мова іншых народаў, адшліхтоўвалася і ўзбагачалася, адкідаючы ўсё выпадковае з размоўнае першакрыніцы. Я толькі меў заўвагі да бессупярэчных, ведамых мамэнтаў, як «прыйшлося перарабіць» (можа быць у іншым значэнні: «што ішло — прыйшло, прыйшлося»), «аказаўся» (гэта зусім не па-нашаму), вучыўся мове (творны склон), а не «вучыўся мову» і г. д.

Даруйце мне, не хацеў так шмат пісаць на гэту тэму, ды само неяк напісалася.

Нічога новага ў мяне няма. Пры такім духовым стане, што маю цяпер, лепш маўчаць.

Застаюся з найшчырэйшымі пажаданнямі й прывітаннямі, кланяюся, з глыбокім паважаннем да Вас — *Алесь Салавей.*

58. АЛЯКСАНДРУ МІЦКЕВІЧУ

8 красавіка 1948 г.

Вельміпаважаны спадар Міцкевіч!

Ліст Ваш атрымаў. Дзякую.

Навінаў у нас асабліва няма. «Брацтва», як я ўважаю, — развалілася. Айцец Віктар жыве цяпер на новым месцы. Спадар Грыцук выехаў у Канаду.

З маім выездам у Нямеччыну нічога, мабыць, не выйдзе. І цікавых ведамкаў адтуль не маю.

Моцна цісну Вашу руку.

З паважаннем — *Алесь Салавей.*

59. АЛЯКСЕЮ ГРЫЦУКУ

19 красавіка 1948 г.

Дарагі Аляксей!

Пазаўчора атрымаў Твой вельмі цікавы й змястоўны ліст. Сардэчна дзякую. Збіраюся сяння ў места — адведаць усіх знаёмых і перадаць ім твае прывітанні.

Нізка табе кланяюцца Розумавы. Я ўжо вітаў іх ад твайго імя.

Нічога ў нас не з'іначылася. Баракі тыя ж самыя і той самы табар. Мацней прыгравае сонца — прыбліжаецца лета, а голад пачынае прыпякаць і там, дзе не трэ было б… Перадваенны несупакой суцішыўся, і людзі пачынаюць верыць у цуд, які выратуе іх. Дай жа Божа!

Пазаўчора запісвалі ў Канаду на працу ў дзіцячых дамах і санаторыях, і запісвалі nur mit Kinder. Я, ведама, запісаўся — не дарам жа паўдня стаяў у радоўцы! Ды сяння паведамілі, што гэта была памылка — маўляў, перакруцілі тэлеграму, заміж ohne, ці як там, напісалі — mit…

Выклікаў мяне Arbeitzamt, два дні круціўся я, нібы мыш пад венікам, ды змушаны быў ісці. А там «хер» сказаў мне: «Я и знал, что это были не вы, а ваш переводчик…» Скончылася ўсё добра.

«Сіла гневу», здаецца, пайшла ў набор. А. Адамовіч мае надзею выдаць і «Вянкі». Ды падзеі ў свеце, мабыць, не паспрыяюць гэтаму. Дарэчы, у Нямеччыне шмат хто пераканаы, што змены ў свеце будуць яшчэ няхутка.

Настрой нецікавы. Трэ было б некуды ехаць — і больш нічога. Хоць выезд ператворыць мяне, чалавека, у сытую жывёлу, слухмяную на загад гаспадара, што добра корміць яе, але ж, мабыць, пакіне пры жыцці. А сядзець на месцы — значыць збірацца на той свет. Што лепш, што горш — я не прыйшоў яшчэ да станоўчага выснаву.

Калі паэта, што мае Божую іскру, займее, скажам, 20 дзяцей, — ён тады ні для паэзіі, ні для Бацькаўшчыны ўсё роўна не будзе страчаным. Варта нават яму аднаму выехаць за акіян — тады й Божая іскра не дапаможа. Гэта я ведаў і гэта адчуваю…

Дазволь жа пажадаць табе добрых Велікодных Святаў. Хай жа і ў Канадзе не губляецца надзея ў тое, што ўваскросне й нашая Бацькаўшчына. Канада нам ніколі не заменіць яе. Прывітанне ад Зіны, Міхаські й Ганускі.

Моцна цісну Тваю руку, нецярпліва чакаю адказу.

З паважаннем да цябе — *Алесь Салавей*.

60. ЮРКУ ВІЦЬБІЧУ

20 красавіка 1948 г.

Дарагі дзядзька Юры!

Цяжка сяння жадаць каму-небудзь радасці й шчасця, бо кожнае добрае пажаданне разбіваецца дробнай хваляй аб жорсткія скалы нашых мукаў. На конадні светлага Вялікадня хочацца верыць і ў прыйсце нашага Вялікага Дня. Святая праўда. Уваскрошанне Ісуса Хрыста вядзе нас да ўваскрошання нашай Бацькаўшчыны. Не будзем жа губляць надзеі, што гэтая нашая мэта блізка.

Хрыстос уваскрос!

Будзьце ласкавыя прывітаць сям'ю.

З глыбокім паважаннем да Вас, адданы Вам — *Алесь Салавей.*

P. S. Кагадзе атрымаў Ваш ліст ад 14.04.1948 г. і пакунак з часапісамі. Сардэчна дзякую Вам. Найдурнейшая з усяго «Воля» (а я не магу вытрываць, каб гэтага не падкрэсліць) яшчэ з часоў нападу на «Узвышша» адхіснула мяне ад сябе, і я цяпер не магу яе чытаць (мне прысылаюць яе).

Ласкава прашу Вас адпаведна зарэагаваць на няўдольныя перадрукі з «Шыпшыны» (гэта просьба датычыцца майго вершатвору «Пачні з Гамера»). Нейкая мядзведжая паслуга толькі ў двух месцах дакранулася да вершатвору, але ўсё роўна скалечыла яго. Калі людзі не ўмеюць належна ставіцца да чужое працы, прадуманай да кожнай коскі (і, зразумела, лішняя коска шкодзіць ёй), дык няхай памятаюць адно: гаворачы пра незалежнасць Бацькаўшчыны, нельга забывацца й аб творчай суверэннасці аўтара, якой няможна лацьваважыць. Калі яны гэтага не ведаюць, варта было б ім напомніць. Ува ўсякім выпадку аўтар адчувае, што ён больш пісьменны за няўдольных «хіругаў», якія зрабілі ягонаму твору невялічкую «аперацыю». А самая найменшая аперацыя дабівае чалавека, калі яе зробяць не хірургі, а «хірургі».

Што да завітання ў Вашыя мясціны — магу прыехаць толькі афіцыйна (чаго ніяк не здолеў ажыццявіць), неафіцыйна ж — нізкі на вочы і ўначы не бачу «зялёных» тропаў.

З грашыма ў мяне катастрафальнае палажэнне, бо працы цяпер не маю (апошнім часам 60 проц. DP пазвальнялі). Але Вы мне ўсё роўна нічога не прышлеце — дэвізовыя абмежаванні.

Як з 7-ым нумарам «Шыпшыны»?

Яшчэ раз моцна цісну Вашу руку — *Алесь Салавей.*

61. МАСЕЮ СЯДНЁВУ

28 красавіка 1948 г.

Дарагі Масей!

У цёшчы маёй пад старасць галава закруцілася, а ты не напомніў ёй, што я — Альберт Кадняк, дачка ейная — Зінаіда Кадняк (яна ж пабралася са мной), а Алесь Салавей — мой літаратурны псеўданім. І трэба было напомніць, што дзявоцкае прозвішча Зінаіды Кадняк, маёй жонкі — Баразнёнак-Шабуня (праз злучок). Яшчэ летась я пісаў Віцьбічу гэтыя дадзеныя, а цяпер вы іх не ўзялі пад увагу. Значыцца, ласкава прашу пераправіць усё (даты няхай застаюцца тыя самыя). Лепш перапісаць нанова. Яшчэ напішы мне дату (чысло й месяц), месца нараджэння й дзяржаўную прыналежнасць цёшчы (гэта дзеля анкеты, якую тут мушу запоўніць). Прышлі ўсё як найбарджэй. Я падам гэта й роўна праз тры месяцы атрымаю адказ (усё ідзе праз галоўную гасподу I. R. O. ў Вене). Можа, і пашанцуе, бо нікому яшчэ не адмовілі. Адзіная перашкода — паперка direktor'a. Гэты бюракрат напісаў тое, чым тут ніхто не цікавіцца. Яму трэба было пацвердзіць хадайніцтва цёшчы і прыпіску chairman'a... Калі ж станецца наадварот, і цёшчы прапануюць ехаць да мяне, дык неяк трэба будзе выкручвацца — сіламоц жа не прымусяць (ты не ўспамінай цяпер пра гэта). Дарэчы, больш падрабязна й «веско» дапішыце аб маёй працы ў вашым табары. Працу ў сваім фаху да часу выезду бяруць пад увагу (тым больш працу, што спрыяе «развязанню праблемы DP»).

Моцна цісну тваю руку. Пішы як найбарджэй.

З Вялікаднем! Хрыстос уваскрос!

Алесь Салавей.

62. ВІТАЎТУ ТУМАШУ

19 траўня 1948 г.

Вельміпаважаны спадару доктару!

Ваш ліст ад 6.05.1948 г. атрымаў. Сардэчна дзякую. Ад спадара Будзькі атрымаў «Апокрыф» М. Багдановіча й зборнік песняў. Вельмі дзякую Вам і ласкава прашу перадаць спадару Будзьку шчырую падзяку ад майго імя.

Жыву па-ранейшаму.

Маё «беспрацоўе» скончылася. Пашчасціла атрымаць працу на будаўніцтве ў Галяйне (20 км ад нас). На наступным тыдні еду туды. Толькі ў суботу й нядзелю змагу адведваць сваю сям'ю. Ніякая праца не страшыць мяне, але пры дрэнных харчах — катарга, а не праца. Іншым — лягчэй, па-за працай умеюць «камбінаваць». Мяне ж Усявышні пакараў вершамі, пазбавіўшы здольнасці да «камбінацыяў».

Зайздрошчу нашым «лонданцам», поўным патрыятызму й бадзёрасці. Мне ж цяпер — жывот перадусім. Кажуць, што кожны галодны перажывае падобныя з'явы.

Прывітанні Вам і Вашай сям'і ад мяне й маёй сям'і.

З глыбокім паважаннем да Вас — *Алесь Салавей.*

63. АЛЯКСЕЮ ГРЫЦУКУ

19 траўня 1948 г.

Дарагі Аляксей!

З таго ж самага месца й палажэння, ведамага табе, адпісваю на твой ліст, за які сардэчна дзякую. І даляр надышоў у цэласці, ён, як і ліст, прынёс шмат радасці — так-сяк разлічыліся за кватэру й харчы за красавік.

Ліст твой ішоў чамусьці звычайнай поштай, хоць на куперце напісана «Air mail».

Кланяецца табе цётка. Яна сказала наступнае: «Напішэце яму, што я жывая й здаровая, чаго й яму жадаю, і перакажэце праз ліст — хай моцна й шчыра Богу моліцца, і Бог не пакіне, дапаможа яму. І не забудзьцеся ўспомніць у лісце, што ўсе мяне крыўдзяць і ўсе забыліся на мяне, і на Вялікдзень ніхто не прыйшоў і не адведаў, як быццам мяне няма на свеце...» Жыве яна ў ранейшым кутку, а ў другім кутку — праф. Аляксішын.

Кланяліся табе й Чалоўскія. «Госцікі» зноў завіталі ў Зальцбург. Чалоўскі «адведаў» іх і нарабіў скандалу — ведама ж, быў п'яны, як зюзь. Гэта правінцыяльныя навіны.

А мае асабістыя — «без никаких изменений». «Оное высочество» прачытала «в газетке», што «и белорусы против...» І цяпер гэнае «высочество» вельмі ж крывіцца на мяне. Я наагул больш не магу сядзець у ранейшым нязменным палажэнні. На наступным тыдні збіраюся

ехаць у Галяйн на працу ў будаўніцтве. Нашых цяпер кіруюць туды — у самім Зальцбургу ўжо блізу ўсе звольненыя. Мікола па-ранейшаму без працы. Запісаўся ён на выезд у Канаду. Ужо й камісіі прайшоў, не быў пакуль толькі ў консула. Калі выедзе — тым часам няведама.

Мой зборнік «Сіла гневу» днямі павінен выйсці з друку. Ужо атрымаў гранкі для аўтакарэкты і адаслаў іх на мінулым тыдні. Што да «Вянкоў» — іхняе выданне будзе залежаць ад таго, як раскупіцца «Сіла гневу».

А па-за ўсім гэтым — тыя самыя калорыі і той жа пясок за баракамі. Атрымаў градку — два крокі ўдоўжкі і гэтулькі ж ушыркі. Пасеялі на ёй «хлеб», ды нейкая мышка, як на ліха, усё пагрызла.

Ці навязваў лучнасць з канадыйскімі беларусамі? Ці атрымліваеш праз іх «Бацькаўшчыну»? Ці атрымаў першы нумар «Сакавіка»?

Тым часам канчаю і цісну руку! Прывітанні ад Ганускі й рэшты сям'і. Пішы!

З запраўдным паважаннем — *Алесь Салавей.*

64. РЫГОРУ КРУШЫНУ

4 чэрвеня 1948 г.

Дарагі дружа Рыгор!

Твой ліст надышоў разам з парай паасобнікаў «Сілы гневу». Чакаю наступных паасобнікаў — як атрымаю, тады ж і пашлю Табе свой зборнік... Што казаць пра змест зборніка — ён не заслугоўвае, каб і гаварылі аб ім, але ж і вонкавы выгляд — ужо «стаханаўскімі» тэмпамі ў Менску і то лепш друкуюць.

Па-за гэтым — ніякіх навінаў у маім жыцці. Працую на калідоры, і гэта праца — найчарнейшая пляма ў маім жыцці. Але ж што зробіш? Што да эміграцыі — нікуды, апрача Паўдзённае Амерыкі, за выняткам Аргентыны, нельга тым часам выехаць. Каб набірала ў нас Аўстралія — паехаў бы, усё ж лепш Бразіліі.

На месцы працы жыву без сям'і, сям'я — на ранейшым месцы. Духовае жыццё, настрой — вельмі нецікавыя. Грызе туга і не дае супакою. Нічога не пішу. У гэтым годзе напісаў нешта з 5 вершатвораў. Рукапіс іншага майго зборніка «Вянкі» — у Адамовіча, пачытай, калі будзеш у Астэргофэне... Часопіса «Сакавік» (№ 2) яшчэ не атрымаў. Чуў, што там надрукаваны мой «Домік у Менску». Гэта рэч уваходзіць у зборнік «Вянкі».

Што да «дзеячаў» і нашых часопісаў — цалкам згодзен з табою. Там і мае колішнія жарты, напісаныя для кола бліжэйшых сяброў, цяпер выкарыстоўваюць. Падпісваюць іх прозвішчам Алесь Салавей, хоць пісаліся яны некалі пад іншым псеўданімам. Хуліганства — і больш нічога. І «Шыпшына» ўлегла ў балота. Дзіды можна паказваць з памогай саліднае крытыкі, а не абразаў і лаянкі. Віцьбіч безнадзейна хворы. Заўвагу пра «Шыпшыну» і іншыя часопісы (а яны ўсе чысценька лаюцца) хваравіта ўспрымае і бярэ ўсё на сябе і на адну «Шыпшыну». На апошні Віцьбічаў ліст адразу не адказаў, каб не пасварыцца і не заражацца чужой хваробай. Адкажу пазней, але ўсё роўна не ведаю, як адказваць... Пэўна ж, і «Сакавік» зачапіў «Шыпшыну», ці лепей: Юстапчык — Віцьбіча, але ж тая зачэпка не была такой бруднай, як шыпшынаўскі адказ на ліст Арсенневай.

Гэта я гавару табе па-сяброўску. Наогул жа ў гэта балота не хачу ўлазіць. Я толькі шкадую, што Віцьбіч не толькі захварэў, але і талент страціў — піша цяпер адно «божевілля». І «Шыпшына» ягоная (хутчэй, мабыць, ягоная, чымся наша) у першых нумарах, калі не было ніводнай кніжкі, крыху была падобная на часапіс, а цяпер — немаведама што. Раней я хваляваўся за гэты часапіс, зычыў яму ўдачаў, думаў — дармо, што на ратататры, няхай не спыняецца ў чыне на дабро культуры, ды гэтыя зычанні былі зычаннямі хвораму здароўя. Цяпер жа бачу — безнадзейная справа, не орган пісьменнікаў, а папаўненне «Рухаў» і «Вызваленняў». Сумна і балюча. Мабыць, і праўда, што эміграцыя — памыйная яма, у якую толькі выпадкова і вельмі рэдка трапляюць чыстыя і не паглумленыя рэчы.

Дзякую за павіншаванне, але ж не шкодзіла б вылаяць мяне за «Сілу гневу».

Пасылаю твайму сыну яшчэ адну паштовую марку.

Прывітанне табе і тваёй сям'і ад усіх нас.

Цісну руку. З праўдным павашаннем — *Алесь.*

65. МАСЕЮ СЯДНЁВУ

9 чэрвеня 1948 г.

Дарагі дружа!

Больш месяца таму адаслаў я назад паперу, што да майго пераезду ў Нямеччыну, бо была яна напісана на імя Алеся Салаўя. Я ведаў, што

гэта — новыя для цябе клопаты і што ніхто не возьмецца яе перарабляць, але адаслаў, бо сам ведаеш — цяперашніх бюракратаў ніякім чынам не пераканаеш, што я — гэта я, калі не напісана чорным па белым. Ды такой бяды з паперамі, давай пакінем іх у забыцці — гэткая мая доля, і гэтак мне заўсёды шанцуе...

Але чаму ты маўчыш? Мне тут вельмі цяжка й балюча аднаму, а без тваіх лістоў — якраз як некалі табе без Ліды. Бядую, мабыць, горш за ўсіх на свеце, мучаюся й гіну, тупею й нічога не пішу. Калі летась меў працу ў майстроўні па вырабу мэблі й так-сяк перабіваўся, дык сёлета й працы не маю, шукаю й не магу знайсці — беспрацоўе. Знайшоў быў «пасаду» на каменяломні, ды не вытрымаў, знясілены; каб там працаваць, трэба быць асілкам. Цяпер добрыя людзі абяцаюць уладзіць на працу ў Зальцбургу — у перасяленцкім табары Lehen, бо шмат тамтэйшых работнікаў выязджае ў Канаду. Калі ажыццявяцца гэтыя планы — тады ізноў перабяруся на старое месца — у стайню. Толькі і з гэтаю працаю цяжка: падскокваюць ужо «дзельцы», а за імі хіба даступішся?

Хочацца хутчэй выехаць. Хто выехаў летась — наракае на новае месца, бо тут яшчэ можна было круціцца, нічога не робячы; хто выязджае сёлета — задаволены.

Што з наступным нумарам «Шыпшыны»? Калі пшык — забяры мае актавы і адашлі Адамовічу. Ласкава прашу цябе не забыцца выканаць маю просьбу. Буду табе вельмі ўдзячны.

«Сіла гневу» ўжо выходзіць, здаецца. Яшчэ адна нэндза лезе ў свет!

Як табе падабаецца рэцэнзія «Асабістымі перажываннямі» ў часопісе «Божым шляхам»?

Пішы! Не напішаш — лычам будзеш.

Цісну руку — *Алесь Салавей.*

66. МАСЕЮ СЯДНЁВУ

1 ліпеня 1948 г.

Дружа Масей!

Сяння атрымаў твой ліст. Адпісаў на працы ды недзе згубіў адпісанае, шукаў — не знайшоў.

«Із славы», ці «са славы», а мо «зы славы» я не пакарыстаў — на новым старым месцы пачуваю сябе вельмі дрэнна. Сям'я — гэ-

нам, а я — гэтта (о ратуй мяне, Божа, ад «выдумкаў» «Бацькаўшчыны»!):

Усяго пакрысе
Знойдзеце вы гэтта,
Пры сасе, пры касе
Сабрана за лета.

Я. Купала

Запраўды, калі не быць рутынерам, як кажа Адамовіч, застаецца сцвердзіць, што «там», «тут», «тутака» — адно, а «гэнам», «гэтта» і «гэттака» — зусім іншае… А з «із» меў шмат клопату: не згаджаючыся з ім, пайшоў на кампраміс, на сярэдняе паміж «із» і «са» — на «зы» (ліханька, у нас усяго тры, а ў суседзяў аж чатыры: «із», «со», «зі», «зо». І ні ад «са», і ні ад «зы» мастацкая вартасць твора не з'іначыцца; з'явіцца на свет людская граматыка — будзем трымацца яе. Цяпер жа… Цяперака я прыйшоў да выснаву, што трэба пісаць «зы». Хто давёў, што не трэба? Які правапіс, зацверджаны міністэрствам асветы, забараніў яго ўжываць?

А новыя словы… Не ведаю, якія ты маеш наўвеце. Што да наватвораў — на іх маем права і ты, і я. «Навет» — спосаб напісання, а не новае слова, да яго я прывык гэтак, як ты да «сяння», да «наагул», да «пагляд». Можа, кагадзе? Якраз заўчора, пачуўшы з маіх вуснаў гэтае слова, жонка закінула мне: «Што за словы выкопваеш ты з «Бацькаўшчыны»? Што за «кагадзе», што за «балазе»?..» (Гэтыя словы знойдзеш у кожнага нашага паэты й празаіка, і больш яны пашыраныя, чымся Юркава «надысь»; дарэчы, і Юрка мае на яго права.)

Адамовічава мова часта нагадвае мне шмат што чутае раней, а пазней забытае. Таму я і ўжываю часам тое-сёе, раней не ўжыванае. Мова Адамовіча, за выняткам запраўдных выдумкаў, з якімі ніколі не згаджуся, — мова Дубоўкі й Пушчы, Бядулі й Чорнага, Зарэцкага й Гартнага, Купалы й Коласа, Крапівы й Танка, крыху й Ластоўскага. У Адамовіча я бяру прыклад вучобы ва ўспомненых карыфеяў. Адначасна не выракаюся собскіх асаблівасцяў і адценняў свайго лексікону, на што, як і кожны паэта, маю права.

Слова «мудзёры» магу дзе-небудзь ужыць, а слова «кудзёры» — шмат ужыванае нашымі пісьменнікамі, наагул, гэта добрае слова. Над кожным словам шмат думаю, з лёгкасцяй і паспешнасцяй аніводнага ў свет не пускаю. Мне падабаецца, іншым — не, што ж зробіш? Ня-

хай незадаволеныя лаюць мяне, на гэта яны маюць права, як і я маю права слухаць іх або не слухаць.

Прабач мне за «моўную» пісаніну. Шмат гаварыць і апраўдвацца — мая хвароба, ды ты, думаецца, мне прабачыш: не гэта прабачаў-выбачаў.

І ўсё ж мова ў нашых творах бедная й нэндзная, як тая «Шыпшына». І ў Танка, і ў Жылкі — багацце мовы, а мы палохаемся кожнага слова, не ўжыванага раней у «Звяздзе» і іншых выданнях часоў нашай вучобы.

№ 1 «Сакавіка» — туды-сюды. Пераклад Н. Арсенневай з Уітмана (?) нікуды не варты, нават горшы Золакавага перакладу з Клэна.

Адным словам, каб здарыўся цуд, якога ў нас не бывае, і «Шыпшына» злучылася з «Сакавіком» (ад «Шыпшыны» — прэч тое самае, што пачынаецца з літары «глаголъ», ад «Сакавіка» — «Пранцішаў», вучонасць і палітыку № 1), тады мо што-небудзь й выйшла б людскае, цяму годнае.

Асаблівымі навінамі пахваліцца не магу, бо не маю іх. Паслаў А. Адамовічу большую частку зборніка «Вянкі». Ніяк не збяруся паслаць рэшту. І на мяне нападаюць гэткія «ляноты», якія часам бываюць і ў цябе.

Ну, і тым часам бывай здароў.

Моцна цісну тваю руку — *Алесь Салавей.*

67. МАСЕЮ СЯДНЁВУ

1 ліпеня 1948 г.

Дружа Масей!

«Карыстаючы із славы», «з якой паспешнасцяй і, сказаў бы, з лёгкасцяй», «на мой пагляд», «пакуль не стануцца «кроўю», — пішаш ты. Бачу, ты не горш за мяне ўспрымаеш мову «хоць сабе й «Бацькаўшчыны». І я не толькі ўражаны, але і ўзрадаваны, што й ты аддаляешся ад савецка-беларускага лексікону і ўжываеш тыпова нашыя звароты мовы. Гэта зусім зразумела — усё добрае з мовы «хоць сабе й «Бацькаўшчыны» не можа абмінуць нас. Што да «новых словаў», то ў лісце да Ю. Віцьбіча я не «ўспрымаў», а бараніў тое, што мне даводзілася чуць і што, на мой погляд, выдаецца добрым. Адначасна заўсёды стаю за тое, каб і ў мове «падцягваць» чытача за

вушы, а не абніжацца да ягонага моўнага ўзроўню. Наш цяперашні чытач слаба ведае мову сваіх бацькоў, а літаратары слаба ведаюць мову дзядоў. А па-за гэтым — і ў мяне свая мова, і ў цябе свая, а не чыясь іншая. Мабыць, не памылюся, калі скажу, што й ты пазнаеш паводле мовы мой верш, не падпісаны мною, гэтак і я пазнаю твой. А вось з «із» «з лёгкасцяй» не згаджаюся, бо яно ўвайшло ў нашу мову ад жыдоў. А «зы» паблізу Вязынкі — на радзіме Купалы — пачуў, і яно, ужытае ў «Бацькаўшчыне», разгневала мяне, а цяпер пачакаецца, і не магу вытрываць да таго часу, пакуль яно станецца «кроўю». Здаецца, і сам Купала яшчэ ў 1938 годзе пісаў «зы», ды рэдактары правілі на «са» — дызертыра ў нашай мове (тут я згаджаюся з А. Адамовічам). Я не адмаўляюся, А. Адамовіч і В. Ластоўскі крыху паўплывалі на маю мову; усё благое іхнае я адкідаў і стараўся таксама сваёй мовы не спляміць.

Што да «смятаны» — ці не ў тым яна, што нашы рэакцыянеры ў мове топчуць нагамі? Наагул жа, раблю тое, што мне даспадобы, і не раблю таго, што не падабаецца. Розныя «Беларусы на чужыне» назавуць гэта «нявыхаванасцяй», але найгоршы літаратар больш шліфуе нашу недаспелую яшчэ мову, чымся мы... Гэта ўсё, напісанае вышэй, — таксама толькі мая асабістая думка.

Што да «Шыпшыны» — маеш рацыю, гэта я і ў вочы Ю. Віцьбічу казаў-пісаў. Ды цяпер яна змоўкне, мабыць. Пасля вымены грошай будзе ў вас тое, што ў нас пачалося яшчэ залетась. Кожная капейка дарага будзе каштаваць і нялёгка будзе здабывацца. Кожны будзе рады першай-лепшай працы, што трапіць у рукі. У нас ужо тым, што выязджаюць, і за рэнту плаціць трэба, і за медыцынскі агляд. Як на маю сям'ю — гэта вялікія кошты.

Пра эвакуацыю 70 тыс. ДП з Аўстрыі «Бацькаўшчына» перадрукавала «вутку» з нямецкай прэсы.

На новым-старым месцы жыву тым часам адзін. Толькі ў вольныя часіны адведваю сям'ю. Нядзелі для мяне няма, бо працую за «старэйшага» на калідоры. Шмат людзей выязджае, шмат новых прыходзіць, гэты перасяленчы табар біткам набіты, таму невядома, ці здолею сюды ўлезці з сям'ёй.

А пабачыцца з табой так хочацца, што ты проста не ўяўляеш. Але шляхі нашы разыдуцца — давядзецца-такі ехаць мне ў Паўдзённую Амерыку. У іншыя краіны не прымуць, з Аўстрыі выганяць. Здохнем, браток, у розных канцах свету.

Прабач за «алавіковы» ліст. Пішу на месцы працы, а «бюрка» на калідоры няма. Таму й почырк нецікавы, ды я яго й да гэтага папсаваў, перапісваючы вершы.

Твой зборнік «Спадзяванні», прысланы Б. Аляксандраву, мае 56 балонкаў. Пасля 56-ай бал. пачынаецца змест, пасля зместу — ізноў тэкст ад 1-ай да 56-ай бал., а ў самым канцы — яшчэ раз змест. Барыс прасіў мяне не пісаць табе аб гэтым, таму май на ўвазе.

«Сіла гневу» ўжо бадай выдрукаваная. Калі не «пшыкнуць» пераплёты-сшыванкі з прычыны вымены грошай, — добра будзе.

Мова ў нашых лістах — газетная, канцылярская, не мастацкая. Таму мо й дарэмна сварыўся я ў пачатку ліста.

Бывай, цісну тваю руку — *Алесь Салавей.*

68. АЛЯКСЕЮ ГРЫЦУКУ

Субота, 3 ліпеня 1948 г.

Дарагі Аляксей!

Інжынер Фядзюшка споўніў сваё слова: з 15 чэрвеня я працую на «новым старым» месцы ў паліцыі-варце I.R.O. Нічога не зробіш — нейкім чынам трэба змагацца за кусок хлеба.

Я павінен быў перасяліцца з Глязэнбаху на месца працы — у Леген. Ды на другі дзень майго славутага «змагання» ў імя жывата інжынер неспадзявана выехаў у Канаду, а новае начальства кажа: «Це пан інжинер Федюшко вам абіцяв… А ми кажемо, що в Глязенбасі дощ на вашу голову не падае…»

Я й пакінуў ужо дамагацца. Не маленькі ж, ведаю: пуста ў кішэнях — маўчы і не раззяўляйся.

У Глазэнбаху мне добра было б, каб я стала служыў ад восьмае ўранні да шостае ўвечары. Але калі маю службу да дванаццатае ўначы, дык пасля службы — або пехатою прыся дахаты, або чакай раніцы. Тое самае, калі служба выпадае да чацвертае ўранні — мушу дастацца ў Леген увечары папярэдняга дня. Праз усё гэта шмат часу прападае ў бяздом'і, і хоць працую-свішчу гадзінаў з 30 на тыдзень, у хаце-дома, сярод сям'і — рэдкі госць.

Гаварыў я з вышэйшым начальствам — з містэрам Сільвэрам. Містэр казаў «окэй», ды не памагло яно; калі ніжэйшае начальства круціць яйцамі, дык і загад вышэйшага траціць сілу.

За кватэрмайстра цяпер пан Каўтанюк, за ягонага заступніка — артысты Лугавы, залаты чалавек, рады дапамагчы, ды начальнік з яго надта маленькі.

Вось і «новости» мае — ведамкі — навіны.

Чалоўскі выехаў. Мікола таксама. Ягоны «малы» — у Ангельшчыну; спарыш рассыпаўся. Твая «гвардыя», хлопцы гуртам падаліся ў Ангельшчыну. Нешта ўсяго толькі два «гвардзейцы» засталіся. Адольф «подстроил» адной (сакрэт, і не прагаварыся перад Курыловічам і Матвеенкам). Цётка хвалілася ўсім, што ты ёй даляры прыслаў і ўсім гаварыла: «Не кажэце Алесю, што мне даляры Грыцук прыслаў...» — мабыць, баіцца, каб я не стаўся канкурэнтам у атрымванні тваіх, потам і працай цяжкой здабытых капіталаў.

Перадай Курыловічу й Матвеенку маю сардэчную падзяку за даляры, сардэчна дзякую й табе. Шчыра пацісні хлопцам руку ад майго імя — мо яшчэ з раз перашлюць «падмацаванае» прывітанне.

У нас цяпер, каб куды-небудзь выехаць, трэба плаціць і за медыцынскі агляд.

Мой зборнік, бадай, выдрукаваны. Калі не перашкодзіць грашовая рэформа — бліжэйшымі днямі пабачыць свет.

Я думаю пра выезд у ЗША. У Легене кажуць, што новы эміграцыйны закон пачне ажыццяўляцца толькі ў кастрычніку. Усякі выезд у ЗША спынены на тры месяцы. Калі возьме Канада — паеду туды. У Чылі, Венесуэлу й Бразілію выехаць вельмі лёгка. Навет сілком змушаюць ехаць у гэныя краіны.

Нейкая нямецкая газета ў Баварыі надрукавала «вутку» пра эвакуацыю 70 тыс. нашага брата з Аўстрыі. Гэтую «вутку» перадрукаваў у «Бацькаўшчыне» Адамовіч. У Баварыі пачалі гаварыць, што вывезуць нас у Нямеччыну. Я ўжо атрымаў лісты з надзеяй хуткага спаткання. Падставай для «вуткі» сталася заява галоўнага дырэктара I.R.O. на Аўстрыю, што да канца чэрвеня 1949 года выедзе з Аўстрыі ў заморскія краіны 70 тысячаў ДП. Нямецкая газета выезд назвала эвакуацыяй і заміж 1949-га падала 1948 год.

Даўно ўжо паслаў я табе мінулы ліст. Атрымаў і адказ, вось і адпісаў. А ў нас няма лета: дажджы й дажджы, Зальцах выходзіць з берагоў. Уначы на службе холадна, не памагае й свэтар, мушу ўскладаць зімовае паліто. А цяпер жа — ліпень. Людзі кажуць, што надыходзіць канец свету.

Барыс яшчэ не выехаў. І ехаць яму хочацца гэтак, як табе ў лесе тапаром махаць.

Кланяюцца табе Ануська, Міхаська й Зіна.

Моцна цісну руку тваю, з запраўдным паважаннем — *Алесь Салавей.*

69. МІКОЛУ ГАНЬКО

13 ліпеня 1948 г.

Дабрыдзень, Мікола!

Твой ліст з Італіі атрымаў. Учора надышоў ліст з Канады. Сардэчна табе дзякую. Ні першы ліст з Італіі, ні другі з Канады ўжо не засталі Юркі — ён выехаў у Ангельшчыну на пачатку дваццатых чыслаў мінулага месяца. Лістоў ад яго яшчэ не маю. Таму й не магу паведаць табе ягонага адрасу.

У той дзень, калі ты ад'язджаў у Канаду, я прыйшоў у Lenarkaserne а восьмай гадзіне ўранні, а ты выехаў на станцыю а 7.55. У мяне пачалася служба, і я ніяк не мог адлучыцца, каб трапіць на станцыю. Вельмі шкадаваў, што так сталася.

Алольф сфатаграфаваў цябе (твой ад'езд) у дзвюх позах. Выйшлі нядрэнныя карткі. Па два асобнікі кожнага здымка Юрка ўзяў з сабою. Мо ён і прышле табе з Ангельшчыны. Адольф без грошай мне не дае, а ў мяне па-ранейшаму пры душы — ні капейкі. Атрыманы заробак за палову мінулага месяца пайшоў на пакрыццё даўгоў, а таксама кватэрная й харчовая плата... Адольф — жмінда; я ўжо пазычаў грошы на гэту справу, ды ён кажа, што цяпер не мае лішніх фотакартак — зробіць пазней. А В. Конаў мае мо з дзесяць. Адольф яму мо й сам пашле — хваліцца, што добры хлопец Васька, і нахваліцца не можа. Дарэчы, Адольф «подстроил» гэнай самай... Ейныя бацькі паехалі ў Бразілію, а яна засталася. Адольф круціўся, як мыш пад венікам, ды пабраўся-такі. Цяпер ён мае жонку й на спадкаемства спадзяецца. І апрача ўсяго гэтага бацька крыху вылупцаваў яго.

«Дыперыя» ад'язджае гэтак, як і ад'язджала. Усё роўна знаку няма. Я вельмі лёгка мог бы выехаць у Бразілію. Ды не цягне мяне туды. Скажы сваім «сёстрам», няхай прышлюць мне пэрміт, толькі па пэрміту можна выехаць у Канаду адначасна з сям'ёй. Ну, але гэта я жартую, бо х..., прабач, я дачакаўся б, а не пэрміта, каб нават і збіраўся хто паслаць.

Жыву па-ранейшаму на старым месцы. На пяты дзень маёй працы інжынер Фядзюшка паехаў у Канаду, а новае начальства яйцамі круціць. Словам, я не пераехаў у Леген, нават і не спадзяюся пераехаць. Ды гэта — такой бяды. Купіў Monats-Streckenkarte — можна ездзіць. Адзіная нявыгада — працую мала ды дома бываю рэдка, у «бяздом'і» праходзіць бадай увесь час.

Зборнік мой выдрукаваны, толькі пакуль не пераплецены. Але, мабыць, не хутка пабачыць свет. У Нямеччыне адбылася фінансавая рэформа, «дыпіўскім» арганізацыям грошай тым часам не памянялі. Значыцца, няма за што выкупіць кнігу з друкарні — наперад не разлічваліся.

Ну, вось тым часам і ўсё. Прывітанне табе «від хлопців-поліцистів».

Кланяецца табе Ганунька й рэшта сям'і.

Жадаю табе ўсяго найлепшага, пішы.

Бывай здароў — *Алесь Салавей.*

70. МІКОЛУ ГАНЬКО

16 ліпеня 1948 г.

Дарагі Мікола!

Твой ліст з далярам атрымаў, за што сардэчна дзякую. Прывітанні ўсім перадаў. Усе табе шчыра дзякуюць і нізка кланяюцца. Мае пабрацімы, а твае сябры й знаёмыя — калідорнікі-вартаўнікі — нікуды яшчэ не выехалі. Пасля таго, як ад'ехаў Чалоўскі, наступнага транспарту ў Чылі не было. «Госцікі» таксама не ад'ехалі, каб быў тут Чалоўскі — да сянняшняга дня тросся б, як асінавы ліст... Вольга Дуброўская выехала ў Польшчу 11 ліпеня. А Адольф запрашае цябе на вяселле.

Чаму ты нічога не ўпамінаеш пра Юрку? Ці навязаў з ім лучнасць? Ён выехаў з Зальцбургу — і след па ім прастыў, нібы карова языком злізала. Калі ты не спісаўся з ім як-небудзь, дык што з ім сталася? А калі спісаўся — напішы яму ад мяне прывітанне.

А як Васька маецца? Ці далажыў капейку да ахвяры на мой нікчэмны зборнік? Дарэчы, ужо і ў апошнім нумары «Бацькаўшчыны» абвешчана, што зборнік выйшаў з друку. Я чакаю яго з выдавецтва. А ці звязаўся ты з кальпартэрам Пітушкам? Ці атрымліваеш беларускую прэсу? Ці ёсць ты на тых фатаграфіях, што Адольф паслаў Ваську? Я ніяк не магу іх у Адольфа выенчыць...

Зіна кажа, што носіць панчохі 9-га нумару. Але ты не вытрачайся. Я абсалютна нічога не патрабую. А каб і паслаў што-небудзь — дык хіба якую кансерву са шмальцам ці з салам. Што да «аўфруфаў» — дык цяпер горш, як было раней, толькі хлеба крыху прыбавілі ды й памідораў, ну й агуркоў крыху далі. А хлеб і агуркі — тым часам не голад.

Жыву яшчэ ў Глязэнбаху. На пярэбары ў Леген не маю надзеі — не хочацца мордам літра стаўляць, і не пастаўлю. Мабыць, давядзецца мне падацца да Чылі або да Бразіліі. На іншыя месцы з сям'ёй — паранейшаму ніякіх надзеяў, а на выезд пачынаюць націскаць. Куды можна паехаць, туды і едзь — кажуць.

Прывітанне табе ад усіх нас.

З павbooжаннем — *Алесь Салавей.*

71. АЛЯКСЕЮ ГРЫЦУКУ

17 ліпеня 1948 г.

Дарагі Аляксей!

Ліста ад цябе яшчэ не атрымаў, але пішу зноў — маю да цябе просьбу. Просьбу, якую нават не асмельваюся выказаць.

Выйшаў мой зборнік. А фінансавая рэформа ў Нямеччыне так падкасіла выдавецтва, што яно не мае за што пераслаць мне аўтарскія паасобнікі.

Ці не маглі б вы (ты, Мацвеенка й Курыловіч) скласціся па пары даляраў і пераслаць іх на адрас выдавецтва:

Herr A. Adamowitsch,
Weissruthenischer Zeitungs — Verlag «Backausczyna»,
Osterhofen,
Am Stadtplatz, Gasthof,
«Zur Sonne»,
Germany.

Грошы трэба слаць пераводам, інакш — вымуць, лісты ў Нямеччыну яшчэ цэнзуруюцца. На пераводзе або ў адмысловым лісце зазначце, на якую мэту пасылаюцца грошы.

Буду вам вельмі ўдзячны. Як толькі выеду ў якую-небудзь краіну — адразу ж разлічуся з вамі.

Ласкава прашу прабачыць за такое маё нахабства. Але іншага выйсця не маю, толькі на вас адзіная надзея.

Моцна цісну вашы рукі, з паважаннем — *Алесь Салавей.*

P. S. Барыс прыняты да выезду ў Канаду. Едзе бліжэйшымі днямі. Між іншага, выязджае ён на пэрміт — прыслаў зусім чужы чалавек. Так што Барыс не будзе звязаны з кантрактам.

72. ЮРКУ ВІЦЬБІЧУ

30 ліпеня 1948 г.

Дарагі дзядзька Юры!

Ваш ліст атрымаў і прачытаў з вялікай радасцю. Даўгое Вашае маўчанне і асабліва апошні нумар «Шыпшыны» засмуцілі былі мяне. Пачуваю ў сабе нешта ненармальнае і, губляючы ажыўленую лучнасць з найдаражэйшымі для мяне людзьмі, пачынаю траціць адчуванне блізіні да іх. А ад гэтага — яшчэ большы духовы неспакой.

Чытаў рэцэнзію-пашквіль на «Усяночную» С. Юстапчыка. Мне не хочацца верыць, але чамусьці неадступна думаецца, што гэты пашквіль пісалі Вы. Не С. Юстапчык мяне інтарэсуе, а тое, ці заслужыў ён памыяў на сваю галаву, ці не. Па-мойму, пісьменнік з розумам і талентам не можа так бясчэсціць іншага, не пазбаўленага таленту. У пашквілі — не аб'ектыўная або суб'ектыўная рацыя, а жоўць нянавісці да С. Юстапчыка, нянавісці «божевільной». Прабачце, калі ласка, але я гэтак жа сама адрэагаваў бы, каб хто-небудзь асуджваў і Вас так брутальна і неразумна.

Уладзімір Глыбінны зусім слушна вылаяў мяне за мае нецэнзурныя рэчы ў 4-м нумары «Пагоні». Калі я пускаў іх у часапіс, дык і разлічваў на гэтую слушнасць, толькі не ад У. Глыбіннага, што, бадай, ніколі не мае яе. Сталася ж: самога сябе я знізіў у сваім уяўленні, а У. Глыбіннага ўзняў пад нябёсы. Аднак жа ні маё нікчэмства, ні геній У. Глыбіннага нічога не могуць зрабіць супроць рацыі, выказанай у гэных, хай сабе й нецэнзурных, рэчах.

З новымі маімі творамі цяжка — ужо даўжэйшы час нічога не пішу. Праўда, я напісаў у студзені пару санетаў і колькі александрыйскіх вершаў. Паслаў іх Адамовічу, таксама паслаў зборнік лірыкі «Вянкі»

на 112 бал. Пасылаць тое ж самае ў іншае месца не выпадае, дый я не маю ўжо сілаў яшчэ раз перапісваць.

Наагул, апошнім часам жыццё маё складалася гэтак, што было не да вершаў, пэўна ж, аб гэтым Вы добра ведаеце. А цяпер маю працу, дзеля якой усцяж тыдня — бадай ніводнае вольнае часінкі. Вучыцца і ўзбагачаць веду таксама няма магчымасці, а таму мне й не зусім карціць пісаць — не хачу паўтарацца, пераспеўваць самога сябе або іншых. Аднак, не зважаючы на гэта, калі й вынасіцца што-небудзь — пашлю цяпер у першую чаргу на адрас «Шыпшыны». Як толькі спозніцца ў 8-мы нумар — пойдзе ў 9-ты.

Адначасна не адмаўляюся ад выказаных у папярэднім лісце словаў пра мой пагляд на грызню й абразы ў нашых часапісах, на іхняе ўбоства. Ад гэтага шмат будзе залежаць і лёс далейшага майго суўдзелу ў іх. Да падтрымання з боку шырокіх колаў нашай «грамадскасці» стаўлюся негатыўна, бо толькі тое мае сякую-такую вартасць, ад чаго гэта «грамадскасць» адварочваецца. Мадзенне на ўзроўні «грамадскасці» — наша трагедыя. Калі ж мы перарасцём яе?

Вялікі ліст ніяк не пішацца — я не знаёмы з Вашым паглядам на мае думкі, выказаныя ў папярэдніх лістах. Вы аб гэтым нічога не пішаце.

Націскаюць на выезд у Паўднёвую Амерыку (Бразілія, Венесуэла, Чылі — яны якраз і бяруць вельмі інтэнсіўна). На Канаду з сям'ёй няма надзеі, ЗША тым часам толькі праектуюць. Цяжка сказаць, ці ўдасца ўтрымацца з надзеяй на выезд у ЗША — залежыць ад таго, як у далейшым будуць націскаць (Аўстрыя ж звальняецца).

Жадаю Вам добрых удачаў у жыцці й творчасці! Прывітанне Вам і Вашай сям'і ад усіх нас.

З павагаю — *Алесь Салавей.*

73. АЛЯКСЕЮ ГРЫЦУКУ

31 ліпеня 1948 г.

Даражэнькі Аляксей!

Твой ліст і два даляры я атрымаў, за што сардэчна дзякую. Усяго разам я атрымаў ужо 8 даляраў. У далейшым мо не пасылай, каб вельмі шмат не вытрачацца, я ж — гэткі нетактоўны нахал — апрача ўсяго гэтага папрасіў паслаць на адрас выдавецтва «Сакавік» пару

даляраў на мой зборнік (больш 5-ці даляраў пасылаць няма патрэбы). З гэткай самай просьбай я звяртаўся й да Міколы. Але Мікола піша, што з Канады ў Нямеччыну грошай не прымаюць. У гэтай справе найлепшую інфармацыю мог бы даць Язэп Пітушка — нейкім жа чынам ён разлічваецца за «Бацькаўшчыну». Ягоны адрас: Pitushka Joseph, General Delevery, Ottawa, Ontario.

Калі ніякай рады няма — пасылаць грошы ў куперце ні ў якім разе не трэба. І калі наагул з грашыма цяжкавата — таксама не трэба. Мо з 10 паасобнікаў як-небудзь прышлюць, а з рэштай — такой бяды, ці гэта ў нас прападала? Выпісваць, як мяркуе Мікола, у Канаду, а з Канады перасылаць мне — не варта заводзіць такую валакіту. Тым часам я не атрымаў яшчэ ніводнага паасобніка. І «Бацькаўшчына» ўжо два тыдні не выходзіць.

Як будзеш пісаць да Пітушкі й Акулы, спытайся заадно — мо ведаюць часам добрага чалавека, які змог бы прыслаць пэрміт на маю сям'ю? Зразумела, такое пытанне смешнае й даволі наіўнае, але ж папытацца не пашкодзіць. Барыс запытаўся між іншага — і прыслалі пэрміт. У запыце, праўда, не ўспаміналася пра сям'ю, і пэрміт прысланы на аднаго Барыса — бацька тым часам застаецца. Барыс ад'язджае бліжэйшымі днямі.

Выехаць, часова пакінуўшы сям'ю, можна, але на гэткі крок я не пайду. І на ЗША мала надзеяў. Я ведаю, што чакае мяне, скажам, у Канадзе, але ж выехаць — мус, як той казаў. I.R.O. выклікала мяне на інтэрв'ю. Давалі 15 хвілінаў падумаць, каб даў згоду на выезд у Паўдзённую Амерыку. І гэткіх усіх выклікалі... А Бразілія й Чылі бяруць з сем'ямі, і бяруць вельмі інтэнсіўна. Аднак жа некваліфікаваным работнікам самі консулы не радзяць выязджаць і кажуць, што некваліфікаваная сіла ў іх аплочваецца ў тры разы меней, чым у Канадзе. І самі людзі пішуць з Бразіліі і з Венесуэлы, што без фаху там самога сябе не пракорміш. А торбы грошай на собскі рэстаран, аб чым хваліўся, выязджаючы, Чалоўскі, я не маю. Што ж рабіць? На выезд націскаюць і хутка будуць націскаць больш інтэнсіўна — Аўстрыя ж «разгружаецца». Няўжо мне Чылі ці Бразіліі, як суда Божага, не мінаваць?

Сем'і тых, што выехалі яшчэ летась, да сянняшняга дня сядзяць на месцы. І перспектываў на хутчэйшы выезд няма.

Пра Гарадэльскую вунію звесткі перапішу і прышлю неўзабаве. Можа, у далейшым прышлю і што-небудзь сваё, але не абяцаю. З тымі, хто працуе ў паліцыі, музы не сябруюць. Сілком саджаў само-

га сябе за стол, браўся праз сілу за пяро — ніводнага радка з сябе не выціснуў. Тут нічога ўжо не парадзіш. Здаецца, каб гной вазіў — тады яшчэ натхненне было б, а паліцыя — горш усякага гною. Бяздомнае ў мяне і цяпер жыццё: я ў Легене, а сям'я — у Глязэнбаху. Халтурыць не магу, а на салідную літаратурную працу не маю магчымасцяў. Пасля розных «інтэрв'ю» свет нямілы, мабыць, яшчэ больш нямілы, чымся табе ў лясной глушы і дашчаным бараку... Праца мая, сам ведаеш — лёгкая, ды на душы цяжка. А з духовай болесцяй ты знаёмішся цяпер і знаеш, што яна з сябе ўяўляе. І нада мною навісае глуш-глухамень — ты паехаў, а цяпер ад'язджае і Барыс.

Адольф «выйшаў замуж». Неўзабаве ён паедзе, мабыць, з усёй чысценька сям'ёй у Бразілію.

Дуброўскія запісаліся на выезд у Польшчу. У сярэдзіне жніўня адыходзіць іхны транспарт. У гэтай справе небяспечна й цяжка што-небудзь ім радзіць. Я асабіста не магу іх адмаўляць ад выезду: па-першае, не магу нічым дапамагчы, па-другое, перакананы, што ім нічога не будзе. На выезд наважылі іх апошнія лісты ад Вольгіных сястры й брата.

Выйшаў зборнік вершаў Ігара Качуроўскага. Там ёсць добрыя рэчы. Я даў Ігару твой адрас, ён пашле табе свой зборнік.

Міхаська гаворыць ужо вельмі добра. Ануська ходзіць. Дзеці растуць, як грыбы.

Вось, тым часам, і ўсё.

Прывітанні табе ад усіх нас.

Моцна цісну тваю руку, з паважаннем — *Алесь Салавей.*

74. АЛЯКСЕЮ ГРЫЦУКУ

15 жніўня 1948 г.

Дарагі Аляксей!

Твой апошні ліст, як бачна, размінуўся ў дарозе з маім апошнім лістом. Сардэчна дзякую за два даляры — іх я атрымаў. Глядзі, дружа, каб не было гэта для цябе завялікай вытратай.

Ужо й «Бацькаўшчына» ў сваім апошнім «аварыйным» 25-ым нумары паведаміла, што мой зборнік «Сіла гневу» выйшаў з друку. Ніводнага паасобніка з выдавецтва я яшчэ не атрымаў. Што да панчохаў — можа, і нядрэнна гэта прыдумана, але толькі ў Нямеччыне ў магазінах не з'явіліся яны за бясцэнак.

Аб змушаным маім успаміне пра зборнік можаш не мецъ сумневу. Што гэта за дрэнь і мізарнота «Сіла гневу» — ты проста не можаш сабе ўявіць. З кожным днём усё больш і больш пераконваюся ў гэтым. Кажу зусім шчыра.

Што да тутэйшых навінаў і настрояў — аб усім я напісаў табе ў мінулым лісце. Нічога не з'іначылася. Мабыць, не абмінуць мне Паўдзённае Амерыкі — сваёй пагібелі…

Вольга Дуброўская выехала ў Польшчу 11 жніўня. Барыс Аляксандраў ад'едзе ў Канаду праўдападобна 28 жніўня. Кажа, што ўжо з Канады напіша табе. Цётка жыве ўжо ў Гэльбруне. Адольф «наслаждается прелестями первых дней молодой жизни», а жонка ягоная з кожным днём «полнеет». Адольф зрабіўся маўклівым і негаваркім. Апошнім часам пачуў ад яго толькі, што развод каштуе блізу 600 шыл. Я па-ранейшаму «верно служу» на калідоры. Па-нямецку навучыўся «брахаць», як сабака — сама праца змусіла. Першымі днямі думаў, што нічога не выйдзе, а за якога паўмесяца пайшло…

Яшчэ толькі палова жніўня, але сёлета вельмі нечакана пачаў адчувацца надыход восені. Лета бадай не было. На найменшых горах ляжыць снег. Дрэвы там-сям пачынаюць жаўцець, на палях — восеньскае павучынне.

Мне цяжка абяцаць што-небудзь для вашага часапісу. Без натхнення я й двух радкоў не магу напісаць. А «іраўская» каска выціснула з маёй галавы найменшую згадку аб натхняльніцы-музе. На калідоры — шэрая аднастайнасць, уражанняў — ніякіх. А там, дзе няма ўражанняў, няма і натхнення. Талент тут не мае значання.

Нізка кланяецца табе сям'я Розумава (пані Вера — у санаторыі). Айца Віктара даўно не бачыў, ён «хварэе» ў Паршы — у Апех'е. Матушка прайшла курсы медсясцёр.

Прывітане ад усіх нас, цісну руку — *Алесь Салавей.*

75. МІКОЛУ ГАНЬКО

8 верасня 1948 г.

Даражэнькі Мікола!

Хіба ты не ведаеш, што я «сябра харошы» толькі для Уладзіміра Дудзіцкага, а для цябе, можа, і благі? Што да «маку» — я ж табе тысячу разоў казаў, што іначай пісаць не ўмею.

Атрымаў ліст ад «прапашчай граматы», як ты пішаш. Толькі хацеў паведаміць табе ягоны адрас — ажно надышоў ліст ад цябе; ты пішаш, што Юркаў адрас ужо маеш. Ну й дзякаваць Богу, што навязалася лучнасць.

Разам з тваім лістом атрымаў і даляр. Сардэчна табе, Міколка, дзякую, [redacted] найбольш удзячны Міхаська. Есць яблыкі і кажа: «Дзядзя Мікола даляра прыслаў, а тата аўтам яблыкаў прывёз». Таксама і гэтак кажа: «Той дзядзя, што стрыг мяне, рабіў чы-чы». Бачыш, хоць я і ўдаўся ў сентыментальнасць, але ведай, што маленькі чалавечак не забываецца на цябе. Калі я сказаў яму, што ты ездзіш аўтам свіней карміць, апісаўшы-растлумачыўшы праўду гэтага падарожжа, дык маё апавяданне вельмі спадабалася, і цяпер ён просіць, каб паўтараў яго, як тую казку пра Чырвоную Шапачку.

Дзякую табе й за тое, што выканаў маю просьбу, паслаўшы на адрас «Бацькаўшчыны» натурплату. Ад Адамовіча яшчэ не маю вестак аб тым, ці пашчасціла збыць тое пасланае. Думаю, што Бог дапаможа ў гэтым, калі толькі ў Нямеччыне ў магазінах яшчэ пуставата. У нас ужо ўсяго-ўсенькага біткам набіта — абы толькі грошы былі. З наступнага перыяду й «аўфруфы» павялічацца на 400 калорыяў — будзе ўжо 2000. Пэўна ж, не на масла і сала, а на фасолю й гарох ізноў налягуць.

З выдавецтва я ўжо атрымаў 10 паасобнікаў свайго зборніка. Выглядае ён вельмі мізэрна, і наагул з тэхнічнага боку марны. Я паслаў табе звычайнаю поштаю — будзе ісці крыху даўжэй, бо перасылка паветранай поштай каштавала б 23 шыл. 70 гр. Я не шкадаваў такой сумы, але падумаў — так ці інакш — усё роўна атрымаеш (за лісты, што прыходзяць сюды з Канады й важаць больш 10-ці грамаў, а на іх маркі на 15 цэнтаў, тут даплачваецца 6 шыл; больш 20-ці грамаў — 12 шыл. і г. д.). Тваe лісты — менш 10-ці грамаў, і мне даплачваць не трэба, можаш быць спакойны. Як атрымаеш зборнік — паведамі мяне. Напішы таксама, ці трэба паслаць Ваську, ці цікавіць яго гэта.

Спяшаюся паведаміць, што табака мая паспела. Днямі пачнецца збор ураджаю. Я не скурыў яе загадзя, бо вельмі ж паскудная.

Ад Вольгі Дуброўскай — няма ведамкаў. Ад Чалоўскага — таксама. Адольф Губерт паставіў пасярод свайго пакою самагонны апарат, пазаліваў горлы табарнай паліцыі і пачаў гнаць самагонку — не ў баўэра ўжо, а проста дома. Прадукцыя ягоная вельмі танная, бо

ўжо савецкай саракаградуснай у магазінах па 40 шыл. літар — колькі хоцькі.

Прывітанне табе ад Ю. Кебуса. Цяпер якраз ноч — удваіх маем службу.

Ну, вось тым часам і ўсё.

Цісну руку, з паважаннем — *Алесь Салавей.*

76. АЛЯКСАНДРУ МІЦКЕВІЧУ

10 верасня 1948 г.

Вельміпаважаны спадар Міцкевіч!

Ліст Ваш атрымалі. Радуе нас Ваша жаданне мець з намі лучнасць.

Нас тут вельмі мала, і робіцца з вялікімі цяжкасцямі толькі тое, што дазваляюць магчымасць і ўмовы. Мы маем невялічкую колькасць падпісчыкаў на нашы выданні, а гэта пагражае сарванню друкаванага беларускага слова ў Аўстрыі.

Калі можаце, арганізуйце падпіску сярод Вашых беларусаў на нашы выданні. Тыднёвік «З Беларускага жыцця» каштуе 2 шыл. на месяц. Часапіс «Пагоня» каштуе 3 шыл., але грошай на яго высылаць не трэба. Аб выхадзе новага нумару вам паведамяць, а тады кожны, хто зажадае набыць часапіс, зможа яго выпісаць.

Наагул, рабеце паводле змогі ўсё тое, што карыснае для нашае беларускае справы.

Малюнак Ваш атрымаўся ўвогуле нядрэнна. Ці можаце Вы стварыць што-небудзь новае, не перамалёўваючы з гатовага? Можа, змаглі б нам прыслаць колькі добрых гумарыстычных малюнкаў?

Адрасу беларускай школы ў Пасаў мы не маем. Мы толькі выпадкова атрымалі вестку аб ейным існаванні.

Пішэце! З паважаннем — *Алесь Салавей.*

77. АЛЯКСЕЮ ГРЫЦУКУ

10 верасня 1948 г.

Даражэнькі Аляксей!

Адказваю табе з дзесяцідзённым спазненнем. Настрой апошнім часам быў вельмі нецікавы, і я ніяк не мог узяцца за ліст, прабач

мне, дружа. Выпіскі з гісторыі Я. Найдзюка пра Люблінскую вунію пашлю бліжэйшымі днямі. Тыдзень таму паслаў звычайнай поштаю зборнік «Сіла гневу». Як атрымаеш — паведамі мне. І напішы такса-ма, ці варта пасляць зборнік Мацвеенку і Курыловічу. Ну, а Пітушка й Акула, мабыць, з самога выдавецтва атрымаюць — ім жа шлюць усё-ўсенькае…

Разам з тваім лістом атрымаў я й два даляры. Дзякуем сардэчна з усёй сям'ёй. Міхаську й Ганусьцы купляюцца за гэныя грошы яблыкі, вінаград і слівы — і яны найбольш за ўсіх задаволеныя. Міхаська навет кажа, што яблыкаў больш не хоча, а хоча, каб я яму за даляры, што дзядзя Аляксей прыслаў, купіў аўта…

Барысаў ад'езд ізноў адкладзены. Але ўжо 17 верасня выедзе ён абавязкова.

З Вены перабраўся ў наш табар (у Глязэнбах) мастак Пётра Мірановіч. Цяпер я маю добрага суседа. Апавядаў ён шмат цікавых рэчаў. Савецкія вайсковыя аддзелы вельмі добра ставіліся да сваіх землякоў (пасля капітуляцыі). А палітычная паліцыя з'явілася толькі праз тры месяцы — ужо тады, калі прыйшлі ў Вену ангельцы, французы й амерыканцы. Чырвонаармейцы лаюць Сталіна й Саветы на кожным кроку, не баючыся кары, кажуць: «Вот только здесь мы увидели равенство и настоящую жизнь».

У Легене ўжо мала не ўвесь блок пайшоў пад канцылярыі. Адны жыды паўблока занялі. Цяпер і тых, што там жывуць і працуюць, высяляюць. Ужо й Лугавы выехаў у Бразілію. Цяпер ізноў новы кватэрмайстар. Цяпер адна Бразілія бярэ. А Чылі адмовілася — першыя два транспарты «вельмі добра» там сябе зарэкамендавалі. Значыцца, Броня яшчэ даўжэйшы час будзе ў Зальцбургу. Апрача гэтага чуў я, што Анацкі (цяпер — паліцыянт у Легене) збіраецца ўжо ў Канаду — тым часам без сям'і, і гэтак жа Броня. Мо яшчэ й спаткаецеся ў Канадзе. Лісты з Чылі ад тых, што выехалі туды, — найжахлівейшыя. З Венесуэлы ніхто такіх не пісаў.

Барыс атрымаў ліст ад Уладзіка. Піша той, што працуе навукоўцам у дзяржаўным інстытуце. Чуў ты?.. У першую чаргу цікавіцца лёсам а. Інакенція…

А пра Вольгу — не чуваць нічога, і след прастыў. Людзі кажуць, што ейны ад'езд — твая віна.

На гэтым і кончу. Цісну руку, з павжаннем — *Алесь Салавей.*

78. МАСЕЮ СЯДНЁВУ

22 верасня 1948 г.

Аўтарскія паасобнікі зборніка «Сіла гневу», высланыя на мой адрас, пошта вярнула назад. Каб выслаць іх у купэртах (як звычайныя лісты), выдавецтва не мае грошай. І дзе іх узяць, хоць на пераслане якіх-небудзь 10-ці паасобнікаў, — проста-ткі не ведаю. Напачатку я атрымаў толькі пару паасобнікаў свайго зборніка; адзін аддаў І. Качуроўскаму, адзін паслаў за акіян (навет не памятаю каму, можа й Гуцьку) — і ў мяне самога нічога не засталося. Ты ўжо прабач мне, даражэнькі Масей, — я табе пашлю зборнік, абы ён толькі надышоў на мой адрас.

Б. Олександрыў выехаў у Канаду. Цяпер я тут — круглая сірата. Праўда, з Вены пераехаў у наш табар мастак П. Міранові́ч. Але зы старэйшымі людзьмі не магу быць у найбліжэйшых дачыненнях, бо несімпатычны я ды йшчэ і ўсходнік.

2-га нумару «Сакавіка» таксама не атрымаў, а таму й не бачыў. Зборнік жа мой навет з тэхнічнага вонкавага боку — макулатура, брак. Ці выйшаў наступны нумар «Шыпшыны»? Ці прышляце мне яго? Да Юркі Віцьбіча баюся пісаць, каб не пасварыцца без дай прычыны. Я ж не вінаваты, што ў Вашых мясцінах — атмасфера напружаная.

Па-ранейшаму працую, радуюся «капейцы й рублю». Толькі не над зёлаю гну спіну, а над… Пэўна ж без рукавіцы ўжо не прывітаўся б зы мной, а то й зусім не прывітаўся б, бо й рукавіцу можна забрудзіць. Мабыць, я нешчаслівы. А пісаць — не пішу, бо не магу пісаць. Навет напісанага на «ўпраўскім» хлебе йшчэ ўсяго не ўпарадкаваў (сцэнічны абраз «Дух праўдны, духу зла непадуладны», нізка санетаў «Падарожжа на Шафбэрг»).

Выехаць нікуды йшчэ не змог і не змагу, мабыць, і тут заставацца не змагу. А ў Бразілію й Венесуэлу сілком яшчэ не пагналі. Аб гэтых выездах абрыдла слухаць, але пішу, бо ты пытаешся. Наагул не пісаць магу, але табе не пісаць не магу.

Даруй жа, што так мала пішу. Настрой нешта нецікавы, баюся ўдацца ў трызну, як гэта ўжо ці раз здаралася ў маіх лістох да цябе.

Моцна цісну руку тваю, адданы табе — *Алесь Салавей.*

79. АЛЯКСАНДРУ МІЦКЕВІЧУ

23 кастрычніка 1948 г.

Вельміпаважаны спадару!

Ці жадаеце Вы перасяліцца ў Аргентыну? Згуртаванне беларусаў у Аргентыне прапанавала мне пераслаць спісак беларусаў з Аўстрыі, зацікаўленых у гэтай справе, на якіх абяцае выстарацца дазвол Аргентынскага ўраду на ўезд у Аргентыну. Калі толькі ў Вас ёсць жаданне атрымаць такі дазвол, ласкава прашу пераслаць на мой адрас наступныя дадзеныя: імя й прозвішча, дата й месца нараджэння, нацыянальнасць, веравызнанне, сямейны стан, прафесія, дзяржаўная прыналежнасць, дакладны сучасны адрас.

З паважаннем — *Алесь Салавей.*

80. МІКОЛУ ГАНЬКО

1 лістапада 1948 г.

Даражэнькі Мікола!

Даўжэйшы час ні ад цябе, ні ад Аляксея — жаднай ведамкі. Што сталася з вамі? А можа вы пісалі — і лісты загінулі ў дарозе? Лісты з далярамі зачастую прападаюць на пошце. Толькі заказныя заўсёды надыходзяць незачэпна.

Яшчэ раз сардэчна дзякую табе за панчохі, пасланыя табой у Нямеччыну. Дзякуючы гэтай дапамозе, я змог атрымаць частку аўтарскіх паасобнікаў «Сілы гневу». Зборнік паслаў табе. Ці атрымаў ты яго?

Броньця выйшла замуж, ці лепш — пабралася з «партайманам» з Нямеччыны. Бацькоў пакінула ў Зальцбургу і падалася са сваім «чоловіком» на месца ягонага жыхарства. Вольга Дуброўская піша, што заехала і ўладзілася добра. Наагул задаволеная і ні на што не наракае. У Веры Розумавай нарадзілася дачка. Адольф Губерт бліжэйшымі днямі выязджае ў Аргентыну. Камісію й консула прайшоў месяц таму. У Аргентыну прымаюць перш-наперш старых. Мабыць, туды і я падамся ў канцы зімы.

Калі выдавецтва выканае маю просьбу і прышле на твой адрас 30 паасобнікаў «Сілы гневу» — дык я буду ласкава прасіць, каб ты палажыў іх дзе-небудзь на паліцу, хай перахоўваюцца ў цябе на ўсякі выпадак. Можа, у пазнейшы час будуць патрэбныя мне. А ты з імі

вялікага клопату мець не будзеш. Калі і ў іншае месца пераедзеш — вялікага цяжару не будзе ад іх.

Я працую па-ранейшаму ў Легене. Жыву так дрэнна, як і ўвесну. Дзве зарплаты ўсадзіў на апал, бо з лесу цяпер не прыцягнеш — пільнуюць, і на зімовую вопратку, і на чаравікі, бо босы…

Прывітанне Васілю К.

Моцна цісну руку тваю — *Алесь Салавей.*

81. ЮРКУ ВІЦЬБІЧУ

8 лістапада 1948 г.

Дарагі дзядзька Юры!

Апошні Ваш ліст, атрыманы месяцы тры таму, быў узрушыў крыху мяне, і ніяк я не мог адразу адпісаць. Прычынаў да ўзрушання, зразумела, не было, але чаму так сталася — я й сам не ведаю. Можа, таму, што я не зусім нармальны і ўраўнаважаны, ці што. Цяпер жа крыху адлягло, і пісаць магу больш-менш спакойна.

Збіраўся пасласць Вам свой зборнік «Сіла гневу». Ды не паслаў, бо яшчэ не атрымаў з выдавецтва аўтарскіх паасобнікаў. Зборнік і ў змесце, і ў вонкавым выглядзе — найлепшае сцвярджэнне таго, як не трэба пісаць і выдаваць.

Што з «Шыпшынай»? Я яе, як і самога сябе, пачаў крыху недалюбліваць апошнім часам, але ўсё роўна цікаўлюся ёю. Калі няма нікога, тады й самому сабе рады, а пры нічым добра мець хоць тое, што ёсць.

Працую, зарабляю грошы і шылінгі, нібы той кол, тырчу на калідоры. Калі ж праходзіць паўз мяне начальства, — мушу варушыцца й падскокваць, як Кавалеўскі на сцэне, каб зрабіць выгляд, што нешта раблю. Дома бываю рэдка. А на калідоры Муза да мяне не падыходзіць — цураецца, ды я й сам не наважыўся б кампраметаваць там яе.

Надышла часіна — мушу пакідаць Аўстрыю. 70 проц. старых бежанцаў ужо выехалі. Але табары біткам набітыя, зрабілася цясней, як было залетась. Штодня прыбываюць сотні з Чэхаславаччыны, Вугоршчыны, Румыніі, Югаславіі і г. д. Чым больш выязджае за мора, тым больш трохпавярховых ложкаў устанаўляецца ў нашых «харомах». Бежанцкай праблеме няма канца.

Хто надаслаў у «Беларускую волю» сатыру «Наш вучоны», напісаную 6 год таму толькі для кола бліжэйшых сяброў? Я не адмаўляюся

ад гэтай сатыры, але ж у «Волі» не хацеў бы яе друкаваць. Ператвараць сатыру ў памыі не жадаю.

Тым часам застаюся з найлепшымі пажаданнямі і з паважаннем да Вас — *Алесь Салавей.*

Жывуць Крывічы й Беларусь!

82. АЛЯКСЕЮ ГРЫЦУКУ

29 лістапада 1948 г.

Дарагі Аляксей!

Апошні твой ліст з двума далярамі я атрымаў у першых чыслах верасня. Адразу ж я адпісаў, таксама ў асобным купэрце выслаў зборнік вершаў «Сіла гневу», а йшчэ крыху пазней — выпіс з гісторыі Найдзюка пра Люблінскую вунію. На ўсё гэта я не атрымаў ад цябе жаднага адказу. Кагадзе чытаў у старога Грыбінскага Барысаў ліст, ён піша ў адным месцы пра тое, што навязаў ужо лучнасць з табой; успамінае таксама, што ты даўжэйшы час не маеш лістоў ад мяне. Цяпер я й не ведаю: ці мае лісты загінулі, не надышоўшы на твой адрас, ці, можа, твой адказ на іх хто-небудзь перахапіў, калі йшчэ й даляры пасылаліся з ім, ці ты зусім вырашыў спыніць ліставанне?

Вольга Дуброўская ўжо два лісты прыслала да Грыневіча. Заехала яна добра, жыве там нядрэнна. Зрэшты, яна мо і сама табе напісала. Ува ўсялякім выпадку ў Польшчы ёй лепш будзе, чымся было б на эміграцыі.

Адольф Губерт і І. Качуроўскі выехалі з сем'ямі ў Аргентыну. У гэтым дачыненні ўсім, хто мае на сваім утрыманні старых, пашанцавала. Каб выехаць у Аргентыну, трэба заплаціць за візу 49 даляраў. Гэтую суму пакрывала I.R.O. за тых, ад каго яна хоча найхутчэй збавіцца. А Аргентына ні на век, ні на стан здароўя не бярэ ўвагі (адзіная гуманная краіна!). Аднак жа ўжо афіцыйна паведамлена, што Аргентына, як і Чылі, спыняе набор эмігрантаў. Мне па-ранейшаму застаецца магчымасць выезду ў Бразілію. Усё складаецца так, што праз два-тры месяцы я змушаны буду падацца ў гэтую краіну, і падацца насуперак свайму жаданню. Што да ЗША — трэба мець гарантыю працы й памяшканне, што да Канады — трэба мець пэрміт. Каб цуда дапамагло мне ў гэтым — я быў бы выратаваны. Каб ты змог спрычыніцца да гэтага цуда — маліўся б за цябе на каленях усё сваё жыццё.

З «правінцыяльных» зальцбургскіх навінаў, якія мо хоць трошкі цікавяць цябе, магу яшчэ пацешыць аднэю ведамкай: у тваёй кумы В. Розумавай нарадзілася дачка, «маленька дытынка», як сама яна кажа... Айцец Віктар [Нікіфараў] і матушка «живут» ужо ў «в лагере Парш». Адзіны чалавек, з якім я цяпер бачуся і гутару, — Янка Грыневіч. З Вены перабраўся ў Aasenbach мастак Пётра Мірановіч. З ім я ў наструненых дачыненнях — нешта апошнім часам з'іначыўся ён, любіць самога сябе не менш, як Гуцька.

Як бачыш — навіны мае нецікавыя. Жыццё заводзіць ва ўсё большае і большае бязвыйсце, і далёкі я ад узнёслых імкненняў і думак.

На парозе Калядаў і Новага году дазволь пераслаць табе найшчырэйшыя пажаданні ад мяне і маёй сям'і. Дай Божа не загубіцца нам у свеце й дачакацца лепшае будучыні. Міхаська просіць цябе, каб ты прыслаў яму што-небудзь на свята. На якую-небудзь драбніцу, што шмат не каштуе, не пашкадуй для яго. Ануська мала йшчэ разумее і тым часам ні да кога, апроч таты й мамы, не звяртаецца...

Ну, і тым часам канчаю.

Моцна цісну руку тваю.

З найшчырэйшым пажаданнем — *Алесь Салавей.*

83. МІКОЛУ ГАНЬКО

1 снежня 1948 г.

Даражэнькі Мікола!

Ліст твой з далярам атрымаў. Сардэчна табе дзякую. Прабач, што адпісваю з невялічкім спазненнем. Абставіны склаліся гэтак, што толькі сяння здолеў узяцца за адказ.

Апошнімі часамі ў табарах, сведкам жыцця ў якіх быў і ты, адбыліся вялікія з'іначанні. Са старых жыхароў засталося не больш, як 25 %. Каб не прыбывалі тысячы новых уцекачоў з Чэхіі, Вугоршчыны, Румыніі і г. д., табары былі б бадай пустыя. Надышла часіна, што й мне ўжо не выпадае болей тут сядзець. Трэба некуды выязджаць. Але, апрача Бразіліі, нішто мне не ўсміхаецца, таму я й раздумваю яшчэ, чакаючы з мора добрага надвор'я...

Адольф Губерт ад'ехаў у Аргентыну. З тваіх знаёмых няма тут і В. Крычкі — ён ужо ў ЗША. А. Біскуп выязджае сяння ў Бразілію. В. Бараноўскі, Ю. Кебус затрымаліся дзеля Чылі, якое адмовілася

ад набраных, прынятых да выезду перасяленцаў. Яны цяпер афармляюць дакументы ў Аргентыну — якраз маюць дазвол амерыканскага ўраду на ўезд. Адольфу Губерту пашанцавала: са старымі й непрацаздольнымі бярэ Аргентына ў першую чаргу. І гэта не што іншае, як гуманнасць успомненай краіны.

Цяпер у мяне на працы новы начальнік. З ім ладзіць цяжэй, як з Корацем. Навет пераконваюся, што на цяперашняй службе доўга не ўтрымаюся.

Выдавецтва «Сакавік» абяцала мне пераслаць на твой адрас 30 паасобнікаў «Сілы гневу». Як атрымаеш — паведамі мяне.

Час наагул бяжыць хутка, цяжка агледзецца. Вось ужо й Каляды, Новы год пад бокам. Дык жа прымі ад мяне й маёй сям'і найшчырэйшыя прывітанні й пажаданні ў сувязі з гэтымі святамі. Вітай Ваську.

Успамінаючы твае ранейшыя парады, каб я не саромеўся напомніць Клішэвічу пра пару даляраў, перасылаю табе Міхаськаву просьбу: «Тата, напішы дзядзю Міколу, каб ён прыслаў што-небудзь на святы…» Дзеці ўжо разумеюць і чакаюць свята з нецярплівасцяй. Каб ты й наважыўся пайсці Міхаську насустрач — найлепш пасылаць маленькім адмысловым пакункам, што ідзе сюды два тыдні, таксама, як і Air mail.

Радуюся, што ў Новым свеце паводзіцца табе нядрэнна. Адначасна раджу (не злуй толькі) пукнуць сабе пальцам у лоб — гарэлка да дабра не давядзе (на сяброўскую параду нельга гневацца). Ці не Васька цябе там зводзіць?

Вось і ўсё на гэтым, цісну руку — *Алесь Салавей.*

84. АЛЯКСЕЮ ГРЫЦУКУ

10 снежня 1948 г.

Даражэнькі Аляксей!

Дзесяць дзён таму паслаў табе ліст. Пазаўчора атрымаў твой. Нашы лісты размінуліся ў дарозе. Між іншага, твой ліст ішоў больш за паўмесяца. Над Еўропай і часткай Атлантычнага акіяна цяпер вельмі вялікія і густыя туманы, што перашкаджае нармальнай паветранай лучнасці еўрапейскага кантыненту з амерыканскім.

Калі твой ліст, пасланы больш за два месяцы таму, быў адказам на мае лісты, — значыцца, ён загінуў у дарозе. Зразумела, на пошце яго не падабралі — гэта здараецца вельмі рэдка. Хутчэй за ўсё,

нехта падхапіў яго ў самім Глязэнбаху — у табары. Грошы найлепш пасылаць заказным лістом — ніколі не гінуць, і найлепш пасылаць у цёмных купертах, што не прасвечваюцца. Што да пакункаў — каб і наважваўся пасланць, дык хіба сала ці які-небудзь шмалец. У нас па-ранейшаму тыя самыя калорыі, што былі яшчэ і пры табе. І найлепш пасылаць невялічкім пакуначкам, што ідзе сюды праз Air mail, як і лісты (такія пакуначкі, здаецца, могуць важыць да 5 кілаграмаў).

Прыйшоў і на мяне дазвол што да ўезду ў Аргентыну, але на прозвішча Альфрэда Радзюка. Ёсць дазвол і на Уладзіміра Гуцьку. Гэта паводле спіскаў, што рабіліся яшчэ ў канцы 1945 года. Паводле тых спіскаў і Губерты атрымалі дазвол. На дазвол паводле пазнейшых спіскаў, як і паводле спіска В. Нікіфарава, можна чакаць не раней, як праз год. Што ні кажы, Бразілія — мая адзіная надзея. З набраных увесну ў Чылі выехала толькі 15 %, ад рэшты гэта краіна адмовілася. Адтуль надыходзяць самыя жахлівыя лісты. У ЗША прымаюцца цяпер адны жыды, і выязджаюць толькі яны. Штодня праходзіць праз Lenarkaserne не менш як 200. Вось табе й новы эміграцыйны закон! Прыедзе сяння Сруль з Польшчы, а заўтра ўжо мае візу ў ЗША. І дакументаў у яго не патрабуюць. А наш брат больш трох гадоў чакае і аплікацыі мае даўно, ды ў яго патрабуюць дакумент маральнасці за нямецкіх часоў, не лічачы ўжо безлічы іншых драбніцаў. А дзе ж возьмеш той дакумент маральнасці? Навет тыя, што ў часе вайны жылі ў самім Зальцбургу, не могуць дастаць. І такіх бесцырымонна адкідаюць. Словам, добра бачна, на каго разлічаныя гэныя 200 тысячаў…

А ў Канаду не выехала яшчэ ніводная сям'я, галава якой жыве там. Толькі адзінкам пашчасціла, і то рознымі шляхамі. Я добра зрабіў, што не разлучыўся з сям'ёй.

Кажуць, што з новага года Аўстралія адчыніць дзверы для нашага брата. Даў бы Бог! Аўстралія ў тысячу разоў лепш, чымся Бразілія.

А ў набітых бітком табарах старыя жыхары цяпер — меншыня, бальшыня — чэхі й вугорцы.

Як бачыш, палажэнне маё незавіднае. Няпэўнасць у заўтрашнім дні большая, чымся ў цябе. Таму нічым не магу цябе пацешыць.

Прывітанні ад Ганулькі, Міхася й Зіны.

Моцна цісну руку тваю — *Алесь Салавей.*

85. АЛЯКСАНДРУ МІЦКЕВІЧУ

24 снежня 1948 г.

Вельміпаважаны спадару!

Ці пасылаў я Вам свой зборнік «Сіла гневу»?
Жадаю Вам добрых святаў.
З Раством Хрыстовым!
З Новым, 1949 годам!

Алесь Салавей.

86. ЮРКУ ВІЦЬБІЧУ

5 студзеня 1949 г.

Дарагі дзядзька Юры!

Сардэчна дзякую за Вашыя лісты й цёплыя святочныя прывітанні, а таксама й за газету.

Сяння ў рэдактара газеты «Промінь» бачыў ужо 2-гі нумар ад 1-га студзеня (можа, і на мой адрас у Глязэнбаху ўжо надыйшоў). 2-гі нумар выглядае нядрэнна, зусім падобны на газету. Адна загана — шмат русіцызмаў і расейскіх зваротаў мовы, праўда, менш, чымся ў цяперашняй «Бацькаўшчыне» — паланізмаў. Нядобра выйшла ў шапцы на 1-ай балонцы — «Віншуем (лепш было б «вітаем») з Новым годам і Святымі Калядамі». Кожнаму ж ведама, што Каляды бываюць толькі перад Новым годам (і ў каталікоў, і ў праваслаўных), таму на першым месцы мусілі б быць Каляды. Чаму ў паасобных мясцінах пішацца «беларусоў»? Правільна ж — «белару́сы», а не жыдоўскае «беларусы́». Чаму ўпарта пішацца «прышоў», «адышоў» і г. д. заміж «прыйшоў», «адыйшоў»?

Думкаў што да рэстаўраванай БЦР, як і да тэстамэнтавай БНР, паранейшаму не падзяляю (лепш бы нашыя палітыкі арганізоўвалі, як гэта зрабілі ўкраінцы, нешта запраўднае эміграцыйнае, а не фальшывае, на цвярозы розум безгрунтоўнае, агульнабеларускае). Ну, але гэта мяне не датычыцца — das Scherz mich nicht im gewingsten. Ува ўсякім разе кожнай добрай газеце, якая б група яе ні выдавала, буду заўжды рады. Вершы, калі не адмовіцеся іх друкаваць, буду прысылаць у далейшым.

Спадабаўся мне й вершатвор «З Новым годам» М. Сяднёва. Аднačасна ўспомніліся й наступныя вершы: «С Новым годом, старый год! С новым счастьем, землякі!» Не без пачуцця сказана.

На мінулым тыдні паслаў 2 ням. маркі на падпіску (паводле магчымасці).

З найшчырэйшым паважаннем да Вас — *Алесь Салавей.*

87. МІКОЛУ ГАНЬКО

11 студзеня 1949 г.

Даражэнькі Мікола!

Шчыра дзякую табе за ліст, за цёплыя святочныя прывітанні, за два даляры, што сталіся добрым падарункам дзецям на свята. Хачу табе тут сказаць, што тым часам знаходжуся не ў бязвыйсцевым палажэнні, таму ты, трапіўшы ў такую бяду, можа, і не прысылай больш грошай. Добра, калі чалавек здаровы. Але няма нічога горшага, калі нападае на яго знемажэнне, хвароба. Як жа пачуваеш сябе цяпер? Ці рабіў аперацыю? Нецікавая тая краіна, у якой няма сацыяльнага забеспячэння.

Як бачыш, пішу табе ліст з таго самага старога месца. Нікуды яшчэ не выехаў. А ўжо даўно, мабыць, была б пара пакінуць Аўстрыю. Усё роўна як з месца непарушным зрабіўся…

Цяперака ў нас з нечуванымі тэмпамі набірае перасяленцаў Аўстралія. Мабыць, і мне варта было б туды падацца. Збіраюся запісвацца, хоць шмат перашкодаў на шляху да гэтага. Аўстралія прымае эмігрантаў толькі паводле нацыянальнасцяў. А пра беларускую нацыю ніхто не ведае. Перафарбоўвацца ж мне не зусім ахвота — нядобра рабіць гэтак. Нават як і паляк, паводле дзяржаўнае прыналежнасці, не магу запісацца, бо палякі, як і беларасейцы, прымаюцца толькі самотныя — без сем'яў (наагул, нейкі дзіўны падбор: адна нацыянальнасць можа выязджаць з сем'ямі, а іншая — не). Цяжка прадчуваць тое, што чакае наперадзе. Але дайшоў да адзінага пераканання: трэба выязджаць, і выязджаць як мага хутчэй. Таму й пачаў цяпер інтэнсіўна старацца. Пры сянняшніх магчымасцях да вясны можна будзе й выехаць.

Ад Грыцука ізноў даўжэйшы час не маю лістоў. Апошнім разам ён пісаў мне, што ягоныя папярэднія лісты загінулі. Можа й цяпер пісаў што — ды ізноў загінула?

На дамаганне аўстрыйскага ўраду, што да звароту ваеннапалонных з СССР, Саветы дамагаюцца ад Аўстрыі сваіх грамадзянаў. Рэшткі нашае брацііі ізноў занепакоіліся і пачалі хваляваццa.

Нашых палітыкаў на эміграцыі ўважаю за бараноў, прэсу — за сметнік беларускага нікчэмства. Пакліканы да жыцця САБЭ нагадвае мне стварэнне магістрата ў савецкім сектары Берліна.

Прывітанне табе ад Ганусыкі, Міхасыкі і Зіны.

Цісну руку — *Алесь.*

88. АЛЯКСЕЮ ГРЫЦУКУ

24 студзеня 1949 г.

Дарагі Аляксей!

Ліст твой атрымаў дзесяць дзён таму, але адразу не адпісваў, бо чакаў пасланую табой пасылку, якая вось-вось павінна была надысці. І яна надышла пазаўчора. Усё, што ты пасылаў, цалкам атрымана. Сардэчна дзякую табе, дарагі дружа, за тваю ўвагу да мяне й мае сям'і — усе мы атрыманаму пакунку вельмі рады.

У выніку даўгога блукання твайго апошняга «непаслухмянага» ліста наша лучнасць ізноў крыху перарвалася. Сапраўды, мінула ўжо мала не два месяцы, як я апошні раз пісаў да цябе. Але за гэты час ніякіх цікавых навінаў і зменаў у маім жыцці не адбылося. Дый наагул, якія змены могуць адбыцца ў табарным «заседжаным» жыцці (ужо тры гады з добрым гакам), так дасканала ведамым табе? Адчуваю, што ўжо невылечна захварэў на тую зямелую хваробу, якой яшчэ ад 1945 года хварэе бальшыня людзей, што міжвольна вымушаны шукаць сабе нейкага месца-прыпынку ў свеце. Няма ратунку ад гэтай хваробы. Трэба жыць, а ў табары вечна жыць немагчыма. А што чакае пасля «выздараўлення»? Пэўна ж, не лепшае, што сустрэла й цябе. І тыя духовыя неспакой і болесць, што не адступаюць ад нас у месцы, дзе ўрэшце мусім спыніцца, мабыць, застануцца з намі да дзён скону нашага. «Каб жа вярнуцца…» — штодня ўспамінаюцца твае словы ў лісце да Янкі Грыневіча. Але ж, адкінуўшы самападман, даводзіцца казаць самому сабе: гэтае светлае летуценне збудзецца, мабыць, тады, калі нашы бароды адрастуць да самых пятаў і калі дзецям маім у выніку непахісных законаў жыцця бацькаўшчынай будзе тое месца, у якім яны вырастуць і стануць на собскія ногі. Якім адда-

ным немцам ні быў барон фон Энгельгарт, але ўсё роўна да самай смерці бацькаўшчынай для яго заставалася беларускае Наддзвінне, дзе ён нарадзіўся, узрос і дзе прайшла ягоная маладосць. Аб гэтым ён не раз сцвярджаў у самыя апошнія дні свайго жыцця. Або ўзяць мастака П. Мірановіча, які жыве цяпер у Глязэнбаху. Ён кажа: «Радзіма маіх бацькоў — мая радзіма, я кахаю яе, але нічога не хацеў бы, толькі каб вярнуцца ў маю любую Рыгу…»

Вялікага выбару на шляху да «выздараўлення» я не маю: гэтымі днямі запісаўся на выезд у Аўстралію. Гэтая краіна бярэ з Аўстрыі 30 000 перасяленцаў. Выехаць вельмі лёгка, праўда, не ўсім, як, прыкладам, палякам і расейцам, бо ў Аўстраліі «гасцююць» польскія і савецкія місіі, што да «апекі» над іхнымі грамадзянамі; латышамі, літоўцамі, эстонцамі і ўкраінцамі (дадам ад сябе — і беларусамі) «апекавацца» там не дазволена. Выеду і я, калі прыме мяне аўстралійскі консул (кажу «калі прыме», бо пра беларускую нацыю тутэйшая аўстралійская эміграцыйная місія нічога не ведае, пад тэрмінамі Bielorussie і White-Russian разумее белрасейцаў, на тэрмін Whiteruthenia кажа, што гэта тое самае, на брашуркі «Bielorussie» і «Whiteruthenia» не хоча й глядзець. Хай жа Абрамчыку добра ікнецца ад прапагандаваных ім Bielorussiene і Bielorussian — калі адмаўляе фікцыю БССР, хай адначасна змагаецца і з пушчаным бальшавікамі ў свет тэрмінамі «bielorussisch», «bielorussienne», «byelorussian» і г. д.

На прыгаданыя кагадзе словы хацелася дапаўняць, напамінаць і даводзіць: не ўспомненых Абрамчыкам «адсталых джэнтэльменаў», а ўсіх чысценька і ўсюды збіваюць з панталыку тыя «russisch», «russienne», «russian». Пэўна ж, як даводзіў дзядька Антон (Адамовіч), было б найлепш: «Bieloruthenisch», «bieloruthenienne», «bieloruthenian»…

Чым жа яшчэ пацешыць цябе з «дыпіўскага» свету? Можа, палітыкай? Эмігранты ж без палітыкі жыць не могуць — ты гэта добра ведаеш. Спяшаюся паведаміць, што і мяне, як Ю. Віцьбіча, пачынаюць прываблiваць гэтак званыя «зарубежнікі». Цяпер я сімпатызую ім больш, чымся «крывічам». Не падабаецца мне «крывіцкая» тактыка — вельмі ж адштурхоўвальная яна. Нашы «славутыя палітыкі», што жылі і ўзгадоўваліся ў «дэмакратычнай» Польшчы, думаюць больш таталітарнымі катэгорыямі, чымся былыя савецкія «палітрукі». Яны, «палітыкі», самі не заўважаюць гэтага. Яны навет думаюць, што яны — найвялікшыя ў свеце і самыя ідэальныя дэмакраты. Няхай

сабе думаюць, але беларуса таталітарызмам больш не прывабяць. Ён пойдзе не толькі з Астроўскім, але і з чортам лысым, калі той, «перабудаваўшыся», пачне больш «дэмакратычна» віляць хвастом…

Ці даходзіць да цябе «Бацькаўшчына»? Ці чытаеш яе? Дзядзьку Антона знялі з рэдактарства за «незразумеласць» газеты «для масы, для народа». Пасадзілі на ягонае месца д-ра Ст. Ст. Спачатку доктар у ролі бабы Тэклі выліваў памыі на балонкі «Бацькаўшчыны», а цяпер ака зусім ужо задзірае спадніцу і паказвае адпаведнае месца…

І яшчэ спяшаюся паведаміць аб сваіх «поспехах» у нашым грамадскім жыцці: 1-шы «сусветны» з'езд беларускай эміграцыі параўноўваю са стварэннем магістрата ў савецкім сектары Берліна.

Не падай духам, дружа, трымайся!

Прывітанне ад усіх нас, моцна цісну руку — *Алесь Салавей.*

89. ЮРКУ ВІЦЬБІЧУ

16 лютага 1949 г.

Дарагі дзядзька Юры!

Даўно ўжо не пісаў да Вас, мабыць, больш месяца прамінула, як атрымаў Ваш апошні ліст. Вельмі няўцешнае маё палажэнне апошнім часам. Было ні да лістоў, ні да вершаў, шчыра кажучы. Дарэчы, з вершамі цяжкавата: па-першае, калі пераглядаю іх, самому нядобра робіцца; па-другое, яны, мабыць, з «паэзіі імя паэзіі», для літаратурнай балонкі можа й надаваліся б, а па-за ёй усё роўна не надрукуюцца, калі пашлю.

Пэўна ж, Вам добра ведама, што азначае кончая патрэба, а то й горш — прымус захварэць на перасяленцкую хваробу, гэта значыць — збірацца ў пошукі месца прыпынку ў свеце. Цэлы месяц праходзіў з вельмі «спрыяльнай» для гэных пошукаў сваёй сямейкай розныя працэдуры, што да выезду ў Канаду — на плантацыі цукровых буракоў. Але консулам быў адкінуты: першая прычына — не змог выразна й вычарпальна растлумачыць, як трэба даіць карову (рыхтаваўся ж да цукровых буракоў!), другая прычына — адсутнасць мазалёў на далонях, «жаноцкія» рукі (ліханька, пасля каменавальні здалікаціліся на працы ў «старэйшых»), трэцяя прычына — вырвана шмат зубоў (уставіць зялезныя не меў за што). А цяперака пачалася валакіта, што да выезду ў Аўстралію. Мабыць, таксама буду

адкінуты, бо беларускае нацыянальнасці няма ў спіску тых, што прымаюцца да выезду. Праз тыдзень гэтая справа вырашыцца. Адмоўнае ж вырашэнне станецца прысудам немінучага выезду ў Бразілію, якая тут увесь час не мае патрэбнай колькаасці кандыдатаў — транспарты адыходзяць з мноствам вольных месцаў. Адзінае магло б затрымаць — доказ, што маю падставы на выезд у ЗША (на атрыманне гарантыі, памяшкання й працы)... Няўдача што да Канады — торная, першы раз быў адкінуты ўвесну 1948 г. Тады лекар прычапіўся да лёгкіх, хоць мазалі былі досыць грубыя — выгружаў вугаль у табары, і зубоў было больш.

Вось ужо перайшоў на другую балонку, а нічога цікавага яшчэ не напісаў. Запраўды, заражаны перасяленцкай хваробай і хворы без надзеі на выздаравенне. Але думаю, што мне за ўсё прабачыце. Праўда, часамі лепш маўчаць, чымся пісаць аб нецікавых рэчах, — прынцып гэты, аднак, хай захоўваецца пры афіцыйных, а не сяброўскіх перапісках.

№ 3 «Беларускага слова» вельмі пацешыў мяне цікавым артыкулам «У чым нашы разыходжанні». Сардэчна дзякую Вам за газету.

Вось і ўсё, што здолеў сяння напісаць.

Жадаю Вам найлепшых удачаў. Прывітанне сям'і.

Моцна цісну руку Вашу, з найшчырэйшым паважаннем да Вас — *Алесь Салавей.*

P. S. Ранейшыя Вашы лісты (аб дзідах і г. д.) расчароўвалі, апошні ліст (аб Вальтэры і г. д.) развейвае гэнае расчараванне.

90. АЛЯКСЕЮ ГРЫЦУКУ

1 сакавіка 1949 г.

Дарагі Аляксей!

Твой ліст я атрымаў 16 лютага. У гэты час якраз пачаў вырашацца мой лёс што да Аўстраліі. І я не адпісваў табе адразу, чакаў канчальнага вырашэння «аўстралійскай справы». У першых чыслах лютага я праходзіў камісію што да выезду на плантацыі цукровых буракоў у Канаду. Быў адкінуты. І «writer» напісана ў паперы са скрынінгу, і пары зубоў не стае, і рукі «жаноцкія», і мазалёў няма на далонях, і невычарпальным быў мой адказ на пытанне, як трэба даіць карову. Цяперака з Канады прыехалі нейкія дурні — усё гэта бяруць пад

увагу, стаўляюць «тавар» у шарэнгі, загадваюць маршыраваць; хто ідзе ўразвалку, як Мішка (можа, прыпамінаеш яго?), на таго кажуць: «All right», хто ж ідзе лёгка і роўна, таго адкідаюць са словамі, што спартсменаў яны не патрабуюць. А вось што да ЗША, дык нядаўна праходзіў камісію нейкі малады доктар філасофіі — на ананімную аплікацыю ад аднае грамадскай арганізацыі. Консул спытаўся ў доктара, што той можа рабіць па-за сваім фахам, і доктар адказаў: «Магу быць шафёрам». «Шафёраў мы не патрабуем», — зазначыў консул. «Магу быць электраманцёрам». Консул пакрывіўся на гэта. «Магу быць крысавальнікам — чертёжником». Консул яшчэ больш скрывіўся. «Я аматар боксу, магу быць баксёрам!» «All right! — узрадавана ўскрыкнуў консул, — мы патрабуем такіх людзей!» І ўзбуджана прыбіў штэмпель да візы.

Аўстраліец жа на маё writer сказаў: «That's capital» і спытаўся толькі, ці згодзен я выконваць розную фізічную працу, якая будзе адпавядаць маім сілам. Наагул жа хацеў мяне адкінуць, бо ў яго-ных інструкцыях, што да набору ДП ў Аўстралію, пра нашу нацыянальнасць няма ўпаміну. Ён згаджаўся, што гэткая нацыя існуе на свеце, урэшце рэштаў паверыў брашурцы «Whiteruthenia» і розным картам. Але прасіў зразумець, што ён не можа абмінуць дадзеных яму інструкцыяў… Выручыла, мабыць, цверджанне, што «balt» і «white» — адно і тое, і схіліла яго на думку залічыць мяне да балтаў… Словам, я прыняты да выезду і падпісаў кантракт (2 гады). Выеду хутчэй за ўсё ў пачатку траўня. Спадзяюся яшчэ атрымаць ад цябе ліст са старога месца і ліст з новым адрасам.

Што да інтэлігенцыі, дык Аўстралія вельмі рада прымаць яе.

На месца перасяленцкай хваробы прыйшла перадвыезная трасца-трасавіца (таксама і ад яе няма ратунку). Доля закідае Бог ведае куды — у дасконнае адзіноцтва, у паховіны таго, чым жыў і жыву, і толькі таму, што няма іншага выйсця.

Ты не зразумеў мяне ў маім апошнім лісце. Я гаварыў толькі аб сімпатыях, а не аб прыналежнасці або намеры прыналежваць. Таксама напісаў падрабязна аб тым, што міжвольна змушае да гэтых сімпатыяў.

У лісце да Я. Грыневіча Вольга Дуброўская перасылае табе найшчырэйшае прывітанне. Таксама просіць, каб паведамілі яе аб тваім новым адрасе, як толькі ён з'іначыцца. Калі пытаюцца пра адрас, але нічога не пішуць на яго — у падобных выпадках я асабіста адношуся

з недаверам да гэтага, тым больш Польшча — не амерыканская зона Аўстрыі.

Ледзь не забыўся напісаць табе, што разам з лістом атрымаў і два даляры. Сардэчна дзякую табе за гэта.

Што піша Барыс? Як там у Таронта будуецца Беларусь? Нішто так не адштурхоўвае мяне на эміграцыі, як наша радзімая «беларуская справа». «Наш долг — активно отстаивать в творческой работе принцип партийности литературы», — піша, падлізваючыся, Максім Танк у «Литературной газете». Не інакш пішуць і на эміграцыі нашы «крытыкі» тыпу Тамашчыка. З падобным можна спаткацца не толькі ў выказваннях аб літаратуры, але і ў выказваннях аб «справе» (тут, зразумела, у першую чаргу, бо «справа» без партыі жыць не можа, як і партыя без «справы» — кажучы словамі «-чыкаў і К»). Прабач мне, калі ласка, часам з'яўляецца жаданне пакпіць з таго, што падносіцца ў нашай прэсе.

Прывітанне ад Міхаські, Ганускі й Зіны.

Цісну руку — *Алесь Салавей.*

91. МАСЕЮ СЯДНЁВУ

6 сакавіка 1949 г.

Дарагі Масей!

Паведамляю, што я ўжо ў дарозе на Аўстралію, г. зн. прыняты да выезду. Мае надзеі перабрацца ў Нямеччыну яшчэ летась не здзейсніліся, а таму чакаць на нешта іншае, больш «зваблівае», няма дзе. Шляхі нашы, здаецца, разыходзяцца, і ніколі ўжо, мабыць, не пабачымся. Ад гэтага найбольшы цяжар на сэрцы. Усё іншае ўжо не даходзіць да яго. Бацькаўшчына — не за ейным парогам. Праўда, і тутака свецяць тыя ж зоры, што і над тым месцам, дзе даводзілася «шпурляць каменьчыкі ў месяц», і тутака тое ж сіняе неба. Але няма пад імі прытулку і нават трох аршынаў пад імі няма. Гэнае самае «няма» — нячыстая сіла, гоніць Бог ведае куды, пад іншае неба (а тут ужо й паэзія безнадзейна-невылечнаму, хвораму на яе), пад «пурпуровых ветразяў узвівы», гоніць туды, дзе «ад нязнаных водаў нязнаныя ўзыходзяць зоры...» А па-за гэтым, урэшце рэштаў, якая розніца для бяздомнага чалавека — тысяча ці колькінаццаць тысячаў кіламетраў?

«Праходны двор паміж Масквою і Варшаваю» гэткім і застанецца. Будуць унукі майго брата казаць «хорошо» заміж «добра» і будуць таптаць сцежкі-дарожкі ў неабдымных Сібірах. Ну, а мае ўнукі будуць казаць «all right» і пот праліваць у джунглях аўстралійскіх... «Какая разница, не всё ли равно?»

Перад ад'ездам рознае лезе ў галаву — і ўсур'ёз, і неўсур'ёз. Аднаго шчыра жадаў бы: каб не спаткацца больш зы свалатой, што «дыцыдуе», зы смуродам, што «тоже дицидирует» — каб яны ўсе падохлі! Буду імкнуцца туды, дзе менш людзей, дзе больш адзіноцтва, каб ніхто не перашкаджаў хоць у собскай душы будаваць маю Бацькаўшчыну — таксама з небам сваім, з зорамі сваімі, і жыць для яе, і ўрэшце рэштаў — цярпець для яе, таксама хай і памерці для яе. І яна будзе жыць разам з душой, у душы збудаваная.

Заўчора атрымаў ад Ю. Віцьбіча пасмяротнае выданне твораў Хв. Ільяшэвіча, а таксама «праграму» нейкае «партыі». Перадай ад мяне Ю. Віцьбічу шчырую падзяку, у першую чаргу — за творы Хв. Ільяшэвіча. Ці выдаецца далей «Беларускае слова»? Апошні нумар, што я атрымаў, — 3(4).

Цяперака ў мяне няма ніводнага паасобніка «Сілы гневу». Днямі павінен атрымаць рэшту, што пасылаецца мне праз Лондан. Як толькі атрымаю — пашлю зборнік для Леаніда Палтавы. Калі не паспею атрымаць, — напішу ў выдавецтва, каб яно само выслала на твой адрас.

Выеду або праз два-тры тыдні, або ў пачатку траўня.

Прывітанне Ю. Віцьбічу і ягонай сям'і.

Бывай!

Моцна цісну руку тваю, назаўсёды табе аддany — *Алесь Салавей.*

92. МІКОЛУ ГАНЬКО

12 сакавіка 1949 г.

Даражэнькі Мікола!

Адпісваю табе з вялікім спазненнем. Меў шмат клопатаў — і цяжка было ўзяцца за ліст. Але цяперака выбраў часінку, хоць і яна не зусім спакойная: жартачкі — збіраюся ў далёкую дарогу. Маю ўжо візу ў Аўстралію. Выеду, мабыць, 27 сакавіка. Дык ты ўжо, Міколка, не злуй за маё даўгаватае маўчанне.

Еду не таму, што, як ты пішаш, Аўстралія — цудоўная краіна, а таму, што не маю іншага выйсця. У Канадзе збіраецца старая «бражка» —

і там мо было б крыху весялей. І бліжэй ад таго самага, пра што думаем і памятаем, не забываемся. Праўда, яно нерэальнае, але тут нічога не зробіш — такі закон прыроды. Ваўка ўсё роўна цягне ў лес — як ні кармі яго. Але на плантацыі цукровых буракоў у Канаду выехаць не пашчасціла — быў адкінуты. Да выбару заставалася Бразілія і Аўстралія. І — хоцькі-няхоцькі — мусіў згадзіцца на выезд у апошнюю.

Бліжэйшымі днямі выязджае ў Канаду на тыя ж плантацыі Ю. Кебус. В. Крычка — даўно ў ЗША, В. Бараноўскі — у Аргентыне. Са старых табарных «обитателей» бадай ніхто не застаецца. Толькі на змену ім прыходзяць новыя — чэхі і вугорцы. Але і іх Аўстралія бярэ ў неабмежаванай колькасці.

А наагул лісты з Аўстраліі вельмі добрыя. Пішуць тыя, што выехалі яшчэ летась з Нямеччыны. Захапленню іхняму няма канца. Усё выдаецца ім дзіўнай казкай. А тэмп працы — навет павальнейшы, чымся ў Аўстрыі. Ну, але за выгодамі я не ганюся. Аўстраліяй вельмі цікаўлюся, запраўды — цудоўная краіна, але еду праз сілу.

Ю. Кебус перасылае табе сардэчнае прывітанне.

Вітай Васіля К. Усяго найлепшага яму ў новым жыцці.

Прывітанне ад усіх нас.

Бывай! Буду пісаць з Новага свету.

Цісну руку — *Алесь Салавей.*

93. АЛЯКСЕЮ ГРЫЦУКУ

20 сакавіка 1949 г.

Дарагі Аляксей!

Сяння атрымаў твой ліст з двума далярамі, за што сардэчна дзякую. Таксама ўсцешыла мяне й фатаграфія — і за яе дзякуй. Выглядаеш нядрэнна, але сам фон — глыбокі снег і лес — вельмі нагадвае катаргу, страту непаўторнае Белавежы. Я ніколі не быў у Белавежскай пушчы, але мне здаецца, што чую яе гоман, імкнуся да яе душой, мабыць, так, як і ты: я — ад бясконцага шляху ў Аўстралію, ты — з аснежаных лясоў Канады…

Спяшаюся адпісаць, каб ліст застаў цябе яшчэ ў Pine Postage. Выеду ў канцы гэтага або ў пачатку наступнага месяца, словам, праз тыдзень-два. З далёкага свету буду пісаць табе на адрас Я. Пітушкі. Спадзяюся, што лучнасць нашая не перарвецца.

Аўстралія найбольш цікавіць мяне з паэтычнага боку, і толькі гэтым цешу самога сябе, зусім не верачы ў тое, што буду там чалавекам. Наагул, я не нарадзіўся для выбіцця ў людзі. Затое ад звычайных словаў А. Адамовіча — «новы свет, новае неба й зоры» — усцешыўся, як малое дзіця. Між іншага, Адамовіч таксама збіраецца выязджаць у Аўстралію, едуць туды Качан, Снежка, Кунцэвіч і шмат іншых добрых хлопцаў з Нямеччыны. Сімпатычныя і самі аўстралійскія прадстаўнікі: глядзяць на нас, як на людзей, а не як на жывёлу. Мяне, разам з іншым, цешыць і тое, што я не залежны ні ад якіх пэрмітаў і ўсялякіх іншых шмітаў і ад людзей, пры пасярэдніцтве якіх мог бы іх атрымаць. У Аўстраліі пры пяройсці лекарскіх агледзінаў правяраецца сіла кожнага новапрыбылага, слабейшых на цяжкія працы не пасылаюць. І наагул, там тэмп працы, паводле лістоў адтуль — як мокрае гарыць. Там не такая інтэнсіўная праца, як у ЗША. Розумаў кажа: «Мой девиз — мало работать, хорошо кушать». І я далучаюся да ягоных словаў, але далёкі шлях ад Бацькаўшчыны, хоць Бацькаўшчыну можна будаваць і ў собскай душы, наводзіць на сумныя думкі.

Крыху падвучыў ангельскую мову. На сянняшні дзень ведаю 1460 словаў (73 балонкі ў запісной кніжачцы — па 20 словаў на кожнай — усё гэта ведаю, вывучаў іх 80 дзён, пачынаючы ад 31 снежня, у аўтобусе, на службе, усюды). І граматыку крыху падвучыў. Цяперака тут, у Lenarkaserne, ламлю язык з людзьмі, што гавораць па-ангельску. Нічога не выходзіць, але надзеі не трачу. У Аўстраліі, у ангельскім моўным акружэнні, нідзе не дзенуся. Найцяжэй вымавіць тое «the». Глухое «th» у слове «thick» так-сяк выходзіць, а звонкае, прыкладам, у слове «that» — ніяк мне не даецца. Або — «ng»... Так, заднюю частку языка я ставіў у палажэнне пры «к» і «г», кончык жа ягоны трымаў знізу, прапускаў паветра не праз рот, а праз нос — усё роўна нічога лепшага. Як «g» у віленчаніна, не выходзіць...

Айцец Віктар служыць цяпер у «русской церкви» ў Глязэнбаху. Круціць носам, са мной не жадае гаварыць. Ён таксама хацеў выехаць у Аўстралію, але лекар адкінуў яго з прычыны «хваробы на хваробу». Лекар, аднак, абяцаў прыняць у далейшым, як толькі мінецца тая «хвароба».

Усе выязджаюць. Хутка застануцца толькі Гэльбрун і Парш з аднымі вугорцамі.

Моцна цісну руку тваю. Прывітанне ад усіх нас — *Алесь Салавей.*

94. АЛЯКСАНДРУ МІЦКЕВІЧУ

27 сакавіка 1949 г.

Вельміпаважаны спадару!

Ці жывяце яшчэ на старым месцы? Якія навіны ў Вас?

Я выязджаю ў Аўстралію. Пакіну Аўстрыю ў бліжэйшым часе.

Жадаю Вам усяго найлепшага. Ад шчырага сэрца зычу памыснасці ў здзяйсненні Вашых намераў.

Бывайце здаровыя, моцна цісну Вашу руку.

З найшчырэйшым паважаннем — *Алесь Салавей.*

95. ЮРКУ ВІЦЬБІЧУ

Зальцбург, 17 красавіка 1949 г.

Дарагі дзядзька Юры!

20 красавіка 1949 года а 8-ай гадзіне ўвечары пакідаю Аўстрыю. Пасылаю на развітанне вершатвор Леаніда Палтавы. Ці не надаваўся б ён для друку ў «Беларускім слове»?

Апошні нумар газеты «Беларускае слова», што я атрымаў, быў прысвечаны 25-аму Сакавіку. У далёкім свеце хацелася б быць не дармовым ейным чытачом.

Сардэчнае прывітанне Масею Сяднёву. Ад яго, як і ад Вас, усцяж апошняга часу — жаднае ведамкі. Не ведаю, чым гэта тлумачыцца.

Найшчырэйшыя велікодныя пажаданні Вам і Вашай сям'і. Хрыстос уваскрос!

З запраўдным паважаннем да Вас, адданы Вам — *Алесь Салавей.*

96. МІКОЛУ СКАБЕЮ

27 чэрвеня 1949 г.,
цягнік Альбуры—Мельбурн

Дарагі сябра Мікола!

Сардэчна дзякую за ліст, за грошы, за добрую памяць. Ліст надышоў у суботу ўвечары — пазаўчора, а адпісваю ўжо з дарогі.

У чацвер, 23.6.1949 г., быў я прызначаны на працу — якраз праз два тыдні свайго прабывання ў пераходным табары (за гэты час

я залагодзіў усе фармальнасці, адваяваў свой багаж з кніжкамі, што быў затрыманы бязмозгімі «кантралёрамі» для перагляду і аддадзены мне палітычнай паліцыяй без ніякага кантролю. Багаж, між іншага, кантралююць цяпер у новапрыбылых вельмі строга.

Сяння ўранні вырушыў у дарогу ў Адэлаіду на працу пры аўстралійскай арміі. Мой заробак будзе станавіць 6 даляраў на тыдзень, утрыманне — 7 даляраў, за жонку таксама, за дзяцей — па 12 даляраў. Сыну майму тры гады з гакам, дачцы — каля трох. З усяго гэтага бачна, што для кішані застаецца вельмі мала грошай, але на лепшае спадзявацца я не мог. Можна было трапіць на каналізацыю ў Сідней з аплатаю ў 7 ф. на тыдзень, з перамяшчэннем сям'і за 280 міляў ад Сіднею. А тут мне абяцалі, што праз тыдзень-два маю сям'ю (яна засталася яшчэ у Банагілі) перавязуць у Вудсайд (12–15 міль ад Вудсайда, я звяраўся на карце — гэдак і мае быць).

Аднак, даведаўшыся з Твайго ліста, што ў аддзеле працы часта хлусяць, я пачаў сумлявацца — ці стрымаюць сваё слова і ці не пашлюць сям'ю дзе-небудзь у іншае месца?

Учора колькінаццаць чалавек, прызначаных да Адэлаіды, уварваліся на кватэру да самога дырэктара — ён запэўніў, што сем'і будуць скіраваныя ў Вудсайд. Дай жа, Божа, каб гэта было праўдай. На працу з аплатай 8 і 9 ф. на тыдзень пасылаюць толькі самотных — гэта да каменавальняў на ўскрай неба й зямлі і да выпрабавальняў ракетнай зброі ў пустэльню. Быў бы адзін — пайшоў бы туды, мяне й цягне ў пустэльню, да «неожиданностей», як кажуць расейцы.

Наагул жа, пачынаючы ад нашага транспарту, цяперака не даюць раздумваць, хутчэй выпіхаюць на працу, па два новых транспарты штотыдня. Можа, мне яшчэ і пашанцавала, калі толькі запраўды сям'я будзе ў Вудсайдзе (жонка кантракту не падпісвала, але працавала б, каб было дзе пакінуць дзяцей, яна неблагая краўчыха, умее вязаць, вышываць і г. д. Толькі працуючы ўдваіх, мы сталі б тут на ногі, словам, у далейшым будзе бачна).

Тыдзень таму я паслаў ліст і да Калодкі, але на ранейшы адрас — на Імбіл. Мабыць, гэты ліст загіне — новага адрасу я не ведаў.

У Неапалі я бачыў сп. Курыля з Віндзіжберга — блізка з ім не сышоўся, бо ён вельмі вялікі палітык, а вялікіх палітыкаў і аж да чырвана гарачых энтузіястых я не люблю. Ён, калі яшчэ не прыехаў, хутчэй за ўсё будзе на вадаплаве, што прыбыў учора ці прыбудзе сяння ў Мельбурн.

Фунта мо і не трэба было пасылаць, я ж тутака ўжо не ў бядзе, учора нат атрымаў дарожныя (7,5 шыл.) і кішанёвыя (5 шыл.).

Вельмі хацелася б сабрацца разам, але ж нічога не зробіш, пакуль кантракт — гэта мала ад нас залежыць.

Мой адрас, калі верыць скіраванню да працы, мае быць такі: Army Dep[artment], Keswic Warraks, Adelaide, S[outh] A[ustralia].

Вельмі трасе, хутка Мельбурн, з Адэлаіды напішу больш.

Цісну руку Тваю — *Алесь.*

Жывуць Крывічы!

Адрас П. Мікуліча, на жаль, не даведаўся, учора была нядзеля, a сяння на досвітку выехаў.

97. МІКОЛУ СКАБЕЮ

5 ліпеня 1949 г., Адэлаіда

Дарагі сябра Мікола!

Адмігала за вокнамі вагона спавітая зімовым смуткам Вікторыя, клапатліва задуманы Мельбурн застаўся ззаду, чырвоназёмная Паўднёвая Аўстралія на самым досвітку так і ўторыла маім думкам: «Навошта пакінуў Вікторыю — невялічкае кола тваіх сяброў?». А шырака распасцёртая й самазадаволеная Адэлаіда сціскала сумам сэрца і прадвесціла няўцеху майму двухгадоваму кантракту-палону…

Учора атрымаў Твой другі ліст (пераслала жонка з Банагілі), часапіс «Моладзь» і «Беларускі каляндар» ад Цябе з Мельбурну. Сардэчна дзякую за Тваю сяброўскую ўвагу да мяне і бязмежна шкадую, што не давялося з Табой пабачыцца або раней спісацца…

Шэсць дзён праклінаў напышлівую Адэлаіду, а ўчора, на сёмы дзень, атрымаўшы Твой ліст, трос на свой цяперашні «прытулак» кулаком і лаяўся, проста-такі непрыстойна лаяўся.

Калі прызначалі мяне на працу, я ведаў, што праз чатыры дні будуць прызначаць на гэткую ж працу ў Мельбурн. Цікавіў мяне Мельбурн больш, чымся Адэлаіда, але адмаўляцца я не важыўся, бо адмова так і прыкоўвае людзей аж на шэсць месяцаў у Банагілі. Але каб я ведаў тады, што Ты ў Мельбурне, што там можна так-сяк уладзіцца і хоць праз год сцягнуць з Коўры за Сіднеем сваю сям'ю! Я мог бы сказаць, што там жыве і працуе мой дзядзька Мікола Скабей, што я прашуся туды на працу — у падобных просьбах нікому пры мне не адмаўлялі.

На фабрыку, зразумела, адразу мяне не паслалі б, але праз пэўны час можна было б змяніць працу.

Як атрымаў у пазамінулую суботу Твой першы ліст (пасля прызначання ў чацвер увечары на працу), мяне спалохалі й кватэрныя праблемы ў Мельбурне і адначасны са мной ад'езд сям'і ў іншы канец — у Коўру, і спакушаў той пракляты Вудсайд, што знаходзіцца не далей ад Адэлаіды (між іншага, ні трошкі не лепшы за Банагілю). А таму ў нядзелю, залагоджваючы апошнія фармальнасці ў аддзеле працы, я нат і не падумаў прамяняць Адэлаіду на Мельбурн (а тады яшчэ можна было). Жылося б мне напачатку ў Мельбурне не лепш, чымся тут, затое можна было б хоць пагутарыць з Табой, са сваім чалавекам — і, пэўна ж, лягчэй было б на сэрцы.

Працы я не баюся ніякай, ёсць, праўда, я нядужы і трошкі «файтлапа» або «шляпа», і зямля, казаў той, не гарыць у мяне пад нагамі. Насіць цэглу, капаць ямы, пілаваць дровы, вазіць вагонікі з пяском, забіваць кіркаю каменне пад шпалы, мясіць гліну, цягаць скрынкі, валізкі, мыць вокны і падлогі, бяліць сцены, раўняць рыдлёўкай дарожкі ў алеях, падмятаць, прыбіраць — гэта мая спецыяльнасць. Але на цяперашняй працы я цэлымі днямі сумую ад няма чаго рабіць (мо і ўпрагуць пазней у хамут — хто яго ведае).

Працы па-над восем гадзінаў няма, у суботу і нядзелю — таксама няма. Субота й нядзеля здаліся мне цэлым годам — я не знаходзіў сабе месца. Абхадзіў горад, падбіўся — усё роўна двух дзён было зашмат. Бачыў людзей з Гомельшчыны, з Магілёўшчыны, з Віцебшчыны — іх ці мала, але нічога, акрамя трохпавярховай расейскай лаянкі, ад іх не чуў і быў не рады, што спаткаўся з імі.

Збіраўся пісаць да Цябе — рукі не падымаліся. У Банагілі чуў яшчэ голас Бацькаўшчыны, а тут, апрача знямення, нічога не пачуў. І кармілі блага, трэба было дакупляць, чаго ніколі не спадзяваўся. Сяння запратэставалі — здаецца, дапамагло. Вячэра была гэткая, што можна было б лопнуць, усё паеўшы.

Жонка піша пра голад у Аўстраліі. Дзецям пачалі даваць тое самае, што і дарослым, тое, чаго стары не перажуе, не толькі малое. Значыцца, плаці ў далейшым і адмаўляйся ад заплачанага, а за капейкі, што трапяць у собскія рукі, купляй і вары, хаваючыся, бо печы — і электрычныя, і звычайныя — у табары забароненыя.

У Адэлаідзе ёсць дзесяткі людзей, якім таксама абяцалі прывезці сем'і ў Вудсайд, але завезлі іх недзе за Сідней — за паўтары тысячы

міляў адгэтуль. Ёсць ці мала й гэткіх, што ўжо тры месяцы чакаюць прыбыцця сем'яў у Вудсайд і ніяк не дачакаюцца. Нашы пасланцы былі ў Вудсайдзе. Палавіна табару — загарадкаў для коней — там пустуе, але аб прыбыцці новых сем'яў начальства нічога не ведае. Абяцанкі цацанкі, а дурному радасць — гэтак і мне давядзецца пабачыць сям'ю хіба пасля кантракту.

Што да кватэраў у Адэлаідзе — можна жыць за дзевяць шылінгаў у тыдзень пад самымі зорамі, пад хмурым і светлым небам, пад зыркім сонцам — дзякаваць Богу і за гэта. Люблю адзіноцтва, пустыню, лес, але ў Аўстраліі, без сяброў, пачаткі цяжкія. Адэлаіда горш лесу, горш пустыні. У лесе размаўляў бы з дрэвамі, у пустыні — з пяском, ■ тутака не магу глянуць ні на зямлю, на якой стаіць горад, ні на бляшаныя баракі, ні на поўныя раскошы дамы.

У Еўропу нічога яшчэ не пісаў. З маім цяперашнім настроем лепш не пісаць нічога.

Яшчэ раз сардэчна дзякую за часапіс, за каляндар і адначасна баюся, каб падобнае прысылалася перад маёй аплатаю — быў я вінаваты за прэсу у Аўстрыі, залажу ўжо ў пазыку й тут — колькі ж можна гэтак?

Над маім ложкам у страсе выпаў цэлы ліст бляхі. Паўдзённы Крыж зырка зіхаціць угары над галавою.

Хутчэй бы прыйсці да сябе — пачну пісаць вершы. Цяпер, калі ўсе паснулі, мне здаецца, што праз зняменне прабіваецца далёкі гук званоў — гэта, напэўна, званы Крывіччыны, мае дарагое Бацькаўшчыны, і гэта нядрэнны знак.

Моцна цісну руку Тваю — *Алесь.*

Жывуць Крывічы!

98. МІКОЛУ СКАБЕЮ

13 ліпеня 1949 г., Адэлаіда

Даражэнькі Мікола!

У апошніх двух лістах да Цябе я, казаў той, выстагнаўся — і мне адразу палягчэла. Такая ўжо натура ў мяне: невялічкую непрыемнасць мушу выгаварыць — хоць бы сабе й на паперы. Не выгавару, пачаўшы яе абыходзіць моўчкі, — доўга яна дакучае й мучае.

Зразумела, усё, аб чым Ты пішаш у апошнім сваім лісце ад 8.07.1949 г., чысцюсенькая праўда, я ведаў аб ёй і тры гады таму, і яшчэ нядаўна,

ад'язджаючы ў далёкі свет. Нялёгкі хлеб эмігранта і цяжкія яго пачаткі на зямлі, якую выбірае ён для свайго прытулку. Я нават спадзяваўся на горшае, чымся цяперака маю — на бязлюдную глухамань, у якой наслядуючы дапатопнага чалавека, мусіў бы пачынаць свае першыя крокі пад іншымі зорамі — не пад тымі, пад якімі нарадзіўся. Але часам людная неўгамоннасць горшая бязлюднай глухамані. Хлусня, абман, нездзяйсняльныя абяцанні, у якіх пачуваеш сябе абураным, расчароўваюць, падкошваюць сумам, а потым мусіць надысці і надыходзіць лагічны выснаў: дзякаваць Богу, што сяння яшчэ жыву, не страціўшы ў сэрцы таго, без чаго няможна жыць, што «пачуваю пад сэрцам ношу», як пісаў Уладзімір Жылка, — імя Бацькаўшчыны на чужой зямлі. Успамінаеш нават найдрабнейшыя драбніцы…

Ужо паслязаўтра, у пятніцу, атрымаю першы свой заробак у новым свеце — першую радасць для маіх нашчадкаў. Бясспрэчна, дзеці мае ў той самай дзяржаве, у якой жыву і я, і, пэўна ж, развітаўся з імі не навекі. Добрай дапамогай для іх быў Твой фунт — яшчэ раз сардэчная Табе падзяка. Перад ад'ездам, апрача дарожных грошай, я атрымаў і кішанёвыя — 6 шыл. і 3 пенсы на тры асобы, а дачка — другое дзіця — павінна атрымліваць пазней нейкія іншыя грошы — дзяржаўную дапамогу, як мне абяцалі.

Апошнімі днямі ў Банагілі ізноў палепшала. У мінулую пятніцу вызначылі невялічкую групу сем'яў для ад'езду ў Коўру — гэткім чынам, відаць, хацелі разбіць іхнюю еднасць і ўсіх паступова вывезці. Але жанчыны і дзеці, што трапілі й не трапілі ў гэную групу, яшчэ раней падвучаныя намі, узнялі бунт, і дырэктар уціхамірыў іх абяцанкамі. Першую абяцанку, што да палепшання харчавання дзяцей, стрымаў, другую абяцанку, што да Вудсайда, яшчэ не стрымаў, але, мне думаецца, стрымае.

Журба часамі бывае салодкай і прыемнай, і дзікім, проста нялюдскім выдаецца мне сіплы голас, што кожнага дня скрыпіць, як пагібель, у бараку: «Я свою жену и детей под бомбами потерял и не плакал, а вы, олухи, носы повесили по юбкам женщин, которые находятся от вас на расстоянии одного плевка». Не цярплю ідыётаў і паважаю людзей, што сумуюць па страчаных назаўсёды, па разлучаных часова, бо сум — натуральная з'ява, праўдзівы позірк у вочы сапраўднаму стану рэчаў, а не абдурванне сябе самога тым, чаго няма цяперака. Цяперака, а не заўтра або паслязаўтра…

Ангельскую мову я крыху ведаю тэарэтычна, але гаварыць, мне думаецца, асмелюся няхутка — вельмі жахлівая ў мяне вымова.

Слоўнічак-ліліпут на 12 тысяч слоў я маю. Але добры слоўнік я хацеў бы набыць — без слоўніка не разумею ўсяго ў газетах і асабліва ў кніжках. Гэнага ліліпута прыслаў мне ў Зальцбург з Парыжа Янка Філістовіч. Ён абяцаў таксама прыслаць, ужо ў Аўстралію, лепшы слоўнік, выдадзены ў Нью-Ёрку. Але я, пакуль не пашлю грошай на выдаткі, вырашыў не аказвацца.

Цягнік з Мельбурна да Вудсайда ідзе 16 гадзінаў. Калі зможаш калі-небудзь прыехаць — прыязджай, буду вельмі рады Цябе пабачыць і пагутарыць з Табой. Можа, і я праз які-небудзь год змагу завітаць да Цябе. Хутчэй бы толькі ўладзіцца, а то цяпер я — нібы той воўк у лесе.

Газету «Беларус на чужыне» атрымаў — таксама шчыра дзякую. Неўзабаве змагу паслаць грошы на падпіску. Апошні нумар «Бацькаўшчыны», што атрымаў я ў Зальцбургу, быў падвойны, прысвечаны 25-му Сакавіку.

Пару часінаў таму надышоў з вячорнаю поштаю новы Твой ліст ад 11.7.1949 г. Дзякую за парады — я патрабую іх на кожным кроку. Людзі ж бо, што ўжо даўжэйшы час тут жывуць, калі спаткаешся з імі, баяцца, здаецца, страціць праз парады свае выгады. Нічога ў іх не выпытаеш. Найбольш арганізаваныя тут латышы — усімі сіламі дапамагаюць сваім уладзіцца. Маюць вялікія знаёмствы і ці малыя магчымасці.

Наша начальства (тут нас 90 чалавек, усе сямейныя) ужо ці раз званіла ў Банагілю і ездзіла ў Вудсайд. Але нічога, аднак, не вызваніла і не выездзіла і цяперака ўцякае ад нашых пытанняў. Днямі, як я ўжо пісаў Табе, прыбывае ў Адэлаіду новы вадаплаў з перасяленцамі. Іх прымесцяць тым часам у Вудсайдзе.

Кватэру праз газету можа тут толькі самотны шукаць, сямейныя не атрымлівалі і не атрымліваюць ніякага адказу. Той сямейны, што знайшоў кватэру, дзякуючы шчасцю, плаціць за яе 3–4 фунты на тыдзень. Таннейшую, за 30–40 шыл., знаходзім таксама дзякуючы шчасцю, у 10–15 мілях ад горада, там, дзе газетаў не чытаюць. Шмат хто, расчараваны бязвыніковымі пошукамі, купіў пляц (85 фунтаў — за местам, 10 міляў ад цэнтру, можна і на выплату) і паставіў палатку, але эмігрэйшэн офіс не дазваляе ў яе пасяліцца з малымі дзецьмі. Хто знайшоў фікцыйную кватэру, абдурыўшы emigration, і пасяліўся ў палатку, той таксама меў шчасце. Хто меў рызыку, здольнасць

і месца красці цэглу, цэмент і інш., той і домік на курыных ножках згарусціў. Але я не належу да гэткіх звярнігаловаў і шчасліўцаў. Можна паставіць палатку і на чужым пляцы — за 10 шыл. на тыдзень, але абдурыць Эмігрэйшэн офіс, каб пасяліцца туды з дзецьмі, я не здолею. А шчасця можна будзе шукаць тады, калі завядзецца капейка ў кішэнях. Завядзецца ж яна не хутка, бо так здзяруць, што няшчасная «унраўская» і «іраўская» вопратка ў шматкі абернецца, і давядзецца ператварыцца ў першажыхара Аўстраліі…

Цешу сябе адною надзеяй на пабочны заробак. Салдаты, з якімі я б'ю лынды, апавядаюць, што з надойсцем вясны пабочнай працы будзе шмат.

Мне думаецца, што на працу да войска паслалі нас часова з увагі на забастоўку, бо тутака няма чаго рабіць. Пазней, здаецца, нас растасуюць недзе ў індустрыю. Але і там людзі наракаюць. Прыкладам, на аўтазборачнай фабрыцы ўсцяж апошніх 7 месяцаў цэлымі тыднямі не было працы з прычыны забастоўкаў, і добры заробак у агульным зрабіўся ніжэйшым ніжэйшага.

Грошы я не патрабую — шчыра дзякую за сардэчную ўвагу. Паслязаўтра атрымаю дапамогу (вылічваецца за харчы не 30 шыл. на тыдзень, як абяцалі, а 34 шыл. і 3 п. Дзяржаўны падатак кавалерскі — з Банагілі яшчэ не надышлі паперы. Буду старацца ў далейшым і сваю долю ўнесці на пасылкі, на прэсу і г. д. Не збіраюся ж вечна быць з сям'ёю пад апекаю эміграцыйнага ўраду з абдзіраннем да апошняга граша. І зарабляць больш спадзяюся ў далейшым.

Інж. Тамашчыка я не люблю за ягонае палітыканства і графаманію. Лепшай камедыі з гэткім япіскапам цяжка прыдумаць. А з іншага боку — што ж зробіш, калі лепшага Тамашчыка-Туманшчыка няма? На бязрыб'і й рак уважаецца за рыбу. Гэта ўсё між іншага, гэта да мяне не датычыцца. У гэтых справах знаўца з мяне не лепшы, як з Тамашчыка літаратурны крытык. Апошні — майстар на ўсе рукі, і ў літаратуру лез з доўгім носам, а ў сваім журналісцка-публіцыстычным узлёце газету «Бацькаўшчына» ператварыў у памыйную яму. Я не ахвяраваў, але сэрца балела, калі бачыў, што іншыя ахвяроўваюць на духовае ўбоства, на трыбуну заслепленых сваім мудрагельствам ідыётаў і нават захапляюцца гэтым мудрагельствам у пасланнях да рэдакцыі. Цікава, ці яшчэ да сяння д-р Ст[аніслаў] Ст[анкевіч] пад высокім кіраўніцтвам інж. Т[амашчыка] рэдагуе «Бацькаўшчыну»?

Вельмі рады чытаць Твае даўгія, як Ты пішаш, лісты, але для мяне яны зусім кароткія. А вось гэты мой ліст, мабыць, даўжэйшы за ўсе найдаўжэйшыя. Прабач мне, калі ласка.

Я не спадзяваўся, што Калодка атрымае мой ліст. Збіраюся напісаць яму і з Адэлаіды.

Моцна цісну руку Тваю — *Алесь.*

Жывуць Крывічы!

99. МІКОЛУ СКАБЕЮ

31 ліпеня 1949 г.

Дарагі Мікола!

Твой ліст і часапіс «Божым Шляхам» надышоў у аўторак, а адпісваць я толькі сяння сабраўся. Прабач, што гэтак позна.

Усцяж тыдня — ад панядзелка да пятніцы — буравальная машына пры разбурэнні фундамента былога будынка вытрасла з мяне ўсе чысценька сілы. Пасля працы страшэнна балелі рукі і галава. Працаваць з паветраным буравам не вельмі ўжо і цяжка, ён мне зусім пад сілу, але да яго трэба прызвычаіцца. Ужо ў чацвер і пятніцу рукі не млелі, і было нашмат лягчэй. А наагул я вельмі задаволены — авалодаў яшчэ адным працоўным навыкам.

Жыву па-ранейшаму. Гэтак, як і ўчора, сумую і трымаюся. Ззаду — матэрыяльныя пацёмкі й духовыя прабліскі святла. Наперадзе — матэрыяльныя прабліскі святла й суцэльныя духовыя пацёмкі. Нецікавае і адно, і другое, але другое нават горшае. Пры першым чалавек без капейкі не губляе сабе цаны, пры другім жа цана чалавеку — капейка. Каб не быць выкінутым у крапіву пад плот і не быць патаптаным, мусіць дбаць пра грошы, забыўшыся пра тое, чым жыве. Не будзеш мець грошы, і будзеш патаптаны. Сянняшняя ж мая вартасць — у тыднёвых шасці фунтах і двух шылінгах. Чым большая колькасць будзе гэных фунтаў і шылінгаў, тым большая будзе мая вартасць. І калі я сяння кажу, што пачуваюся зусім добра, гэта значыць — кажу няпраўду, абдурваючы самога сябе.

Вось першыя сімптомы пагібелі Алеся Салаўя і выплывання на паверхню ненавіснага абываталя Альберта Кадняка. Калі Алесь Салавей не знойдзе для свае сям'і найтаннейшую кватэру (не больш двух фунтаў на тыдзень), а ў суботу й нядзелю будзе «сочинять стишки», ён

будзе пракляты голымі й галоднымі нашчадкамі — так, як праклінапі яны яго ў Еўропе. Калі ж Альберт Кадняк не згодзіцца плаціць тыднёва 10 шыл. за месца на чужой зямлі, а на гэтых жа ўмовах (10 шыл. на тыдзень) купіць на выплату сваю зямлю, абяртаючы гэныя шылінгі ў собскае карыта, праз месяцаў 5–6 паставіць будку-гараж, праз месяцаў 120 — дом, тады ён будзе вясёлы і бадзёры, грэючыся ля цёплага жончынага боку, бавячыся з радымі нашчадкамі, аб'ядаючыся, апранаючыся й складаючы грошы ў панчоху…

Хто каго пераможа — Салавей Кадняка ці Кадняк Салаўя — тым часам толькі іхняму бяздольнаму лёсу вядома.

Сям'я яшчэ ў Банагілі. Сын захварэў на вуха.

Ці прыехаў хто з новых нашых людзей у Аўстралію?

Пасылаю 10 шыл. на прэсу.

Моцна цісну руку Тваю — *Алесь-Альберт С[алавей]-К[адняк].*

100. МІКОЛУ СКАБЕЮ

9 жніўня 1949 г.

Дарагі Мікола!

Твой ліст вельмі расчуліў мяне — запраўды шчырае, блізкае, братняе слова не можа не расчуліць. І спакайней робіцца на сэрцы, і прыемна адчуваць, што маеш блізкіх людзей, і лягчэй жыць.

Фундамент былога будынка ўжо разбураны, цэгла і каменне вывезены за места. Я ізноў працую гуляючы. Учора й сяння быў на стрэльбішчы — мяняў мішэні й працаваў па гадзіне ў дзень, а рэшту часу мучыўся ад няма чаго рабіць. А змыцца нікуды не змыешся, пакуль не адаб'юць гадзіны працы. Здаецца, пры стрэльбішчы прабуду даўжэйшы час. А да паветранага бурава ў другі тыдзень працы я прызвычаіўся, набыў спрыт, і ўжо было мне няцяжка. І рабілася больш тыдня тое, што можна было б зрабіць за тры дні.

Лёс звычайнага работніка і падмятайлы мяне не палохае, ён нават прыемны для мяне, шмат чым прываблівае. Не падабаецца мне толькі нястача, казаў той, развязаных рук.

Дарагі сябра Мікола, клянуся барадой свайго прадзеда і даю слова гонару, што я не бачыў абсалютна ніякіх закідаў у Тваіх лістах і не мог бачыць, і нічога благога не думаў, паслаўшы 10 шыл. на прэсу. Перашлі іх на падпіску ці на Прэсавы фонд — як сам уважа-

еш. Я паслаў таму, што не мог не пасլаць — кажу шчырую праўду. У Аўстрыі я галадаваў з сям'ёю, і майго заробку нават не выстарчала на харчы. А тут мы сытыя, і ў мяне яшчэ застаюцца грошы — як жа было не паслаць? У першы ж тыдзень свае працы я яшчэ не плаціў за ўтрыманне сям'і — яна была на транзітным палажэнні, і ў мяне завялася такая-сякая капейка. Ні ў якім разе не трэба вяртаць гэных 10 шыл. Грошы я не патрабую — тым часам не маю для іх ніякага прызначання. Хіба тады, калі б не было ніякага выйсця і заставалася б ставіць шатро, я пазычыў бы каля 10 фунтаў на гэтую справу. Але цяпер я пра шатро і не думаю, кватэру таксама не шукаю. Хто знайшоў кватэру — не прывёз і не зможа прывезці сям'ю да канца забастоўкі. А па-за тым, дзеці мае неспакойныя, жывыя, бадзёрыя, здаровыя — яны саміх гаспадароў павыганяюць з хаты. Куды ж з імі на прыватную кватэру ў Аўстраліі?

Ізноў жа, для мае сям'і патрэбныя два пакоі і кухня (гэтага жадае Эміграйшэн офіс, а не я, сям'я ж — не адзін чалавек, і без гэнага эміграйшэна з табару яе не вырвеш). Два пакоі й кухня — вялікая для мяне выгада, не паводле кішэні, і я звар'яцеў бы ад гэткае выгады, яшчэ ніколі так не жыў (чым-чым, а прымітывамі магу пахваліцца). Без лішніх словаў — чакаю прыезду сям'і ў Вудсайд (прыедзе пасля забастоўкі). А потым буду думаць аб нечым іншым. Можа, уладжу сям'ю ў нямецкім гарадку, а сам буду жыць пры працы — нямецкі гарадок знаходзіцца ў 20 мілях ад Адэлаіды. Шмат хто, сабраўшы крыху грошай, крадзе сем'і з табару й перавозіць на собскі кошт. Тады, зразумела, неяк прыпісваюць і назад не пасылаюць.

Я звяртаўся да каталіцкае арганізацыі — маніўся ўладзіць дзе-небудзь жонку з дзецьмі (на працу пры дзіцячым садку або палігоне), але і без мяне да тае арганізацыі звяртаюцца штодня дзесяткі людзей, і ўсе, зразумела, дарэмна. Шукаць працу з месцам для сябе й сям'і — нядрэнная думка, але з гэтай справай ходзяць у эміграцыйны ўрад сотні людзей, і ніхто нічога не дамогся і не знайшоў. Майго калегу па ложку прасіў на працу адзін тартак — прасіў праз Эміграйшэн офіс, але апошні адмовіў. Пры тартаку калега жыў бы з сям'ёй. Ды й наша начальства манілася пасяліць нас з сем'ямі ў бараках, што пустуюць, але яшчэ вышэйшае начальства адмовіла (нас тут ужо 120 чалавек).

Сардэчна дзякую за цёплыя словы, за ўвагу, за парады. Газету і часапісы я прачытаў і паслаў жонцы. Яна прачытае й схавае

ў мой архіў. Ці мушу я адсылаць іх назад? Ці Ты пасылаеш лішнія паасобнікі, ці толькі тыя, што для сябе атрымліваеш?

Сын папраўляецца. Цяплее, а ўлетку з дзецьмі будзе лягчэй у праклятым табары, калі давядзецца даўжэйшы час быць у ім.

Цісну руку — *Алесь С.*

101. МІКОЛУ СКАБЕЮ

21 жніўня 1949 г.

Дарагі Мікола!

Кагадзе здолеў прысесці, каб узяцца за ліст. І цяперака, як і раней, у мяне няма нічога цікавага, апрача дакучнага і нуднага асабістага. Маўчаць, не гаварыць, не пісаць — не магу. Ад усяго затоенага ў сабе і нявыказанага галава трашчыць, як цэбар, адно застаецца, казаў той, скакаць у вір галавою. Цешыць сябе, быць задаволеным, хлусіць, ледзь не тое самае, што скакаць і смяяцца над труною нябожчыка. Гаварыць праўду, дакучаючы іншаму, гэта значыць — пішчом прасіць адказу. «Адчапіся, чалавеча, у мяне і без цябе галава трашчыць і свет нямілы!» Застаецца даверыцца паперы, выгаворваючыся праз яе на далёкую адлегласць. Рабі са мною, што хочаш — ці карай, ці мілуй, ці страляй, ці вешай — далібог, прыкушваю язык, ды ніяк не прыкушу (не апавядай нікому пра гэта).

З маленства я не жыў у раскошы, за кароткі свой век зазнаў ці мала бяды й гора. Здавалася б, жыццё павінна было шмат чаму навучыць, прызвычаіць да абставінаў не толькі мяне, але і мае думкі. А вось прыгледжваюся да сябе і бачу: палавіна мяне — адно, а другая палавіна — іншае. Адна палавіна кажа: «З неба нішто не падае і нішто не даецца без мукаў, без поту й мазаля». Другая ж палавіна не слухае, яна прыслухоўваецца да душы, да ейнага голасу: «Пакінь гэты нудны, даступны твайму зроку свет, ідзі за мною ў свет, даступны мне, далёкі ад зямнога бруду й поту, якім ты абліваешся, там не трэба таго, што само даецца, і таго, што здабываецца мазалём». Так-так — падказваюць думкі — аб гэтым і ведамы нам паэта Максім Багдановіч пісаў: «Там не трэба ні шчасця, ні ласкі, там няма ні нуды, ні клапот». І ўслед жа, нібы бачыць мяне наскрозь, гаворыць, здаецца, мой сусед-селянін: «Ты звар'яцеў, чалавеча, выкінь з галавы дурное, а то адлупцую, дальбог адлупцую, хоць я й не бацька твой, ты павінен слухацца старэйшага».

А другі сусед-студэнт з іншага боку чытае ўголас Шаўчэнку: «А думка, думка все літае по-над цією стороною»...

У параўнанні з Табою я зусім шчаслівы, не Ты мяне, а я Цябе павінен суцяшаць. Але ж чаму, скажы, ужо ў сталасці не магу пазбавіцца здзяцінення? Прыгожыя камэны спяваюць штоночы ў снах маіх усё адно і тое самае: «Спаткаўся ты са мной, вясёлай і ўрачыстай, сярод чароўных ніў Ламбардыі цвяцістай...» Яны спяваюць далей, успамінаюць маю Бацькаўшчыну, але я, прачынаючыся, помню толькі два гэтыя радкі. Усцяж апошніх дзесяць дзён я наважваўся сесці, успомніць увесь спеў, хоць на пару гадзінаў адчуць сябе шчаслівым. Але кватэра, праклятая кватэра адбірала ў мяне маё шчасце, прыкоўвала мяне да тае зямлі, ад якой я ўжо і ў думках не магу адарвацца.

Дзесяць дзён ездзіў у пошуках кватэры. У мінулую суботу быў у нямецкім гарадку, у нядзелю — на балгарскім пасёлку каля порта. З усяго, што знайшоў, была найлепшай і найвыгаднейшай кватэра-куратнік, за якую павінен быў бы плаціць паўтара фунта на тыдзень, апрача гэтага — самому мне адпрацоўваць чатыры дні на месяц, а жонцы — мыць бялізну. Зразумела, ад гэтага, як і ад усяго іншага, я адмовіўся (балгар згаджаўся абдурыць эміграйшэна, паказаўшы пакоі ў доме. Не магу, не магу, не магу пагадзіцца на гэткую эксплуатацыю, ледзь не падпісваючы другога кантракту.

Праўда, трапіўся мне адзін балгар, які казаў: «Я разумею цябе, я пусціў бы цябе на кватэру за 1 фунт на тыдзень, каб ты меў адно малое, але з двума — не жадаю». Усе навіны маіх пошукаў я выказаў сваім суседзям у бараку. Яны кінуліся па маіх слядах, пайшлі на тыя ж кватэры і пагадзіліся на тыя ж умовы. Большая палова нашых людзей з меншымі сем'ямі (адно дзіця) уладзілася ў балгараў. Людзі цешацца і кажуць: «Абы пасяліцца, а далей будзе бачна...» А я не магу гэтак сказаць.

Учора і сяння шукаў зямлю. Добрая зямля — 160 фунтаў, хоць адразу будуйся на ёй. Зямля за 50–60 фунтаў знаходзіцца супраць ліха на ўзгорачку, хто пабачыць тое месца, таму жыць не хочацца. А за 80 фунтаў — там хоць кусты растуць, але выплаціць трэба ўсцяж года — дзядзьку Івану, што працуе тут з двума сынамі, гэта якраз пад сілу. Адзін агент паабяцаў мне паведаміць у чацвер аб іншай дзялянцы за 75 фунтаў (заклад — 5 фунтаў, якраз паводле маёй кішані з выплатаю ўсцяж трох год. З гэтым можна было б змірыцца і ўзбіцца неяк на шатро. У шатро блага з малымі, гэта праўда, але лепш, чымся

ў бляшаным бараку ў табары, па якім вецер гуляе. Словам, калі агент паведаміць, тады пабачу, не паведаміць — нікуды больш не пайду, складу рукі і буду глядзець у неба. Хай сабе гэта будзе слабасцяй характару і нястачай сілы волі.

У апошніх чыслах гэтага месяца мая сям'я прыедзе ў Вудсайд, калі будзе здаровая (у Банагілі эпідэмія дзіцячых хваробаў). Дай Божа, каб усё было добра.

Моцна цісну руку Тваю — *Алесь.*

P. S. З Ангельшчыны атрымаў 19-ты нумар часапісу «Наперад». Ці ёсць у Цябе 17-ты й 18-ты нумары? Прысылаць мне не трэба, але напішы толькі, ці ёсць што-небудзь маё ў гэтых нумарах? З Аўстрыі я пасылаў тое-сёе. Грошы можна паслаць на Зіну — буду Табе вельмі ўдзячны. Неўзабаве вышлю трошкі на часапіс «Наперад».

102. МІКОЛУ СКАБЕЮ

30 жніўня 1949 г., Адэлаіда

Дарагі сябра Мікола!

Ты не зусім зразумеў мяне ў мінулым лісце. Я пісаў аб той палавіне, якая дбае пра штодзённы хлеб для жывата і здабывае яго ў поце чала свайго. Пісаў і аб другой палавіне, у якой Ты мяне не пазнаеш, — аб той другой, якая не можа адарвацца ад першай у свет, што не хмурнее маёй дакучнай штодзённасцяй, адарвацца дзеля таго, каб пісаць, тварыць, каб заляцець у думках на распятую Бацькаўшчыну, каб праняцца болем і горам суродзічаў, каб супакоіць і іх, і сябе ў шчырай малітве да Усявышняга, у надземных уявах і летуценнях. Вось якраз я й не задаволены тым, што пазбаўлены дому, сыцею і думаю пра цёплы кут на чужой зямлі, забываюся пра тое, што страціў, не пратэстуючы хоць словам сваім супраць чорнай і пякельнай начы, навіслае над страчаным. І толькі ў снах маіх нараджаецца гэнае слова, а калі прачынаюся — яго заглушае практычная палавіна, занятая штодзённасцяй. Ну, але гэта між іншага.

Тыдзень таму прыехала ў Вудсайд мая сям'я. У пятніцу, суботу й нядзелю я быў у Вудсайдзе (паблізу сямейнага табару — вайсковыя бараکі, у пятніцу ездзіў туды на працу: мянялі тэлефонны слуп). Сямейны табар у Вудсайдзе не ўвесь аднолькавы, але ўсё роўна ў параўнанні з Банагіляй — рай. Сям'і маёй пашчасціла

трапіць у асобны пакой у цёплым бараку, абабітым усярэдзіне картунаю і гіпсавымі лістамі. Харчаванне добрае, але для дзяцей варыцца тое, што і для дарослых. Малака ў два разы менш, чымся ў Банагілі. Але гэта не бяда — можна ж дакупіць. Палавіна чорнага суму спала з майго сэрца.

Учора купіў зямлю за 55 фунтаў — ушыркі 20 ярдаў, удоўжкі — 42. Заплаціў 5 фунтаў, а рэшта на выплату па 10 шыл. на тыдзень, 2 фунты штомесяцу. Зямля знаходзіцца ў добрым месцы — 7 міляў ад цэнтра, адна міля ад порта, недалёка ад вуліцы, што ідзе з цэнтра места ў порт, паблізу тралейбуса, фабрыкаў і ўсялякае працы. За зямлю патрабавалася на пачатку 20 фунтаў, а рэшту па фунту ў тыдзень, але [illegible] прасіў агента, агент гаспадара, і апошні ўрэшце пагадзіўся на 5 фунтаў дэпазіту і на 10 шыл. тыднёвай выплаты.

Ніякага далейшага плана не маю. У Адэлаідзе няма таго, што ў іншых гарадах. Тут вялікі наплыў новых жыхароў, прыйшлыя ў места з правінцыі падчас вайны назад не вярнуліся, салдаты, што ваявалі, заспыніліся ў месце. Тут шалёная гонка будоўляў, фірмы любяць заказы на бліжэйшыя 5 год. Пра баракі, якія будуе фірма, у нас няма і гутаркі. Пра шатро я думаю й не думаю, падчас нават баюся думаць. Жыць у табары — ніякае не выйсце, бо на табар ідуць, бадай, усе грошы (апрача гэтага я куру і не магу пакінуць). Овэртаймаў на маёй працы няма, пабочнага заробку яшчэ не знайшоў — шукаю. Змяніць працу — шкада цёплага месца, дзе плацяць не за работу, а за гадзіны. Тым часам шукаю працу на суботу й нядзелю, і калі пашчасціць — наважыўся й надалей сядзець у табары, адмовіўшыся ад шатра, а пазней, як будуць грошы, пачну сам ляпіць будку.

Ты пішаш праўду, што да параўнання нашага палажэння з палажэннем нашых суродзічаў пад «раем», я ведаю аб гэтым. Я канстатаваў толькі факт паасобных мамэнтаў з майго асабістага жыцця, не разбіраючы іх. Дапамагаць мне не трэба, я сам летуцею дапамагаць маім суродзічам — сябрам у Еўропе. Калі буду мець выразны план на далейшае, толькі пазычу, калі можна будзе, невялічкую суму грошай. Ад верасня буду зарабляць 6 фунтаў і 10 шыл. на тыдзень. Калі б змяніў працу (сталаванне ў іншым месцы каштуе 2 фунты і 12 шыл. на тыдзень, на 1 фунт з гакам больш, чымся пры войску), не ведаю, ці шмат выйграў бы.

Буду вельмі рады бачыць Цябе, калі зможаш прыехаць. Толькі не змагу спаткаць Цябе так, як спаткаў бы на вольнай Бацькаўшчыне.

Але некалі па-запраўднаму спаткаемся там. Толькі ў імя нашага звароту ёсць сэнс жыць.

Не сумуй, Усявышні ўратуе нашых дарагіх, родных і блізкіх, яны прычакаюць і Цябе, і мяне, і ўсіх нас.

Моцна цісну руку Тваю — *Алесь С.*

103. МІКОЛУ СКАБЕЮ

12 верасня 1949 г.

Дагагі сябра Мікола!

«Is Australia a good country?» — не раз, не два, а колькі разоў штодня пытаецца ў мяне салдат, з якім разам працую. Я прамоўчваю, не адказваю на гэтае пытанне. Салдат нястомна пытаецца ізноў, а я нястомна жадаю пачуць іншы голас: «Ці хутка, дружа, вернемся ў Беларусь?» Хочацца пагаварыць са сваім чалавекам, і вось я ізноў «гавару» — пішу да Цябе ліст.

Твой ліст атрымаў тыдзень таму. Усцешыўся, што новыя перасяленцы з нашых людзей прыбываюць у Аўстралію. Нават прыбыццё гэнага Шмуткі мяне ўсцешыла. Гэтае прозвішча прыгадала мне таксама Шмутку, койданаўскага балагола, які ўважаў сябе за прэм'ер-міністра воза і кабылы. Шмутка мільгнуў і знік, а за ім пайшлі ўспаміны дарагога і незабыўнага. Ува ўсякім разе кола нашае робіцца цяснейшым, а ў цесным коле — цяпло, для холаду там няма месца. Буду шчаслівы, калі мяне не загрызе штодзённасць, калі і я змагу нешта рабіць у гэным коле паводле сваіх здольнасцяў і ўмення, не мяшаючыся не ў сваю справу.

Жыву, як і раней, працую і зарабляю цяперака 6 фунтаў і 18 шыл. на тыдзень. 10 шыл. тыднёва плачу за зямлю, прадчуваючы, што жыць на ёй не давядзецца. Страціць — нічога не страчу, няхай сабе грошы затрымліваюцца на ўсялякі выпадак у гэтым «зямельным банку». І кішаня ўжо ў мяне не пустая — маю 8 фунтаў «зямельнага капіталу». Як ні кажы — цяперака магу сабраць 4 фунты на месяц і лепшага я не жадаю. Праз 5 год буду мець 200 фунтаў, а праз 10 год — 400. Словам, як у пэўнай казцы: заб'ю зайца, мяса з'ем, а шкуру прадам; за выручаныя грошы куплю свінню; свіння прывядзе парасятаў, якіх прадам, і г. д.

Між іншага, тры мае калегі ў працы, што пайшлі на знойдзеныя мною кватэры, ад якіх я адмовіўся, ужо перавозяць свае сем'і ў Вудсайд. Шукаў працу на суботу і нядзелю, давалі мне найбольш 2 шыл. і 6 пенсаў за гадзіну. У гэтым вінаватыя самі ДП — згаджаюцца працаваць за такую аплату. Але я адмовіўся ад эксплуатацыі без кантракту і езджу штосуботы ў Вудсайд. Бясспрэчна, лепш затраціць штотыдня 8 шыл. на дарогу, чымся гнуць спіну за 2 шыл. і 6 пенсаў за гадзіну.

Сям'ю маю ўжо перавезлі з адбудаванага й цёплага 5-га блока ў неадбудаваны й халодны 4-ты блок — у ім наладзілі добрую дзіцячую кухню. У Аўстраліі гэтак і бывае — адно наладзяць, а другое разладзяць.

Даруй, што дакучаю Табе гэтай нуднай асабістасцяй — неяк ужо само трапляе на пяро, а з пяра — на паперу (пішу і выводжу літары, але хіба на валізцы ў Аўстраліі па-людску іх выведзеш?).

Дзякую за часапісы. Айцец Гарошка прысылаў мне свой часапіс, калі жыў я ў Аўстрыі. Да гэтага часу я з ім не разлічыўся. Якім чынам Ты перасылаеш грошы ў Францыю? Напішы мне, і я пашлю. Пісаць у Еўропу — ужо пісаў: Адамовічу, Лашуку й Філістовічу. Ад Філістовіча ведамкаў не маю (грошы ў Францыю, здаецца, кіруюцца праз Лондан, праз адрас а. Сіповіча?).

Адэлаіда — сапраўды цудоўная мясцовасць паводле клімату. Таму сюды й скіроўваюцца ангельцы, і тут вялікі прырост жыхарства апошнімі гадамі, а ў выніку — нялёгка з будоваю. Пляцоў у чароўных мясцовасцях за 160 фунтаў — безліч. Мой пляц — каля фабрыкаў і іх дыму.

Тыдзень таму атрымаў «Бацькаўшчыну» ад Б. Дзедаўца. Можа, і мы некалі, сабраўшыся, выдадзім што-небудзь людскае. У роскідзі можна выдаць слёзы, а за слёзы брацца не хочацца.

«Ці мае дзядзя Мікола аўта?» — чамусьці спытаўся ў мяне аднойчы мой сын. Я адказаў яму, што мае, і некалі, як прыедзе, павозіць яго. Пасля гэтага «дзядзя Мікола» не выходзіць з ягоных успамінаў.

Нядаўна даведаўся, што мяне і яшчэ 19 сяброў у працы мяркуюць паслаць на 6 тыдняў за 120 міляў ад Адэлаіды для пабудовы нейкіх баракаў. Калі давядзецца ехаць — паеду, бо тут ужо па-запраўднаму разгультаіўся, працуючы дзве-тры гадзіны ў дзень (людзей прымаюць, а працы няма).

Прывітанні Табе ад сына і ўсіх нас.

Моцна цісну руку Тваю — *Алесь С.*

104. МІКОЛУ СКАБЕЮ

5 кастрычніка 1949 г.

Дарагі сябра Мікола!

Прабач мне, я ізноў пішу алавіком — сапраўды, нязручна пісаць чарнілам на калене. Калі пастаўлю валізку на ложку, дык трэба бокам сядзець — таксама нязручна. А столік зрабіць — красці дошак не ўмею, папрасіць жа — не люблю кланяцца. Гэтак я ўжо і прызвычаіўся пісаць на калене — пішу алавіком.

Ты дарэмна турбуешся, што ў маёй галаве можа нешта перакруціцца ад Тваіх лістоў. Наадварот, я бязмежна рады кожнаму Твайму слову, і чым даўжэйшы Твой ліст, тым больш у мяне радасці і ўцехі. Як ні кажы, адзін чалавек у свеце, з якім я сяння перапісваюся, — гэта Ты. Шмат каму не сабраўся яшчэ напісаць, а шмат з кім наагул страціў лучнасць.

Час бяжыць хутка, ужо праз чатыры дні — чатыры месяцы майго пабыту ў Аўстраліі, больш трох месяцаў кантракту. Шмат да чаго я прызвычаіўся, шмат з чым зміррыўся. Не магу змірыцца з адным — з жыццём «на дзве палавіны». Гэткае жыццё апустошвае кішаню, змушае думаць: а што будзе заўтра? З чым давядзецца вывесці сям'ю з казённага бараку — вечна ж яна там сядзець не будзе?

«Сянняшні дзень, — гаварыў мне нядаўна адзін мой знаёмы, — гэта прадвесце заўтрашняга дня. Чым хмурнейшае твае сяння, тым больш сонечнае заўтра. Не будзь жа ганарлівы, ідзі ў заробкі, згаджайся з аплатаю ў 15 шыл. за 8 гадзінаў — нават гэткая сума пад плотам не валяецца!» Няўжо запраўды згадзіцца? Ужо куру адну цыгарэту ў дзень — хіба і ад гэтага адмовіцца? Збіраюся купіць шкарпэткі, але, можа, лепш замяніць іх анучамі? Заміж насавое хустачкі — як-небудзь абыходзіцца рукавом? Не адведваць сям'і ў Вудсайдзе і быць голым сцяблом, адарваным ад коласа? Заміж чаравічак для дзяцей плясці вераўчаныя лапцікі? Заміж бялізны насіць вопратку, выданую для працы? Капацца на вайсковым сметніку і там знайсці чаравікі для сябе і жонкі, нават неблагі капялюш? Гэтак робяць, бадай, усе мае суседзі ў бараку, але я яшчэ ўсё ніяк не магу вышкаліцца ў такога ідэальнага «копильщика денег». Усё ж нехта сказаў: разбагацелым на сметніку ніколі не шанцуе, прыйдуць бальшавікі — яшчэ раз раскулачаць.

У Адэлаідзе шмат працы. З працаю тут, здаецца, палажэнне такое, як і ў Мельбурне. Усе, што працуюць на фабрыках, маюць овэртаймы,

могуць працаваць і ў суботы. Гэта ў нас, пры войску, няма овэртаймаў. А фабрыкі не бяруць чужых людзей у суботнія заробкі. Я магу знайсці заробак толькі ў абываталя (8 гадз. — 15 шыл.). Змяніць працу — я ўжо пісаў Табе аб плюсах і мінусах змены. Апрача гэтага шмат дзе зусім няма памяшкання для работнікаў.

Беларускі пасёлак — гэта вельмі добрая ідэя, але як жа яе ажыццявіць? У рэчаіснасці ж трэба сабрацца ўсім жыхаром будучага пасёлка і закупіць «блокі» ў адным месцы — інакш нічога не будзе. У тых мясцінах, дзе мой «блок», будзе, здаецца, украінскі пасёлак. Апрача двух беларусаў, рэшта маіх суседзяў — украінцы. Трэба мне зарабіць 150–170 фунтаў, каб паставіць бляшаны ці драўляны маленькі домічак — будку на два пакоі. Уся гэта праблема з будаваннем — справа не мае натуры, але што зробіш, калі няма іншага выйсця? Праз гадоў 5–10, можа, і зажыву разам з сям'ёй.

Грошай жа на выезд з Аўстраліі не будзе ў мяне ніколі. Мне часамі думаецца, што чырвоная пошасць апануе ўвесь свет; у ваенны канфлікт у бліжэйшым часе таксама не веру. Калі б Ты і яшчэ хтонебудзь жыў у Адэлаідзе і меў жаданне далучыцца, як Ты пішаш, — з майго боку, апрача згоды, нічога іншага быць не можа. Так ці інакш, для супольнікаў я нічога не зраблю — ці буду я жыць у Адэлаідзе, ці ў іншым месцы.

Чуў адным вухам, што нам яшчэ крышку прыбавяць заробак, здаецца, да 7 фунтаў і 4 шыл. Я маю вельмі добрую працу — амаль нічога не раблю і атрымліваю грошы. Такое працы трэба трымацца рукамі і нагамі. Тых, што памануліся змяніць працу з мэтаю лепшага заробку, запхнулі туды, дзе, казаў той, і совы не куракаюць.

Раманоўскага не ведаю.

Моцна цісну руку Тваю — адданы Табе *Алесь С.*

105. МІКОЛУ СКАБЕЮ

27 кастрычніка 1949 г.

Дарагі сябра Мікола!

Пісаць я не развучыўся, толькі ледзь не навучыўся маўчаць. Не гнявайся на мяне за маўчанне — запраўды, я не меў часу. Шчыра прызнаюся: цэлых два тыдні «архірэйскім» інструментам з аўстралійскага дубовага дрэва майстраваў нешта, у чым маім дзецям можна будзе

спаць. З аўстралійскіх салдацкіх ложкаў яны звальваюцца на падлогу. Дапамагала мне палавіна бараку. Штовечару пасля працы людзі (аж тры чалавекі) дружна браліся за работу, і мне не выпадала адлучацца, каб узяцца за лісты. З самога ж мяне майстар такі, як з нечага куля. А дзве апошнія суботы й нядзелі, як і раней, быў у Вудсайдзе — там для мяне два дні мінаюць так хутка, як пяць часінаў.

Як жа мне знайсці й пабачыць інжынера Трысмака? Твой ліст надышоў учора, сяння былі заняткі ангельскае мовы. Заўтра, у пятніцу, пасля працы, нібы на крылах, палячу ў Вудсайд (спалучэнні вельмі дрэнныя, і ў суботу ехаць нязручна). Хіба ўжо на наступным тыдні распачну пошукі інжынера (той шпіталь, дзе працуе ягоная дачка, — 14 міляў ад мяне). А доктар Мілянцэвіч (я знаёмы з ім з Рыгі і Берліна) яшчэ ў Вудсайдзе. Чакае прызначання на працу. Заўтра адвозіць свайго сына ў пансіён (ён удавец). На словах, ён задаволены Аўстраліяй. Пагавару з імі на тэму, аб якой Ты пішаш…

Апошнімі гадамі места Адэлаіда сталася немалым прамысловым цэнтрам. Будуюцца новыя фабрыкі. Працы, як і ўсюды ў Аўстраліі, выстарчае. Заробкі розныя — як і ўсюды. З кватэрамі, як для самотных, так і для сямейных, пры жаданні і пошуках таксама няцяжка (гэта такім сем'ям, як мая, не зусім добра з малымі).

Места разбудоўваецца. У ім безліч вольных пляцоў. У чароўнай мясціне, ля цёплых водаў і пляжу пляцы каштуюць па 170 фунтаў. Гэта 6 міляў ад цэнтру, але недалёка ад разбудаваных кварталаў прадмесця. На гэткай жа адлегласці ад цэнтру, блізка ад пошты, ад чыгункі, за тую ж цану прадаюцца пляцы (іх вельмі шмат) і ў Сэатон Парку, і ў іншых месцах. Пляцы ад 55 да 120 фунтаў знаходзяцца супраць ліха на ўзгорачку. Купіць іх вельмі цяжка, бо яны не прадаюцца адразу, а толькі па 5–10 блокаў. На рэшту даецца наступны адказ: «Гэткія і гэткія блокі тым часам намі нявысветленыя, будуць прадавацца пазней».

Наагул, купля таннага пляцу робіцца ўвесь час цяжэйшай. Цяжка купіць на выплату, бо шмат імігрантаў-пакупнікаў згаджаецца плаціць усё адразу. Пляцы за 170 фунтаў — не па нашай кішані. Апрача гэтага, на пляцах нельга будаваць што-небудзь часовае — вымагаецца адразу добры будынак. Можна будаваць самому або чакаць у чарзе 6–7 год, пакуль пабудуюць на выплату. З купляю гэткіх пляцоў трэба быць вельмі асцярожным. Калі я купіў зямлю, быў абвешчаны продаж 20-ці «блокаў» па 55 фунтаў у маім месцы — іх адразу ж расхапілі,

затрымаўшы агента да 11 гадзін вечара. Усюды патрэбныя знаёмствы і рэкамендацыя. З імі здабудзеш усё. Гэдак і з купляю матэрыялу без дазволу (на дазвол трэба доўга чакаць).

Не зважаючы на ўсё гэта, нашы людзі такія дамы будуюць і ўжо павыбудоўвалі, што аўстралійцы проста заглядаюцца (ёсць сем'і, у якіх працуе 5 душ). Вырастае ледзь не новы горад з імігрантамі, пераважная бальшыня — украінцы, усе ў адным танным месцы, на вялікім прасторы, там жа і мая зямля. Будаўляны матэрыял на выплату прыватна не прадаецца; без выплаты, за наяўны разлік — іншая справа, можна купіць, што хочаш.

Пытанне нашага згуртавання і пасялення вельмі сур'ёзнае (аб патрэбе і гаварыць не прыходзіцца), і яго трэба развязаць усім разам. Будзе вялікае нядбайства й віна, калі пакінецца яно безуважным. Згуртавацца — значыць не паддацца асіміляцыі, гэта ўсім нам ведама.

Само места Адэлаіда ўважаецца за найлепшую кліматычную мясціну ў Аўстраліі. Лета тут пераважна не парнае, зіма не сырая, дажджы бываюць зрэдку, на правінцыі — часцей, правінцыя — горная і ўзімку вільготная.

Кожны мае, казаў той, сваю галаву. На мой асабісты пагляд — не варта ўлазіць у чужыя куткі ў чужой газеце, лепш пачынаць выдаваць ранешта сваё, зусім самастойнае, сур'ёзнае і саліднае, хай сабе й на ратапары. Гэная балонка ва ўкраінскай газеце будзе нагадваць «кукарэку» безгалосага певуна на чужым сметніку.

Збірацца ў адно месца, пасяляцца, трымаючыся прынцыпу: адзін за ўсіх, усе за аднаго — за гэта я стаю рукамі й нагамі.

Моцна цісну руку Тваю — *Алесь С.*

Жывуць Крывічы!

106. МІКОЛУ СКАБЕЮ

4 лістапада 1949 г., Вудсайд

Дарагі сябра Мікола!

Заўтра а 6-ай уранні выязджаю ў кірунку да правінцыі Вікторыя — у Рэнмарк (160 міляў ад Адэлаіды). Вярнуся адтуль перад самымі святамі. 29 лістапада і 30 лістапада 1949 г. мы працуем. 3 ці 4 студзеня выеду ізноў у гэты самы Рэнмарк на працу, калі не выкручуся (чуў я адным вухам ад салдатаў, што па святах паедзем на даўжэйшы

час). За выняткам мяне і аднаго інжынера-ліцвіна, усе прызначаныя на працу ў Рэнмарк (сярод іх былі запраўдныя сталяры і плотнікі) пайшлі да начальства, расплакаліся — і іх вызвалілі. Я ж, зразумела, як і ліцвін-інжынер, не ўмею плакаць і цяперака еду з новенькімі, прызначанымі на месца вызваленых. А ўсе новенькія — дактары і прафесары, у будаўніцтве, як і я, нічога не цямяць. Але будзем будаваць баракі ў Рэнмарку.

Інжынера Трысмака не бачыў. Ездзіў да яго, але не застаў дома (ён жыве далекавата ад мяне). Я аб усім падрабязна пісаў яму ў лісце. А доктар Мілянцэвіч працуе ўжо ў нас пры войску і жыве на тым жа двары, дзе і я, — у суседнім бараку. Ён яшчэ нічога пэўнага мне не сказаў аб адведзінах Мельбурна. Аднак прасіў напісаць Табе, што ён, калі паедзе, паведаміць Цябе тэлеграфічна за колькі дзён перад ад'ездам.

Я атрымаў ад Б. Дзедаўца газету «Беларускі эмігрант». Ці не дрэнна было б нам далучыцца да гэтай газеты, падтрымліваючы яе? Ці зможам мы ў Аўстраліі выдаць такую газету і ці ўтрымаем яе? Ці змаглі б мы ў Аўстраліі пабудаваць Беларускі дом? Пэўна ж, гэтыя справы абгаворацца ў Мельбурне.

Прабач мне, я не змагу прыехаць. Апрача іншых прычынаў, і гэны пракляты Рэнмарк — таксама перашкода.

Моцна цісну руку Тваю — *Алесь С.*

107. МІКОЛУ СКАБЕЮ

10 лістапада 1949 г.

Дарагі сябра Мікола!

Я ізноў крыху спазняюся з адказам, прабач мне. Здаецца, працую няшмат, часу хапае, але як узяўся з панядзелка за рамонт абутку для сябе й сям'і, дык ажно цяперака скончыў (заўтра трэба адвозіць у Вудсайд). Майстра з мяне геніяльны — пакуль падаб'ю адзін чаравік пасля працы, дык ужо і поўнач. Суседзі бурчаць, каб хутчэй гасіў святло.

Інжынера Трысмака не бачыў. На мінулым тыдні я ад'язджаў у Вудсайд у суботу па паўдні, а з рання хацеў пабачыць інжынераву дачку. Я не застаў яе ў шпіталі, і ніхто іншы нічога не ведаў пра яе бацькоў. Ліст жа напісаць мне вельмі цяжка — не ўмею звяртацца з просьбай да паненак. Я ўжо браўся пісаць, але, апрача «будзьце

ласкавы» і «ветліва звяртаюся да Вас з просьбай», нічога ў мяне не выйшла. Я не хлушу. І чаму так адзічэў — сам не ведаю. Запраўды, заводзіць знаёмствы не ўмею, заходзячы ў хату высокапастаўленай асобы, спатыкаюся і вітаюся з жанчынамі, як мядзведзь. Ці не лепш мне зусім не паказвацца на вочы людзям?

З доктарам Мілянцэвічам гутарыў (ён яшчэ без працы). І я, і ён дайшлі да згоды, што з'езд конча патрэбны, але, мне думаецца, што той, хто не прыедзе, мог бы замяніцца іншым чалавекам, які жыве на месцы з'езду, — праз упаўнаважанне. Упаўнаважаныя дэлегаты фармавалі й САБЭ — тое «Цоб-Цабэ», як пісаў мне адзін мой знаёмы.

Што да згуртавання, да задзіночання — само сабой зразумела: толькі жывучы не ўроскідзі, зможам духова трымацца і трымаць адзін аднаго. Пасяляцца, як мы абодва думаем, найлепш у меншым месце, бо для нас, піянераў новага пасялення, вялікае места-грамідла не дасць шмат прастору. З нашае эміграцыі на сяло мала хто пойдзе. Бальшыня паселіцца ў месце, а таму мы мусім жыць там, дзе мець-мем працу. Цяжка мне гаварыць аб гэтых справах. Пішу, бо Ты пытаешся, а разумеюся ў іх не больш, чымся баран у новых варотах.

Зямля, аб якой я пісаў у мінулым лісце, і тут «супраць ліха на ўзгорачку» (у чорта на кулічках), але, калі прыгледзецца і падумаць, няцяжка пераканацца, што гэта не вельмі вялікае ліха. У меншых гарадах «кулічкі» не такія далёкія, як у гарадах большых. Даражэйшая зямля (да 180 фунтаў) — гэта ўжо, бадай, не «кулічкі», але ж на ёй, паўтараю, дазваляюць будаваць адразу добры дом. Гэтая зямля будзе прададзеная няхутка, аўстралійцы яе не купляюць (і яны лезуць на таннае), нашы людзі ёю мала цікавяцца (ім выгадней лезці туды, дзе можна пачынаць ад шатра).

Калі будзеш мець жаданне купіць зямлю — зможаш купіць дзе хочаш і колькі захочаш, на гэта патрэбна Твая прытымбытнасць, выбар, упадабанне і т.д. Пара маіх будучых суседзяў будуе домікі за 60–70 фунтаў — са скрынкаў, у якіх прывозяць аўты; скрынка каштуе 7 фунтаў (на ладны домік выстарчае 4 скрынкі). Я ўжо выплаціў за сваё будучае гора — зямлю — 11 фунтаў. На мінулым тыдні выклікаў мяне агент і катэгарычна запатрабаваў 4 фунты за зямлю. Гэтым ён накінуў вялікі цяжар на мае плечы. Змену ўмовы ён матываваў тым, што гаспадар спачатку абяцаў даць згоду на 2 фунты за 4 тыдні, але пазней перадумаў і не згадзіўся, бо пакупнікоў, што выплачваюць усе грошы адразу, не бракуе.

Які нешчаслівы выпадак стаўся з Калодкам? Як ён маецца цяпер-ака? Разам з мінулым лістом да Цябе я пісаў і Калодку.

Скажы Нарушэвічу, што ёсць наступныя навучальныя ўстановы (можа, ён і сам аб іх ведае): The Research Institute (Адэлаіда) і Roseworthy Agricultural College (30 міль на поўнач).

Моцна цісну руку Тваю — *Алесь С.*

P. S. Калі будзеш перасылаць грошы ў Еўропу, заадно перашлі і ад майго імя 10 шылінгаў на адрас Янкі Філістовіча і 10 шылінгаў на часапіс «Наперад». Пасля наступнае зарплаты, праз тыдзень, я вярну Табе гэтую суму. Наперад дзякую.

108. МІКОЛУ СКАБЕЮ

14 лістапада 1949 г., Адэлаіда

Дарагі Мікола!

Сяння ўвечары бачыўся са сп. інж. Трысмаком. Як выявілася, я знаёмы з ім яшчэ з Берліна. Інжынер пачувае сябе нядрэнна. Працуе на фабрыцы сельскагаспадарчых машынаў. Апошнімі днямі яго перавялі ў цэх з больш лёгкаю працаю, чымся была перад гэтым. Мы гутарылі аб тым, што Ты закранаў у мінулых сваіх лістах. Інжынер усё яшчэ наэлектрызаваны «змаганнем» нашых суродзічаў у Нямеччыне. Між іншага, ягоныя перспектывы нясумныя — усе тры душы працуюць.

Беларусы ў Канадзе, яшчэ адрабляючы кантракты, пастанавілі збірацца пазней у Таронта. Гэтую пастанову цяпер выконваюць. Ці неблагі гэта прыклад для нас?

Што да з'езду — мо і лепш было б адкласці яго да 25 Сакавіка. Да гэтага часу можна было б стварыць часовую арганізацыю беларусаў і абраць управу ці нешта падобнае (можна абраць і карэспандэнцыйным спосабам).

Што да месца будучага пасялення, то мне думаецца, што гэтую справу можна вырашыць і без з'езда. Ці не маглі б стацца ініцыятарамі месца пасялення тыя людзі, што ўжо адрабілі ці неўзабаве адробяць кантракты? З чыста асабістага гледзішча я таксама вельмі хацеў бы ў будучыні жыць са сваімі людзьмі. Я мог бы перабрацца ў іншае места ці тут купіць новую зямлю разам са сваімі. Быў бы рады быць Тваім суседам. Усе грошы, мабыць, трэба заганяць у матэрыяльную вартасць — аб гэтым напамінае іхняя няпэўнасць.

У пятніцу ўранні было абвешчана аб продажы 160 пляцоў па 80 фунтаў (16 міляў ад цэнтру, але ўсё роўна — поле й кусты). Усцяж дня ўсе 160 пляцоў былі прададзены (дэпазіт — 25 фунтаў). Бальшыня людзей плаціць усе грошы адразу. Я не магу прыдумаць, як «затрымаць» пару пляцоў, аб якіх Ты ўспамінаў. На гэта абавязкова патрэбен Твой выбар і ўпадабанне, патрэбен пашпарт пакупніка (зямля зацвярджаецца ўрадам, паліцыя на месцы цікавіцца працай пакупніка, што ён за чалавек). Патрэбен і подпіс пакупніка.

Інж. Трысмак мяркуе чакаць большае колькасці нашых суродзічаў і тады купляць сабе месца да жыцця з кім-небудзь разам — па-суседству.

Моцна цісну руку Тваю — *Алесь С.*

109. МІКОЛУ СКАБЕЮ

20 лістапада 1949 г.

Дарагі сябра Мікола!

Невялікія клопаты і розныя драбніцы, звязаныя з гэнымі клопатамі, перашкодзілі мне адразу адпісаць на Твой ліст. Ты мне прабач за гэта, калі ласка.

Сардэчна дзякую за запросіны ў Мельбурн. Узварушаны гэтаю цёплаю ўвагаю да мяне, хаця я на гэта не заслугоўваю. Мне вельмі сумна, мне надта цяжка сказаць у гэтым лісце, што на Каляды прыехаць у Мельбурн я не здолею. Прыехаць жа мне вельмі хацелася б. Я перакананы, што спатканне з маімі сябрамі шмат натхніла б мяне і абнадзеіла, і наагул лягчэй жыць на свеце, калі спаткаешся і пагутарыш з блізкімі людзьмі, калі не адчуваеш сябе адарваным...

Працую я ад 5-ай гадзіны ўранні да 6-ай увечары. Чатыры разы ўсцяж працую па чатыры дні, а па два дні бываю вольным, а потым 5 разоў працую й бываю вольным па тры дні. Якраз на самыя першыя дні свята прыпадае мне праца. Якраз на Каляды працавацьму па чатыры дні (аб гэтым я раней пісаў коратка Калодку). Святамі буду вольны толькі 27-га, 28-га снежня, а потым — 2-га і 3-га студзеня 1950 г. Няблага зарабляю, таму не хацелася б прапускаць працу. За два дні я здолеў бы толькі заехаць у Мельбурн і вярнуцца назад, а пагутарыць не было б часу.

Гэта першая прычына: я ніяк не магу вырушыць у дарогу і ў адведзіны сваіх калегаў без майго найбліжэйшага і найдаражэйшага ся-

бра Алеся. З увагі на тое, што Алесь цяпер перабывае ў водпускуадпачынку, дадзеным яму музамі, я не здолею намовіць апошняга далучыцца да майго падарожжа. Можа, у новым годзе міне той адпачынак, тады, бясспрэчна, Алесь на крылах прыляціць у Мельбурн, і я ад яго не адстану.

Надоечы я атрымаў з Аргентыны кароткі нарыс з гісторыі Беларусі — «Беларусь учора і сяння» Я. Найдзюка. Днямі перашлю гэту кніжку Калодку. Тым часам перадай яму ад мяне самае найсардэчнейшае прывітанне.

Асаблівых і цікавых навінаў не маю.

Сям'я мая павялічылася яшчэ на адну асобу — на сына.

Тым часам канчаю, моцна цісну руку Тваю — адданы Табе *Альберт Кадняк.*

110. МІКОЛУ СКАБЕЮ

23 лістапада 1949 г., Адэлаіда

Дарагі сябра Мікола!

Адразу я атрымаў аж тры лісты: ад Цябе, ад Калодкі і Янкі Філістовіча. А. Калодка таксама піша аб прыездзе ў Мельбурн. Піша, што прыедзе туды 26.12.1949 г.

Кагадзе быў у мяне доктар Мілянцэвіч. Ён усё яшчэ без працы і цяперака шукае яе самастойна. Я гутарыў з ім аб зборах у часе калядных святаў у Мельбурне. Доктар сказаў, што абавязкава туды прыедзе, калі ў далейшым ягоным жыцці ўсё будзе адбывацца памысна (гэта значыць, калі ён зможа крыху папрацаваць да Калядаў). Дата ягонага магчымага прыезду ў Мельбурн — 26.12.1949 г.

А з інжынерам Трысмаком я пастараюся пабачыцца бліжэйшымі днямі (ягонай сям'і яшчэ не бачыў, ён не жыве разам з ёю). Інжынеру я таксама падаў дату прыезду ў Мельбурн — 26.12.1949 г. Але добра было б, каб яшчэ і Ты напісаў у гэтай справе інжынеру. Ягоны адрас: Парфіры Трысмакоў, Kilkenny Road, Kilkenny, S[outh] A[ustralia].

Што да мяне самога — Ты не гневайся на мяне, дарагі сябра, — я не прыеду. Цяжка гаварыць аб прычынах — яны заўсёды знойдуцца, і, пэўна ж, пры важных справах іх нельга браць пад увагу. Грошы на падарожжа я маю, і зусім лішнім было б мне дапамагаць (шчыра дзякую за прапанову і запросіны). Але на гэты раз прабач мне — прычы-

на зусім у іншым. Табе аднаму прызнаюся па-сяброўску, нікому, калі ласка, не гавары аб гэтым. Хіба можна якраз у часе калядных святаў палохаць Аўстралію (гэта ж не ў Аўстрыі, дзе ўсе былі аднолькава шэрымі) маім «дыпіўскім» выглядам? Дазволь мне ў думках быць на зборах, быць з Табой, з усімі сябрамі, сярод усіх. Я жадаю ўсім самага найлепшага. Хай найсардэчнейшыя мае пажаданні заменяць маю прытымбытнасць…

Нешта патыхае плаклівым прыбядненнем у вышэй напісаным, але прабач, яно ўжо неяк само выскачыла з-пад пяра, я не ёсць і не жадаю быць прыгнобленым, хай сабе і ў летуценнях.

Асаблівых зменаў у маім жыцці апошнім часам не адбылося. 5.12.1949 г. выязджаю на працу за 160 міляў ад Адэлаіды (гэта толькі цяпер зрэалізоўваецца тое, аб чым я некалі Табе пісаў). Вярнуся назад перад самымі святамі. Пасля Новага года выеду яшчэ раз — толькі на тыдзень. Будзем складаць стары бляшаны барак. Ужо даўно разбураны й завезены з Адэлаіды. Праца вельмі цікавая, будзе складаць гэны барак 20 чалавек.

Здаецца, я адракуся ад свайго «блоку», падараваўшы ўжо выплачаныя 13 фунтаў. Мне налічылі за яго афармленне 12 фунтаў і 10 шыл. Прыйшла «грамата», каб выплаціў грошы да 3 снежня 1950 г. Словам, добра купляць што-небудзь, выплачваючы ўсе грошы адразу, а не ў працягу даўжэйшага часу.

Моцна цісну руку Тваю — адданы Табе *Алесь С.*

P. S. Калі трапіцца вольная часіна, прыязджай у Адэлаіду, усе мы будзем вельмі рады Цябе бачыць.

111. АЛЯКСЕЮ ГРЫЦУКУ

24 лістапада 1949 г., Адэлаіда

Дарагі дружа Аляксей!

Бяруся за гэты ліст са страхам перад табою: пэўна ж, ці раз ты лаяў мяне за адыйсце на «вечны супакой». 9 снежня споўніцца шэсць месяцаў майго жыцця ў Аўстраліі, а я яшчэ ні слова табе не напісаў. У Аўстрыі быў я ў бядзе (няшчасны ДП!), атрымліваў ад цябе дапамогу з Канады. У Аўстраліі ж «разбагацеў» («new australian») і замоўк навекі — сябры, ведама ж, толькі ў горы… Дзеля Бога, не падумай гэтак, як пішу. Прычына майго даўгога маўчання зусім не ў гэтым.

(Прычыны, казаў той, заўсёды знойдуцца, таму абмяжуюся парай словаў: толькі апошнім часам агоўтаўся і магу што-небудзь пісаць.)

Працую пры аўстралійскім войску ў месце Adelaide (ад самага пачатку — з 30 чэрвеня). Adelaide is the capital of sauth Australia. Праца мая вельмі лёгкая. Што менавіта раблю — я й сам не ведаю (у гэтым дачыненні мне, як гультаю, вельмі пашанцавала, навет шкадую, што пры войску няма овэртаймаў — у Аўстраліі толькі саракадзінны рабочы тыдзень). Зарабляў напачатку 6 фунтаў 2 шыл. за тыдзень (ад вылічэнняў за ўтрыманне мяне й сям'і, бадай, нічога не заставалася; каб жыў разам з сём'ёй, то праядаў бы ўтрая менш, і былі б больш сытымі). Ад 1 жніўня зарабляў 6 фунтаў 18 шыл. Ад 20 лістапада буду ўжо зарабляць 7 фунтаў 4 шыл. і 10 пенсаў на тыдзень. Напачатку мая сям'я жыла за 680 міляў ад мяне і знаходзілася ў найжахлівейшых умовах. Цяперака жыве бліжэй — за 26 міляў (меў ці мала клопату, пакуль яе туды перацягнуў). Бачуся з сям'ёй пераважна два-тры разы на месяц (ездзіць часцей — і заашчаджанняў маіх не выстарчыць). Сям'я жыве на ўсім гатовым (у сямейных табарах у Аўстраліі інакш жыць не дазваляецца), а таму й заробак мой ляціць, як у прадонне.

Напачатку я нічога не меў у Новым Свеце. Цяперака стаўся собснікам зямлі ў Адэлаідзе за 67 фунтаў (18 метраў ушыркі і каля 50-ці ўдоўжкі, правільней — 60 футаў на 150). За собскасць выплаціў ужо 13 фунтаў. Рэшту запазычанасці мушу пакрыць да 3 снежня 1950 года. Адзінае, што я магу цяпер з вялікай цяжкасцяй заашчадзіць, — гэта пакрыццё запазычанасці за зямлю. А гэная зямля — няўхільная патрэба. Як скончыцца кантракт, хоць будзе дзе паставіць шатро, каб сям'я не апынулася пад адкрытым небам.

Адэлаіда — самая найлепшая мясціна ў Аўстраліі паводле клімату. Нашыя беларусы, што ўжо канчаюць кантракт, маняцца перабрацца сюды. Мяне раней палохала «дзевяцімесячная» гарачыня ў Паўдзённай Аўстраліі, але ўжо жыву тут пяць месяцаў і гарачыні яшчэ не бачыў. Ужо вясна, навет канец вясны (са снежня пачынаецца лета), а ўдзень працую ў марынарцы. Ноччу ж — мерзну пад чатырма салдацкімі коўдрамі ў бараку. Улетку, апавядаюць, хоць і пячэ сонца, але ад прахалоднага ветру ў полі халаднавата.

Пішы мне, дарагі дружа, і не гневайся за маё маўчанне. Якія ў цябе навіны і наагул, што ў цябе чуваць? Здаецца, вы пачынаеце выдаваць друкаваную газету ў Канадзе і збіраецеся будаваць Беларускі дом? Віншую! У гэтым дачыненні ў Канадзе шмат лягчэй, чымся ў Аўстраліі.

Паведамі мне, калі ласка, адрас Міколы Ганька. Перадай найсардэчнае прывітанне Б. Аляксандраву. Напішу яму неўзабаве. Прывітанне ўсім сябрам.

Цалуюць цябе Міхаська й Ганучька, моцна цісну руку тваю.

Твой сябра — *Алесь Салавей.*

112. МІКОЛУ ГАНЬКО

4 снежня 1949 г.

Дарагі Мікола!

Два дні таму атрымаў з Квінслэнду вашу першую друкаваную газету «Беларускі эмігрант» і даведаўся з яе аб Тваім новым адрасе. Найперш вітаю Цябе з высокім становішчам старшыні Беларускага выдавецкага фонду. Цяперака — як ні кажы — Тваё імя не абміне найсвятлейшых балонкаў нашай гісторыі. Віншую і моцна цісну руку Тваю!

Перад атрыманнем «Беларускага эмігранта» я нават не сніў аб вашых найвялікшых поспехах у Канадзе. Вы ўжо адпрацавалі няволю-кантракт, вы ўжо вольныя людзі, вы цяпер яшчэ больш адданыя будаўнікі вольнае Бацькаўшчыны, нястомныя й самаахвярныя будаўнікі. Вы ўжо заклалі фундамент пад Беларускі дом, вы выдалі першую друкаваную газету ў Амерыцы. Вы забілі клін у сівую Еўропу, дзе не можа ніяк уваскроснуць даўні нябожчык з імем «Навіны», дзе ў перадсмяротных сутаргах канаюць заўчасна састарэлая газета «Бацькаўшчына» і вечна зялёнае недаросце «Беларус на чужыне» (нават нашыя колішнія слёзы «З беларускага жыцця» і «Пагоня» ледзь не былі клінам для Францыі — мы ж не зараблялі тады нічога, і чытачы нас не маглі падтрымаць).

Мне вельмі сумна і балюча, што я не трапіў з Табой і Аляксеем у Канаду. Там невялікі кантракт няволі, а пасля кантракту я змог бы далучыцца да вас, да выдавецкае працы. А тутака чакае мяне маркота ў адзіноцтве, якое абязвольвае і сілу, і ахвоту што-небудзь пісаць.

Першыя недахопы вонкавага выгляду вашае газеты і тэхнічнага фармавання ў далейшым зgладзяцца, у працэсе наступнае працы змогуць паправіцца. «Роднае слова ўсцеражэ нас не толькі ад нацыянальнай смерці, але й асабістай маральнай, а мо й фізічнай...» Няхай жа гэтае слова ў вашай газеце будзе прыгожым літаратурным беларускім словам. Абмінайце не нашыя й брыдкія — «кумекайце», «машэнцаў»

і г. д., а таксама — «занавесай», «у прошласці», «узложаныя» і інш. («заслонай», «у мінуўшчыне», «ускладзеныя»).

Я падпішуся на «Беларускі эмігрант», перасылаўшы грошы тутэйшаму кальпартэру. На Тваю ўстанову — на Прэсавы фонд — змагу паслаць у далейшым, як толькі пазбаўлюся цяжкога грашовага стану, выкліканага купляй месца, дзе некалі трэба будзе прытуліцца пад новымі зорамі ў далёкім свеце.

Жадаю Табе вясёлых Калядаў і шчаслівага Новага году. Зычу найпамыснейшых поспехаў у працы й жыцці — у грамадскім і асабістым. Прывітанне ўсім.

Яшчэ раз моцна цісну руку Тваю, Твой — *Алесь.*

113. МІКОЛУ СКАБЕЮ

12 снежня 1949 г., Рэнмарк

Дарагі сябра Мікола!

Ужо тыдзень знаходжуся ў прыгожым Рэнмарку на беразе ракі Мурэй. Жывецца мне тут няблага, працуецца няцяжка. Падарожжа на аўце ў матэль на сняданне, полудні і вячэры трывае больш, чымся сама праца. Але тым часам у бараку, што будуем, неяк вырасла аснова, паслалася падлога, сяння паставілі сцены і кроквы пачалі ставіць. Адно крыху непрыемна: «ад ветру» гнуцца цвікі, якія даводзіцца забіваць, і нават сорамна, калі цікаўныя аўстралійцы, што прыходзяць паглядзець на нашу работу, бачаць, як гэныя цвікі гнуцца — і ў мяне са лба ўжо пот халодны капае!

У мінулы панядзелак, як я даведаўся ў нядзелю ўвечары, вярнуўшыся з Вудсайда, меўся выехаць часова на працу за 80 міляў ад Адэлаіды і доктар Мілянцэвіч. Доктар збіраўся напісаць да Цябе, але на ўсялякі выпадак прасіў мяне напісаць, што ён не зможа прыехаць на свята ў Мельбурн.

У суботу я сумаваў, блукаў уздоўж Мурэю і не знаходзіў сабе месца. А ўчора не вытрымаў і пайшоў у заробкі да фермера. Восем гадзінаў працаваў у апельсінавым садзе пад спякотным сонцам, без гарбаты, без цыгаркі. Як сагнуўся а дзевятай уранні, дык ажно ўвечары а пятай гадзіне разагнуў спіну. Працаваў, як кажуць расейцы, «по совести», ажно, як разагнуўся, зямля перакруцілася ўваччу дагары нагамі. Гаспадыня адвезла мяне на аўце дахаты і заплаціла

за працу 12 шылінгаў. Я вярнуў ёй гэтыя грошы, шчыра падзякаваў і сказаў, што працаваў не дзеля грошай, а дзеля свайго часу, дзеля прыемнасці.

А сяння (о гора мне!) праз пошту прыйшоў на мой адрас адзін фунт. І я распісаўся за яго, гэтым разам не адмаўляючыся праз няўцям ад майго ўчарашняга «задавальнення». Вельмі дзіўна — грошы прыйшлі на «містэра Альберта», і «містэр Альберт» атрымаў іх без прозвішча.

Вось і ўсе мае навіны на новым месцы.

Моцна цісну руку Тваю — *Алесь.*

114. МІКОЛУ СКАБЕЮ

20 снежня 1949 г., Рэнмарк

Дарагі сябра Мікола!

Ужо аджываю апошнія дні свае камандыроўкі. На свята выеду ў Адэлаіду. Пасвяточная праца ў Рэнмарку, калі давядзецца мне паехаць, будзе трываць шэсць тыдняў.

Твой ліст ад 11.12.1949 г. (шчыра Табе дзякую) атрымаў. Ужо прыбліжаецца 26.12.1949 г. — дзень, калі збяруцца нашы сябры (усе вы) у Мельбурне, шчыра жадаю вам самых найлепшых удачаў! Ты ўспамінаеш аб маіх прапановах — гэта былі павярхоўныя згадкі майго пагляду на пэўныя рэчы, і іх не трэба ўважаць за прапановы. Што да праекту нашае працы, то ён, пэўна ж, даўно напісаны больш дасведчанымі ў гэтай справе людзьмі, чымся я. Што ж я магу дадаць да яго? «З чаго пачынаць?» — паўтараю Твае словы і пачуваюся абавязаным таксама адказаць на гэта пытанне. Зразумела, калі б не было ў нас каму яго развязаць, я шукаў бы адказу на яго як мог бы і ўмеў…

Яшчэ адна толькі невялічкая згадка: пэўна ж, у нас будуць усе роўныя і абмінецца дзяленне на адных і іншых, як гэта было і ёсць у Еўропе.

Прэсу ад сп. Дзедаўца атрымліваю. Маю ад яго ўсё. Вельмі дзякую Табе за тое, што Ты раней мне прысылаў, і заўсёды буду рады адудзячыцца. Па святах я разлічуся за ўсё Табой перасланае. Гэта ж Табе каштавала, а цяпер для мяне не ёсць ніякай цяжкасцяй пакрыць гэтыя кошты.

Айца Шчурка не бачыў у Вудсайдзе, але чуў ад людзей аб ягоным прыездзе.

Ад зямлі не адмовіўся. У адным толькі клопат: апрача чатырохфунтовай сумы на месяц, што цяпер выплачваю, вымагаецца адначасна ўвесь разлік за паперы (афармленне). Таму я й разгневаўся напачатку за тое, што не быў папярэджаны аб гэтым пры куплі. Але з Божай дапамогай і гэты, не вельмі ўжо вялікі клопат, мінецца.

Жадаю шчаслівых і вясёлых святаў, здзяйснення наважанага і поспеху ўва ўсім.

Прывітанні сябрам, моцна цісну руку Тваю — *Алесь С.*

115. АЛЯКСЕЮ ГРЫЦУКУ

[1949]

Дарагі Аляксей!

Канчаецца восень, і ў дзверы стукаецца зіма. У маім жытле холадна, хоць кажух ускладай (шчаслівы той, хто прывёз яго з Еўропы). Гэта змусіла мяне спаважней задумацца над аббіццём жытла з сярэдзіны. Хацеў хоць на адзін месяц, апрача працы ўдзень, знайсці якую-колечы працу ўначы. Але nic z tego nie wyjshlo. Навет і тую працу, што маю, неўзабаве магу страціць, бо беспрацоўе — на самым носе. Овэртаймаў даўно няма. А саракагадзіннага заробку ледзьве стае на пражыццё... Зіма ў Вікторыі вельмі мокрая і гнілая. Марозы на Беларусі так не дакучаюць, як тутэйшая слата. Драўляныя дамы (дошка — на дошку) хаваюць чалавека толькі ад дажджу. А нутраное аббіццё гэтых дамоў азбеставымі, гіпсавымі або папярова-драўлянымі плітамі засланяе ад ветру і часткова ад холаду. Вятры на Беларусі ў Піліпаўку не бываюць гэткімі дзікімі і дакучлівымі, як тут — ці то холад, ці то гарачыня.

Твой ліст атрымаў тры тыдні таму. Дзякую за яго, а насамперш за прапанову выдаць што-небудзь з маіх твораў. Мне думаецца, што ні зборнік, ні драма не адпавядаюць нашай эміграцкай кішэні. Усё ж, як ні кажы, гэтыя рэчы абымаюць па сем друкаваных аркушаў. Паэма «Надзея» (на 3 друк. арк.) яшчэ сыраватая, і я хацеў бы, каб яна паляжала тры-чатыры месяцы. Яна разлічана на асобную самастойную кніжыцу. У далейшым яе вышлю. Можа, і пашчасціла б выдаць? Але хоць у «Беларускім эмігранце» пашчасціла б надрукаваць... Яна заняла б паўтары газетныя балонкі. Цалкам была б на месцы ў газеце на 6 бал. — з літаратурным дадаткам.

Зіна перасылае табе прывітанне і найлепшыя пажаданні ўдачаў у тваім жыцці. Пачувае сябе цяпер не вельмі блага. Дзеці і цешаць, і дакучаюць — доля жаноцкая. Старая вайна з холадам ды славутае кашаварства і вадагрэйства на мізерным прымусе. Гэты ж апошні «люксус» мае цесную лучнасць і з беларускім карытам — у ім мусіць змясціцца не толькі Юрачка (так завецца найменшы), але і сам вялікі тата. Гэта ўсё, ведама, не павінна засланяць вочы жанчыне і ад вялікага «чыну». Што ні кажы, ёй, мабыць, давядзецца чытаць рэферат на Свяце Маці ў наступную нядзелю. Поспехі! Тут і мая асоба ледзьве адкараскалася ад дэкламацыяў. Не абышлося і без думнае водпаведзі: «Калі няма каму дэкламаваць апрача мяне, дык і няма каму слухаць».

Пасылаю ў гэтым лісце і пару вершаў са зборніка. На скарачэнне цыклю (з якога-небудзь гледзішча) не пагаджаюся. Калі б гэта надрукавалася, прышлі аўтарскі паасобнік паветранай поштаю.

Шчырыя прывітанні Міколу Г[анько], Барысу і ягонаму бацьку.

Дзякую за фатаграфіі.

Вельмі цікавы сакавіковы нумар «Беларускага эмігранта». Жыве Віцьбіч!

Цісну руку — *Алесь Салавей.*

116. МІКОЛУ СКАБЕЮ

24 студзеня 1950 г.

Дарагі сябра Мікола!

Ужо другі тыдзень жыву й працую ў Вудсайдзе. Войска адбывае манеўры, і я маю тут добрую працу — езджу на джыпе, праўда, не за шафёра, а за звычайнага ездака-абібока. Праз дзён дзесяць вярнуся ў Адэлаіду. У Рэнмарк пасля святаў не давялося паехаць — балела ў мяне рука, нават была апухла.

Ліст Твой надышоў даўнавата. За гэткае доўгае маўчанне дазваляю мяне павесіць.

Дзякую за ведамкі з нашага агульнага жыцця. Вырашаным у Мельбурне задаволены. Сумна, што А. Калодка ў цяжкім для яго здароўя стане паехаў у Мельбурн. Як маецца ён цяпер?

Не ведаю, ці сумаваць, ці цешыцца тым, што Ты ўжо скончыў кантракт. Бо пасля кантракту, бадай, тое самае, што было й раней. Праўда, волі больш і развязаныя, здаецца, рукі. Прынамсі, цяпера-

ка магу парадзіць Табе атайбавацца ў месце майго будучага «кастэлю», нават жыць на маёй цяперашняй «собскасці». Сяння запланавана будаваць на ёй у далейшым невялікую Беларусь з жыхарствам у чатыры асобы. Успамінаю Твой жарт пра кватэру ў маім будучым «кастэлі» і кажу зусім сур'ёзна, што з Табой гэта Беларусь мела б ужо пяць асобаў і шмат мацнейшай была б. Разбіраючы гэтае пытанне шырэй і маючы наўвеце агульнасць імкненняў усіх жыхароў аднаго гаспадарства, можна было б у выпадку патрэбы зрабіць дзве акругі, скажам — Менскую і Віленскую (а гаспадарства заставалася б тым самым). І што Ты скажаш на ўсё гэта?

Цяпер жа дазволь мне пагаварыць аб іншых важных справах і прабач за тое, што не ўмею гаварыць аб іх добра і падрабязна. Маю наўвеце таварыства, клуб або, прыкладам, праваслаўнае брацтва, што выконвала б ролю нашае грамадскае арганізацыі ў S[outh] A[ustralia]. Мы ўжо гутарылі аб гэтым. Калі а. Міхал [Шчурко] застанецца тут, дык праваслаўнае брацтва, мне думаецца, было б на месцы. Нічога канкрэтнага яшчэ не вырашылі. Трэба, каб выявіўся сярод нас адзін ініцыятар і паставіў на ногі тое, што манімся паставіць. Я цэлю на інжынера Трысмака і наступнага разу вазьмуся за ролю падбадзёрвальніка...

Мяне хрысцілі ў каталіцкай царкве, і я абыходжу свята паводле новага стылю. Сёлета святкаваў на заробках пры цэменце каля Вудсайда. Тваё вельмі цёплае святочнае прывітанне было для мяне вялікаю ўцехаю. У часіны гэтае ўцехі быў я ў думках з Табою і ўзаемна зычыў Табе ўсяго найлепшага: удачаў у жыцці й працы, здзяйснення таго, аб чым штодзённа летуцееш. Жадаю Табе гэтага й цяпер.

Разам з гэтым лістом пасылаю на добрую памяць новы свой верш — адзін паасобнік для Цябе, а другі — для А. Калодкі.

Моцна цісну руку Тваю — адданы Табе *Алесь С.*

Таксама дзякую і за ліст ад Лашука. У чацвер — якраз свята — адпішу яму.

117. АЛЯКСЕЮ ГРЫЦУКУ

24 студзеня 1950 г.

Дарагі Аляксей!

Цяпер я знаходжуся часова на працы ў тым жа табары, дзе жыве мая сям'я (26 міляў ад Адэлаіды; палавіну табару займае войска).

Твой ліст са зваротным адрасам застаўся ў Адэлаідзе — забыўся ўзяць з сабою. Ніяк не змог прыпомніць адрас, а таму й пішу табе ў лісце да Міколы Г. Думаю, што за гэта на мяне не пакрыўдзішся.

Ліст твой вельмі мяне ўсцешыў. Сам ведаеш, прыемна атрымаць ведамку ад сябра, ад блізкага чалвека, з якім даўжэйшы час давялося разам жыць і працаваць. І, пэўна ж, трэба спадзявацца, што і ў далейшым будзе паміж намі цесная лучнасць… Сардэчна дзякую за цёплыя святочныя прывітанні й пажаданні. Задаволены, што хоць адзін мой верш табе спадабаўся («Сын»). Некалі я чытаў яго табе ў Глязэнбаху — гэта было перад тваім ад'ездам у Канаду, у развітальныя гадзіны. Верш меўся друкавацца ў «Сакавіку», ён быў у А. Адамовіча. І як ён трапіў да гэнае «Ускалосі» (яшчэ не бачыў яе) — сам не ведаю. З тваёю заўвагаю, што да «memento mori», не пагаджаюся. Праўда, гэты выраз («памятай аб смерці») нарадзіўся як перасцярога, але па-за сваім нараджэннем часта ўжываўся і ўжываецца такса-ма ў сэнсе, падобным да кону, інакш, хай навет і груба кажучы: «не абмінеш тае часіны, калі давядзецца ногі выцягнуць».

Сям'я беларусаў у Адэлаідзе пабольшваецца. У суседстве са мною жывуць і разам са мной працуюць д-р Мілянцэвіч і а. Міхал Шчурка — упаўнаважаны Беларускае аўтакефальнае царквы ў Аўстраліі (а ўсё ж хітравата ўсміхаецца пры словах: «Епіскап Васілі…» — а мне гэта і даспадобы). У месце жыве й працуе і інжынер Трысмак. Ёсць ці мала сялянаў з Палесся, з Меншчыны, з Наваградчыны.

Збіраемся закласці таварыства пад выглядам праваслаўнага брацтва або спартовага клуба. Найбольшы беларускі асяродак будзе, мабыць, у Мельбурне. Шмат нашае інтэлігенцыі з першых транспартаў ужо не мае кантрактаў.

Атрымаў і другі нумар друкаванага «Беларускага эмігранта». Трымайцеся, хлопцы! Шчасці вам Божа! Буду пісаць у газету ў далейшым. Цяпер жа ўсё яшчэ сяджу над ангельскай мовай. Гавару ўжо збольшага і заяву-просьбу суседа магу да «эмігрэйшэна» напісаць, але шмат яшчэ трэба вучыцца.

Прывітанне Б[арысу] А[ляксандраву] і ягонаму бацьку.

Моцна цісну руку тваю — *Алесь Салавей.*

118. МІКОЛУ ГАНЬКО

30 студзеня 1950 г., Вудсайд

Дарагі дружа Мікола!

«Беларускі эмігрант», што выдаецца пад тваім адміністратарствам, дасягае ўсё большых і большых поспехаў — сяння я ўжо атрымаў трэці друкаваны нумар ад 1 снежня. Ведама, на плячах адміністратара заўсёды ляжыць больш клопатаў, чымся на плячах самага найвышэйшага рэдактара. Дык жа каго, калі не цябе, трэба прывітаць у першую чаргу з гэнымі поспехамі? Усе ж бо б'юць нізкія паклоны рэдакцыі і рэдактару, а пра адміністрацыю й адміністратара — ні гу-гу. Але ты не бяры ўвагі на гэта — затое гісторыя не забудзецца сказаць свайго праўдзівага слова…

І за ліст, і за добрыя словы, і за цёплае святочнае прывітанне — шчыры табе дзякуй. І за газету дзякую — яна ж пайшла з тваіх рук праз нашага кальпартэра (кальпартэрам дзякаваць не даводзіцца — яны не адрозніваюць паху паперы ад паху літараў на ёй). І тут яно, наша роднае слова ў тваёй газеце так і прамаўляе да мяне ў мосяжных палях — ужо тры тыдні я не ў месце, і толькі праз месяц вярнуся назад. Тут жа, дзе цяпер часова працую, жыве і мая сям'я. Войска адбывае манеўры, а суботы й нядзелі яго на манеўрах няма, таму я маю й овэртаймы (за суботу й нядзелю, па 8 гадзінаў — 4 ф. 16 шыл.). Езджу з начальствам на джыпе, адчыняю й зачыняю вароты бясконцых фермерскіх, абгароджаных дротам, палёў. Мне застаецца жадаць, каб мой кантракт цягнуўся як мага даўжэй. У мінулым лісце я меў наўвеце кантракт у Канадзе, у лесе і ў фермера, куды толькі й бралі з Еўропы.

Твой маленькі суродзіч Міхаська яшчэ ўсё памятае чырвонае аўта, гаворыць добра не толькі па-беларуску, але і па-ангельску — лепш за мяне і перасылае табе прывітанне.

Алесь Салавей.

119. МІКОЛУ СКАБЕЮ

10 лютага 1950 г., Вудсайд

Дарагі сябра Мікола!

Яшчэ ўсё жыву і працую ў Вудсайдзе і ўжо нават не ведаю, калі вярнуся ў Адэлаіду. Твой ліст надышоў учора ўвечары. Дзякую за яго

і вельмі сумую, што няхутка, мабыць, давядзецца нам пабачыцца. Але тым часам дзякаваць Богу, што «акругі» нашыя, магчыма, будуць, як Ты пішаш, хоць у двух штатах-суседзях. Як разбагацеем, тады ўсё ж які-небудзь раз на год зможам бачыцца. Без гэтага сяброўства пагасае. А з гэтым — і пры далёкай адлегласці яно мацнейшае, чымся, скажам, у адной хаце.

Планы — планамі, размовы — размовамі, але на які бераг выкіне нас жыццё, да сянняшняга дня неўсталяванае і неўнармаванае, — аднаму Богу ведама. Сабрацца ўсім у адну сям'ю, калі давядзецца застацца на чужыне, — аб гэтым, здаецца, толькі я летуцеў у сваіх лістах. У сапраўднасці ж бальшыня атайбоўваецца там, дзе ўжо сяння кладзе першыя цагліны свайго далейшага быцця, — гэта няўхільнасць. Таму няма сумніву, што сярод нас знайшоўся цвярозы розум, які вырашыў: каб Бацькаўшчына не была хутка забытай на чужыне, патрэбен задзіночаны цэнтр, з якога пульсавалі б ажыўчыя сілы да ўсяго нашага нацыянальнага арганізму ў Аўстраліі. А ля гэтага цэнтру, бясспрэчна, згуртуецца найбольш суродзічаў — актыўных і сведамых. Вось для чаго мусілі б найперш снавацца мае планы. Застацца асабнём у бяздзейнасці — гэта не што іншае, як пайсці на вечны супакой.

Ведама ж, сцяжынкі кагадзе ўспомненага цэнтру павядуць ад тых клубаў ці брацтваў, аб якіх мы ўжо гутарылі. Але, шчыра прызнаюся, я яшчэ нічым не спрычыніўся да гэтага. Д-р М[ілянцэвіч], інж. Т[рысмак], а. М[ікалай] вызначылі чарговыя зборы ў Адэлаідзе на мінулую пятніцу. На зборах я не быў, бо ў пятніцу вярнуўся з манеўраў не а 3-яй папалудні, як мне абяцаў капітан К. ураннi, а а 9-ай увечары — з 4-ма гадзінамі овэртайму. У суботу я не паехаў у Адэлаіду, бо ні доктара, ні інжынера ў гэты дзень нідзе не знойдзеш. Заўтра мо пабачу тут а. М[ікалая] і мо даведаюся ад яго што-небудзь.

Словам, і тут напрошваецца стары выснаў: як заўсёды, нічога не робім, а вельмі шмат гаворым аб грамадскай працы і аб розных ахвярнасцях. Выгляды ў нас заклапочаныя (жартачкі, думаем спачатку аб Бацькаўшчыне, а толькі пасля аб сабе), і, казаў той, за соль і пуп зямлі ўважаем сябе там, дзе ад графаманскага «чыну» й «справы» адзін толькі попел сыплецца. Прыкра мне, што я пішу й думаю аб гэтым. Калі быў заняты раней літаратурнай працай, ведаў, што не бяздзейнік і што нешта раблю. Цяпер жа ведаю, што нічога не раблю, хіба толькі пачынаю пісаць «грамадскія» лісты.

Бальшыня найстарэйшых работнікаў-эмігрантаў у нас, пры войску, першы раз ступала па Аўстраліі праз Банагілю. Людзі траплялі ў гэты Reception and Training Centre ўзімку, калі ў дзюравых бляшаных бараках падчас замярзала вада. Па табары хадзіла пошасць дзіцячых хваробаў. Сем'і разлучаліся — усіх галоваў сем'яў пасялялі асобна. Потым іх спешна скіроўвалі на працу. Дзяцей і жонак сілаю выганялі ў сямейны табар за тысячы міляў ад іх бацькоў і мужоў. Які настрой мог быць у чалавека, што хваляваўся за лёс сям'і і не ведаў, у якіх умовах іх пакінуў? А зарабляў ён напачатку вельмі мала і цэлага паўгоду біўся, пакуль яму пачалі выплачваць 7 фунтаў і 5 шыл. на тыдзень.

Параўнальнае палажэнне ў Аўстраліі з палажэннем у Сібіры мала супакойвала, і найбольш нервовыя хапіліся за зямлю — гэту магілу ўсяго жыцця й сілаў, стаўлялі шатры, сцягвалі туды з розных Коўраў сем'і. Трэба нешта будаваць. На гэта патрэбен час і грошы. І шмат хто будуецца, працуючы суперстаханаўскім тэмпам — і на фабрыцы для грошай, і для сябе на будоўлі. Усё роўна спакою і на гэтым не будзе. Места — не сяло. І ў будцы, здабытай крывавым потам, доўга не наседзіш. Трэба будзе брацца за добрую хату, запрагаючы ў працу й дзяцей — куды там школа! Гэта шмат лягчэй, чымся ў Еўропе, хіба таму, хто тут нарадзіўся. Ненароджаным тут, як Ты добра ведаеш, з будаўніцтвам шмат цяжэй. Вось у каго бяда, і яна будзе ў кожнага пасля кантракту й табару. Тым часам табар — яшчэ не гора.

Асобу, аб якой Ты ўспамінаеш у лісце, лёс скіраваў проста з вадаплаву ў нехалодны і неспякотны Вудсайд, у светлы і добра дагледжаны табар. Яна адразу трапіла адбываць кантракт пад бокам свае сям'і — у самую Адэлаіду. Асоба атрымала лепшую ўва ўсім свеце працу пры бібліятэцы. Ейны начальнік сяржант-маёр С. даручыў ёй неблагі абавязак — вывучаць на працы ангельскую мову. Асоба і вывучае яе беспаспяхова, ад самага пачатку атрымліваючы за гэта 7 фунтаў і 5 шыл. на тыдзень. За ўтрыманне сям'і ў табары плаціць трэцюю частку, рэшту выдаткаў пакрывае дзяржава. Таксама штомесяцу атрымлівае 12 фунтаў дзяржаўнай дапамогі, і, як бачыш — вялікага страху няма, ён будзе хіба ажно пасля кантракту. Але і тады, трэба думаць, дапаможа дзяржава, адпусціўшы фальварачак за невялікую кватэрную плату.

Летуценні ж аб сянняшнім фальварку ў Мельбурне — гэта, мабыць, нейкае заблуджэнне розуму. Твае спробы вывесці гэныя заблуджэнні на «истинный путь», здаецца, вельмі не ўгнявілі асобу, на-

адварот, зрабілі яе самую ў ейных вачах яшчэ большай пакутніцай «шматгаротнае Маці-Бацькаўшчыны — Беларусі». Праймацца гэтымі пакутамі і невялічкім гневам, што ўжо астыг, не варта.

Грошы на апошні нумар «Бацькаўшчыны» — гэта ледзь не тое самае, што й прэзэнты, аб якіх Ты пішаш. Ад апошняга нумару не будзе выглядаць уваскрэслай гэтая газета, узнятая на адпаведную вышыню А. Адамовічам і дакананая і пахаваная доктарам Ст[аніславам] Ст[анкевічам] — гэтым, можа, і нядрэнным навукоўцам, а ў палітыцы і публіцыстыцы — таталітарным графаманам, артыкулы якога мала адрозніваюцца паводле духу ад перадавіцаў савецкае «Звязды». Розніца ў адным: «Звязда» падыходзіць да справы з камуністычнага гледзішча, а д-р Ст[аніслаў] Ст[анкевіч] — з нацыянальнага.

У дакананні «Бацькаўшчыны» (у сэнсе зместу) спрычыніўся і інж. Т[амашч]ык. Я ўжо пісаў, здаецца, аб гэтым. Я ніколі не адмаўляў у адданасці і ахвярнасці «Бацькаўшчыне» з боку апошняга; з гэткай ахвярнасцяй і адданасцяй ён мог бы нават стаццца нацыянальным героем тыпу К. Каліноўскага, каб даў яму Бог больш розуму. А так можа выбіцца толькі ў святыя 20 стагоддзя (чаго толькі не бывае ў гэты час нечаканасцяў і неспадзеўкаў). Яго я ведаю асабіста і свайго часу ці раз спатыкаўся і гутарыў з ім. З кругаглядам гміннага пісара альбо сельсавецкага палітрука. У грамадскай дзейнасці ён хварэў на кругагляд самога ваяводы або самога «бацькі». Каб ён быў увесь час на сваім месцы, нічога іншага, апрача добрае думкі аб ім — ахвярным і адданым — у мяне не было б. Ува ўлонні БАПЦ — гэта ці не адзін з найпісьменнейшых беларусаў, якія былі дагэтуль…

Не беручы ўвагі на собскі пагляд, што да апошняга нумару «Бацькаўшчыны», я заўсёды гатоў падтрымаць справу сяброў сваіх. Пасылаю тут на гэта 10 шыл. Прабач, што пасылаю гэткую невялічкую суму. Даруй таксама, што дагэтуль не пераслаў даўно абяцанага разліку за прэсу. Апошнім часам меў шмат выдаткаў. Заплаціў за афармленне зямлі, чарговы месячны ўклад, былі і іншыя няўхільныя выдаткі. Каб не пабочныя заробкі, за два месяцы не выдаткаваў бы сумы, што магу сабраць за 4 месяцы. Але цяпер клянуся барадой свайго прадзеда, што праз 4 тыдні абавязкова разлічуся за прэсу, і гэта для мяне ніякая не цяжкасць. Ёсць у мяне яшчэ 10 шыл., іх пасылаю для падпіскі на «Беларускі эмігрант».

Ці яшчэ ў Брысбене Дзедавец? Ці не мог бы Ты мне прыслаць для цікавасці «Беларускае слова»? Прачытаўшы, я вярну Табе.

Кагадзе бачыў айца М[ікалая]. Чарговыя зборы ў наступны чацвер. На іх ужо, здаецца, нешта вырашыцца. У чацвер усімі сіламі пастараюся трапіць у Адэлаіду. Аб ахвярах на «Бацькаўшчыну» пераказваю праз а. М[ікалая]. Айцец — патрыёт і вельмі ахвярны, гэтага нельга адмовіць. Прэзент ён набыў і паслаў за свой кошт. Не шкадуе собскіх грошай і на ўсё патрэбнае для царквы. Заўтра ён правіць Божую службу для праваслаўных беларусаў і ўкраінцаў у Вудсайдзе. Летуцее аб набыцці пляцу пад царкву.

Для ўкраінцаў ужо некаторыя цагельні ахвяравалі невялікую колькасць цэглы (дармова).

Сяння капітан К. падараваў мне за добрую працу пляшку піва і пляшку віна. Пад уплывам гэтых пляшак я і напісаў гэткі вялікі ліст. У надзеі, што мне за гэта прабачыш, я не нішчу яго і не пішу іншага, карацейшага.

У Аўстрыі я адзвычаіўся ўжываць алкагольныя напоі. Добра не прызвычайвацца да іх і ў Аўстраліі. Не адмовіцца ж ад падарунка і апаражніць яго за здароўе добрых людзей — можна, мне думаецца.

Моцна цісну руку Тваю — адданы Табе *Алесь С.*

120. МІКОЛУ ГАНЬКО

4 красавіка 1950 г., Вудсайт

Дарагі Мікола!

Ліст твой надышоў два тыдні таму. Вельмі табе дзякую. Усё ж, запраўды, прыемна атрымліваць ведамкі ад блізкіх людзей і адчуваць, што ты не адзін. Толькі тым часам хоць лістамі можам трымацца адзін аднаго.

Жыву па-ранейшаму. Здаецца, кантракт мой кончыцца на пачатку 1951 года — на паўгода раней. Значыцца, я ўжо адрабіў палавіну кантракту. Ужо цяпер трэба думаць пра будучы прытулак, пра тое, што прыкрывала б галаву пад небам. Але без 300 фунтаў, хоць напачатку, нічога не прыдумаеш. Як для мяне, на гэта патрэбна 4–5 гадоў (за зямлю ўжо выплаціў 59 ф. 5 ш. і 10 п.), яшчэ засталося 10 ф. і 4 ш. разам з процантамі і паперамі.). Пасля кантракту давядзецца зазнаць шмат бяды, пакуль не збудую хоць трэцюю частку дома, куды можна будзе пасяліцца. Усё гэта канчальна даб'е мяне і назаўсёды разлучыць з тым, чым жыў раней.

У Аўстраліі я не прадбачу арганізаванага беларускага жыцця ў далейшым. Абставіны змушаюць кожнага асядаць там, куды ён трапляе напачатку. Гэта ніколі не пазбавіць нас ад роскідзі. А ў роскідзі — наша пагібель.

Пішу тут адначасна і да С. Хмары. Перадай яму, калі ласка.

Прывітанне ад усіх нас, пішы — *Алесь Салавей.*

121. МІКОЛУ СКАБЕЮ

20 чэрвеня 1950 г., Вудсайд

Дарагі сябра Мікола!

Я ўжо не ведаю, як пачынаць гэты ліст і як выкручвацца ад заслужанае мною кары — застаецца мяне, хіба, толькі павесіць за... Аргументаў да апраўдання не маю ніякіх. Рукі апалі, апусціліся? У чалавека з нашчадкамі і з гэткай «забяспечанай будучыняй», як ты пішаш, яны павінны ўздымацца ўгору!..

Шкада, што не разумееш мяне і пасля нашага пабачання. Нашчадкі — гэта тое, што ёсць «забяспечаная будучыня», тое, што можа або не можа быць, але ж справа не ў гэтым, а ў тым, аб чым Ты сам думаеш і не спіш, а падчас адчуваеш, што сапраўды апускаюцца рукі ад гэных думкаў... Ці ж усцешыш чалавека тым, што толькі каменем кладзецца на сэрцы пры думках не аб нашым прыватным — не аб Тваім ці маім, — але аб нашай усіхняй будучыні? У кожнага — свая бяда, але па-за чыста асабістым — ува ўсіх нас яна аднолькавая.

Узаемавыказванні болесцяў і радасцяў — узаемадапамога і ўзаемападтрыманне, без гэтага не можа абысціся адчувальны беларускі характар (не раўня фанабэрліваму польскаму: «Салому жуй, а хвост угору трымай»)...

А па-за гэтым ні з таго ні з сяго наплылым на пяро ўступам даруй мне за маю цяжкую правіну — даўгое маўчанне. Нешта мне перашкодзіла адпісаць адразу на Твой ліст, а як адразу не адпішаш, тады, сам ведаеш, шукай прычыны да апраўдання.

Пішчом улез на працу у Вудсайд (ужо шэсць тыдняў як не быў у Адэлаідзе). Працую за кухара на кухні, дастаў лепшую кватэру. Зарабляю, здаецца, няблага. Як прыпадаюць да працы суботы й нядзелі — тады «выганяю» мала не 20 фунтаў на два тыдні. І без суботаў і нядзеляў маю на два тыдні 16 фунтаў. Але ў Адэлаідзе было

весялей — па-за ўсім нам ведамым там усё ж не дакучала гэтак наша рэчаіснасць і не быў там так адарваны ад свету…

Ніякіх лістоў і навінаў не маю (праўда, і сам не пішу). Дзе што робіцца — не ведаю. У кожную хвіліну магу вярнуцца ў Адэлаіду — тут сілком не трымаюць (цяпер працадаўца — не Dep[artment] Army, a Dep[artment] of Emigr[ation]). За зямлю ўжо выплаціў усе грошы і цяперака, як ні кажы, — собснік. І на банкавай кніжцы маю 21 фунт, а праз тыдзень буду мець 26. Як дараблюся да соткі — тады і сабачую будку можна будзе стаўляць ля кусцікаў…

Рукі варушацца, пішу і жыву тым самым, чым і дзяцька Цыпрон з Сіднею: «Павідамляю Вамачкі, што жыву няплоха, купіў зямельку ў Гаўстраліі і страіцельства начынаю і благадару ту Гаўстралію, што спасла мяне ад Еўропавага Сталіна…»

Варта ўкласці гэты ліст у купэрт, аднесці на пошту, а пасля прыгадаць тое, аб чым пісаў, — і застанецца кінуцца на ложак і выць па-воўчаму. Запраўды, цяпер я ўжо не сябра Алесь, а дзядзька Ляксандра: прыслаў мне Яцкевіч маркі Рады БНР на 9 шыл., а я купіў іх толькі на адзін шыл. — рэшту ж вярнуў назад.

Яшчэ раз сардэчна дзякую за Тваю чуласць да мяне і да нас у часе тут Твайго побыту. Прабач за ўсё, што было не гэтак, як мела быць. Дні, калі бачыўся і гутарыў з Табою, былі найсвятлейшымі днямі майго побыту ў Аўстраліі. Спадзяюся, што ў далейшым паправім тое, што было крыху не гэтак.

Як жыве А. Калодка? Як цяпер пачуваецца? Як здароўе? Якія навіны, што да выдання прэсы ў Аўстраліі? Ці склеіцца што-небудзь у Мельбурне? Прывітанне А. Калодку, сардэчнае прывітанне.

Моцна цісну руку Тваю — адданы Табе *Алесь С.*

122. АЛЯКСЕЮ ГРЫЦУКУ

24 сакавіка 1952 г.

Дарагі Аляксей!

Вельмі рады твайму лісту, дзякую за добрую памяць.

Гады прамінулі — маеш рацыю, але «надежды наши не сбылись». Дзякаваць Богу, што яшчэ хоць лістамі можам сябе пацешыць.

Шмат зменаў у маім жыцці адбылося апошнім часам. Цікавага — мала, няўцешнага — «поўныя рэзгіны», як пісала, здаецца, Арсеннева… Крыху

пісаў (дзякаваць Богу, яшчэ да Станкевічавага «натхнення» ў «Бацькаўшчыне»). Напісаў драму «Я хачу жыць», новыя раздзелы з аповесці «Пад нагамі гарыць зямля», пачатай яшчэ ў Зальцбургу; закончыў зборнік вершаў «Несмяротнасць» (актавы, санеты і александрыйскі верш). Гэта ўжо другі ненадрукаваны зборнік, бо маёй кнігі «Вянкі» так і не здолеў выдаць А. Адамовіч у Нямеччыне; ну і канчаю, здаецца, досыць вялікую паэму «Надзея», просіцца на пяро новая драма (напаўфантастычная) «На Захадзе навальніца», за галоўных герояў якое — ажно два прэзідэнты аднае неіснаванае дзяржавы.

А ў «рэзгінах»? Канец кантракту й выйсце з табару пад адчыненае неба змусілі былі мяне восем месяцаў таму падацца з вельмі прыхільнай паводле клімату Паўдзённай Аўстраліі ў сырую і парную Вікторыю (толькі тут можна было купіць крыху дрэва й дошак), збудаваць частку дому на паперы, а ў рэчаіснасці — сабачую будку, і пасяліцца ў ёй. Па будцы ходзіць вецер і гасіць святло газніцы, і дождж заходзіць у «хату» ў «госці»: яшчэ не забітыя зашчыткі пад «страхою». Да нутранога аббіцця будкі і да вады, можа, дараблюся ў наступным годзе, да ложкаў, сталоў і крэслаў — у пазанаступным (пагоня за далярамі, фунтамі і дамамі).

Жыву не ў асаблівай пашане сярод тутэйшага грамадзянства. Ты ж сам добра ведаеш, што неактыўнае адведванне нарадаў і сходаў, ухіленне ад жыцця грамадзянскіх арганізацыяў (розных «цоб-цобэ» ці Ц.О.Б. — Ц.А.Б.Э.), незахапляльны погляд на ролю і важнасць «справы» — гэта ўжо ледзь не здрада Бацькаўшчыне. Часта даводзіцца ўспамінаць цябе, адзінага, бадай, знанага мной дагэтуль грамадскага дзеяча — чалавека, перад якім можна было выказваць супрацьлежныя яму погляды, не псуючы пры гэтым сяброўскіх узаемадачыненняў.

Ці «адшылі» крыху дуркаватага Хм. ад вашай прэсы? Калі б там «заварочваў» наш Ганько — варта было б пасылаць пад ягонае адміністратарства што-небудзь у кожны нумар. Можа, і друкаваў бы паводле старога знаёмства? Вось жа, асцерагаючыся паўторна «закаласіцца» ў «Калоссі», тым часам абмяжоўваюся «актуальным» паўвершам-паўэпіграмай.

«Дадаткі» да ліста адначасна пасылаюцца.

Якія ведамкі мелі вы, што да мяне?

Прывітанне Барысу А[ляксандраву] і М. Ганько.

Прывітанне табе ад мяне і мае сям'і (усе, казаў той, жывы і здаровы).

Моцна цісну руку тваю — *Алесь Салавей.*

123. ЮРКУ ВІЦЬБІЧУ

13 траўня 1952 г.

Дарагі дзядзька Юры!

Мала не паўгода таму атрымаў Ваш ліст і быў яму вельмі рады. У той час я не меў магчымасці адпісаць Вам — жыў у вельмі неспрыяльных абставінах, працаваў каля 20-ці гадзінаў у содні: і на фабрыцы ўдзень, і пры пабудове вельмі сціплага даху над галавою ўвечары і ўначы (іншага выйсця не знайшоў). Цяпер маю больш вольнага часу. Але за адкладзенае раней цяжка было пазней узяцца. Прабачце мне, калі ласка.

Цікава было даведацца з Вашага ліста аб літаратурных навінах у ЗША. Сілу пісьменніцкай арганізацыі і пладавітасць творчае працы бачу ў выданні хоць аднаго сталага друкаванага часапісу, калі б была на гэта найменшая магчымасць.

Апошнімі гадамі напісаў тое-сёе. Друкаваць яго не маю вялікай ахвоты — усё гэта не тое, што мусіла б быць. Дазвольце хоць з даўно забытага зборніка «Вянкі» паслаць пару вершаў — можа, яны надаюцца да друку?

«Пагадненне Віцьбіч — Адамовіч» — гэта якраз і ёсць тое, аб чым я пісаў і Вам, і дзядзьку Антону яшчэ ў 1948 годзе. Я асабіста цешуся гэтай ведамкай і зычу вам абодвум яшчэ лепшых узаемадачыненняў.

Чытаў Вашыя новыя нарысы ў «Бацьк[аўшчыне]» і «Б[еларускім] Э[мігранце]». Жадаю поспехаў!

Працу маю нядрэнную. У бліжэйшым часе спадзяюся трапіць у лік беспрацоўных.

Дазвольце, калі ласка, пераслаць найшчырэйшыя прывітанні Вам і Вашай сям'і ад мяне і мае сям'і. Прывітанне ад М. Скабея.

З павbooжаннем да Вас — *Алесь Салавей.*

124. АЛЯКСЕЮ ГРЫЦУКУ

27 верасня 1952 г.

Даражэнькі Аляксей!

І гэтым разам сталася так, што не адразу адпісваю. Ветліва прашу прабачыць за гэта.

Аўтарскі паасобнік «Беларускага эмігранта», высланы праз паветраную пошту, атрымаў. Шчыра дзякую. Вершы надрукаваныя

старанна, але з апушчэннем «зы» не пагаджаюся. Пры неўсталяванасці правапісу пісьменнік мае большае права на напісанне гэтага, чымся рэдактар на выпраўленне.

Тваё здзіўленне, што да напісанага мною, крыху завялікае. Вось узяўся за паэму «Надзея», каб паслаць яе табе (уступ да яе ў «Бацькаўшчыне» скамечаны). Шмат чаго выкінулася і нямала дапісалася. З трох друкаваных аркушаў выйшла чатыры — і я зноў паклаў паэму на адлежванне. Тое самае чакае і рэшту напісанага (трынаццаць вершаў з «Несмяротнасці» выкінуў, а на іхняе месца, каб кніжка засталася кніжкаю, трэба напісаць іншыя).

Адзін друкаваны аркуш — 16 балонак. Ёсць, зразумела, аркушы і большыя, і меншыя — што да памеру балонкаў (лік жа 16 бал. у адным друкаваным аркушы застаецца нез'іначаным). Я разлічваю толькі на такі памер балонкі, як у зборніку «Сіла гневу». На гэткай балонцы месціцца 7 страфаў (паэма «Надзея» ў цяперашнім выглядзе мае 430 страфаў — гэта й зойме 62 балонкі плюс дзве балонкі на тытул). Друкаванне вершаў у газеце патрабуе менш паперы, чымся ў кніжцы (у кніжцы — больш пустога месца, чымся запоўненага). Уступных словаў у сваіх кніжках я не люблю. Найлепш надрукаваць паэму ў газеце (спадзяюся цяпер паслаць яе праз месяцы два-тры) — за набор заплоціць рэдакцыя, як за матэрыял для газеты. Гэты ж, ужо дармовы набор можна будзе выкарыстаць і для кніжкі, і табе, як ейнаму выдаўцу, танней абышлося б. (Думаю, што надрукаванне двухтрох урыўкаў з паэмы ў «Бацькаўшчыне» не пашкодзіць гэтым планам.) А пазней, пасля паэмы, пабачылі б, ці ёсць сэнс выдаць яшчэ што-небудзь.

Верш «Астры» належыць пяру Олеся. М. Багдановіч пераклаў яго ў беларускую мову. (...)

Найпаўнейшае выданне, якое можаш дастаць на эміграцыі: Максім Багдановіч. Выбраныя творы. Дзяржаўнае выдавецтва БССР, Мінск, 1946. Гэтую кніжку мае тут М. Нікан (ягоны адрас ведае В. Жук-Грышкевіч).

Шчырае прывітанне ад мяне і сям'і.

Алесь Салавей.

125. У БЕЛАРУСКІ ІНСТЫТУТ НАВУКІ І МАСТАЦТВА

23 траўня 1955 г.

Ветліва прашуся ў прыймо да сяброў Беларускага інстытута навукі й мастацтва, калі надавацьмуцца да гэтага мае персанальныя дадзеныя, літаратурны стаж і г. д.

Адрас — унізе. Нарадзіўся 1 траўня 1922 года на Меншчыне. Асвета — несістэматычная. Друкавацца пачаў у 1937 годзе.

Галіна літаратуры, у якой жадаю паводле магчымасцяў працаваць, — паэзія.

Выдаў зборнікі вершаў «Мае песні» і «Сіла гневу», малую паэму «Звіняць званы Святой Сафіі». Напісаў зборнікі вершаў «Вянкі» і «Несмяротнасць» (кнігі яшчэ патрабуюць пераглядзінаў і папраўкаў).

Алесь Салавей.

Albert Kadniak,
12 Hook St [reet],
St. Albans, Vic[toria], Australia.

126. АНТОНУ АДАМОВІЧУ

[Верасень 1955 г.]

Даражэнькі дзядзька Антон!

Я не стрымаў свайго слова, прабачце мне. На мінулыя Каляды адпачынку не меў, і ў годзе «выкарыстаў» яго… грашыма.

Мае найлепшыя дары — вянкі —
Табе, правобраз хараства адзіны.
Хвалюеш ты таёмныя глыбіны
Душы мае, узнёслай у вякі.

Гэта самы пачатак. У мяне было раней: «Табе, красы правобразе адзіны». Я паправіў так, як пададзена вышэй. А як лепш — цяпер сам не ведаю. Па кароткім часе ўсё будзе лепш відаць і вычувацца. Радок «з мясцінаў, дзе ад змроку да відна» (вянок трэці) добра гучыць у сярэдзіне санета, напачатку, а ў канцы выйшаў «прылеплены». Паправа выклікае складаную камплікацыю і г. д. Хутка пашлю ўсё чысценька, ужо ўзяўся за яго і не манюся пакінуць.

У маіх вершах у часапісе Рыгор не дагледзеў пару мясцінаў. Надрукавана «ўзлётных» заміж «узлётны» (не ўзлётныя ветразі, а ўзлётны ўзвіў я меў наўвеце). Пад вершам стаіць дата 1940 заміж 1949. Пасля слова «бераг» у наступным вершы стаіць злучок заміж працяжніка. Пасля слова «глебе» — ізноў злучок, а не працяжнік (тут я сам крыху памыліўся — пасля слова «пешчы» мусіла б быць коска, зразумела, з працяжнікам перад ім). Ну й яшчэ адна памылка: «берегамі». У вершы «Згода», які хіба будзе надрукаваны ў «Бацькаўшчыне», у апошнім радку мусіць быць «веліч» заміж «радасць».

Пасылаю тут сёе-тое. Праз тыдзень пашлю яшчэ.

Сардэчныя прывітанні Вашым бацькам, Рыгору, спадару Тумашу і іншым знаёмым.

Цісну руку — *Алесь Салавей.*

127. АНТОНУ АДАМОВІЧУ

[Верасень 1955 г.]

Даражэнькі дзядзька Антон!

Седзячы над сваімі вершамі, пісанымі не са змусу, але з натхнення, я дакараю іх халодным змусам-розумам: паўторы, паўторы, паўторы… Маніўся перарабляць усё ад пачатку, і калі наважыўся — змус пачаў калечыць усё напісанае…

Думаецца ўсё ж, што кожны паўтор — гэта звязаныя між сабою колцы да далейшага ланцуга развязваных падзеяў. І вось жа з гэтаю думкаю пастанавіў пасылаць Вам зборнік паасобнымі балонкамі, а каб далей не рабіць лішняе работы — пасылаць гэтаксама недрукаваныя дагэтуль вершы. Кожная балонка нумараваная, і некалі, па атрыманні ўсяго тэксту, усё вельмі лёгка растасуецца.

Пасланыя ў мінулым лісце вершы: «Як акіян» (гэта ёсць бал. 96), «Кітай» (бал. 104), «Імкніся ўсцяж» (бал. 108).

Наступным, пазанаступным тыднем — наступнае-далейшае…

Алесь Салавей.

128. АНТОНУ АДАМОВІЧУ

26 кастрычніка 1955 г.

Даражэнькі дзядзька Антон!

Першы і трэці раздзелы зборніка «Вянкі» (бал. 1–40 і 89–112) Вы маеце — я іх паслаў Вам яшчэ з Аўстрыі. Балонкі 41–88 — гэта «Вянкі санетаў», якіх яшчэ не пасылаў (з дня на дзень даводжу да канца).

У мінулых двух лістах я паслаў паасобныя балонкі апошняга зборніка «Несмяротнасць» — якраз тыя балонкі з вершамі, якія я перагледзеў. Усё з пасланага ў гэтых двух лістах, за выняткам 5-цёх вершаў («Як акіян», «Кітай», «Наяве», «Наўвеце», «Імкніся ўсцяж»), друкавалася некалі ў «Шыпшыне» (зразумела, нідзе не друкаваныя да гэтага часу вершы прызначаныя для «Конадняў»). Лісты прападаюць. Як выглядае, Вы не атрымалі майго ліста (у якім я пісаў аб сабе), пасланага перад санетамі, даўно надрукаванымі ў «Конаднях».

Апошнімі днямі выбіраўся адпісаць на Ваш ліст, атрыманы якраз у той дзень, калі паслаў свой — з вершамі «Наяве» і «Наўвеце». Сяння толькі вытлумачваюся: працаваў 12 гадзінаў і заўтра працую гэтулькі ж; лёгка падацца ў чыгуначныя або паштовыя чыноўнікі, але не дам сабе рады на чыноўніцкім заробку. Усё ж усімі сіламі пастараюся адпісаць бліжэйшымі днямі разам з новымі паасобнымі балонкамі — перагледжанымі вершамі са зборніка «Несмяротнасць».

Вельмі ўдзячны і заўсёды буду ўдзячны за заўвагі, што да мовы. Мне не давялося жыць у асяроддзі носьбітаў нашае мовы; пачаў вучыцца ў 1930 годзе, а пазней, калі чытаў і пісаў, тае мовы ўжо не было.

«Чалом, чалом». «Рыфмаў» застаецца без з'інachання. Заміж «храм» мусіць быць «дом» (хай сабе будзе гэтак, хоць дом — не хорам або храм).

«Ну што». Мусіць быць «тоўху мала» заміж «толку». «Тоўху» (хай правінцыялізм) гучыць лагадней, чымся «толку», і не гэтак дзіка, як «ужытку» (у дадзеным выпадку) і «клёку»; «звыроддзя» — правільна мусіць быць «звароддзя».

«Пакінуў я» — «прыплываў і адплываў», «падзьмуў».

«Не ўспамінай» — «і той шурум-бурум».

«Слупы» — з'іначанняў няма.

«Нішто». «Суздромны ноль», «суцэльны ноль» — зусім не падабаецца. Але добра — «нішчым». Таму і назоў верша мусіць быць «Нішчым».

«Альпы» — «гурмой гарбоў». «Птах» застаецца.

«Як акіян» — «саломы жорсць».

«Кітай» — няма паправак (у кожным лісце кнігі — дзве балонкі). «Спадар» — перада мною нешта вышэйшае, чымся «ўладар».

«Імкніся ўсцяж» — «не згіну».

Верш «Згода» даўно пасылаўся ў «Бацькаўшчыну», але хіба не пабачыць там свету, бо быў скіраваны разам з разлікам за газету на адрас выдавецтва, а не рэдакцыі. Пасылаю тут яго прызначанай яму балонкай у зб. «Несмяротнасць».

Вершы «Зірні» (бал. 41) і «Звон» (бал. 50) нідзе дагэтуль не друкаваныя. Папраўкі да пасланых вершаў: «Максім Багдановіч» (бал. 44) — у трэцім радку пасля слова «прастор» мусіць быць працяжнік, далей — «пад імі гуў лясун» і г. д.; «Дзе хмурны пас радзее» (бал. 46) — пяты радок мусіць чытацца: «Пад схіламі — вясна, і хмурны пас радзее». Адылі і ў назове верша заміж «дзе» трэба падаць «і».

Ветліва прашу занатаваць гэтыя папраўкі не адкладваючы.

Алесь Салавей.

129. АНТОНУ АДАМОВІЧУ

18 снежня 1955 г.

Даражэнькі дзядзька Антон!

Я вінаваты за маўчанне — навет і не апраўдваюся. Але праўду сказаць трэба-такі. Сем тыдняў працаваў уначы. Жыву ж у невялічкай будцы. Сям'я немаленькая. Лета, гарачыня. Дзе было да сну ўдзень? Дзе было да вершаў і ліставання?

Навал работы скончыўся — ізноў працую ўдзень. Апошнім часам — такі-сякі tradesman, radial drill operator. Машына з Манчэстару — новая і цудоўная. Тэхніка тут — дапатопная. Такіх машынаў — няшмат. Таму праца пры ёй — гонар і павага на фабрыцы... Вельмі добра зарабляю і не магу адмовіцца ад надгадзінаў, бо з маёю працаю звя-

заная праца тых, хто надгадзінаў жадае. Ды й само жыццё кожнага змушае да гэтага. Кожны мусіць дбаць пра сваё жытло — на жыццё ў чужым тут не здабудзешся. А на яго патрэбныя тысячы. І я манюся ў наступную зіму тое-сёе дабудоўваць да свае будкі — трэцяе часткі дому, канчаць увесь дом. Гэта пратрывае тры-чатыры гады. І толькі па гэтым часе хіба знайду супакой. Тады змагу падацца ў службоўцы на пошту альбо чыгунку. На кавалак хлеба штодзённага зараблю і мецьму час на вершы.

Месяцы чатыры таму я меў запросіны да ўступу ў сябры Беларускага інстытуту навукі і мастацтва. Паслаў заяву, дастаю «Абежнікі», але не ведаю, ці залічаны ў сябры. Калі так — мушу плаціць складкі. Можа, я і не сябра — таму не мог дагэтуль плаціць.

«Творы» Жылкі дастаў. З Мюнхена дастаў 1-ю й 2-ю кнігі «Зборніка», але не дастаў Вашае кнігі пра Коласа. «Віці» дастаў — з апошнім нумарам за мінулы год, дзякую…

Два мае лісты да Грыцука вярнуліся назад — новага ягонага адрасу не ведаю. Для «Вызвалення» нічога не пісаў. Наагул, цяпер лягчэй магу зарабіць мазалём, чымся на прапагандзе. Ангельскую мову крыху ведаю, чытаю, разумею, пішу элементарныя лісты ў палагоджанні якіх-небудзь справаў, гавару з жахлівым акцэнтам. Маю пару перакладаў з Кітса (зрабіў яшчэ ў 1951 г.). Пераклады няўдалыя, але калі Бог дазволіць іх калі-небудзь паправіць — тады пашлю.

Праз чатыры дні пачынаецца мой трохтыднёвы адпачынак (сёлета-такі працаваць не буду). У гэтым часе хачу здзейсніць сваё даўно абяцанае, хоць часткова — трэці «Вянок» вельмі цяжка паддаецца паправе.

Сардэчнае прывітанне Вашым бацькам. Некалі ў цяжкім нашым падарожжы з Бацькаўшчыны пры ўсім сваім жаданні я анічым не змог ім дапамагчы.

Шчыра жадаю Вам і Вашым бацькам вясёлых Калядаў і шчаслівага Новага году.

З пасыланых цяпер вершаў — адзін («Дзе хмурны пас радзее») яшчэ нідзе не друкаваўся. Ён слабаваты, але ўжо хай ідзе побач з іншымі.

Моцна цісну Вашу руку, адданы Вам — *Алесь Салавей.*

130. АНТОНУ АДАМОВІЧУ

31 снежня 1955 г.

Даражэнькі дзядзька Антон!

Пасылаю тым часам яшчэ пару мясцінаў са зборніка «Несмяротнасць».

Верш «За» — нідзе дагэтуль не друкаваны.

Алесь Салавей.

131. УЛАДЗІМІРУ ГЛЫБІННАМУ

24 студзеня 1965 г.

Дарагі Уладзік!

Наконадні Новага года атрымаў ад Цябе каштоўную кнігу «На берагох пад сонцам». Шчыра дзякую.

На мінулым тыдні паслаў у разлік 35 аўстралійскіх шылінгаў (4 ам. дал.).

Пасля ўсяго нікчэмства, напісанага і выдадзенага на эміграцыі, апрача «Каханага горада» і «Афрадыты Ost», — гэта запраўды вартасная кніга мастацкае прозы (можа, што выйдзе з «Рамана Корзюка» М. Сяднёва?). Чытаю і захапляюся глыбока-чуллівым адтварэннем пачуццяў чалавека на фоне прыроды і ейнае красы.

Прыкра было чытаць у паза-заслоннай прэсе накіды на Цябе за словы, пісаныя некалі не Табой, а нямецкімі «зондэрфюрэрамі», і перакладваныя спачатку з нямецкае мовы ў расейскую, а потым — у беларускую (ніхто з нас тады нямецкае мовы добра не ведаў).

Шмат часу канула ў нябыт з тае пары. Ужо больш за пяць год я працую катляром і электразварвачам. Узяцца цяпер за пяро для мяне — невыносная мука. Маю ўсё, што цешыць жывот, але не душу, — і дом, і аўта, але не маю натхнення да мастацкага творства.

Заўтра — ізноў да працы: рэзаць зялеза і агнём зварваць. Абставіны жыцця склаліся гэтак, што давялося выйсці ў свет не праз кузню навукі — універсітэт, а праз кузню фізічнае працы — фабрыку.

Увогуле жывы і здаровы (з сям'ёй), чаго і Табе жадаю і Тваёй сям'і. Дзеці мае ўжо дарослыя (два сыны і дачка).

Шчыра жадаю натхнення да новых твораў, да памыснага заканчэння «Вялікіх дарогаў» (не «змагарных»).

Цісну руку — *Алесь.*

132. ЛАРЫСЕ ГЕНІЮШ

25 красавіка 1971 г., Мельбурн

Дабрыдзень, паважаная Ларыса Антонаўна!

Зіна атрымала Ваш ліст з цёплымі святочнымі прывітаннямі. Шчыра дзякуем. Сардэчна дзякую (Зіна пісала раней) і за навагоднія прывітанні:

Белым-бела, снягі пад-над хатамі,
Наняслі вятры, намялі…

Так прыемна чытаць пра бель, пра снег, якога цяпер амаль не бачым… Дзеці ездзілі ў горы, бачылі снег; вярнуўшыся дахаты, апавядалі, што ён — такі самы, як іней у халадзільніку (першае знаёмства з ім). Тлумачылася, чыталася пра нашу дарагую Бацькаўшчыну. Яны ведаюць ці мала. Цяпер усе дарослыя. Малодшаму — вось-вось 21 год. Два ўнукі — меншаму 5 месяцаў. Зіна пісала аб гэтым. У адказ на папярэдні ліст напіша пазней.

Ад шчырага сэрца вітаем і Вас з Вялікім Святам — Першамаем! Сапраўды, вось красавік канчаецца, так недалёка травень-май! Як прыгожа на Беларусі! Заміж снежнай белені — зяленівасць траваў, дрэваў, цвітуць кветкі. Забыцца аб гэтым не зможам да смерці.

Нястача адпаведнай лучнасці з роднай мовай, літаратурай, фізічная праца на фабрыцы (праз гэтулькі год!), далёкі ад Бацькаўшчыны свет пазбавілі мяне таленту і натхнення.

Апошнімі днямі прачытаў два раманы Івана Шамякіна: «Сэрца на далоні» і «Снежныя зімы». Надзвычайныя творы! Незалежна ад таго, у якім свеце яны напісаныя, пачуцці чалавека ў іх, выразы адданасці да абавязку, сяброўства, любасці да сям'і, да дзяцей — гэта агульналюдскія пачуцці. Цяпер чытаю «Каласы пад сярпом тваім» Уладзіміра Караткевіча. Спыніўся на апавяданні пра старога лерніка. Цікавы твор, высокамастацкі — песня самога лерніка, я не кажу яшчэ аб усім рамане, бо толькі пачаў чытаць яго.

У мяне побач з «Невадам з Нёмана» — «Мая Іліяда» Уладзіміра Караткевіча, «Перазовы» Ніла Гілевіча. Захапляюся вянком санетаў «Нарач». Некалі і мне давялося пісаць вянкі санетаў.

Верш «Беларуская песня» Уладзіміра Караткевіча, уступ да кнігі «Мая Іліяда» — крылаты ўзлёт ва ўзвышшы чароўнае паэзіі, дзе род-

нае спалучаецца з агульналюдскім... Роднае не забываецца ў далёкім свеце і пры ўсялякіх абставінах ажывае яно.

Даруйце, што дакучаю Вам старымі вершамі. Гэта толькі абмена дум. Сумна, духова балюча далёка ад Бацькаўшчыны. Апошні раз бачыў Беларусь 27 год таму. Мне было тады 22. Тут жа дачакаўся ўжо і ўнукаў. Я «пралетарскі» чалавек. З'явіўся на свет 1 траўня-мая 1922 года.

У нас цяпер восень. Заўтра — пачатак першага дня трэцяга месяца восені — Першамай. З дрэваў ападае лісце. Холадна. Ліст пасылаю 30.04.1971.

Прывітанне мужу, з павbooжаннем — *Алесь.*

133. ЛАРЫСЕ ГЕНІЮШ

10 верасня 1971 г.

Паважаная Ларыса Антонаўна!

Так сталася, што зробіш? — сталася: пішу гэты ліст са шпіталю. Сам вырашыў не зацягваць хваробы, якая можа давесці не толькі да руіны, але да канца. Яна пусціла ўжо глыбокія карані, і без дапамогі лекара яе не пазбавішся. З першых дзён чуюся добра, думалася, што будзе цяжэй. І цвёрда наважыўся, і пастанавіў з усімі сіламі волі: за варотамі шпіталю спаткаць новы чароўны свет, да старога не вярнуцца да самай смерці.

Учора адведвалі мяне Зіна, Юрка, Мікола [Нікан]. Сёння завітаў другі Мікола [Скабей]. Заўтра ізноў завітаюць. Я маю шмат добрых сяброў. Званю да іх, яны да мяне звоняць. Таму не сумна. У ложку, бясспрэчна, не ляжу. Пішу тым часам лісты, чытаю. Бязмежна, шчыра дзякую за кнігу «Дзень паэзіі». Я перапісаў шмат вершаў з кнігі, аддаў суродзічам. Яны чытаюць самі і дзецям, вывучаюць на памяць. Звычайныя людзі, як і паэт, такі ж самы чалавек, не забываюцца Бацькаўшчыны. Яна нязгасна жыве і свеціць у думках, як тыя, скажам, зоркі, што вельмі зырка ззяюць над Паўночнай Італіяй і Грэцыяй у канцы чэрвеня і ў пачатку ліпеня.

Маю з сабою і кнігу «Мая Ііяда» Уладзіміра Караткевіча, якую прачытаў даўно, ды зноў перачытваю, як пабожны чалавек увесь час пераказвае-паўтарае малітвы. Удумлівы верш «Лебедзь» — гэта глыбокае спалучэнне пачуццяў птушкі з пачуццямі чалавека. І чалавек у далёкім свеце «ў дрэме плача» аб роднай краіне — ці то сумнай,

ці то вясёлай. Верш «Апошняя песня Дантэ» — вельмі змястоўны твор — прыгадаў мне і мае колішнія тэрцыны.

Усялякія праявы жыцця, звязаныя з глыбокімі пачуццямі любасці да роднага краю. Іх шмат, пачуццяў, хоць не так шмат выказана іх на паперы.

Падарожжа ў далёкі свет узіралася наперад праніклівымі вачыма, бачачы завалоклыя густым туманам змрочныя прасторы акіяну; позірк паварочваўся назад — яшчэ ўсё сяцiўся пад сонцам даляглад з адчыненымі дзвярыма небасхілу.

Бяруся за другую кнігу рамана «Каласы пад сярпом тваім» Уладзіміра Караткевіча. Першую прачытаў раней. Другую дастаў перад шпіталем. Яшчэ не чытаў Васіля Быкава і Івана Мележа. Кнігі санетаў Шэкспіра ў перакладзе Уладзіміра Дубоўкі не змог дастаць. Зіна ў Мінску шукала гэту кнігу — не знайшла. Два тамы выбраных твораў У. Д[убоўкі] маю.

Шматлікія мае сябры, з якімі некалі разам вучыўся, бачыўся, — цяпер таленавітыя працаўнікі на ніве літаратуры, мастацтва, навукі на Бацькаўшчыне.

...Наўкола шпіталю — прыгожы сад, кветкі. Не хочацца выходзіць, бо, хоць вясна, — холадна, сцюдзёны вецер з мора. Цёпла і ўтульна ў паадзіночнай палаце.

Тутэйшыя сябры — шчырыя, адданыя, ахвярныя людзі, блізкага ў забыцці і бядзе не пакінуць. У гаспадарскіх, практычных, грамадскіх справах — непараўнальныя. Але паэзія для іх — далёкі свет.

Зіна, дзеці і ўнукі — здаровыя. Сам жа няўхільна і цвёрда веру ў хуткае выздараўленне і ў назаўсёдны незварот да хваробы. Як Вы маецеся?

Прывітанне мужу. З найшчырэйшым павужаннем — *Алесь.*

Прывітанне ад Зіны.

134. АНТОНУ АДАМОВІЧУ

9 лютага 1977 г.

Не змог напісаць да Вас хутка, дарагі дзядзька Антон, бо чакаў на фатаграфіі. Мой сын дастаў іх толькі ўчора ўвечары. Працаваў я 12 гадзінаў. І сяння — таксама. Ужо трэці дзень — тэмпература 98–100 F. Ледзьве жывы. Weather Bureau падае, што заўтра будзе 86 F. Усё роўна цёпленька будзе, як М. С. кажа: «Добра, што цёпленька».

Здымкі — з «хутара» і з «маёнтка», са «сцэны» і з па-за «сцэны» — са стройным шэрагам «жаўнераў-салдатаў». Толькі ў адным месцы Зіна «выратавала сітуацыю», сеўшы на «сцэне». «Зоры» атрымаў праз 6 дзён, а ліст — праз 11, пазаўчора. Вельмі і вельмі дзякую. Пахаладае — напішу неўзабаве аб усім падрабязна.

Вітаем Вас — *Алесь* і ўсе мы.

135. АЛЯКСАНДРУ КАЛОДКУ

6 сакавіка 1977 г.

Дарагі Аляксандр!

Прафесар А. Адамовіч падаў у радыёперадачы «Звіняць званы Святой Сафіі»: «падрыхтаваў да друку зборнік «Вянкі». Правільна ў альманаху «Ля чужых берагоў»: «падрыхтаваў да друку «Вянкі» (1937–1947) і «Несмяротнасць», мусіць быць — «(1947–1952)».

У зборнік «Вянкі» ўвайшлі вершы, пісаныя ў той самы час, калі пісаліся вершы да зборнікаў «Мае песні» і «Сіла гневу», але паводле сваёй тэматыкі і формы пакідаліся для іншага зборніка з трыма вянкамі санетаў (1947), адгэтуль і назоў кнігі — «Вянкі». Цяпер два ненадрукаваныя да гэтага часу зборнікі плануюцца да выдання адной кнігай пад назовам «Нятускная краса» разам з пазней напісанымі вершамі.

Алесь Салавей.

136. АНТОНУ АДАМОВІЧУ

3 ліпеня 1977 г.

Даражэнькі дзядзька Антон!

Вось ужо і ліпень надышоў — гэта ж мала не паўгода ад часу, калі мы апошні (дай Божа, не апошні!) раз бачыліся. Напісаць раней не мог: 60 гадзінаў у тыдзень працы на фабрыцы і, па-за гэтым, — заканчэнне будовы «маёнтка». Увесь час — з тыдня на тыдзень — быў гэтак змучаны, што цяжка было газету прачытаць, не толькі за лісты брацца. Ды яшчэ («грахоў не ўтаю») — розныя згрызоты і «пазбаўленне» ад іх таксама былі прычынай…

Ліст ад 2 сакавіка (ужо другі ў 1977 годзе), а таксама стужку для радыё (Ул. Жылка, Я. Купала) атрымаў. Вельмі і шчыра дзякуем.

Перасылкі каштуюць грошай, і мы тут прыдумаем спосаб разліку. Ліля Я. моцна пратэставала і пратэстуе — чаму стужка не перасланая беспасярэдне да яе? Мяне яна не слухае і не хоча слухаць. Пагаджаецца крыху з Аляксандрам К[алодкам], але ўсё роўна шмат што робіць па-свойму. Калі б была магчымасць пасласць нам яшчэ што-небудзь — будзем бязмежна ўдзячныя. Шлеце, як і раней, на мой адрас, калі ласка (гэта думка і А-дра К[алодкі], і двух Міколаў (Нікана і Скабея); мы ўсе супрацоўнічаем у згодзе). Істужкі вашыя надаюцца для Сіднейскага радыё, але тут іх можна перапісаць на іншыя. «Казку аб песні» з маім «сучасным» уступам, зробленым на падставе атрыманага, і верш «Паўстань» праслухалі на святкаванні 25 Сакавіка. Праз радыё яшчэ не падавалі. «Тастамент» Ул. Жылкі падамо ў 45-я ўгодкі ягонай смерці.

Перадача пра Максіма, можа, была і неблагая. Але думка мая працавала слаба. І я да сваіх думак дадаў пару Антона Навіны: «Нацыянальнае стаецца агульналюдскім праз укрытую ў ім чыстую красу». Гэта быў скрыпт для радыё — не артыкул у часапіс, і хіба ў тым не асабліва вялікая правіна. Аб жанчыне-маці ў творчасці Максіма Багдановіча было коратка сказана ў перадачы, прысвечанай Дню маці. Таксама адбылася перадача пра Рыгора Шырму (скрыпт пісаў я)... Урад адмовіўся фінансаваць радыёстанцыю 3ZZ. Яна хіба зачыніцца. Але не трацім надзеі, хоць будзе цяжэй, супрацоўнічаць з іншымі радыёстанцыямі.

За нашы сціплыя падарункі атрымаў падзякі ад Цябе, дзядзька Антон, ад д-ра Я[нкі] З[апрудніка] і д-ра Ст[аніслава] Ст[анкевіча]. Мая ўдзячнасць Вам за шчырыя зычанні! Усцешыў і ліст за 31 траўня з many special wishes. Хоць я не заслужыў на гэта за ўсе 55 гадоў жыцця, таксама — сардэчная ўдзячнасць Табе, разам і ўсім тым, хто пераслаў прывітанні праз Аўгена Грушу.

Атрымаў ліст ад Ігара Качуроўскага. Ізноў усцешыўся. Тут я набыў усе ягоныя кніжкі, выдадзеныя за апошняе дзесяцігоддзе з гакам. Вельмі цікавая, вялікая і салідная праца — «Строфіка». Між іншага, у ёй ёсць цытаты і з беларускай паэзіі — з М. Багдановіча і А. Салаўя. Аб строфіцы пару словаў у нашай мове напісаў М. Багдановіч (прыкладам, «Санет»). Больш пісаў Ты, думаецца, што Ты — у часапісе «Віці», але не вельмі шырока.

Цяпер аб маіх «выбарах» ці выбранні ў свет. Усё, што рабіў я на фабрыцы ўсцяж апошніх чатырох гадоў, — пайшло ў Філіпіны. На сян-

ня ў маіх руках засталіся мятла і шуфель для падбірання сметніка. Зарабляю 4 даляры за гадзіну. На Філіпінах чалавек, які робіць тое самае, што рабіў тут я, мае 40 цэнтаў за гадзіну (фабрыка пабудавала там свой workshop).

Сям'я мая нічога не мае супраць майго падарожжа ў свет. Усе — дарослыя і ў дастатку. Мама з меншым сынам (27 гадоў) дасць сабе рады.

Было б пажадана ехаць у паўночна-экватарную вясну. Увосень і ўзімку я змерзну там, як прусак, не прызвычаіўшыся паступова да гэтага (так мне кажа доктар, сын расейцаў, народжаны ў Югаславіі; ён падарожнічаў напачатку гэтага года — быў і ў Мюнхене, і ў Нью-Ёрку).

Далей, падарожжа і адведзіны — гэта адно, але калі б давялося працаваць там, скажам, у радыё — іншае. Як гэта паўплывае на маіх брата і сястру, на пляменнікаў?

Першыя тры гады жыцця ў Аўстраліі я пісаў, нават пладавіта пісаў. Цяпер жа ці змагу што-небудзь людскае напісаць пасля 25-гадовага атупення на фабрыцы?

Ува ўсякім разе я жадаў бы сяброўскай парады.

Ёсць у нашай паэзіі яшчэ адно слова «цяпершчына»: «Я з імі Такрочыў, сябра мой, / праз дым цяпершчыны зларэчай». У паэме «Тастамент» прачытана: «Яно было пра тое, як / Прыгож бязмежна свет дзівосны». Думаецца, трэба чытаць так: «Ян*о* был*о* пра т*о*е, *як* // Прыг*о*ж бязм*е*жна... і г. д.

Ці выкарыстоўваўся верш «Заззяе прабуджальная дзянніца»? Мізэрнае «сочинение», горшае за ранейшыя, таму і падпісанае «Антон Дабрыдзень».

Што да паэмы «Звіняць званы Святой Сафіі», то мусіць быць: «...ды ўклаў зборнікі «Вянкі» і «Несмяротнасць».

Мы тут былі папpавілі памылку, але Ліля Я[цкевіч], чытаючы, прапусціла радок, і ўсё выйшла навыварат. Чаму з «Тастамента» выкінуты радкі: «Дзіцём ля матчынае цыцкі, / І рос, вясёлы шалапут...»? У словах «цыцка» і «шалапут» нічога няма нелітаратурнага — яны якраз і сталіся літаратурнымі праз ужыццё іх Ул. Жылкам у паэме.

Працую цяпер не больш 40 гадзінаў у тыдзень. Далей не давядзецца маўчаць з лістамі па паўгода.

На гэтым канчаю, вітаем Цябе і ўсіх суродзічаў — *Алесь Салавей.*

ДАДАТАК
УСПАМІНЫ ПРА АЛЕСЯ САЛАЎЯ

Ігар Качуроўскі

АЛЕСЬ САЛАВЕЙ,
ЯКІМ Я ЯГО ПАМЯТАЮ

Пад восень 1946 года я прыехаў з Карынтыі наведаць Зальцбург, які быў тады цэнтрам украінскага жыцця ў Аўстрыі: там жылі некалькі пісьменнікаў, дзейнічаў лагерны тэатрык, выходзілі газеты, існавала выдавецтва Пятра Валыняка й пачынала сваю дзейнасць нядаўна заснаваная Суполка ўкраінскіх навукоўцаў, літаратараў і мастакоў. А галоўнае, там пасяліўся мой асабісты сябар і літаратурны аднадумец — малады паэт Барыс Аляксандраў, які толькі што выдаў свой першы зборнік. Ад Барыса я даведаўся, што найцяснейшае сяброўства звязвае яго не з землякамі-ўкраінцамі, а з беларускім паэтам Алесем Салаўём.

Алесь быў маладзейшы за нас па гадах, але выглядаў старэйшым дзякуючы акулярам і шызаму ад галення падбароддзю (падбароддзе, якое трэба галіць двойчы на дзень: зранку і звечара…). Зрэшты, ён быў старэйшым і паводле жыццёвага ды літаратурнага досведу: быў ужо жанаты, а першы зборнік паспеў выдаць два гады таму (я не выдаў тады пакуль ніводнага).

Перш за ўсё мы зладзілі літаратурны вечар у адным (ужо не прыгадаю якім) з украінскіх лагераў Зальцбурга. Выступалі ўсе трое з чытаннем сваіх вершаў. Што тычыцца мастацкай якасці, то вершы стаялі прыблізна на адным узроўні, але лепш за ўсіх чытаў Алесь. На стылі яго чытання не адбілася модная ў Савецкім Саюзе манера Качалава–Станіслаўскага — чытаць вершы як прозу, робячы найбольш ідыёцкія лагічныя націскі. Наадварот, Алесь дакладна акцэнтаваў рытмаструктуру вершаў — так што ўвага слухачоў плыла за ім на хвалях рытму.

Потым мы яшчэ некалькі разоў праводзілі такія супольныя выступы, у прыватнасці, ладзілі літаратурны ранішнік у лагеры Сан-Марцін каля Філяху, дзе я тады жыў, ды вечар у Зээбодэне ля Мільштацкага возера.

Падчас размоваў з Алесем я ўпершыню пачуў імёны некаторых дзеячоў беларускай культуры, якія жылі на Захадзе: Юрка Віцьбіч, Наталля Арсеннева, Антон Адамовіч, Рыгор Крушына, Масей Сяднёў (які карыстаўся тады найбольшай Алесевай сімпатыяй). Між іншым, у Зальцбургу жыў тады яшчэ адзін беларускі паэт, Уладзімір Дудзіцкі, але мы не знайшлі з ім шмат супольнага, бо краевугольным каменем свайго існавання ён ставіў адну толькі праблему:

— Як бы гэта выпіць?

Зрэшты, мы з Барысам і Алесем таксама былі не супраць, каб часам выпіць, але тое было дзесьці «на маргінэсе» (як кажуць галічане), а зацікаўленасць нашая засяроджвалася галоўным чынам на толькі што выдадзеных кніжках украінскіх і беларускіх аўтараў, на часопісных і газетных публікацыях празаічных і вершаваных твораў, на новых імёнах, якія раз-пораз з'яўляліся на арбіце нашага пісьменства, якое перажывала кароткатэрміновы лагерны росквіт.

Якраз у тыя гады разгарнулася трэцяя па чарзе ў гісторыі ўкраінскага пісьменства літаратурная дыскусія, якая хвалявала не толькі крытыкаў і пісьменнікаў, але й шырокія колы спажыўцоў мастацкага слова. (Першая такая дыскусія ўзнікла дзесьці напярэдадні Першай сусветнай вайны, паміж «радзянамі», якія прытрымліваліся расійска-народніцкага ўтылітарнага разумення літаратуры, ды «хацянамі», якія стаялі на пазіцыях заходнееўрапейскага мадэрнізму. Другая дыскусія пачалася ў сярэдзіне 20-х гадоў, калі Хвылявы кінуў покліч арыентацыі на еўрапейскую культуру, намагаючыся адарваць украінскае пісьменства «ад задрыпанкі-Масквы» ды пазбавіць яго правінцыйных рысаў.)

Дыскусія лагернага перыяду ўспыхнула паміж невялічкай групоўкай прыхільнікаў украінскага парнасізму (увасобленага, у прыватнасці, у творчасці кіеўскіх неакласікаў) ды прыхільнікамі «нацыянальна-арганічнага стылю», што ўздымалі на шчыт творчасць выпадковых літаратараў, якія былі й засталіся для нас «самазванцамі ў літаратуры». Карацей кажучы, нашыя сімпатыі былі тады на баку Дзяржавіна, Клэна, Орэста, якія выступалі абаронцамі неакласічных традыцый.

Алесь, які балюча ўспрымаў недахоп сваёй адукацыі, прагна паглынаў веды з галіны літаратуразнаўства (якія, дарэчы, ніяк не цікавілі Барыса Аляксандрава). Літаратурным узорам для Алеся быў беларускі парнасіст Максім Багдановіч, які і для мяне стаўся «вечным спадарожнікам». Варта звярнуць увагу на глыбінную сваяцкасць

творчасці Багдановіча й згаданых тут кіеўскіх неакласікаў, і што адзін з іх, Міхайла Драй-Хмара, пераклаў на ўкраінскую мову дзесьці сорак Багдановічавых вершаў.

Не лішнім будзе ўзгадаць, што Алесь у нейкай ступені быў абавязаны неакласікам за вышкал формаў, напрыклад, ён запазычыў у Зэрава дванаццацірадковую александрыну. Пра беспамылковы эстэтычны Алесеў густ найлепш сведчыць наступны выпадак. У 1947 годзе на старонках украінскіх часопісаў і газетаў пачалі з'яўляцца вершы Парфірыя Гаратака (у прыватнасці, у «Літаўрах», органе Суполкі УНЛМ, мы прачыталі падпісаныя гэтым імем дзве рэчы: «Астраўную баладу» і «Таямнічую міледзі»). Хадзілі чуткі, што Гаратак нарадзіўся на Далёкім Усходзе, а адтуль пасля ўсіх прыгодаў патрапіў у Аўстрыю. Па руках хадзіў машынапісны зборнік Гаратакаўскіх вершаў, якія выклікалі захапленне ў двух вядомых украінскіх літаратуразнаўцаў: Івана Кашаліўца й Юрыя Дыўніча (Лаўрыненкі). Падчас свайго чарговага візіту ў Зальцбург я запытаў сваіх сяброў, ці хто ведае таго Гаратака асабіста.

— А хто бачыў Казьму Пруткова? — адказаў Алесь.

І сапраўды: неўзабаве мы даведаліся ад Пятра Валыняка, у выдавецтве якога друкаваўся Гаратакаўскі зборнік, што гэта — літаратурная містыфікацыя, а хаваюцца за псеўданімам «Парфірый Гаратак» Клэн і Мосендз.

Аднойчы ў размове з Барысам я выказаў думку, што перад Алесем вялікая будучыня ў паэзіі.

— Калі б жа не ягоныя дзівацтвы... — уставіў Барыс.

— Што ты хочаш гэтым сказаць? Якія дзівацтвы?

— Будзе нагода — пабачыш...

Нагода не прымусіла сябе доўга чакаць. Аднойчы ў прысутнасці Алеся мы з Барысам скардзіліся, што замест рамантычных чубоў нам абодвум неўзабаве давядзецца свяціць празаічнымі лысінамі. А вось Алесю з ягонымі, нібы з дроту, валасамі такая небяспека, маўляў, не пагражае... Кожны з нас, і Барыс, і я, былі б не супраць абмяняцца чубамі з Алесем. Алесь маўчаў. А на другі дзень з'явіўся... з паголенай галавою...

Другім Алесевым дзівацтвам было падпісваць толькі што напісаныя вершы задні́м чыслом: нібыта гэта напісана яшчэ тады, як ён рыхтаваў да друку першы зборнік. І ўзнікала пытанне: чаму ж ён даў у той зборнік некаторыя яшчэ зялёныя, не цалкам саспелыя рэчы,

а найлепшых не ўключыў? Таксама паставіў ён мінулагоднюю дату на сваім наследаванні Гаратакаўскай гумарэсцы Venit mors velociter з наіўным спадзяваннем, што мы паверым, быццам ён сам, незалежна ад Гаратака, выдумаў своеасаблівую страфічную будову верша…

Апошні раз я бачыў Алеся недзе ў жніўні ці верасні 1948 года. Клэна не было ўжо сярод жывых, часопіс «Літаўры» спыніў сваё існаванне, шэрагі ўкраінскіх чытачоў радзелі на вачах: усе хлынулі за акіян, і ўсе думкі былі скіраваныя толькі ў адным напрамку: куды з'язджаць і што нас там чакае. У такі неадпаведны час выйшаў мой першы зборнік («Над светлай крыніцай»), які ўжо не было каму чытаць.

Барыс, якога заўжды перад тым абступалі зграйкамі дзяўчаты — прафесар Главінскі называў іх Барысавымі музамі, — быў, як кажуць, на смерць закаханы ў адну букавінку, якая сталася найвялікшым каханнем ягонага жыцця і якой ён прысвяціў ці не лепшыя свае вершы. Ягонае захапленне перадалося й мне — яна й мне пачала здавацца незямною істотаю.

— Звычайная дзяўчына! — сказаў пра яе Алесь.

Так потым і высветлілася…

Алесь жыў ужо не ў Ленарказэрнэ (дзе меў пад страхою маленькі, але асобны пакойчык), а ў якімсьці лагеры за горадам, дзе ў велічэзнай залі тулілася звыш дзесяці сем'яў.

Не без горычы Алесь сказаў мне, што Барыс так і не наведаў яго на новым месцы… А яшчэ болей горычы было ў ягоных словах, калі ён распавёў, што другое дзіцё, здаецца, глухое ад нараджэння…

У тыя дні мы развіталіся з Барысам, які ад'язджаў у Канаду. Неўзабаве і я адплыў у Аргентыну, а Алесь — у Аўстралію.

З Барысам мы ліставаліся аж да ягонай трагічнай смерці, ад Алеся я атрымаў некалькі лістоў, і ў апошнім з іх яшчэ раз выявілася Алесева дзівацтва: ён прасіў не пісаць яму на працягу двух гадоў, бо ён усё адно не адкажа. Я пісаў яму і тады, і два гады счакаўшы, — але адказу так ніколі й не атрымаў.

Звяртаўся я й да Барыса, ці вядома яму што-небудзь пра Алесеву долю, але Барыс пісаў чыста лірычныя лісты і на кожны дакладны запыт ніколі не адказваў…

Гэтая жменька ўспамінаў усплыла ў маёй памяці (і з майго забыцця), калі я атрымаў кніжку «Нятускная краса» — пасмяротны зборнік майго былога сябра…

1982

Вольга Грыцук

УСПАМІН ПРА АЛЕСЯ САЛАЎЯ

Мне асабіста прыйшлося пазнаёміцца з Алесем Салаўём у 1945 годзе ў Беларускім камітэце ў Зальцбургу. Там я мела шчасце пазнаёміцца і з маім мужам, і з Уладзімірам Дудзіцкім. Хутка яны ўключылі мяне ў грамадскую і культурную працу ў беларускім жыцці. Разам мы працавалі ажно да 1947 года.

У пакоі майго мужа, дзе жыў таксама Алесь Салавей з жонкай, адбываліся важныя падзеі нашага штодзённага жыцця. Там мы збіраліся на грамадскія сходкі. Там мы дзяліліся горам і нядоляй. Там мы распачалі выдаваць часапісы «З беларускага жыцця» і «Пагоня».

Мы мелі вельмі вялікі клопат. Не было ніякіх фінансаў на нашыя выданні. Мой муж быў вельмі добры арганізатар і зарадны чалавек. Вось ён і распачаў усё, і дамогся працы пры УНРА, і працаваў у лагернай управе кватармайстрам. Ён камбінаваў як толькі мог, каб выдаваць часапіс. Дзесьці дастаў паперу. Купіў старую машынку да пісання ў сп. Яцкевіча. Ён і Салавей доўга правілі гэту машынку, каб пачаць працаваць. Потым купілі ратаtap. Божа ж мой! Гэта ўсё было такое старое ламачча, але вельмі каштоўнае для нас.

Артыкулы і паэзію пісалі А. Салавей і мой муж. Ул. Дудзіцкі памагаў часам, але не заўсёды — пры выданні ды апрацоўцы нумароў. Нам часам было крыўдна, бо ён мог бы шмат больш памагчы.

У склад рэдакцыі часапіса ўваходзілі Алесь Грыцук, Алесь Салавей, Уладзімір Дудзіцкі. Памочнікамі былі Мікола Ганько, Адольф Губерт, Вольга Дуброўская (цяпер В. Грыцук). Я жыла ў другім лагеры і прыязджала памагаць пры выданні часапісаў.

Беларусаў у Аўстрыі шмат не было. Нясведамыя нармальна прылучаліся да расейцаў або палякаў. Усе сведамыя належалі да Беларускага камітэта і былі зарэгістраваныя сябрамі. Не магу прыпомніць дакладнай колькасці, але каля 30 чалавек.

Мы мелі свайго святара і цэркву. Нават быў неблагі хор. Быў святар айцец Нікіфараў з матушкай. Таксама былі вялікая сям'я Губертаў (з 10 чалавек), Янка Грыневіч, Чалоўскі з жонкаю, Яцкевіч, Вера Розумава, сям'я Дуброўскіх (4 асобы), Мікола Ґанько.

Мой муж некалькі разоў арганізоўваў з дапамогай украінскага паэта Барыса Аляксандрава (ён пераклаў колькі вершаў Алеся) вечары

паэзіі для Салаўя. Алесь вельмі прыгожа дэкламаваў свае вершы. Таксама бралі ўдзел украінскія паэты. І заўсёды былі добра прымаюныя залай.

Алесь Салавей быў надзвычай сціплы ды шчыры чалавек. Вельмі здольны і крыху сарамлівы. Калі, бывала, вып'е, тады рабіўся гаваркім і любіў дэкламаваць свае вершы.

У Аўстрыі была яшчэ адна невялічкая група беларусаў — у мястэчку Гайдэльберг. Там мы мелі якісь час беларускую школку. Салавей з Дудзіцкім туды ездзілі выкладаць.

1998

Ян Пятроўскі

СПАТКАННЕ І ЎСПАМОГА

Хутка пасля кансалідацыі нашае беларуска-ўкраінскае групы ў Крэмсмюнстары вычувалася патрэба кантактаў з суродзічамі, расцярушанымі па ўсім абшары Еўрапейскага кантынента.

Не памятаю сягоння, у якіх абставінах было гэта, як з'явіўся ў арбіце нашых спраў беларус з прозвішчам Яцэвіч Аляксандр з жонкаю Валяю. Жылі яны тады прыватна недзе ў ваколіцы Рыду — невялікага места, паложанага каля 65 км на ўсход ад Лінца-над-Дунаем. Пры адведзінах аднойчы пераначаваў я адну ноч у іх. Ад часу нашага пераезду ў Лінц Алесь быў частым нашым наведвальнікам, поўны, як заўсёды, розных планаў і неспажытае энергіі ў рэалізацыі іх. З гэтае пары і аж па сягонняшні дзень, нягледзячы на тое, у якім краі мы жылі, што мы рабілі, сувязь нашая ніколі не супынялася.

Ад яго я даведаўся, што ў Зальцбургу жыве нехта з прозвішчам Салавей — паэта… Ад гэтага апошняга па нейкім часе даведаўся я пра гаспадара Ф. Фаміна, які з сям'ёю жыў тады ў невялічкай мясцовасці Лінд (Аўстрыя). У міжчасе, дзякуючы Салаўю, быў навязаны кантакт і з гаспадаром Міколам Паньковым у Ольдэнбургу (Нямеччына). Кантакт на адлегласці быў навязаны адносна хутка. Бо дня 23.12.46 году Салавей прыслаў да мяне ліст, які канчаўся сказам: «Прыязджайце, калі ласка. Рады будзем Вас бачыць».

Дзіўнае пачуццё мяне наведала, калі, расчыніўшы дзверы, увайшоў я ў жыллё Салаўя. Эканамічная беднасць у тым часе была агульнаю прыкметаю ўсіх нашых людзей, ведамых мне, але побач

яе прабівала жыццёвая энергія са спадзеяю на будучыню. Нічога падобнага не спаткаў я ў Салаўя. Тут да беднасці дадаваўся глыбокі песімізм на мяжы з адчаем. Кідалася ў вочы розніца характараў. Жонка была маладзіцаю з прыкметамі жыцця ў сабе, тады як муж быў запярэчаннем гэтага. Ён проста не быў у стане агарнуць і зразумець рэчаіснасць, у якую падзеі закінулі яго, і лунаў з музаю ў свеце паэзіі і няўлоўных летуценняў.

Натура, здаецца, умее ўмясцовіць у чалавеку здольнасць у адным якім-небудзь пачатку, пакідаючы ўсе іншыя на ўзбоччы. Для прыкладу, у Мілявічах, на поўнач ад Дзярэчына, я спаткаў хлапца, зусім нягеглага для сельскае гаспадаркі, але ён быў праўдзівым артыстам-маляром, які намаляваў мне алеем на палатне партрэт Льва Талстога.

Нешта падобнае спасцярог я ў Салаўя. Не мае ён здольнасці агарнуць навакольны свет, але праяўляе і здольнасць, і энергію, калі ўваходзіць ў свет паэзіі. Тут ён становіцца валадаром.

З гэтага часу і да пары ягонага выезду ў Аўстралію асабістая і пісьмовая лучнасць захавалася між намі.

Мне здавалася, што Алесь Салавей у значнай меры насіў у сабе савецкае ўзгадаванне, якое стварала свет пасіўнасці для дзяцей, падлеткаў і моладзі, свет, у якім не трэба турбавацца за сваю будучыню. Ёсць нехта на версе ўлады, хто будзе думаць за цябе і турбавацца, што да твае будучыні, ён цябе выадукуе, навучыць, дасць табе працу і патрэбны хлеб, каб жыць. І гэта самае —для твае жонкі і тваіх дзяцей, калі ты жанаты...

Праўдападобна, у нашым ліставанні наступіў перапынак, бо ўжо дня 22 жніўня 1947 г. я пісаў да яго: «Тое, што Вы пішаце, мяне вельмі засмуціла, тым болей, што праз нейкі час я не пісаў да Вас, і цяпер раптам аж гэтак дрэнна? Як жа ж Вы дапусцілі аж дагэтуль? Я выслаў для Вас 50 шылінгаў з нашае зборавае касы. На жаль, болей не магу. Буду, аднак, думаць пра Вашу сям'ю і чыніць усё магчымае, каб Вам памагчы. Наша царква спадзяецца хутка атрымаць помач ад сваіх братоў з Амерыкі... Аднак, калі гэта Вам не перашкаджае, прышлеце мне адваротнаю поштаю ўсе Вашыя і Вашае сям'і патрэбы (у чым Вы маеце патрэбу перадусім)».

У адказ Салавей напісаў: «Хочацца выказаць найшчырэйшую ўдзячнасць за Вашу ўвагу да мяне, але не хапае словаў. Абмяжуюся тым, чым магу: вялікае Вам дзякуй! Вы пішаце: «Як жа ж Вы дапусцілі да гэтага?». Няўмольнага лёсу абысці я не змог, і тое, што цяпер пера-

жываю, пачалося ўжо год таму. Можна цярпець і год, і два — гледзячы як. Бывала гэтак, што і году не выцерпіш. І маё цярпенне дайшло да сваіх межаў, мяне ўжо ўзяло ліха. А з волі Божае павялічылася яшчэ мая сям'я. Майму другому дзіцяці — дачцы — спаўняецца тры месяцы. Ні аб чым не магу сур'ёзна думаць. Галоднага, мабыць, нішто не цікавіць, апрача ежы, — патрабаванні жывата становяць сабой найвышэйшы ідэал. Усё гэта, аб чым пішу, — мабыць, у аднаго мяне ва ўсім Зальцбургу, бо адзін толькі я не маю тых крыніцаў, што маюць гэткія, як я, сярод арганізаваных эміграцыяў, і адзін толькі я не ўмею займацца гандлем — адзінай падтрымкай нашага брата. Гандаль, здабыццё хлеба па-за прадугледжаным законамі — не мая стыхія».

Вось у гэткім стылі напісаныя, бадай, усе лісты лікам 22, у якіх прабівае адчай, нядольнасць «гандляваць», амбіцыя з гонарам і дызарыентацыя ў новым для яго свеце, які змушае кожнага грамадзяніна да адказнасці ды ініцыятывы ў змаганні на хвалях разлеглага мора, якія набягаюць бесперапынку адна за другою.

Дзеля атрымання помачы для патрабуючых яе я мусіў выказвацца гэтак жа патрабуюча. Я напісаў Салаўю: «Дзеля стварэння магчымасці атрымання помачы далучаю апытальнік у нямецкай мове, які пасля запаўнення прашу прысласць мне».

Ягоны адказ, вельмі магчыма, мае сваё апраўданне, і я мог бы сказаць болей пра анкеты, калі б ведаў, дзе, калі і кім была выдумана першая на свеце анкета.

Салавей пісаў у лісце, датаваным 30.08.1947 г.: «Прабачце мне, калі ласка, я мушу шчыра прызнацца: з пэўных меркаванняў і прычынаў я не магу запоўніць прысланае мне анкеты. У дадатак да майго мінулага ліста магу дадаць яшчэ наступнае: прозвішча маё Кадняк, імя Альберт, нар. 1922 г., беларус з Польшчы, нерэлігійны, літаратар і некваліфікаваны работнік. На ўтрыманні — жонка (нар. 1922 г.) і двое дзяцей: аднаму год і чатыры месяцы, другому — тры месяцы. Дзеці і жонка праваслаўныя. Яшчэ раз прашу прабачэння, калі незапаўненне анкеты перашкодзіць мне атрымаць дапамогу ад Вашай арганізацыі (хоць я, зразумела, не маю на дапамогу права і не заслугоўваю на яе) — нічога не зробіш. Анкеты прыносяць мне страх, напамінаюць аб жахлівым мінулым, ад першага іхняга пытання цямнее ўвачч, і рука адмаўляецца пісаць».

Тут Алесь Салавей выступае ў ролі чалавека, які ведае, што ягонае паступаванне дзён адышоўшых і адыходзячых у нябыт крые ў сабе

апраўданне, але паблытанасць палітычная між народамі ў форме непрыязні адзін да аднаго, як і садружнасці аднаго з другім, не пакідаюць яму магчымасці сказаць таго, што сказаць ён, як чэсны чалавек, хацеў бы. Усё гэта разам можна было б уважаць за змору ў часе сну, калі б не тое, што рэч знаходзіць сабе месца не ў сне, але ў штодзённай выняткава гістарычнай рэчаіснасці. Затым чалавек стаецца нямым.

Хутка пасля гэтага (2 верасня 1947 г.) Салавей хоча дабавіць і зрэвідаваць сказанае: «Так, я песімісты. І цешуся, што не страціў здольнасці глядзець на свет запраўднымі вачыма, успрымаць жыццё такім, якім яно ёсць у запраўднасці. Не можа, паважаны спадару, быць непесімістам чалавек, здольны цвяроза думаць. Трэба было б ператварыцца ў абмежаваную і тупую істоту, каб быць аптымістым — маскай сляпога з дурною ўсмешкаю — і цешыць сябе самога тым, чаго няма або не можа быць. У дадатак я — індывідуалісты. Мая асабістая індывідуальная вера ў Бога мацнейшая за сплямленую натоўпам веру, і я перакана080ны, што гэтая мая вера ні трошкі не адхіліць мяне ад нацыянальнае прыналежнасці — справы крыві».

Тут Салавей выступае, як праўдзівы філосаф — прабуджаны чалавек у першую чаргу, сведамы сам у сабе, ведае, хто ён, і адчувае свет, у якім наканаванне паставіла яго. З гэтае прычыны ён мае многа сказаць свайму наваколлю. Але ён не кажа шмат. З прычынаў, ад яго незалежных, ён маўчыць. Ён поўны надзеі і веры, што як толькі паправяцца ягоныя палітычна-эканамічныя абставіны, ён пачне прамаўляць да народу, свайго Беларускага Народу…

Часамі Алесь Салавей даходзіў да страшных жыццёвых высноваў: «Тымчасам ніхто не сядзеў за мяне начамі, упарта працуючы над тым, да чаго рвецца мая душа… Цяпер друкуецца ў Рэгенсбургу мая кніга «Сіла гневу» на 6 друкаваных аркушаў; падрыхтаваная да друку новая кніга «Вянкі». А я іх пісаў пераважна ў 1945–1947 гадах. Цяпер працую над аповесцяй у прозе «Пад нагамі гарыць зямля». Мне не раз даводзілася чуць: «Наша Беларусь бедная, нават кніжак няма, каб пачытаць». А потым з вуснаў гэнага ж тыпа: «Вы скардзіцеся, што дрэнна жывеце. Чаму ж не працуеце на фірме? Там добры заробак і дадатковыя харчовыя карткі!» Я працаваў і фізічна, і разумова. За працу атрымліваў кукіш. Калі ж гэтае самае за працу атрымае конь, прыкладам, дык і ён, як я, далей ног не пацягне. Коратка кажучы, каб на гэтым свеце жыць, — трэба быць жулікам. Быць жулікам я не магу, а таму мушу загінуць. Было б зусім лішнім і несумленным для мяне,

каб я пачаў пераглядаць сваё дагэтуляшняе палажэнне ў жыцці. Усё гэта між іншым. Ці варта гаварыць пра мяне, маленькага чалавечка, калі вялікі Бетховен у лепшыя, як сяння, часы пад старасць год, будучы слаўным, скіраваўся пехатою на колькі дзесяткаў кілametraў у адведзіны сваіх крэўных, бо не меў грошай на праезд? І гэта было не на чужыне, і Бетховен не быў гультаём» (ліст з дня 23.11.1947 г.).

Дня 6 травеня 1948 г., сярод іншых падобных лістоў, я атрымаў падзячны ліст ад Салаўя, які пісаў: «Вельмі дзякую Вам разам з усёй сям'ёй за Вашу пасылку, за Вашу клапатлівую ўвагу да нас. Чаравікі, штаны і марынарка — усё добра падышло да мяне, нібы адмыслова пашытае. Хай гэтае шчырае прызнанне не ператварае мяне ў чалавека, які гонар і сорам страціў. Але ж запраўды, выкінуўшы ранейшыя свае ганучы на сметнік, стаўся цяпер крыху падобным да людзей... Буду не забывацца, каб у будучыні па-запраўднаму адудзячыцца, калі не застануся да скону жабраком, якім ёсць сягоння».

У іншым лісце (з дня 25.07.1948 г.) знаходзіцца гэтакі абзац: «Нагул, ні літаратурная праца, ні абавязак—патрыятызм не ідуць мне цяпер у галаву. Калі далей пажыву ў гэтым пазбаўленым жыцця палажэнні, — ад мяне застанецца нервова расхістаная, пазажыццёвая руіна».

У сваім кароткім і апошнім да мяне лісце, датаваным 18.04.1949 г., паэта пісаў:

«Выязджаю а 8-ай гадзіне вечарам 20 красавіка 1949 году. Найшчырэйшыя прывітанні Вашай сям'і. Жадаю ўсяго найлепшага, з праўдзівым паважаннем да Вас — *Алесь Салавей*».

Аляксандр Калодка

ПАМЯЦІ АЛЕСЯ САЛАЎЯ

У нядзелю 22 студзеня сёлета адышоў ад нас назаўсёды ведамы наш паэт Алесь Салавей (Альберт Кадняк). Смерць наступіла раптоўна на ўдар сэрца.

Нябожчык нарадзіўся 1 травеня 1922 года ў вёсцы Крысава Лагойскага раёна Менскай вобласці. Пачатковую асвету атрымаў у роднай вёсцы, сярэднюю ж (Педагагічны тэхнікум) — у Лагойску. Не маючы схільнасці да настаўніцкай працы, ён уладзіўся на працу ў мясцовай

раённай газеце, у якой і друкаваліся ягоныя раннія вершы. У 1937 годзе НКВД арыштавала ягоных бацькоў: маці дастала 10 гадоў зняволення ў сібірскіх лагерах, бацька быў закатаваны падчас следства. Маці вярнулася з высылкі ў Беларусь у 1947 годзе. Абое, бацька й маці, былі рэабілітаваныя ў хрушчоўскім перыядзе.

Святой памяці Алесь Салавей студыяваў журналістыку й беларускую мову на Беларускім дзяржаўным універсітэце ў Менску ды быў сябрам Саюза пісьменнікаў БССР. Падчас Другое сусветнае вайны ён пражываў нейкі час у Іллі Вялейскае акругі, пазней у Рызе (Латвія) й Нямеччыне, усюды прымаючы актыўны ўдзел у беларускім грамадска-нацыянальным жыцці. Канец вайны застаў яго ў Аўстрыі, адкуль пазней выэміграваў у Аўстралію, спярша ў Адэлаіду, а пазней у Мельбурн. Тут ён таксама прымаў удзел у нашым грамадскім жыцці, асабліва на працягу апошніх колькіх гадоў.

Ён быў культурным рэферэнтам Беларускага Цэнтральнага камітэта ў Вікторыі ды сябрам Беларускае секцыі Радыё 3ZZ. Напярэдадні ягоных 55 угодкаў ад дня нараджэння 30 красавіка 1977 года Беларуская секцыя прысвяціла яму адмысловую радыёперадачу. Як найбольшы эксперт у беларускай мове, ён ахвотна служыў усім нам сваёй радай ці проста дапамогай пры розных нагодах. Ён чытаў рэфераты, ладзіў літаратурныя вечары. Не раз запрашалі яго на літаратурныя вечары тутэйшыя ўкраінцы, пра што згадвалася й у «Беларусе», і ў украінскай прэсе.

Святой памяці Алесь Салавей быў вельмі ахвярным чалавекам, асабліва калі збіраліся ахвяры на розныя нацыянальныя патрэбы, як выданне падручнікаў, выдавецкі фонд газеты «Беларус», хоць кожны даляр прыходзіўся яму нялёгка — увесь час працаваў ён на фабрыцы.

26 студзеня сёлета на вечны супачынак святой памяці Алеся Салаўя праводзілі шматлікія суродзічы з Мельбурна й ваколіцаў, хоць гэта быў звычайны працоўны дзень. На беларускай дзялянцы могілак Фокнэр развітваліся з нябожчыкам: сям'я, ягоны прыяцель Мікола Скабей, ад беларусаў Сіднея спецыяльна прыбылы сюды Міхась Лужынскі, ад Беларускага Цэнтральнага камітэта ў Вікторыі сп. Э. Яцкевіч ды ад Украінскага літаратурна-мастацкага клуба прафесар Д. Нытчэнка, вялікі прыяцель нябожчыка.

Першы раз спаткаў я святой памяці Алеся Салаўя ў Іллі ўвосень 1941 года. Гэта быў перыяд глуму і здзеку польскай паліцыі над

беларускім жыхарствам, асабліва над інтэлігенцыяй. Нябожчык быў без дай прычыны арыштаваны і толькі дзякуючы старанням беларускага актыву быў звольнены з турмы.

Пасля вайны я спаткаў яго ў Мельбурне ды пасябраваў з ім. Ён неаднаразова гутарыў са мной пра свае літаратурныя працы ды планы на блізкую будучыню. Між іншым, ён пісаў мне нядаўна, што «два ненадрукаваныя да гэтага часу зборнікі плануюцца да выдання аднэй кнігай пад назовам «Нятускная краса» разам з пазней напісанымі вершамі».

Лёс, аднак, не дазволіў здзейсніць гэтых планаў. Передчасная смерць забрала ад нас чалавека, які мог бы яшчэ шмат зрабіць для дабра Бацькаўшчыны — Беларусі і для нас тут, у Аўстраліі.

Vale, Алесь Салавей! Хай прыязная аўстралійская зямелька будзе Табе пухам!

1978

Уладзімір Брылеўскі

НА ЎГОДКІ СМЕРЦІ АЛЕСЯ САЛАЎЯ

22 студзеня сёлета мінулі першыя ўгодкі перадчаснай смерці ў далёкай Аўстраліі выдатнага беларускага паэта-лірыка Алеся Салаўя. Не будучы крытыкам ні літаратураведам, не збіраюся пісаць аб ягонай творчасці, затое хачу пакінуць па ім пару словаў успамінаў, як аб чалавеку, якім я яго ведаў.

З Алесем Салаўём (сапраўднае імя й прозвішча — Альфрэд Радзюк) мне давялося пазнаёміцца, нейкі час працаваць разам, пасябраваць і нават жыць у супольнай кватэры ў часе апошняй вайны на пачатку 1944 года ў Рызе. Быў ён тады яшчэ вельмі маладым чалавекам. У вольны ад працы час, пераважна вечарамі, пісаў вершы й шмат чытаў, галоўным чынам паэзію, якая найбольш яго цікавіла. Можна сказаць, ён жыў паэзіяй. Матэрыяльны бок жыцця яго мала цікавіў, дык і цярпеў недастачу, холад у кватэры, часта недаядаў.

Побач з творамі Максіма Багдановіча й чужых класікаў захапляўся й некаторымі мадэрнымі паэтамі, усялякімі імажыністамі й футурыстамі з пачатку бягучага стагоддзя тыпу расейскага Ігара Севяраніна. Калі аднойчы Пётра Міранoвіч, выдатны беларускі ма-

стак, якому ён прысвяціў адзін з вершаў («Мастак») у сваім першым зборніку лірыкі «Мае песні», у гутарцы з паэтам шчыра сказаў яму, што любіць раннія творы Янкі Купалы й Якуба Коласа, а вершаў сучасных паэтаў не чытае, амаль абурыўся. Не мог сабе ўявіць, як гэта можна не чытаць вершаў?! Якраз у тым часе ён рыхтаваў да друку згаданы зборнік сваіх вершаў, які й выйшаў у ліпені таго ж года. Памятаю, ён прыдумаў некалькі варыянтаў загалоўка гэнага зборніка, але ніводзін яго не задавальняў. Я тады яму запрапанаваў, што паколькі ён Салавей, дык найлепш назваць зборнік проста «Мае песні», з чым ён неяк лёгка згадзіўся. (Дарэчы зазначыць: на першай бачыне падараванага аўтару гэтых успамінаў паэт собскаручна напісаў: «Міламу Уладзіміру Брылеўскаму, майму дарагому сябру й супрацоўніку пры выданні гэтае кнігі. Алесь Салавей. Рыга, 20 ліпеня 1944 г.»)

У прыватным жыцці Алесь Салавей быў чалавекам вельмі сціплым, мяккага характару, крыху нясмелым, але шчырым і сяброўскім, вельмі сентыментальным, крыштальна сумленным. Стараўся дапамагчы другому чалавеку ў бядзе. Быў гарачым, але не крыклівым, беларускім патрыётам, без эфектацыі й дэкламавання аб сваім патрыятызме. Не любіў хвалькоў, гіпакрытаў, пустазвонаў, самалюбаў, эгаістаў, людзей позы й таннага эфекту, апанаваных маніяй вялікасці.

Быў ён вельмі чулым на чужое гора. Памятаю, у нашай кватэры СД арыштавала нейкага летувіса, сваяка нашай гаспадыні, які прыехаў з Коўні й зайшоў, каб з ёй пабачыцца. Алесю Салаўю гэта прыгадала арышт бальшавікамі ягонага бацькі ў 1937 годзе і ягоны ўласны ўвосені 1941 года, калі яго арыштавала ў Іллі (у Вялейскай акрузе) польская паліцыя ў нямецкай службе. Ён не мог супакоіцца, аж пакуль мы ўдваіх не пайшлі ў гатэль, у якім быў затрымаўшыся гэны летувіс, і папрасілі гатэльную адміністрацыю, каб яна паведаміла аб арышце жонку арыштаванага. Гатэльная служба вельмі здзівілася, што мы, зусім чужыя, нават незнаёмыя гэтаму летувісу людзі, прыйшлі з такой просьбай, але ўсё ж просьбу нашую выканала — пры нас жа затэлефанавала ў Коўню й перадала жонцы арыштаванага сумную вестку. Калі мы, выходзячы з гатэля, ёй шчыра падзякавалі, яна нам сказала: «Мы, латышы — вельмі чэрствыя, а вы, славяне — зусім іншыя».

Ужо на вуліцы, калі мы вярталіся дамоў, Алесь Салавей, хоць практыкуючым каталіком не быў і нават лічыў сябе вальнадумцам,

з вялікім аблягчэннем мне сказаў: «Як добра, што мы выканалі хрысціянска-маральны абавязак». І расказаў мне тады пра сваю неспадзяваную, вельмі непрыемную сустрэчу ў Рызе, у публічным месцы (здаецца, у рэстаране), з шэфам нямецкага СД у Вялейцы Гравэ, аб якім піша Язэп Малецкі ў сваёй кнізе «Пад знакам Пагоні». «Гравэ ўгледзеўся ў мяне, — казаў Алесь, — і спытаўся: — Дзе я вас бачыў?» Алесь не разгубіўся і спакойна адказаў: «Вы, напэўна, памыляецеся, бо я вас зусім не ведаю».

Пазней, увосені 1944 года, нашая гаспадыня (жонка Мікалая Дзямідава, старога беларускага вайсковага і асветна-грамадскага дзеяча, у часе Другой сусветнай вайны акруговага школьнага інспектара ў Лідзе) казала мне, што Алесь Салавей, выязджаючы ў жніўні таго ж года з Рыгі, вельмі шкадаваў, што мяне з жонкай не было ў той час у Рызе, што мы маглі б выехаць разам з ім. Ад Рыгі нашыя шляхі разышліся, і ўжо ніколі мне не давялося зноў сустрэцца з Алесем Салаўём.

1979

Мікола Ганько

Я ПАМЯТАЮ

Восень 1945 года. Здаецца, што я астаўся сам-адзіны беларус на цэлым свеце. Кругом чужыя людзі. Але неяк аднаго вечара пасля працы, у гутарцы з адным украінцам, выйшла, што ён спатыкаў беларусаў у ІІ Украінскім лагеры ДП. Я з нецярплівасцю выпытаў што мог і на другі ці трэці дзень, калі быў вольны ад службы, пайшоў шукаць Беларускі камітэт, як мне было сказана.

Радасці маёй не было граніцаў, калі я пазнаёміўся з сп. А. Грыцуком і сп. Вольгай Дуброўскай, што працавала сакратаркай у Камітэце. Пры дапамозе сп. А. Грыцука я прыпісаўся да гэтага лагера ДП, дзе знаходзілася кучка беларусаў. У вольныя дні пачаў наведваць і знаёміцца з іншымі асобамі сціплай беларускай групы ў Зальцбургу (Аўстрыя). Зборным пунктам і цэнтрам дзейнасці нашай групкі была кватэра сп. А. Грыцука. Такім чынам, у вольны час прошаныя і няпрошаныя асобы кожнай пары дня й вечара туды накіроўваліся.

Побач праз нейкі час памясціліся яшчэ дзве сям'і — сп-ва Розумавы і сп-ва Кадлякі.

Можа, месяц перад Калядамі 1945 года меў я нагоду бліжэй пазнаёміцца з суседзямі сп. Грыцука. Вечар пачаўся нармальна, па беларуску. Субяседнікі пакрысе павясялелі. Розныя тэмы. Раптам малады вусаты чалавек звяртаецца да гаспадара кватэры:

— Алёша, паслухай… Ялінка, дзеці і агні… Нядобра нам адным.

Я асмеліўся, падсоўваюся бліжэй. Мо яшчэ штось пачую, музыка слоў для мяне прыямнейшая за ўсялякі пачастунак.

Мой новы сябра просіць называць яго па імені — Алесь Салавей.

Шмат разоў давялося мне насалоджвацца дэкламацыямі сырых твораў Алеся Салаўя. Шмат разоў паэт прасіў крытыкі звычайнага чалавека, якому хацеў перадаць свае пачуцці.

Дзесь вясною 1946 г. у вярхушкі беларускага грамадства ў Аўстрыі нарадзілася думка выдавання інфармацыйнага лістка для беларусаў, што знаходзіліся ў лагерах ДП ў Аўстрыі. Друкарні дастаць было нельга, ды й не было грошай. Я запрапанаваў сваю дапамогу, калі будзе згода, адбіваць на ратaтары. Заарганізавалася рэдкалегія. Не прыходзіць у галаву, хто быў рэдактарам, але здаецца — Ул. Дудзіцкі. Сябры — А. Грыцук Алесь Салавей, сп. Вольга Дуброўская — сакратаркамашыністка, ну і я — «Скарына», як мяне называлі. Рэдактар быў вельмі ненадзейны, ніколі своечасова нічога не напісаў. Найбольш адміністрацыйнай працай і пісаннем артыкулаў на гістарычныя тэмы займаўся сп. Аляксей Грыцук. Душой часопіса быў Алесь Салавей. Вялікае пачуццё абавязку, пачуццё патрэбы афармлення і добрага мастацкага зместу ляжала на плячах Алеся Салаўя. Захаванне чысціні мовы, ці то ў прозе, ці то ў паэзіі, заўсёды было на першым плане.

У тых мізэрных абставінах ДП-лагероў дрэнная папера, гнілыя УНР-аўскія матрыцы, паламаны ратaтар часамі даводзілі Алеся Салаўя да адчаю. Аднак ён стараўся, каб часопіс выйшаў у час і ў магчыма добрым выглядзе, і з належным зместам. Аднаго разу УНР-аўскія матрыцы былі амаль непрыдатныя да ўжытку. Разлазіліся на ратaтары. Алесь злаваўся, наракаў на ўсіх супрацоўнікаў, а найбольш дасталося мне — друкару. Вымазаныя друкарскім чарнілам рукі пакідалі сляды пальцаў на паперы. Алесь раптам выкрыкнуў:

— Ах ты, Вэрцік!

Пасля, калі часопіс быў неяк змучаны, я запытаўся ў яго, хто такі гэты Вэрцік? Алесь выясніў, што ў іхнім сельсавеце быў такі пісар:

што б ні ўзяў у рукі, усё было замазана чарнілам. Вось таму я і дастаў тую мянушку.

Наколькі я магу сяння меркаваць, тая пара ў жыцці Алеся Салаўя была адной з найбольш творчых. Штонекалькі дзён меў я нагоду знаёміцца з новым вершам паэта. Ён прасіў крытыкі. Я, паводле свайго разумення, выказваў сваю думку.

Дзесь улетку 1947 г. выйшлі на прагулку па-над узбярэжнай ракі Зальцах. З грудной кішэні Алесь дастаў паперку і пачаў чытаць верш. Які — сяння не памятаю. Я настрою не меў і проста не хочучы, на адчэпнае, сказаў:

— Слаба, Алесь, ты мог бы лепш напісаць.

Алесь памалу скамечыў лісток у руцэ і кінуў у бок ракі.

Ахамянуўшыся, я падняў лісток і пачаў апраўдвацца, што я толькі з няўвагі даў такую апінію, нават не падумаў, што гавару. Верш я захаваў і праз некалькі дзён звярнуў яго Алесю. Доўга мы дыскутавалі над тым вершам і пасля нейкага часу я ізноў чуў яго ў зменённай форме. Той верш надрукаваны ў зборніку «Сіла гневу».

Я падаю гэты памятны мне факт таму, што ён адлюстроўвае пачуццё паэта да акружэння. Алесь вельмі цаніў апінію сваіх сяброў, асабліва калі яна была шчырая, а шчырасць Алесь вельмі лёгка мог адрозніць ад фальшу.

Пачалася эміграцыя. Людзі памалу пачалі выязджаць з лагероў ДП у розныя краіны. Алесь Салавей з жахам гаварыў пра патрэбу выезду за акіян. Вельмі перажываў ад думкі, што яшчэ далей прыйдзецца аддаліцца ад роднай зямлі. Якраз у часе гэтых ягоных выказванняў можна было адчуць ягоную нязмерную любоў да сваёй Бацькаўшчыны, да роднай зямлі, да свайго народа. Пры такіх размовах і пасля іх Алесь траціў на даўжэйшы час настрой. З гэтага прыгнечанага настрою нармальна выцягваў сп. Грыцук, або абавязак выдавання наступнага нумара часопіса змушаў яго ўзяцца за працу, і хандра праходзіла.

Дзесьці ўзімку 1947 г. з прычыны недахопу паперы й матрыцаў спыніўся выдавецкі пачын «Беларускага жыцця». Усе пачалі паважна думаць над выездам куды-небудзь. Канец 1947-га й першая палова 1948 г. раскінула нашу калонію ў Аргентыну, Канаду, Ангельшчыну, ну й нарэшце Алесь Салавей са сваёй сям'ёй падаўся ў Аўстралію.

Як відаць з ягоных лістоў, у Аўстраліі ён вельмі тужыў за далёкай Бацькаўшчынай, за недахопам арганізаванага беларускага жыцця, за друкаваным словам, якое так цаніў і любіў.

Я чуюся багаты на цэлае маё жыццё тым, што быў, працаваў і меў нагоду чуць жывое слова сапраўднага паэта і вялікага патрыёта беларускага народа.

1980

ЛІСТ ЗІНАІДЫ КАДНЯК АНТОНУ АДАМОВІЧУ

6 снежня 1979 г.

Дарагі дзядзька Антон!

Ужо прайшло шмат часу, як я абяцала напісаць. Зараз не працую, абставіны злажыліся так, што я змушана была пайсці на пенсію. Пакуль што не раблю ніякіх планаў, бо ніколі не выходзіць, як думаеш. Хаця не працую на фабрыцы, але працы маю аж зашмат у доме. Зараз са мной жыве Юрка са сваёй сям'ёй. Ён закрыў свой бізнес, бо быў вельмі хворы, у выніку залез у глыбачэйшыя даўгі. Цяпер у бальніцы. Зрабілі нарэшце аперацыю, калі без ускладненняў, у суботу, можа, выпішуць. Можа, будзе здаровы і па-сапраўднаму возьмецца за жыццё. Ужо час.

За пісанне бяруся вельмі неахвотна. Усё адкладваю з дня на дзень, а час ляціць. Вось і Новы год стукае ў дзверы. Хацелася б напісаць кароценька пра сумеснае жыццё з Алесем, але не выходзіць, атрымоўваецца вельмі доўга. Колькі разоў пачынала пісаць і кідала.

Пазнаёміліся з ім увосень 1944 года ў Берліне праз Аўгена Кавалеўскага, які расказваў Алесю пра мяне, і яму хацелася пазнаёміцца з той «цудоўнай дзяўчынай», па словах Аўгена. Для таго каб атрымаць прадуктовыя карткі, патрэбны былі прыпіска й праца. Вось яго ўладкавалі бібліятэкарам пры Цэнтральнай Радзе. Алесь быў вельмі непрактычны ў жыцці, асабліва ў цяжкіх абставінах. Я старалася чым памагчы, мела магчымасць даставаць купоны на мяса, хлеб, так як ён у першы тыдзень «з'ядаў» свае купоны на мяса, на другі — заставаліся другія прадукты, на трэці —цукар, на чацвёрты — жыў выключна на чужыя. Я прапанавала мыць бялізну, бо мела для гэтага лепшыя ўмовы, чым у яго. Так як Аўген часта выязджаў на гастролі з групай артыстаў, я часта бачылася з Алесем.

Адносіны ў мяне да яго былі чыста сяброўскімі, я думаю, ён добра разумеў гэта. Калі Барткевіч (Аўген называў яго часам Мефістофелем) казаў, што з нас была б нядрэнная пара, я злавалася й казала, што такі тып людзей мне не падабаецца, гэта не мой ідэал. Тым часам бамбардзіроўкі Берліна значна ўзмацніліся, і шмат хто з нас падумваў пакінуць горад. Пасля асабліва вялікай бамбардзіроўкі 6 студзеня 1945 года быў дадзены загад разгрузіць Берлін. У некаторых месцах можна было атрымаць пропуск на выезд без усякіх дакументаў, сказаць, што яны загінулі ў час бамбардзіроўкі, і немцы верылі. Алесь, Масей Сяднёў і Сядура часта ездзілі па горадзе, асабліва пасля бамбардзіроўкі, на дармовую гарохаўку. У разбітыя раёны пасылалася паходная кухня, дзе дармова давалі абеды. У адным з такіх месцаў яны даведаліся, што можна атрымаць пропуск. Алесь узяў на сябе й на жонку, запісаўшы маё імя. Узяў таксама й Сядура. Гэта быў маршрут Прага — Вена — Брэгенц. Алесь прыехаў увечары з гэтай навіной. Я пагадзілася ехаць, бо маршрут спрыяў мне. З апошняга ліста ад Аўгена я ведала, што яны знаходзяцца ў Вене, я спадзявалася сустрэцца з ім. Па дарозе мы застанавіліся на пару дзён у Празе, у Сядуравай маці, якая жыла там у той час. Там сустрэліся з Ларысай Геніюш. Масей і Алесь адведалі яе. Калі прафесар П. Жарскі (ён таксама быў там) і Ларыса Геніюш прапанавалі мне застацца ў Празе, бо толькі жанчын у той час прыпісвалі, Алесь паспяшаўся ехаць у Вену.

Па прыездзе ў Вену мы завіталі да П. Мірановіча. Ягоная жонка сказала, што артысты выехалі пару дзён назад, не ведала, куды. Бо адны стаялі за тое, каб ехаць назад, у Берлін, другія — у Брэгенц. Я не ведала, на што Алесь спадзяваўся, калі браў пропуск на мяне. Ён добра ведаў адносіны паміж мной і Аўгенам як ад мяне, так і ад Аўгена. А можа, я была такой наіўнай? Алесь заўсёды стараўся нагаварыць мяне супраць Аўгена (здавалася, яны былі сябры), асабліва пра ягоную сувязь з «каралевай» — так называлі тую расейку, што стаяла на чале артыстычнай трупы. Аб гэтым усім я ведала ад самога Аўгена. Наракаў, што з-за мяне пакінуў сяброў.

Ваенныя абставіны, няпэўнасць у Аўгенавым пачуцці пад уплывам Алесевых нагавораў (пазней я пераканалася ў шчырасці Аўгена), а галоўнае, мне было шкада Алеся, і я пагадзілася стацца ягонай жонкай. Можа, так і сталася, як пісаў шмат пазней Аўген: гэтым я зрабіла

ўсіх трох няшчаснымі. Я паставіла крыжык на мінулым, але нялёгка было трываць. Алесь без усялякіх прычынаў быў вельмі зайздросны. Не раз ён прыносіў часапісы, дзе друкаваў Кавалеўскі свае п'есы, і казаў: «На, прачытай, што піша табе твой Аўген». Праўда, часам там траплялся ягоныя або мае словы, укладзеныя ў вусны дзеючых асоб. (Гэта было тады, калі мы жылі ў Зальцбургу.)

За гэты час мы пазнаёміліся з А. Яцэвічам (Алесем Змагаром). Ягоная жонка Валя вучылася з Алесем у Беларускім педагагічным тэхнікуме ў Менску. Тым часам фронт набліжаўся, і быў час пакінуць Вену. Яцэвіч ужо даўно нагледзеў возік у адным з двароў і проста «пазычыў» без спросу. Ён меў шмат рэчаў, у нас жа было па пары валізак, якія мы маглі ўзяць з сабой, і кожны праязджаючы грузавік мог нас падабраць. Але Алесь пагадзіўся трымаць кампанію. Гэта быў вельмі даўгі шлях. Так у дарозе Алесь сустрэў свой 23 год нарадзінаў. Яцэвіч неразлучны быў са сваім пузатым партфелем, у якім насіў свае вершы. І калі астаноўліваліся дзе ў баўэра на начлег у клуні, ён казаў, што ён «шрыфштэлер» (аўстрыйцы мелі павагу да пісьменнікаў), часам яго запрашалі ў дом на кухню; тады ён паважна садзіўся за стол, з кішэні вымаў чарніліцу, з партфеля ручку й паперу й штосьці пісаў. Алесь толькі смяяўся з яго.

Пасля мы далучыліся да маладой пары галічанаў, якія працавалі ў баўэра на валох, а потым з'ехалі з імі і доўгай арбой. Вось да гэтай арбы мы прычапілі свой возік, а самі ўсе ўладкаваліся на арбе; было куды лягчэй, бо не трэба было цягнуць возік. Так мы ехалі ў кірунку Зальцбурга, аж пакуль не нагналі нас амерыканцы. Гэта было каля мястэчка Кірхгайм, там амерыканцы далі нам кватэру, папрасілі немцаў пацясніцца. Іх перасялілі ўсіх на больш высокі паверх, а нас пасялілі ўнізе. Там мы жылі да глыбокай восені. За гэты час ездзілі ў Зальцбург у разведку. Там ужо быў Уладзімір Дудзіцкі са сваёй Люсяй. Ва ўкраінскім лагеры «Ленарказэрнэ» быў Аляксей Грыцук кватэрмайстрам. Дзякуючы яму мы атрымалі там кватэру.

Гэтыя гады ў Зальцбургу былі самыя пладатворныя. Алесь пазнаёміўся там з украінскімі паэтамі й пісьменнікамі. Напісаў шмат вершаў, піць ён шмат не мог у той час, бо не меў за што. У красавіку 1946 года нарадзіўся першы сын Міхась, а ў ліпені 1947 года — дачка Анна. Па сваёй натуры Алесь не быў сямейным чалавекам. Ён не любіў дзяцей, ніколі не меў часу для іх. Лічыў перашкодай і лішнім

клопатам. Я старалася з дзецьмі не перашкаджаць яму. Мы мелі магчымасць пераехаць у Баварыю, але ён не хацеў ехаць з-за Аўгена. Ён баяўся, што я змагу там аставіць яго. Ведаў, што Аўген не паглядзіць, што [redacted] маю двое дзяцей. У гэтым ён не памыляўся.

Прыйшоў час, што трэба было думаць, куды падзецца, якую краіну выбраць на пастаяннае жыццё. Як і шмат іншых, Алеся цікавіла Аўстралія. Падалі паперы на дазвол на ўезд ў Амерыку і Аўстралію. Здаліся на лёс, куды дазвол прыйдзе першым. Першым атрымалі ў Аўстралію. Тут мы і апынуліся. Па дарозе ў Аўстралію ў італьянскім порце сустрэлі знаёмага з Нямеччыны, ад якога даведаліся, што Аўген выехаў у Францыю. Нашыя дарогі разышліся назаўсёды.

Цяжка было прызвычаіцца да працы: фізічную Алесь не любіў, але не стараўся здабыць лягчэйшую працу. Ён мог бы вучыцца або мог бы ўладкавацца працаваць на пошту. Ягонае веданне ангельскай мовы дазваляла на гэта. Але ён спасылаўся на тое, што там мала плоцяць. Ён ніколі не слухаў маёй парады. Слухаў работнікаў, з якімі працаваў. Яны былі задаволеныя на фабрыцы, бо былі спрытнейшымі й зараблялі болей за яго, асветы ж яны не мелі. Толькі тады, калі пасля 20 год працы на адным месцы яго звольнілі, і ён амаль што нічога не атрымаў за гэта, зразумеў, што дрэнна зрабіў, што не слухаў мяне. Але ўжо было позна.

Алесь вельмі змяніўся, працуючы на фабрыцы. Зжыўся з работнікамі, пачаў гутарыць такой жа мовай, як і яны, ужываючы брудную лаянку, зрабіўся непазнавальным. На людзях ён быў карэктным, мог кланяцца, дзесяць разоў прасіць прабачэння, дзякаваць. Умеў падабацца жанчынам. (У маладосці ён быў сарамлівым у гэтым сэнсе, пазней жа вельмі асмеліўся.) І на пахвалы быў аматар. Кожнай звычайнай жанчыне ён мог нагаварыць столькі камплімэнтаў, што тая сапраўды пачувала сябе надзвычайнай. Або, будучы ў каго на абедзе, так расхваліць якую страву, як быццам ніколі такой не меў, і другія думаюць, які ж ён бедны, жонка не можа зварыць звычайнай стравы.

На кароткі час быў закаханы ў сп. Ліду Нікан. У іхным збліжэнні быў яе пачын, у яго ж не хапіла адвагі. Яна ж пасля разрыву з Калодкам прыхінулася да Алеся. Мы толькі што пераехалі ў Мельбурн. Ліда любіла кампанію, умела добра выпіць, мела нядрэнны голас, магла спяваць, любіла й разбіралася ў музыцы, цікавілася паэзіяй, ду-

маю, каб падабацца Алесю, мела шмат вольнага часу. У мяне ж было трое дзяцей і ўся гаспадарка. Я не магла ўдзяліць яму шмат часу, таму не мела нічога супраць Ліды. Таму яны ўдваіх часта сустракаліся, ездзілі ў кіно, наведвалі музеі і Бог ведама што. Але на перашкодзе стаў Мікола Скабей, які вырашыў выратаваць ад «няшчасця» дзве сям'і (ніхто яго не прасіў). Алесь, маючы сям'ю, не меў магчымасці траціць шмат грошай на старонку, для яго самога не хапала на выпіўку. Мікола Скабей мог дазволіць сабе гэта. Такім чынам, Алесь застаўся з носам. У ягоным беспрасветным жыцці хаця на кароткі час заззяла сонца, вярнулася натхненне, ён напісаў тады колькі добрых вершаў. Болей раманаў ён не заводзіў. Пераважна пасля працы заставаўся дома, запасаўся півам.

Любіў чытаць уголас вершы — свае, Сяднёва, другіх паэтаў, чытаў ахвотна Лермантава, Пушкіна — усё з памяці. Памяць ён меў надзвычайна добрую. У апошнія гады жыцця яна крыху прытупілася. Лёгка пісаў вершы пры якой-небудзь аказіі за сталом, пры бяседзе ці то на дзень народзінаў, ці на вяселле або якія другія прычыны. Вершы фармаваліся адразу ў ягонай галаве. Пісаў гумарыстычныя, часам сатырычныя. Але гэтыя вершы ён не лічыў мастацтвам, а таму нідзе не друкаваў. Нічога не засталося ад іх — усё знішчыў. Калі б можна было сабраць усё тое, што ён напісаў, то атрымалася б немалая кніжка. Ён пакідаў і друкаваў толькі тое, што, на ягоную думку, было добра напісана.

Я не разумею, у яго было такое вялікае жаданне пісаць, што ён лічыў сябе нешчаслівым таму, што не меў магчымасці пісаць, але не стараўся палепшыць умовы. Ён лічыў, што толькі на сваёй роднай зямлі ён зможа па-сапраўднаму пісаць. Зайздросціў сваім сябрам па пяры — тым, з кім быў на курсах маладых пісьменнікаў, адчуваў недахоп у асвеце. Ён ніколі б не асмеліўся наведаць сваю Бацькаўшчыну. Я была ўпэўнена, што калі б яму далі дазвол на адведзіны, то яго б не затрымалі. Але страх, хранічны страх перад міліцыяй і другімі органамі бяспекі ў яго застаўся назаўсёды. Ён назаўсёды запамятаў тую ноч 1937 года, калі арыштоўвалі ягоных бацькоў. Уся брутальнасць часта паўставала перад ягонымі вачыма. Ягоныя бацькі былі рэабілітаваныя пасля іхнай смерці.

Па сваёй натуры Алесь не быў сямейным чалавекам. Яго змусілі абставіны, бо не змог глядзець за сабой. Вядома, у лепшых матэры-

яльных абставінах, маючы грошы, ён бы пражыў добра. Найтанней было мець жонку, якая і памые, і накорміць, яшчэ й грошы заробіць, якую можна лічыць за собскасць.

Яшчэ калі мы толькі пабраліся, ён напісаў:

Ажаніўся. Ой, Божа мой, Божа!
Я ніколі не сніў, не гадаў,
Што мяне і сагне, і стрыножа
Нявыноснае гора-бяда.
Ажаніўся — быць мужам і толькі,
А паэтам — ім можаш не быць.
І ўтыркай пад пазногці іголкі,
І цярпі, не кажы, што баліць.

Калі я запытала, чаму ён так напісаў, ці сапраўды так ёсць, бо я, наадварот, старалася не перашкаджаць яму, але сапраўды ён так адчуваў, хаця тады казаў, што напісаў абы напісаць.

На людзях Алесь быў вельмі ветлівы, ніколі нікому не сказаў дрэннага слова, кожнаму хацеў дагадзіць, калі яго штосьці папросяць зрабіць. Дома ж ён быў зусім іншы. Аб дрэнных ягоных баках можна было б успамінаць вельмі шмат, але ніхто не паверыць, толькі пару блізкіх людзей ды жонка ягонага брата, бо брат ягоны не лепшы. Няхай жа застаецца такім, якога ведалі людзі, з якімі яму даводзілася сутыкацца.

Аднойчы, незадоўга перад ягонай смерцю, я запытала, чаму ён мне не прысвяціў ніводнага верша, хаця пісаў шмат, але не друкаваў. Толькі адзін надрукаваны, ды й там напісаў — Сяднёву. На гэта ён адказаў, што ўсё, што ён напісаў пасля вайны, гэта толькі дзякуючы мне. Я часта думаю, мяне шмат хто вінаваціць, у тым ліку і ягоны брат, што я была замяккай да яго. Трэба было змусіць яго, каб не піў. На што я брату ягонаму адказала: «Ці зможа цябе жонка ўстрымаць? Толькі партыйная дысцыпліна цябе трымае, бо даўно б страціў працу».

Я ж не такой натуры, каб змушаць. А пры тым пытанне, ці напісаў бы ён тады й палову таго, што напісаў?

Я ўсё ж цвёрда веру ў тое, што вялікая тэмпература пры ягонай цяжкой працы, на якой ён быў апошнія два тыдні, спрычынілася да ягонай смерці. Бо ён такі змучаны прыязджаў з працы, што я настойвала, каб кінуў працу, лепш пасядзеў на беспрацоўнай плаце. Ён пагадзіўся, даў слова, што ў панядзелак пакіне працу, а ў нядзелю яго не стала.

Якім бы ён ні быў, але мне бясконца яго шкода, што так рана адышоў ад нас. Усё ж думалася, калі б дажыў да пенсіі, калі б скончылася ягоная праца на хлеб штодзённы, ён бы спыніў піццё, можа, шмат яшчэ чаго напісаў.

Які ён ні быў смелы ў доме, але на працы не мог абараніць сябе, і кожны мог ім папіхаць і смяяцца з яго, асабліва апошні год на працы, калі ягоным начальнікам стаўся паляк Адам, якому пашчасціла працаваць на гэтай фабрыцы ад самога прыезду ў Аўстралію, і ён нарэшце выбіўся ў «босы» й хацеў паказаць, што можа пасылаць кожнага на работы, куды захоча, ды яшчэ мае права падганяць. Не адзін раз я такая была злосная, што ўжо хацела ісці сама на фабрыку ўбачыць гэтага паляка, хоць бы вылаяць яго. Але шкадавала Алеся, каб не смяяліся з яго, што жонка прыйшла ў абарону.

ЛІСТ ЗІНАІДЫ КАДНЯК АЛЯКСАНДРУ КАЛОДКУ

6 студзеня 1979 г.

Паважаны спадар Калодка!

Я дасылаю біяграфію Алеся, не закранаючы жыцця ў Аўстраліі. Аўстралійскае жыццё Вам вельмі добра знаёмае. Шкада, што яно сталася такім цяжкім да яго. Я ўвесь час шкадавала, што не паслухала парады жонкі мастака Пётры Міравовіча, з якой я пазнаёмілася ў Вене, а потым давялося яшчэ жыць які час у адным лагеры Глязэнбах, недалёка Зальцбургу. Яна мне раіла не пагаджацца ехаць у Аўстралію, бо там, у глушы, загінем. Калі я адмоўлюся ехаць, то не паедзе й Алесь. А я думала, нам прыйдзецца працаваць фізічна, Алесь быў ні да чаго не падрыхтаваны, бо работа канвеерная, трэба быць хуткім і спрытным, на што ён не меў здольнасці. У Аўстраліі ж, як пісалі, працуюць павольна. Мелі выраблёныя дакументы ў ЗША й Аўстралію. Чакалі, куды прыйдзе выклік першы, прыйшоў у Аўстралію, сюды й прыехалі. Думку, каб паехаць у Аўстралію, падаў Антон Адамовіч. Алесь спачатку захапляўся зусім нязнаным Новым Светам з новым сузор'ем, новым небам. Пісаў, што шматлікія збіраюцца ехаць сюды. Але потым, добра разгледзеўшыся, напісаў, якія перспектывы чакаюць інтэлектуальных працаўнікоў у будучым (яго не цікавіў матэрыяльны бок жыцця). Атрымаўшы гэты ліст, усе ў Еўропе павярнулі аглоблі ў ЗША. Потым яго стараліся сцягнуць

адсюль. Двойчы прысылалі афіцыйнае запрашэнне на працу ў радыё «Свабода». Ён адмовіўся з прычыны той, што на радзіме засталіся ягоныя брат з сястрой і сваімі сем'ямі.

Ён быў на рэдкасць дзіўнай асобай. Мне прыходзілася часта сустракацца з пісьменнікамі й паэтамі, як у Берліне, так і ў Зальцбургу, ягонымі сябрамі, як сваімі, гэтак і ўкраінскімі. Яны стараліся змірыцца са сваім лёсам, былі шмат рэчаістымі. Стараліся набыць неабходную асвету, каб у будучым не працаваць фізічна, каб мець болей магчымасцяў займацца ўлюбёнай працай. Многія мелі сем'і, дзеці для іх былі пацехаю, стараліся быць блізкімі з імі. Алеся ж нічога не цікавіла. Ён жыў у прыватным свеце надзямным. Мне здаецца, ён ніколі па-сапраўднаму не апусціўся на зямлю абедзвюма нагамі. Напрыклад, ён строіў планы, яму здавалася «ўсё як мае быць», як ён заўсёды казаў, а калі пойдзе ды яшчэ памоліцца Богу, то ўжо зусім будзе добра. Але так не заўсёды было, як ён планаваў. І тады ён у роспачы ўцякаў ад рэчаіснасці ў палон ці царства алкаголю. Ён стараўся змагацца з ім і верыў, што толькі стоіць яму пайсці ў «гэтую клініку», што ў Морэландзе, і ўсё будзе «як мае быць». Але, каб вырвацца з палону алкаголю, патрэбна было сапраўды быць моцным сілай волі, патрэбна было цярпець, да чаго ён не прывык.

Найцяжэйшыя часы для яго былі пару гадоў пасля арышту бацькоў. Калі ж ён пайшоў на працу ў Лагойск, атрымоўваў нядрэнную зарплату, бо апрача выканання абавязкаў заступніка рэдактара газеты ён пісаў артыкулы й вершы, за што плацілі ганарар. У ваенны час пакутаваць яму па-сапраўднаму шмат не давялося, як, прыкладам, Вам, хіба толькі голад, а хто яго не зазнаў? Ажаніўся, лічыў гэта за няшчасце, але ж я яго ніколі не трымала. Праўда, быў вельмі рады, калі нарадзіўся першы сын, але з'яўленне апошніх двух лічыў за няшчасце. А ён жа іх не выхоўваў. Ён не ведаў, колькі каштавалі кніжкі, уніформы ды ўсё другое, бо гэта ўсё было маім абавязкам, я плаціла за ўсё, ён жа гэтыя расходы падаваў падаткавікам. Між тым, толькі сям'я яго ўтрымоўвала, бо такім незарадным у жыцці ён загінуў бы даўным-даўно. Я старалася як мага аблегчыць ягоны стан жыцця. Часта яго дакаралі за тое, што ён бярэ мала ўдзелу ў беларускім жыцці (яскравей адказаў у вершы «Мала»).

Ён быў не палітык, у яго шмат вершаў было патрыятычных, ён верыў у тое, што пісаў, але з гадамі траціў надзею на будучыню. Ён пісаў мастацкія вершы на вышыні класічнай літаратуры. Яму хаце-

лася, каб мова беларуская была не мовай «простай», як пераважна думаюць нашыя будзённыя людзі й саромеюцца ў ёй гаварыць, карыстаюцца расейскай або польскай мовамі.

Часта яго дакаралі за тое, што мала браў удзелу ў беларускім жыцці. Але ў першыя гады ў Аўстраліі ён быў даволі актыўным. Яшчэ пры жыцці сп. Уладзіміра Аксючыца. Тады яшчэ беларусы не мелі свайго Дому, але як была пастаўлена культурная справа! Тады Алесь з галавой акунуўся ў гэту працу, будучы культурным рэферэнтам. Колькі было падрыхтавана й пастаўлена пастановак, дэкламацыяў пры кожнай нагодзе! Тады ён не шкадаваў часу й да чаркі прыкладаўся вельмі мала. Тады з ім яшчэ лічыліся й слухалі ягоныя парады ў мове, яго яшчэ выдзялялі.

Але чым больш зжываліся з ім, тым больш рабілі яго нікчэмным. Уладзімір Шнэк зрабіўся адным з заядлых яго ворагаў, а чаму? Бо ён адмовіўся паправіць ягоную гістарычную аповесць «Драбы», матывуючы тым, што яе трэба перарабіць усю, на што ён не мае часу, дый тады твор стане не яго. Шнэк выдаў «Драбы» без Алеся, не ведаю, ці папраўляў хто, ці не. Алесь жа лічыў: друкаваць трэба тое, што сапраўды напісана на высокім узроўні. У нас тут, як ведаеце, развялося шмат паэтаў, і кожны сягае ўвысь.

Памятаю, як купілі Беларускі Дом, ён казаў: «Вось і сцэнка ёсць, хоць невялічкая, але ж усім можна будзе зрабіць штосьці». Але як ставіліся да яго? Што рабіла «паважаная» (не мной) спадарыня Яцкевіч? Ці сказала яму аб намеры паставіць п'есу (а ён жа быў культурны рэферэнт)? Не памятаю, ці змаглі яны паставіць тую п'еску. Нават не заікнуліся. Яна хацела мець лепш сп. Шайпака за суфлёра, што ледзь чытаць умеў.

А калі перадаваліся беларускія перадачы ў радыё? У тых артыкулах, якія падрыхтоўваў ён, Вы са сп-няй Яцкевіч прыдзіраліся за кожнае слова. Памятаеце — Мурэй, колькі Вы сапсавалі нерваў за гэта, а ён меў рацыю. А хто ведаў лепш беларускую мову, як не ён? Ён ёю толькі й жыў і ўсё сваё жыццё да апошняга часу цікавіўся кожным новым словам. Ведаў правапісы — як Тарашкевіча, так і новыя, савецкія.

Вельмі цяжка было яму змагацца з алкаголем, а ён стараўся, рабіў спробы, быў два разы ў шпіталі.

А недавер? Часамі было, калі ён завітае неспадзявана да аднаго ці другога Міколы, а там абгаварваліся пытанні аб дзейнасці Рады БНР, гутарка сціхала. Нават Аксючыц меў большае значэнне, бо ён быў

заходнік. А Алесь быў «крывіч», хаця і ўсходнік, ён лічыў сябе нашчадкам крывічоў.

Я шкадую, што аб сапраўдных абставінах не напісала Антону Адамовічу, можа, ён падзейнічаў бы на Алеся, каб выехаць адсюль. Прыехаўшы сюды, пабыўшы пару дзён, ён сам з'арыентаваўся, у якой абстаноўцы апынуўся Алесь, і дакараў мяне, чаму я нічога не напісала яму аб гэтым.

«Алесь Салавей — найвыдатнейшы з тых паэтаў, што прыйшлі ў літаратуру і выявіліся ў часе Другой сусветнай вайны ды выехалі на эміграцыю», — гэта словы тых, хто крыху разумеецца на паэзіі. Такая апінія аб ім як у ЗША, так і ў Еўропе.

Мне здаецца, за 33 гады сумеснага нялёгкага жыцця шмат чаго было ахвявана на тое, каб як мага болей даць магчымасці Алесю пісаць. Незадоўга перад канчынаю, калі ён сабраўся выдаць свой зборнік, я запытала, чаму ён ніколі не прысвяціў мне ніводнага верша. А было іх напісана шмат. Адзін быў змешчаны ў зборніку «Сіла гневу», і то не падпісаны. Замест прысвячэння мне ён узяў эпіграф з верша М. Сяднёва. Алесь тады адказаў: «Усё, што напісана пасля вайны, — гэта заўдзяка табе, без тваёй дапамогі я не напісаў бы і дзесятую частку». Я не хвалюся, але так было.

І яшчэ балюча адно. Як падалі ў прэсе, так і паміж усімі вамі адно перакананне: памёр таму, што піў. А ён стаў ахвярай таму, што не мог пастаяць сам за сябе. Такі паляк Адам, якому пашчасціла на той працы быць ад самага пачатку прыезду і які за болей чым 20 гадоў працы выбіўся ў начальнікі, мог здзекавацца над ім. Апошнія ягоныя тры тыдні працы ў час адпачынку спрычыніліся да ягонай смерці. Напружаная праца пры тэмпературы да 1300 ля загартовачных печаў, а галоўнае — стрэс, духовае перажыванне, здзек над ягонай душой — вось, што спрычынілася да яго смерці. Спецыялісты гэта пацвердзілі. «Памёр на моры ў часе купання», — бо я яго ўзяла, каб адпачыў, быў ён у вельмі дрэнным стане.

Веру ў тое, і ніхто з вас мяне не пераканае ў адваротным: каб дажыў да пенсіі, калі б не трэба было працаваць на «хлеб штодзённы», ён бы шмат яшчэ напісаў, бо жаданне пісаць перамагло б. Ведама, зусім піць не перастаў бы, бо гэта дапамагала яму ляцець увысь, да зораў, у царства музаў.

Прашу прабачыць, калі што не падабаецца з успомненага.

З прывітаннем да Вас — *Зіна Кадняк*.

ЛІСТ ЗІНАІДЫ КАДНЯК ЛАРЫСЕ ГЕНІЮШ

7 лютага 1978 г., Мельбурн

Дарагая Ларыса Антонаўна!

Здаецца, упершыню за ўвесь гэты час, калі не стала Алеся, спала ўсю ноч, нават не чула будзіка, які званіў, і ледзь не спазнілася на працу.

Першыя чатыры дні, пакуль не пахавалі яго, я была як скамянелая, нават плакаць не магла. Нягледзячы на тое, што Алесь памёр на маіх вачах, мне не хацелася верыць, што дні яго ўжо скончаныя. Было шмат працы, трэба было ўсё ўладзіць, купіць адзенне, бо ён ніколі не турбаваўся пра вопратку… І толькі на наступны дзень, калі [redacted] вярнулася на працу, і мае таварышкі сталі выказваць спачуванні, я расплакалася — не магла за слязьмі, якія душылі мяне, гаварыць.

Вось і цяпер сяджу на працы, а ў галаву лезуць розныя думкі, успамінаецца добрае і дрэннае. Як звычайна бывае ў такі цяжкі момант, усё дрэннае здаецца драбніцай. Хоць і лічыў Алесь сям'ю цяжарам і мала рабіў для яе, тут, на эміграцыі толькі сям'я яго і трымала.

Скончыліся ягоныя духовыя мукі. Да гэтага часу я не ўпарадкавала ў яго пакоі, здаецца, ён зараз прыедзе з працы. Прагледзела на стале яго кнігі і лісты, патрэбныя мне дакументы. Так і не скончыў ён збіраць усё напісанае, а хацеў скласці ўсё надрукаванае і ненадрукаванае ў адзін зборнік, сабраць грошы і выдаць. Друк у нас, асабліва кірыліцай, вельмі дарагі. Грошай, што назбіраў, ледзь хапіла на паховіны. Помнік жа будзе каштаваць яшчэ болей. Ды неяк усё ўладзіцца.

Яшчэ гады два таму назад Алесь неяк загаварыў пра тое, што мушу зрабіць з яго рукапісамі ў выпадку, калі ён нечакана памрэ. Тое я і зраблю цяпер. Памаленьку дам сабе рады. Час загоіць раны.

Бадай, ён адзіны на эміграцыі з нашых, хто так цяжка перажываў страту Маці-Радзімы і не мог змірыцца з лёсам. Часта казаў: «Лепш памерці, чым так жыць». Гэты смутак і боль пакрыў яго душу панцырам, зрабіў яго чэрствым. Я разумела яго, але разбіць той панцыр не мела сілы.

У Аўстраліі мы жылі спачатку ў Адэлаідзе, там мы адпрацавалі двухгадовы кантракт (Алесь адпрацаваў, я была з дзецьмі). Тады мы жылі ў лагеры, і кожны хацеў прыдбаць які ўласны куток. Заробак тады быў вельмі малы — штосьці каля 6 фунтаў у тыдзень, з якіх каля 3 бралі за пражыццё. Так што на спажытак заставалася мала.

Але мы купілі тады пляц за 50 фунтаў — на выплату, як і ўсе другія. Жывучы ў лагеры, мы пасябравалі з іншымі сем'ямі — як беларусамі, так і ўкраінцамі. Усіх нас злучыла падарожжа на параходзе, а потым жыццё ў лагерах. Тыя, хто прыехаў з вялікімі дзецьмі ці без іх, хутчэй сталі на ногі. Многія прывезлі з сабой заашчаджаныя даляры ці фунты. У нас жа не было нічога, акрамя скрынкі кніжак і дваіх дзяцей.

Тым, хто пачынаў будавацца, пазычалі грошы тыя, якія не думалі пра будоўлю. Было толькі адно дрэнна: гэта былі простыя людзі, і Алесь з імі меў мала супольных інтарэсаў. У той час у Мельбурне быў больш цікавы асяродак. І мы сталі падумваць, каб пасля сканчэння кантракту перабрацца ў Мельбурн. Перад канцом тэрміна Алесь паехаў у Мельбурн у госці. Яго сустрэлі вельмі добра. Прапанавалі пераехаць. Алесь паехаў ізноў, прабыў там больш за паўгода, а я з дзецьмі жыла ў лагеры. За гэты час цэны на зямлю ўзраслі, і мы прадалі свой надзел у Адэлаідзе за 275 фунтаў. Такім чынам мы змаглі купіць, зноў жа на выплату, зямлю ў Альбансе (праўда, у горшым месцы).

Пачалі там будаваць частку дома — два пакоі і пральню, але грошай не хапіла, і знаёмыя пазычалі — па 5, 10, 15 фунтаў. Усяго разам мы пазычылі 130 фунтаў. Алесь усё запісаў у кніжку, каб потым як найхутчэй аддаць даўгі. Некалькі чалавек памагалі і будавацца. Бо які з Алеся будаўнік? Калі ўсё было амаль скончана, Алесевы сябры кажуць, каб ён даў кожнаму распіску на пазычаныя грошы. Хіба ж так робяць сапраўдныя сябры, хіба ж яны не маюць даверу? Алесь напісаў распіскі, але пасля моцна перажываў.

Пераехалі мы ў яшчэ не закончаныя сцены, і палова падлогі была не засланая. А дом усярэдзіне мы не аббівалі ажно 2 гады. І калі дзьмулі вятры (а тут яны вельмі вялікія), то часам гасілі лямпу, бо электрычнасці тады тут не было. На прымусе я варыла ежу, грэла ваду на бялізну, для купання і т. д. Мы нічога не куплялі з мэблі. Купілі толькі для малога Юркі ложачак і вялікі ложак, на якім спала я з двума старэйшымі дзецьмі. Алесь збіў казлы, напхалі сушанай травы ў мяшок — атрымаўся матрац. Замест стала была скрыня, якая прыехала з намі з Еўропы. Усе заашчаджаныя грошы ішлі на сплачванне даўгоў. Хацелі хутчэй пазбавіцца ад іх. Гэтак мы выжылі, расплаціліся з даўгамі, адпрацавалі кожнаму, хто памагаў у будаўніцтве.

Шкада, бязмежна шкада Алеся, ён так заўчасна адышоў. Дзіўны ён меў характар, усё ніяк не мог змірыцца са сваёй доляй. Усё бачыў

у чорных фарбах. Яму здавалася, што цяжка толькі яму. Фізічную працу ён не любіў, але не меў сілы волі ўзяцца за навуку, як зрабілі амаль усе ягоныя сябры. Алесь не захацеў і з тае прычыны, што фізічная праца трохі болей аплачвалася.

Ён моцна быў упэўнены, што толькі на Радзіме ён змог бы шырока выкарыстаць свае здольнасці. Незадоўга да ягонай смерці ўкраінцы праводзілі літаратурны конкурс маладых літаратараў. У ім брала ўдзел моладзь, якая нарадзілася на эміграцыі, пераважна ў Аўстраліі, і Бацькаўшчыну ведала толькі па кнігах і расказах. Запрасілі на гэты вечар і Алеся. Ён вярнуўся дахаты ўсхваляваны. Гэта падняло яго трохі на духу. Падахвоціўся сабраць усё друкаванае і не друкаванае ў адну кнігу і выдаць. Пачаў — але, на жаль, не скончыў.

Я дужа распісалася, трэба канчаць.

З прывітаннем да Вас — *Зіна.*

ЛІСТ МІКОЛЫ НІКАНА ЛАРЫСЕ ГЕНІЮШ

Вельмі паважаная і дарагая сяброўка!

Вы, напэўна, ужо дачуліся аб трагедыі, што сталася 22 студзеня. Лічу, што Вам хочацца ведаць дакладна, як гэта сталася.

Вось жа, 21 студзеня Алесь з Зінай паехалі ў сваю хату пры моры ў Торквэй (назоў мясцовасці). Я ж прывёз матэрыял на дзверы для шафаў. Гэтага дня я выразаў і павесіў дзверы, а Алесь пачуваў сябе несамавіта, казаў, што меў непаразуменне на фабрыцы, дзе цяжка працаваў. «Лячыўся», як звычайна, вінам. Спаў, уставаў і «лячыўся». Ноччу стагнаў так, што не даваў спаць мне. Зіна казала, што падобнае бывала і раней, таму ніхто з нас не прыдаў асаблівага значэння стогнам. Я нават паспрачаўся з ім, даводзячы, што церпіць сям'я. Алесь адказаў мне, што мае права выстагнацца ў сваёй хаце.

22 студзеня а 10-ай гадзіне прыехалі нашы супольныя сябры (муж і жонка) — на запросіны Алеся і Зіны. Алесь быў вельмі рады, што будзе нагода «палячыцца». Пры стале мы жартавалі, Алесь расказаў урывак з нейкага апавядання пад назвай «Выстагнаўся». Пагода была не зусім адпаведная для купання — халаднаватая, але вырашылі купацца. Да мора ад хаты каля 400 метраў. Госці і Зіна жадалі прайсціся. Я лічыў, што пасля купання будзе лепш сесці ў аўта. Алесь са мной пагадзіўся, і мы з ім паехалі. Пакуль «пехацінцы» прыйшлі, дык

я ўжо пакупаўся, Алесь і муж госці лічылі, што ім захоладна. Але тут госця запрапанавала Алесю пакупацца разам з ёй. Яны пайшлі да мора, а мы трое засталіся на беразе. Алесь плаваў дагары і нармальна, і нават госця заўважыла, што адплыў задалёка. Паклікала да сябе, бо кепска плавае, дык не зможа дапамагчы, калі што…

Калі Алесь наблізіўся, яна заўважыла, што ён сінее, і палічыла, што яму холадна. Узяла яго за руку, і яны пайшлі да нас. Яшчэ ў вадзе, каля 30 метраў ад берага, Алесь пачаў слабець. Госця лічыла, што ён жартуе, але пачала махаць рукой — клікаць нас. Я хутка пабег да іх (метраў 100), мы выцягнулі Алеся на бераг. Я адкрыў яму вочы і пабачыў, што ён нежывы. Але пачаў рабіць штучнае дыханне, памагалі мне і іншыя. Паклікалі лекара (ён жыве пры моры), які і сцвердзіў смерць. Усё гэта трывала некалькі мінут. Госця плакала істэрычна, і лекар даў ёй супакаяльны ўкол. Яна і цяпер лічыць сябе вінаватай, што запрапанавала купацца. Памёр у яе на руках ад сэрцавага ўдару.

Здарэнне гэтае ўсе мы вельмі цяжка перажываем. Па Алесю засталіся неўпарадкаваныя творы, якія ён не меў часу падрыхтаваць да друку, хоць і абяцаў гэта зрабіць. Не ведаю як, але будзем шукаць спосаб іх выдаць. Страта нацыянальная вельмі вялікая. Вечная яму памяць. Хай будзе лёгкай яму аўстралійская зямля. Паклалі яму на грудзі шкатулачку з зямлёй з Бацькаўшчыны, што прывезла Зіна, калі ездзіла ў Беларусь.

У Вас вялікія завеі, а ў нас сканчаецца лета. Другое спатканне беларусаў прайшло даволі добра, хоць і мелі месца непрыемныя спрэчкі. Наступнае спатканне адбудзецца ў Адэлаідзе (Паўдзённая Аўстралія) 6 студзеня 1979 года.

Зіна перажывае, але трымаецца даволі бадзёра. Пераказвае Вам з мужам сардэчныя прывітанні.

Застаюся з глыбокай пашанай — Ваш *Мікола*.

КАМЕНТАР

Шаноўны чытач трымае ў руках першую кнігу Алеся Салаўя, якая пабачыла свет у Беларусі. Зборнік «Мае песні» (1944), хоць у яго выходных дадзеных і значыцца слова «Менск», з друкарскім варштатам сустрэўся ўсё ж далёка ад менскіх ваколіцаў — у Рызе. Па сведчаннях сучаснікаў, паэт у рыжскай друкарні «Rota» ледзь паспеў атрымаць частку накладу, надпісаць кнігі найбліжэйшым сябрам і — мусіў збірацца ў выгнанне, на чужыну. З-за паспешлівай эвакуацыі людзей і ўстановаў наўрад ці ўвесь наклад «Маіх песняў» (3000 асобнікаў) быў надрукаваны.

Другі зборнік Алеся Салаўя «Сіла гневу» (1948) выйшаў таксама па-за межамі Бацькаўшчыны — у нямецкім горадзе Остэргофэн, дзе пасля Другой сусветнай вайны дзейнічала беларускае выдавецтва. Складальнік мае ў сваім кнігазборы гэты рарытэт — неспадзяваны падарунак паэта і крытыка Леаніда Галубовіча, які такім чынам прыспешваў падрыхтоўку гэтай кнігі.

Найбольш поўным зборам тэкстаў Алеся Салаўя да гэтага часу была кніга «Нятускная краса», выдадзеная ў 1982 годзе Беларускім інстытутам навукі і мастацтва ў Нью-Ёрку. Яна і паслужыла асноўнай тэксталагічнай крыніцай пры падрыхтоўцы нашага выдання — пераважная большасць твораў у ім друкуецца менавіта паводле «Нятускнай красы». У выпадках, калі вершы публікуюцца паводле іншых крыніцаў, гэта адзначаецца ў каментарах.

Складальнік палічыў мэтазгодным падаць у каментарнай частцы толькі істотна адрозныя варыянты тых ці іншых твораў і радкоў, хоць дробныя разыходжанні паміж першапублікацыямі, аўтографамі і тэкстамі, змешчанымі ў «бінімаўскім» томе, сустракаюцца даволі часта.

Тэксты твораў у нашым выданні пададзеныя ў храналагічным парадку (у межах кожнага раздзела). Неабходна адзначыць, што ў кнігу не ўвайшлі некаторыя раннія творы, якія, на думку складальніка, знаходзяцца ў відавочным дысанансе з усёй астатняй творчасцю паэта. Маюцца на ўвазе вершы «Вецер, буй-вецер…» («Полымя рэвалюцыі», 1938, № 2), «Шчасце» («Чырвоная змена», 22 ліпеня 1938 г.), «Ты паслухай мяне…» («Літаратура і мастацтва», 30 жніўня 1938 г.), «Цырульнік» («Полымя рэвалюцыі», 1939, № 4). Аднак на іх не варта забывацца складальнікам будучага поўнага збору твораў Алеся Салаўя.

У кнізе «Конадзень» упершыню сабраная і пракаментаваная эпісталярная спадчына Алеся Салаўя — 136 лістоў да Масея Сяднёва, Антона Адамовіча, Юркі Віцьбіча, Рыгора Крушыны, Вітаўта Тумаша, Аляксея Грыцука, Міколы Ганько, Уладзіміра Міцкевіча, Яна Пятроўскага, Аляксандра Лашука, Ларысы Геніюш, Міколы Скабея.

Зберагаюцца лісты ў Беларускім інстытуце навукі і мастацтва ў Нью-Ёрку, у Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва, у аддзеле рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі. Прынагодна складальнік выказвае падзяку кіраўнікам гэтых установаў і структурнага падраздзялення — сп. Вітаўту Кіпелю, сп. Ганне Запартыцы, сп. Аляксандру Стэфановічу.

У раздзслс «Дадатак» змсшчаныя ўспаміны сучаснікаў, блізкіх і сяброў паэта, выкладзеныя часам у лістах да зацікаўленых асобаў.

Алесь Салавей у некалькіх вершах і лістах ужыў нецэнзурную лексіку. Складальнік быў вымушаны зрабіць купюры, пазначаныя ў тэксце шматкроп'ямі. У іншых выпадках да купюравання тэкстаў мы не звярталіся.

Тэксты твораў у нашым выданні друкуюцца згодна з правіламі сучаснай арфаграфіі і пунктуацыі з захаваннем асаблівасцяў мовы Алеся Салаўя.

Складальнік таксама лічыць сваім абавязкам падзякаваць дабрадзеям, якія ў розны спосаб дапамаглі пры падрыхтоўцы гэтай кнігі: сп. Лідзіі Савік (Менск), сп. Наталлі Гардзіенцы (Менск), сп. Лявону Юрэвічу (Нью-Ёрк), сп. Ігару Гардзіенку (Менск), сп. Ігару Качуроўскаму (Мюнхен), сп. Вользе Гулевай (Менск), сп. Аляксею Каўку (Масква), сп. Дзмітрыю Давыдоўскаму (Менск).

ПРЫНЯТЫЯ СКАРОТЫ

Асоба і час, 2009 — Асоба і час: біяграфічны альманах. Вып. 1. / Укл. Аляксандр Фядута. Мінск, 2009.

БДАМЛіМ — Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва.

БІНіМ — Беларускі інстытут навукі і мастацтва ў Нью-Ёрку.

НАРБ — Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь.

ФАС — Фонд Алеся Салаўя ў БДАМЛіМ (неапрацаваны).

ЦНБ НАН — Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі.

ВЕРШЫ

На сенажаці (с. 19). Упершыню — газ. «Ударнік Дзяржыншчыны», чэрвень 1937 г., пад сапраўдным імем — *Альфрэд Радзюк.* Першы надрукаваны верш паэта. Падрабязней гл.: *Кароткі жыццяпіс (с. 255).*

Ты (с. 23). Парываньняў Тваіх «не разбіць, не стрымаць!»... — цытата з верша М. Багдановіча «Пагоня» (1916): «Старадаўняй Літоўскай Пагоні / Не спыніць, не разбіць, не стрымаць». Верш «Ты» перакладзены на расейскую мову Святланай Яўсеевай.

Вуса (с. 25). Вуса (Уса) — рака ў Дзяржынскім і Уздзенскім раёнах, правы прыток Нёмана.

Узыдзе ранак срэбны ла лугі... (с. 26). Упершыню — час. «Полымя рэвалюцыі», 1938, № 10, пад сапраўдным імем — *Альфрэд Радзюк.* Першапачатковы варыянт верша істотна адрозніваецца ад пазнейшага, які ўвайшоў у зб. «Мае песні». Прыводзім яго цалкам:

Узыдзе ранак срэбны на лугі,
Пашле святло сваё празрыстае ў прасторы.
І ў росах заіскрацца мурагі,
На грудзі поўныя дыхне ржаное мора.

Пачую я: зязюля за ракой
Куваць пачне. І гучна дзяцел будзе стукаць.
Разбудзяць ціхі ранішні спакой
Птушыных галасоў прыветлівыя гукі.

Ля нізкіх і зялёных берагоў
Крыніца жвавая ключом жывым зазвоніць.
Завеі хмар — нябесных караблёў —
Парывы ветру буйнага разгоняць.

І сонца яснае з вышынь тады
Палье агністы сок цурком, нібы праз сіта.
Нап'юцца соку гэтага сады,
Памочыць вус у ім багаты колас жыта.

Туды, дзе поле шэпча збажыной,
Дзе рэчкі светлая вада цячэ, бруіцца,
Пайду я з хаты светлае сваёй
Халоднае вады з крыніцы той напіцца.

То скарб я п'ю радзімае зямлі,
Дзе нівы, рэкі і сады — усё жывое...

Як добра жыць, дзе краскі расцвілі,
Дзе Сталін напісаў Закон сваёй рукою.

Я цябе палюбіў усім сэрцам адразу... (с. 27). Упершыню — час. «Полымя рэвалюцыі», 1939, № 4, пад сапраўдным імем — *Альфрэд Радзюк.* Пазней не перадрукоўваўся.

Сумнаю згадкаю... (с. 28). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 25 кастрычніка 1953 г. Верш пакладзены на музыку Міколам Куліковічам-Шчагловым.

Там, на пякельным таку, дзе цапамі малоцяць галовы... (с. 28). Усяслаў Брачыслававіч (каля 1029–1101) — князь полацкі, за свае подзвігі празваны Чарадзеем; адзін з герояў «Слова пра паход Ігара».

Гайна (с. 29). Упершыню — «Беларуская газэта», 23 кастрычніка 1943 г. *Гайна* — рака ў Менскай вобласці, правы прыток Бярэзіны.

Букет (с. 30). Упершыню — час. «Сакавік», 1948, № 1.

Чорны крук закракаў на ўсё горла... (с. 31). Упершыню — час. «Шыпшына», 1950, № 9.

Спі, мой родны (с. 31). Упершыню — газ. «Голас вёскі», 31 ліпеня 1942 г., пад псеўданімам *Алесь Вясновы.* Бацька паэта, *Радзюк Васіль Раманавіч,* працаваў у лясніцтве, у Койданаўскім райспажыўсаюзе, быў дырэктарам саўгаса, у жніўні 1937 г. быў арыштаваны. Падрабязней гл.: *Кароткі жыццяпіс (с. 255).*

Маці сына чакае з вайны (с. 32). Упершыню — газ. «Голас вёскі», 24 ліпеня 1942 г., пад псеўданімам *Алесь Вясновы.*

У мроях (с. 34). Упершыню — час. «Новы шлях», 1943, № 12.

Лідскае замчышча (с. 34). Упершыню — час. «Новы шлях», 1943, № 16. *Гедымін* (каля 1275–1341) — вялікі князь Вялікага Княства Літоўскага; лічыцца, што замак у Лідзе быў пабудаваны з яго ініцыятывы.

Дзеці (с. 35). Упершыню — «Беларуская газэта», 13 кастрычніка 1943 г. *Ела* (латышск.) — вуліца.

Беларусі (с. 36). Упершыню — газ. «Голас вёскі», 18 верасня 1942 г., пад псеўданімам *Алесь Вясновы.*

Пад шэлесты лісця (с. 37). Упершыню — газ. «Голас вёскі», 24 снежня 1942 г., пад псеўданімам *Алесь Вясновы.*

За славу Радзімы (с. 37). Упершыню — «Беларуская газэта», 16 жніўня 1942 г., пад псеўданімам *А. Вясёлка. Беларускі корпус самаахowы —*

вайсковае фармаванне, створанае ўлетку 1942 г. у Менску Беларускай народнай самапомаччу з дазволу нямецкіх акупацыйных уладаў. Зварот аб стварэнні БКС быў падпісаны І. Ермачэнкам, В. Гадлеўскім, В. Іваноўскім, У. Казлоўскім, Ю. Саковічам, арх. Філафеем («Беларуская газэта», 4 ліпеня 1942 г.).

Кінь сваволіць пад вокнамі, вецер... (с. 38). Упершыню — «Беларуская газэта», 16 жніўня 1942 г., пад псеўданімам *А. Вясёлка.* Верш прысвечаны брату паэта *Лявону Радзюку* (нар. 1929).

Не пакіну (с. 39). Упершыню — час. «Новы шлях», 1942, № 10.

Мяне не ўспамінаеш — сяння я далёкі... (с. 40). Няцечка — невялікая рэчка ў Дзяржынскім раёне, прыток Усы.

Шляхі маладосці! Без суму... (с. 40). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 25 кастрычніка 1953 г.

Радасць жыцця (с. 41). Упершыню — газ. «Голас вёскі», 16 студзеня 1942 г. Першы твор, падпісаны псеўданімам *Алесь Салавей.*

Лёс паэта (с. 42). Упершыню — «Беларуская газэта», 10 траўня 1942 г., за подпісам *Не паэта. ...Той на Суражскі прэ грыбы...* — маецца на ўвазе *Суражскі рынак* у Менску. *Беларуская народная самапомач* — нацыянальная дабрачынная арганізацыя, створаная ў 1941 г. па загадзе Генеральнага камісара Беларусі В. Кубэ. БНС (дзейнічала з кастрычніка 1941 г. па люты 1944 г.) пачаргова ўзначальвалі І. Ермачэнка, В. Іваноўскі, Ю. Сабалеўскі. *Энкавэдэ* — ад НКВД (Народный комиссариат внутренних дел). *Вега* — адна з самых яркіх зорак Паўночнага паўшар'я неба. *Альдэбаран* — самая яркая зорка ў сузор'і Цяльца.

Восень (с. 45). Упершыню — «Новы шлях», 1943, № 9.

Наш вучоны (с. 46). Упершыню — газ. «Беларуская воля», 4 чэрвеня 1948 г. Верш надрукаваны без згоды аўтара (гл. ліст А. Салаўя Ю. Віцьбічу ад 8 лістапада 1948 г.). Публікуецца паводле выд: Юрэвіч Л. Літаратурны рух на эміграцыі. Мінск, 2002, с. 139. Верш прысвечаны *Янку Станкевічу* (1891–1976) — беларускаму мовазнаўцу і грамадска-палітычнаму дзеячу. З 1944 г. жыў на эміграцыі. Рэдагаваў часопіс «Веда», склаў «Беларуска-расійскі (Вялікалітоўска-расійскі) слоўнік» (1990). Гэты ды іншыя сатырычныя вершы А. Салаўя распаўсюджваліся ў машынапісах пад псеўданімам *Антон Дабрыдзень.*

З вамі (с. 47). Упершыню — газ. «Раніца», 1943, № 15.

Пароша (с. 47). Упершыню — час. «Новы шлях», 1942, № 12.

Каляды (с. 47). Упершыню — час. «Новы шлях», 1942, № 12.

Мне помніцца студзеньскі вечар (с. 48). Упершыню — «Беларуская газэта», 3 снежня 1943 г.

З Новым годам! (с. 49). Упершыню — «Менская газэта», 6 студзеня 1942 г., пад псеўданімам *Максім Блакітны.*

Снягі (с. 50). Упершыню — час. «Новы шлях», 1943, № 3.

Дарогай шчасця (с. 50). Упершыню — газ. «Раніца», 1943, № 21.

Ноч топіцца ў снягох, і ветравей скуголіць… (с. 51). Упершыню — газ. «Раніца», 1943, № 15.

Што там, наперадзе, іскрыцца?.. (с. 51). Упершыню — газ. «Раніца», 18–25 красавіка 1943 г., пад назвай «*Наперадзе агні*».

Ліст да крытыка (с. 52). Упершыню — час. «Новы шлях», 1944, № 1.

Зірнула сонца ў маю хату… (с. 53). Упершыню — час. «Новы шлях», 1943, № 6.

Афарызмы (с. 53). Упершыню — «Беларуская газэта», 4 красавіка 1943 г.

Хрыстосаў лёс (с. 54). Упершыню — час. «Новы шлях», 1943, № 7.

Першы гром (с. 54). Упершыню — час. «Новы шлях», 1943, № 7, за подпісам *С. Алесь.* У зб. «Нятускная краса» (с. 13, 247) змешчаныя два вершы пад назвай «*Першы гром*». Адзін з іх («*Голасам моцным, ціха і важна…*») належыць Якубу Коласу.

Сустрэўся зноў з табою ў сне… (с. 54). Упершыню — час. «Новы шлях», 1944, № 1.

Драбніцы (с. 55). Упершыню — «Беларуская газэта», 4 красавіка 1943 г.

Спяшайся жыць. Хай іншы раз і цяжка… (с. 55). Упершыню — час. «Новы шлях», 1943, № 8.

Расці, цвіці (с. 56). Упершыню — час. «Новы шлях», 1943, № 11.

Раса (с. 57). Упершыню — «Беларуская газэта», 12 чэрвеня 1943 г. Верш пакладзены на музыку Ксаверам Барысаўцом.

Мора (с. 57). Упершыню — «Беларуская газэта», 12 чэрвеня 1943 г.

Няйначай (с. 58). Упершыню — «Беларуская газэта», 12 чэрвеня 1943 г.

Мурашкі (с. 59). Упершыню — газ. «Беларускі работнік», 1944, № 14.

На магіле (с. 59). Упершыню — «Беларуская газэта», 16 кастрычніка 1943 г.

Каб сказалі... (с. 60). Упершыню — час. «Новы шлях», 1943, № 20.

Паэт (с. 60). Упершыню — газ. «Беларуская газэта», 28 ліпеня 1943 г.

Гекзаметры (с. 61). Упершыню — газ. «Беларуская газэта», 28 ліпеня 1943 г. *Дажбог* — бог сонца ва ўсходнеславянскай міфалогіі.

Санет («Здаецца, ўрэшце я знайшоў спакой...») (с. 61). Упершыню — час. «Новы шлях», 1943, № 16.

Не раз я чуў: «Зірні, якая прыгажосць...» (с. 62). Упершыню — час. «Новы шлях», 1944, № 1.

Птушкі (с. 63). Упершыню — час. «Новы шлях», 1944, № 1.

Мастак (с. 63). Упершыню — час. «Новы шлях», 1944, № 1. *П. М.* — Пётра Мірановіч (1902–1990) — беларускі мастак. Выпускнік Латвійскай Акадэміі мастацтваў, з 1944 — на эміграцыі. Жыў у Аўстрыі, з 1950 — у ЗША. Стварыў партрэты пісьменнікаў-эмігрантаў, у тым ліку — Алеся Салаўя.

Рандо (с. 64). Упершыню — час. «Новы шлях», 1943, № 17.

Глянь, дружа мой! — у вышыні... (с. 64). Упершыню — час. «Новы шлях», 1943, № 17.

Перачытваючы «Калевалу» (с. 64). Упершыню — час. «Новы шлях», 1944, № 1. *Калевала* — карэла-фінскі народны эпас, сабраны і апрацаваны Эліясам Лёнратам. Алесь Салавей знаёміўся з «Калевалай», хутчэй за ўсё, па класічным расейскім перакладзе Леаніда Бельскага. На беларускую мову эпас перакладзены Якубам Лапаткам ужо ў XXI стагоддзі (гл.: час. «Дзеяслоў», 2009, № 40).

Максіму Багдановічу (с. 65). Упершыню — час. «Новы шлях», 1944, № 1. Друкаваўся таксама ў час. «Шыпшына», 1947, № 5. *Багдановіч Максім* (1891–1917) — беларускі паэт, крытык і перакладчык, які моцна паўплываў на фармаванне паэтычнай натуры А. Салаўя.

Раманс («Зноў далёка я, зноў без цябе...») (с. 65). Упершыню — час. «Новы шлях», 1943, № 15.

Апэлес і Аляксандр Македонскі (с. 66). Упершыню — час. «Новы шлях», 1944, № 2. *Апелес* (каля 380–300 да н.э.) — старажытнагрэцкі жывапісец, быў прыдворным мастаком македонскіх цароў. *Аляксандр Македонскі* (356–323 да н.э.) — цар Македоніі, славуты палкаводзец, выхаванец Арыстоцеля.

Песні (с. 66). Упершыню — час. «Новы шлях» 1943, № 24. *Забэйда-Суміцкі Міхась* (1900–1981) — беларускі спявак (лірычны тэнар). Спяваў у Пазнанскай і Харбінскай операх, стажаваўся ў Мілане ў Ф. Карпі. З 1940 г. быў салістам Народнага тэатра ў Празе. Алесь Салавей мог прысутнічаць на канцэрце М. Забэйды-Суміцкага ў Рыжскім універсітэце 28 верасня 1943 г.

Восеньскія тэрцыны (с. 67). Упершыню — час. «Новы шлях», 1943, № 21.

Раманс («Няма нідзе блакітных васількоў...») (с. 67). Упершыню — час. «Новы шлях», 1943, № 23.

Раманс («Толькі там, дзе айчыны бальзам...») (с. 68). Упершыню — час. «Новы шлях», 1944, № 3.

Павіслі вячорныя змрокі над вулкамі... (с. 68). Упершыню — час. «Новы шлях», 1944, № 4.

І заплакалі сумныя далі... (с. 69). Упершыню — час. «Новы шлях», 1944, № 1.

Нямала меў, нямала маю я сяброў... (с. 69). Упершыню — час. «Новы шлях», 1944, № 4.

Песня («Мне адно прыйшло жаданне...») (с. 70). Упершыню — час. «Новы шлях», 1944, № 2.

У вырай (с. 72). Друкуецца паводле час. «Новы шлях», 1944, № 1, дзе апублікаваны ўпершыню. У зб. «Нятускная краса» першы радок: *У далеч іх нясе адлёт патужны, нестрыманы...*

Бітва (с. 72) Гамер — паўлегендарны паэт Старажытнай Грэцыі, стваральнік паэмы «Іліяда», адкуль і ўзяты перакладзены фрагмент. Урыўкі з паэмы на беларускую мову пераклалі таксама Б. Тарашкевіч, Ю. Дрэйзін, А. Клышка (Скобла М. Галасы з-за небакраю: анталогія паэзіі свету ў беларускіх перакладах XX стагоддзя. Мінск: Лімарыус, 2008).

Эпіграмы (с. 75). Упершыню — «Беларуская газэта», 4 красавіка 1943 г.

Сягаць не раю аж пад неба... (с. 75). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў НАРБ (ф. 458, воп. 2, адз. зах. 16, арк. 14). Выяўлены і перададзены складальніку Аляксеем Каўкам. *Я перарос усіх глыбінных...* — маецца на ўвазе Уладзімір Глыбінны (сапраўднае прозвішча — *Сядура;* 1910–1997) — беларускі пісьменнік і журналіст, галоўны рэдактар «Новага шляху». З 1944 г. — на эміграцыі; жыў у ЗША, працаваў ва універсітэце Трой (Нью-Ёрк).

Дождж (с. 74). Упершыню — час. «Новы шлях», 1944, № 4.

Гуманізм (с. 74). Упершыню — час. «Шыпшына», 1948, № 6. *Скарына Францішак* (каля 1490—каля 1551) — беларускі першадрукар, асветнік, пісьменнік. *Цяпінскі Васіль* (1530-я—1599 або 1600) — беларускі пісьменнік, кнігавыдавец. *Будны Сымон* (каля 1530–1593) — беларускі асветнік, філосаф, перакладчык.

Бэз (с. 76). Упершыню — час. «Сакавік», 1948, № 1.

Паводле Дантэ (с. 76). Дантэ Аліг'еры (1265–1321) — італьянскі паэт.

Клён шапацеў на сцямнелым двары... (с. 77). Упершыню — час. «Сакавік», 1948, № 2.

Трыялет («Мой бел-чырвона-белы сцяг...») (с. 77). Упершыню — газ. «Беларускі работнік», 29 жніўня 1943 г.

Ён ідзе (с. 78). Упершыню — час. «Новы шлях», 1943, № 1.

Лёгкай рукою на шыбах узоры мароз вытыкае... (с. 78). Упершыню — час. «Новы шлях», 1944, № 4.

Цэлымі днямі сядзеў і не спаў я цалюткія ночы... (с. 78). Упершыню — час. «Новы шлях», 1944, № 4.

Ліпавы цвет (с. 79). Упершыню — час. «Новы шлях», 1944, № 1.

Сад (с. 79). Упершыню ў выд.: 25-лецце Беларускай гімназіі ў Вільні: 1919–1944. Вільня, 1944. *Віленская беларуская гімназія* — адна з першых беларускіх сярэдніх навучальных установаў у Заходняй Беларусі, заснаваная ў 1919 г. па ініцыятыве Івана Луцкевіча.

Муза (с. 80). Упершыню — час. «Новы шлях», 1944, № 4.

Маці. З ёю — дзіця... (с. 80). Упершыню — час. «Новы шлях», 1944, № 4.

Акравершы (с. 81). Упершыню — час. «Новы шлях», 1944, № 4. У першым акравершы прачытваецца імя *Ніначка*; яго прыналежнасць складальніку выявіць не ўдалося. Другі акраверш, найверагодней, прысвечаны стрыечнай сястры паэта — *Люсі.* Удава паэта Зінаіда Кадняк прыгадвала ў лісце Ант. Адамовічу ад 16 студзеня 1980 г.: «У гады вайны Люся была вывезена на працу ў Нямеччыну. Калі я была ў Менску, то з ёю бачылася. Вельмі шкадуе, што не змагла застацца на эміграцыі». (Ліст зберагаецца ў ФАС.)

Культура — азнака вышэй усяго... (с. 81) Упершыню — час. «Новы шлях», 1944, № 6. Пра *Ул. Глыбіннага* гл. зноску да верша «*Сягаць не раю аж пад неба...*» *(с. 75).*

Цемра гусцее. Заплюшчыў дзень зmoраны сінія вочы... (с. 81). Упершыню — час. «Новы шлях», 1944, № 4.

Ля Вострай Брамы (с. 82). Упершыню — газ. «Беларускі работнік», 1944, № 55. Друкаваўся таксама ў газ. «З беларускага жыцця» (12 кастрычніка 1946 г.) і час. «Звіняць званы Святой Сафіі» (1946, № 4).

Змагар Айчыны (с. 82). Упершыню — «Беларуская газэта», 29 сакавіка 1944 г.

Добры дзень табе, сонечны Слуцак!.. (с. 83). Упершыню — «Газэта Случчыны», 13 красавіка 1944 г. Як падае Зора Кіпель у каментарах да зб. «Нятускная краса», верш прысвечаны літаратурнай вечарыне ў Слуцку, якая адбылася 2 красавіка 1944 г.

Вільня (с. 83). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 15 лютага 1948 г.

Яе чакаў і я... (с. 83). Вохнае — араматнае (заўвага А. Салаўя). Аўтограф зберагаецца ў БДАМЛіМ (ф. 363, воп. 1, адз. зах. 80, арк. 19).

У Койданаве жыў Радзюк Альфрэд... (с. 84). Упершыню — час. «Новы шлях», 1944, № 8.

Ізноў я нарадзінаў дзень спаткаў... (с. 85). Упершыню — час. «Новы шлях», 1944, № 9.

Даволі спаць. Адчыніш вейкі... (с. 86). Упершыню — час. «Сакавік», 1948, № 1. Друкуецца паводле аўтографа, які зберагаецца ў БДАМЛіМ (ф. 363, воп. 1, адз. зах. 80, арк. 20). *Прасвядны — накшталт расейскага «благодатный»* (заўвага А. Салаўя). Аўтограф значна разыходзіцца з тэкстам у зб. «Нятускная краса».

Пад п'яную руку (с. 87). Друкуецца ўпершыню паводле машынапісу, які зберагаецца ў архіве БІНіМ. Верш прысвечаны *Лявону Савёнку* (літ. псеўданім *Крывічанін*; 1897–1974) — беларускаму пісьменніку, журналісту і грамадскаму дзеячу. З 1944 г. жыў на эміграцыі, з 1950 — у ЗША. Найпаўней творчасць Л. Савёнка прадстаўленая ў выд.: Крывічанін Лявон. Беларусізацыя пад № ... / Укл. і прадмова Лявона Юрэвіча. Нью-Ёрк, 1998. *Што «Чужанінавым» завецца...* — маецца на ўвазе сатырычная аповесць Л. Крывічаніна «З дзённіка Чужанінава» (1942).

Зямля ў агні (с. 89). Упершыню — час. «Пагоня», 1946. Друкаваўся таксама ў час. «Звіняць званы Святой Сафіі», 1946, № 3.

У жылах счах крыві струмень... (с. 90). Упершыню — газ. «Беларускі работнік», 12 лістапада 1944 г.

Сустрэча, першая сустрэча... (с. 91). *Сяднёў Масей* (1913–2001) — беларускі паэт, празаік і перакладчык. Студэнтам Менскага педагагічнага інстытута (1936) быў арыштаваны і высланы ў лагер на Калыме. Праз чатыры гады прывезены на перагляд справы ў Менск. Падчас Другой сусветнай вайны працаваў у рэдакцыі газеты «Новая дарога» (Беласток). З 1944 г. — на эміграцыі. Працаваў на радыё «Свабода», выкладаў у Індыянскім універсітэце (ЗША). Ліставаўся з А. Салаўём (гл. раздзел *Лісты*).

Трамвай — даўжэзная, танклявая труна... (с. 91). Упершыню — час. «Пагоня», 1946, № 4.

Ахвяраў прагне смерць... (с. 92). Упершыню — газ. «Беларускі работнік», 5 лістапада 1944 г.

Вароты ў няведамы свет... (с. 93). Упершыню — час. «Пагоня», 1946, № 4. *Кастуся* — народнае найменне смерці.

Пусціня... пусціня... пусціня... (с. 94). Упершыню — газ. «Раніца», 12 лістапада 1944 г.

Казка й сон (с. 94). Упершыню — час. «Пагоня», 1946, № 4.

З таго свету (с. 96). Упершыню — час. «Шыпшына», 1946, № 1.

Паклон (с. 96). Упершыню — газ. «Беларускі работнік», 1944, № 40.

Ужо тры дні, ужо тры дні... (с. 97). Упершыню — час. «Пагоня», 1946, № 4.

Тры вадаплавы адплылі... (с. 98). Друкуецца паводле час. «Пагоня», 1946, № 4, дзе ўпершыню апублікаваны.

Расцалаваў я алавік... (с. 98). Упершыню — час. «Пагоня», 1946, № 4.

Бывай, Гедэместэ, бывай... (с. 99). Упершыню — час. «Пагоня», 1946, № 3. *Гедэместэ* — невялікі горад у Эстоніі. Верш перакладзены на расейскую мову Міхаілам Шэлехавым.

Лясы. Узгоркі. Паплавы... (с. 100). Упершыню — час. «Пагоня», 1946, № 4.

Плыве вадаплаў і плыве... (с. 101). Упершыню — час. «Пагоня», 1946, № 4. Верш перакладзены на расейскую мову Міхаілам Шэлехавым.

У моры (с. 101). Упершыню — газ. «Раніца», 22 кастрычніка 1944 г.

Мой сціплы ложак! Прытульны спынак... (с. 103). Упершыню — час. «Новы шлях», 1944, № 4.

Героям Бацькаўшчыны (с. 103). Упершыню — газ. «Беларускі работнік», 1944, № 54. Варыянт друкаваўся таксама ў час. «Пагоня», 1948, № 1 (без дзвюх апошніх строфаў, замест іх — страфа, адсутная ў зб. «Нятускная краса»: *Няўжо?.. О, не! У ім — ваш гарт і сіла. / У ім — ад вас і ваш арліны ўзлёт. / Яго пякельня смерці не скасіла, / Яго ў зямлю не ўтопча катні бот*).

Fröhliche Weihnachten (с. 104). Frohliche Weihnachten! (ням.) — вясёлых Калядаў! *Ost* (ням.) — усход; нашыўку *Ost* былі змушаныя насіць работнікі, вывезеныя на прымусовую працу ў Нямеччыну з акупаваных усходніх земляў, у тым ліку з Беларусі. *S-Bahn* (ням., ад *Stadt Bahn*) — гарадская чыгунка.

Мінаю заміны. Нічога... (с. 107). Упершыню — газ. «Беларускі работнік», 1944, № 42.

Я прыйшоў ад зямлі, ад людзей... (с. 108). Упершыню — час. «Сакавік», 1948, № 1.

«І неба ранішнім абмылася дажджом...» (с. 110). Друкуецца паводле аўтографа, які зберагаецца ў БДАМЛіМ (ф. 363, воп. 1, адз. зах. 80, арк. 21). У зб. «Нятускная краса» 1-шы радок: *Нябёсы ранкавым абмыліся дажджом*; 6-ты радок: *Сюды, у край пануры, не паехаў.*

Дзе ж тая радасць — той дар адзіны... (с. 111). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 25 кастрычніка 1953 г.

Радаславу Астроўскаму (с. 111). Упершыню — газ. «Раніца», 5 лістапада 1944 г. *Астроўскі Радаслаў* (1887–1976) — беларускі палітычны і грамадскі дзеяч. У 1924–1936 гг. — дырэктар Віленскай беларускай гімназіі. Падчас Другой сусветнай вайны кіраўнік адміністрацыі Бранскай, Магілёўскай і Смаленскай акругаў, з 1943 г. — прэзідэнт Беларускай Цэнтральнай Рады. Пасля 1944 г. жыў у Нямеччыне, Аргентыне, Вялікай Брытаніі, ЗША. Удава паэта Зінаіда Кадняк у лісце Ант. Адамовічу ад 16 студзеня 1980 г. паведамляла: «Гэты верш быў напісаны наогул як правадыру, а не выключна данай асобе. Калі нарэшце Алесь дабраўся да Берліна (*1944 год. — М.С.*), ён нічога не меў у кішэні, і Астроўскі даў яму грошы — як ганарар за «Мае песні», не ведаю — колькі. Словам, за кароткі час ён ужо нічога не меў з тых грошай. Алесь пайшоў прасіць яшчэ, а той стукнуў кулаком па стале і кажа: «А дзе тыя грошы, што ўзяў? Прапіў?». Каб змякчыць Астроўскага, Алесь падпісаў яму гэты верш і атрымаў яшчэ колькі грошай, але каб ведаў, што так атрымаецца, напэўна, не падпісваў бы. Не ведаю, ці гэта праўда, але ён сам мне так казаў» (ФАС).

Лісты на ветры (с. 112). Упершыню — час. «Новы шлях», 1944, № 10.

Смерць цэліла ў грудзі кап'ём... (с. 113). Упершыню — час. «Пагоня», 1946, № 4.

Стаўся ўсюды госцем выпадковым (с. 114). Упершыню — час. «Пагоня», 1946, № 4. Верш перакладзены на ўкраінскую мову Ігарам Качуроўскім, на расейскую — Міхаілам Шэлехавым.

Дзве Зіны (с. 114). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС. Верагодна, адна з гераіняў верша — *Зінаіда Кадняк (нар. 1922;* у дзявоцтве *Баразнёнак-Шабуня),* будучая жонка паэта.

Так і сталася: тую, другую... (с. 117). Упершыню — час. «Шыпшына», 1947, № 5.

З агню вар'яцкага, з пякельнай цемрыні... (с. 117). Упершыню — час. «Пагоня», 1946, № 4.

Да жыцця ад пагібелі крочу... (с. 118). Упершыню — час. «Пагоня», 1946, № 4.

Дваццаць тры (с. 118). Weg (ням.) — прэч. *Keine Platz* (ням.) — няма месца.

Майму каханню (с. 119). Ich liebe (ням.) — я кахаю.

Крыжовы шлях (с. 120). Упершыню — час. «Пагоня», 1946, № 4. Друкаваўся таксама ў газ. «Беларускія навіны», 1947, № 1. Верш перакладзены на польскую мову Зоф'яй Багдановічавай.

Малітва («Як боль свой выказаць хачу я...») (с. 121). Упершыню — час. «Пагоня», 1946, № 4.

Смутлівая маці (с. 121). Упершыню — час. «Шыпшына», 1948, № 6. Верш перакладаўся на ўкраінскую мову Барысам Аляксандравым, Дзмітром Чубам-Нітчанкам. Апошні сябраваў з А. Салаўём і пасля яго смерці змясціў 19 лютага 1978 г. ва ўкраінскай газеце «Вільна думка» (Сідней) згадку пра паэта: «Жывучы ў Зальцбургу, Алесь Салавей быў у сяброўскіх дачыненнях з вядомымі ўкраінскімі паэтамі Леанідам Мосензам, Юрыем Качуроўскім, Барысам Аляксандравым ды паэтам і прафесарам Юрыем Клэнам — сябрам кіеўскай групы неакласікаў. У 1951 г. А. Салавей прымаў удзел у нашым першым літаратурным вечары ва Украінскім доме ў Эсенфоне (прыгарад Мельбурна), чытаў свае собскія вершы. А зусім нядаўна, 14 жніўня мінулага года, ён быў прысутны ва Украінскім доме на вечары ўдзельнікаў конкурса творчай моладзі. Захо-

плены поспехамі нашых маладых аўтараў, ён выступіў з цудоўнай прадмовай, расказаўшы добрай украінскай мовай пра свае колішнія сувязі з украінскімі пісьменнікамі ды прачытаўшы свой цудоўны верш, прысвечаны Украіне. Калісьці «Новыя дні» ды іншыя ўкраінскія выданні часта друкавалі пераклады ягоных твораў на ўкраінскую мову. Памяць пра Алеся Салаўя, нашага найлепшага прыяцеля, мы будзем доўга захоўваць у нашых сэрцах» («Беларус», 1978, № 251).

Споведзь (с. 122). Упершыню — час. «Шыпшына», 1948, № 6.

Gloria mundi (с. 123). Gloria mundi (лац.) — слава свету. Да верша маецца заўвага Алеся Салаўя: *«Словы з выслоўя: Sic transit gloria mundi (гэтак прамінае слава свету), якое прагалошваюць пры інтранізацыі новага Папы Рымскага, спальваючы пры гэтым каслаўку лёну».*

Узняўся сокал у блакіт... (с. 124). Упершыню — час. «Пагоня», 1946, № 4.

У сузор'і заззяе Колас... (с. 124). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 1948, № 7. *Колас* (лацінская назва *Спіка*) — самая яркая зорка ў сузор'і Дзевы. *Астрэя* — у грэцкай міфалогіі багіня справядлівасці, якая ўзнеслася на неба і ператварылася ў сузор'е Дзевы.

Ялінка (с. 125). Упершыню — час. «Звіняць званы Святой Сафіі», 1947, № 7. Верш перакладзены на ўкраінскую мову Барысам Аляксандравым, на расейскую — Міхаілам Шэлехавым.

Вянкі, табе вянкі... (с. 127). Упершыню — час. «Сакавік», 1948, № 2.

Што ўчора мінула — ніколі... (с. 128). Упершыню — час. «Сакавік», 1948, № 2.

А прайшоў я ці мала дарог у свеце... (с. 129). Упершыню — час. «Моладзь», 1949, № 8.

Дабрыдзень, мая зарніца!.. (с. 129). Упершыню — час. «Наперад!», 1949, № 21.

Найпершы парыў абяскрылены... (с. 129). Упершыню — час. «Наперад!», 1949, № 16, пад назвай *«Маладосць».*

Далёка няўцеха развітання... (с. 130). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 25 кастрычніка 1953 г.

З табою разам быў... (с. 130). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 25 кастрычніка 1953 г.

Ой жа хітрунніца якая... (с. 131). Упершыню — час. «Наперад!», 1949, № 17.

У дзень нарадзінаў (с. 132). Упершыню — час. «Шыпшына», 1946, № 3. Маецца на ўвазе вядомы біблейскі выраз: «*Всё суета сует и томление духа*». У беларускім перакладзе Васіля Сёмухі: «*Наймарнейшая марнасць, пагоня за ветрам*» (Біблія, Dunkanville, 2002; Кніга Эклезіяста, 4:4).

А ўсё ж мы вернемся дахаты, у Айчыну... (с. 133). Упершыню — час. «Пагоня», 1946, № 4.

Прошча (с. 133). Упершыню — час. «Божым шляхам», 1947, № 3.

Гамоніць даўняй праўды звон (с. 135). Упершыню — час. «Пагоня», 1946, № 2. Верш пераклаў на ўкраінскую мову Барыс Аляксандраў.

Alea acta est! (с. 136). Упершыню — час. «Пагоня», 1946, № 3. *Alea acta est!* (лац.) — *жэрабя кінута!* Паводле легенды, так сказаў Юлій Цэзар пры пераходзе ракі Рубікон, што аддзяляла Рым ад Галіі.

Швейцарыя (с. 138). Упершыню — час. «Сакавік», 1948, № 1.

Снежань (с. 139). Упершыню — час. «Сакавік», 1948, № 1.

Маленства (с. 140). Упершыню — час. «Сакавік», 1948, № 1.

Спі... (с. 140). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 17 лістапада 1947 г.

Пачні з Гамера, ці пачні з Сакрата... (с. 141). Упершыню — час. «Шыпшына», 1947, № 4. *Сакрат* (470–399 да н.э.) — старажытнагрэцкі філосаф. *«У перашкодах дух расце»...* — радок з верша Уладзіміра Дубоўкі «О Беларусь, мая шыпшына» (1925).

З мройнай задумай моўкне бор... (с. 142). Упершыню — час. «Сакавік», 1948, № 1.

Да шчасця шлях не быў адчынены... (с. 144). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 25 кастрычніка 1953 г.

Employ (с. 144). Друкуецца паводле выд.: Юрэвіч Л. Камэнтары. Мінск, 1999, с. 134, дзе апублікаваны ўпершыню. *Employ* (ангельск.) — служба, наёмная праца.

Малітва («Божа вялікі, паслухай маленне...») (с. 145). Упершыню — газ. «З беларускага жыцця», 1946, № 4. Верш пакладзены на музыку І. Паўлавым.

Тысяча дзевяцьсот... (с. 146). Юхнавец Янка (1921–2003) — беларускі паэт. З 1944 г. — на эміграцыі, жыў у ЗША. Найпаўней яго творчасць прадстаўленая ў выд.: Юхнавец Я. Сны на чужыне / Укл. і прадмова Алеся Бяляцкага. Мінск, 1994. Лацінскай літарай *V* («*фаў*»)

называлася нямецкая ракетная зброя, якую фашысты выкарыстоўвалі падчас Другой сусветнай вайны.

Конадзень (с. 149). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 25 сакавіка 1948 г. *In hoc signo vinces* (лац.) — пад гэтым знакам пераможаш. «*Канстанцін Вялікі, які зрабіў хрысціянства дзяржаўнай рэлігіяй у Рымскай імперыі, казаў, што гэтыя словы разам са знакам крыжа ён бачыў на небе падчас свайго паходу на Рым. Пасля перамогі над сваім супраціўнікам Максентыем у бітве ля Сакса Руба, паблізу Рыма, 27 кастрычніка 312 г. Канстанцін загадаў напісаць гэтыя словы на рымскім штандары*». — Заўвага А. Салаўя.

На матыў Гайнэ (с. 150). Упершыню — час. «Сакавік», 1948, № 4. *Гайнэ Гайнрых* (1797–1856) — нямецкі паэт.

Навекі (с. 150). Упершыню — у перакладзе на ўкраінскую мову ў час. «Наш шлях», 1947, № 6. Аўтар перакладу — Барыс Аляксандраў.

Паводле Гайнэ (с. 151). Упершыню — час. «Сакавік», 1948, № 1.

Жыць (с. 152). Упершыню — час. «Сакавік», 1948, № 1.

Аб табе успамін — найвышэйшая ўцеха... (с. 152). Упершыню — час. «Наперад!», 1949, № 16.

Хочацца плакаць — стрымваю слёзы... (с. 153). Упершыню — час. «Наперад!», 1949, № 17.

Нязмоўкная слава... (с. 154). Упершыню — час. «Сакавік», 1948, № 2.

Яшчэ не моўкнуць... (с. 154). Упершыню — час. «Сакавік», 1948, № 1.

Як вас... (с. 155). Упершыню — час. «Сакавік», 1948, № 1.

Цемра (с. 155). Упершыню — час. «Сакавік», 1948, № 1.

Раство (с. 156). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 7 студзеня 1953 г.

На чыстым аркушы (с. 156). Упершыню — час. «Сакавік», 1948, № 2. *Александрыйскі верш* — верш з аб'яднаных папарна рыфмай радкоў, напісаных шасцістопным ямбам з цэзурай пасля трэцяй стапы. У беларускай паэзіі найчасцей ужываўся М. Багдановічам. Назва паходзіць ад «Рамана пра Аляксандра Македонскага» (XII ст.), які напісаны такім вершам. *На чыстым аркушы, прад вузенькім вакном / Прыгожа літары выводзіць ён пяром...* — цытата з верша М. Багдановіча «Перапісчык» (1912).

Адзіноцтва (с. 157). Упершыню — час. «Сакавік», 1948, № 2.

Новы год (с. 157). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 25 студзеня 1948 г.

Чалом, чалом... (с. 158). Упершыню — час. «Шыпшына», 1948, № 7. *Актава* — васьмірадковы верш, напісаны пяці- або шасцістопным ямбам, зарыфмаваны па схеме: АбАбАбвв.

Ну, што яшчэ... (с. 158). Упершыню — час. «Шыпшына», 1948, № 7.

Пакінуў я... (с. 158). Упершыню — час. «Шыпшына», 1948, № 7. Вершы *Не ўспамінай, Слупы, Нішчым, Альпы, Спакой* апублікаваныя ўпершыню ў тым самым выданні.

Несмяротнасць (с. 160). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 23 траўня 1948 г.

Ардэнаносцам (с. 161). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 4 ліпеня 1948 г.

Крывічы (с. 161). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 19 кастрычніка 1952 г. *Палата* — рака ў Полацкім раёне, правы прыток Дзвіны.

Няхай (с. 162). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 7 студзеня 1953 г.

І сонцу, і вясне (с. 163). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 30 жніўня 1953 г. *Моцартэум* — музычна-навуковае таварыства ў Зальцбургу (Аўстрыя), цэнтр моцартазнаўства, заснаваны ў 1880 г. *Паганіні Нікало* (1782–1840) — італьянскі скрыпач і кампазітар.

І хмурны пас радзее (с. 163). Упершыню — час. «Конадні», 1955, № 4. *Schafberg* (ням.) — гара ў аўстрыйскіх Альпах, літаральна: *Авечая гара. Mondsee* (ням.) — возера ў Аўстрыі, літаральна: *Месяцовае возера.*

Ад шумных рэк (с. 163). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 19 кастрычніка 1952 г. *Denn was der Mensch in seinen Erdeschranken / Von hohem Gluck mit Gotternamen nennt... (Goethe)* — Бо чалавек быў у зямной прасторы высокім шчасцем, Боскім іменем названы... (Гётэ).

Сцюжа (с. 164). Упершыню — газ. «Беларускі эмігрант», 1952, № 7.

Silentium! (с. 164). Упершыню — газ. «Беларускі эмігрант», 1952, № 7. *Silentium* (лац.) — бязмоўе, маўчанне. Гэтым лацінскім словам названы вядомы верш Ф. Цютчава, адкуль і ўзяты эпіграф. *Молчи, скрывайся и таи / И чувства, и мечты свои* — Ні перад кім не варушы / Пласты таёмныя душы (пераклад Аляксея Каўкі). Гл.: Скобла М. Галасы з-за небакраю: анталогія паэзіі свету ў беларускіх перакладах ХХ стагоддзя. Мінск, 2008.

Ідзеш, плывеш (с. 165). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 30 студзеня 1954 г.

Заранка ўсходу (с. 165). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 1955, № 12-13.

За (с. 165). Упершыню — час. «Конадні», 1955, № 4.

Праз неспагаду (с. 166). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 30 жніўня 1953 г., дзе мае, відавочна, памылковую назву *Праз непагоду. Мадагаскар* — востраў у Індыйскім акіяне непадалёк ад паўднёвай Афрыкі. *Каломба* — партовы горад, сталіца астраўной дзяржавы Шры-Ланкі ў Індыйскім акіяне. *Гвінея* — дзяржава ў Заходняй Афрыцы. *Гаваі* — востраў у Ціхім акіяне, самы вялікі ў архіпелагу Гавайскія астравы.

Узвіў (с. 166). Упершыню — час. «Конадні», 1954, № 2.

Надойсце (с. 167). Упершыню — час. «Конадні», 1954, № 2.

На ціхі бераг (с. 167). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 28 лютага 1954 г.

Сярод чароўных ніў (с. 168). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 3 жніўня 1952 г. *Ламбардыя* — правінцыя Францыі. *Мілан* — горад у Італіі.

Зірні (с. 168). Упершыню — час. «Конадні», 1955, № 4.

Святая (с. 169). Упершыню — час. «Новы шлях», 1942, № 5. *Райнэр Марыя Рыльке* (1875–1926) — аўстрыйскі паэт. А. Салавей цікавіўся яго творчасцю (гл. раздзел *Пераклады*).

Звон (с. 169). Упершыню — час. «Конадні», 1955, № 4.

За Порт Саід (с. 170). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 7 студзеня 1953 г. *Порт Саід* — горад у Егіпце, пры ўваходзе ў Суэцкі канал. *«Цветов и льда» няма. А «арапчата»? / «Не кинул им ты на ходу плоды?»* — паводле Антона Адамовіча, гэта алюзіі на вершы расейскага паэта Мікалая Гумілёва (1886–1921) «Красное море» і «Суэцкий канал». (Гл.: Адамовіч А. Да гісторыі беларускае літаратуры / Укл. і прадмова В. Булгакава. Мінск, 2005, с. 1343.)

Перад вясной (с. 170). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 7 студзеня 1953 г.

Надойсце дня (с. 170). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 19 кастрычніка 1952 г. *Адэн* — горад у Йемене, транзітны порт на Аравійскім моры.

Узбудам хваль (с. 171). Упершыню — газ. «Беларускі эмігрант», 1952, № 7.

Акіян (с. 171). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 3 жніўня 1952 г. Верш пераклаў на ўкраінскую мову Леанід Палтава. *Шуми, шуми, послушное ветрило...* — шумі, шумі, мой паслухмяны ветразь... *(Пушкін). Roll on, thou deep and / Dark blue Okean — roll...* (Byron) — Кацiся ты, глыбокі й цёмны акіян, кацiся... (*Байран*).

За годам год (с. 171). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 19 кастрычніка 1952 г.

Паўдзённы Крыж (с. 172). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 31 студзеня 1954 г. *Паўдзённы (Паўднёвы) Крыж* — сузор'е ў Паўднёвым паўшар'і неба.

Паладзін (с. 172). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 7 студзеня 1953 г. *Паладзін* — рыцар са світы караля ці феадала, у пераносным значэнні — чалавек, адданы якой-небудзь ідэі.

Чаўны (с. 172). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 31 студзеня 1954 г. *М. С. і А. К.* — верагодна, паэт Масей Сяднёў і Аркадзь Качан (1921–1982) — беларускі грамадскі дзеяч, з 1950 г. жыў у Аўстраліі.

Белы снег (с. 173). Упершыню — газ. «Беларускі эмігрант», 1952, № 7. *Мікуліч Пётра* (1922–1981) — беларускі грамадскі дзеяч, з 1948 г. жыў у Аўстраліі (Мельбурн). *Вязынь* і *Раёўка* — паселішчы на Меншчыне.

Надзея (с. 173). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 25 траўня 1952 г., дзе надрукаваны як *уступ да паэмы. «Паэма «Надзея» (на 3 друк. арк.) яшчэ сыраватая, і я хацеў бы, каб яна паляжала тры-чатыры месяцы. Яна разлічана на асобную самастойную кніжыцу. У далейшым яе вышлю»,* — паведамляў А. Салавей у 1949 г. (ужо з Аўстраліі) А. Грыцуку. Сённяшняе месцазнаходжанне паэмы складальніку невядомае.

Надзямным (с. 174). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 19 кастрычніка 1952 г.

У акіян (с. 174). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 25 сакавіка 1959 г.

Сум (с. 175). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 25 сакавіка 1959 г.

У новы свет (с. 175). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 3 жніўня 1952 г.

Як акіян (с. 176). Упершыню — час. «Конадні», 1955, № 4.

Зоры (с. 176). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 31 студзеня 1954 г.

У цішыні (с. 176). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 31 студзеня 1954 г.

Дом (с. 177). Верш прысвечаны паэту Масею Сяднёву — аўтару верша «*Домік у Менску*», які А. Салавей цалкам уключыў у сваю аднайменную паэму, напісаную ў 1944–1945 гг.

Слова (с. 178). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 25 сакавіка 1957 г.

Не з вамі (с. 179). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 1955, № 12-13.

Над Слуцкам днее (с. 180). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 28 лютага 1954 г. Верш перакладзены на ангельскую мову Верай Рыч.

Не спіш спакойна (с. 180). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 28 лютага 1954 г.

Ліст (с. 181). Упершыню — час. «Конадні», 1954, № 2. На *Салавецкіх выспах (Салаўках)* за савецкім часам размяшчаўся лагер для асуджаных.

Лёс (с. 181). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 25 сакавіка 1959 г.

Згода (с. 182). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 1955, № 46.

Мала (с. 182). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 25 сакавіка 1959 г.

Развітанне (с. 183). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 31 студзеня 1954 г.

Прыпынак (с. 184). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 25 сакавіка 1959 г. *Лангфэла Генры* (1807–1882) — амерыканскі паэт.

У светлы дзень (с. 184). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 3 жніўня 1952 г.

Святлярныя агні (с. 185). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 30 жніўня 1953 г. *Шапэн Фрыдэрык* (1810–1849) — польскі кампазітар і піяніст. *Рахманінаў Сяргей Васілевіч* (1873–1943) — расейскі кампазітар і дырыжор. *Бетховен Людвіг ван* (1770–1827) — нямеці кампазітар і піяніст. *Вагнер Вільгельм Рыхард* (1813–1883) — нямецкі кампазітар і пісьменнік. *Бах Ёган Себасцян* (1685–1750) — нямецкі кампазітар і арганіст. *Чайкоўскі Пётр Ільіч* (1840–1893) — расейскі кампазітар. *Барадзін Аляксандр Парфіравіч* (1833–1887) — расейскі кампазітар і навуковец-хімік.

У ім і па-над ім (с. 185). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 7 студзеня 1953 г. *Моцарт Вольфганг Амадэй* (1756–1791) — аўстрыйскі кампазітар. *Сальеры Антоніа* (1750–1825) — італьянскі кампазітар. *Шэкспір Уільям* (1564–1616) — ангельскі драматург і паэт.

Зара (с. 185). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 31 студзеня 1954 г. *Nature gives to every Time and Season Some beauties of its own (Dickens)* — Прырода дае кожнаму часу і пары года сваю адметную прыгажосць (Дыкенс).

У добры час (с. 186). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 31 студзеня 1954 г.

Знічы (с. 187). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 25 сакавіка 1957 г.

Шлях (с. 187). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 25 сакавіка 1957 г... *Green in Summer, white in Winter, / Ever singing, ever singing (H. Longfellow)* — Зялёны ўлетку, белы ўзімку, вечна спеўны, вечна спеўны (Г. Лангфэла). *Геркулес* — у рымскай міфалогіі бог і герой, які валодаў незвычайнай сілай.

Кітай (с. 187). Упершыню — час. «Конадні», 1955, № 4. *...Плач твой аб старонцы...* — недакладная цытата з верша Максіма Багдановіча «Кінь вечны плач свой аб старонцы...» (1911).

Наяве (с. 188). Упершыню — час. «Конадні», 1955, № 4. Рака *Калыма* і *Камчацкі паўвостраў* (Расея) атаясамліваліся з Гулагам.

Наўвеце (с. 188). Упершыню — час. «Конадні», 1955, № 4.

Кола (с. 188). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 25 сакавіка 1957 г.

Імкніся ўсцяж (с. 189). Упершыню — час. «Конадні», 1955, № 4.

Успамін (с. 189). Упершыню — газ. «Беларускі эмігрант», 1952, № 7.

Камэне (с. 189). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 25 сакавіка 1959 г. *Ніягара* — рака ў Паўночнай Амерыцы, па якой праходзіць мяжа паміж ЗША і Канадай. *Мурэй* — рака ў Аўстраліі. *Пахмурным Альбіёнам...* — маецца на ўвазе Вялікая Брытанія. *Шампань* — правінцыя ў Францыі. *Камэна* — у рымскай міфалогіі німфа ручаёў.

Усцяж (с. 190). Аксючыц Уладзімір (1922–1965) — беларускі грамадскі дзеяч на эміграцыі; жыў у штаце Вікторыя (Аўстралія).

Маме (с. 193). У «Кароткім жыццяпісе» (гл. раздзел *Проза*) Алесь Салавей падаў пра маці вельмі скупыя звесткі: «*Маці мая была інтэлігентная, пісьменная жанчына, шмат увагі аддавала на выхаванне... Маці была высланая на 10 гадоў у Сібір. Што з ёй цяпер — не ведаю*». Антон Адамовіч у сваёй манаграфіі «Так пяяў Салавей» цытуе ліст паэта ад 3 красавіка 1968 г.: «*Мама вярнулася праз 10 гадоў, хутка памерла ў Менску і пахаваная ў Вязані каля Фаніпаля*» (Адамовіч А. Да гісторыі беларускае літаратуры / Укл. і прадмова В. Булгакава. Мінск, 2005, с. 1208).

Жадаю вам (с. 194). Дарагому дзядзьку Антону... Адамовіч Антон (1909–1998) — беларускі пісьменнік і грамадскі дзеяч. У 1930 г. быў арыштаваны НКВД і высланы ў Расею. Праз восем гадоў вярнуўся на радзіму, закончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт. Падчас вайны працаваў у рэдакцыі «Беларускай газеты», у Беларускім навуковым таварыстве, рэферэнтам па справах друку пры Генеральным камісарыяце. У 1947 г. рэдагаваў часопіс «Сакавік», у выдавецтве якога пабачыў свет зборнік А. Салаўя «Сіла гневу» (1948). Ліставаўся з Алесем Салаўём (гл. раздзел *Лісты*), сустракаўся з ім у Мельбурне.

Вялікія тамы з няславай і шматслоўем... (с. 195). Аўтограф — ЦНБ НАН (ф. 31, адз. зах. 357, арк. 1–2). *Геніюш Ларыса* (1910–1983) — беларуская паэтка. З 1937 па 1948 г. жыла ў Чэхаславакіі, дзе была арыштаваная і дэпартаваная ў СССР. У 1949 г. — асуджаная на 25 гадоў пазбаўлення волі, у 1956-м — вызваленая. Жыла ў Зэльве, ліставалася з многімі дзеячамі беларускай эміграцыі, у тым ліку з Алесем Салаўём (гл. раздзел *Лісты*) і ягонай жонкай Зінаідай Кадняк. Апошняя ў лісце Ант. Адамовічу ад 16 студзеня 1980 г. пісала: «Алесь напісаў ёй (*Ларысе Геніюш. — М. С.*) усяго некалькі лістоў, ды і тыя не ўсе дайшлі. Я ж пісала пра ягонае жыццё больш падрабязна, а часам і вершы, якія — без палітыкі. Вядомая рэч, прозвішчаў (*колішніх знаёмцаў А. Салаўя, якія наведвалі Л. Геніюш у Зэльве. — М. С.*) яна не ўспамінае, згадвае месца, адкуль яны ведаюць Алеся, і ён здагадваўся, хто яны такія. Адзін з іх прыслаў нават віншавальную картку на ягоныя 50-я ўгодкі. Толькі не падпісаў, ад каго, і без зваротнага адрасу» (ФАС). *І з «Невадам...» плывём у глыбы таямніцаў...* — маецца на ўвазе зборнік Ларысы Геніюш «Невадам з Нёмана» (1967).

Жадаю вам у гэты час світання... (с. 195). Упершыню — газ. «Голас Радзімы», 14 снежня 1995 г. Публікацыя Яніны Кісялёвай. Віншаванне адрасаванае Ларысе Геніюш. Аўтограф — ЦНБ НАН (ф. 31, адз. зах. 357, арк. 1–2).

Любіла красы паўніню... (с. 195). Упершыню — газ. «Беларус», 1973, № 200. *Ліда Нікан (з дому Пашынкоўскіх)* — жонка Міколы Нікана (1908–1999), актывіста беларускага руху ў Аўстраліі. Пасля Другой сусветнай вайны жыла ў Швецыі, працавала ў Чырвоным Крыжы, з 1948 г. — у Лондане, дзе пазнаёмілася з М. Ніканам; з 1952 г. жыла ў Мельбурне, памерла ў 1973 г. Верш змешчаны на надмагільным помніку Ліды Нікан, пахаванай на беларускай дзялянцы могільніка Фоўкнер у Мельбурне.

Жадаю Вам найсветлых дзён... (с. 196). Упершыню — газ. «Голас Радзімы», 21 снежня 1995 г., пад псеўданімам *Антон Дабрыдзень.* Публікацыя Яніны Кісялёвай. Віншаванне адрасаванае Ларысе Геніюш. Аўтограф — ЦНБ НАН (ф. 31, адз. зах. 357, арк. 4).

Яно прыйшло адтуль, дзе ўцеха ходзіць з горам... (с. 196). Упершыню — газ. «Беларус», 1970, лістапад. Верш прысвечаны Міколу Скабею (1905–1992) — кіраўніку Згуртавання беларусаў у Вікторыі (Аўстралія), потым — старшыні аўстралійскага Беларускага Цэнтральнага камітэта. Перапісваўся з А. Салаўём, гл. раздзел *Лісты.*

ПАЭМЫ

На хуткіх крылах вольнага Пегаса (с. 197). Упершыню — час. «Новы шлях», 1943, № 23-24. *Зевес (Зеўс)* — у грэцкай міфалогіі галоўнае бажышча, бацька багоў і людзей. *Зефір* — у грэцкай міфалогіі бог заходняга ветру. *Крыўя* — маецца на ўвазе Беларусь. *Пярун* — у славянскай міфалогіі бог грому.

Звіняць званы Святой Сафіі (с.208). Упершыню — газ. «З беларускага жыцця», 1946, № 2; паэма выходзіла асобным выданнем коштам аўтара: Салавей А. Звіняць званы Святой Сафіі, Зальцбург, 1946. Пазней друкавалася ў газ. «Беларускі эмігрант», 1948, № 3. *Ad astra* (лац.) — да зор. *Птушыны Тор* — Млечны Шлях. *Валвой* — хваляй. *Віцьбіч Юрка* (сапр. *Шчарбакоў*; 1905–1975) — беларускі пісьменнік і грамадска-культурны дзеяч. Падчас вайны жыў у Менску, быў ініцыятарам аднаўлення літаб'яднання «Узвышша». У 1944 г. эміграваў. У Нямеччыне ўдзельнічаў у стварэнні літаб'яднання «Шыпшына», рэдагаваў праваслаўны часопіс «Звіняць званы Святой Сафіі». Паэма перакладзеная на ўкраінскую мову Анатолем Галанам.

Домік у Менску (с. 211). Упершыню — час. «Сакавік», 1948, № 2. *Адзіны дом, каханы дом...* — парафраза радка М. Сяднёва «Драўляны дом, блакітны дом!», якім пачынаўся яго верш «Домік у Менску», цалкам уключаны А. Салаўём у аднайменную паэму. *Reich* (ням.) — дзяржава, тут: Нямеччына. *O, mein Gott!* (ням.) — о, мой Божа!

Сын (с. 222). Упершыню — час. «Наперад», 1949, № 18. *Memento mori* (лац.) — памятай пра смерць.

ВЯНОК САНЕТАЎ

Вянок санетаў (с. 226). Упершыню — час. «Конадні», 1958, № 5-6. *Беатрычэ* — гераіня камедыі У. Шэкспіра «Шмат пагаласкі з нічога» (1599). *Леанарда да Вінчы* (1452–1519) — італьянскі жывапісец, скульптар, архітэктар і тэарэтык мастацтва. *Рафаэль Санці* (1483–1520) — італьянскі жывапісец і архітэктар. У тым жа самым нумары «Конадняў» быў надрукаваны і вянок санетаў Міхася Кавыля «Чорны лёд», датаваны 24 лютага 1958 г. Пакуль застаецца нявысветленым, хто аўтар першага беларускага вянка санетаў — М. Кавыль ці А. Салавей. Па сведчаннях сучаснікаў (Ант. Адамовіч) — Алесь Салавей, проста ён затрымаўся з адсылкай свайго вянка ў рэдакцыю. Што праўда, звычайна паэт датаваў свае творы, на аўтографе вянка санетаў даты няма.

ДРАМАТУРГІЧНЫЯ ТВОРЫ

Дух праўдны, духу зла непадуладны (с. 234). Як паведамляе Зора Кіпель у каментарах да зб. «Нятускная краса», твор быў пастаўлены А. Салаўём на сцэне падчас святкавання 25 Сакавіка 1964 г. у Мельбурне; галоўную ролю выканаў сам паэт.

Заззяла прабуджальная дзянніца (с. 242). Упершыню — час. «Баявая ўскалось», 1970, № 10, пад псеўданімам *Антон Дабрыдзень.*

ВЕРШЫ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

У лесе (с. 244). Упершыню — час. «Іскры Ільіча», 1939, № 6. Пазней не перадрукоўваўся.

Улетку (с. 244). Упершыню — час. «Новы шлях», 1944, № 43. Верш надрукаваны без подпісу.

Сняжынкі (с. 245). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 1959, № 1-2. Тамсама — вершы *«Дзед Мароз»* і *«Ялінка».*

Зайчык (с. 247). Упершыню — газ. «Беларускія навіны», 1947, № 6.

ІНШАМОЎНЫЯ І НЕЗАКОНЧАНЫЯ ВЕРШЫ

Куда плывём? Скажи, мой друг, куда?.. (с. 248). Друкуецца паводле выд.: Адамовіч А. Творы / Укл. і прадмова Лявона Юрэвіча. Нью-Ёрк, 2003, с. 402.

Шумит, шумит угрюмая тоска... (с. 248). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС.

Тільки очі лукаво примружить... (с. 249). Друкуецца паводле выд.: Адамовіч А. Да гісторыі беларускае літаратуры / Укл. і аўтар прадмовы Валер Булгакаў. Мінск, 2005, с. 1308. Як прыгадвае І. Качуроўскі, чатырохрадкоўе — пазасталы ў памяці фрагмент пародыі А. Салаўя на ўкраінскага паэта Барыса Аляксандрава.

Ды можа сам, як чалавек, схіліўся... (с. 249). Друкуецца паводле выд.: Юрэвіч Л. Камэнтары. Мінск, 1999, с. 141.

ПЕРАКЛАДЫ

З Райнэра Марыя Рыльке

Песня статуі (с. 250). Упершыню — час. «Новы шлях», 1942, № 5. Тамсама надрукаваныя і наступныя пераклады з Рыльке: «Хлопчык», «Сусед», «Восень». *Райнэр Марыя Рыльке* (1875–1926) — аўстрыйскі паэт.

З Тараса Шаўчэнкі

Садок вішнёвы каля хаты... (с. 252). Шаўчэнка Тарас (1814–1861) — украінскі паэт і мастак.

З Леаніда Палтавы

Хто мы? (с. 252). Упершыню — час. «Шыпшына», 1947, № 5. *Патагонія* — мясцовасць у Паўднёвай Амерыцы на тэрыторыі Чылі і Аргенціны. *Палтава Леанід* (1921–1990) — украінскі паэт і перакладчык. Пасля Другой сусветнай вайны жыў на эміграцыі — у Вялікай Брытаніі і ЗША. Перакладаў беларускіх паэтаў, у тым ліку М. Сяднёва і А. Салаўя.

У бальніцы (с. 253). Упершыню — час. «Конадні», 1955, № 3.

З Адама Міцкевіча

Да Нёмна (с. 254). Упершыню — час. «Конадні», 1955, № 4. *Міцкевіч Адам* (1798–1855) — польскі паэт беларускага паходжання (нарадзіўся ў маёнтку Завоссе на Наваградчыне).

З Макса Дуна

Скакаў я, пакуль дзвюх ступнёў не меў... (с. 254). Упершыню — час. «Беларуская моладзь», 1975, № 4, пад псеўданімам *Антон Дабрыдзень.* Як паведамляў Аляксандр Калодка ў лісце ў БІНіМ ад 10 красавіка 1978 г., пераклад зроблены падчас знаходжання А. Салаўя ў шпіталі ў Морэландзе (прадмесці Мельбурна). *Макс Дун* (1895 —?) — ірландскі паэт. Алесь Салавей меўся падрыхтаваць аўтарскую анталогію перакладаў з ангельскай мовы пад назвай «Узлёты ў свет», пра што паведамляў у 1969 г. у БІНіМ. На жаль, задума не была ажыццёўленая.

ПРОЗА

Кароткі жыццяпіс (с. 255). Упершыню — газ. «Беларускі голас», 31 сакавіка 1944 г. *Чапскі (Гутэн Чапскі) Эмерык* (1828–1896) — дзяржаўны дзеяч, калекцыянер і нумізмат, заснавальнік музея ў Станькаве (цяпер Дзяржынскі раён). *Улетку 1938 года я быў выкліканы ў Менск на месячную канферэнцыю...* — пра навучанне паэта на літаратурных курсах расказвала і Зінаіда Кадняк Антону Адамовічу. Ліст ад 16 студзеня 1980 г.: «Алесю тады было ўсяго 16 год, ён быў наймалодшы, прытым у той час ягоныя бацькі былі арыштаваныя. З'явіўся ён на курсы ў бацькавым касцюме, вопратка на ім, высокім і худым, вісела, як на калу. Ён пачуваў сябе няёмка...». *«Беларуская газэта»* выдавалася ў 1941–1944 гг. у Менску і распаўсюджвалася на тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь. *Часопіс «Новы шлях»* выходзіў у Рызе ў 1942–1944 гг.

Белы снег (с. 260). Упершыню — час. «Новы шлях», 1944, № 3, за подпісам *С. Алесь.* Апавяданне перакладзенае на ўкраінскую мову Барысам Аляксандравым.

Чужы (с. 263). Упершыню — час. «Пагоня», 1946, № 3, пад псеўданімам *Тамара Залеская.* Пазней не перадрукоўвалася.

Маналог сабакі (с. 267). Упершыню — газ. «Бацькаўшчына», 30 траўня 1954 г., пад псеўданімам *Тамара Залеская.* Пазней не перадрукоўваўся. *Wild West* (ангельск.) — дзікі Захад.

Сорак дзён (с. 270). Упершыню — газ. «Беларус», 1973, сакавік. *Ліда Нікан* — гл. зноску да верша *«Любіла красы паўніню...» (с. 195). Нікан Мікола* (1908–1999) — актывіст беларускага руху ў Аўстраліі. Падчас Другой сусветнай вайны служыў у Арміі генерала Андэрса, пасля дэмабілізацыі жыў у Вялікай Брытаніі, з 1952 г. — у Аўстраліі, дзе быў сакратаром Беларускага цэнтральнага камітэта ў Вікторыі. Сябраваў з Алесем Салаўём. *Рэпін Ілья Яфімавіч* (1844–1930) — расейскі мастак. *Рэмбрант Харменс ван Рэйн* (1606–1669) — галандскі жывапісец. *Мне адно прыйшло жаданне, я адну задумаў думу...* — А. Салавей цытуе «Калевалу» ва ўласным перакладзе.

Пад небам Паўдзённага Крыжа (с. 272). Упершыню — газ. «Беларус», 1974, верасень, пад псеўданімам *Антон Дабрыдзень. Квінсленд* — адзін з шасці штатаў Аўстраліі. *Пастушком ганяў у бор...* — цытата з паэмы Уладзіміра Жылкі «Тастамент» (1932–1933). *Люблю наш край, старонку гэту...* — цытата з верша Канстанцыі Буйло «Люблю...» (1911), які стаў вядомай песняй. *Зорка Венера ўзышла над зямлёю...* — першы радок верша Максіма Багдановіча «Раманс» (1912). *Груша Надзея (з дому Сасноўскіх*; 1937–1999) — актывістка беларускіх арганізацый у Аўстраліі, жонка старшыні Выканаўчага камітэта Федэральнай рады беларускіх арганізацый у Аўстраліі Аўгена Грушы (нар. 1935). *Песняй «Беднае сэрца мамы...»* — відаць, маецца на ўвазе песня «*Сэрца маці*», якую, паводле інфармацыі Аляксандра Калодкі, Алесь Салавей пераклаў з расейскай на беларускую мову (гл.: «Беларус», 1979, сакавік).

ЛІСТЫ

1. Масею Сяднёву (с. 275). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў БДАМЛіМ (ф. 363, воп. 1, адз. зах. 80). М. Сяднёў перадаў свой архіў у БДАМЛіМ у 1992 г., у тым ліку 43 лісты Алеся Салаўя. Першы датаваны 31 снежня 1943 г., апошні — 22 верасня 1948 г. «*Новая дарога*» — беларуская газета; выходзіла ў Беластоку пад рэдакцыяй Хведара Ільяшэвіча. За перыяд з 1942 па 1944 г. выйшла больш за сто нумароў. *Mieszkac* (польск.) — жыць.

2. Масею Сяднёву (с. 278). Упершыню ў скароце — час. «Роднае слова», 1998, № 4. Публікацыя Ганны Запартыкі. Друкуецца паводле: Асоба і час, 2009. *Шырокаў Пятро* (літ. псеўданім *Тодар Лебяда*; 1914–1970) — беларускі паэт і драматург. Падчас Другой сусветнай вайны жыў у Віцебску, рэдагаваў газету «Беларускае слова». У 1947 г. быў

асуджаны савецкім ваенным трыбуналам на 25 гадоў няволі. Вызваліўся ў 1956 г. *Байран Джорж Гордан* (1788–1824) — ангельскі паэт і драматург. *Калі грымяць гарматы, дык музы маўчаць...»* У арыгінале: *Inter arma silent Musae*. Выслоўе паходзіць ад выказвання Марка Юлія Цыцэрона: «*Inter anna silent leges» («Калі грыміць зброя, законы маўчаць»). Ёсць чары у мінулым, старадаўным...* — цытуецца верш М. Багдановіча «Тэрцыны». *Няма красы без спажытку...* — цытата з апавядання М. Багдановіча «Апокрыф» (1913). *«Маё гарачае прывітанне Янку Богдану...»* — у часопісе «Новы шлях» зрэдку друкаваліся вершы Янкі Богдана; асобу аўтара складальніку высветліць не ўдалося.

3. Масею Сяднёву (с. 282). Упершыню ў скароце — час. «Роднае слова», 1998, № 4. Публікацыя Ганны Запартыкі. Друкуецца паводле: Асоба і час, 2009. *Або для часопіса «Узвышша...»* — часопіс з такой назвай у 1944 г. меркавала выдаваць у Менску Беларускае культурнае згуртаванне. Паводле неўдакладненай інфармацыі, першы нумар паспеў выйсці з друку. *Зборнік лірыкі...* — маецца на ўвазе зборнік «Мае песні», які выйшаў у менскім «Выдавецтве падручнікаў і літаратуры для моладзі» ў 1944 г. *Сівіца Ёзаф* — кіраўнік Школьнага інспектарату і «Выдавецтва падручнікаў і літаратуры для моладзі», якія дзейнічалі ў Менску падчас Другой сусветнай вайны.

4. Масею Сяднёву (с. 285). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў БДАМЛіМ (ф. 363, воп. 1, адз. зах. 80). *Латышскі літаратар і паэта...* — відаць, маецца на ўвазе Аляксандрас Анцанас (1910–1944). Асобу *Міколы Валнавога* складальніку высветліць не ўдалося.

5. Масею Сяднёву (с. 287). Упершыню — Асоба і час, 2009. *Езавітаў Кастусь* (1893–1946) — беларускі палітычны і грамадскі дзеяч, сакратар ваенных спраў у першым Урадзе БНР (1918), генерал-маёр (1920). Узначальваў галоўную ваенную ўправу Беларускай Цэнтральнай Рады (1944). У 1945 г. арыштаваны савецкімі спецслужбамі ў Нямеччыне. Памёр пасля катаванняў у менскай турме. *Крытык Дуброва...* — Плашчынскі Ізыдар (1908–1986), беларускі крытык і літаратуразнавец. Падчас вайны працаваў акторам у Менскім гарадскім тэатры. Эміграваў у 1944 г., жыў у ЗША пад імем Язэп Гуткоўскі. Брат паэта Язэпа Пушчы. *Крывічанін Лявон* (сапр. *Савёнак*; 1897–1974) — беларускі журналіст і пісьменнік. Падчас Другой сусветнай вайны жыў у Менску, друкаваўся ў «Беларускай газэце». Пасля вайны жыў у Нямеччыне і ЗША. *Апалінар Чоп* — адзін з рэдкаўжываных псеўданімаў Алеся Салаўя. *Дудзіцкі Уладзімір* (сапр. *Гуцька*; 1911—?) — беларускі паэт і культурны дзеяч.

Падчас Другой сусветнай вайны працаваў у Менскай гарадской управе, узначальваў аддзел прапаганды Беларускай краёвай абароны. З 1944 г. — на эміграцыі. Жыў у Венесуэле, Нямеччыне, ЗША. У 1950-я гг. быў галоўным рэдактарам беларускай службы радыё «Свабода». *Беларускае культурнае згуртаванне* — культурна-асветная арганізацыя, якая ад 1944 г. дзейнічала пры Беларускай Цэнтральнай Радзе. *Цютчаў Фёдар Іванавіч* (1803–1873) — расейскі паэт і дзяржаўны дзеяч. *Арсеннева Наталля* (1903–1997) — беларуская паэтка. Выпускніца Віленскай беларускай гімназіі. У 1940–1941 гг. знаходзілася ў высылцы ў Казахстане. Пазней жыла ў Менску, працавала ў «Беларускай газэце». У 1944 г. пакінула Беларусь, жыла ў ЗША. *«Славянские ручьи сольются в русском море...»* — цытата з верша А. Пушкіна «Клеветникам России» (1831). *«Не лукоморьями у дубов зелёных...»* — маецца на ўвазе пачатковы радок паэмы А. Пушкіна «Руслан и Людмила»: «*У Лукоморья дуб зелёный*». *Мальер* (сапр. *Жан Баціст Паклен*; 1622–1673) — французскі драматург, актор і тэатральны дзеяч. *Фет Афанасій Афанасьевіч* (сапр. *Шэншын*; 1820–1892) — расейскі паэт. *Маякоўскі Уладзімір Уладзіміравіч* (1893–1930) — расейскі паэт і драматург. *«В последнем вкусе туалетом / Заняв ваш любопытный взгляд...»* — цытата з рамана ў вершах А. Пушкіна «Яўгеній Анегін» (1832). *Галкоўскі Канстанцін* (1875–1963) — беларускі і літоўскі кампазітар і дырыжор. Народны артыст Літвы (1955). Пісаў музычныя творы на вершы Ф. Багушэвіча, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Танка. *«Когда б вы знали, как ужасно / Томиться жаждою любви...»* — цытата з рамана ў вершах А. Пушкіна «Яўгеній Анегін» (1832). *«Край наш бедны, край наш родны, / Лес, балота ды пясок...»* — цытата з верша Я. Коласа «Наш родны край» (1906). *«Ах, ножки, ножки! Где вы ныне? / Где мнёте нежные цветы?..»* — цытата з рамана ў вершах А. Пушкіна «Яўгеній Анегін» (1832). *«На берегу пустынных волн / Стоял он, дум великих полн...»* — цытата з паэмы А. Пушкіна «Медны коннік» (1833). *Дзямідаў Мікалай* (1888–1967) — беларускі грамадскі і вайсковы дзеяч. Адзін з арганізатараў Беларускага войска (1918), удзельнічаў у Палескім паходзе С. Булак-Балаховіча (1920). У міжваенны перыяд быў паслом Польскага Сойму ад Беластоцкай акругі. Падчас Другой сусветнай вайны настаўнічаў у Латгаліі. Эміграваў у 1944 г., жыў у ЗША. Працуючы ў рэдакцыі «Новага шляху» ў Рызе, А. Салавей жыў у кватэры М. Дзямідава. *Случанін Лявон* (сапр. *Шпакоўскі*; 1914–1995) — беларускі паэт. Выпускнік Менскага педінстытута. Перад вайной быў рэпрэсаваны, падчас вайны працаваў у рэдакцыі «Газэты Случчыны». У 1944 г. пакінуў радзіму, аднак быў арыштаваны савецкімі спецслужбамі, прывезены ў Беларусь і асуджаны. Пасля вызвалення жыў у Салігорску. *Ільяшэвіч*

Хведар (1910–1948) — беларускі паэт, журналіст, грамадскі дзеяч. Выпускнік гістарычнага факультэта Віленскага універсітэта. Падчас Другой сусветнай вайны жыў у Беластоку, узначальваў тамтэйшы Беларускі камітэт, рэдагаваў газету «Новая дарога». З 1944 г. — на эміграцыі, жыў у Берліне, пасля — у лагеры Ватэнштэт. Загінуў у аўтамабільнай катастрофе. А. Салавей мог бачыць віленскія зборнікі Хв. Ільяшэвіча «Зорным шляхам» (1932) і «Захварбаваныя вершы» (1936). *Друкарня Мамонічаў...*— кніга Хв. Ільяшэвіча «Drukarnia domu Momoniczow w Wilne (1575–1622)» выйшла ў 1938 г. *«Калосьсе»* — беларускі літаратурна-навуковы часопіс. Выходзіў у Вільні ў 1935–1939 гг. *Танк Максім* (сапр. *Яўген Скурко*; 1912–1995) — беларускі пісьменнік, грамадскі і дзяржаўны дзеяч. Старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі (1967–1990), член ЦК Камуністычнай партыі Беларусі (1966–1990), старшыня Вярхоўнага Савета БССР (1963–1971). Народны паэт Беларусі (1968), Герой сацыялістычнай працы (1974), лаўрэат Сталінскай (1948), Ленінскай (1978) і Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Купалы (1966). *Машара Міхась* (1902–1976) — беларускі паэт, актывіст нацыянальна-вызвольнага руху ў Заходняй Беларусі. *Іверс Анатоль* (сапр. *Іван Міско*; 1912–1999) — беларускі паэт і ўдзельнік нацыянальна-вызвольнага руху ў Заходняй Беларусі. *Васілёк Міхась* (сапр. *Касцевіч*; 1905–1960) — беларускі паэт. Падчас Другой сусветнай вайны жыў на акупаванай тэрыторыі, падпольна ўдзельнічаў у антыфашысцкім руху. *Хмара Сяргей* (сапр. *Сіняк*; 1905–1992) — беларускі паэт, выдавец, грамадскі дзеяч. Падчас Другой сусветнай вайны рэдагаваў газету «Слонімскі кур'ер». Пакінуў Беларусь у 1944 г., жыў у Канадзе, выдаваў газету «Беларускі голас» і часопіс «Баявая ўскалось». *Станкевіч Станіслаў* (1886–1964) — беларускі выдавец; з 1926 г. трымаў у Вільні ўласную кнігарню. *Лявон Бушмар* — герой аднайменнай аповесці Кузьмы Чорнага; тут у значэнні: аднаасобнік.

6. *Масею Сяднёву (с. 298).* Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў БДАМЛіМ (ф. 363, воп. 1, адз. зах. 80). *Родныя, не плачце пры ўспаміне...* — радок з верша М. Сяднёва «Маім бацькам».

7. *Масею Сяднёву (с. 298).* Упершыню — Асоба і час, 2009. *Наш галоўны рэдактар...* — маецца на ўвазе Уладзімір Сядура. *Будзька Часлаў* (1913–1985) — беларускі грамадскі дзеяч і педагог. Выпускнік гуманістычнага факультэта Віленскага універсітэта. Падчас Другой сусветнай вайны жыў у Нямеччыне, пасля — у Вялікай Брытаніі і ЗША. *«Раніца»* — беларуская газета, выходзіла ў 1939–1945 гг. у Берліне.

«Такія дактары вымуць душу без пары» — сатырычны верш К. Крапівы, напісаны ў 1923 г.

8. Уладзіміру Сядуру і Масею Сяднёву (с. 301). Упершыню ў скароце — час. «Роднае слова», 1998, № 4. Публікацыя Ганны Запартыкі. Друкуецца паводле: Асоба і час, 2009. *«Шыпшына»* — беларускі літаратурны часопіс; выдаваўся ў лагеры Міхельсдорф (1946–1948) пад рэдакцыяй Ю. Віцьбіча. *«Пагоня»* — беларускі літаратурна-мастацкі часопіс; выдаваўся ў Зальцбургу (1945–1946) рэдкалегіяй у складзе А. Грыцука, У. Дудзіцкага, А. Салаўя. *«З беларускага жыцця»* — тыднёвік, які выдаваўся той самай рэдкалегіяй у Зальцбургу (1946–1947). *Грыцук Аляксей* (1910–1976) — беларускі грамадскі дзеяч, педагог і літаратуразнавец. Выпускнік гістарычнага факультэта Варшаўскага універсітэта. Падчас Другой сусветнай вайны арганізоўваў беларускія школы на Беласточчыне. З 1948 г. жыў у Канадзе, узначальваў Згуртаванне беларусаў Канады. Абараніў доктарскую дысертацыю па творчасці М. Багдановіча. *УНРРА* (*UNRRA — United Nations Relief and Rehabilitation Administration*) — Арганізацыя Аб'яднаных Нацый па дапамозе і аднаўленні. Створаная ў 1943 г. у ЗША прадстаўнікамі 44 краінаў. Дапамагала пацярпелым падчас Другой сусветнай вайны. *Ганько Мікола* (1924–1999) — беларускі грамадскі дзеяч і публіцыст. Пасля вайны жыў у Зальцбургу, з 1948 г. — у Канадзе, дзе заснаваў і многія гады ўзначальваў Згуртаванне беларусаў. Брат старшыні Саюза беларускай моладзі Міхася Ганько.

9. Юрку Віцьбічу (с. 304). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС. *Буду пісаць вялікую паэму...* — звестак аб паэме пра Грунвальдскую бітву складальнік не мае. *Ягайла* (1352?—1434) — вялікі князь ВКЛ і кароль Польшчы; быў галоўнакамандуючым аб'яднаных войскаў Польшчы і ВКЛ падчас Грунвальдскай бітвы. *Можа... скаўты ведаюць што-небудзь...* — у беларускіх DP-лагерах быў пашыраны скаўцкі рух; да каго канкрэтна звяртаецца А. Салавей — невядома.

10. Вітаўту Тумашу (с. 306). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў архіве БІНіМ. *Тумаш Вітаўт* (1910–1998) — беларускі гісторык, публіцыст, грамадскі дзеяч, адзін з рэдактараў газеты «Раніца». Пасля Другой сусветнай вайны жыў у Нямеччыне і ЗША, займаўся пераважна скарыназнаўствам. *Г. Ляўчук* — мастак, аздобіў зборнік А. Салаўя «Сіла гневу» (1948). *«Шляхам жыцця», «Скаўт»* — беларускія часопісы, якія выдаваліся ў лагеры Ватэнштэт.

11. Масею Сяднёву (с. 308). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў БДАМЛіМ (ф. 363, воп. 1, адз. зах. 80). *«Званы»* — ма-

ецца на ўвазе часопіс «Звіняць званы Святой Сафіі», які выдаваў Юрка Віцьбіч.

12. Масею Сяднёву (с. 309). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў БДАМЛіМ (ф. 363, воп. 1, адз. зах. 80).

13. Вітаўту Тумашу (с. 310). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў архіве БІНіМ. *«Скаўцкая інфармацыйная служба»* — бюлетэнь пад такой назвай выходзіў у лагеры Мэйервік. *Нікіфараў Віктар* — беларускі святар; падчас Другой сусветнай вайны належаў да Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы. На эміграцыі быў настаяцелем прыходу ў Зальцбургу, перайшоў у юрысдыкцыю Расейскай праваслаўнай царквы за мяжой. З 1951 г. — у ЗША.

14. Масею Сяднёву (с. 313). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў БДАМЛіМ (ф. 363, воп. 1, адз. зах. 80). *Палікарп Манькоў* (1910–1999) — грамадскі дзеяч. Падчас вайны працаваў у Слонімскім гебітскамісарыяце, быў адным з кіраўнікоў Саюза беларускай моладзі. З 1944 г. — на эміграцыі.

15. Масею Сяднёву (с. 314). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў БДАМЛіМ (ф. 363, воп. 1, адз. зах. 80).

16. Масею Сяднёву (с. 314). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў БДАМЛіМ (ф. 363, воп. 1, адз. зах. 80).

17. Вітаўту Тумашу (с. 316). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў архіве БІНіМ.

18. У рэдакцыю газеты «Беларускія навіны» (с. 316). Упершыню ў скароце — час. «Шыпшына», 1947, № 4; тэкст цалкам — Асоба і час, 2009). Друкуецца паводле машынапісу, які зберагаецца ў ФАС.

19. Вітаўту Тумашу (с. 319). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў архіве БІНіМ. *Я напісаў два раздзелы аповесці ў прозе «Пад нагамі гарыць зямля»...* — складальнік не мае звестак пра гэты твор А. Салаўя.

20. Аляксандру Міцкевічу (с. 320). Друкуецца паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС. *Міцкевіч Аляксандр* — беларускі грамадскі дзеяч на эміграцыі, уваходзіў у Беларуска-Амерыканскае задзіночанне, быў сябрам Рады Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы, займаўся распаўсюдам газеты «Беларус».

21. Вітаўту Тумашу (с. 321). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў архіве БІНіМ. *Газета «Бацькаўшчына»* выдавалася

з 1947 па 1966 г. у Мюнхене. *Жылка Уладзімір* (1900–1933) — беларускі паэт. *Дубоўка Уладзімір* (1900–1976) — беларускі паэт і перакладчык. *Пушча Язэп* (сапр. *Плашчынскі*; 1902–1964) — беларускі паэт. *Часопіс «Медычная думка»* выдаваўся пад рэдакцыяй Вітаўта Тумаша. *Брусаў Валеры* (1873–1924) — расейскі паэт, перакладчык, выдавец. *Горкі Максім* (сапр. *Аляксей Пешкаў*; 1868–1936) — расейскі пісьменнік і грамадскі дзеяч.

22. Юрку Віцьбічу (с. 323). Друкуецца паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС. *Мікола Вярба* (сапр. *Сільвановіч*; 1917–1975) — беларускі пісьменнік і грамадскі дзеяч, з 1944 г. — на эміграцыі, адзін са стваральнікаў літаратурнага згуртавання «Шыпшына». З 1949 г. жыў у Канадзе.

23. Масею Сяднёву (с. 326). Упершыню — час. «Роднае слова», 1998, № 4 (у скароце). Публікацыя Ганны Запартыкі. Друкуецца паводле аўтографа, які зберагаецца ў БДАМЛіМ (ф. 363, воп. 1, адз. зах. 80).

24. Масею Сяднёву (с. 327). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў БДАМЛіМ (ф. 363, воп. 1, адз. зах. 80).

25. Вітаўту Тумашу (с. 327). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў архіве БІНіМ. *Сурвіла Янка* (1925–1997) — выпускнік Мадрыдскага універсітэта (1956). У 1952 г. заснаваў беларускую рэдакцыю Іспанскага радыё. З 1969 г. жыў у Канадзе, дзе працаваў у Міністэрстве занятасці і эміграцыі.

26. Масею Сяднёву (с. 328). Упершыню ў скароце — час. «Роднае слова», 1998, № 4. Публікацыя Ганны Запартыкі. Друкуецца паводле: Асоба і час, 2009. *МУР* — Мистецький український рух. *Зізаній Лаўрэнцій* (?—1634) — беларускі асветнік, царкоўны дзеяч, мовавед і педагог. У 1596 г. выдаў у Вільні падручнік «Азбука з Лексісам», куды ўвайшоў старабеларускі слоўнік (1061 слова). «*Час*» — украінскі часопіс, які выдаваўся ў Зальцбургу. *Славуціч Яр* (1918—?) — украінскі паэт і выдавец. Пасля Другой сусветнай вайны жыў у Канадзе, перакладаў і выдаваў беларускую паэзію. *Кавыль Міхась* (сапр. *Язэп Лешчанка*; нар. 1915) — беларускі паэт і выдавец. Служыў у Чырвонай Арміі, у 1942 г. трапіў у нямецкі палон. Падчас вайны працаваў у аддзеле прапаганды Генеральнага камісарыяту. З 1944 г. — на эміграцыі, жыве ў ЗША. Рэдагаваў літаратурна-публіцыстычны часопіс «Беларуская думка» (Саўт-Рывер). «*Цень Янкі Купалы*» — паэма Масея Сяднёва, датуецца 1947 г. «*Літаўры*» — украінскі літаратурны часопіс, выдаваўся ў Зальцбургу. *Махатма Гандзі* (сапр. *Махандас Карамчанд*; 1869–1948) — індыйскі грамадска-палітычны дзеяч і мысляр, адзін з лідэраў нацыянальна-вы-

звольнага руху. Празваны ў народзе Махатмам, што азначае «вялікая душа». *Хірахіта* (1901–1989) — імператар Японіі ў 1926–1989 гг.

27. Масею Сяднёву (с. 330). Упершыню — Асоба і час, 2009. «*Сакавік*» — літаратурны часопіс, які выходзіў у лагеры Остэргофэн (Нямеччына) пад рэдакцыяй Ант. Адамовіча. *Бялевіч Антон* (1914–1978) — беларускі паэт. Падчас Другой сусветнай вайны партызаніў. Жыў у Менску.

28. Вітаўту Тумашу (с. 331). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў архіве БІНіМ. *«Беларускія навіны»* — газета, якая выдавалася ў Парыжы (1945–1947) пад рэдакцыяй Лявона Рыдлеўскага. *Перажыванні палоннага Чарадзея, пададзеныя ў «Слове»...* — Відаць, маюцца на ўвазе радкі: «*Яму ў Полацку пазвоняць ютрань рана ў званы святое Сафіі, а ён той звон чуе ў Кіеве*» (пер. Рыгора Барадуліна; гл.: Слова пра паход Ігара. Мінск, 1986.). *DP* (ад ангельскага *Displaced Person)* — перамешчаная асоба.

29. Вітаўту Тумашу (с. 333). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў архіве БІНіМ. *Друзья-товарищи...*— маецца на ўвазе Савецкі Саюз.

30. Юрку Віцьбічу (с. 335). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС. *Беларускі дапамогавы камітэт у Нямеччыне* — магчыма, маецца на ўвазе Беларускі нацыянальны камітэт, створаны ў 1945 г. у Рэгенсбургу (Нямеччына).

31. Аляксандру Лашуку (с. 335). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС. *Лашук Аляксандр* (1909–1997) — грамадскі дзеяч; з 1944 г. — на эміграцыі. Служыў у 2-м Польскім корпусе. Пасля вайны быў адным з заснавальнікаў Згуртавання беларусаў у Вялікай Брытаніі, жыў у Лондане. Асобу *К. Ваўка* складальніку высветліць не ўдалося.

32. Масею Сяднёву (с. 337). Упершыню — Асоба і час, 2009. *І Алёшка зусім паважна радзіць мне...* — маецца на ўвазе *Аляксей Грыцук.*

33. Вітаўту Тумашу (с. 338). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў архіве БІНіМ. *Каваль-вернідуб* — герой-асілак з аднайменнай вершаванай казкі Алеся Якімовіча (1935).

34. Яну Пятроўскаму (с. 339). Публікуецца па выд.: Пятроўскі Ян. Мэмуары: стагоддзе ў рэтраспэкце. — Слуцак—Гэйнсвіл. Кніга 2. 1991, с. 97, дзе апублікаваны ўпершыню. *Пятроўскі Ян* (1905—?) — дзеяч пратэстанцкай царквы, выдавец, перакладчык, пісьменнік, лексікограф;

з 1953 г. жыў у ЗША, дзе выдаваў часопіс «Светач Хрыстовае навукі». Склаў «Клясычны грэцка-беларускі слоўнік» (1985).

35. Яну Пятроўскаму (с. 341). Публікуецца па выд.: Пятроўскі Ян. Мэмуары: стагоддзе ў рэтраспэкце — Слуцак—Гэйнсвіл. Кніга 2. 1991, с. 104, дзе апублікаваны ўпершыню.

36. Аляксандру Лашуку (с. 342). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС.

37. Яну Пятроўскаму (с. 343). Публікуецца па выд.: Пятроўскі Ян. Мэмуары: стагоддзе ў рэтраспэкце — Слуцак—Гэйнсвіл. Кніга 2. 1991, с. 102, дзе апублікаваны ўпершыню.

38. Масею Сяднёву (с. 344). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў БДАМЛіМ (ф. 363, воп. 1, адз. зах. 80). Асобу *Леонаса Кравіс-Чаніўса* складальніку высветліць не ўдалося. *Цэлеш (Целеш) Мікола* (1900–1976?) — беларускі пісьменнік; падчас Другой сусветнай вайны працаваў у «Беларускай газэце», з 1944 г. — на эміграцыі, жыў у Нью-Ёрку. Беларускім Інстытутам навукі і мастацтва ў Нью-Ёрку ў 1995 г. выдадзена кніга М. Цэлеша «Хмары над Бацькаўшчынай» / укл. і прадмова Лявона Юрэвіча. Асобу *М. Гука* высветліць не ўдалося.

39. Масею Сяднёву (с. 345). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў БДАМЛіМ (ф. 363, воп. 1, адз. зах. 80).

40. Аляксандру Лашуку (с. 347). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС.

41. Масею Сяднёву (с. 348). Упершыню — Асоба і час, 2009. «*У акіяне ночы*» — зборнік М. Сяднёва, выйшаў у 1947 г. у Мюнхене. *Вокладка Г. Л.* — Г. Леўчука. *IRO (International Relief Organization)* — Міжнародная арганізацыя дапамогі бежанцам. Дзейнічала ў 1947–1950 гг. на тэрыторыі Нямеччыны і Аўстрыі.

42. Юрку Віцьбічу (с. 350). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС. *Кастэцкі Ігар* (1913–1983) — украінскі паэт і перакладчык, быў адным з заснавальнікаў Мастацкага ўкраінскага руху (Нямеччына).

43. Масею Сяднёву (с. 351). Упершыню ў скароце — час. «Роднае слова», 1998, № 4. Публікацыя Ганны Запартыкі. Друкуецца паводле: Асоба і час, 2009.

44. Масею Сяднёву (с. 353). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў БДАМЛіМ (ф. 363, воп. 1, адз. зах. 80).

45. *Вітаўту Тумашу (с. 353).* Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў архіве БІНіМ.

46. *Масею Сяднёву (с. 355).* Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў БДАМЛіМ (ф. 363, воп. 1, адз. зах. 80). *«Спадзяванні»* — зборнік вершаў М. Сяднёва, выйшаў у 1947 г. у Рэгенсбургу (Нямеччына).

47. *Масею Сяднёву (с. 355).* Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў БДАМЛіМ (ф. 363, воп. 1, адз. зах. 80). *«Зарубежнікі»* — маюцца на ўвазе прыхільнікі Беларускай цэнтральнай рады, якая аднавіла сваю дзейнасць у Нямеччыне ў 1947 г.

48. *Масею Сяднёву (с. 356).* Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў БДАМЛіМ (ф. 363, воп. 1, адз. зах. 80).

49. *Вітаўту Тумашу (с. 356).* Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў архіве БІНіМ.

50. *Масею Сяднёву (с. 358).* Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў БДАМЛіМ (ф. 363, воп. 1, адз. зах. 80). *Ясенін Сяргей* (1895–1925) — расейскі паэт. *Качуроўскі Ігар* (нар. 1918) — украінскі паэт, перакладчык, даследчык літаратуры. У 1948 г. выехаў з Аўстрыі ў Аргенціну, у 1969 г. вярнуўся ў Еўропу, працаваў на радыё «Свабода», цяпер жыве ў Мюнхене. Напісаў успаміны пра А. Салаўя (гл. раздзел *Дадатак*), а таксама артыкул «Паэзія Алеся Салаўя» (гл.: Качуровський Ігор. 150 вікон у світ: з бесід, трансльованих по радіо «Свобода». Київ, 2008). Тамсама змешчаны верш І. Качуроўскага «Памяці Алеся Салаўя» (1978). У суаўтарстве з паэтам Б. Аляксандравым І. Качуроўскі напісаў (па-беларуску!) пародыю-александрыну на А. Салаўя (нагадаем, што і Салавей напісаў сяброўскую пародыю на І. Качуроўскага па-ўкраінску — гл. раздзел *Іншамоўныя і незакончаныя вершы*). Падаем тут твор украінскіх паэтаў як факт беспрэцэдэнтнага ўкраінска-беларускага літаратурнага сяброўства):

Так пачынаецца мая александрына.
Якая прыгажосць — цяжарная жанчына!
Яечка круглае ўдае сабой зусім,
Як гадаваны грыб, дзіцё ўсё спее ў ім.
Яна не ведае, хто бацькам ёсць дзіцяці,
Але аб гэтым ёй зусім не трэба знаці.
Я й сам не ведаю запраўднага з бацькоў.
Ці я яго зрабіў, ці сябра мой Сяднёў?

51. Юрку Віцьбічу (с. 358). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС. *«Храните гордое терпенье...И дум высокое стремленье»* — цытата з верша А. С. Пушкіна «Во глубине сибирских руд» (1927). *Лепш за Ю. Шэраха (Гр. Шаўчука ведае...* — відаць, маецца на ўвазе *Шэрах Юрый* (1908–2002) — украінскі пісьменнік, лінгвіст, гісторык літаратуры. Быў віцэ-прэзідэнтам Мастацкага ўкраінскага руху (Нямеччына). *Зарэцкі Міхась* (сапр. *Касянкоў*; 1901–1937) — беларускі пісьменнік. У 1936 г. быў арыштаваны і праз год расстраляны. Першая частка рамана *«Крывічы»* была надрукавана ў 1929 г. («Полымя», № 4).

52. Аляксандру Лашуку (с. 360). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС. *«Беларус на чужыне»* — часопіс, выдаваўся з 1947 па 1950 г. у Лондане пад рэдакцыяй Аляксандра Надсана; выйшла ў свет 42 нумары.

53. Масею Сяднёву (с. 361). Упершыню ў скароце — час. «Роднае слова», 1998, № 4. Публікацыя Ганны Запартыкі. Друкуецца паводле аўтографа, які зберагаецца ў БДАМЛіМ (ф. 363, воп. 1, адз. зах. 80). *«Божым шляхам»* — грамадска-рэлігійны і літаратурны часопіс, выдаваўся ў Парыжы (1947–1957) і Лондане (1957–1980), выйшаў у свет 151 нумар.

54. Масею Сяднёву (с. 362). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў БДАМЛіМ (ф. 363, воп. 1, адз. зах. 80).

55. Масею Сяднёву (с. 363). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў БДАМЛіМ (ф. 363, воп. 1, адз. зах. 80).

56. Аляксею Грыцуку (с. 363). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС. *Грыцук Аляксей* (1910–1976) — беларускі грамадскі дзеяч, педагог і літаратуразнавец. Выпускнік гістарычнага факультэта Варшаўскага універсітэта. Падчас Другой сусветнай вайны арганізоўваў беларускія школы на Беласточчыне. З 1948 г. жыў у Канадзе, узначальваў Згуртаванне беларусаў Канады. Асобаў *Фядзюшкі, Казлоўскага, Кліменкі* і *В. Кінава* складальніку высветліць не ўдалося. *Марыя Дуброўская* — сястра Вольгі Дуброўскай, памерла 19 траўня 1948 г. у Зальцбургу. *Дуброўская Вольга (Грыцук*; нар. 1923) — грамадская дзеячка, старшыня Згуртавання беларускіх жанчынаў Канады, аўтарка кнігі «Мы стваралі сваю Беларусь» (Мінск, 2007), жонка Аляксея Грыцука. Напісала ўспаміны пра А. Салаўя, гл. раздзел *Дадатак. Акула Кастусь* (сапр. *Качан Аляксандр*; нар. 1925) — беларускі пісьменнік, з 1947 г. жыў у Канадзе, рэдагаваў газету «Беларускі эмігрант». *Пітушка Язэп* (1913–1984) — адзін са стваральнікаў Згурта-

вання беларусаў Канады, пазней уваходзіў у Беларускае нацыянальнае аб'яднанне; жыў у Таронта. Асобаў *Курыловіча* і *Матвеенкі* складальніку высветліць не ўдалося.

57. Вітаўту Тумашу (с. 365). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў архіве БІНіМ.

58. Аляксандру Міцкевічу (с. 366). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС.

59. Аляксею Грыцуку (с. 367). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС. *Нізка табе кланяюцца Розумавы...* — маюцца на ўвазе *Вера* і *Кастусь Розумавы*. *Nur mit Kinder* (ням.) — толькі з дзіцем. *Ohne* (ням.) — без. *Arbeitzamt* (ням.) — ручная праца; маецца на ўвазе распарадчык працы ў лагеры. *«Хер»* (ням. *Herr*) — пан. *Міхаська* — сын А. Салаўя, народжаны ў 1946 г. *Гануська* — дачка А. Салаўя, народжаная ў 1947 г.

60. Юрку Віцьбічу (с. 368). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС. *Найдурнейшая з усяго «Воля»...* — відаць, маецца на ўвазе газета «Беларуская воля», якая выдавалася ў лагеры Гарміш-Партэнкірхен Яўхімам Кіпелем.

61. Масею Сяднёву (с. 369). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў БДАМЛіМ (ф. 363, воп. 1, адз. зах. 80). *Chairman* (ангельск.) — старшыня.

62. Вітаўту Тумашу (с. 369). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў архіве БІНіМ.

63. Аляксею Грыцуку (с. 370). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС. *Air mail* (ангельск.) — авіяпошта. *Іван Аляксішын* — украінскі навуковец, прафесар геалогіі. Пра *Чалоўскіх* складальніку звестак знайсці не ўдалося. *«Вянкі»* — назва падрыхтаванага да друку зборніка Алеся Салаўя, які не быў выдадзены.

64. Рыгору Крушыну (с. 371). Друкуецца паводле выд.: Крушына Р. Выбраныя творы / Укл., прадмова і каментар М. Скоблы. Мінск, 2005, с. 367, дзе апублікаваны ўпершыню. *С. Юстапчык* — адзін з псеўданімаў Ант. Адамовіча.

65. Масею Сяднёву (с. 372). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў БДАМЛіМ (ф. 363, воп. 1, адз. зах. 80).

66. Масею Сяднёву (с. 373). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў БДАМЛіМ (ф. 363, воп. 1, адз. зах. 80). *Змітрок Бядуля* (сапр. *Самуіл Плаўнік*;1886–1941) — паэт і празаік. *Кузьма Чорны*

(сапр. *Мікалай Раманоўскі*; 1900–1944) — празаік, класік беларускай літаратуры. *Цішка Гартны* (сапр. *Зміцер Жылуновіч*; 1887–1937) — пісьменнік і дзяржаўны дзеяч, старшыня Часовага рабоча-сялянскага ўрада Беларусі (1919). *Кандрат Крапіва* (сапр. *Кандрат Атраховіч*; 1896–1991) — байкапісец, драматург, народны пісьменнік Беларусі (1956). *Ластоўскі Вацлаў* (1883–1938) — палітычны дзеяч, гісторык, этнограф, пісьменнік, акадэмік Акадэміі навук Беларусі (1928), прэм'ер-міністр урада БНР (1919–1923). *«Звязда»* — штодзённая беларуская газета, выходзіць у Менску. *Уітман Уолт* (1819–1892) — амерыканскі паэт. *Янка Золак* (сапр. *Антон Даніловіч*; 1912–2000) — паэт і грамадскі дзеяч; падчас Другой сусветнай вайны працаваў у рэдакцыі «Газэты Случчыны», з 1944 г. — на эміграцыі, жыў у ЗША (г. Саўт-Рывер). *Юрый Клэн* (сапр. *Освальд Бурхарт*; 1891–1947) — украінскі паэт.

67. Масею Сяднёву (с. 375). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў БДАМЛіМ (ф. 363, воп. 1, адз. зах. 80). *Аляксандраў Барыс* (сапр. *Грыбінскі*; 1921–1979) — украінскі паэт.

68. Аляксею Грыцуку (с. 377). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС. Асобаў *Каўтанюка* і *Лугавога* складальніку высветліць не ўдалося. *Губерт Адольф* (1922–2006) — беларускі грамадскі дзеяч. У Зальцбургу ажаніўся з украінкай Раісай Плужнік. У 1948 г. сям'я Губертаў выехала ў Аргенціну, у 1959-м перабралася ў ЗША.

69. Міколу Ганько (с. 379). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС. *Lenarkaserne* (ням.) — літар.: *казарма ў Ленэры*; у гарадку Ленэр размяшчаўся DP-лагер. *Permit* (ангельск.) — дазвол. *Monats-Streckenkarte* (ням.) — месячны праязны квіток.

70. Міколу Ганько (с. 380). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС. *А як Васька маецца?* — магчыма, А. Салавей мае на ўвазе *Васіля Камароўскага* (1914–1953) — беларукага пісьменніка, які на той час жыў у Канадзе. *Aufruf* (ням.) — адозва.

71. Аляксею Грыцуку (с. 381). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС. *Herr A. Adamowitsch, Weissruthenischer Zeitungs—Verlag «Backausczyna», Osterhofen, Am Stadtplatz, Gasthof «Zur Sonne», Germany* (ням.) — Спадар А. Адамовіч, выдавецтва беларускай газеты «Бацькаўшчына», Остэргофэн, Гарадская плошча, гатэль «На сонцы», Нямеччына.

72. Юрку Віцьбічу (с. 382). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС.

73. *Аляксею Грыцуку (с. 383).* Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС. *Pitushka Joseph, General Delivery, Ottawa, Ontario* (ангельск.) — Пітушка Язэп, да запатрабавання, Атава, Антарыю. *Гарадэльская унія* — хаўрус Вялікага Княства Літоўскага з Польшчай, падпісаны ў 1413 г. у замку Гарадле на рацэ Заходні Буг.

74. *Аляксею Грыцуку (с. 385).* Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС.

75. *Міколу Ганько (с. 386).* Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС. Асобу *Ю. Кебуса* складальніку высветліць не ўдалося.

76. *Аляксандру Міцкевічу (с. 388).* Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС.

77. *Аляксею Грыцуку (с. 388).* Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС. *Найдзюк Язэп* (1909–1984), беларускі гісторык і грамадскі дзеяч, аўтар кнігі «Беларусь учора і сяння» (1943); пасля Другой сусветнай вайны жыў у Польшчы пад прозвішчам *Александровіч*. *Люблінская унія* — міжнародна-прававы акт аб’яднання Вялікага Княства Літоўскага з Польшчай у федэратыўную дзяржаву — Рэч Паспалітую, зацверджаны ў Любліне ў 1569 г. Асобу *а. Інакенція* складальніку высветліць не ўдалося.

78. *Масею Сяднёву (с. 390).* Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў БДАМЛіМ (ф. 363, воп. 1, адз. зах. 80). *Можа й Гуцьку...* — маецца на ўвазе паэт Уладзімір Дудзіцкі (1911—?).

79. *Аляксандру Міцкевічу (с. 391).* Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС.

80. *Міколу Ганько (с. 391).* Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС. *Прывітанне Васілю К.* — магчыма, маецца на ўвазе *Васіль Камароўскі.*

81. *Юрку Віцьбічу (с. 392).* Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС. *Кавалеўскі Аўген* (1921–1963) — беларускі драматург; з 1944 г. — на эміграцыі. Арганізаваў у DP-лагеры ансамбль песні і танца «Жыве Беларусь!», пасля жыў у Парыжы.

82. *Аляксею Грыцуку (с. 393).* Друкуецца паводле выд.: Грыцук В. Мы стваралі сваю Беларусь / Укл. Вольга Іпатава. Мінск, 2007, с. 203, дзе апублікаваны ўпершыню. Асобу *Янкі Грыневіча* складальніку высветліць не ўдалося.

83. Міколу Ганько (с. 394). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС. Асобаў *В. Крычкі, А. Біскупа, В. Бараноўскага, Кораця* складальніку высветліць не ўдалося. *Клішэвіч Уладзімір* (1914–1978) — паэт, перакладчык. Падчас Другой сусветнай вайны рэдагаваў «Газэту Случчыны», з 1944 г. — на эміграцыі, жыў у Лос-Анжэлесе (ЗША), выкладаў у каледжы; у 1973 г. выдаў у Менску зборнік «Сняцца сны мне залатыя», наведваў Савецкі Саюз.

84. Аляксею Грыцуку (с. 395). Упершыню — Асоба і час, 2009.

85. Аляксандру Міцкевічу (с. 397). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС.

86. Юрку Віцьбічу (с. 397). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС. *«Промінь»* — украінская газета, якую выдавалі ў DP-лагерах сябры Мастацкага ўкраінскага руху (МУР). *Думкаў што да рэстаўраванай БЦР, як і да тэстамэнтавай БНР, па-ранейшаму не падзяляю...* — у 1947 г. беларуская эміграцыя падзялілася на прыхільнікаў Беларускай Народнай Рэспублікі (старшыня Рады — Мікола Абрамчык) і Беларускай Цэнтральнай Рады (прэзідэнт — Радаслаў Астроўскі). Падрабязней гл.: Гардзіенка А. Беларускі кангрэсавы камітэт Амэрыкі. Смаленск, 2009, с. 18. *Das Scherz mich nicht im gewingsten* (ням.) — гэты жарт мне зусім недаспадобы.

87. Міколу Ганько (с. 398). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС. САБЭ — Сусветнае аб'яднанне беларускай эміграцыі, створанае Лявонам Рыдлеўскім у Парыжы.

88. Аляксею Грыцуку (с. 399). Упершыню — Асоба і час, 2009. *Энгельгарт Яўген* (1899–1948) — нямецкі вайсковы дзеяч. Падчас Другой сусветнай вайны ўзначальваў Наваградскае лясніцтва, службу аховы лесу Налібоцкай пушчы. Аўтар кнігі «Weissruthenian» (1943), перакладчык на нямецкую мову твораў Я. Купалы і М. Багдановіча. *Абрамчык Мікола* (1903–1970) — беларускі грамадскі і палітычны дзеяч, старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі (1947–1970); жыў у Францыі. *Астроўскі Радаслаў* (1887–1976) — беларускі палітычны і грамадскі дзеяч. У 1924–1936 гг. — дырэктар Віленскай беларускай гімназіі. Падчас Другой сусветнай вайны кіраўнік адміністрацыі Бранскай, Магілёўскай і Смаленскай акругаў, з 1943 г. — прэзідэнт Беларускай Цэнтральнай Рады. Пасля 1944 г. жыў у Нямеччыне, Аргентыне, Вялікай Брытаніі, ЗША. *Станкевіч Станіслаў* (1907–1980) — беларускі палітычны і грамадскі дзеяч. Выпускнік Віленскага універсітэта імя Стэфана Баторыя. Падчас Другой сусветнай вайны — намеснік прэзідэнта

БЦР у Баранавіцкай акрузе. З 1944 г. на эміграцыі. Пачаргова рэдагаваў газеты «Бацькаўшчына» і «Беларус», жыў у ЗША, узначальваў управу Беларуска-Амерыканскага Задзіночання.

89. Юрку Віцьбічу (с. 401). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС. *«Беларускае слова»* — газета, выдавалася ў лагерах Міхельсдорф і Бакнанг. *Вальтэр* (1694–1778) — французскі пісьменнік і філосаф.

90. Аляксею Грыцуку (с. 402). Упершыню — Асоба і час, 2009. *Writer* (ангельск.) — пісьменнік. *Скрынінг* (ад ангельск. *Screening test*) — папярэдняе выпрабаванне. *All right* (ангельск.) — усё добра. *That' s capital* (ангельск.) — гэта выдатна. *Тамашчык Уладзімір* (1900–1970) — беларускі грамадскі і рэлігійны дзеяч. Выпускнік агранамічнага факультэта Пражскага політэхнічнага інстытута. Падчас Другой сусветнай вайны працаваў намеснікам галоўнага рэдактара газеты «Новая дарога» (Беласток). З 1944 г. — на эміграцыі. У 1949 г. узведзены ў епіскапы Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы. Жыў у ЗША, узначальваў Беларускі інстытут навукі і мастацтва. Загінуў пры нявысветленых абставінах.

91. Масею Сяднёву (с. 404). Упершыню — Асоба і час, 2009. «*Пурпуровых ветразяў узвівы», «ад нязнаных водаў нязнаныя ўзыходзяць зоры...»* — цытаты з паэмы Уладзіміра Дубоўкі «*Пурпуровых ветразяў узвівы*» (1928). «*Праходны двор паміж Масквою і Варшаваю...»* — маецца на ўвазе Беларусь. *Пасмяротнае выданне твораў Хв. Ільяшэвіча...* — кніга апавяданняў *Хведара Ілляшэвіча* (пад псеўданімам *Святаслаў Залужны*) выйшла ў 1948 г. у лагеры Ватэнштэт.

92. Міколу Ганько (с. 405). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС.

93. Аляксею Грыцуку (с. 406). Упершыню — Асоба і час, 2009. *Pine Postage* (ангельск.) — магчыма, паселішча ў Канадзе. *Качан Аркадзь* (1921–1982) — беларускі грамадскі дзеяч. Падчас вайны працаваў сакратаром Глыбоцкага суда, служыў у Беларускай самаахове, з 1950 г. жыў у Аўстраліі. Асобу *Снежкі* складальніку высветліць не ўдалося. *Кунцэвіч Анатоль* (1912—?) — беларускі грамадскі і рэлігійны дзеяч. Выпускнік тэалагічнага факультэта Варшаўскага універсітэта, быў высвечаны на святара. З 1949 г. жыў у Аўстраліі. *Thick* (ангельск.) — густы, поўны. *That* (ангельск.) — гэта.

94. Аляксандру Міцкевічу (с. 408). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС.

95. Юрку Віцьбічу (с. 408). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС.

96. Міколу Скабею (с. 408). Друкуецца ўпершыню паводле машынапісу, які зберагаецца ў ФАС. *Банагіля* — лагер для мігрантаў у Аўстраліі, на мяжы штатаў Вікторыя і Паўднёвая Валія. *Вудсайд* — лагер для мігрантаў непадалёку ад Адэлаіды. *Скабей Мікола* (1905–1992) — падчас Другой сусветнай вайны кіраўнік беларускай паліцыі у Іллянскай акрузе, дэлегат Другога ўсебеларускага кангрэса, з 1948 г. жыў у Аўстраліі, дзе ачольваў Беларускі цэнтральны камітэт. Выступаў у друку пад псеўданімам *М. Крывіч. Калодка Аляксандр* (1911–1985) — беларускі грамадскі дзеяч. Закончыў юрыдычны факультэт Віленскага універсітэта, падчас Другой сусветнай вайны працаваў упаўнаважаным акруговага камісара ў Вілейцы, быў арыштаваны гестапа і змешчаны ў канцлагер. З 1948 г. — у Аўстраліі, дзе заснаваў некалькі беларускіх арганізацый. Асобу *Курыля* складальніку высветліць не ўдалося. *Army Dep[artment], Keswic Warraks, Adelaide, S[outh] A[ustralia]* (ангельск.) — вайсковы аддзел, Кесвік Варакс, Адэлаіда, Паўднёвая Аўстралія.

97. Міколу Скабею (с. 410). Друкуецца ўпершыню паводле машынапісу, які зберагаецца ў ФАС. *Коўра* — лагер для мігрантаў у Паўднёвай Аўстраліі.

98. Міколу Скабею (с. 412). Друкуецца ўпершыню паводле машынапісу, які зберагаецца ў ФАС. *«І часта, бы ў дзівосным сне, / Я пачуваў пад сэрцам ношу...»* — радкі з паэмы У. Жылкі «Тастамент» (1932–1933). *Філістовіч Янка* (1926–1953) — публіцыст і грамадскі дзеяч, рэдактар часопіса «Моладзь», які выходзіў у 1948–1954 гг. У 1951 г. дэсантаваны са парашуце ў Беларусь для арганізацыі партызанскай барацьбы з савецкай уладай, быў схоплены і ў 1953 г. расстраляны. *Emigration* (ангельск.) — эміграцыя; маецца на ўвазе эміграцыйная служба.

99. Міколу Скабею (с. 416). Друкуецца ўпершыню паводле машынапісу, які зберагаецца ў ФАС.

100. Міколу Скабею (с. 417). Друкуецца ўпершыню паводле машынапісу, які зберагаецца ў ФАС.

101. Міколу Скабею (с. 419). Друкуецца ўпершыню паводле машынапісу, які зберагаецца ў ФАС. *Спаткаўся ты са мной, вясёлай і ўрачыстай, сярод чароўных ніў Ламбардыі цвяцістай...* — радкі з верша А. Салаўя «Сярод чароўных ніў» (1949). *Часопіс «Наперад!»* выдаваўся беларусамі ў Вялікай Брытаніі ў 1948–1949 гг.

102. Міколу Скабею (с. 421). Друкуецца ўпершыню паводле машынапісу, які зберагаецца ў ФАС. *Што да параўнання нашага палажэння з палажэннем нашых суродзічаў пад «раем»...* — маюцца на ўвазе беларусы ў БССР.

103. Міколу Скабею (с. 423). Друкуецца ўпершыню паводле машынапісу, які зберагаецца ў ФАС. *Is Australia a good country?* (ангельск.) — Аўстралія добрая краіна? *Гарошка Леў* (1911–1977) — беларускі святар і даследчык гісторыі царквы ў Беларусі. Закончыў Львоўскую духоўную акадэмію (1936), браў удзел у Другім усебеларускім кангрэсе, з 1944 г. — на эміграцыі. У 1965 г. стаў архімандрытам, кіраваў беларускай секцыяй радыё Ватыкана, рэдагаваў часопіс «Божым шляхам», склаў грэка-лацінска-царкоўнаславянска-беларускі слоўнік (20 000 словаў). *Дзедавец Браніслаў* — прадстаўнік газеты «Бацькаўшчына» ў Аўстраліі.

104. Міколу Скабею (с. 425). Друкуецца ўпершыню паводле машынапісу, які зберагаецца ў ФАС. *Овэртайм* (ангельск. *overtime*) — праца звыш нормы. *Раманоўскі Аляксандр* (1915–1955) — беларускі мастак; з 1949 г. жыў у Аўстраліі, выдаў зборнік палітычных карыкатураў «За жалезнай заслонай» (1955).

105. Міколу Скабею (с. 426). Друкуецца ўпершыню паводле машынапісу, які зберагаецца ў ФАС. *Трысмакоў Парфіры* (1903–1985) — беларускі навуковец-тэхнік; падчас Другой сусветнай вайны працаваў у Менскай гарадской управе, з 1947 г. жыў у Аўстраліі. Доктар *Мілянцэвіч Уладзімір* прыехаў у Аўстралію адначасова з А. Салаўём; яны разам удзельнічалі ў першым сходзе беларусаў Паўднёвай Аўстраліі (студзень 1950 г.), у 1960 г. У. Мілянцэвіч браў удзел у епархіяльным з'ездзе БАПЦ у Мельбурне, належаў да парафіі Святых Апосталаў Пятра і Паўла (Адэлаіда).

106. Міколу Скабею (с. 428). Друкуецца ўпершыню паводле машынапісу, які зберагаецца ў ФАС. Газета «*Беларускі эмігрант*» выходзіла ў канадскім горадзе Таронта (1948–1954).

107. Міколу Скабею (с. 429). Друкуецца ўпершыню паводле машынапісу, які зберагаецца ў ФАС. *Нарушэвіч Станіслаў* (1913–2001) падчас Другой сусветнай вайны працаваў у Берліне на радыё «Вінэта», закончыў Горны інстытут у Боне, у 1947 г. выехаў у Аўстралію. *The Research Institute* (ангельск.) — даследчы інстытут. *Roseworthy Agricultural College* (ангельск.) — Розвэртскі сельскагаспадарчы каледж.

108. Міколу Скабею (с. 431). Друкуецца ўпершыню паводле машынапісу, які зберагаецца ў ФАС.

109. Міколу Скабею (с. 432). Друкуецца ўпершыню паводле машынапісу, які зберагаецца ў ФАС.

110. Міколу Скабею (с. 433). Друкуецца ўпершыню паводле машынапісу, які зберагаецца ў ФАС. *Kilkenny Road, Kilkenny, S[outh] A[ustralia]* (ангельск.) Кількены Роўд, Кількены, Паўднёвая Аўстралія.

111. Аляксею Грыцуку (с. 434). Упершыню — Асоба і час, 2009. *New australian* (ангельск.) — новы аўстраліец. *Adelaide is the capital of sauth Australia* (ангельск.) — Адэлаіда, сталіца Паўднёвай Аўстраліі.

112. Міколу Ганько (с. 436). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС. *«Беларус на чужыне»* — часопіс, выдаваўся з 1947 па 1950 г. у Лондане пад рэдакцыяй Аляксандра Надсана; выйшла ў свет 42 нумары.

113. Міколу Скабею (с. 437). Друкуецца ўпершыню паводле машынапісу, які зберагаецца ў ФАС. *Грошы прыйшлі на «містэра Альбэрта»...*— у Аўстраліі Алесь Салавей жыў пад імем *Альберт Кадняк.*

114. Міколу Скабею (с. 438). Друкуецца ўпершыню паводле машынапісу, які зберагаецца ў ФАС. *Айцец Міхаіл Шчурко* (1907–1972) — беларускі святар-аўтакефаліст; з 1949 г. жыў у Аўстраліі, служыў у Адэлаідзе.

115. Аляксею Грыцуку (с. 439). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС. *Nic z tego nie wyjshlo* (польск.) — нічога з таго не выйшла.

116. Міколу Скабею (с. 440). Друкуецца ўпершыню паводле машынапісу, які зберагаецца ў ФАС. *«Кастэль»* (ангельск. *castle*) — замак. *S[outh] A[ustralia]* (ангельск.) — Паўднёвая Аўстралія. Да ліста быў прыкладзены верш «Чаўны».

117. Аляксею Грыцуку (с. 441). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС. *І як ён трапіў да гэнае «Ускалосі»...*— Кавідаць, маецца на ўвазе часопіс *«Баявая ўскалось»*, які выдаваўся ў Канадзе Сяргеем Хмарам-Сіняком з 1949 па 1981 г. *Пры словах: «Епіскап Васілі...»* — маецца на ўвазе *Тамашчык Уладзімір* (1900–1970) — беларускі грамадскі і рэлігійны дзеяч, у 1948 г. высвечаны ў епіскапы Беларускай праваслаўнай аўтакефальнай царквы пад імем *Васіля.*

118. Міколу Ганько (с. 443). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС.

119. Міколу Скабею (с. 443). Друкуецца ўпершыню паводле машынапісу, які зберагаецца ў ФАС. *Reception and Training Centre* (ангельск.) — Цэнтр прыёму і навучання.

120. Міколу Ганько (с. 447). Друкуецца ўпершыню паводле машынапісу, які зберагаецца ў ФАС.

121. Міколу Скабею (с. 448). Друкуецца ўпершыню паводле машынапісу, які зберагаецца ў ФАС. *Не Dep[artment] Army, a Dep artment] of Emigr[ation]* (бел. — ангельск.) — не вайсковы дэпартамент, а дэпартамент эміграцыйны. *Прыслаў мне Яцкевіч маркі Рады БНР...* — відаць, маецца на ўвазе Данат Яцкевіч (1924–1969) — беларускі вайсковец, заснавальнік Задзіночання беларускіх ветэранаў у Аўстраліі, выдавец часопіса «Лучнік», распаўсюднік беларускіх выданняў.

122. Аляксею Грыцуку (с. 449). Друкуецца паводле выд.: Грыцук В. Мы стваралі сваю Беларусь / Укл. Вольга Іпатава. Мінск, 2007, с. 205, дзе апублікаваны ўпершыню. «*Надежды наши не сбылись...*» — А. Салавей цытуе радок з папулярнай у тыя часы расейскай песні (словы Канстанціна Нікольскага): «*Надежды наши не сбылись / И мы не встретились случайно, / Надежды наши не сбылись, / И не надёжны обещанья...*». *Ц.А.Б.Э.* — маецца на ўвазе *САБЭ* — Сусветнае аб'яднанне беларускіх эмігрантаў. *Ці «адшылі» крыху дуркаватага Хм. ад вашай прэсы...* — маецца на ўвазе *Сяргей Хмара-Сіняк*.

123. Юрку Віцьбічу (с. 451). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС.

124. Аляксею Грыцуку (с. 451). Упершыню — Асоба і час, 2009. *Олесь Аляксандр* (сапр. *Кандыба*; 1878–1944) — украінскі паэт. *Нікан Мікола* (1908–1999) — беларускі грамадскі дзеяч і педагог. Перад пачаткам Другой сусветнай вайны быў арыштаваны НКВД і высланы ў Варкуту. Служыў у арміі генерала Андэрса (1942–1944), з 1952 г. жыў у Аўстраліі. *Жук-Грышкевіч Вінцэнт* (1903–1989) — беларускі грамадскі і палітычны дзеяч, навуковец. Старшыня Рады БНР (1970–1982), кіраўнік Каардынацыйнага камітэта беларусаў Канады. У Атаўскім універсітэце абараніў доктарскую дысертацыю на тэму «Лірыка Янкі Купалы».

125. У Беларускі інстытут навукі і мастацтва (с. 453). Друкуецца паводле выд.: Юрэвіч Л. Літаратурны рух на эміграцыі. Мінск, 2002, с. 128, дзе апублікаваны ўпершыню. *Albert Kadniak, 12 Hook St[reet], St. Albans, Vic[toria], Australia* (ангельск.) — Альберт Кадняк, 12 Хук Стрыт, Сэнт Олбанс, Вікторыя, Аўстралія.

126. Антону Адамовічу (с. 453). Упершыню — Юрэвіч Л. Літаратурны рух на эміграцыі. Мінск, 2002, с. 128. Друкуецца паводле аўтографа, які зберагаецца ў архіве БІНіМ. *У часапісе Рыгор не дагледзеў пару*

мясцінаў... — маецца на ўвазе паэт і рэдактар часопіса «Конадні» Рыгор Крушына. *Заміж 1949...* — у публікацыі Л. Юрэвіча памылкова названы год — 1939. *Ну й яшчэ адна памылка: «берегамі». У вершы «Згода», які хіба будзе надрукаваны ў «Бацькаўшчыне», у апошнім радку мусіць быць «веліч» заміж «радасць»* — гэты тэкст адсутнічае ў публікацыі Л. Юрэвіча.

127. Антону Адамовічу (с. 454). Упершыню — Юрэвіч Л. Літаратурны рух на эміграцыі. Мінск, 2002, с. 128. Друкуецца паводле аўтографа, які зберагаецца ў архіве БІНіМ.

128. Антону Адамовічу (с. 455). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў архіве БІНіМ. *«Конадні»* — літаратурны часопіс, які выдаваў Беларускі інстытут навукі і мастацтва ў Нью-Ёрку ў 1954–1955, 1958 і 1963 гг.

129. Антону Адамовічу (с. 456). Друкуецца паводле выд.: Юрэвіч Л. Літаратурны рух на эміграцыі. Мінск, 2002, с. 128, дзе апублікаваны ўпершыню. *Tradesman, radial drill operator* (ангельск.) — спецыяліст, аператар радыяльнай свідравальнай машыны. *Не магу адмовіцца ад надгадзінаў...* — у публікацыі Л. Юрэвіча памылкова: *пагадзінаў*. *«Абежнік»* — друкаваны орган Беларускага інстытута навукі і мастацтва ў Нью-Ёрку, выходзіў у 1953–1969 гг.. Маюцца на ўвазе *«Творы» Уладзіміра Жылкі*, якія пад рэдакцыяй Ант. Адамовіча выйшлі ў Нью-Ёрку ў 1955 г. *Дастаў 1-ю й 2-ю кнігі «Зборніка»...* — «Беларускі зборнік», які выдаваўся Інстытутам па вывучэнні СССР у Мюнхене. *Не дастаў Вашае кнігі пра Коласа...* — манаграфія Ант. Адамовіча «Якуб Колас у супраціве саветызацыі» выйшла ў 1955 г. *«Віці»* — грамадска-літаратурны часопіс, які выдаваўся ў Нью-Ёрку (1952–1957) Згуртаваннем беларускай моладзі і Беларускім студэнцкім таварыствам. *«Вызваленне»* — першапачатковая назва радыё «Свабода». *Кітс Джон* (1795–1821) — ангельскі паэт.

130. Антону Адамовічу (с. 458). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў архіве БІНіМ.

131. Уладзіміру Глыбіннаму (с. 458). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС. *«На берагох пад сонцам»* — кніга прозы Уладзіміра Глыбіннага, выйшла ў 1964 г. у ЗША. *«Каханы горад»* і *«Афрадыта Ost»* — творы Ант. Адамовіча. *Sonderfuhrer* (ням.) — вайсковае званне ў войсках вермахта. *Шчыра жадаю натхнення да носкага заканчэння «Вялікіх дарогаў» (не «змагарвых твораў, да памыснага заканчэння «Вялікіх дарогаў» (не «змагарных»)...* — маюцца на ўвазе аповесць Уладзіміра Глыбіннага «Вялікія дарогі» і раман Кастуся Акулы «Змагарныя дарогі».

132. Ларысе Геніюш (с. 459). Упершыню — газ. «Голас радзімы», 14 снежня 1995 г. Публікацыя Яніны Кісялёвай. Аўтограф — ЦНБ НАН (ф. 31, воп. 1, адз. зах. 389, арк.1–5). *Наняслі вятры, намялі..* — А. Салавей цытуе верш Л. Геніюш з гэтак званай «каляднай» нізкі. *Шамякін Іван* (1921–2005) — народны пісьменнік Беларусі (1972), Герой сацыялістычнай працы (1981), аўтар папулярных раманаў на тэмы савецкай сучаснасці. *Караткевіч Уладзімір* (1930–1984) — класік беларускай літаратуры; раман «Каласы пад сярпом тваім» закончаны ў 1964 г. *«Невадам з Нёмана»* — кніга Л. Геніюш, выйшла ў 1967 г. *«Мая Іліяда»* — паэтычны зборнік У. Караткевіча, пабачыў свет у 1969 г. *Гілевіч Ніл* (нар. 1931) — паэт, перакладчык, літаратуразнавец, грамадскі дзеяч, народны паэт Беларусі (1991); зборнік *«Перазовы»* выйшаў у 1967 г. У ліст А. Салаўём упісаныя тэксты *раздзела 5* з паэмы *«Домік у Менску», уступны, 1, 2, 13 і 14* санеты з *«Вянка санетаў»*, вершы *«Сярод чароўных ніў»* і *«Акіян»*.

133. Ларысе Геніюш (с. 460). Упершыню — газ. «Голас радзімы», 21 снежня 1995 г. Публікацыя Яніны Кісялёвай. Аўтограф — ЦНБ НАН (ф. 31, воп. 1, адз. зах. 389, арк.8–10). *Учора адведвалі мяне...* — ліст напісаны ў лякарні ў Морэландзе. *Юрка* — сын А. Салаўя. *Быкаў Васіль* (1924–2003) — класік беларускай літаратуры. *Мележ Іван* (1921–1976) — народны пісьменік Беларусі (1972), аўтар трылогіі «Людзі на балоце». *«Санеты» Уільяма Шэкспіра* ў перакладзе Уладзіміра Дубоўкі выйшлі ў 1964 г. У ліст А. Салаўём упісаныя тэксты вершаў *«У сузор'і раззяе Колас...», «Мала», «У ім і па-над ім», «Перад вясной», «Паўдзённы* Крыж».

134. Антону Адамовічу (с. 461). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў архіве БІНіМ. *Weather Bureau* (ангельск.) — бюро надвор'я. *М.С.* — магчыма, Масей Сяднёў.

135. Аляксандру Калодку (с. 462). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ФАС.

136. Антону Адамовічу (с. 462). Друкуецца паводле выд.: Юрэвіч Л. Літаратурны рух на эміграцыі. Мінск, 2002, с. 133, дзе апублікаваны ўпершыню. *Яцкевіч Эўлялія* (нар. 1923) — грамадская дзеячка, была старшынёй Згуртавання беларускіх жанчынаў Аўстраліі, ініцыятаркай стварэння ў 1976 г. беларускай рэдакцыі радыё 3ZZ у Мельбурне, дзе працаваў і А. Салавей. *Беларуская секцыя на Сіднейскім радыё* была створаная ў тым жа 1976 г. *Антон Навіна* — псеўданім *Антона Луцкевіча* (1884–1942) — беларускага палітычнага дзеяча, гісторыка і літаратурнага крытыка. *Шырма Рыгор* (1892–1978) — беларускі харавы дырыжор, фальклярыст і грамадскі дзеяч. *Супрацоўнічаць з іншымі радыёстанцыямі...*—

гэты тэкст адсутнічае ў публікацыі Л. Юрэвіча. *Запруднік Янка* (сапр. *Вільчыцкі Сяргей*; нар. 1926) — гісторык, палітолаг, літаратар, выпускнік Лювенскага універсітэта (Бельгія); працаваў у беларускай рэдакцыі радыё «Свабода», выкладаў у Квінскім каледжы Гарвардскага універсітэта (ЗША), быў галоўным рэдактарам газеты «Беларус». *Many special wishes* (ангельск.) — з самымі найлепшымі пажаданнямі. *Груша Аўген* (нар. 1935) — грамадскі дзеяч, з 1980 г. — старшыня Выканаўчага камітэта Федэральнай рады беларускіх арганізацый у Аўстраліі. *Workshop* (ангельск.) — майстэрня. *Калі б давялося працаваць там, скажам, у радыё...* — маецца на ўвазе праца на радыё «Свабода».

ДАДАТАК
УСПАМІНЫ ПРА АЛЕСЯ САЛАЎЯ

Ігар Качуроўскі. *Алесь Салавей, якім я яго памятаю (с. 465).* Упершыню — газ. «Беларус», 1982, № 301–302.

Вольга Грыцук. *Успамін пра Алеся Салаўя (с. 469).* Упершыню — газ. «Беларус», 1998, № 450. Дапрацаваны тэкст — у лісце В. Грыцук складальніку ад 6 чэрвеня 2009 г.

Ян Пятроўскі. *Спатканне і ўспамога (с. 470).* Упершыню — Пятроўскі Я. Мэмуары: стагодзьдзе ў рэтраспэкце (1945–1953). Кніга 2. Слуцак—Гэйнсвіль, 1991.

Аляксандр Калодка. *Памяці Алеся Салаўя (с. 474).* Упершыню — газ. «Беларус», 1978, № 251.

Уладзімір Брылеўскі. *На ўгодкі смерці Алеся Салаўя (с. 476).* Упершыню — газ. «Беларус», 1979, сакавік.

Мікола Ганько. *Я памятаю (с. 478).* Друкуецца ўпершыню паводле машынапісу, які зберагаецца ў ФАС.

Ліст Зінаіды Кадняк Антону Адамовічу (с. 481). Упершыню — Беларуская мэмуарыстыка на эміграцыі / Укл. Лявон Юрэвіч. Нью-Ёрк, 1999.

Ліст Зінаіды Кадняк Аляксандру Калодку (с. 487). Упершыню — «Запісы БІНіМ», 2005, № 28. Публікацыя Наталлі Гардзіенкі.

Ліст Зінаіды Кадняк Ларысе Геніюш (с. 491). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ЦНБ НАН (ф. 31, воп. 1, адз. зах. 390).

Ліст Міколы Нікана Ларысе Геніюш (с. 493). Друкуецца ўпершыню паводле аўтографа, які зберагаецца ў ЦНБ НАН (ф. 31, воп. 1, адз. зах. 429).

БІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА

Алесь Салавей (сапраўднае імя — Альфрэд Радзюк) нарадзіўся 1 траўня 1922 года ў вёсцы Крысава паблізу Койданава (цяпер — Дзяржынскі раён). Бацька працаваў у лясніцтве, кіраўніком сельгаспрадпрыемстваў, маці была хатняй гаспадыняй. У сям'і, апрача Альфрэда, гадаваліся яшчэ трое дзяцей: Ала (нар. 1923), Лявон (нар. 1929) і Уладзік (нар. 1933). У 1928 бацьку перавялі на працу ў Чэрвенскі раён, у вёску Наталеўск, дзе сямігадовы Альфрэд пайшоў у пачатковую школу. У 1933 годзе Радзюкі вярнуліся ў родныя мясціны і пасяліліся ў Вялікіх Навасёлках, адкуль будучы паэт хадзіў у Койданаўскую сярэднюю школу. У 1937 годзе бацька і маці Альфрэда былі арыштаваныя, іх ён болей ніколі не ўбачыў.

Першыя вершы паэт надрукаваў у газетах «Ударнік Дзяржыншчыны» і «Піянер Беларусі» (1937–1938). Пачаткоўца заўважылі, і ўлетку 1938 года ён быў запрошаны ў Менск на месячныя літаратурныя курсы, арганізаваныя Саюзам пісьменнікаў Беларусі. Пасля курсаў паступіў у Менскае педагагічнае вучылішча (былы Педагагічны тэхнікум імя Усевалада Ігнатоўскага), аднак з-за цяжкіх матэрыяльных варункаў не закончыў яго і ў 1940 годзе ўладкаваўся на працу ў рэдакцыю лагойскай раённай газеты. Там яго на пасадзе намесніка галоўнага рэдактара і заспела вайна. Некалькі месяцаў Алесь Салавей працаваў у рэдакцыі «Беларускай газеты», потым — у цывільнай адміністрацыі мястэчка Ілля на Вілейшчыне. У канцы 1942 года перабраўся ў Рыгу — дзеля працы ў рэдакцыі беларускага часопіса «Новы шлях».

27 чэрвеня 1944 года Алесь Салавей быў дэлегатам Другога ўсебеларускага кангрэса ў Менску. Неўзабаве ў Рызе выйшаў у свет яго першы зборнік «Мае песні». Улетку таго ж 1944 года паэт эвакуяваўся на захад, праз Берлін і Прагу дабраўся да Вены. У Аўстрыі жыў у лагеры для гэтак званых «перамешчаных асобаў» пад Зальцбургам (1945–1949).

У гэтыя гады Алесь Салавей шмат пісаў, актыўна друкаваўся ў перыёдыках, якія выдаваліся на той час у лагерах для ўцекачоў (часопісы «Пагоня», «Шыпшына», «Сакавік», «Звіняць званы Святой Сафіі», газеты «Бацькаўшчына», «З беларускага жыцця»). З гэтых публікацый склаўся другі зборнік «Сіла гневу», які пабачыў свет у 1948 годзе ў Остэргофэне (Нямеччына).

У 1945 годзе Алесь Салавей пабраўся шлюбам з Зінаідай Кадняк, у маладой сям'і нарадзіліся дзеці: сын Міхась і дачка Ганна.

Пасля доўгіх мітрэнгаў у 1949 годзе паэт разам з сям'ёй выехаў у Аўстралію. Два гады адпрацоўваў кантракт у Адэлаідзе, потым пасяліўся настала ў Мельбурне, дзе набыў зямлю і пабудаваў уласны дом. У Аўстраліі нарадзіўся яшчэ адзін сын — Юрка. Кароткі час Алесь Салавей супрацоўнічаў з беларускай секцыяй мясцовага радыё 3ZZ, быў культурным рэферэнтам Беларускага цэнтральнага камітэта ў штаце Вікторыя. Стала працаваў на фабрыцы, засвоіў спецыяльнасць аператара свідравальнай машыны.

Жывучы ў Аўстраліі, падрыхтаваў да друку рукапісы дзвюх кніг — «Вянкі» і «Несмяротнасць», якія, аднак, выдаць не ўдалося.

Алесь Салавей памёр 22 студзеня 1978 года на беразе мора непадалёк ад свайго дома — раптоўна спынілася сэрца. Пахаваны на беларускай дзялянцы могілкаў Фоўкнер у Мельбурне.

У 1982 годзе Беларускі інстытут навукі і мастацтва ў Нью-Ёрку падрыхтаваў і выдаў на складкі суайчыннікаў том выбраных твораў Алеся Салаўя «Нятускная краса» (рэдакцыя і пасляслоўе Антона Адамовіча, бібліяграфічны паказальнік Зоры Кіпель).

Змест

Міхась Скобла. Паладзін радзімы 7

ВЕРШЫ

На сенажаці 19
«Ніхто ў цішы нямой...» 19
«Мінулы дзень...» 20
Шылава гара 20
«Малітвы небу на паперы...» 21
«Дзяўчынка! Хіба я іначай...» 22
«Ці ж не новае шчасце мне знічыць?..» 22
«Пачакай, пабудзь са мной часінку...» 22
Ты 23
Радзіма 23
Вуса 25
«Такі лагодны, як тая ласвіца...» 25
«Змоўклі вясёлыя песні застольныя...» 26
«Узыдзе ранак срэбны ла лугі...» 26
«Я цябе палюбіў усім сэрцам адразу...» 27
«Сумнаю згадкаю...» 28
«Там, на пякельным таку, дзе цапамі малоцяць галовы...» 28
«Выйдзі, паслухай — ґучаць галаслівыя медныя трубы...» 28
Гайна 29
«Не, не я тваю сціснуў руку...» 29
«Бывай здароў, знаёмы кут...» 30
Букет 30
«Чорны крук закракаў на ўсё горла...» 31
Спі, мой родны 31
Маці сына чакае з вайны 32
У мроях 34
Лідскае замчышча 34
Маладзечна 35
Дзеці 35
Беларусі 36

Пад шэлесты лісця . . . 37
За славу радзімы . . . 37
Кінь сваволіць пад вокнамі, вецер… . . . 38
Не пакіну . . . 39
«Мяне не ўспамінаеш — сяння я далёкі...» . . . 40
«У хату поўнач плыве ракой...» . . . 40
«Шляхі маладосці! Без суму...» . . . 40
«Мне і ў цемру не забыцца...» . . . 41
Радасць жыцця . . . 41
Лёс паэта . . . 42
Восень . . . 45
Наш вучоны . . . 46
З вамі . . . 47
Пароша . . . 47
Каляды . . . 47
Мне помніцца студзеньскі вечар . . . 48
З новым годам! . . . 49
Снягі . . . 50
Дарогай шчасця . . . 50
«Ноч топіцца ў снягох, і ветравей скуголіць...» . . . 51
«Што там, наперадзе, іскрыцца...» . . . 51
Трыялет . . . 51
Ліст да крытыка . . . 52
«Зірнула сонца ў маю хату...» . . . 53
«Хутка ў мяне ля вакон...» . . . 53
Афарызмы . . . 53
Хрыстосаў лёс . . . 54
Першы гром . . . 54
«Сустрэўся зноў з табою ў сне...» . . . 54
Драбніцы . . . 55
«Спяшайся жыць. Хай іншы раз і цяжка...» . . . 55
«Зацвіцела вясна навакола...» . . . 56
Вітай . . . 56
Расці, цвіці . . . 56
Раса . . . 57
Мора . . . 57
Няйначай . . . 58

«Усыпана крыжамі ўся аблога...» 58
Мурашкі 59
На магіле 59
Каб сказалі... 60
Паэт 60
Гекзаметры 61
«Толькі выгляне сонца з-за хмараў...» 61
Санет 61
«Ці бачыш ты?..» 62
«Не раз я чуў: «Зірні, якая прыгажосць...» 62
Птушкі 63
Мастак 63
Рандо 64
«Глянь, дружа мой! — у вышыні...» 64
Перачытваючы «Калевалу» 64
Максіму Багдановічу 65
Раманс 65
Апэлес і Аляксандр Македонскі 66
Песні 66
Восеньскія тэрцыны 67
Раманс («Няма нідзе...») 67
Раманс («Толькі там...») 68
«Павіслі вячорныя змрокі над вулкамі...» 68
«І заплакалі сумныя далі...» 69
«Нямала меў, нямала маю я сяброў...» 69
«Зямля мая — абсяг вялікіх скарбаў...» 69
Песня (З «Калевалы») 70
У вырай 72
Бітва (З Гамера) 72
Эпіграмы 73
«Сягаць не раю аж пад неба...» 73
Дождж 74
Гуманізм 74
Бэз 76
Паводле Дантэ 76
«Ён салодкі цяпер, але першы быў шмат саладзейшы...» 77
«Клён шапацеў на сцямнелым двары...» 77

Трыялет 77
Ён ідзе 78
«Лёгкай рукою на шыбах узоры мароз вытыкае...» 78
«Цэлымі днямі сядзеў і не спаў я цалюткія ночы...» 78
Парада 78
Ліпавы цвет 79
«Калі звычайную, хай просценькую рэч...» 79
Сад 79
Муза 80
«Маці. З ёю — дзіця...» 80
Акравершы 81
«Культура — азнака вышэй усяго...» 81
«Цемра гусцее. Заплюшчыў дзень зморaны сінія вочы...» 81
Ля Вострай брамы 82
Змагар айчыны 82
«Добры дзень табе, сонечны Слуцак...» 83
Вільня 83
«Яе чакаў і я. Прыйшла яна...» 83
«У Койданаве жыў Радзюк Альфрэд...» 84
«Ізноў я нарадзінаў дзень спаткаў...» 85
«Даволі спаць. Адчыніш вейкі...» 86
«Ты плывеш, ты змагаешся з хваляй...» 86
Пад п’яную руку 87
Зямля ў агні 89
«Крыніцы звонкае струмень...» 89
«У жылах счах крыві струмень...» 90
«Сустрэча, першая сустрэча...» 91
«Трамвай — даўжэзная, танклявая труна...» 91
«Ахвяраў прагне смерць...» 92
«Вароты ў няведамы свет...» 93
«Пусціня… пусціня… пусціня...» 94
Казка й сон 94
«Дваццаты век. А ён… Хіба маўчыць паэт...» 95
«Хацелася б мне вылаяцца ў вершы...» 95
З таго свету 96
Паклон 96
«Ужо тры дні, ужо тры дні...» 97

«Тры вадаплавы адплылі...» 98
«Расцалаваў я алавік...» 98
«Бывай, Гедэместэ, бывай...» 99
«Лясы. Узгоркі. Паплавы...» 100
«Плыве вадаплаў і плыве...» 101
У моры 101
«Нідзе не адступае...» 102
«Мой сціплы ложак! Прытульны спынак...» 103
Героям бацькаўшчыны 103
Fröhliche Weihnachten 104
Мая сталіца 105
«Я толькі з ёй пайшоў у свет...» 105
Вітанне Случчыне 106
«Мінаю заміны. Нічога...» 107
«Я прыйшоў ад зямлі, ад людзей...» 108
«Не сагрэе сонца майго твару...» 109
«Аблокаў плач — мая туга...» 109
«І неба ранішнім абмылася дажджом...» 110
«Снег ідзе… Вецер гуллівы да ліпаў — сясцёр сіратлівых...» 111
«Дзе ж тая радасць — той дар адзіны...» 111
Радаславу Астроўскаму 111
Лісты на ветры 112
«Смерць цэліла ў грудзі кап'ём...» 113
Стаўся ўсюды госцем выпадковым 114
Дзве Зіны 114
«Мне твая спадабалася ўсмешка...» 115
Случанка 116
«Так і сталася: тую, другую...» 117
«З агню вар'яцкага, з пякельнай цемрыні...» 117
«Да жыцця ад пагібелі крочу...» 118
Дваццаць тры 118
Майму каханню 119
Крыжовы шлях 120
Малітва 121
Смутлівая маці 121
Споведзь 122
Gloria mundi 123

Узняўся сокал у блакіт . . . 124
«У сузор'і заззяе Колас...» . . . 124
Ялінка . . . 125
Чакай . . . 126
Сустрэча . . . 127
«Вянкі, табе вянкі...» . . . 127
«Скажаш мне — і пайду...» . . . 128
«Хай не стукаецца ў дзверы...» . . . 128
«Што ўчора мінула — ніколі...» . . . 128
«А прайшоў я ці мала дарог у свеце...» . . . 129
«Дабрыдзень, мая зарніца...» . . . 129
«Найпершы парыў абяскрылены...» . . . 129
«Далёка няўцеха развітання...» . . . 130
«З табою разам быў...» . . . 130
«Ой жа хітрунніца якая...» . . . 131
«Мінаюць дні. Прайшла вясна. Адззяць і лету...» . . . 131
У дзень нарадзінаў . . . 132
«А ўсё ж мы вернемся дахаты, у Айчыну...» . . . 133
Прошча . . . 133
Гамоніць даўняй праўды звон . . . 135
Alea acta est! . . . 136
Швейцарыя . . . 138
Снежань . . . 139
Маленства . . . 140
Спі... . . . 140
«Пачні з Гамера, ці пачні з Сакрата...» . . . 141
«З мройнай задумай моўкне бор...» . . . 142
«"Будзе дачушка у нас", — ціха шаптала...» . . . 143
«Схіляешся над самаю калыскай...» . . . 143
«Клубочак-брацік бегае з лётачкай-сястрычкаю...» . . . 143
«Да шчасця шлях не быў адчынены...» . . . 144
Employ . . . 144
Малітва . . . 145
Тысяча дзевяцьсот... . . . 146
У гэты дзень . . . 147
Конадзень . . . 149
На матыў Гайнэ . . . 150

. . . 150
Навекі . . . 151
Вам . . . 151
Паводле Гайнэ . . . 152
Жыць . . . 152
«Аб табе успамін — найвышэйшая ўцеха...» . . . 153
«Хочацца плакаць — стрымваю слёзы...» . . . 153
«Ці ж ты і не спаткаеш ніколі...» . . . 154
«Нязмоўкная слава...» . . . 154
Яшчэ не моўкнуць... . . . 155
Як вас... . . . 155
Цемра . . . 156
Раство . . . 156
На чыстым аркушы . . . 157
Адзіноцтва . . . 157
Новы год . . . 158
Чалом, чалом... . . . 158
Ну, што яшчэ... . . . 158
Пакінуў я... . . . 159
Не ўспамінай . . . 159
Слупы . . . 159
Нішчым . . . 160
Альпы . . . 160
Спакой . . . 160
Несмяротнасць . . . 161
Ардэнаносцам . . . 161
Крывічы . . . 162
Няхай . . . 162
Максім Багдановіч . . . 163
І сонцу, і вясне . . . 163
І хмурны пас радзее . . . 163
Ад шумных рэк . . . 164
Сцюжа . . . 164
Silentium! . . . 165
Ідзеш, плывеш . . . 165
Заранка ўсходу . . . 165
За . . . 166
Праз неспагаду . . . 166

Узвіў . . . 166
Надойсце . . . 167
На ціхі бераг . . . 167
Сярод чароўных ніў . . . 168
Зірні . . . 168
Святая (На матыў Р. М. Рыльке) . . . 169
Звон . . . 169
За Порт Саід . . . 170
Перад вясной . . . 170
Надойсце дня . . . 170
Узбудам хваль . . . 171
Акіян . . . 171
За годам год . . . 171
Паўдзённы Крыж . . . 172
Паладзін . . . 172
Чаўны . . . 172
Белы снег . . . 173
Надзея . . . 173
Надзямным . . . 174
У акіян . . . 174
Сум . . . 175
У новы свет . . . 175
Як акіян . . . 176
Зоры . . . 176
У цішыні . . . 176
Дом . . . 177
«Дабрыдзень беларускай хаце...» . . . 177
Воддаль . . . 177
Слова . . . 178
Не з вамі . . . 179
Змагаром народу . . . 179
Над Слуцкам днее . . . 180
Не спіш спакойна . . . 180
Ліст . . . 181
Лёс . . . 181
Згода . . . 182
Мала . . . 182

Развітанне 183
Прыпынак 184
У светлы дзень 184
Святлярныя агні 185
У ім і па-над ім 185
Зара 185
Вам хочацца 186
У добры час 186
Знічы 187
Шлях 187
Кітай 187
Наяве 188
Наўвеце 188
Кола 188
Імкніся ўсцяж 189
Успамін 189
Камэне 189
Усцяж 190
«У гэты час, калі ўсясвету зоры...» 191
Удзячны ўсім 191
Я жыць хачу 192
Ён і яна 192
Бывайце 192
Маме 193
«Ізноў я завітаў да Вашай хаты...» 194
Жадаю Вам 194
«Вялікія тамы з няславай і шматслоўем...» 195
«Жадаю Вам...» 195
«Любіла красы паўніню...» 195
«Жадаю Вам найсветлых дзён...» 196
«Яно прыйшло адтуль, дзе ўцеха ходзіць з горам...» 196

ПАЭМЫ

На хуткіх крылах вольнага Пегаса 197
Звіняць званы Святой Сафіі 208
Домік у Менску 211
Сын 222

ВЯНОК САНЕТАЎ 226

ДРАМАТУРГІЧНЫЯ ТВОРЫ

Дух праўдны, духу зла непадуладны 234
Заззяла прабуджальная дзянніца 242

ВЕРШЫ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

У лесе 244
Улетку 244
Сняжынкі 245
Дзед Мароз 246
Ялінка 246
Зайчык 247

ІНШАМОЎНЫЯ І НЕЗАКОНЧАНЫЯ ВЕРШЫ

«Куда плывём? Скажи, мой друг, куда?..» 248
«Шумит, шумит угрюмая тоска...» 248
«Тільки очі лукаво примружить...» 249
«...Ды можа сам, як чалавек, схіліўся...» 249

ПЕРАКЛАДЫ

З Райнэра Марыя Рыльке
Песня статуі 250
Хлопчык 250
Сусед 251
Восень 251

З Тараса Шаўчэнкі
«Садок вішнёвы каля хаты...» 252

З Леаніда Палтавы
Хто мы? 252
У бальніцы 253

З Адама Міцкевіча
Да Нёмна 254

З Макса Дуна
«Скакаў я, пакуль дзвюх ступнёў не меў...» 254

ПРОЗА

Кароткі жыццяпіс 255
Белы снег 260
Чужы 263

Маналог сабакі 267
Сорак дзён 270
Пад небам Паўдзённага Крыжа 272

ЛІСТЫ

1. Масею Сяднёву. 15 снежня 1943 г. 275
2. Масею Сяднёву. 31 снежня 1943 г. 278
3. Масею Сяднёву. 14 траўня 1944 г. 282
4. Масею Сяднёву. 15 траўня 1944 г. 285
5. Масею Сяднёву. 9 чэрвеня 1944 г. 287
6. Масею Сяднёву. [1944 г.] 298
7. Масею Сяднёву. 14 лістапада 1944 г. 298
8. Уладзіміру Сядуру і Масею Сяднёву. 28 траўня 1944 г. 301
9. Юрку Віцьбічу. 21 верасня 1946 г. 304
10. Вітаўту Тумашу 4 лістапада 1946 г. 306
11. Масею Сяднёву. 27 лістапада 1946 г. 308
12. Масею Сяднёву. 29 лістапада 1946 г. 309
13. Вітаўту Тумашу. 14 снежня 1946 г. 310
14. Масею Сяднёву. 27 снежня 1946 г. 313
15. Масею Сяднёву. 28 снежня 1946 г. 314
16. Масею Сяднёву. 31 снежня – 1 студзеня 1947 г. 314
17. Вітаўту Тумашу. [1947 г.] 316
18. У рэдакцыю газеты «Беларускія навіны». 25 студзеня 1947 г. 316
19. Вітаўту Тумашу. 12 лютага 1947 г. 319
20. Аляксандру Міцкевічу. 19 лютага 1947 г. 320
21. Вітаўту Тумашу. 23 лютага 1947 г. 321
22. Юрку Віцьбічу. 26 лютага 1947 г. 323
23. Масею Сяднёву. 26 лютага 1947 г. 326
24. Масею Сяднёву. 29 сакавіка 1947 г. 327
25. Вітаўту Тумашу. 3 красавіка 1947 г. 327
26. Масею Сяднёву. 14 красавіка 1947 г. 328
27. Масею Сяднёву. 27 красавіка 1947 г. 330
28. Вітаўту Тумашу. 8 траўня 1947 г. 331
29. Вітаўту Тумашу. 21 траўня 1947 г. 333
30. Юрку Віцьбічу. 9 чэрвеня 1947 г. 335
31. Аляксандру Лашуку. 23 чэрвеня 1947 г. 335
32. Масею Сяднёву. 4 жніўня 1947 г. 337

33. Вітаўту Тумашу. 10 жніўня 1947 г. 338
34. Яну Пятроўскаму. 26 жніўня 1947. 339
35. Яну Пятроўскаму. 30 жніўня 1947 г. 341
36. Аляксандру Лашуку. 10 верасня 1947 г. 342
37. Яну Пятроўскаму. 11 верасня 1947 г. 343
38. Масею Сяднёву. 21 верасня 1947 г. 344
39. Масею Сяднёву. 24 верасня 1947 г. 345
40. Аляксандру Лашуку. 3 кастрычніка 1947 г. 347
41. Масею Сяднёву. 16 кастрычніка 1947 г. 348
42. Юрку Віцьбічу. 20 кастрычніка 1947 г. 350
43. Масею Сяднёву. 26 кастрычніка 1947 г. 351
44. Масею Сяднёву. 7 лістапада 1947 г. 353
45. Вітаўту Тумашу. 16 лістапада 1947 г. 353
46. Масею Сяднёву. 17 лістапада 1947 г. 355
47. Масею Сяднёву. 18 лістапада 1947 г. 355
48. Масею Сяднёву. 27 снежня 1947 г. 356
49. Вітаўту Тумашу. 10 студзеня 1948 г. 356
50. Масею Сяднёву. 14 студзеня 1948 г. 358
51. Юрку Віцьбічу. 15 студзеня 1948 г. 358
52. Аляксандру Лашуку. 5 лютага 1948 г. 360
53. Масею Сяднёву. 22 лютага 1948 г. 361
54. Масею Сяднёву. 28 лютага 1948 г. 362
55. Масею Сяднёву. 17 сакавіка 1948 г. 363
56. Аляксею Грыцуку. [Сакавік 1948 г.] 363
57. Вітаўту Тумашу. 7 красавіка 1948 г. 365
58. Аляксандру Міцкевічу. 8 красавіка 1948 г. 366
59. Аляксею Грыцуку. 19 красавіка 1948 г. 367
60. Юрку Віцьбічу. 20 красавіка 1948 г. 368
61. Масею Сяднёву. 28 красавіка 1948 г. 369
62. Вітаўту Тумашу. 19 траўня 1948 г. 369
63. Аляксею Грыцуку. 19 траўня 1948 г. 370
64. Рыгору Крушыну. 4 чэрвеня 1948 г. 371
65. Масею Сяднёву. 9 чэрвеня 1948 г. 372
66. Масею Сяднёву. 1 ліпеня 1948 г. 373
67. Масею Сяднёву. 1 ліпеня 1948 г. 375
68. Аляксею Грыцуку. 3 ліпеня 1948 г. 377
69. Міколу Ганько. 13 ліпеня 1948 г. 379

70. Міколу Ганько. 16 ліпеня 1948 г. 380
71. Аляксею Грыцуку. 17 ліпеня 1948 г. 381
72. Юрку Віцьбічу. 30 ліпеня 1948 г. 382
73. Аляксею Грыцуку. 31 ліпеня 1948 г. 383
74. Аляксею Грыцуку. 15 жніўня 1948 г. 385
75. Міколу Ганько. 8 верасня 1948 г. 386
76. Аляксандру Міцкевічу. 10 верасня 1948 г. 388
77. Аляксею Грыцуку. 10 верасня 1948 г. 388
78. Масею Сяднёву. 22 верасня 1948 г. 390
79. Аляксандру Міцкевічу. 23 кастрычніка 1948 г. 391
80. Міколу Ганько. 1 лістапада 1948 г. 391
81. Юрку Віцьбічу. 8 лістапада 1948 г. 392
82. Аляксею Грыцуку. 29 лістапада 1948 г. 393
83. Міколу Ганько. 1 снежня 1948 г. 394
84. Аляксею Грыцуку. 10 снежня 1948 г. 395
85. Аляксандру Міцкевічу. 24 снежня 1948 г. 397
86. Юрку Віцьбічу. 5 студзеня 1949 г. 397
87. Міколу Ганько. 11 студзеня 1949 г. 398
88. Аляксею Грыцуку. 24 студзеня 1949 г. 399
89. Юрку Віцьбічу. 16 лютага 1949 г. 401
90. Аляксею Грыцуку. 1 сакавіка 1949 г. 402
91. Масею Сяднёву. 6 сакавіка 1949 г. 404
92. Міколу Ганько. 12 сакавіка 1949 г. 405
93. Аляксею Грыцуку. 20 сакавіка 1949 г. 406
94. Аляксандру Міцкевічу. 27 сакавіка 1949 г. 408
95. Юрку Віцьбічу. 17 красавіка 1949 г. 408
96. Міколу Скабею. 27 чэрвеня 1949 г. 408
97. Міколу Скабею. 5 ліпеня 1949 г. 410
98. Міколу Скабею. 13 ліпеня 1949 г. 412
99. Міколу Скабею. 31 ліпеня 1949 г. 416
100. Міколу Скабею. 9 жніўня 1949 г. 417
101. Міколу Скабею. 21 жніўня 1949 г. 419
102. Міколу Скабею. 30 жніўня 1949 г. 421
103. Міколу Скабею. 12 верасня 1949 г. 423
104. Міколу Скабею. 5 кастрычніка 1949 г. 425
105. Міколу Скабею. 27 кастрычніка 1949 г. 426
106. Міколу Скабею. 4 лістапада 1949 г. 428

107. Міколу Скабею. 10 лістапада 1949 г. 429
108. Міколу Скабею. 14 лістапада 1949 г. 431
109. Міколу Скабею. 20 лістапада 1949 г. 432
110. Міколу Скабею. 23 лістапада 1949 г. 433
111. Аляксею Грыцуку. 24 лістапада 1949 г. 434
112. Міколу Ганько. 4 снежня 1949 г. 436
113. Міколу Скабею. 12 снежня 1949 г. 437
114. Міколу Скабею. 20 снежня 1949 г. 438
115. Аляксею Грыцуку. [1949 г.] 439
116. Міколу Скабею. 24 студзеня 1950 г. 440
117. Аляксею Грыцуку. 24 студзеня 1950 г. 441
118. Міколу Ганько. 30 студзеня 1950 г. 443
119. Міколу Скабею. 10 лютага 1950 г. 443
120. Міколу Ганько. 4 красавіка 1950 г. 447
121. Міколу Скабею. 20 чэрвеня 1950 г. 448
122. Аляксею Грыцуку. 24 сакавіка 1952 г. 449
123. Юрку Віцьбічу. 13 траўня 1952 г. 451
124. Аляксею Грыцуку. 27 верасня 1952 г. 451
125. У Беларускі інстытут навукі і мастацтва. 23 траўня 1955 г. 453
126. Антону Адамовічу. [Верасень 1955 г.] 453
127. Антону Адамовічу. [Верасень 1955 г.] 454
128. Антону Адамовічу. 26 кастрычніка 1955 г. 455
129. Антону Адамовічу. 18 снежня 1955 г. 456
130. Антону Адамовічу. 31 снежня 1955 г. 458
131. Уладзіміру Глыбіннаму. 24 студзеня 1965 г. 458
132. Ларысе Геніюш. 25 красавіка 1971 г. 459
133. Ларысе Геніюш. 10 верасня 1971 г. 460
134. Антону Адамовічу. 9 лютага 1977 г. 461
135. Аляксандру Калодку. 6 сакавіка 1977 г. 462
136. Антону Адамовічу. 3 ліпеня 1977 г. 462

Дадатак

УСПАМІНЫ ПРА АЛЕСЯ САЛАЎЯ

Ігар Качуроўскі. Алесь Салавей, якім я яго памятаю 465
Вольга Грыцук. Успамін пра Алеся Салаўя 469
Ян Пятроўскі. Спатканне і ўспамога 470
Аляксандр Калодка. Памяці Алеся Салаўя 474

Уладзімір Брылеўскі. На ўгодкі смерці Алеся Салаўя 476
Мікола Ганько. Я памятаю 478
Ліст Зінаіды Кадняк Антону Адамовічу. 6 снежня 1979 г. 481
Ліст Зінаіды Кадняк Аляксандру Калодку. 6 студзеня 1979 г. 487
Ліст Зінаіды Кадняк Ларысе Геніюш. 7 лютага 1978 г. 491
Ліст Міколы Нікана Ларысе Геніюш. [1978 г.] 493

КАМЕНТАР 495

Біяграфічная даведка 544

Літаратурна-мастацкае выданне

Салавей Алесь (Радзюк Альфрэд)

ТВОРЫ

Паэзія, проза, лісты

Адказны за выпуск *М. Шыбко*
Вокладка *Г. Мацур*
Вёрстка *В. Нога*
Карэктар *Т. Нікалаева*

Падпісана ў друк 10.06.2010. Фармат 60x84 1/16. Папера афсетная. Афсетны друк.
Ум. друк. арк. 33,0. Ул.-выд. арк. 26,1. Наклад 400 асоб. Заказ 1714.

Выдавецтва ТАА «Лімарыус». ЛИ № 02330/0494401 ад 16.03.2009.
Вул. Стралковая, 14, 220030, г. Мінск.

ТДА «НоваПрынт». ЛП № 02330/0150476 ад 25.02.2009.
Вул. Купрэвіча, 2, 220047, г. Мінск.

Алесь Салавей

